ARCHE Зьмест № 5'04

1. Зьмест / Уводзіны
2. Шукайце нас у падпольлі
3. ARCHE 5 (34) 2004. апытаньне.
4. Чаму Беларусь ня Аўстрыя, а эўразійская сатрапія
5. Калі фармальная лёгіка недарэчы…
6. Даніла Жукоўскі. Pax Vobiscum
7. Юры Дракахруст. Ваенная хітрасьць.
8. Нерыюс Прэкявічус. Як Лукашэнка апраўдвае рэферэндум і свой рэжым.
9. Уладзімер Мацкевіч. Чыя палітыка тапырыцца ў раёне Берасьця?
10. Лілія Шаўцова. Межы бюракратычнага аўтарытарызму.
11. Сэмюэл Гантынгтан. Мёртвыя душы.
12. Пётр Рудкоўскі. Падмуркі і падпоркі дзяржаўнай ідэалогіі.
13. Андрэй Ягораў. Жабрацтва ідэалогіі.
14. Даніла Жукоўскі. Цётка Свабода.
15. Сяргей Богдан. Гісторыя іншасказаньняў: мусульманская літаратура Вялікага Княства Літоўскага.
16. Сяргей Носаў. Ты памятаеш, як усё пачыналася.
17. Ігар Бабкоў. Катакомбы cogito.
18. Аляксей Бацюкоў. Праўда і няпраўда гісторыі.
19. Франц Сіўко. Асымэтрыя.
20. Сяргей Балахонаў. Зямля пад крыламі Фэнікса.
21. Алесь Макрацоў. Зямля пад крыламі Фэнікса.
22. Крыс Братэн. Царква.
23. Том Стапард. Догаў Гамлет, Кагутаў Макбэт.
24. Юры Пацюпа. Страла Зэнона.
25. Анатоль Трафімчык. Паміж Сцылаю і Харыбдаю.
26. Яўген Казінец. Беларусь шматаблічная.

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (34) - 2004**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

5[image]-[image]2004

"да Зьместу"

аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]
[image]

З ь м е с т

ПРАДМОВА

Шукайце нас у падпольлі

АПЫТАНЬНЕ

На пытаньні «ARCHE» адказваюць вядомыя расейскамоўныя інтэлектуалы Беларусі

ПАЛЕМІКА

ВАЛЕР БУЛГАКАЎ Чаму Беларусь ня Аўстрыя, а эўразійская сатрапія
ПЁТРА САДОЎСКІ Калі фармальная лёгіка недарэчы
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Pax Vobiscum
ЮРЫ ДРАКАХРУСТ Ваенная хітрасьць

АНАЛІТЫКА

НЕРЫЮС ПРЭКЯВІЧУС Як Лукашэнка апраўдвае рэфэрэндум і свой рэжым
УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ Чыя палітыка тапырыцца ў раёне Берасьця?
Выступ прэзыдэнта перад берасьцейскімі студэнтамі
ЛІЛІЯ ШАЎЦОВА Межы бюракратычнага аўтарытарызму
СЭМЮЭЛ ГАНТЫНГТАН Мёртвыя душы.

Дэнацыяналізацыя амэрыканскай эліты

КРЫТЫКА

ПЁТРА РУДКОЎСКІ ОП Падмуркі і падпоркі дзяржаўнай ідэалёгіі
АНДРЭЙ ЯГОРАЎ Жабрацтва ідэалёгіі
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Цётка Свабода
СЯРГЕЙ БОГДАН Гісторыя іншасказаньняў: мусульманская літаратура Вялікага Княства Літоўскага

ЭСЭІСТЫКА

СЯРГЕЙ НОСАЎ Ты памятаеш, як усё пачыналася
ІГАР БАБКОЎ Катакомбы cogito
АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ Праўда і няпраўда гісторыі

ЛІТАРАТУРА

ФРАНЦ СІЎКО Асымэтрыя
СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ Зямля пад крыламі Фэнікса
АЛЕСЬ МАКРАЦОЎ Лірыка
КРЫС БРАТЭН Царква
ТОМ СТОПАРД Догаў Гамлет, Кагутаў Макбэт
ЮРАСЬ ПАЦЮПА Страла Зэнона. Рытмалягічны трактат

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

АНАТОЛЬ ТРАФІМЧЫК Паміж Сцылаю і Харыбдаю
ЯЎГЕН КАЗІНЕЦ Беларусь шматаблічная

[image]
[image]

№ 5 (34) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/01/11

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (34) - 2004**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

прамова[image]2004
"да Зямлі"

[image] [image] [image]

Шукайце нас у падпольлі

Часопіс «ARCHE» спачатку папярэдзілі (Міністэрства інфармацыі), а пасьля пачалі душыць. «Белкніга» загадала спыніць продаж усім менскім найважнейшым кнігарням, што прадаюць беларускамоўную літаратуру: «Кнігарні пісьменьніка», «Падпісным выданьням»,

«Ведам»... А
апярэдзіла
ўсіх у гэтым
лакаўце
наймудрэйшая
«Акадэмкніга».
Без
тлумачэньня
прычынаў
дамовы на
распаўсюд
«ARCHE»
разарвалі
рэспубліканскі
«Белсаюздрук»
і
«Менгарсаюздрук».
Пакуль няма
адпаведнага
ліста зь
«Белпошты»
аб
спыненьні
падпіскі на
часопіс і
выключэньні
яго з
падпіснога
каталёгу,
але
найхутчэй і
гэта нас не
абміне.
Ясна, чаму
гэта ўсё, –
праз
адпаведны
загад
зьверху, які
надышоў,

найхутчэй, з Адміністрацыі прэзыдэнта. Ясна і за што: за нумар, прысьвечаны вынікам 10-гадовага прэзыдэнцтва Аляксандра Лукашэнкі. Пакараньне ўзорнае: кнігарням і шапікам забаронена прадаваць ня толькі гэты апошні нумар часопісу – яны вярнулі ўсе ранейшыя нумары. Калі «ARCHE» не разумее намёкаў – выгнаньня з Дому друку, папярэджаньняў Міністэрства інфармацыі пасьля нумароў, дзе аналізаваліся «дзяржаўная ідэалёгія» і

кадравая
палітыка, –
трэба
правучыць
яго
канкрэтна.

Па часопісе нанесены жорсткі ўдар: 85 % асобнікаў часопісу прадавалася празь сеткі й крамы, якія цяпер сталі недаступнымі. Як выжыць у такой сытуацыі? Як даходзіць да спажыўца, як ня вырадзіцца ў адно з шматлікіх бясьпечных для ўладаў выданьняў, што не прадаюцца нідзе за межамі ўласнай Рэдакцыі? І ці слушна зрабіла Рэдакцыя, выдаўшы Лукашэнкаўскі нумар «ARCHE», надрукаваўшы эсэ і артыкулы Валера Булгакава, Андрэя Казакевіча, Вольфа Рубінчыка, Славоя Жыжака, Валянціна Акудовіча, Сяргея Шыдлоўскага, Макса Шчура, Алеся Аркуша, Пётры Рудкоўскага, Міколы Пачкаева, Алены Гапавай і апытаньні палітыкаў і дзеячоў культуры? Мо лепш было легчы на падлогу і прыціхнуць, перачакаць, пераседзець гэтыя халодныя для беларускае культуры дзесяцігодзьдзі?
Перад здачай нумару ў друк Рэдакцыя «ARCHE» абмяркоўвала гэтыя пытаньні, разглядаючы варыянты «друкаваць – не друкаваць» і «надрукаваўшы, прадаваць адкрыта – не прадаваць». Вырашылі дзейнічаць у адпаведнасьці з прынцыпамі інтэлектуальнай сумленнасьці і культурнай нармальнасьці. Адмовіцца ад іх, пайсьці на ідэалягічную самацэнзуру або гуляць у хованкі было б прызнаць іхныя правілы гульні, далучыцца да палка тых, хто думае адно, гаворыць другое, а робіць трэцяе.
«ARCHE» засноўваўся як «іншы», непадобны да «Прыпяцяў» і «Сталасьцяў» часопіс, што закладаў новы лібэральны дыскурс. Прынцыпова непадкантрольны. Прынцыпова закрыты для палітканьюнктуры, прапаганды.
«ARCHE» стаў першым рэгулярным недзяржаўным беларускамоўным часопісам постсавецкага часу. Як такі, ён мае пэўныя абавязкі перад інтэлектуальнай гісторыяй.
Спыняць выданьне ня будзем да апошняга, мяняць прынцыпы ня будзем ніколі. Ня садзяць за тое, што пішам па-беларуску, дзякуй і за гэта.

Адказу на пытаньне, як цяпер даходзіць да чытача, мы да канца пакуль ня маем. Мы гатовыя прыяжджаць на сустрэчы з чытачамі ў любы куток Беларусі і прывозіць з сабою выданьні «ARCHE». Мы зьвяртаемся да інтэлектуалаў і актывістаў нацыянальнага руху: закладайце міні-сыстэмы распаўсюду незалежных выданьняў у кожнай вашай мясьціне.
Калі часопіс «ARCHE» будзе забаронены, мы вынайдзем іншыя формы культурнай працы з захаваньнем ранейшых інтэлектуальных прынцыпаў.
Шукайце нас у прыватных распаўсюднікаў.
05.11.2004
Андрэй Дынько
[image]
[image]

№ 5 (34) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/2/28
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к № 5 (34) - 2004

[image]

[image]

[image]

5 [image] [image]2004
"да Зміцера"

АПЫТАНЬНЕ

На пытаньні адказваюць вядомыя расейскамоўныя інтэлектуалы Беларусі:
Сьвятлана Алексіевіч, *пісьменьніца;*
Аляксандар Фядута, *публіцыст і літаратуразнаўца;*
Сяргей Панькоўскі, *кандыдат філязофскіх навук, дарадца рэктара зачыненага Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту,*

кіраўнік аналітычнага праекту «Наше мнение»;
***Юры Дракахруст**, палітычны аналітык радыё «Свабода»;*
***Аляксандар Сасноў**, былы міністар працы, а цяпер намесьнік дырэктара НІСЭПД;*
***Станіслаў Багданкевіч**, прафэсар БДЭУ, ганаровы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі, былы старшыня Нацыянальнага банку;*
***Леанід Злотнікаў**, эканаміст;*
***Леанід Заіка**, старшыня Аналітычнага*

цэнтру «Стратэгія»;
Уладзімер Мацкевіч,
сацыёляг;
Сямён Букчын,
дасьледчык літаратуры, публіцыст;
Віктар Марціновіч,
намесьнік галоўнага рэдактара «Белорусской газеты»;
Пятро Марцаў,
выдавец «Белорусской деловой газеты».

ЦІ МУСЯЦЬ У БЕЛАРУСІ ЗАСТАЦЦА ДЗЬВЕ ДЗЯРЖАЎНЫЯ МОВЫ?

Сьвятлана Алексіевіч: Я мяркую, і для мяне гэта цалкам відавочна, што ў Беларусі павінны быць дзьве дзяржаўныя мовы. Магчыма, на пераходны пэрыяд, магчыма, і назаўсёды, як гэта і ёсьць у шэрагу эўрапейскіх краінаў. Гэта павінна быць з прычыны шэрагу гістарычных чыньнікаў - з прычыны русіфікацыі, з прычыны таго, што нацыя наагул затрымалася ў сваёй нацыянальнай самасьвядомасьці. Прайдзіце па вуліцах - ніхто ж не гаворыць па-беларуску. Зайдзіце ў любую ўстанову, у краму, у кавярню. Адзіная дзяржаўная мова - гэта будзе элемэнт гвалту. Думаю, што гэтая ідэя ўжо непапулярная ў грамадзтве.

Аляксандар Фядута: Ужо - так. На жаль, цяпер дэмакраты павінны зразумець: любая спроба забраць у расейскай мовы статус дзяржаўнай адразу прывядзе да ўскладненьня адносінаў з Расеяй. Гэта небясьпечна, бо, у адрозьненьне ад Латвіі, мы ня хутка будзем у Эўропе. Апроч таго, пашкадуйце дзяцей, якім ізноў давядзецца перавучвацца. Трэба зрабіць іншае: чыноўнікі і кандыдаты на кіраўнічыя пасады ў дзяржаўных структурах, улучна зь сілавымі, павінны здаваць экзамэн на веданьне дзьвюх дзяржаўных моваў. Хаця б на ўзроўні школьнага сачыненьня ці пераказу. Паверце, гэтага будзе дастаткова. Наступнае пакаленьне ўжо будзе жыць пры моўным камунізьме: поўная роўнасьць моваў, нават без матэрыяльнага стымуляваньня. А то ж агульны ўзровень пісьменнасьці падае.
Сяргей Панькоўскі: Пытаньне пра нацыянальную мову павінна стаць прадметам шырокай грамадзкай дыскусіі, удумлівай, далікатнай, сьвядома арыентаванай не на разьмежаваньне, а на гатоўнасьць і жаданьне знайсьці ў грамадзтве згоду, больш ці менш кампраміснае рашэньне, на разуменьне таго, што мы - адзін народ, адрозны ад іншых, і сярод нас, «сваіх», павінны імкнуцца з павагаю і дэмакратычна ставіцца адно да аднаго. Адзінства не азначае выключэньня адрозьненьняў. На жаль, цяпер пануючы палітычны стыль накіраваны на здушэньне альтэрнатываў, распальваньне недаверу і супярэчнасьцяў унутры грамадзтва, трактоўку адрозьненьня як варожасьці. Можна чакаць, пакуль зьменіцца гэты неспрыяльны для адкрытай дыскусіі палітычны кантэкст, можна імкнуцца яго зьмяніць, а можна ўжо цяпер наладжваць дыялёг унутры пэўнай прасторы свабоднага і дэмакратычнага мысьленьня, дзе «талерантнасьць» - не пустая прапагандысцкая дэмагогія, а праграмны прынцып. Таму на пытаньне пра дзьве дзяржаўныя мовы пакуль я б адказаў, хутчэй, «так». Іншая рэч, трэба думаць аб захадах, якія б забясьпечылі рэальнае раўнапраўе дзьвюх моваў, з паступовым ростам прэваляваньня беларускай. Гэта значыць, на мой погляд, у прынцыпе, натуральна, у ідэале галоўнай мовай павінна быць беларуская. Але ігнараваць расейскую, мне здаецца, цяпер проста культурна і палітычна немэтазгодна. І ня трэба сьпяшацца. Рэвалюцыі заўсёды рэч небясьпечная.
Юры Дракахруст: Дзяржаўны статус абедзьвюх моваў варта захаваць. Вынікі перапісу і шматлікіх сацыялягічных

дасьледаваньняў, звычайны жыцьцёвы досьвед сьведчаць пра тое, што пераважная колькасьць беларускага насельніцтва, у тым ліку і пераважная колькасьць этнічных беларусаў, карыстаюцца ня толькі ў афіцыйных зносінах, але і ў сваім побыце расейскай мовай. Тут калі магчыма гаварыць пра прымусовую русіфікацыю, то толькі ў гістарычным пляне: для саміх цяперашніх расейскамоўных беларусаў іх расейскамоўнасьць - рэч абсалютна натуральная і зусім не прымусовая. Якой мовай размаўляць чалавеку дома - тут аніякая ўлада ні да чога прымусіць ня можа. «Хатняя» мова - гэта, за рэдкім выключэньнем, і ня вынік выбару, не наступства пэўнай пазыцыі. Бацькі гэтак гаварылі, сябры, знаёмыя гэтак гавораць, нарэшце, жонка (муж) гэтак размаўляе - ну дык а я што, інакш размаўляць буду? І гэты сацыяльны «прымус» надае моўным перавагам асаблівую ўстойлівасьць.
Таму ў цяперашняй моўнай сытуацыі зьніжэньне статусу расейскай мовы, абмежаваньне яе правоў у афіцыйным ужытку будзе ўспрынятае расейскамоўнай большасьцю як несправядлівая дыскрымінацыя.
Адсюль вынікае і другі чыньнік, чаму мусіць быць захаваная дзяржаўнасьць абедзьвюх моваў. Калі дзякуючы зьбегу абсалютна ўнікальных абставінаў (як тое было ў 1990 годзе) беларуская мова стане адзінай дзяржаўнай, гэтае масавае пачуцьцё несправядлівасьці, дыскрымінаванасьці раней ці пазьней выплюхнецца, набудзе палітычную форму - папросту кажучы, моўны рэфэрэндум 1995 году паўторыцца зноў.
Аляксандар Сасноў: Гэта не такое лёгкае пытаньне, як здаецца шмат каму. Рэч у тым, што ўжо 9-10 пакаленьняў беларусаў жывуць ува ўмовах моцнай русіфікацыі. Тых, хто быў здольны неяк адчуваць сваю беларускасьць, спачатку царскія, потым савецкія (таксама расейскія!) улады жорстка і бязьлітасна зьнішчалі. Астатнім увесь час убівалі ў галаву тое, што яны таксама «расейцы», але трохі «сапсаваныя» палякамі. І каб нечага дабіцца ў жыцьці, беларусы былі вымушаны авалодваць расейскай мовай. Паколькі гэта цягнулася бадай два стагодзьдзі, вось і выйшла, што значная большасьць беларусаў сёньня гаворыць на расейскай мове. Трэба зазначыць, што калі б большасьць беларусаў заставалася дагэтуль сялянамі, дык ніякіх моўных пытаньняў і не было б: усе б гаварылі матчынай мовай. Але цяпер у вёсцы засталіся толькі старыя ды «пітоны»,

а бальшыня перабралася ў гарады, атрымала адукацыю (на расейскай мове!) і сваім нашчадкам перадае менавіта гэтую мову. Інакш Лукашэнка ня змог бы так лёгка атрымаць перамогу на рэфэрэндуме 1995 году, вынікі якога ня трэ было фальсыфікаваць. Калі б ня гэты факт, безумоўна, трэ было б рабіць толькі адну мову дзяржаўнай.
Чаму сьвядомыя беларусы так змагаюцца за адну дзяржаўную мову? На мой погляд, рэч зусім ня ў мове. Яны лічаць, што мова - першы і, бадай, галоўны носьбіт нацыянальнага самавызначэньня для насельніцтва. Таму яны думаюць, што іншая мова, менавіта беларуская, дазволіць мець вельмі глыбокую і моцную *іншасьць ад Расеі*, дазволіць *вырваць Беларусь з расейскага імпэрскага кола*. Я лічу, што гэта памылка! Валоданьне і карыстаньне расейскай мовай ні ў якім сэнсе не дабаўляе анічога ні супраць беларускасьці, ні да яе. Хто быў савецкім «інтэрнацыялістам», той ім і застанецца, хай ён лепш за ўсіх валодае беларускай мовай. Хто любіць сваю матчыну, дык ён будзе шанаваць яе і на расейскай (польскай, ангельскай, габрэйскай ды іншай) мове. Сёньня нацыянальнае самавызначэньне зьвязана з грамадзянствам, а не з этнічным паходжаньнем, тым больш ня з мовай. Канадцы ў Квэбэку ня робяцца французамі толькі таму, што гавораць па-французску!
Станіслаў Багданкевіч: У цяперашніх умовах немэтазгодна касаваць канстытуцыйную норму аб выкарыстаньні ў якасьці дзяржаўных дзьвюх моваў - беларускай і расейскай. Разам з тым, трэба прыняць закон, які б зацьвердзіў дзяржаўную праграму ўзьняцьця дэ-юрэ і дэ-факта беларускай мовы да ўзроўню рэальнай першай дзяржаўнай мовы. У праграме неабходна прадугледзець захады дзеля пашырэньня выкарыстаньня беларускай мовы ў дашкольных і школьных установах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, адпаведную матэрыяльную і фінансавую падтрымку працэсу, накіраванага на аднаўленьне значнасьці, прэстыжнасьці і карыснасьці ўжываньня беларускай мовы. Мяркую, што гэтае пытаньне канчаткова магло б быць разьвязанае пасьля ажыцьцяўленьня вышэй згаданых захадаў, гадоў так празь пятнаццаць.
Леанід Злотнікаў: Дзьве дзяржаўныя мовы - гэта непазьбежная рэальнасьць для Беларусі, і няма ў краіне той сілы, якая б змагла зьмяніць сытуацыю. Калі гэтае пытаньне разглядаць як

пажаданьне, то я за дзьвюхмоўе, таму што гэта адпавядае лібэральна-дэмакратычнаму сьветапогляду: правы грамадзяніна вышэйшыя за інтарэсы дзяржавы або нацыі. Калі больш за палову насельніцтва ўжывае расейскую мову, дык чаму рабіць ім дрэнна?
Беларуская мова становіцца адным з сымбаляў узьнікаючай беларускай нацыі, але з гэтага зусім не вынікае, што ўсе, хто на апошнім перапісе насельніцва прызнаў беларускую мову роднай, яе ўжываюць ці будуць згодныя перайсьці на яе на справе.
Леанід Заіка: Дзяржаўная мова - гэта паняцьце, якое мяняецца. У сьвеце ўжо дастаткова людзей, якія з высокай ступеньню мабільнасьці ўвесь час мяняюць працу і месца жыхарства. Больш за палову маіх былых найлепшых студэнтаў паехалі працаваць і жыць за мяжу. Ня веру я ў тое, што яны вернуцца ў Беларусь. Яны хочуць увайсьці ў больш пэрспэктыўнае эканамічнае і інтэлектуальнае асяродзьдзе. Стаць часткай сусьветнай эліты.
Мова, якой яны карыстаюцца, - ангельская. Магчыма, што менавіта гэтая мова і гэтая эліта зьяўляюцца новым ладам XXI стагодзьдзя. Дзяржаўная мова і дзяржаўная навука, дзяржаўнае мастацтва - утварэньні чыноўнікаў і палітыкаў. Я асабіста супраць выцясьненьня адной лінгвістычнай сыстэмы празь іншую. Наша звычайнае дзіця для ўваходжаньня ў рэгіянальную і сусьветную супольнасьць вымушана будзе асвойваць тры моўныя сыстэмы: беларускую, расейскую і ангельскую. Гэта дарагая справа, і выдаткі часу на навучаньне ў разы большыя, чым у Вялікабрытаніі ці ЗША. У гэтых краінах дастаткова ведаць толькі адну мову. Аўтаматычна наша лінгвістычная адукацыя становіцца ў тры разы даражэйшаю. Дадамо яшчэ такі фактар, як час на асваеньне моваў.
З гэтай прычыны абмежаваць адукацыю і дзелавую практыку адной «мовай» азначае пазбавіць большасьць моладзі магчымасьцяў увайсьці ў эліту сваёй краіны і сьвету. Змагацца за сваю родную мову - гэта свайго роду праграма-мінімум. Гіпэркампэнсацыя на карысьць самаідэнтыфікацыі.
Ёсьць і іншы ракурс у гэтай праблеме. У цяперашняй сытуацыі субстанцыяй дыскусіі пра дзьве мовы ёсьць палітычны выбар. Ён навязаны палітыкамі і палітыканамі. Сутнасьць - альбо свабоднае разьвіцьцё краіны, дыстанцыяванае ад Расеі, альбо

ўсходні вэктар стратэгічнай арыентацыі Беларусі. Гэта дылема - Усход ці Захад. Але на заходнім кірунку - ЭЗ і інтэграцыйныя інстытуты. Вобразна кажучы, налева пойдзеш - ангельскую знойдзеш, направа - расейскую. Будучыня Беларусі - у трох мовах. Прычым нам гэта неабходна так сама, як літоўцам, латышам, палякам. Наш супольны лёс увесь час палягаў і будзе палягаць у выбары. Але цяпер сусьветная палітыка і інтэграцыйныя працэсы такія, што выбар робяць за нас больш моцныя і ўплывовыя краіны.

Уладзімер Мацкевіч: Калі б такія пытаньні можна было вырашаць штучна і гэта залежала б ад мяне, дык я пакінуў бы дзяржаўнай толькі адну беларускую мову. І абвесьціў бы мараторый на зьмену гэтага артыкулу Канстытуцыі на 40-50 гадоў. Калі б праз 50 гадоў расейская мова была распаўсюджаная ў Беларусі хоць бы так, як сёньня беларуская, то можна было б вярнуцца да гэтага пытаньня зноў. Але ж гэта не залежыць ад мяне і ні ад кога асабіста. Палітыка - гэта штука, або мастацтва магчымага.

Трэба дадаць, што нельга аргумэнтаваць захаваньне дзьвюх дзяржаўных моваў абаронай правоў чалавека. Такі аргумэнт прымальны толькі ў тым выпадку, калі грамадзтва пагаджаецца рабіць усё для пашырэньня сфэры ўжываньня беларускай мовы. Такі кансэнсус малаімаверны. Таму адзіным разумным выйсьцем зьяўляецца канстытуцыйная абарона беларускай мовы. Гэта прадмет экалёгіі культуры, а не ўцісканьня правоў чалавека, як гэта імкнуцца падаваць. Мала забараніць паляваньне на жывёлаў з «Чырвонай кнігі» - яны загінуць проста ад нераўнацэннай канкурэнцыі, - іх трэба спэцыяльна даглядаць і гадаваць. Так і ў выпадку з мовамі, якія знаходзяцца на мяжы зьнікненьня. Наша мова яшчэ не перайшла гэтай мяжы, але шчыльна да яе наблізілася.

Сямён Букчын: Дзяржаўная мова - Беларусі мусіць быць адна - беларуская. Разам з тым трэба рэальна бачыць сытуацыю (з пунктаў гледжаньня сацыяльнага, грамадзкага, палітычнага, эканамічнага) і нармальна глядзець на існаваньне і распаўсюджанасьць расейскай мовы ў Беларусі, ня робячы з гэтага палітыкі, не супрацьпастаўляючы яе беларускай. Беларусь не Эстонія і ня Латвія. Калі б гэта ў свой час зразумелі нашыя палкія патрыёты, можа, мы б ня мелі таго, што маем сёньня.

Віктар Марціновіч: Тут трэба зыходзіць з таго, што колькасьць дзяржаўных моваў - паказьнік, які ў культурным і этнічным пляне ўвогуле ні на што не ўплывае. Лічбу моваў, на якіх рэальна камунікуецца народ, вызначаюць зусім іншыя, на мой пагляд, фактары. І гэтых фактараў - маса.
Вось у нас, у Беларусі, дзьве дзяржаўныя мовы. Лягічна было б, каб на гэтых дзьвюх мовах хаця б вялася ўся афіцыйная дакумэнтацыя. Так адбываецца? Не! Нават пасьля таго, як Аляксандар Лукашэнка стаў экстраным чынам разварочваць краіну ў бок ад Расеі, усе афіцыйныя дакумэнты складаюцца толькі на расейскай мове. Для таго каб улада стала дзьвюхмоўная, трэба не афіцыйная дэклярацыя дзьвюхмоўя, а зьмена складу элітаў. Вось калі ў выканаўчай вэртыкалі будуць сядзець як носьбіты «трасянкі» (гэта значыць магілёўска-гомельскія дзядзькі, якія лічаць, што гавораць па-расейску), так і прадстаўнікі Партыі БНФ ці проста нацыянальна арыентаваная інтэлігенцыя, усе законы і ўрадавыя пастановы імгненна стануць дзьвюхмоўнымі.
Аднак нават гэта не дапаможа рэальнаму ўсталяваньню дзьвюхмоўя, павелічэньню ролі беларускай мовы ў побыце. Больш за тое, калі гэта адбудзецца занадта рэзка, гэта можа адштурхнуць, напалохаць асноўную масу насельніцтва. Я ўважаў і працягваю ўважаць, што прыход у 1994 годзе да ўлады кандыдата ў прэзыдэнты, які пасьля забараніў бел-чырвона-белы сьцяг і герб «Пагоня», стаў вынікам палітыкі дынамічнага нацыянальнага Адраджэньня, якая была зразуметая і ўхваленая элітамі, але трохі напалохала значную долю «несьвядомага насельніцтва», што не належыць да племя homo politicus. Таму, вяртаючыся да пытаньня, я лічу так: у Беларусі, улічваючы яе нацыянальны склад, можна было б увесьці чатыры дзяржаўныя мовы: беларускую, расейскую, габрэйскую і арабскую. А беларускую праз пэўны час абвесьціць мовай міжнацыянальных зносінаў.
Пятро Марцаў: У прынцыпе - так. У гэтай сытуацыі, у гэты канкрэтны гістарычны пэрыяд часу - так. Зь дзьвюх прычынаў. Першая прычына: расейская мова ёсьць рабочай мовай зносінаў практычна для ўсяго насельніцтва. Беларуская мова, на жаль, такой ня ёсьць. Другая прычына: расейская мова ёсьць рабочай мовай у дзяржаўнай сфэры дзейнасьці, беларуская такой ня ёсьць. Хаця б з вышэйназваных прычынаў трэба пакінуць дзьве

дзяржаўныя мовы. Беларуская - гэта родная, нацыянальная мова, і яе неабходна захаваць. У прынцыпе, яе трэба было б разьвіваць і пашыраць, але не ў дзяржаве гэтага тыпу, ня ў гэты гістарычны пэрыяд. Тое, што яна захаваная як дзяржаўная мова, - гэтага пакуль дастаткова.

ПАВОДЛЕ
ЯКОГА
ПРЫНЦЫПУ
МУСІЦЬ
ВЫЗНАЧАЦЦА
МОВА
НАВУЧАНЬНЯ
Ў
БЕЛАРУСКАЙ
СЫСТЭМЕ
АДУКАЦЫІ?

Сьвятлана Алексіевіч: Адказваючы на пытаньне перапісу, я б таксама адказала, што мая родная мова - беларуская. Але гэта зусім не азначае, што я на ёй гавару, што я яе добра ведаю, што я магла б на ёй пісаць гэтак жа, як я пішу на расейскай. Адказы людзей, што іх родная мова беларуская - гэта спроба застацца, ня зьнікнуць у гэтым сьвеце глябалізацыі. Чалавек адчувае, што сьвет робіцца такім агромністым, а ты - такім маленькім, ты можаш ува ўсім гэтым зьнікнуць. Таму тут ёсьць элемэнт самазахаваньня, калі людзі адказваюць такім чынам на гэтае пытаньне.

Але гэта зусім не інструмэнт для палітыкаў, не інструкцыя да іх дзеяньняў, калі гэта рэальныя і цьвярозыя палітыкі, таму што я думаю, што аснова нацыянальная - яна ў нас разбураная. І адзіная для мяне праграма - што ўсё гэта трэба складаць па цаглінцы і нарошчваць, гэта павінна быць вялікая праграма. Павінны існаваць дзьве мовы, але распачатая велізарная праца, мінімум на два-тры пакаленьні, каб зь дзіцячага садку стваралася агульная атмасфэра вывучэньня роднай мовы, роднай гісторыі, але не ў радыкальных формах. З усім гэтым трэба яшчэ разабрацца. У тых кнігах зь беларускай гісторыі, якія я чытала, часам цяжка зразумець, дзе міталёгія, а дзе - рэальная гісторыя. Я мяркую, што гэта павінна быць агромністая праца, і я ўпэўненая, што ў нас ёсьць людзі, якія

ведаюць, як гэта зрабіць спакойна, бяз шашак нагала. Меркаваньне, якое было гадоў 20 таму, што ўсе праблемы мы вырашым праз мову, - гэта бясьсільле думкі, нацыянальнай у тым ліку. Мова - гэта можа быць адна з праблемаў, але гэта ня ўся праблема.

Аляксандар Фядута: Паводле прынцыпу добраахвотнасьці. Але вышэйшая адукацыя павінна ўлучаць веданьне абедзьвюх моваў, а таксама дзьвюх замежных. Прыклады Вячоркі і Баршчэўскага дэманструюць, што магчыма й большае.

Сяргей Панькоўскі: Беларускай мовай павінен свабодна валодаць выпускнік любой школы. Але валодаць і расейскай. Унутры «расейскіх» і «беларускіх» школаў суадносіны гадзінаў, натуральна, могуць быць рознымі. Колькасьць беларускіх школаў павінна расьці паступова. Для гэтага й патрэбная прадуманая і рэалістычная дзяржаўная палітыка.

Юры Дракахруст: У гэтым пытаньні павінен быць камбінаваны падыход. Базавым прынцыпам, які вызначае прапорцыю паміж беларускамоўнымі і расейскамоўнымі школамі, мусіць быць воля бацькоў, але беларуская мова павінна атрымаць пэўную, пажадана заканадаўча вызначаную фору. Скажам, суадносіны воляў бацькоў 20:80, фора - 10 %, значыць, суадносіны школаў - 30:70. Памер гэтай форы можа быць вызначаны шляхам дыскусіяў, але самую яе легітымнасьць беларускамоўныя (і разумныя расейскамоўныя) могуць адстаяць, апэлюючы ня толькі да прыніжанага стану беларускай мовы, а выкарыстоўваючы несымэтрычнасьць пазыцыяў моўных групаў, пэўны сантымэнт да беларускай мовы нават цалкам зрусіфікаваных беларусаў. Урэшце, мара пра цалкам беларускамоўную Беларусь адносна пашыраная, цалкам расейскамоўнай Беларусі ня прагне, бадай, ніхто.

Размовы кшталту «Мы таксама ня супраць беларускай мовы» мусяць быць увасобленыя ў дакладным памеры гэтай форы. Іншыя формулы, з улікам нашага славянскага мэнталітэту, будуць непазьбежна спараджаць іх палітычнае карумпаваньне. І яшчэ важны дадатак: павінна быць абсалютна выключана зьнішчэньне знакавых для той ці іншай моўнай групы навучальных установаў, такіх, як Коласаўскі ліцэй і ЭГУ.

Аляксандар Сасноў: Нічога ня зробіш, трэба пагадзіцца, каб мову навучаньня ў базавай школцы выбіралі бацькі. Але вось далей навучаньне ў сыстэме сярэдняй, спэцыяльнай ды

вышэйшай адукацыі павінна весьціся на дзьвюх дзяржаўных мовах у роўных прапорцыях. Паколькі зрабіць гэта ў адной установе амаль немагчыма, на мой погляд, павінны быць у дзяржаве асобныя адукацыйныя ўстановы зь беларускай і расейскай мовай навучаньня. Але ў кожнай пэўная частка вызначаных навук павінна выкладацца на другой мове. У якую ўстанову хто пойдзе - вызначаюць навучэнцы сумесна з бацькамі, але *не дзяржава*!

Станіслаў Багданкевіч: Прынцып выбару мовы навучаньня павінен быць адзін - добраахвотны выбар бацькоў. Беларуская дзяржава можа і павінна ў цяперашніх умовах уплываць на выбар мовы навучаньня праз стварэньне прэстыжных навучальных установаў зь беларускай мовай навучаньня і разнастайных формаў матэрыяльнага стымуляваньня.

Леанід Злотнікаў: Прынцып добраахвотнасьці. У садку ці школе, да 16-18 гадоў, гэта вырашаюць бацькі, а потым - самі навучэнцы. Патрэбна фінансавая падтрымка дзяржавы, каб гэты прынцып рэалізаваць. Напрыклад, калі ў раёне толькі адзін хоча атрымліваць навучаньне на беларускай мове, патрэбны дадатковыя сродкі, каб арганізаваць адпаведную групу на некалькі акругаў, аплаціць транспарт або пражываньне ў інтэрнаце і гэтак далей.

Леанід Заіка: Вольнае навучаньне. Выбар школаў з асноўнай мовай: беларускай, ангельскай, расейскай. Пры гэтым навучальныя праграмы могуць і не супадаць паводле аб'ёму ведаў. Звычайная сярэдняя адукацыя павінна быць варыятыўнай з пункту гледжаньня моўнай практыкі. Дзеці і іх бацькі выбіраюць самі, адукацыя ў любым моўным асяродзьдзі павінна быць бясплатнай.

Уладзімер Мацкевіч: Вядомы такі выпадак. Жыхары Новага Ёрку скардзіліся, што, калі будуюць новы хмарачос, будаўнічы пляц перапыняе рух на некалькіх вуліцах і жыцьцё ўсяго кварталу. Амаль як новабудоўлі ў сучасным Менску. Тады быў прыняты закон, які забараніў рабіць у Новым Ёрку будаўнічыя пляцы большага памеру, чым пэрымэтар падмурку будынку. Уявіце сабе такое ў Менску! Ніякіх платоў вакол новабудоўлі, ніякага бруду і сьмецьця ў навакольлі! Толькі будаўнікі скажуць: «Гэта ж немагчыма!» Так гаварылі і амэрыканскія будаўнікі. А потым распрацавалі новыя мэтады будаўніцтва знутры сьценаў. І ўсё. Таму, з пункту гледжаньня

заканадаўства, можна зрабіць вельмі проста: «Усё навучаньне ажыццяўляецца на беларускай мове ў школах усіх узроўняў, акрамя школаў нацыянальных меншасьцяў». І зь цягам часу будуць распрацаваны падручнікі, напісаны мэтадычкі, распрацавана тэрміналёгія, усе навучацца свабодна гаварыць. Толькі ня трэба сьпяшацца. Але перад гэтым патрабуецца некалькі гадоў інтэнсіўнага піяру. Гэта не пытаньне мэтадычак і падручнікаў, не пытаньне заканадаўства. Гэта праблема PR, праблема гуманітарных тэхналёгіяў. А ў гэтай галіне ні беларускія палітыкі, ні навукоўцы-адраджэнцы, ні настаўнікі не адукаваныя. Прапаную ўсім вучыцца.

Сямён Букчын: Сыстэма адукацыі павінна адпавядаць нацыянальна-дзяржаўным інтарэсам Беларусі, гэта значыць улічваць рэальную сытуацыю. Я не спэцыяліст у гэтай галіне, але перакананы, што веданьне, вывучэньне беларускай мовы, літаратуры, культуры (як і іншай нацыянальнай) ня толькі ня можа камусьці зашкодзіць, наадварот - пашырае сьвет асобы. Глыбіня гэтага вывучэньня (навучаньня на нацыянальнай мове) павінна зыходзіць зноў-такі з той самай рэальнай сытуацыі. Агульны прынцып мусіць быць такі: абавязковая дзяржаўная падтрымка нацыянальных праграмаў, скіраваных на разьвіцьцё «беларускай справы» (культуры, беларускасьці), але без прымусу тых, хто жадаў бы засвойваць беларускае бяз пэўнай заглыбленасьці. І яшчэ. Ня трэба спрашчаць сытуацыю і дзяліць усіх на «тытульную нацыю» і нацыянальныя меншасьці, якім справядлівая і гуманная ўлада гатовая «пайсьці насустрач». У Беларусі нямала «прамежкавых людзей» (тэрмін трохі крыўдны, але прымем як умоўны і ня будзем чапляцца, так?), да таго ж і сярод карэнных беларусаў. Ня трэба сьпяшацца ўсіх заганяць у нацыянальныя меншасьці, якія для кагосьці выглядаюць як пэўнае гета. Ня трэба думаць, што калі расейцы тут аб'яднаюцца (а гэтага прагнулі аўтары «ЛІМу» на пачатку 90-х, прыкладам, этноляг Павал Церашковіч), дык гэта будзе «нармалёвая» нацыянальная арганізацыя, існаваньне якой будзе сьведчыць пра тое, што яны менавіта пачуваюцца тут як меншасьць і тым самым заспакойваюць нацыянальнае самаадчуваньне хваравітых на нацыянальную недасьпеласьць беларусаў. Хутчэй за ўсё, гэта будзе чарговы «Славянскі сабор».

Віктар Марціновіч: Тут я прыхільнік клясычнага падыходу, паводле якога тэхнічныя навукі варта было б выкладаць па-

расейску (у тым выпадку, вядома, калі выкладнік не якісьці там унікум і не валодае беларускай тэхнічнай лепей, чымся расейскай тэхнічнай), гуманітарныя - па-беларуску. Выняткам у гуманітарных навуках маглі б быць расейская мова і літаратура. Што да расейскай мовы - гэта агульнапрыняты падыход. Усе паважныя школы ангельскай ува ўсім сьвеце (International house, напрыклад) выкладаюць ангельскую менавіта па-ангельску. Што да расейскай літаратуры, выкладаньне яе па-расейску магло б быць часовай і кампраміснай мерай. Выкладаць яе па-расейску мэтазгодна да таго часу, пакуль ня ўзьнікне істотны масіў твораў расейскай літаратуры, карэктна і прыгожа перакладзеных на беларускую (я перакананы, што ў дадзены момант такога масіву не існуе). Тут трэба дадаць, што ў шэрагу ісьцінна гуманітарных ВНУ ключавыя прадметы яшчэ з савецкіх часоў выкладаюцца па-беларуску. У Акадэміі мастацтваў, напрыклад - на маё суб'ектыўнае адчуваньне, - больш беларускамоўных выкладчыкаў, чым расейскамоўных. Вось чаму, дарэчы, спаміж жывапісцаў, графікаў і дызайнэраў Беларусі шмат людзей, якія карыстаюцца беларускаю мовай у побыце. Тое, што традыцыі беларушчыны ў Акадэміі падтрымліваюцца спакон вякоў, без скачкоў і рыўкоў, уласьцівых пачатку 90-х, наўпрост уплывае на якасьць мовы, носьбітамі якой ёсьць выкладнікі гэтай ВНУ. Яна - мэлядычная, прыгожая, без русізмаў і элемэнтаў «трасянкі».

Пятро Марцаў: Па-мойму, толькі паводле волевыяўленьня грамадзянаў. Гэта значыць - хочуць вучыцца па-расейску - павінны мець магчымасьць вучыцца па-расейску, хочуць вучыцца па-беларуску - павінны вучыцца па-беларуску. Так павінна быць, але гэта ня так цяпер. Так, як цяпер, - няправільна.

Зь іншага боку, немагчыма прымушаць народ вучыцца на роднай мове. Тут трэба дзейнічаць паступова, акуратна. У пачатку 90-х гадоў была памылковая дэманстрацыя, і гэта выклікала адчужэньне грамадзтва. Нацыянальна арыентаваныя палітыкі ня хочуць гэтага прызнаваць, але гэта так.

Нават роднай мове гвалтам навучаць нельга. З прыходам нацыянальнай самасьвядомасьці прыходзіць і сьвядомасьць таго, што трэба ведаць родную мову. Але без прыходу гэтай самасьвядомасьці, у загадным парадку дзяржава - якая б яна ні

была, ці лібэральная, ці «сацыяльна-арыентаваная», як у нас цяпер, - ня можа гэтага зрабіць. Гэта вельмі тонкая матэрыя.

ЦІ ВЫШЭЙШАЯ РАСЕЙСКАЯ КУЛЬТУРА ЗА БЕЛАРУСКУЮ?

Сьвятлана Алексіевіч: Што тычыцца мяне, то я пішу гісторыю ўтопіі: маленькі чалавек і вялікая ўтопія. Гэтыя сто гадоў савецкай гісторыі, савецка-расейскай, калі хочаце - савецка-беларускай. А мова ўтопіі - гэта расейская мова, гэта відавочна. Вось чаму ў мяне расейская мова. Нейкія рэчы, якія я рабіла, напрыклад Чарнобыль ці нават вайна, я, магчыма, і не змагла б зрабіць без усясьветнага досьведу філязофскай думкі пра вайну без касмаганічнага досьведу расейскай культуры і філязофіі я не змагла б пісаць пра Чарнобыль, наўрад ці я б здолела. А магчыма, я проста ня ведаю глыбока беларускую культуру, не жыву толькі ў ёй.

Я думаю, што, з аднаго боку, геаграфія абмяжоўвае сёньняшняга чалавека, але, зь іншага боку, яна патрэбная яму, каб ён наагул не апынуўся ў беспаветранай прасторы. Аднак Чарнобыль навучыў мяне, што ты існуеш геаграфічна тут, але ты яшчэ існуеш і нідзе. Гэта відавочна, калі вы наведаеце Чарнобыль, калі вы шмат аб гэтым думаеце, калі вы думаеце пра будучыню. Сёньня зразумела, што чалавек існуе ў зусім іншай прасторы.

Мне не падабаецца сама пастаноўка гэтага вашага пытаньня. Чаму? Таму што я адчуваю ў ім радыкалізм 20-гадовай даўніны, калі я чула выступ Пазьняка, які казаў: «Крымінальнікі не гавораць па-беларуску, камуністы не гавораць па-беларуску». І ўся заля паўстала ў адзіным парыве, а я адзіная, здаецца, засталася сядзець і не магла падзяліць гэты энтузіязм. Я была ўпэўненая, што бандыты і камуністы гавораць на ўсіх мовах сьвету. І гэты ідэалізм і рамантызм я ніколі не магла падзяліць. Я не магу ўявіць сабе такую пастаноўку пытаньня. Вось, скажам, даволі складаныя адносіны маюць Японія і Кітай. Японцы маюць пэўны комплекс непаўнавартасьці перад старажытнай кітайскай культурай, яны

разумеюць, што яны - нацыя выканаўцаў, увасабляльнікаў чужых ідэяў, нацыя-машына. Але і кітайскага, і японскага інтэлектуала зьдзівіла б пытаньне: ці вышэйшая кітайская культура? Гэта ня тое што некарэктна, гэта недакладна, гэта вядзе нас убок ад таго, што з намі адбываецца. У чалавецтва адбываецца крызыс сьветапогляду, і ён адбываецца не на ўзроўні мовы, а на значна больш глыбокім узроўні.
Аляксандар Фядута: Не кажэце глупстваў! Такая пастаноўка пытаньня магчымая хіба на сэсіі Гомельскага аблсавету пры адказе на запыт, колькі будуць чакаць прапановы таварыша Сапегі. Цяпер вы яшчэ спытаеце ў мяне, як суадносяцца польская і кітайская культуры. У нас проста прынцыпова розная культурная храналёгія. У той час, калі ў расейскай паэзіі быў Андрэй Белы, Цётка і Колас яшчэ насьледавалі маладому Някрасаву. Пяцьдзясят гадоў розьніцы. Вінцуку Дуніну-Марцінкевічу да Баратынскага зь Цютчавым таксама - пяцьдзясят гадоў у культурным пляне, ён жа яшчэ архаічнейшы. А ад Францыі мы адсталі яшчэ на большы тэрмін. Але гэта нічога не азначае. Як у свой час малады Багдановіч, так цяпер малады Хадановіч дэманструюць, што магчымыя й прарывы ў іншыя культурныя вымярэньні.
Сяргей Панькоўскі: Гэта псэўдапраблема. Свой дом ёсьць свой дом. Што з таго, што ў іншым больш ці менш пакояў?
Юры Дракахруст: Відаць, усе памятаюць фразу Аляксандра Лукашэнкі, сказаную ў 1994 годзе пры прызначэньні гомельскага «вэртыкальшчыка»: «На беларускай мове нельга стварыць нічога вялікага. Вялікае творыцца толькі на расейскай і ангельскай мовах». Мала хто памятае (і наагул ведае) забаўны працяг гэтага сюжэту. Неўзабаве пасьля Гомелю Лукашэнка прызначаў Уладзімера Ярмошына менскім «вэртыкальным». Падчас абмеркаваньня ў Менскім гарсавеце нейкі дасьціпны дэпутат працытаваў гомельскі «пэрл», не называючы аўтара, і папрасіў кандыдата на гарадзкога галаву яго пракамэнтаваць. Ярмошын, звычайны, нармальны беларускі гаспадарнік, бясконца далёкі ад палітычных і моўных жарсьцяў, адрэагаваў імгненна: «Што за лухта? Які дурань гэта сказаў?» Заля лягла ад рогату, Ярмошын, адчуўшы, што сказаў нешта ня тое, але ня ведаючы, што менавіта, бездапаможна паглядзеў на Лукашэнку. Той, зразумеўшы, што чыста прайграў, таксама скрывіў вусны ўва ўсьмешцы.

Адказваючы па сутнасьці пытаньня, відаць, больш карэктна казаць пра параўнальную моц культураў. Тут, зразумела, сумневу быць ня можа - пра пагрозу расейскай культуры (менавіта культуры як такой, а ня толькі русіфікатарскай палітыкі ўладаў) у Беларусі можна пачуць даволі часта. У Расеі на пагрозу тамтэйшай identity з боку беларускай культуры чамусьці ня скардзяцца. Але сутнасьць справы ў тым, што сама сабою моц расейскай культуры насамрэч ня ёсьць фактарам, які нешта ў культурных суадносінах перадвызначае, бо беларуская культура гаворыць беларусам пра іх саміх і пра сьвет нешта такое, чаго не гаворыць ніводная іншая, у тым ліку магутная і блізкая расейская.

Аляксандар Сасноў: Што бы засталося ад расейскай культуры безь беларускай? Нешта б, безумоўна, засталося, але зусім ня тое, як сёньня. Гістарычна атрымалася, што сёньня расейская культура ёсьць агромністы канглямэрат з культур усіх народаў, што складалі імпэрыю. Таму яна *шмат багацейшая* за культуры яе складальнікаў. Але і ў кожным з складальнікаў ёсьць такія *здабыткі культурнай вышыні*, якія нікім не дасягальныя. Таму параўнаньне наконт «вышэйшасьці» некарэктнае.

Станіслаў Багданкевіч: Я лічу некарэктнай такую пастаноўку пытаньня. Кожны народ мае пэўную ўнікальнасьць. Любая нацыя павінна шанаваць уласныя культурныя каштоўнасьці, не адмаўляючыся ад сусьветных, улучна з расейскімі.

Леанід Злотнікаў: З падручнікаў сацыяльнай псыхалёгіі альбо этнапсыхалёгіі вядома, што ў кожнай краіне «просты» народ лічыць сябе вышэйшым за суседзяў. Тыя заўжды гультаі, п'яніцы, не такія працаздольныя, разумныя альбо чульлівыя. Але ж адукаваная частка насельніцтва ведае, што на падобнае пытаньне навука ўжо адказала: няма народаў вышэйшых ці ніжэйшых, проста ёсьць розныя культуры.

Каб прывесьці паказьнікі культуры да адной роўнасьці, давялося б зводзіць у адзіны паказьнік каштоўнасьці народаў, што навука ўвогуле рабіць адмаўляецца. Напрыклад, навука ня здольная адказаць на пытаньне: што лепш - жыць трыццаць гадоў і карміцца жывой крывёю альбо жыць трыста гадоў і есьці падла? А калі такое пытаньне і ставяць невукі, то з гэтага нічога добрага не адбываецца. Успомнім Гітлера.

Леанід Заіка: Адказы на гэтыя пытаньні можна знайсьці ў Адольфа Шыкльгрубэра. У 30-я гады мінулага стагодзьдзя ў

краіне, для паездкі ў якую ў верасьні 2004 году выстройваюцца на сотні мэтраў чэргі па візы, праходзілі цікавыя дыскусіі што да прапанаванага прадмету. Скончыліся яны канцэнтрацыйнымі лягерамі і гетамі. Відаць, цяпер мы зь дзіўнай настойлівасьцю спрабуем паўтарыць тое самае, нават пэрсаналіі палітычныя кангруэнтна самаідэнтыфікаваліся. Жаданьне фармуляваць такія пытаньні, магчыма, ёсьць рэакцыяй на паступовае пагружэньне краіны ў балотны стан, які арганізавалі цяперашнія палітыкі, як з боку ўлады, так і з боку часткі апазыцыі.

Уладзімер Мацкевіч: Параўнаньне культураў па «вышыні» разьвіцьця, як і параўнаньне такім жа чынам расаў, разглядаецца ў шляхетным асяродзьдзі як дурны тон яшчэ з часоў панаваньня структуралізму 30-х гадоў. Вось толькі канкурэнцыю і барацьбу за выжываньне ніхто забараніць ня зможа. Расейская культура - наш галоўны канкурэнт ува ўсіх «экалягічных нішах». Час ад часу барацьба ідзе на вынішчэньне. «Арэал» існаваньня беларускай культуры значна звузіўся пад ціскам канкурэнтаў. Але ж яна захавала жыцьцяздольнасьць, і гадоў 15-20 таму пачалася адваротная тэндэнцыя. Мы памалу-паціху «адваёўваем» здадзеныя раней пазыцыі. Бог дасьць, і мы пераможам!

Сямён Букчын: Ваша пытаньне - досыць наіўная правакацыя. «Вышэйшая культура» - гэта ж той самы расісцкі падыход. Ад «вышэйшай культуры» да «вышэйшай расы» недалёка... Чаму ня ўжыць выраз «больш пашыраная», «больш вядомая ў сьвеце»? Але тады - бо гэта відавочна - зьнікае праблема для спрэчкі і магчымасьць яшчэ раз закляйміць «імпэрыю». Панове з «ARCHE»! Досыць ужо правакаваць і камплексаваць! Кіньце гэты нацыянальны ананізм! Вы ж эўрапейцы! Вышэй галаву! Тады, дарэчы, і спрэчкі нашыя будуць цікавейшыя, бо сапраўды ёсьць пра што пагаварыць.

Віктар Марціновіч: Крый божа, не. Такая пастаноўка пытаньня была б шавінізмам. Увогуле, як чалавек, што дасьледаваў у сваёй дысэртацыі Віцебскую школу ў мастацтве, гэта значыць, фактычна як ня толькі журналіст, але і культуроляг, магу сказаць, што ў самім вашым пытаньні ёсьць элемэнт правакацыі. Адна культура ня можа быць вышэйшай за іншую. Проста, у выніку аб'ектыўных прычынаў, адныя культуры становяцца слабейшыя, іншыя - мацнейшыя. Часам моцныя

асымілююць слабыя. Але гэта зусім ня значыць, што культура індзейцаў, асыміляваных выхадцамі з Старога Сьвету, якія цяпер называюць сябе амэрыканцамі, ніжэйшая за культуру ЗША, якую мне ўвогуле цяжкавата вызначыць як цэласную зьяву. Проста часам (і часьцей за ўсё) фактарам асыміляцыі зьяўляюцца ня больш мэлядычныя сьпевы, ня больш выкшталцоны жывапіс, а гарматы і танкі - большая ў разы вайсковая магутнасьць. А таму нават пра слабасьць культураў гаварыць некарэктна, бо слабасьць культуры часта вызначаецца геапалітычнымі раскладамі, на якія ні паэты, ні мастакі ніяк паўплываць ня могуць. Больш за тое, чым больш часу цывілізацыя аддае ўдасканаленьню культуры, чым далей яна апынаецца ад надзённых праблемаў рэгіёну, тым хутчэй яна апынецца пад чыім-небудзь палітычным уплывам. Літаратурная традыцыя, носьбітам якой быў Уладзімер Караткевіч, не вышэйшая і не ніжэйшая за тую, якую прадстаўляе Ўмбэрта Эка. Яны проста цалкам розныя. Жывапіс Шчамялёва не вышэйшы і не ніжэйшы за жывапіс Вольгі Зікеевай. А паспрабуйце сказаць камусьці на канцэрце «Троіцы», што яны ніжэйшыя за Пелагею! Вы пачуеце масу аргумэнтаў на карысьць таго, што не, не ніжэйшыя, а нашмат-нашмат вышэйшыя (але і гэтыя сьцьверджаньні будуць з гледзішча культуралёгіі правакацыйнымі).

Пятро Марцаў: Гэта некарэктнае пытаньне. Культура можа быць старажытнейшая, культура можа быць шырэйшая, ярчэйшая, але яна ня можа быць вышэйшая ці ніжэйшая, лепшая ці горшая. Тым больш што калі казаць пра карані беларускай культуры, дык яна, можа, і старэйшая. Тое, што расейская культура - вялікая культура, ніхто адмаўляць ня будзе, і ўплыў яе на беларускае грамадзтва відавочны. Беларуская культура - гэта эўрапейская культура, у расейскай культуры больш, скажам так, азіяцкіх матываў. Хаця, у прынцыпе, стараславянскія вытокі - адны і тыя ж.

ЦІ ВІТАЕЦЕ
ВЫ
АБМЕЖАВАНЬНЕ
Ў
ІНФАРМАЦЫЙНАЙ
ПРАСТОРЫ
РАСЕЙСКАГА

ЎПЛЫВУ?

Сьвятлана Алексіевіч: Я нядаўна размаўляла з адным беларускім пісьменьнікам, які, ня любячы нашу сёньняшнюю ўладу, вітаў сам гэты факт абмежаваньня. Яму здавалася, што тады мы будзем больш беларускімі, чым цяпер, ня будуць размывацца некаторыя рэчы, як яму ўяўлялася. Гэта глыбокая аблуда, погляд чалавека, які хоча стварыць карціну сьвету, не выходзячы з уласнага дому. Гэта немагчыма. Мы жывём у велізарным, пахіленым сьвеце, які трашчыць па ўсіх швох. Чалавек ідзе па шляху самазьнішчэньня, і стаіць лямант. А ўжо на якой мове людзі крычаць пра паратунак, гэта зусім няважна. Я ўпэўненая, што калі б у нас цяпер увялі два амэрыканскія тэлеканалы, усе б успрынялі гэта станоўча. Людзям бы здалося, што гэта - акно ў сьвет. А Расея - гэта наша сапраўднае акно ў сьвет. У мяне ўжо выдадзена больш за 100 кніг на розных мовах, я аб'езьдзіла ўвесь сьвет. Людзі, якія ведаюць беларускую мову, перакладчыкі, ёсьць толькі ў нашым маленькім атачэньні - былым СССР, Чэхіі, Польшчы. Але не далей. Менавіта расейская мова - наша акно ў сьвет. Маса людзей і разуменьня ня мае, дзе гэта Беларусь, для іх гэта ўсё роўна Расея. Украіна яшчэ неяк ёсьць у сьвядомасьці людзей, а Беларусі зусім няма.

Таму ўсе гэтыя абмежаваньні робяць нас яшчэ меншымі, чым мы ёсьць. Я ня ведаю, але мне здаецца, што чым болей вокнаў у сьвет, тым болей шанцаў у нацыі ўратавацца. Нават у момант, калі яна настолькі хворая і слабая і нам здаецца, што, калі мы закрыем усе вокны, мы ачуняем. Хворы ляжыць - і трэба ўсе вокны зачыніць. Ды няпраўда гэта. Наадварот, трэба расчыніць усе вокны.

Аляксандар Фядута: Не. Абмежавалі расейскае тэлебачаньне - атрымалі «зімоўскае» тэлебачаньне. Яно якасна горшае і абсалютна не інфармацыйнае. Я лічу, што польскае, нямецкае і ангельскае тэлебачаньне таксама варта было б глядзець. І любое іншае. Так ёсьць у любым эўрапейскім гатэлі, што ў Чэхіі, што ў Нямеччыне. Я б і «Аль-Джазіру» ўлучыў у сьпіс каналаў, трансьляваных хаця б праз кабэльныя сеткі. А то летась месяц пражыў у Кіеве, паглядзеў на тамтэйшыя тэлеканалы і ледзь не звар'яцеў ад суцэльнага КВК - ажно да кубку Падолу. А мы што, «Запрашаем на вячоркі» тыражаваць

па каналах будзем - ці як?
Сяргей Панькоўскі: У XXI стагодзьдзі альтэрнатывы трэба не выключаць, а вучыцца, калі хочаце, палемізаваць зь імі. Часткова інтэграваць іх, вучыцца фармуляваць і процістаўляць сваю пазыцыю. Але зноў-такі ў рэжыме дыялёгу, а не варожасьці. Тэхналягічна сьвет робіцца ўсё больш адзіным. Адмежавацца ад яго і замкнуцца ў нейкай гермэтычнай сфэры безь вялізных стратаў немагчыма.
Юры Дракахруст: Не вітаю. У цяперашняй канкрэтнай сытуацыі гэты ўплыў для вялікай масы беларусаў - ці не адзіная крыніца альтэрнатыўнай інфармацыі. Якасьць гэтай інфармацыі за апошнія гады відавочна пагоршылася, тэндэнцыйнасьць узмацнілася, але сама празь сябе наяўнасьць такой альтэрнатывы - нейкая перашкода манаполіі айчынных сродкаў масавай маніпуляцыі. Вітаць падобнае абмежаваньне - усё роўна што ў савецкія часы было вітаць глушэньне «падрыўных» радыёстанцыяў.
Але ёсьць, зразумела, і больш шырокі кантэкст пытаньня. Добра, цяпер становішча такое, а заўтра, у дэмакратычнай Беларусі, стане іншым. Як тады? А тут ужо пытаньне веры ў здольнасьць, у тым ліку і канкурэнтаздольнасьць, нацыянальнай журналістыкі і культуры. На мой погляд, па-першае, цяплічныя ўмовы, забясьпечаныя дзяржаўнай аховай ад замежных канкурэнтаў, ня пойдуць ім на карысьць, а па-другое, нацыянальныя, «мясцовыя» мэдыі (як і культура) маюць стартавую перавагу перад замежным, нават самым лепшым канкурэнтам: людзям цікава слухаць і ведаць пра сваё.
Аляксандар Сасноў: Я супраць таго, што беларускія дзяржаўныя інфармацыйныя каналы на 99 % зьяўляюцца расейскамоўнымі. Я за тое, каб абедзьве дзяржаўныя мовы мелі аднолькавы ўплыў на грамадзтва. Але гэта павінен быць не *расейскі*, а менавіта *беларускі* ўплыў.
Што тычыцца расейскіх каналаў інфармацыі, а таксама польскіх, украінскіх ды іншых, яны могуць мець магчымасьць прысутнічаць у беларускай інфармацыйнай прасторы, але не дамінаваць у ёй.
Станіслаў Багданкевіч: Я выступаю супраць якіх-кольвек адміністрацыйных абмежаваньняў распаўсюджваньня інфармацыі, у тым ліку і той, якая зыходзіць з Расеі. Зразумела, перадусім беларускаму народу павінны быць забясьпечаныя ўсе

асабістыя і грамадзянскія правы і свабоды. Павінна быць гарантаванае дэ-юрэ і дэ-факта права на выказваньне ўласнай пазыцыі, свабоднае атрыманьне і распаўсюджваньне інфармацыі, выкарыстаньне тэлебачаньня, радыё, газэтаў і часопісаў ды інш.

Леанід Злотнікаў: Не, не вітаю. Я не прыхільнік таталітарнай ідэалёгіі і не магу ўзяць на сябе ролю Госпада Бога, ролю вышэйшай інстанцыі, якая ведае, як каму жыць і на якой мове гаварыць. Таму кожны мае права выбіраць той канал, які яму падабаецца. Другая справа, што тут выбар малы. У цывілізаваных краінах чалавек мае выбар зь дзясяткаў і сотняў каналаў тэлебачаньня і радыё з усяго сьвету. Патрэбна, каб і ў Беларусі было так.

Леанід Заіка: Пасьля Сталіна і Брэжнева мы павінны разумець, што свабода распаўсюджаньня інфармацыі ёсьць правам чалавека і асновай свабоднага разьвіцьця грамадзтва. Ніколі не лічыў, што ў нас шмат інфармацыі і ўплыву іншых краін. Наадварот, мы пакуль знаходзімся ўва ўбогім становішчы. Калі я жыў у ЗША, то першыя дні цяжка было выбіраць з 90 каналаў ТБ, якія трансьляваліся ў маіх апартамэнтах. Вярнуўся ў Менск - і быў шакаваны 5 каналамі нашага тэлебачаньня. Першае ўражаньне - Беларусь жыве ў пячорны час. Да таго часу, пакуль ня будзе тры-чатыры дзясяткі каналаў (эўрапейскіх, азіяцкіх, расейскіх), гаварыць пра свабоду інфармацыі проста няма падставаў. Калі цяпер абмяжоўваюць расейскія каналы, то гэта азначае вяртаньне да сталінскіх часоў. Нават не да брэжнеўскіх.

Уладзімер Мацкевіч: Так. Але ў залежнасьці ад таго, якім чынам. Я не прыхільнік меркаваньня, што ўсе сродкі добрыя. Ня трэба забаронаў і гвалту. Патрэбна паступовае замяшчэньне расейскіх крыніцаў ды сродкаў інфармацыі сваімі, раўнавартаснымі ці лепшымі. Гэта цалкам магчыма, толькі не ўвадначас.

Сямён Букчын: Ну вось! Ізноў замыкаецца вядомае кола. На пачатку 90-х дэпутат Цумараў разам зь іншымі з фракцыі БНФ патрабаваў пазбавіць Беларусь ад расейскага інфармацыйнага ўплыву. Сёньня мы бачым, як гэта пасьпяхова робіць лукашэнкаўскі рэжым. Якія ж вы нудныя, каб не сказаць «прымітыўныя», хлопцы - што дыктатары, што нацыяналісты! Нават эўрапейскага кшталту... Адно ў вас - абмежаваць! Ну

абмяжуйце! Ну пастаўце агароджу да нябёсаў! І Інтэрнэт толькі для «нацыянальнага правадыра», як у Паўночнай Карэі. І так вам утульна, цёпленька будзе ў сваім балоце...

Віктар Марціновіч: Так, я цалкам вітаю гэта як ідэю. Але я супраць таго, як гэта рэалізаванае ў Беларусі. Я быў сталым гледачом каналу «Культура» і проста не разумею, што такое канал «Лад» - два чалавекі, якія сядзяць у нязграбнай студыі ды дзень і ноч абмяркоўваюць праблемы, якія хвалююць толькі іх. Абмежаваньне расейскага ўплыву ў інфармацыйнай прасторы было б дамэтным, калі б яно кампэнсавалася забесьпячэньнем гледача якасным нацыянальным прадуктам. А для гэтага трэба мяняць падыходы да тэлебачаньня, ператварыць яго з сродку чыстай прапаганды хаця б у сродак інфармаваньня, забаўляньня і прапаганды.

Пятро Марцаў: Увогуле - так, але залежыць, у які спосаб. Гэта пытаньне ўзмацненьня ўплыву беларускіх СМІ, а ня проста замяшчэньня ці перакрыцьця расейскіх. Трэба разьвіваць уласныя каналы. Разьвіцьцё добрых беларускіх СМІ - гэта і ёсьць, на маю думку, абмежаваньне расейскага інфармацыйнага ўплыву. Простае перакрыцьцё расейскіх СМІ нічога не дае. Гэтага я не вітаю.

ЦІ БУДЗЕ
БЕЛАРУСКАЯ
ІНТЭГРАЦЫЯ
З
ЭЎРАЗЬВЯЗАМ
АЗНАЧАЦЬ
АДНАЧАСОВА
«ПРЭЧ АД
РАСЕІ»?

Сьвятлана Алексіевіч: Я не палітык, але жыцьцё мяне выцягвае на вуліцу і палітычнае чуцьцё хоцькі-няхоцькі фармуецца, таму што, на жаль, немагчыма сёньня ў нас пісьменьніку ня быць палітыкам. Я думаю, гэты шанец - быць асобна ад Расеі ў Эўропе - мы прапусьцілі. Была калісьці ідэя Чарнаморска-балтыйскага саюзу, мы маглі апынуцца разам з Прыбалтыкай, хоць у нас і не было таго народу, з той самасьвядомасьцю, тымі чаканьнямі і тымі надзеямі. Мы заўсёды былі зьвернутыя да Расеі. Я памятаю, як я спытала

суседку на лесьвічнай пляцоўцы: «За што вы будзеце галасаваць на рэфэрэндуме пра адносіны з Расеяй?» Яна паглядзела на мяне як на вар'ятку. Для гэтай простай жанчыны нават пытаньня такога не існавала.

Я мяркую, што сёньня сьвет жорсткі і прагматычны. І здаецца, што Эўропа ўжо даўно саступіла Беларусь Расеі, як зону ўплыву, і не выпадае разьлічваць, што нешта ў блізкім часе памяняецца, тым больш што Расея сёньня гэтак зацята ахоўвае свае межы, у тым ліку і межы ўплыву. Паглядзеце, як яна ня хоча сыходзіць з Каўказу, хаця зусім відавочна, што ёй давядзецца сысьці. Так што зь Беларусі яна дакладна ня сыдзе, і ўва Ўкраіне невядома, чым усё скончыцца. Так што ўсе размовы пра нашае ўваходжаньне ў Эўропу, дзе, я абсалютна ўпэўненая, нас ніхто не чакае… Ды і з чым мы прыйдзем туды? Сёньня гэта жорсткі рынак, перш за ўсё. Гэта, калі хочаце, і культурны рынак, і эканамічны рынак. Мы вельмі шмат часу страцілі. І я ня думаю, што трэба быць настолькі няшчырымі перад самімі сабой, ашукваць сябе. Ну колькі можна прыдумляць? То народ прыдумляем, то інтэлігенцыю прыдумляем - усё маем справу з улюбёнымі ідэямі, а не з рэчаіснасьцю. Я ўпэўненая, што мы ўжо зьвязаныя з Расеяй настолькі шчыльна, што наўрад ці зможам ад яе адарвацца. Я не кажу, добра гэта ці кепска. Калі б Беларусь магла стацца такой маленькай буфэрнай дзяржавай паміж Эўропай і Расеяй - магчыма, гэта быў бы яе шанец. Але няма ў нас такіх Гарчаковых, дальнабачных, разумных палітыкаў, мы страцілі гэтыя 20 гадоў. Зразумела, мы будзем у гэтай зьвязцы вельмі доўга. Рэч ня ў тым, што з гэтым трэба зьмірыцца, гэта трэба прызнаць як факт і неяк асвойваць гэтую прастору. Колькі ж можна жыць асобна ад рэчаіснасьці, чым мы займаемся апошнія 20 гадоў.

Аляксандар Фядута: Не. Гэта нявыгадна Эўрапейскаму Зьвязу. Прабачце, мы й за Лукашэнкам каменем ляжым на шляху з Азіі ў Эўропу, а вы хочаце яшчэ й фортку зачыніць? А жыць за кошт чаго? Мы ж транзытная дзяржава, а значыць, нам трэба быць адкрытымі ўсім эканамічным вятрам, адкуль бы яны ні падзьмулі.

Сяргей Панькоўскі: А навошта? Хіба «сябраваць» можна толькі «супраць»?

Юры Дракахруст: Калі «прэч» замяніць на «менш», то ў пэўнай

ступені гэта, зразумела, непазьбежна. Калі доля Захаду ў замежным гандлі Беларусі будзе павялічвацца (а гэта - адна з формаў інтэграцыі), то доля Расеі непазьбежным чынам будзе памяншацца. Калі беларуская ўладная эліта стане шчыльна кантактаваць з эўрапейскай, то гэта само празь сябе будзе, прынамсі, зьмяншаць манапольны характар уплыву на Беларусь маскоўскай эліты. Тое ж тычыцца і культурнай, адукацыйнай і іншых сфэраў: Масква застанецца для Беларусі «магнітам», магчыма, самым моцным, але стане «першым сярод роўных», «магнітам праз коску»: Масква, Брусэль, Вашынгтон, Бэрлін, Варшава, Кіеў і гэтак далей.

З другога боку, такога жорсткага падзелу, які існуе ў ідэалягічных студыях, у прыродзе не назіраецца. Скажам, шмат для якіх беларускіх бізнэсоўцаў, кампутаршчыкаў, прадстаўнікоў іншых «прасунутых» катэгорыяў насельніцтва шлях у Эўропу пралягае менавіта праз Маскву, праз расейскія сувязі з той самай Эўропаю.

Што ж тычыцца натуральнага «прэч», гэта значыць ператварэньня «магніта» ў аб'ект адштурхоўваньня, то гэта наўрад ці здарыцца. Наадварот, падаецца, што разумная беларуская эліта, калі яна сапраўды хоча прывесьці сваю краіну ў Эўропу, павінна ўсяляк пазьбягаць ставіць свой народ перад жорсткай дылемай: «ці - ці». Ня трэба пытаць, бо ён адкажа і «эўрапейцам любой цаной» мала не падасца.

На сёньня праблема выглядае амаль неактуальнай: Беларусь мае настолькі кепскія адносіны з Эўропай, што існуе велізарнае поле такога іх паляпшэньня, якое аніяк не закранае адносінаў з Расеяй. Але гэта, зразумела, ня значыць, што так будзе заўсёды. І вось тады ад беларускай эліты спатрэбіцца высокае палітычнае мастацтва (якім яна, на жаль, зусім не вызначаецца).

Можна, дарэчы, сфармуляваць зусім амбіцыйны праект для будучай дэмакратычнай Беларусі: прывесьці з сабой у Эўропу свайго няўрымсьлівага і непрадказальнага «старэйшага брата». Гэта сапраўды магло б стаць вялікай усясьветнай місіяй беларусаў, у параўнаньні зь якой і нехлямяжая саюзная дзяржава, і цяперашні калгасны ізаляцыянізм, і нават панылае самотнае стаяньне ў чарзе ля дзьвярэй Эўразьвязу - другі гатунак. Але гэта - тэма асобнай размовы.

Аляксандар Сасноў: Ня думаю. Інтэграцыя ў Эўразьвяз

вызначаецца праяўленьнем у гэтай частцы сусьвету ўсёплянэтнай глябалізацыі, супраць якой могуць выступаць толькі дылетанты ды прайдзісьветы. Можна лічыць, што і адносіны з Расеяй сёньня таксама зьвязаны з гэтай тэндэнцыяй. Таму пашырэньне адносін з Эўропай будзе азначаць павышэньне магчымасьцяў насельніцтва Беларусі палепшыць сваё жыцьцё (ня толькі ў матэрыяльным сэнсе!), паколькі моцныя адносіны з Расеяй ужо існуюць. Але пры пашырэньні сувязяў з Эўропай адбудзецца пэўны перагляд зьместу адносінаў з Расеяй. Замест ваенна-палітычных і геастратэгічных напрамкаў супрацоўніцтва ўжо ня толькі на справе, але і на ідэалягічным узроўні першынство будзе за эканамічнымі і культурнымі адносінамі. У гэтым сэнсе можна казаць аб значным выхадзе з расейскага імпэрскага мэнталітэту. Можна лічыць гэта сэнтэнцыяй «Прэч ад Расеі»? Ня ведаю. Лепей сказаць: «Прэч ад імпэрскага цемрашальства!»

Станіслаў Багданкевіч: Ня будзе. Беларусь - эўрапейская краіна. У цяперашніх умовах у выпадку неадкладнага далучэньня Беларусі да Расеі альбо да Эўрапейскага Зьвязу яна магла б стаць толькі адсталым краем альбо Расеі, альбо ЭЗ. Ніхто, ні Расея, ні ЭЗ, ня вырашыць за нас праблемаў аднаўленьня дэмакратыі і стварэньня эфэктыўнай рынкавай эканомікі. Беларусь самастойна павінна прыйсьці да дэмакратыі, датрыманьня правоў і свабодаў чалавека, пабудаваць рынкавую эканоміку. Я мяркую, на гэта пойдзе да дзесяці-пятнаццаці гадоў. Пасьля гэтага ёй з поўным правам будзе належаць годнае месца ў аб'яднанай Эўропе. Мяркую, і Расея зь цягам часу прыме эўрапейскія каштоўнасьці. Яна таксама належыць да Эўропы. Беларусь не павінна супрацьстаўляць сябе Расеі. Сёньня нашыя галоўныя замежнаэканамічныя інтарэсы зьвязаныя з эканамічнай інтэграцыяй як з Расеяй, Украінай, так і з Эўрапейскім Зьвязам. У гэтых кірунках Беларусь і павінна працаваць, застаючыся ў бліжэйшыя 10-15 гадоў краінай, якая захоўвае палітычны сувэрэнітэт, нэўтралітэт і поўную дзяржаўную незалежнасьць.

Леанід Злотнікаў: Гэта ўтопія! Расея зьяўляецца стрыжнёвай дзяржавай славяна-праваслаўнай цывілізацыі, куды ўваходзіць і Беларусь. Яна моцна прыцягвае беларусаў. Амаль палова насельніцтва Беларусі (42,6 %) на пытаньне сацыёлягаў «Кім, на Ваш погляд, зьяўляюцца беларусы, самастойнай нацыяй

альбо адной з галін трыадзінай рускай нацыі?» адказалі «Адной з галінаў» (гл. А. Вардомацкий. Беларусь и мир // Аналитический бюллетень белорусских фабрик мысли. 2000. № 2. С. 22). Этнічная самаідэнтыфікацыя рэшты беларусаў па крыві таксама неадназначная.
Зьмяніць цывілізацыйную самаідэнтыфікацыю намнога цяжэй, чым самаідэнтыфікацыю этнічную. Колькі б ні было боек паміж немцамі і французамі, як бы ні розьніліся іх мовы (значна больш, чым расейская і беларуская), але ж яны працягваюць лічыць сябе прыналежнымі да адной цывілізацыі - эўрапейскай. Пакуль што няма тых умоваў (паводле Гантынгтана), якія б спрыялі адыходу Беларусі ў бок эўрапейскай цывілізацыі (згода на тое народу, эліты, дый згода Захаду пад пытаньнем).
Леанід Заіка: У цяперашнім часе палітычныя і эканамічныя прыярытэты ЭЗ - поўдзень Эўропы і новыя дзяржавы, якія ўвайшлі з 1 траўня ў склад ЭЗ. Нас могуць прыняць (за 5-6 гадоў), калі мы пачнем канфрантаваць з Расеяй. Ёсьць такая вэрсія, хоць і сумнеўная. Расея знаходзіць супольную мову з Эўропай хутчэй, чым мы. І так будзе заўсёды. Расея ёсьць фактарам эўрапейскай палітыкі. Мы ня можам выбудоўваць сваю канцэпцыю замежнай палітыкі на асаблівай цікавасьці Вялікабрытаніі ці Нямеччыны да Беларусі. Гуляць на супярэчнасьцях Расеі і эўрапейскіх краінаў што да Беларусі - справа сумнеўная. Уласна кажучы, у мяне склалася ўражаньне, што на сёньня мы ўвогуле не цікавыя для Эўропы. Дома ў сябе прыдумваем, якія мы важныя для Эўропы і якія мы транзытныя. Ад Расеі сыходзіць ня трэба. Страчанай карысьці будзе болей. Ідэальнае становішча - быць на лініі супрацоўніцтва. Стаць адкрытай краінай. Ніякіх візаў ні для кога, ніякіх мытных тарыфаў, ніякіх абмежаваньняў што да продажу ўласнасьці і зямлі замежнікам. Вы не спалохаліся такога падыходу? А калі пры гэтым і ангельская мова прызнаецца мовай дзелавых і іншых зносінаў (ці, як прынята казаць, дзяржаўнай)?
Уладзімер Мацкевіч: Можа і будзе, але ж не павінна быць. Гэта вельмі па-расейску: кожны, хто не з Расеяй, - той вораг і русафоб. Я не русафоб; пражыўшы ў Расеі 3/5 свайго жыцьця, я ня «здрадзіў» ёй, а проста вярнуўся на Радзіму. Эўропа - радзіма Беларусі. Хіба, вяртаючыся на радзіму, мы павінны крычаць: «Прэч ад Расеі»? Ці: «Прэч ад Казахстану»? Мы проста скажам: «Бывай, Расея! Бывай, Казахстан!» А Ўкраіне мы

павінны гаварыць: «Да сустрэчы ў Эўразьвязе!» Ці інакш - у Эўрапейскай Уніі. А унія - гэта так па-нашаму!
Сямён Букчын: Пытаньне з той самай опэры, што і «абмежаваць». Толькі назва іншая - «прэч». Цікава ўсё ж такі: а куды прэч? На Месяц занесьці Беларусь ці на Антарктыду?
Віктар Марціновіч: Усё залежыць ад таго, на якім этапе разьвіцьця беларускай дзяржаўнасьці адбудзецца наш разварот да Эўропы. Калі інтэграцыю з ЭЗ правядзе які-небудзь зь дзеячоў лукашэнкаўскага тыпу, то ня будзе. Калі з ЭЗ мы аб'яднаемся гэтак жа карава, як спрабавалі аб'яднацца з Расеяй (а ў мяне ёсьць падазрэньні, што так яно й будзе, у гэтым пераконваюць гады кіраваньня Кебіча і эпоха кіраваньня Лукашэнкі; у гэтай краіне глябальна наўрад ці штосьці зьменіцца), то гэта адно выкліча буру прарасейскіх настрояў. Я пакуль ня бачу магчымасьці прыходу да ўлады ў Беларусі палітыка, які мог бы зрабіць якіясьці буйныя стратэгічныя развароты краіны чыста, без нэгатыўных наступстваў. А таму адзіным спосабам уваходжаньня Беларусі ў ЭЗ паводле схемы «прэч ад Расеі» ёсьць наступны варыянт: Лукашэнка ці хтосьці зь яго наступнікаў усё-ткі даводзіць да канца задуму з расейска-беларускай інтэграцыяй, за пяць гадоў беларусы ўстаюць на дыбы ад тых «прэлесьцяў», якія на іх дзякуючы гэтаму звалiліся, і на наступных выбарах зьмятаюць гэтага дзеяча разам з усходнім геапалітычным вэктарам. Вось тады спадкаемца проста вымушаны будзе паўтарыць маршрут, які прайшлі краіны Балтыі. У адваротным выпадку з ганьбай зрынуць і яго.
Пятро Марцаў: Можна па-рознаму адказваць на гэтае пытаньне, бо ідзецца пра некалькі тыпаў інтэграцыі. Палітычна - не, бо інтэграцыя з Эўразьвязам, хутчэй за ўсё - магчыма, на жаль, - адбудзецца толькі тады, калі паўстануць ясныя ўзаемаадносіны паміж Эўразьвязам і Расеяй. Перад гэтым Эўразьвяз і Расея доўгі час будуць дэманстраваць супрацьстаяньне ў беларускай сытуацыі. Малаімаверна, што Эўразьвяз выйграе ў гэтым супрацьстаяньні ў блізкім часе, у наступныя 5-10 гадоў.
Культуралягічна - мне здаецца, што насамрэч, насуперак палітыцы дзяржавы, насуперак інфармацыйным палём, якія дамінуюць у Беларусі, - усё-ткі зрух у бок Эўразьвязу ідзе ўжо цяпер. І гэта важна, бо гэта аснова інтэграцыі.

Эканамічна - не. Для таго, каб гэтая дзяржава існавала, яна вымушаная не губляць усходняга рынку. Ужо адно гэта ўскладняе рух Беларусі да Эўразьвязу. Прадукцыя беларускіх прадпрыемстваў запатрабаваная і канкурэнтаздольная на ўсходніх рынках і значна менш канкурэнтаздольная ў Эўропе. Хоць, тым ня менш, пэўны рост экспарту ў Эўропу ёсьць: прадукцыя лёгкай прамысловасьці, мэтал, тэкстыль, хімічная прадукцыя знаходзяць усё большы попыт у Эўразьвязе. Беларусі давядзецца балянсаваць паміж Расеяй і Эўразьвязам, пакуль ня зьявіцца стратэгічная праграма супрацоўніцтва Расеі і Эўразьвязу.

Усё вышэйсказанае датычыць сёньняшніх палітычных рэаліяў - з улікам мэнталітэту палітычнага кіраўніцтва краіны, з улікам асобы, якая ачольвае краіну, з улікам абсалютысцкай мадэлі дзяржавы.

ЯКУЮ
РОЛЮ Ў
ГРАМАДЗТВЕ
ПАВІННА
ВЫКОНВАЦЬ
БЕЛАРУСКАЯ
МОВА:
БЫЦЬ
ПАНУЮЧАЙ
МОВАЙ
(як
літоўская ў
Літве або
польская ў
Польшчы),
БЫЦЬ
АДНОЙ ЗЬ
ДЗЬВЮХ
РАЎНАПРАЎНЫХ
ДЗЯРЖАЎНЫХ
МОВАЎ
(як
французская
і
флямандзкая

ў Бэльгіі)
АБО МОВАЙ
МЯСЦОВАЙ
ЭКЗОТЫКІ
(як
ірляндзкая ў
Ірляндыі)?

ЯКІМ, НА ВАШУ ДУМКУ, БУДЗЕ РЭАЛЬНЫ БАЛЯНС МОВАЎ У БЕЛАРУСІ Ў АГЛЯДНАЙ БУДУЧЫНІ?

Сьвятлана Алексіевіч: Мне бы хацелася, каб былі дзьве раўнапраўныя мовы. Гэта адпавядае таму, што мы маем у сьвядомасьці, у сваёй гісторыі. Але я мяркую, што гэтае пытаньне сёньня вельмі шчыльна зьвязанае з палітыкай улады, з палітыкай Лукашэнкі. Мы жывём у час, калі гэтая асоба і гісторыя краіны вельмі шчыльна перапляліся і мы - закладнікі гэтай сытуацыі, паколькі мы не ўтрымалі яе і не змаглі нічога ёй супрацьпаставіць. Мы сёньня дэмаралізаваныя і прыгнечаныя, трэба прызнаць, што мы пацярпелі паразу.
Але мяркую, што на поўнае зьнішчэньне мовы нават гэтая ўлада ня пойдзе. Аднак будзе панаваньне расейскай мовы з прычыны і палітычных умоваў, і з прычыны таго, што мы ня маем апірышча ў сьвядомасьці людзей. Я ведаю, што цяпер бацькі ў школах імкнуцца адгарадзіць дзяцей ад беларускай мовы, маўляў, навошта дзіцяці напружвацца, хай яно больш вучыць ангельскую, ці французскую, ці нямецкую, беларуская яму не спатрэбіцца. Паглядзіце - у ліцэі толькі 100 вучняў, толькі 100 чалавек захоўваюць самую ідэю, ідэю беларускай мовы. Я думаю, у гэтым сэнсе шанцы невялікія.
З аднаго боку, Лукашэнка захаваў незалежнасьць (і гэты факт трэба прызнаць), паколькі гэта супала зь яго асабістымі інтарэсамі як чалавека, які прагне неабмежаванай асабістай улады. Я мяркую, што ён зрабіў тое, што іншы кіраўнік, магчыма, і ня здолеў бы зрабіць. Ён захаваў незалежнасьць, але ў нейкім дэфармаваным варыянце - гэткая расейская арыентацыя, пры жаданьні быць цалкам асобна. Уявіце сабе, што адбываецца ў галовах людзей. Таму культурная праграма абсалютна не выконваецца, гэта ўсё адкладаецца на потым пры

ўсім нашым спазьненьні.
Аляксандар Фядута: Не бяруся прадказваць. І не хацеў бы прадказваць. Проста калі чуеш глупствы накшталт пахвалы трасянцы, рука цягнецца да пісталета. Гэта сапраўды дурасьць - арыентавацца на шклоўскі стандарт бескультур'я. Ужо цяпер беларуская мова стала мовай культурнай эліты, прычым маладой культурнай эліты. Праўда, гэтая эліта яшчэ не разумее, што перавесьці ўсе школы і дзіцячыя садкі на тарашкевіцу таксама немагчыма, як і вярнуць дарэформавую расейскую артаграфію. Але хай гуляюцца, «молода ще дытына», як казала Васіліса Кашпараўна ў Гогаля. Калі ж гэтае новае пакаленьне здолее перакласьці на беларускую мову, скажам, «Дон Кіхота» і Гамэра (цалкам), адказаўшы тым самым на «Фаўста» і «Біблію» ў перакладзе Сёмухі як на выклікі часу, значыць, яно выканае сваю культуралягічную функцыю, даказаўшы, што беларуская мова існуе як мова клясычная. У цэлым жа пакуль статус пануючай ёй ня сьвеціць.
Юры Дракахруст: Парадак варыянтаў паводле маіх уласных перавагаў - другі, першы, трэці. Іх парадак паводле імавернасьці рэалізацыі ў будучыні, «на чым сэрца супакоіцца», - трэці, другі, першы.
Насамрэч другі варыянт, які мне больш за ўсё даспадобы, - самы складаны, ён патрабуе ад беларускага грамадзтва і яго эліты найбольшых, прычым не зусім уласьцівых ёй, высілкаў. Расейскамоўныя беларусы насамрэч не настолькі ўжо прывязаныя душой да Расеі, іх агрэсіўны message да іх іншамоўных суайчыньнікаў - не «гавары па-расейску», а «гавары, як людзі, гавары, як усе». Парадаксальным чынам ідэал немалой часткі беларускамоўных палягае ў тым жа дыскурсе - каб я ў сваёй Беларусі мог сказаць расейскамоўнаму «гавары як усе» (гэта значыць па-беларуску).
Між тым нават павярхоўнае знаёмства з бэльгійскім досьведам паказвае, што гармонія тамтэйшага дзьвюхмоўя - гэта не аўтаматычны вынік нейкай іманэнтнай эўрапейскасьці бэльгійцаў (непадобных да «дзікуноў»-беларусаў), а штодзённая складаная праца грамадзтва, найперш інтэлектуалаў, дзеля дасягненьня гэтага кансэнсусу. Прычым не выпадае казаць і пра яго спрадвечнасьць: флямандзкая мова, на якой гаворыць амаль палова краіны, прычым палова, якая кампактна засяляе поўнач Бэльгіі, набыла роўны статус з

французскай мовай, на якой гаворыць другая палова бэльгійцаў, толькі ў 60-х гадох XX стагодзьдзя. Дзеля задавальненьня, збалянсаваньня інтарэсаў моўных грамадаў у сфэры адукацыі і нават палітычнага прадстаўніцтва прыдумляюцца даволі грувасткія канструкцыі зь фіксаванымі квотамі і гандыкапамі для больш слабых. На першы погляд гэтыя канструкцыі выглядаюць няўстойлівымі і падрываюць адзінства нацыі, але на самай справе забясьпечыць гэтае адзінства грамадзтва, рэальна падзеленага паводле мовы, можна менавіта такім чынам.

А разрываюць нацыянальнае адзінства якраз «чыстыя» стратэгіі, скіраваныя на татальную перамогу аднаго з бакоў.

Адносна беларусаў аптымізму надае тое, што за сваю гісторыю яны таксама здолелі выпрацаваць мэханізм, які не дае разарваць грамадзтва паводле іншага фундамэнтальнага падзелу - паводле веры. І ня тое, што прыналежнасьць да праваслаўя ці каталіцтва ня мае значэньня - мае, і часам вялікае, проста за стагодзьдзі выпрацавалася адчуваньне, за якія межы ня можа выходзіць гэтая адрознасьць. Таму, магчыма, і ня трэба далёка хадзіць па экзатычны эўрапейскі досьвед, калі ёсьць беларускі шлях вырашэньня беларускіх праблемаў.

Калі сфармуляваць яшчэ нявырашаную праблему ў тэрмінах той, для якой ужо знойдзенае рашэньне, сёньняшняя галаваломка выглядае недарэчнай. Ці трэба ўсю Беларусь акаталічыць ці ўсю навярнуць у праваслаўе? У адказ на такую дылему спачатку прыходзіць думка пра абсалютную немагчымасьць, потым - пра жахлівую цану нават спробы, а напрыканцы (ці наадварот - у першую чаргу) - «а навошта?»

Аляксандар Сасноў: Я б таксама вітаў, каб беларуская мова была пануючай у нашым грамадзтве. Але гэта сёньня немагчыма. Палітыка беларускіх уладаў не дазваляе разьлічваць, што абедзьве дзяржаўныя мовы ў найбліжэйшы час будуць раўнапраўнымі. Застаецца пакуль што толькі трэці варыянт, як гэта ні шкада. І справа ўсіх, каго турбуе будучыня беларускай мовы, - шанаваць яе, захоўваць і перадаваць нашчадкам. У будучыні можа так стацца, што ўсё перамяніцца да лепшага, як у свой час у Празе, дзе за адно пакаленьне чэская мова калісьці замяніла нямецкую!

Станіслаў Багданкевіч: У найбліжэйшай пэрспэктыве ў

Беларусі, мяркую, будзе ўсталяванае рэальнае дзьвюхмоўе.
Леанід Злотнікаў: Ужываньне беларускай мовы пашырыцца, і стаўленьне да яе зробіцца больш паважлівым. Яна ня стане пануючай, але і экзотыкай таксама ня будзе.
Леанід Заіка: Сьвет мяняецца ня ў моўным дачыненьні, а ў інфармацыйным. Кібэрпакаленьне маладых беларусаў зробіць выбар на карысьць таго, што больш пэрспэктыўнае. Мова Інтэрнэту - гэта шанец апярэдзіць многія краіны, якія сёньня вельмі задаволеныя сабой і сваімі посьпехамі. Мы гістарычна вымушаныя быць больш актыўнымі, больш функцыянальнымі, рознабаковымі. У моўных пытаньнях трэба рухацца з арыентацыяй на сытуацыю 2090-2100 гадоў.
Што там будзе, ніхто ня ведае. У ЗША, на думку маіх замежных калег, да канца стагодзьдзя асноўнай мовай будзе гішпанская (дзяржаўная - гішпанская?). У Эўропе перавагу мае ангельская мова. Балянс лінгвістычных сыстэмаў у нас будзе дэтэрмінаваны дзелавой практыкай.
Прагноз: З мовы - мы зьяўляемся «прасунутай» краінай. Дзьве мовы - мы сядзім з Расеяй на печках-лавачках. Адна мова - цешымся з сваёй незвычайнасьці і знаходзімся адначасова на пэрыфэрыі Эўропы і Эўразіі. Выбар за намі.
Уладзімер Мацкевіч: Мне больш прывабным падаецца фінскі варыянт, дзе швэдзкая мова захоўвае традыцыйны статус другой дзяржаўнай, але пануе фінская. Калі б мы эвалюцыянавалі ад сёньняшняга становішча да такога варыянту, я б лічыў, што мы на правільным шляху, што ў нас усё ідзе добра.
Сямён Букчын: Ну што рабіць зь «беларускім комплексам», які вагаецца паміж «пануючай мовай» і «экзотыкай»? Няўжо трэба тлумачыць, што перадусім трэба паспрабаваць стварыць больш-менш нармальнае жыцьцё ў Беларусі, з нармальнай павагай да чалавека? І тады натуральна адновіцца (паралельна гэта будзе адбывацца) нармальнае стаўленьне да мовы беларускай. І ня будзе гэтых штучных падыходаў, «прымерак» да флямандзкай ці ірляндзкай. І «рэальнага балянсу» ня трэба будзе шукаць. Бо ён вырасьце з нармальнага, з сапраўды чалавечага жыцьця. Можна спачатку прыняць «Закон аб мовах», а потым прайграць краіну, будучыню. А можна ствараць нармальнае жыцьцё, у якім годнае сваё месца - не экзатычнае, а натуральнае - зойме нацыянальная мова. Разумееце, пра што я?

Віктар Марціновіч: Пачнем з таго, якую ролю яна *павінна* выконваць. Без усякага сумневу, у нацыянальнай дзяржаве павінна быць моцная нацыянальная мова. З прычыны таго, што тут прысутнічаюць іншыя нацыянальнасьці, яна не павінна насаджацца насуперак іхным інтарэсам. Гэта значыць, расейскамоўныя ў Беларусі павінны мець права гаварыць па-расейску. Але ведаць беларускую ім, безумоўна, не зашкодзіць, - бяз гэтага ў нацыянальнай дзяржаве яны ня змогуць схадзіць у цырульню, ня зробяць пакупак, іх штодзённае жыцьцё адменіцца ў кашмар. Таму, паўтаруся, ідэальны статус беларускай я вызначыў бы так: мова міжнацыянальных зносінаў у Беларусі. Але гэта тое, як павінна быць у ідэале. Што да агляднай будучыні, то, на жаль, мой прагноз пэсымістычны. Хутчэй за ўсё, усё зьвядзецца да ірляндзкага варыянту. Абнадзейвае, бадай, толькі тое, што ў Ірляндыі Gaelic конча стаў прэрагатывай выканаўцаў фольк-музыкі, а ў Беларусі на беларускай па-ранейшаму гаворыць значная доля насельніцтва і ніякая русіфікація ня зрушыць такога магутнага і патрыярхальнага пласта, якім ёсьць беларуская вёска. Зрэшты, чым далей, тым меней часу на рэанімацію застаецца ў беларускай мовы, тым больш што яе распаўсюднікамі становяцца носьбіты «трасянкі» і жахлівай расейскай з фрыкатыўным «г».

Пятро Марцаў: Мне здаецца, бэльгійскі варыянт быў бы ідэальны для Беларусі, але да гэтага ідэалу... Ідэал, як правіла, недасягальны.

Што да рэальнага балянсу - я б не рашыўся даць такі прагноз. Калі б усё залежала ад разьвіцьця грамадзтва як такога, я б сказаў, што ў агляднай будучыні бэльгійскі варыянт дасягальны. Але дзяржава дамінуе над грамадзтвам. Тут мала што зьмянілася з савецкіх часоў. У нас нават не ўкраінская сытуацыя, ува Ўкраіне цяпер лепей. З улікам беларускіх рэалій - бэльгійскі варыянт застаецца недасягальным ідэалам.

Апытваў Алесь Пяткевіч

[image]

[image]

№ 5 (34) - 2004

[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/2/28
[image]

[redacted] (3'2000)

[image]

A R C H E

[image]

[image]

[image]

[image]

палеміка

"Да Эмісту"

[image] [image]

Пачатак

№ 5 (34) - 2004

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]2004

аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image]

ВАЛЕР БУЛГАКАЎ

Валер Булгакаў
Чаму Беларусь ня Аўстрыя, а эўразійская Кантрапія

– А во гэны чалавек лепшы быў.

– Да-да, он лепшы.

З размовы маёй прабабулі Юзэфы Бурак з бабуляй Еўдакіяй Дзіцінай Агафонавай.

Беларусь і Ўзбэкістан яднаюцца ў гэтай Мінскім пантсавецкія дзяржавы, дзе дагэтуль Асаронавай.

Казахстан ужо абганяе Беларусь, бо там у парлямэнце ёсьць адзін апазыцыйны дэпутат.

Аналізу прычын, чаму Беларусь апынулася ў такім стане, няма ў артыкуле Юр'я Дракахруста («Жэнэўская канвэнцыя для вайны культураў», ARCHE, 3/2004), хоць у ім закранаюцца праблемы культурнага, калі не цывілізацыйнага парадку. Яго турбуе не дысфункцыянальнасьць нацыянальнай культуры, якой у вялікай ступені тлумачыцца палітычны посьпех аўтарытарнага папуліста Аляксандра Лукашэнкі, а патрэба ўкладаньня своеасаблівай культурнай канвэнцыі паміж інтэлектуальнымі і палітычнымі лідэрамі расейскамоўнай і беларускамоўнай частак нашага грамадзтва.

Каб прыўнесьці ў такую канвэнцыю пачуцьцё рэальнасьці, аўтар «Жэнэўскай канвэнцыі…» даводзіць, што ідэолягі т. зв.

ВП – выбарчы працэс, ГС – грамадзянская супольнасьць, эўрапейскай пэлітычнай сродкі, Масавай інфармацыі, ДзК – дзяржаўнае кіраваньне, Адмунд Штойбэр, Індаўна гэта падкрэсьлілі выдаўцы «Emerging Economic Monitor» – Адзнака 1 аднаго штомесячнага бюлетэню з дэмакратычнага кватэрай у Лендане, прысьвечанага аналізу макраэканамічных працэсаў і палітычных рызыкаў у нашай частцы Эўропы. Тут уся яе тэрыторыя разьбіта на чатыры рубрыкі: «Цэнтральная Эўропа», «Паўднёва-

«беларускай Беларусі» не ўходзяць амаль нічога, апрача ўласных амбіцыяў. Гэтая праблема, матэрыялах, згодна зь якімі ў беларускамоўных беларусаў Беларусі, тысяч чалавек (зь іх толькі 30 гадоў і каля 250 тыс. чалавек, зусім нармальна для насельніцтва калёніі, параўнальна кепскага вызнаюць вартасьці немадэрнай культуры і адзначаюцца кансэрватыўнымі палітычнымі поглядамі. Дракахрусту хочацца, каб пасьля гэтага «беларускай Беларусі» перабудаваць нацыянальны праект і дамагчыся культурнай і палітычнай культуры, выступаць ад імя маргінальнай абстрактнымі 10 мільёнамі беларусаў, гаварыць на расейскай мове.

Ён ходзіць па коле, прапаноўваючы ўсё тыя ж аргументы, якія ён агучваў у 1990-х гадах. Ён не ўспрымае ніякіх новых фактаў, якія ўзьніклі за апошнія 15 гадоў. Ён не ўспрымае ніякіх новых фактаў, якія ўзьніклі за апошнія 15 гадоў. Ён не ўспрымае ніякіх новых фактаў, якія ўзьніклі за апошнія 15 гадоў.

палавінай разоў) адно інтэлектуальнай сумленнасьцю і мэтадалягічнай строгасьцю спэцыялістаў з НІСЭПД і некваліфікаванасьцю нанятых дзяржавай перапісчыкаў? Магчыма, пасьля спэцыяльнага інструктажу яны проста залічылі ў рубрыку беларускамоўных беларусаў вялікую частку тых, хто гаворыць на трасянцы і/або то па-беларуску, то па-расейску?

Можна паставіць пад сумнеў і сам рубрыкатар нацыянальнага перапісу 1999 г.: маўляў, ён ня даў людзям магчымасьці рэальнага выбару, зводзячы ўсю моўную рэальнасьць да дзьвюх опцыяў, тым часам як спэцыялісты з НІСЭПД прапаноўвалі ажно чатыры варыянты адказу. Але гэта ня будзе праўдай. Хутчэй самі спэцыялісты з НІСПЭД ня ўлічваюць усіх вымераў моўнай рэальнасьці. У апытальніках апошняга перапісу былі дадзеныя шэсьць варыянтаў адказу на пытаньне пра мову штодзённых зносін: «мова сваёй нацыянальнасьці», «беларуская», «расейская», «польская», «украінская« і «іншая». І моўная карціна тут далёкая ад паказнога бляску. Напрыклад, 56 % беларусаў Берасьцейшчыны прызналі сваёй гутарковай мовай расейскую, а больш як 17 тыс. чалавек на Гарадзеншчыне пазначылі сваёй гутарковай моваю польскую (носьбітаў гэтай мовы ў Беларусі, паводле апытаньняў НІСЭПД, наагул няма).

Гэта ставіць першае мэтадалягічнае пытаньне: хто мае права вызначаць мову «штодзённых зносін» канкрэтнага чалавека – інтэрпрэтатар сацыялягічных зьвестак або сам носьбіт мовы? Калі мы пакідаем за індывідам права самастойна, без падказак вызначаць сваю нацыянальнасьць (і няма нічога дзіўнага, што падчас апошняга расейскага перапісу ў гэтай краіне выявіліся такія рэдкасныя народнасьці, як гобліны, эльфы, скіфы, сарматы і джэдаі), то чаму справа вызначэньня сваёй мовы выводзіцца з-пад яго кампэтэнцыі і становіцца вузкім навуковым пытаньнем? Сваім мэтадалягічным радыкалізмам Дракахруст прыпадабняецца да беларускіх нацыяналістаў другой паловы XX ст., якія не прызнавалі самога факту існаваньня польскай нацыянальнай меншыні ў Беларусі. Хоць гэтыя людзі называюць сябе палякамі, меркавалі яны, іх нельга лічыць такімі, бо яны гавораць на звычайнюсенькай беларускай мове.

Адным словам, ігнараваньне тых, хто гаворыць на трасянцы або

па-расейску і па-беларуску, але дзякуючы адданасьці нацыянальнай традыцыі ці якімсь іншым прычынам схільны атаесамляць сваю гутарковую мову зь беларускаю, можна ўспрымаць як маркер, які аддзяляе сацыялёгію ад экзальтаванай журналістыкі. Каб хто правёў сацыялягічнае апытаньне наконт нацыянальнага складу Беларусі, яго вынікі былі б ня менш сэнсацыйнымі, чымся ў выпадку з мовай «штодзённых зносінаў».

Гэты мэтадалягічны радыкалізм не заслугоўваў бы асаблівай увагі, каб не навязьлівае імкненьне рабіць на яго аснове з прыцягненьнем супярэчлівых сацыялягічных фактаў далекасяжныя экстрапаляцыі. Напэўна, адна з прычын гэтага браку адстароненасьці палягае ў завышанай самаацэнцы беларускіх сацыёлягаў. Акадэмічная гісторыя сацыялёгіі ў Беларусі налічвае няпоўныя 15 гадоў. Нашы сацыёлягі дагэтуль вераць, што, маючы простае дачыненьне зь сьвятой воляй народу, яны прадукуюць узоры дасканалай веды абсалютнай навуковай каштоўнасьці. Частыя і ад таго ня менш камічныя апэляцыі да народу як крыніцы абсалютнага пазнаньня не пакідаюць сумневу, што эпоха народніцтва зь яе абагаўленьнем народу як формы найвышэйшай духоўнасьці ўсё яшчэ ня зжытая ў сьвядомасьці нашай інтэлігенцыі незалежна ад яе моўнай прыналежнасьці.

Існуе й яшчэ адно аблічча прыкладной беларускай сацыялёгіі, якая зводзіцца да адной з тэхналёгій маніпуляцыі масавай сьвядомасьцю. Сацыялягічныя агенцыі ўсё часьцей адмаўляюцца інфармаваць грамадзтва аб палітычных, культурных і іншых працэсах і становяцца каналам вядзеньня інфармацыйнай вайны. Возьмем сёлетні рэфэрэндум аб падаўжэньні прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі. У верасьні аналітычны цэнтар «ЭкаОМ» апублікаваў зьвесткі, зь якіх вынікала, што, калі б прэзыдэнцкія выбары адбыліся ў той момант, за дзейнага прэзыдэнта прагаласавала б 66,5 % насельніцтва краіны. У той жа час паводле чэрвеньскага апытаньня НІСЭПД т. зв. адкрыты рэйтынг Лукашэнкі складаў толькі 34,2 %. Сацыялягічны цэнтар «Новак» пад кіраўніцтвам прафэсара Андрэя Вардамацкага ацаніў яго яшчэ на пару пунктаў ніжэй.

Ці ўзяць пытаньне скасаваньня забароны абірацца прэзыдэнту на трэці тэрмін. Паводле зьвестак цэнтру сацыялягічных і

палітычных дасьледаваньняў БДУ пад кіраўніцтвам прафэсара Давіда Ротмана, у сёлетнім верасьні 68,8 % беларусаў падтрымлівалі ідэю скасаваць забарону на трэці тэрмін, 18 % выступалі супраць і 13 % ня вызначыліся. Зусім іншая карціна вымалёўвалася паводле даных апытаньняў НІСЭПД. У сакавіку 2004 г. 47 % апытаных заявілі, што прагаласуюць супраць скасаваньня забароны на трэці тэрмін, а ў чэрвені такі намер выказаў ужо кожны другі апытаны. Згодна зь літоўскай агенцыяй «The Gallup Organization / Baltic Surveys», улетку больш за 50 % беларусаў былі ня згодныя зь зьменай Канстытуцыі ў пытаньні трэцяга тэрміну.
Найпрасьцей, ведама, заявіць: нацыянальны перапіс правялі нацыяналісты, «ЭкаОМ» стварылі лукашысты, а прафэсар Ротман бессаромна брэша. Зробім, аднак, іншае дапушчэньне: сацыялягічныя апытаньні не заўсёды даюць адэкватны адказ, калі ад апытанага патрабуецца выявіць грамадзянскую мужнасьць, выказаць сваю нязгоду зь цяперашнім палітычным курсам, заявіць аб сваёй сымпатыі да непапулярнай палітычнай лініі ці прыналежнасьці да цкаванай меншыні. У гэтым выпадку сацыялягічныя зьвесткі ня могуць быць адзінай базай для аналізу, а патрабуюць удакладненьня і супастаўленьня зь іншымі эмпірычнымі крыніцамі. Сацыялягічныя апытаньні ў найлепшым выпадку перадаюць уяўленьне апытаных пра сацыяльныя працэсы і зьявы, але не адлюстроўваюць сутнасьці гэтых зьяваў. Зыходзячы толькі зь іх, немагчыма зразумець дынаміку сьвядомасьці канкрэтнага індывіда, выявіць сацыяльную непрэстыжнасьць тых ці іншых мяншыняў і прыроду ўласьцівых іх членам псыхалягічных комплексаў.
Ці ствараюць зьвесткі НІСЭПД адэкватную карціну рэальнасьці, калі гаворка заходзіць пра такія пытаньні? Матэрыялы яго нядаўняга апытаньня пра канфэсійную структуру нашага грамадзтва разьмеркаваліся такім чынам: больш за 70 % беларусаў належаць да праваслаўнага веравызнаньня, 15 % – да каталіцкага і 2 % – да пратэстанцкага. У той жа час сьвежая інфармацыя Камітэту ў справах рэлігій спараджае паважныя сумневы ў іх праўдападобнасьці. З 1988 г. колькасьць зарэгістраваных пратэстанцкіх парафій у Беларусі павялічылася ў чатыры разы, і сёньня пратэстанты маюць 1008 зарэгістраваных грамадаў (пры тым, што шмат якія суполкі гэтага вызнаньня прынцыпова ўнікаюць дзяржаўнай

рэгістрацыі). Праваслаўныя маюць 1290 парафіяў, каталікі – усяго 432. Троху іншая дынаміка па культавых будынках: з 1964 праваслаўныя займаюць 1132, каталікі і пратэстанты дзеляць рэшту прыкладна пароўну.

Калі прыняць падыход НІСЭПД, то выйдзе, што адна каталіцкая грамада прыпадае прыкладна на 3500 вернікаў, а адна пратэстанцкая (улічваем, што значная іх частка існуе безь дзяржаўнай рэгістрацыі) – менш як на 200 пры прыкладнай роўнасьці «культавых будынкаў». Дык ці не заніжана лічба беларускіх пратэстантаў? Усьлед за аналітыкам Юр'ем Шаўцовым варта прыпусьціць, што рыма-каталікоў у Беларусі ўсё яшчэ болей за пратэстантаў, але ж ніяк ня ў сем з паловай разоў, як сьцьвярджае НІСЭПД.

У інстынктыўным жаданьні шараговага чальца моўнай ці рэлігійнай меншыні ў адказ на дзяржаўны ўціск і грамадзкі астракізм схаваць сваю сапраўдную ідэнтычнасьць нічога дзіўнага няма. У грамадзтве, у якім нацыянальная традыцыя апошняе стагодзьдзе бязьлітасна рэпрэсавалася*, а экспансія пратэстанцкага хрысьціянства ўспрымалася як выклік грамадзкаму адзінству і палітычнай стабільнасьці, артыкуляцыя на людзях сваёй сапраўднай ідэнтычнасьці выглядае як публічны пратэст. На яго адважваюцца харызматыкі, а не шарагоўцы.

– публіцыст, рэдактар часопісу «ARCHE». Адзін з укладальнікаў кнігі «Эўрапейскі выбар для Беларусі / Беларусь: сцэнары рэформаў» (Варшава, 2003).

Дракахруст у цэлым правільна ацаніў цяперашні стан беларускамоўных беларусаў як меншыні, але амаль не заакцэнтаваў таго, што яны ўяўляюць сабой супольнасьць пункты ўваходу ў якую і выхаду зь якой усьцяж застаюцца адчыненымі для новых/старых членаў. У якасьці кампрамісу можна прызнаць ацэнку ў 5–7 % ніжнім колькасным значэньнем гэтай групы (ці нават «крайнім ніжнім значэньнем». Калі дапусьціць, што беларускамоўныя – гэта тыя, хто любіць чытаць прэсу па-беларуску, а не па-расейску ці і па-беларуску, і па-расейску адначасова, то такіх каля 9 % працэнтаў. Пар. вынікі апытаньня «Новаку» напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г.: на пытаньне «На якой мове вы

* Пар. згадку Натальлі Арсеньневай пра моўныя рэаліі Менску сакавіка 1940-га: «Той самы Кучар зрабіў Танку цікавую заўвагу, калі

аддаяце перавагу чытаць газэты?» былі дадзены адказы: на расейскай – 54 %, на беларускай – 9 %, на беларускай і расейскай – 36 %), а лічбу ў 45 % – верхнім. Мэтадалогія радыкалізм і сацыялягічны гермэтызм не дазваляюць культурна-палітычныя чыньнікі функцыянаваньня супольнасьці. Тэма, ці можа быць расейская мова выразам палітычнай дэпрэсіі і культурнай роспачы беларуса, застаецца па-за межамі разгляду.

Апрача гэтага, Дракахруст не пакідае сацыялёгіі права на памылку або тэндэнцыйнасьць*. Зафіксаванае НІСЭПД раптоўнае павелічэньне долі беларускамоўных у Менску (з 11,6 % у 1997 г. да 25,2 % у 2004 г.; для даведкі: нацыянальны перапіс 1999 г. дае лічбу ў 12,9 %) ён цалкам навукова тлумачыць «пашырэньнем сталічных інтэлектуальных асяродкаў», хоць найхутчэй мы маем справу з звычайным у сацыялягічнай апаратуры** . Гэтага павелічэньня не пацьвярджаюць і іншыя лічбы. Скажам, колькасьць беларускамоўных школьнікаў у Менску сёлета дайшла свайго дзесяцігадовага мінімуму – 5 %. Не пацьвярджае гэтая дынаміка і іншымі сацыякультурнымі паказьнікамі – накладамі прэсы або частатой зваротаў у дзяржаўныя ўстановы на беларускай мове. Да таго ж, яна слаба вяжацца з змаляваным вышэй сацыялягічным партрэтам беларускамоўнага беларуса. На месца замбаванага прапагандай паджылага калгасьніка, у якога душа разрывалася паміж СССР, прыходзіць добра адукаваны сталічны інтэлектуал, сваім звышмагутным інтэлектам, амаль без інстытуцыйнага апарату, за шэсьць гадоў павялічвае колькасьць беларускамоўных беларусаў у менскім мэгаполісе больш як

Сайзецкай
Дракахруст,
Кучар
«Ведаеце, –
ён да яго, –
Прынята
Прынята
Прынята

удвая.

Аднак сказаць толькі, што быць беларускамоўным беларусам у сёньняшняй Беларусі надзвычай непрэстыжна і што бынцё ім пастаянна прычыняе яму траўмы і стварае комплексы, значыць ня бачыць працэсу ў гістарычным разрэзе. Паводле вынікаў першага перапісу насельніцтва Расейскай імпэрыі 1897 г. колькасьць беларусаў склала 5 885 547 чалавек. Зь іх 92 % былі сялянамі. З усёй папуляцыі толькі 18 тыс. мелі адукацыю, вышэйшую ад трохкляснай пачатковай. Каб вызначыць лік тагачасных беларускамоўных беларусаў, вылучым зь іх агульнай колькасьці 8 % часткова небеларускамоўных групаў – перадусім шляхты і мяшчанства. Калі супаставіць 5 млн 411 тыс. беларускамоўных беларусаў у 1897 г. зь іх колькасьцю праз адно стагодзьдзе, выявіцца, што за гэты час іх колькасьць зьменшылася ў 8,3 разу – калі браць за аснову ацэнку НІСПЭД, або ў 1,6 разу – калі браць за аснову вынікі перапісу 1999 г., – у той жа час як лік саміх этнічных беларусаў узрос у 1,4 разу!

Першая лічба сьведчыць пра абсалютны трыюмф праграмы моўнай асыміляцыі беларусаў, другая – пра яе адносны посьпех. Абедзьве дазваляюць зрабіць шэраг абагульненьняў: асыміляцыйная машына на поўны ход запрацавала пасьля другой сусьветнай вайны, прычым асабліва эфэктыўна – у 1970–1980 г., калі крамлёўскія ідэолягі ўсьвядомілі небясьпечную дэмаграфічную дынаміку: выбух нараджальнасьці ў Сярэдняй Азіі руйнаваў дагэтулешні расклад нацыянальнасьцяў у імпэрыі і, каб у пэрспэктыве не ўзьнікла дысбалянсу «тытульнай нацыі» з узбэкамі, і іншымі азіятамі, зь беларусаў і ўкраінцаў пачалі масава вырабляць расейцаў.

Увесь гэты час беларускія эліты мала што рабілі для ўмацаваньня «рукатворнай», нацыянальнай ідэнтычнасьці, прыдатнай для засваеньня масамі. Пасьляваенныя беларускія пісьменьнікі былі не нацыянальнымі дзеячамі, а дзяржаўнымі службоўцамі (адзінкам удалося ўнікнуць такога лёсу). Афіцыйная беларуская культура не працавала на павелічэньне колькасьці беларускамоўных. Цяпер гэтая група складаецца зь

беларуская аўдыторыя расейскай газэты «Известия» (беларускі выпуск якой мае наклад блізка 4 тыс. асобнікаў) амаль роўная па колькасьці усей беларускамоўнай грамадзе. Пра якасьць працы нашых сацыялягічных агенцыяў гаворыць яшчэ адна акалічнасьць. Калі тыя працуюць у адным праекце з заходнімі партнэрамі, апошнія часта не давяраюць ім уласна аналізу сацыялягічных зьвестак, пакідаючы ім адно функцыю

сельскіх жыхароў, якія ўсьцерагліся ад мадэрнізацыі, параўнальна малалікай і эксцэнтрычнай групы культурных беларусаў (тых, хто сьвядома падкрэсьлівае сваю беларускамоўнасьць; прапорцыя беларускамоўных і расейскамоўных рэзка мяняецца ў асяродзьдзі інтэлігенцыі дэмакратычных палітыкаў) і, нарэшце, найбольшай групы – напаўрасейска- або трасянкамоўных беларусаў, якія ядзяркоўваліся адданасьці нацыянальнай традыцыі схільныя атаесамляць сваю гутарковую мову зь беларускай (акурат дзеля гэтай няправільнасьці іх прынята ігнараваць). Узятыя разам, усе яны ня маюць інструмэнтаў эфэктыўнай рэпрадукцыі свайго культурнай традыцыі і змогі ажыцьцяўляць такую ж палітыку, каб падтрымліваць колькасны склад сваёй групы ўзроўні цяперашняга мінімуму. Задача стварыць нацыянальны (=беларускамоўны) універсытэт або спадарожнікаў ім здаецца такой жа неажыцьцяўляльнай, як і поўная беларусізацыя Марсу.

У гэтым сэнсе прыпісваньне беларускамоўным беларусам установкі на «панаваньне беларускай мовы ў Беларусі», а толькі нязграбная сублімацыя супрацьлеглага жаданьня. Ясно апраўдана ў такой жа ступені, як і назва выдадзенай пасьля фабрыкацыі справы «Саюзу вызваленьня Беларусі» ў 1931 м. кніжкі Андрэя Зюзькова «Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі». Такое прыпісваньне грунтуецца не на дакумэнтальна зафіксаваных выказваньнях або разгорнутых тэкстах, а на фобіях зьдзічэлых тутэйшых, якія пры словах «даможамся, каб беларускай мове ў нас нічога не пагражала» ўпадаюць у гістэрыку і страшацца гвалтоўнай дэпартацыі з краіны пражываньня. За маніфэст страшнай разбуральнай сілы выдаецца вырваная з кантэксту рэпліка Сяргея Дубавца, гэта зрабіла газэта «Літаратура і мастацтва» ў другой палове 1990-х, пара радкоў з прыватнага ліставаньня паэта Рамана Тармолы.

Дракахруст, як і пара яго ідэйных апанэнтаў, калі карыстанца расейскай тэрміналёгіяй, з нацыянал-радыкальнага лягеру, тут не аб’ектыўна адлюстроўваюць т. зв. ідэалягічныя ўстаноўкі беларускамоўных беларусаў, а фактычна навязваюць сваё ўласнае ўяўленьне пра іх. У Беларусі нацыяналістычную

і тэхнічнага выкананаўцы – зборшчыка матэрыялу. Прычыны на гэты кроўваліся аблізаць сваю паміж беларускім бёкам і «IRI-Gallup Organization Baltic Survey Group Belarus» падчас правядзеньня «Generic Ballot Test» і «Specific Ballot Test» напярэдадні сёлетніх парлямэнцкіх выбараў і «рэспубліканскага рэферэндуму». Сама доля беларускамоўных беларусаў, згодна з апытаньнямі НІСЭПД пары апошніх гадоў, вагаецца

пагрозу прадукуюць перш за ўсё не рэальныя людзі і іх ідэі, а ўсё яшчэ жывыя пудзілы сьвядомасьці, народжаныя каляніяльнай традыцыяй. Яе жывучасць тлумачыцца тым, што яна трымаецца на фармальна «дыялектычным базісе» ў выглядзе нацыяналізм (у нашым выпадку – гаварэньне на прыгнечанай беларускай мове, публічная крытыка расейскіх парадкаў і г. д.) як партыкулярысцкі рух паграфае «ўнівэрсалісцкім дасягненьням» «агульначалавечай гуманнасьці», хоць уся беларуская гісторыя XX ст. даводзіць, што гэта ня так. Праект беларускамоўных разумеецца як люстэркавае падабенства праекту расейскамоўных: з таго, што ў іх праекце да 1991 г. і пасьля 1994 г. беларускамоўным адводзілася месца адно на ніжэйшай сацыяльнай гіерархіі, нібыта вынікае, што рэактыўны праект беларускамоўных не прадугледжвае месца для ўсіх астатніх. Гэтая фальшывая дыхатамія выдаецца за рэальны голас сучаснай беларускай культуры: з рознагалосься галасоў беларускамоўных беларусаў чуюць толькі тое, што яны пачуць.

(Пытаньне, ці сапраўды паграфае нешта расейскай мове і культуры ў Беларусі ў агляднай будучыні, ці сапраўды ёй патрэбная разгалінаваная база інстытуцыйнай падтрымкі, не знайшло сур'ёзнай распрацоўкі ў айчынным мысьленьні не таму, што адказ на яго відавочны. Яе заступіла дэмагагічнае распальваньне фобіяў. Кінуць сьвятло на гэтае пытаньне маглі б і адпаведныя сацыялягічныя дасьледаваньні, але пра іх тым часам не чуваць – ці не таму, што яны паказалі б сапраўдны кірунак «нацыяналістычнай пагрозы»?)

У гэтым пункце пазыцыя аналітыка Дракахруста выклікае асацыяцыі з пазыцыяй дзейнага прэзыдэнта Лукашэнкі: і першы, і другі сам збой у сыстэме рэпрадукцыі культурнага статус-кво ўспрымаюць як доўгатэрміновую нябесьпеку свайму панаваньню. Лінія адрозьненьня тут праходзіць вакол пытаньня пра форму гэтага панаваньня (фармальнага/нефармальнага). Але яна нівэлюецца маштабам небясьпекі: для аднаго некантраляванае павелічэньне беларускамоўных нясе з сабой пагрозу палітычнай дэстабілізацыі створанага рэжыму, для другога – пазбаўленьне культурнага першынства, каді не ад прафэсійнай дэкваліфікацыі, то ў выніку павелічэньня іх ліку, г. зн. ад 2,6 % у 1989 г. да 7,1 % у 2002 г. і да 8,3 % у 2004 г. Дадатковым фактарам з'яўляецца тое, што ў выніку лукашэнкаўшчыны, пачынаючы з 1995 г., і асабліва ў 2003 г., якія рэкрутаваліся пераважна за кошт тых, хто гаворыць на трасянцы (іх папуляцыя зьменшылася ад 50,0 % у чэрвені 1995 г. да 27,8 % у сакавіку 2004 г.). Адначасова рэзка павялічылася група білінгваў – асоб, якія ведаюць абедзьве мовы, але ў паўсядзённым жыцьці карыстаюцца пераважна расейскай. Гэтая група ў 1995 г. складала 37,3 % насельніцтва, а ў 2004 г. – 51,5 %. Такім чынам, доля расейскамоўных (ад 37,3 % у чэрвені 1995 г. да 51,5 % у верасьні 2003 г.), якія рэкрутаваліся пераважна за кошт тых, хто гаворыць на трасянцы (іх папуляцыя зьменшылася ад 50,0 % у чэрвені 1995 г. да 27,8 % у сакавіку 2004 г.). Адначасова рэзка павялічылася група білінгваў –

шматстайнасьці формаў культурнай рэчаіснасьці. І адрыў, і другі варожа ўспрымаюць заснаваную на кульце беларускай мовы і культуры нацыянальную ідэнтычнасьць, адводзячы напаўняючыся яе разнастайнымі «крыважэрнымі» зьмяшчэньнямі.

І, што найпрыкрэйшае, абодва яны схільны да прыкрытых мілітарысцкай рыторыкай спэкуляцыяў на тэму таго, хто павінен і хто не павінен прадстаўляць інтарэсы беларускай палітычным узроўні. Хоць Дракахруст выкарыстоўвае мэтафары з блізкаўсходняга тэатру баявых дзеяньняў, а Лукашэнка паразытуе на сымбалічнай спадчыне апошняй вайны, сутнасна яны надзвычай падобныя. Ступень дастрэчнасьці параўнаньня культурнага канфлікту паміж расейскамоўнымі і беларускамоўнымі беларусамі з канфліктам паміж беларусаў ізраільцянамі і палестынцамі блізка такая самая, што ступень

де 7,8 % і у чэрвені 1995 г. да 17,3 % у сакавіку 2004 г. З гэтай пэрспэктывы лукашэнкаўская моўная палітыка пачала адпавядаць спадзяваньням бальшыні насельніцтва толькі ў верасьні 2003 г., калі лічба чыста расейскамоўных нарэшце перавысіла 50%. Але ненадоўга, бо ў сёлетнім сакавіку іх колькасьць упала да 47 %.

* Зьвяртае прыхільна беларускай палітыкі: калі хочаш бесплатнага дастрэчнасьці паўнымі і маскоўнымі ваць беларусаў або ступень

рэальнасьці пагрозы здароўю прэзыдэнта Лукашэнкі з боку заходніх дэмакратый.

Тэма палітычнай рэпрэзэнтацыі інтарэсаў расейскамоўных «антылукашыстаў, незалежнікаў і праэўрапейцаў» зьявілася ў Дракахруставай тэорыі таму, што ўжо цяпер ён бачыць на палітычнай сцэне краіны сілы, якія артыкулююць тры «нацыянальныя праекты»: лукашэнкаўскі аўтарытарны расейскамоўны (недаўгавечны, бо расейскамоўныя дрэйфуюць у бок каштоўнасьцяў незалежніцтва, праэўрапейскасьці і дэмакратыі), лібэральны расейскамоўны (яго прадстаўляюць згаданыя вышэй рэпрэзэнтанты) і нацыяналістычны беларускамоўны. Крызыс лукашэнкаўскага рэжыму створыць унікальныя варункі для росквіту лібэральнага расейскамоўнага праекту: галасы расейскамоўных беларусаў адыдуць хутчэй да іх, чым да нацыяналістаў зь іхнай маніяй ігнараваць «сапраўдныя інтарэсы расейскамоўных».

Такім чынам, расейскамоўны лібэрал Дракахруст і расейскамоўны аўтакрат Лукашэнка ўспрымаюць нацыянальны рух як экспансіянісцкі рух, які нясе небясьпеку прагрэсу і чалавечнасьці. Абодва яны схільныя спэкуляваць на фрустрацыях расейскамоўных беларусаў, успрымаць іх як

кіраваць імі, трэба для палатку назваць парачку іх «крыважэрнымі» істотамі, а насьля іх жа абвінаваціць у нацыяналізьме.

2
3
Табліца 2. **«Сувязь паміж моўнымі паводзінамі і адказамі на пытаньне «Якой, на Ваш погляд, была першая ў гісторыі беларуская дзяржава?»** Табліца 3. **Ці захоўваюцца правы чалавека ў Беларусі?**
Чым далей Беларусь адыходзіць ад эўрапейскіх нормаў у галіне захаваньня правоў чалавека і іншых дэмакратычных стандартаў, тым больш беларусаў (зь якіх расейскамоўныя ўяўляюць сабой бальшыню) мяркуюць пра паляпшэньне сытуацыі зь імі. За няпоўныя тры гады колькасьць тых, хто ўважае, што правы чалавека ў Беларусі цалкам захоўваюцца, павялічылася больш як у чатыры разы.4
5

вечны рухавік беларускай палітыкі, прычым страхі пачынаюцца адразу, калі беларуская культура выходзіць за межы папулізму і этнаграфізму. Абодва яны выкарыстоўваюць мэтафару «чамаданаў» для іх выражэньня. І Лукашэнка, і Дракахруст схільныя меркаваць, што беларускамоўныя беларусы маюць адну ўстойлівую і непрывабную ідэнтычнасьць, якая праяўляецца ў стыхійных выбухах агрэсіі да расейскамоўных. Яна культывуецца адарванымі ад рэальнасьці фанатыкамі-ідэолягамі і ў прынцыпе ня можа мадэрнізавацца. Нацыянальны праект беларускамоўных ставіць пад пагрозу сацыяльна пазытыўныя / лібэральныя вартасьці. Яму наканавана заставацца эксклюзіўным, г. зн. грунтавацца на катэгорыі этнічнай выключнасьці, а не інклюзіўным, г. зн. які ўключаў бы ўсіх, хто падзяляе пэўныя палітычныя погляды або культурныя вартасьці незалежна ад свайго паходжаньня, вызнаньня і сацыяльнага статусу.

Падзяляе Дракахруста і Лукашэнку пытаньне, як пакласьці канец гэтай некантраляванай экспансіі. Паставіўшы ў сваім разуменьні беларускамоўных на сваё месца, першы дзелавіта прапануе ўкласьці канвэнцыю, якая павінна вызначыць межы адказнасьці і падуплыўнасьці ў грамадзтве. Другі рэагуе жвавей: рэпрэсіямі і перасьледам ён намагаецца загнаць нацыянальны рух назад у падпольле.

Для абодвух надзвычай важным і красамоўным быў досьвед сярэдзіны 1990-х, калі ўзыходжаньне палітычнай зоркі Лукашэнкі выявіла, што палітычнай мабілізацыі масаў немагчыма дасягнуць пры дапамозе нацыяналістычнай рыторыкі. З таго, што «нацыяналістычная» мабілізацыя масаў пакуль немагчымая, была зроблена выснова, што яна ніколі ня будзе магчымая. «Национализм у нас не приживётся», – думае Лукашэнка. «Пасьля таго як Лукашэнка сыдзе, расейскамоўныя лібэралы могуць і павінны ўзяць уладу ў свае рукі», – можна вычытаць між радкоў у Дракахруста.

(Найбольшы шок ад усьведамленьня гэтай немагчымасьці давялося перажыць беларускамоўным беларусам. Характэрны ў гэтым сэнсе лёс Ігара Герменчука, які на пачатку дзесяцігодзьдзя рэдагаваў самую масавую беларускую газэту, а

пры яго канцы выдаваў спрэс расейскамоўны і малатыражны часопіс «Кур'ер».)

Лібэральны расейскамоўны праект у асноўных рысах пачаў афармляцца пасьля краху СССР. Далёка ня ўсе расейскамоўныя інтэлектуалы перанесьлі гэтую падзею як асабістую драму. Да таго ж яны сапраўды былі лепш адукаваныя, больш дынамічныя і больш шматлікія ў параўнаньні з сваімі беларускамоўнымі калегамі. У першай палове 1990-х стартуюць іх самыя пасьпяховыя культурныя ініцыятывы («Белорусская деловая газета», Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт). Адбываецца росквіт «расейскамоўнага» бізнэсу: у сярэдзіне 1990-х фірма «Пушэ» дасягае найбольшай капіталізацыі.

Расейскамоўным лібэралам падабалася жыць у Беларусі. Ад іх ніхто не патрабаваў засвойваць нацыянальную культуру і мову. Іх абкружалі мяккія людзі і помнікі эўрапейскай архітэктуры. Да Варшавы было бліжэй, як да Масквы, а да Вільні зусім рукой падаць. Некаторыя зь іх не баяліся сказаць услых: зробім зь Беларусі [расейскамоўную] Аўстрыю або, на благі канец, [расейскамоўную] Прыбалтыку.

Хоць рэктар ЭГУ прафэсар Міхайлаў пэўны час кансультаваў тагачаснага кіраўніка дзяржавы Станіслава Шушкевіча, мэханізму, каб ля стырна дзяржавы заставаліся асьвечаныя кіраўнікі-філёзафы, а зямлю ўраблялі земляробы-тутэйшыя, знойдзена не было. Як толькі ім дазволі рэальна выбіраць уладу, мяккія людзі зрабіліся зьвярамі.

Апошнія 10 гадоў сталі страшным выпрабаваньнем ня толькі для этнічных нацыяналістаў, але і для расейскамоўных лібэралаў. Уласьнік «Пушэ» прадпрымальнік Пупейка ледзьве пасьпеў уцячы з краіны і вывезьці свае капіталы. «БДГ» даўно перастала быць лідэрам свайго сэгмэнту мэдыярынку, пра лёс ЭГУ ведае кожны чытач часопісу «ARCHE». І, нарэшце, ізноў пачынае дакучаць неспадзяваная канкурэнцыя з боку праекту «беларускай Беларусі», які, здаецца, быў пахаваны самой

гісторыяй.

Перафразуючы Дракахруста, вера ў Беларусь расейскамоўных лібэралаў становіцца абсурднай проста на вачах, таму што, *па-першае*, пазыцыянаваньне сябе любой палітычнай сілай на палітычнай сцэне Беларусі як абаронцы інтарэсаў адной зь дзьвюх найбольшых моўных супольнасьцяў непазьбежна вядзе да эскаляцыі моўна-культурнага радыкалізму ўсяго грамадзтва. Беларусь ня тая краіна, дзе можна дазволіць сабе палітычную рэпрэзэнтацыю кожнай з гэтых групаў безь небясьпекі яе дэзінтэграцыі. Дэмпалітыкамі выхад з гэтай сытуацыі ўжо цяпер знойдзены ня ў моўнай дыфэрэнцыяцыі, а ў моўнай канвэргенцыі, г. зн. практычным білінгвізьме, які, асабліва калі зважаць на ўкраінскія рэаліі, мае ўсе шанцы некалі стаць нормай і для пануючай палітычнай адміністрацыі. Цяпер яе расейскамоўнасьць грунтуецца на папулізьме і тлумачыцца асаблівасьцямі каляніяльнай сацыялізацыі.

Па-другое, беларускамоўныя палітыкі могуць выдатна прэзэнтаваць інтарэсы трасянка- і расейскамоўных беларусаў, а таксама білінгваў. Зьвернемся да дэмакратычнага эпізоду ў найноўшай гісторыі краіны – прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г. Калі ў грубым прыбліжэньні карыстацца схемай Дракахруста і зьвесткамі НІСЭПД, можна дапусьціць, што беларускамоўныя беларусы (улетку 1995 г. іх было 4,5 %, зьвесткі за 1994 г. у наяўных пад рукой выданьнях НІСЭПД адсутнічаюць) галасавалі прыкладна так, як і праз 10 гадоў, – збольшага за кансэрватыўных палітыкаў з прасавецкімі сымпатыямі. І толькі іх меншая частка, каля 3 % ад колькасьці выбарцаў, галасавала за тагачасных беларускамоўных дэмакратаў Пазьняка і Шушкевіча. Разам тыя набралі 22,7 % галасоў, адкуль вынікае, што іх асноўным электаратам беларускамоўныя беларусы [у трактоўцы НІСЭПД і Дракахруста] не былі.

Па-трэцяе, незалежніцтва расейскамоўных беларусаў *не трымаецца* на гістарычных каштоўнасьцях, а вынікі апытаньняў НІСЭПД (табл. 2) сьведчаць пра іх надзычайны канфармізм і падатлівасьць лукашэнкаўскай прапагандысцкай машыне. Гэтым вынікам уласьцівая невытлумачальная загадкавасьць, паколькі ўсьлед за беларускамоўнымі беларусамі Менску

сымпатыі беларускамоўных беларусаў краіны зноў істотна разыходзяцца зь іх пададзеным вышэй сацыялягічным партрэтам. У межах адпаведных групаў колькасьць беларускамоўных беларусаў, якія ўважаюць БНР за першую беларускую дзяржаву, у паўтара разу большая, чымся расейскамоўных! (У апытаньні адсутнічае адказ «Полацкае княства», што гаворыць аб гістарычнай абмежаванасьці саміх сацыёлягаў. Рэмарка Дракахруста «расейскамоўныя ў найменшай ступені схільныя бачыць пачатак беларускай дзяржаўнасьці ў савецкай і постсавецкай гісторыі» падштурхоўвае да думкі, што ён уважае гісторыю станаўленьня БНР часткай расейскай гісторыі савецкага часу.)

Цяпер пра канфармізм расейскамоўных. Дадзеныя, што мноства беларусаў уважаюць Вялікае Княства Літоўскае першай беларускай дзяржавай, зьявіліся на пачатку гэтага году і зрабілі, здаецца, найбольшае ўражаньне на двух беларускіх інтэлектуалаў, якія жывуць па-за межамі радзімы, – пражаніна Юр'я Дракахруста і віленчука Сяргея Дубаўца (апошні асэнсоўваў іх у перадачы радыё «Свабода» «Вострая Брама»). У гэтым яны бачылі гістарычную непазьбежнасьць: як краіна незалежная, яе грамадзяне становяцца незалежнікамі проста так, *«от балды»*.

	Якой мовай Вы карыстаецеся ў штодзённых зносінах?			
	Беларускай	Расейскай	Беларускай і расейскай	Зьмяшанай
ВКЛ (34,6 %)	17,6	42,1	35,4	25,8
БНР (15,1 %)	20,9	13,7	18,2	14,1
БССР (17,0 %)	23,8	11,5	19,4	23,3
РБ (18,2 %)	15,9	17,6	19,6	18,6

Як на мяне, нічога, апрача здольнасьці рэжыму маніпуляваць грамадзкай думкай у якім заўгодна рэчышчы, гэтыя лічбы не паказваюць. І Дубавец, і Дракахруст выпускаюць з-пад увагі, што пасьля абвастрэньня беларуска-расейскіх адносінаў у 2002 г. афіцыйны Менск нейкі час рэзка крытыкаваў нязбытыя

імпэрскія комплексы Масквы і дашукваўся сваёй легітымнасьці ня толькі ў сучаснасьці, але і ў мінуўшчыне. Лукашэнкаўскае абкружэньне загаварыла пра векавыя традыцыі беларускай дзяржаўнасьці. Адну з радыкальных яе трактовак прапанаваў памочнік прэзыдэнта Валер Цапкала, а найбуйнейшая газэта краіны, «Советская Белоруссия» (№ 243 ад 18.10.2002), растыражавала яе ў 314 111 асобніках:

Что же касается предложенных вариантов вхождения Беларуси в Россию, «аншлюсов», как это у нас назвали, то такие сценарии нами никогда серьезно не рассматривались. На белорусский суверенитет даже при СССР никто не покушался. В принципе, если говорить о белорусской политике за последние шесть лет, то Беларусь, сближаясь с Россией, ни разу не ставила вопрос о ликвидации своего суверенитета. Речь всегда шла о сближении настолько близком, насколько это будет возможно без уничтожения суверенитета двух стран. И это же зафиксировано в договоре о союзе и во всех договорах, которые заключались Беларусью и Россией. Тот скандальный официально предложенный Президентом РФ вариант вступления Беларуси в состав России на правах шести или семи субъектов Федерации, который сейчас широко обсуждается, не имеет никакого отношения к тем предложениям об объединении, которые исходили со стороны Беларуси все эти годы. А давний исторический опыт здесь ни при чем. Можно, конечно, вспомнить царские времена, когда Беларусь была губернией или краем, но можно вспомнить и Великое княжество Литовское, государство нынешних белорусов, называвших себя литвинами, простиравшееся почти до Москвы и до Черного моря (вылучэньне наша. – **Аўт.**).

(Мо калі б рэдактар «Звязды» Наркевіч даўмеўся перадрукаваць гэтае інтэрвію ў сваёй газэце, глядзіш, праз год і 40 % беларускамоўных беларусаў палічылі б ВКЛ «сваёй першай дзяржавай»?)

Гэтае ўзьвелічэньне ВКЛ у афіцыйным дыскурсе мела і іншыя імплікацыі, адной зь якіх стала падрыхтоўка за дзяржаўны кошт энцыкляпэдыі ВКЛ у двух тамох пад рэдакцыяй колішняга

аўтара «ARCHE» Валера Пазьнякова, выданьні статутаў ВКЛ і інш.

Сьцьверджаньне, што як «найбольш дынамічная група» грамадзтва расейскамоўныя найбольш падатлівыя ўзьдзеяньню дзяржаўнай прапаганды, лёгка можна аспрэчыць дадзенымі пра іх адданасьць дэмакратычным ідэалам, на якіх мае трымацца іх эўрапейскі выбар.

Не сакрэт, што апошнія гады сталі часам пераходу лукашэнкаўскага рэжыму ад «мяккага» да «жорсткага» аўтарытарызму, які суправаджаўся ўсёабсяжным наступам на структуры грамадзянскай супольнасьці, незалежныя СМІ, закрыцьцём неляяльных навучальных установаў і безьліччу драбнейшых эксцэсаў, апісаных у спэцыялізаванай літаратуры. Як жа на гэта зрэагавала «самая праэўрапейская» сацыяльная група (табл. 3)? Сам Дракахруст чамусьці не прывёў ніякіх лічбаў, дарма што ён карыстаўся «закрытымі» зьвесткамі НІСЭПД, якія адлюстроўваюць сувязь паміж моўнай прыналежнасьцю апытаных і іх адказамі на ўвесь спэктар пытаньняў. Нам даводзіцца выкарыстоўваць толькі адкрытыя матэрыялы.

	04/01	10/01	03/03	09/03	03/04
Так	2,8	4,2	10,5	12,7	11,7
Хутчэй так	22,3	30,2	21,7	26,1	31,7
Хутчэй не	54,3	39,6	38,7	35,1	31,5
Не	20,1	18,2	23,7	20,0	19,1

Як угрунтаванае на гістарычных каштоўнасьцях незалежніцтва, так і праэўрапейскі і дэмакратычны выбар расейскамоўных беларусаў мае характар пустой дэклярацыі, што пастаянна падкрэсьліваюць паразы апазыцыі. Насамрэч беларусы застаюцца закладнікамі эўразійскай палітычнай культуры, а само іх уяўленьне пра Эўрапейскі Саюз і дэмакратычныя каштоўнасьці пераломлена ў крывых люстэрках незадаволенага спажывецкага попыту і заходняй мас-культуры. Яны гавораць пра свой эўрапейскі выбар, нічагусенькі не разумеючы, што гэта значыць.

Формула «ў найбольшай ступені ў Эўропу імкнуцца расейскамоўныя» абсалютна беспрадметная, таму што паняцьце «Эўропа» тут азначае не арганізаваную пры дапамозе палітычных інстытутаў, дэмакратычных стандартаў, культурных традыцый і праўных нормаў супольнасьць, а спажывецкую абстракцыю.

У духу Дракахруста можна дадаць, што з гэтага пункту гледжаньня расейскамоўныя – найбольшая лікам «слабая» сацыяльная група. Да таго ж казус зь іх «незалежніцтвам» выяўляе таксама неразуменьне ім тэхнікі ажыцьцяўленьня палітычнай улады ў Беларусі.

Па-чацьвертае, асыміляцыя беларусаў у расейскую мову і культуру ніколі не была ў строгім сэнсе добраахвотнай, а такая яе дынаміка выявіла няздольнасьць грамадзянскай супольнасьці чыніць супраціў цэнтралізаванаму гвалту. Асыміляцыя вялася мэтадамі таталітарнага грамадзтва, само існаванне якога немагчыма без брахні і прымусу. Пераглянь сёньня з нацыянальных пазыцыяў зьмест гуманітарных дысцыплін у школе і ВНУ (асабліва гісторыі, літаратуры ды мовы) – і заўтра пачнецца браджэньне розумаў. Узьнікненьне «сталічных інтэлектуальных беларускамоўных асяродкаў», якое фіксуе Дракахруст, было немагчымае без разрыву з інфікаванай таталітарызмам айчыннай гуманітарнай традыцыяй на пачатку 1990-х.

Расейскамоўныя будуць панаваць у Беларусі, пакуль мэтай дзяржаўнай палітыкі будзе заставацца жорсткі ідэалягічны кантроль за сьвядомасьцю кожнага шляхам фальсыфікацыі гуманітарных навук, маніпуляцыяў з грамадзкай думкай і адкрытых рэпрэсіяў супраць грамадзянскай супольнасьці. Раней ці пазьней расейскамоўным лібэралам давядзецца сутыкнуцца з дылемай, самога існаваньня якой, яны, мабыць, яшчэ не ўсьведамляюць. Што мае быць сапраўдным прыярытэтам іх палітычнай дзейнасьці – адстойваньне палітычных інтарэсаў расейскамоўных (і перадусім першага зь іх – недапушчэньня зьмяншэньня іх колькаснага складу) або эўрапеізацыя і дэмакратычная трансфармацыя грамадзтва? Тое, што гэтыя інтарэсы могуць быць несумяшчальныя міжсобку,

паказаў кароткі дэмакратычны эпізод у найноўшай гісторыі Беларусі. (Таксама аказалася, што інтэрас расейскамоўных у захаваньні свайго дамінантнага становішча ў грамадзтве значна больш пераканаўча артыкулююць і адстойваюць рашуча настроеныя прыхільнікі аўтарытарызму.) Дэмакратызацыя, публічнасьць у абмеркаваньні грамадзка значных культурных праблем мацней ударае па моўна-культурных інтарэсах расейскамоўных, падрывае дарагое ім самаўяўленьне як пра культурнага гегемона і культуртрэгера на гэтай зямлі.

Па-пятае, Лукашэнка ёсьць не адыходзячай, а надыходзячай фігурай. Калі ўлада ў Беларусі будзе і надалей беспасярэдне выходзіць ад народу, а не прызначацца асьвечанымі кіраўнікамі суседніх дзяржаваў, палітычны лідэр будзе так ці інакш насьледаваць палітычнай культуры масаў. Пакуль масавая палітычная культура будзе такой, якой яна ёсьць цяпер, а разьвітая нацыянальная ідэнтычнасьць і глыбокі нацыянальны этас будуць заставацца ў праекце, лукашэнкі будуць прадукавацца па змаўчаньні яшчэ не адно пакаленьне. Само ўспрыманьне Лукашэнкі як «адыходзячай фігуры» або «выпадковага прэзыдэнта» дэмаскуе таксама навеяную вульгарным пазытывізмам веру расейскамоўных лібэралаў ува ўсеагульны прагрэс і непазьбежную замену благога добрым. Ці не таму яны часта спагадліва ставяцца да т. зв. беларуска-расейскай інтэграцыі, бо хочуць, каб на зьмену амаральнаму, кепска выхаванаму і хамаватаму *тутэйшаму* прыйшлі прызначаныя з Масквы культурныя кіраўнікі?

Выбар Лукашэнкі быў не выпадковым выбарам, а пачаткам праўдзівай беларускай дэмакратыі. Наш першы прэзыдэнт прыйшоў з народу, якога мучае цяжкая культурная спадчына. Заваяваць народную любоў пакуль могуць неперабарлівыя ў маральна-этычных пытаньнях напорыстыя асобіны мужчынскага полу.

Па-шостае, самі расейскамоўныя лібэралы перажываюць сур'ёзныя праблемы з сваёй культурнай і палітычай ідэнтычнасьцю. Ужо тое, як Дракахрустам падаюцца беларускамоўныя беларусы – зьведзеныя да стану дэструктыўнай сэкты чалавеканенавісьнікі, распальнікі

міжнацыянальнай варажнечы, – азначае, што па сутнасьці ён атаесамляе сябе з тымі, хто задаволены культурным рэваншызмам Лукашэнкі ці, прынамсі, лічыць яго заканамерным наступствам дэмакратычнага эпізоду пачатку 1990-х. Т. зв. ідэолягі «беларускай Беларусі» ўзбуджаюць ў аўтара «Жэнэўскай канвэнцыі…» больш непрыязнасьці, чым улада і яе апарат. У цяперашніх умовах гэтую пазыцыю ў найлепшым выпадку можна расцаніць як праяву інтэлектуальнага канфармізму. З такімі поглядамі, за выняткам колькіх гіпэрпалемічных ацэнак, мог бы лёгка выступаць і работнік ідэалягічнай вэртыкалі.

Зларадна ліючы жоўць з нагоды рэваншу «гома саветыкуса» ў Беларусі, расейскамоўны інтэлектуал насамрэч толькі падкрэсьлівае сваю далечыню ад «эўрапейскасьці» і элемэнтарнае неразуменьне свайго месца ў публічнай прасторы. У Эўропе інтэлектуалы выпрацоўваюць нацыянальную ідэнтычнасьць і крытыкуюць усе аспэкты грамадзкага жыцьця. У Беларусі яны наймаюцца ахоўнікамі каляніяльнай культурнай спадчыны.

Па-сёмае, супрацьстаўленьне лібэральнага [расейскамоўнага] і нацыяналістычнага [беларускамоўнага] праектаў штучнае і ірацыянальнае. Немагчыма давесьці, што лібэральны нацыяналізм расейскамоўных лепшы за лібэральны нацыяналізм беларускамоўных. Іншая рэч, што апошні горай распрацаваны і праартыкуляваны ў інтэлектуальным полі.

Я далёкі ад думкі, каб тлумачыць зьвядзеньне беларускага нацыяналізму да яго далёка ня самай пашыранай этнічнай разнавіднасьці асаблівасьцямі псыхікі або сацыялізацыі таго, хто так робіць. (У гэтым вінаватыя перш-наперш беларускія інтэлектуалы, якія не дарабілі да ладу свайго праекту лібэральнага нацыяналізму, хоць у апошнія гады назіраецца зрух.) Але гэтае зьвядзеньне сьведчыць пра крайнюю няўважлівасьць да нацыянальнай культуры.

Па-восьмае, з таго, што сёньня палавіна ці больш беларусаў гаворыць па-расейску, не вынікае, што так будзе і заўтра. Перамога расейскамоўных ня ёсьць гістарычна непазьбежнай, а моўны рэфэрэндум 1995 г. не паклаў канца моўнай гісторыі

Беларусі. Гэтая падзея выявіла адно асаблівасьці разьвіцьця мадэрнага беларускага нацыяналізму як гістарычна запозьненага руху, які стартаваў у варунках распачатай імпэрскім цэнтрам мадэрнізацыі, за што ад самага пачатку яму давялося заплаціць звужэньнем базы падтрымкі. Можна гаварыць нават пра пазытыўнае значэньне рэфэрэндуму: ён дапамог зразумець, хто мы, дзе мы, адкуль мы прыйшлі і куды мы ідзём. Беларусы нарэшце апынуліся ў сваім гістарычна-культурным часе, вырваўшыўся з палону часу міталягічна-ўтапічнага, за які чапляюцца некаторыя «нацыянальныя ідэолягі». Цяпер можна спакойна падлічваць балянс здабыткаў і стратаў.

Духоўныя лідэры, ведучы за сабой людзей, зьмяняюць культуры. Для беларуса, які сур'ёзна чытаў Францішка Багушэвіча, пісаць не на роднай мове азначае мучыць сябе згрызотамі сумленьня. Нейкую духоўную рэакцыю можа выклікаць па сабе і Лукашэнка.

Па-дзявятае, што ні б гаварыў Лукашэнка і што б ні думаў сабе Дракахруст, беларусы насамрэч цудоўна паддаюцца нацыяналістычнай мабілізацыі. У 1917 годзе падчас выбараў ува Ўстаноўчы сход за блёк беларускіх партыяў прагаласавала 0,3 % выбарцаў (гэтая лічба асабліва кантраставала з 5 млн украінцаў, якія аддалі свае галасы за ўкраінскія партыі). Як ужо гаварылася, у 1994-м «нацыяналісты» Шушкевіч з Пазьняком атрымалі 22,7 % галасоў. За няпоўныя 80 гадоў прыхільнасьць да «нацыянальных» палітыкаў павялічылася ў 75 разоў (праўда, у 1917-м галасавалі толькі жыхары таго абшару Беларусі, які знаходзіўся ў зоне расейскай акупацыі, але гэта прынцыпова карціны не зьмяняе).

Па-дзясятае, сёньняшняя ўлада не «бэтонная пліта», але вытвар вельмі пэўнай палітычнай і культурнай традыцыі. Сакрэт яе непахіснасьці наўпрост залежыць ад працьвітаньня гэтай традыцыі.

Па-адзінаццатае, беларускамоўныя беларусы ніколі аднаасобна не фармулявалі нацыянальнага праекту ці, хутчэй, фармулявалі яго па паперы, тым часам як іх ідэалягічныя апанэнты – на мове дзяржаўных інстытутаў і палітычных

рашэньняў.

І *апошняе* – нацыя дагэтуль так і не пачула ад расейскамоўных лібэралаў уцямнага адказу на пытаньне «Чаму Беларусь ня Аўстрыя, а эўразійская сатрапія?».

І расейскамоўныя лібэралы, і этнічныя нацыяналісты дагэтуль на гэтае пытаньне адказвалі падобна. Узыходжаньне Лукашэнкі на прэзыдэнцкую пасаду падавалася як спрычыненая трагічным зьбегам абставінаў прыкрая выпадковасьць, раптоўнае адхіленьне, як нічым не запраграмаваны збой у пасьлядоўным разгортваньні руху да прагрэсу / нацыянальнага адраджэньня. Разыходжаньні ж пачыналіся на ўзроўні праграмных высноваў з гэтага досьведу.

Першыя інтэрпрэтавалі Лукашэнкаў узьлёт як знак таго, што беларусы не да канца цывілізаваліся праз высокую расейскую культуру і таму ў народзе дзе-нідзе ўспыхваюць языкі цемрашальства і нацыяналізму – гэтых двух тутэйшых цёмных рухаў. Але ў меру набліжэньня і зьліцьця з «высокай расейскай культурай» яны адыдуць у нябыт. Другія бачылі ў Лукашэнку марыянэтку, якую прыводзяць у дзеяньне хітрыкі КГБ, заходніх дэмакратый, газавых манапапістаў, своекарысьлівай мэдыяэліты, нямецкай выведкі і Міжнароднага валютнага фонду.

Існуе яшчэ і трэці, праўда, малазапатрабаваны варыянт адказу на гэтае пытаньне. Беларусь ня Аўстрыя, а эўразійская сатрапія таму, што цяперашняя Эўропа – гэта Эўропа нацый, а не культурных калёній. Каб стаць яе арганічнай часткай, трэба парваць з тутэйшай каляніяльнай традыцыяй, у якую як неад'емны атрыбут імплянтаваны палітычны аўтарытарызм.

У адрозьненьне ад Аўстрыі, у Беларусі існуюць, з аднаго боку, нацыянальны рух, а з другога – дзікунская палітычная культура, якую прынёс з сабой каляніяльны праект. Нацыянальны рух сам празь сябе тут ня ў стане дасягнуць палітычнай перамогі. У найлепшым разе ён здольны заявіць аб

сваіх намерах усяму грамадзтву пры тэндэнцыйным пасярэдніцтве дзяржаўных і іншых варожых мэдыяў. Пакуль гэтая тэндэнцыя будзе існаваць, будуць знаходзіцца палітыкі, ахвочыя паразытаваць на вечным рухавіку палітычнага папулізму, які эксплюатуе хімэры этнічнага нацыяналізму. (Водгукі такой пазыцыі ёсьць і ў Дракахруста: ня лезьце вы з гэтай беларускай мовай, не стварайце штучнага нэгатыву вакол моўна-культурных пытаньняў, не правакуйце нашых палітыкаў і грамадзянаў на рашучыя адказы. І пасьля, для пераканаўчасьці, параўнаньне з блізкаўсходнім – не эўрапейскім, бо Эўропа прынамсі на ўзроўні прынцыпаў паважае права на адрознасьць і вызнае талерантнасьць, – ваенным тэатрам. Як на мяне, гэта выразны прыклад перакладаньня справы з хворай галавы на здаровую: ня трэба абвінавачваць тых, хто змагаецца за правы моўнай меншыні, трэба адвучаць бальшыню чыніць тыранію.)

Існуе толькі адзін праверaны суседнімі нацыямі шлях уваходу ў цывілізацыйную прастору Захаду – нацыятварэньне, зразуметае не як распальваньне міжнацыянальнай варожасьці, а як прышчапленьне масам створанай элітамі нацыянальнай ідэнтычнасьці. Усе іншыя варыянты забясьпечваюць у лепшым выпадку стагнацыю, у горшым – сярэднеазіацкую пэрспэктыву. Як пісаў нямецкі палітоляг Герхард Сыман, «шлях да дэмакратыі праз тварэньне нацыі, без сумневу, поўны небясьпек, але іншых шляхоў папросту няма». На думку амэрыканскага тэарэтыка нацыяналізму Рамана Шпарлюка, мадэрнае нацыятварэньне можа адбывацца толькі ў дачыненьні да Захаду. (У перакладзе на звычайную мову: Беларусь застанецца часткаю Эўразіі датуль, пакуль тут ня ўзьнікне мадэрнай нацыі; а калі мадэрная нацыя ўзьнікне, нацыянальная, а не каляніяльная мова і культура зь неабходнасьцю будуць часткаю нацыянальнай ідэнтычнасьці.)

Змаганьне з этнічным нацыяналізмам – гэта фальшывая мэта, навеяная задушлівай духоўнай атмасфэрай сёньняшняй Беларусі. Усё ХХ стагодзьдзе беларускі этнічны нацыяналізм быў малалікім і малаўплывовым анэмічным рухам, на фоне якога так лёгка адчуваць сябе пераможцам і небясьпека якога наўмысна гіпэрбалізавалася

прапагандыстамі-«інтэрнацыяналістамі».

Стратэгічнай мэтай нашай інтэлектуальнай супольнасьці, прадметам свайго роду негалоснай канвэнцыі можа стаць супольнае тварэньне мадэрнай беларускай ідэнтычнасьці, крытыка каляніяльнай традыцыі, разбудова грамадзянскай супольнасьці. Як у расейскамоўных, так і ў беларускамоўных лібэралаў шанец уплываць на палітычныя рашэньні можа зьявіцца толькі пасьля перагляду мэханізмаў ажыцьцяўленьня ўлады ў краіне.

На жаль, шанцы на ўкладаньне такой канвэнцыі застаюцца пакуль мізэрнымі дзякуючы вышэйпамянёнаму крызысу ідэнтычнасьці расейскамоўных інтэлектуалаў. Прыняць ідэю, што Беларусь эўрапейская будзе Беларусяй дэкалянізаванай, азначае паставіць крыж на праекце акультурваньня Беларусі пры дапамозе расейскай мовы і культуры ў той момант, калі яму даў другое жыцьцё прэзыдэнт Лукашэнка. А таксама давядзецца раней ці пазьней адмовіцца ад прэтэнзіі на «культурную гегемонію» і, ня выключана, прызнаць свой дыяспарны статус, як, напрыклад, гэта зрабіла расейская інтэлігенцыя ў Прыбалтыцы.

Пакуль расейскамоўныя інтэлектуалы будуць бачыць у разьвітаньні з каляніяльнай культурнай спадчынай, якая перашкаджае эўрапеізацыі і дэмакратызацыі грамадзтва і блякуе мадэрнізацыю нацыянальнай культуры, паразу, пра такую канвэнцыю няма чаго і гаварыць.

Аўдоцьця Агафонава памерла ўвосень 1998 г. у Менску, маючы 76 гадоў. У 1982-м яна страціла сваю адзіную сястру Лену, якая адышла ў лепшы сьвет у Кемераве. Іх маці памерла ад раку на Першамай 1937 г., бацька – на вачох Аўдоцьці ўвесну 1942 г. у блякадным Ленінградзе.

Юзэфа Бурак памерла ўвосень 1993-га ў пад'івянецкай Сівіцы, пражыўшы 95 гадоў. Яна была адзінай дачкой у сям'і Яна і Валеры (з Даўнароў) Калачыкаў, мела шасьцёх братоў. Яе

старэйшы брат Францiш эмiграваў у амэрыканскi Дэтройт яшчэ перад першай сусьветнай вайной, у 1912, тры (Аляксандар, Станiслаў i Костусь) – уцяклi ў Польшчу па другой сусьветнай. Дажываць свой век на роднай зямельцы ёй доля судзiла толькi з братамi Вiнцэнтам i Мiхасём.

Калi Аўдоцьця i Юзэфа былi разам, часам здавалася, што яны блiзкiя да паразуменьня, а часам – што i не.

[image]
[image]

Лiст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/2/28
[image]

[image]

A R C H E

[image]

[image]

[image]

[image]2004

[image]

[image]

Пётра Садоўскі Калі фармальная лёгіка недарэчы…

уў я некалі ў дзяцінстве такі выраз: пытацца ў ксяндза, ці ў нядзелю сьвята. Гаварылі так чалавеку, які з простых зразумелых рэчаў рабіў праблему. Гэтыя словы я часта ўзгадваю, калі чытаю некаторыя сацыялягічныя дасьледаваньні. Вось чарговы раз пацешыўся, прачытаўшы ў «ARCHE» (2004. № 3) артыкул кандыдата фізыка-матэматычных навук Юр’я Драхакруста «Жэнэўская канвэнцыя для вайны культураў». Ужо ня першы раз аўтар

П а ч а т а к № 5 (34) - 2004

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

ПЁТРА САДОЎСКІ кандыдат філялягічных навук.

паводле
фармальных
матэматычна-
статыстычных
дасьледаваньняў
сьцьвярджае,
што
«беларускі
нацыяналізм
гаворыць па-
расейску».
Так, дарэчы,
называўся
ягоны
колішні
(1998 год)
артыкул у
«БДГ».

Ува ўзгаданай архэўскай публікацыі дыплямаваны матэматык і «палітычны публіцыст» – так прэзэнтуе яго рэдактар артыкулу – ужо ў 2004 годзе зноў рэзюмуе: *«Расейскамоўныя па-ранейшаму застаюцца больш прыхільнымі да дэмакратычных каштоўнасьцяў і эўрапейскага выбару, чым беларускамоўныя. Парадаксальна, але беларускамоўныя таксама менш даражаць нацыянальнай незалежнасьцю»*.
Для доказу сп. Драхакруст спасылаецца «на *зьмястоўны* выступ» (палітэс!) Вінцука Вячоркі на Зьезьдзе ТБМ у 2003 годзе і палемізуе зь ім, каго лічыць беларускамоўным. Не закранаючы зьместу палемікі, толькі адзначу, што сп. Вячорка рэфэраваў у чыста сацыялінгвістычным дыскурсе, не закранаючы аспэкту выбару дэмакратычных каштоўнасьцяў. Таму ўсе рэфлексы ў гэты бок абсалютна некарэктныя. Гэта першая памылка фармальнай лёгікі. Так можна сьцьвярджаць, што брунэты больш заангажаваныя дэмакратыяй у параўнаньні з бляндынамі, правёўшы экспэрымэнт на бліжэйшых да Захаду гарадзенцах і больш замбаваных расейшчынай віцяблянах. Ёсьць назіраньні, што ў Горадні больш цёмнавалосых, чым у Віцебску. Пісаў жа некалі Ўладзімер Караткевіч – «гарадзенцы-гракі»!

Другая хіба: аўтар ня хоча разумець сэмантыкі ключавога сэнсавага слова экспэрымэнту – *выбар*. Зразумела, адкуль ён набірае беларускамоўных душ, непрыхільных да эўрапейскіх каштоўнасьцяў, – зь ліку вясковых пэнсіянэраў, што рэгулярна атрымліваюць пэнсію, часта большую, чым калгасныя заробкі. Іхная мова – беларуская дыялектная, але ж *яны яе не выбіралі! Яны аўтахтоны ад Бога і гісторыі. Ня могуць яны зрабіць і выбар жыцьцёвых каштоўнасьцяў, бо бачылі і бачаць толькі адзін член бінарнай апазыцыі – савецка-калгасную рэчаіснасьць*. Яны ж апраменьваюцца лукашэнкаўскімі СМІ. Той зь вяскоўцаў, хто дагэтуль помніць, дзе была ладная прадзедаўская дзялка ворнай зямлі ды колькі гектараў лесу, і захоўвае сярод пажоўклых фатаграфій у прыскрынку акт куплі той дзялкі, што датуецца канцом 20-х гадоў мінулага стагодзьдзя, ня мае расейска-савецкай арыентацыі. Гэта ж найпрасьцейшая сацыялёгія! Тут мова і блізка не стаяла.

Што да беларускай мовы гарадзкой інтэлігенцыі, то тут таксама ня трэба хадзіць ні да ксяндза, ні да папа. Хто выбраў сьвядома беларускую мову, дзе за яе на вуліцы могуць паламаць рэбры лукашэнкаўскія міліцыянты, той не касавурыцца ў бок Масквы ды калгаснага ладу. Таіса Бондар, Мікола Мятліцкі, Слава Дашкевіч і яшчэ сёй-той, хто корміцца ад арнамэнтальнай беларушчыны ды шамшурства, – маргіналы, якія былі і будуць у кожнага аўтарытарнага рэжыму.

Колькасна параўноўваць расейскамоўных і беларускамоўных «дэмакратаў» яшчэ некарэктна таму, што расейскамоўных – і прагрэсістаў і рэтраградаў, здатных рабіць выбар, – увогуле больш, чым беларускамоўных. Усе ж ведаем гісторыю моўнага пытаньня ў Беларусі. Тут важна разумець, як павярнуць гэты двухчлен. А то ў сп. Драхакруста лягічны прэдыкат (гэта ў лінгвістычным сэнсе!) павернуты так, што выходзіць: той, хто пераходзіць на беларускую мову, рухаецца ў бок касмапалітызму і рэтраградзтва. Брава!

Я далёкі ад таго, каб вінаваціць сп. Драхакруста ў непрыязнасьці да беларускага. Ён жа зарабляе свой хлеб на беларускай «Свабодзе». Тут уся справа ў фармальнай лёгіцы.

[image]

[image]

№ 5 (34) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/2/28
[image]

Мыслыя (3'2000)
[image]
ARCHE
[image]
[image]
[image]
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае
Пачатак • Навіны • Форум • Пошук • Аўтары • Цалкам •

для гэткіх пошукаў выклікае сумненні). У гэтай частцы спадар Дракахруст выступае ў emploi асцярожнага навукоўца і дазваляе сабе адно аб'ектыўна-стрыманы сціслы каментар.

У другой, меншай памерам, частцы навуковец без папярэджання перакідваецца ў прарока і публіцыста. Ужо не стосы сацыялагічных працэнтаў, але асабістая перакананасць кладзецца ў грунт меркаванняў, характар якіх месцамі нельга пазначыць інакш, як нетрывіяльны.

Пры бліжэйшым разглядзе і метадалогія навуковай часткі выглядае па-валюнтарысцку адвольнай. Моўныя паводзіны чалавека разглядаюцца быццам акт ягонага аднаасобнага выбару (аўтар палемізуе ў гэтым пытанні з В. Вячоркам і выносіць прысуд пра «досыць абмежаваны ўплыў «вонкавых фактараў»). Але што больш уплывае на выбар месца прыпынку кіроўцам: ягоныя асабістыя ўпадабанні ці правілы ды сістэма дзяржаўных органаў, якая іх падтрымлівае? Залежыць ад абставінаў, але ніводнае даследаванне не мае права забывацца на Правілы і ДАІ. Падабенства з моўнымі паводзінамі, на мой погляд, несумненнае.

Выбар сродкаў камунікацыі залежыць ад асабістых упадабанняў – але ж не аднаго, а абодвух бакоў. Менавіта таму аўтар гэтых радкоў карыстаецца беларускаю моваю ў штодзённых зносінах у мінімальным аб'ёме, у размовах з вузкім колам людзей, і ў гіпатэтычным апытанні залежна ад настрою адказаў бы, што карыстаецца або выключна расейскай, або беларускай і

расейскай. Але з ахвотаю гаварыў бы па-беларуску часцей. Дык вось пра моўныя ўпадабанні спадар Дракахруст не згадвае. Затое шырака аналізуе ўпадабанні палітычныя.

Не маючы глыбокіх ведаў у сацыялогіі, я паводле беларускай звычкі думаю: а можа, гэтак трэба? З аднаго боку – практыка, з іншага – каштоўнасці. Ну, і карэляцыя паміж імі. (А ў нашым выпадку, хутчэй, ейная адсутнасць.) Але ў ракурсе заяўленых мэтаў даследавання цікава было б вывучыць моўную практыку versus моўныя ўпадабанні, перш чым шукаць сувязь паміж мовай і палітыкай: паводзіны больш жорстка дэтэрмінуюцца грамадствам, упадабанні маюць шырэйшы дыяпазон свабоды. Прааналізаваны Дракахрустам сацыялагічны матэрыял (у чарговы раз) не супярэчыць пашыранаму ў беларускамоўным асяроддзі меркаванню: паколькі стаўленне да беларускай мовы з боку ўлады на працягу значнага часу непрыхільнае (паводле вызначэння самога Дракахруста – «варварскае»), гавораць па-беларуску або на ніжэйшых драбінах сацыяльнай лесвіцы (прадстаўнікі «слабых» сацыяльных групаў, словамі Дракахруста), або людзі, свядома ангажаваныя ў змаганне за мову. З гледзішча здаровага сэнсу цалкам праўдападобнай выглядае гіпотэза, што палітычныя ўпадабанні згаданых групаў беларускамоўных будуць істотна розніцца, таму аб'яднанне іх у адну выглядае малапрадуктыўным для заяўленых мэтаў даследавання. «Прырода сувязі моўных паводзінаў з палітычнымі» ў вясковага трактарыста і сталічнага выкладчыка наўрад ці будзе аднолькаваю, але абраным даследчыкамі шляхам гэтая розніца хутчэй нівелюецца, чым выяўляецца. Вынікі разгледжанага даследавання дадаюць толькі, што па-ранейшаму першая група беларускамоўных пераважае, – магчыма, за выняткам сталіцы.

Не варта замоўчваць гіпотэзу, якая цалкам кладзецца на вынікі даследавання, толькі таму, што яна пашыраецца прыхільнікамі ўжытку беларускай мовы. Яны могуць мець рацыю, хай сабе гэткае прызнанне шкодзіць спадару Д. у крытыцы іхніх базавых ідэалагемаў, да чаго ён звяртаецца, расклаўшы перад чытачом мазаіку сацыялагічных лічбаў. Зыходзячы з вышэйпададзенага, я лічу гэтую ягоную крытыку на падставе атрыманых у даследаванні дадзеных, сказаўшы мякка, небездакорнай. З аднаго боку, нельга не пагадзіцца, што беларускамоўныя не вызначаюцца ні больш высокай адукацыяй, ні маладосцю, што

гэта не найбольш «прасунутая», дынамічная група насельніцтва, што беларускамоўныя статыстычна больш прыхільныя да аб'яднання з Расеяй і варожыя да еўрапейскай традыцыі. З іншага боку, як выглядаў бы малюнак, калі за аснову бралася не толькі фармальная, але і ўнутраная беларускамоўнасць, пашана (даруйце зацёганы выраз) да роднай мовы?

Мэта маіх пярэчанняў не ў рэабілітацыі любым коштам светлага імя беларускамоўных. Грунтуюся на ўласным коле знаёмых: сярод расейскамоўных ёсць «цвёрдыя іскраўцы», варожыя кожнаму беларускаму слову, а ёсць людзі, якія шчыра саромеюцца сваёй няздольнасці гаварыць па-беларуску. Казаць пра іх як пра маналіт гэтак жа няслушна, як пра беларускамоўных. Гэтак можна даводзіць адсутнасць прыхільнікаў нудызму шляхам вывучэння натоўпу на праспекце Скарыны падчас дэманстрацыі 7 лістапада.

Абраныя метады аналізу перашкаджаюць заяўленым пошукам «прыроды». Скідаючы акадэмічную тогу, спадар Дракахруст зазначае, што цяперашнія беларускамоўныя наўрад ці могуць прэтэндаваць на ролю будаўнікоў ідэальнай дэмакратычнай «беларускай Беларусі» з прычыны як колькасці, гэтак і якасці. Але да будаўніцтва могуць далучыцца тыя, каго ён запісаў у расейскамоўныя і без выразных на тое падставаў надзяліў агульным і адрозным ад беларускамоўных (ды яшчэ і варожым, хаця з ягоных уласных сацыялагічных выкладак больш абгрунтаванай выглядае супрацьлеглая гіпотэза) стаўленнем да вышэйзгаданага праекту. Чамусьці гэтая думка засталася па-за гарызонтам.

Здзіўляе ўпэўненасць, з якой публіцыст гаворыць пра праект «беларускай Беларусі» як пра нешта выразна акрэсленае (і нават супрацьпастаўляе менш чытэльным абрысам праекту, які, на ягоную думку, падтрымліваюць расейскамоўныя насельнікі Беларусі). Фактычна ж адзінаю пэўнаю рысаю «беларускай Беларусі» выступае ў Д. выкарыстанне беларускай мовы. Але ж, карыстаючыся ягонымі ўласнымі лічбамі і здаровым сэнсам, лёгка прыйсці да высновы, што найбольшае, чаго могуць дамагацца (у марах, натуральна, толькі ў марах!) прыхільнікі беларускага праекту ў блізкай і сярэдняй перспектыве, – роўнага статусу расейскай і беларускай моваў у Беларусі. На большае, калі адкінуць палемічны запал, не гатовыя самыя

гэтыя прыхільнікі (улучаючы аўтара гэтых радкоў).
Думаю, спадар Д. гэта ведае. Але і ведама яму, што роўны статус – небяскрыўдная рэч: ён (ці не найперш) выключае магчымасць разглядаць вышэйшую (а ў прынцыпе і ўсякую іншую) адукацыю без ведання беларускай мовы як поўную і дасканалую, што ў сваю чаргу немагчыма без паўнавартаснага ўключэння яе ў навучальны працэс, – і дзе мы апынаемся са знакамітым (без двукоссяў) ЕГУ, хай сабе ягоныя выпускнікі ведаюць па чатыры заходнееўрапейскія мовы? Прыклад з жыцця: у беларускамоўным (закон змушае) загалоўку новага дзяржаўнага стандарту, старанна і даволі трапна перакладзенага з нямецкай, з пяці беларускіх словаў у двух – памылкі. Адукацыі не хапіла.
Ведама спадару, што, зыходзячы з сённяшняга статусу і стану беларускай мовы, дасягненне роўнага статусу запатрабуе шэрагу affirmative actions, каб кампенсаваць існуючы дысбаланс, выкліканы не столькі моцай уласнабеларускай расейскамоўнай стыхіі (якую зноў жа трэба не так адольваць, колькі асіміляваць), але і магутным уплывам інфармацыйнага поля вялікага ўсходняга суседа. Разважанні на гэткую тэму сёння нагадваюць дыскусіі пра мэтазгоднасць тэрафармавання Марса, але думкі спадара Дракахруста маюць далекасяжную стратэгічную накіраванасць. Ён хоча мець гарантыі на ўсе выпадкі.
Наступная нацяжка – імпліцытнае сцверджанне, быццам, карыстаючыся пазначэннямі з артыкула, *беларуская культура змагаецца з культураю расейскамоўных насельнікаў Беларусі*, а не з расейскаю культураю, крыніцаю якой з’яўляецца найперш насельніцтва Расейскай Федэрацыі. Гэтае, сціпла фармулюючы, перабольшанне падказвае, што паважаны публіцыст уважае сябе голасам расейскамоўных супляменнікаў, перадусім занятых у сферы культуры і адукацыі. Робіцца зразумелаю дзіўная арыентаванасць ягонага шляхетнага закліку наконт Жэнеўскай канвенцыі «ў вайне культураў». Па-першае, ён скіраваны выключна на гіпатэтычнае будучае сутыкненне пасля меркаванай дэмакратызацыі рэжыму. Па-другое, выразна адрасаваны свядомым беларусам. Чамусьці сённяшняе *варварскае* стаўленне да беларускай мовы і культуры не натхняе публіцыста заклікаць да стрыманасці і павагі расейскамоўных, хаця ў іхнія ветразі дзьме ўладны вецер, і

спакуса паддацца злоўжываннем актуальнейшая менавіта для іх.
Дракахруст засцерагае ад дэманізацыі расейскамоўных, не заўважаючы, якімі чарцянятамі атрымліваюцца ў яго загнаныя (уладамі, выключна ўладамі…) у кут «свядомыя». Ён дадае мазок за мазком, і нястрымная хваля красамоўства падмывае ягоную ж шляхетную пабудову. Ахопленыя жарсцю татальнага рэваншу ў светлай будучыні, прыхільнікі беларускай мовы прагнуць крыві і бачаць ворага ў кожным, хто гаворыць не па-беларуску… Якім высакародным трэба быць, каб прапанаваць крыважэрным няўклюдам з навукова даведзеным ніжэйшым сацыяльным статусам Жэнеўскую канвенцыю! Ці не дарма гэта?
Адным словам, паддаўшы даўно заслужанай крытыцы самасуцяшальныя ідэалагемы нацыяналістаў, спадар Дракахруст дэманструе ў дзеянні свой набор сумнеўных аксіёмаў. Вось некаторыя з іх:
— *актуальныя моўныя паводзіны індывіда адназначна адбіваюць ягоныя моўна-культурныя прыхільнасці (то бо' імпліцытна сцвярджаецца адсутнасць моўнага прымусу ў штодзённым жыцці);*
— стаўленне да беларускай мовы як каштоўнасці прынцыпова розніцца ад стаўлення да такіх сімвалаў беларускасці, як БНР і ВКЛ, мова разглядаецца выключна як інструментальны атрыбут або прыкмета знарочыстай беларускасці;
— віна за глум з беларускага ляжыць выключна на ўладах і толькі ўладамі ён здзяйсняецца (спадар Д. пазбягае гістарычных экскурсаў, але ўсё ж не рызыкуе падаць сённяшняе стаўленне да моўнага пытання як выключную з'яву);
— беларускамоўныя маюць распрацаваны праект татальнага і прымусовага збеларушвання Беларусі;
— выраз «вайна культураў» азначае будучае гіпатэтычнае сутыкненне беларускамоўных з расейскамоўнымі і аніяк не стасуецца да сённяшніх дачыненняў у моўнай сферы;
— расейскамоўныя беларусы асягнулі выдатных поспехаў на ніве беларускай культуры;
— гэтыя дасягненні ігнаруюцца і дыскрымінуюцца выключна з прычыны іхняй расейскамоўнасці.
Апошнія два тэзісы – голас расейскамоўных культурнікаў Беларусі. Як прыклады згадваюцца творчасць Святланы

Алексіевіч і ЕГУ. Непрыхільнасць да беларускай мовы істотна абясцэньвае акадэмічны ўзровень згаданай установы, але калі хто публічна называе сябе беларускім пісьменнікам, не застаецца нічога іншага, як пагадзіцца, хай сабе чалавек піша на фарсі. Натуральней беларускаму пісьменніку пісаць па-беларуску, але выбар за творцам, калі ж творы вартыя, будзе праца перакладчыкам.

Пагроза, што беларуская культура не палічыць такога аўтара за свайго, сапраўды рэальная. Алеся Адамовіча з задавальненнем папракалі касмапалітызмам, бо з гістарычных прычынаў беларуская літаратура насцярожана, амаль што хваравіта ставіцца да найлягчэйшых праяваў касмапалітызму ў беларускіх творцаў. Нават больш: у барацьбе за выжыванне (у вайне культураў) паўстала сістэма недарэчных, звонку гледзячы, жанравых і тэматычных абмежаванняў. Няма нейкага асаблівага стаўлення да расейскамоўных творцаў – гэта вынік адчування літаратураю (і культураю ў цэлым) сваёй слабасці: боязь змагання на роўных аднолькава перашкаджае лічыць паўнавартымі творцамі што аўтараў дэтэктываў, што расейскамоўных творцаў. Згаданая Святлана Алексіевіч магла б моцна спрычыніцца да разбурэння гэтых штучных абмежаванняў – і ейны ўплыў быў бы непараўнальна большы, калі б рэвалюцыя адбывалася знутры, калі б яна пісала па-беларуску.

Ёсць, аднак, і іншы бок праблемы, калі для вызначэння маштабу дасягненняў прыцягваюцца замежныя меркаванні. Расейскамоўнаму аўтару лягчэй прыцягнуць да сябе ўвагу шырэйшых колаў. На мой густ, «Адзінец» Яраслава Пархуты – твор не менш глыбокі і выдатны, удзячны для інтэрпрэтацыі, чым кнігі Святланы Алексіевіч, і ў тым жа жанры non-fiction, але хто пра яго чуў у Парыжы і Берліне? Не толькі ў коле беларускамоўных творы на розных мовах сустракаюць па-рознаму, для расейскамоўнай аўдыторыі гэта ўласціва ў яшчэ большай ступені.

Паводле маіх назіранняў, дзейнасць беларускіх пісьменнікаў незнаёмая расейскамоўнай частцы насельніцтва нават на ўзроўні імёнаў. Хто па-за межамі чытальнікаў па-беларуску ведае Мудрова ці Глобуса, Разанава ці Булыку? Прычына ў адсутнасці (ці скрайняй малалікасці) кола расейскамоўных беларусафілаў. Калі б гэтае звяно функцыянавала як належыць,

немагчымаю была б **добрая** настаўніца расейскай літаратуры, якая чуць не чула пра «Сказ пра Лысую гару» нават пасля апошніх скандальных разборак паміж Гілевічам і Аўрамчыкам. Цяжэй давалася б і ўзаемная дэманізацыя, якая аднолькава шкодзіць абодвум бакам. Нельга не пагадзіцца са спадаром Дракахрустам, што ўва ўмовах дэмакратыі яна можа спарадзіць доўгую серыю разбуральных рэваншаў пра- і анты-беларускіх сілаў, і не толькі на вузкім моўным полі. Калі хочаш пераадолець гэтую тэндэнцыю, крытыкуй хутчэй не супраціўны бок, а свой. Паколькі спадар Дракахруст можа разглядацца сваім абодвума бакамі, варта адзначыць, што для свядомых беларусаў ён зрабіў добрую справу. Цяпер мо' дапаможа расейскамоўным братам?

На гэтым можна было б і спыніцца, але сфакусаванасць на мове (для адных – фетыш, для іншых – пудзіла) збрыдзела мне не менш, чым спадару апаненту. Мова – не сродак будаўніцтва «беларускай Беларусі», гэта згаданая Беларусь – месца ўтульнага пражывання мовы. Нам залежыць, каб мове было ўтульна, бо мы любім і паважаем яе, яна (як тая гісторыя, якую, паводле сацыёлагаў, гэтак шануюць расейскамоўныя беларусы) не з нас пачалася і не намі павінна скончыцца.

Мове *не падабаецца* існаваць кансервай. Мова *любіць*, калі ёю карыстаюцца. Але спачатку мусіць з'явіцца адпаведная Беларусь, толькі потым у ёй, будзем спадзявацца, «запануе» беларуская мова. Шансы на тое «запанаванне» будуць толькі тады, калі мова прынясе з сабою нешта яшчэ акрамя граматыкі і лексікі, напрыклад добрую літаратуру, сучасную філасофскую і культуралагічную думку і г. д. Гэтага пакуль што... малавата. Аніхто, акрамя беларускамоўных (у шырокім сэнсе) беларусаў, гэтага для мовы не зробіць. Анічога не выйдзе, пакуль расейскамоўныя (таксама ў шырокім сэнсе) беларусы гэтага не заакцэнтуюць і не спапулярызуюць. Дзе тут вайна культураў? Ёй няма месца. Не Жэнеўскай канвенцыі трэба беларусам, а міру і супрацоўніцтва.

Вайна культураў, якую бачыць на гарызонце спадар Дракахруст, вялася (і сёння вядзецца) адміністрацыйна-эканамічнымі сродкамі, і культура тут толькі ў назве. Вастрыня канфлікту вызначаецца перадусім палітычнымі паводзінамі мацнейшага боку. Калі ў належны час расейскамоўная большасць будзе дастаткова разумнаю, каб не пашкадаваць

грамадскіх і дзяржаўных сродкаў на частковае збеларушванне асобных бакоў масавай культуры (дубляж фільмаў, літаратурныя пераклады, СМІ, справаводства), значная частка назапашанай у беларускамоўным коле агрэсіўнасці будзе нейтралізаваная, пераважная частка небагатых людскіх рэсурсаў – задзейнічаная на гэтыя мэты. Ваяваць не будзе каму. Але на гэтыя саступкі давядзецца пагадзіцца – як раней на ВКЛ, БНР і інш., без чаго сёння ўжо цяжка ўявіць беларускую самасвядомасць. Пагадзіцца ў імя любых сэрцу сучасных еўрапейскіх каштоўнасцяў, каб не ціснуць беларускамоўнага суседа, бы каменная пліта, а займацца чымсьці больш прыемным і карысным. І як ні круці, першы крок да згоды давядзецца зрабіць большасці. Бо калі бакі шукаюць міру, першым павінен спыніцца той, хто наступае, а не той, хто бароніць апошнія рубяжы.

Ад рэдакцыі

Сп-ру Дракахрусту была дадзеная магчымасьць адказаць на ўсе крытыкі ягонага артыкулу, апублікаваныя ў гэтым нумары «ARCHE», г.зн. на тэксты Валера Булгакава, Данілы Жукоўскага і Пятра Садоўскага. Юры Дракахруст напісаў адказ толькі на артыкул Данілы Жукоўскага, які быў дасланы яму першым. Наконт двух другіх тэкстаў ён выказаў меркаваньне, што адказваючы на ўсе тры крытыкі ў адным нумары, дзе да таго ж апублікаваны і ягоны адказ на пытаньне анкеты, ён выглядаў бы крыху сьмешна, гэткім «правадыром расейскамоўных», якім ён не зьяўляецца.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/3/10**

[image]

[illegible] (№2000)
[illegible]
[image]
А Р К С Н Е Пачатак № 5 (34), 2004
[image]

Юры Дракахруст

Ваенная хітрасць

ЮРЫ ДРАКАХРУСТ (нар. у 1960 г. у Хабараўску) палітычны публіцыст і аналітык. З 1991 году працуе ў беларускай службе радыё «Свабода». Кандыдат фізіка-матэматычных навук.

— Ці гаворыце вы па-беларуску?
— Ізрэдка.
— А чаму беларусы не гавораць па-беларуску?
— Патаму шта мы рускія.
З размовы ў аднаго з беларускіх сацыялагічных апытанняў

Прыведзеныя зьвесткі даюць нам магчымасьць, па-першае, паразважаць з аўтара гэтага радкоў: «Закідалі беларускамоўным наконт іх кадэцтва», зараз самі таго пакаштуйце», а па-другое, паразважаць над пытаннем, чый насамрэч прэзыдэнт Лукашэнка, а таксама што Азія – яна Азія і ёсьць. Тут бы мне, на ўзор сп. Жукоўскага, кінуцца тлумачыць, што гэта ўсё некарэктна, неэтычна, неэлегантна, што сярод беларускіх расейцаў ёсьць розныя групы, якія ня маюць нічога супольнага, што ўсе яны, маўляў, сярод іх група, якая ў сваёй прагрэсіўнасьці ня ўступае нікому. І сказаць гэта можна, і групу знайсьці, адно назусьці ня хочацца. Такія дык такія, паводле сваіх палітычных перакананьняў, мусіць, прыблізна такія ж, як агульна беларускамоўныя. Маўляў, ня вінаваты, што «больш сьведамыя». Дый што?

З параўнаньня зьвестак Лукашэнкі і тых, што былі прыведзеныя ў маім артыкуле, вынікае, што самая «прасунутая», «прагрэсіўная» частка ў сэнсе палітычных памкненьняў – гэта расейскамоўныя этнічныя беларусы. Паколькі беларускія расейскамоўныя, а з «прагрэсіўнасьцю» ў іх, як ужо казалі, ёсьць пэўныя праблемы, то атрымліваецца, што «прагрэсіўнасьць» у расейскамоўных забясьпечваецца якраз беларускасьцю.

У пэўным сэнсе зьвесткі Лукашэнкі ўзмацняюць пазыцыю, выказаную ў маім артыкуле. Ягоны патас – зусім ня ў тым, што «прасунутыя» ў беларусы расейцы (пра гэта і гаворыцца ў артыкуле), а ў тым, што такімі ёсьць расейскамоўныя, а ў тым, што расейскамоўныя этнічныя беларусы – не аскепкі імпэрыі, ня тое, што зьбіты з панталыку тутэйшы расеец, а ўласна расейцы. Пра культурнай і моўнай блізкасьці з тымі ці іншымі расейцамі і этнічнай блізкасьці (дый культурнай таксама) – зь беларускамоўнымі, гэтая група вызначаецца пэўнымі палітычнымі поглядамі, істотна адрознымі ад абедзьвюх «кадэцкіх» групаў.

Што да нашых розных сп. Жукоўскіх, якія на ня надта натхняльныя зьвесткі пра культурныя і этнічныя групы, то тут варта прыгадаць ягоную заўвагу, што мой артыкул падзелены на дзьве нязьвязаныя памiжсобку часткі: адну – навуковую (хаця паводле сп. Жукоўскага – не зусім) і другую – палымяна-публіцыстычную. Насамрэч яны зьвязаныя: першая частка

Прыведзеныя ў артыкуле зьвесткі ўзятыя з выданьня: Лукашенко А.Г. Беларусь – Россия: время и мы. Минск, 2003. Пераклад з расейскай мовы «Свабоды».
28.07.02

падрывае прэтэнзію майго апанэнта і ягоных аднадумцаў на рэпрэзэнтацыю ідэі, што «Я ад імя самай маладой, дынамічнай, прагрэсіўнай, антылукашэнкаўскай часткі грамадства, ад імя будучыні Беларусі, патрабую…» Сэнс першай часткі майго артыкула палягаў у тым, што калі падставай для такога самавыказвання была мова, то адпаведная рэпрэзэнтацыя недарэчная. Сп. Жукоўскаму крыўдна стрэчаць маё тлумачэнне такой моўнай палітычнай рэпрэзэнтацыі, у чым ён мае рацыю. Не ў расейцах справа, як было сказана.

Спачатку – наконт крытыкі сп. Жукоўскім сацыялагічнай часткі майго артыкула. Паколькі характар сувязі паміж палітычнымі ўяўленнямі і моўнымі паводзінамі, апісаны ў маім тэксце, майму паважанаму апанэнту відавочным чынам не падабаецца, ён аспрэчвае і тлумачэнне вызначэння моўных паводзінаў, якіх ён некалькі слоў пра гэты, якія сп. Жукоўскі экстрапаваў з майго тэксту і паставіў над сумнеў, назваўшы іх пры гэтым аксіёмамі. Я са сваёй першай спецыяльнасці пачынаю з таго, што ў маім тэксце ніякіх аксіём не было. Прычым для гатай вышэйназванай моды не спынена нават тэзіс, які патрабуе доказу (а я, здаецца, тым самым слабымі ёлкамі рабіў), называюцца тэарэмамі. Але варта, відаць, на ніжніх курсах ВНУ тое дадаць.

1. Пра моўны прымус было сказана вышэй – з заўвагу самога сп. Жукоўскага вынікае, што размова тут ідзе найперш пра прымус калектыўных уяўленняў, якія пануюць у беларускім грамадстве, і гэтыя уяўленні значна больш рэальная частка свядомасці кожнага чальца грамадства, чым выпадзёныя сп. Жукоўскім моўныя прыхільнасці.

2. Супраць таго, што у нейкай ілюзорнай прасторы ідэяў стаўленне да беларускай мовы (дакладней, яе ўжыванне) стаіць на зьвязана з стаўленьнем да ВКЛ і БНР, сапраўды ёсьць нейкая сувязь. Але сацыяльна задавальняючым, людзі адказваюць, з вынікаў я пабудаваў кроскаляцыю, калі гэтая грубая рэчаіснасць не супала з ілюзорнымі сьветам пустых сутнасьцяў сп. Жукоўскага – мае прабачэньні.

3. У ладамае больш магчымасьцяў, гатоўнасьці і імпэту, каб расьці і глумі зь беларускага. Бо, паводле адпаведных зьвестак, прывезеных у маім артыкуле, расейскамоўныя пераўзыходзяць у «прагрэсіўнасьці» «эўрапейскасьці» і г. д. ня толькі беларускамоўных, але і ўсе прамежкавыя моўныя групы.

4. «Вайна культураў» – ня толькі прагноз на будучыню, але і азначэньне сучаснай сытуацыі. Адпаведна на натуральных моўных часам дзеліцца дзікія «шалёвыя камандзіры», якія насамрэч ёсьць ня што іншае, як бандыты, якія урэшце робяць шкоду

зручнага,
таго, што
быць
беларускай,
Беларусі, патрабую…» Сэнс
крыўдна
майго артыкула.
майму паважанаму
ён аспрэчвае
майго
Прычым
тэзіс, які
сп. Жукоўскага
ёлкамі
ніжніх
Але варта
Але варта
Але варта

28.07.02, кам нібыта вы праменьт. Мой пранесена ўжо раф.
Гэта ўсклад ванівання ра-сацыяльнасці. Жукоўскі (пагоня і
цэлерді, ў будучыні ўлучэння разбурэзіна, ці прадухіць, каленьмі
з лабкуць ра-бдзеньмі. Ай-ці-тайнёсць, ці-ці-ці-ці, ён, на
*жаўна, ці-ці-ці-

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

№ 5 (34) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/2/28**
[image]

[image]

A R C H E

[image]

[image]

[image] [image] 2004

[image]

[image] [image]

П а ч а т а к **№ 5 (34) - 2004**

[image]

Пачатак Навіны Форум

Пошук Аўтары Цалкам Іншае

аналітыка • аналітыка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура •

НЕРЫЮС ПРЭКЯВІЧУС

Нерыюс Прэкявічус Як Лукашэнка апраўдвае рэферэндум і свой рэжым

эферэндум 17 кастрычніка можна трактаваць як чарговы крок на шляху да фармальнага ўмацавання ўлады прэзідэнта А. Лукашэнкі (уплыў такіх зменаў на рэальнае становішча справаў – тэма для асобнага абмеркавання). Тыя, хто назірае за сітуацыяй у дзяржаўных інстытутах або за шырэйшымі маштабам працэсамі ў нацыянальным/міжнародным кантэксце, змогуць патлумачыць, чаму быў праведзены гэты рэферэндум.

Я ж пакіну гэтую задачу лепш інфармаваным аналітыкам і буду імкнуцца сканцэнтравацца на публічным дыскурсе самога прэзідэнта. Я пастараюся давесці, што Лукашэнкаў стыль палітычнай камунікацыі робіць яго прамовы лёгка «інтэрпрэтабельнымі» і надзвычай інфарматыўнымі. Крыніцаў больш чым дастаткова, аднак мой аналіз базуецца на выступе А. Лукашэнкі перад брэсцкімі студэнтамі 23 верасня 2004 г. Гэтая прамова

дастаткова
ўсёахопная,
што дае
шанец
скласці
меркаванне
не толькі
пра
рэферэндум,
але пра
палітычныя
погляды
прэзідэнта і
пра яго
стыль
кіравання.
ПАДРЫХТОЎКА
ДА
РЭФЕРЭНДУМУ

Перш чым аналізаваць прамову, варта ўдакладніць яе непасрэдны кантэкст. Выступ быў зроблены для студэнтаў у памежным з Польшчай горадзе ў паўднёва-заходняй Беларусі. Нават не чытаючы тэксту, можна здагадацца, што ў ім будуць згадкі пра пытанні трансгранічнага супрацоўніцтва, рэгіянальнае развіццё, вышэйшую адукацыю і праблемы моладзі. І насамрэч, усе гэтыя тэмы прысутнічаюць у розных частках прамовы, прычым, згодна з прэзідэнтам, рэгіянальнае развіццё было вызначана ў якасці галоўнай тэмы год таму назад. Аднак адразу ж становіцца ясна, што гэтая тэма адыходзіць на другі план, паколькі А. Лукашэнка робіць яе важнасць умоўнай сваім абяцаннем «*обязательно будем говорить*». У той жа час пытанне рэферэндуму падаецца як найбольш пякучае, якое мае быць абмеркаванае нават насуперак прэзідэнцкім намерам («*начать придется с большой политики», «не поймет, если я промолчу*»). Такім чынам, ключавой тэмай выступу становіцца пытанне рэферэндуму. Лукашэнка настолькі часта запярэчвае, што ён не займаецца агітацыяй за рэферэндум («*речь не идет об агитации*», «*не собираюсь вас агитировать*», «*приехал сюда не просить вас*»),

што не застаецца ніякіх сумневаў – гэта якраз тое, што ён робіць.
Нягледзячы на заявы А. Лукашэнкі, што ён не падкупае выбарцаў абяцанкамі («*не покупал за зарплату, обещаниями и посулами*»), частка прамовы напоўнена разнастайнымі авансамі, напрыклад, планамі павышэння стыпендый («*увеличим стипендии студентам не на 8 процентов, а, к примеру, на 30 процентов*») і ўвядзеннем ільгот («*по доплате, если кто-то квартиру снимает*»). Прэзідэнт таксама часта нагадвае аўдыторыі пра ўласныя дасягненні («*я сделал все для того, чтобы вы попали в вуз*»; «*здесь начали шевелиться в каждом углу*»; «*удерживаю своими руками цены на коммунальные услуги*»). Найбольш важкім аргументам ёсць сувязь паміж дабрабытам студэнтаў і прэзідэнцкім клопатам («*ваша судьба во многом связана с той работой, которую я проводил при поступлении*»). Калі слухачы ў гэта паверацьь, ім давядзецца прызнаць, што Лукашэнкава адстаўка стане для іх асабістай катастрофай. Прэзідэнт адмаўляе, што рэферэндум арганізуецца для ягонай карысці («*референдум, в объявлении которого меня обвиняют*»), і падае яго як нейтральную магчымасць выявіць волевыяўленне выбаршчыкаў («*проводят многие западные государства*»; «*один из вариантов*»). Для А. Лукашэнкі рэферэндум – найлепшы сродак легітымацыі ягонай улады («*никакая оппозиция … не могут оценить президента так всеобъемлюще, как на референдуме*»). З гэтага вынікае, што поспех на рэферэндуме дазволіць яму праводзіць сваю палітыку нягледзячы на стаўленне да яе апазіцыі («*буду работать с удвоенной… энергией*»).
Гэта, на наш погляд, якраз і дае зачэпку для тлумачэння гэтага рэферэндуму. Дарма што рэферэндум быў неабходнай умовай для А. Лукашэнкі, каб удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах трэці раз, можа стацца так, што ён зацьміць самі выбары. Пасля таго як былі абвешчаны гэткія вынікі рэферэндуму, больш не будуць здзіўляць любыя падрахункі аб галасах, пададзеных за прэзідэнта. Галоўнае пытанне цяпер не ў выніках, а ва ўнутранай і міжнароднай рэакцыі на іх абвяшчэнне. Калі свабодна праінтэрпрэтаваць словы прэзідэнта – апазіцыя будзе не ў стане аспрэчыць вынікі выбараў пасля гэтага рэферэндуму. Менавіта таму А. Лукашэнка зрабіў усё, каб падрыхтаваць да яго грамадства. У 2003 г. прэзідэнт ажыццявіў істотныя

кадравыя перастаноўкі ў сваім акружэнні і абвясціў пра пабудову «беларускай дзяржаўнай ідэалогіі», што мела на мэце сур'ёзна ўзмацніць яго кантроль над бюракратычным апаратам і грамадзянскай супольнасцю. Рэферэндум быў абвешчаны ў час, калі ўвага расейцаў ізноў была прыкута да Чачэніі, у Іраку працягваліся забурэнні, а ў ЗША ішла падрыхтоўка да прэзідэнцкіх выбараў. Гэта зменшыла ўвагу адміністрацый Расіі і ЗША, з боку якіх беларускі рэжым адчувае для сябе найбольшую небяспеку. Да таго ж, для апрацоўкі грамадскай думкі было выкарыстана сёлетняе паляпшэнне эканамічнай кан'юнктуры.

Якімі б ні былі адрозненні ў выбарчых сістэмах, напярэдадні выбараў кожны ўрад імкнецца заручыцца падтрымкай большай, а не меншай колькасці грамадзянаў. Кароткі часавы прамежак паміж абвяшчэннем і правядзеннем рэферэндуму ўскладніў працу апазіцыі. Калі палітыка Расіі на беларускім кірунку не зменіцца, у наступныя два гады беларускія ўлады адно ўмацуюць свае пазіцыі і чарговая перамога прэзідэнта ні для кога не стане неспадзяванкаю.

ГІСТАРЫЧНЫ ВЫБАР БЕЛАРУСІ

Нядаўняе пашырэнне Еўрапейскага Саюзу, відавочна, па-рознаму было ўспрынята ў беларускім грамадстве. Падобна, што асабіста А. Лукашэнка вельмі ўсхваляваўся праз гэтую

падзею. Пра гэта сведчаць зняважлівыя заўвагі на адрас балтыйскіх дзяржаваў у розных частках ягонай прамовы («*таких же «великих» демократий*»; «*ходят они строем, стараясь выслужиться перед сильными мира сего, «тявкая» на Беларусь*»). Паколькі выступаў ён ля польскай мяжы, галоўнымі мішэнямі мусілі служыць балтыйскія дзяржавы: прамова ва ўсходняй Беларусі мела б, найхутчэй, антыпольскую

скіраванасць. Іншай прычынай «стрыманасці» можа быць большая залежнасць ад Польшчы ў эканоміцы і ў сферы транзіту. Хваляванне прэзідэнта лёгка зразумець. Балтыйскія дзяржавы дзякуючы сяброўству ў прэстыжным «клубе» Еўрасаюзу і ў цэлым лепшаму стану эканомікі адыгрываюць (заслужана ці не) ролю пэўнага ўзору для беларускага грамадства. У параўнанні з іншымі дзяржавамі, што нядаўна далучыліся да

Еўрасаюзу, балтыйскія дзяржавы больш падобныя да Беларусі памерам і маюць больш супольнага ў гістарычным плане. Улічваючы ўсё гэта, А. Лукашэнка падрывае вобраз іх эканамічнага поспеху, падкрэсліваючы разбурэнне старых галін прамысловасці («*ушли на Запад» ценой уничтожения реального сектора экономики*») і замоўчваючы стварэнне новых сектараў эканомікі. Таксама ён падкрэслівае страту суверэнітэту, звязаную з

членствам у Еўрасаюзе («*отказ от львиной доли суверенных прав, политических прав внутри государства, человеческих прав*»; «*там не мы «ведущие» – мы там будем «ведомыми*»), забываючы згадаць пра ўласныя інтэграцыйныя планы. Іншай праблемай, выкліканай пашырэннем ЕС, з'яўляецца боязь павелічэння інтарэсу да Беларусі («*наши бывшие друзья… кричат: «Давить Беларусь*»), паколькі гэты інтарэс падрывае

ізаляцыянісцкія арыентацыі прэзідэнта. Аднак, дарма што ЕС у бліжэйшы час яўна будзе больш цікавіцца Беларуссю, гэта наўрад ці прывядзе да рэальнага плёну, пакуль Беларусь не рушыць насустрач. Гэтаксама як уступленне Фінляндыі ў Еўрасаюз у 1995 г. мала паўплывала на адносіны паміж ЕС і Расіяй.

У якасці процівагі прывабнаму «праекту ЕС» высоўваюцца ўласныя погляды на ўнутраную і вонкавую палітыку, сутнасць якой, паводле А. Лукашэнкі, у падтрыманні ранейшага стану грамадства («*сохранить самобытность белорусского уклада жизни*») і ў прарасійскай арыентацыі («*заключить союз с Россией*»). Ён падмацоўвае гэтыя задачы аргументамі «культурніцкага» плану – Беларусь ёсць праваслаўнай краінай, гістарычна звязанай з Расіяй («*для… западной цивилизации… белорусы не являются родными*»; «*Беларусь никогда не была частью западной культуры*»). Адсюль вынікае, што празаходняя арыентацыя з'яўляецца адмаўленнем беларускай ідэнтычнасці

(«*отказ… от той самой беларускасці*») і толькі меншасць насельніцтва можа пагадзіцца з такой арыентацыяй. Пазней у сваёй прамове А. Лукашэнка выкажа свой клопат пра гэтую меншасць, выяўляючы сімпатыю да палякаў і талерантнасць да каталікоў («*католики – мои избиратели*»)[1]. Зазначу, што культурная блізіня і гістарычныя сувязі ёсць метафарамі, якія лёгка паддаюцца маніпуляванню, таму безапеляцыйныя спасылкі на іх наўрад ці карэктныя. Калі прэзідэнт лічыць, што Беларусь не належыць да заходняй цывілізацыі (якой бы яна ні была), ён ні ў якім разе нічога не адмаўляе. Якраз наадварот – ён падкрэслівае маральную перавагу, паказваючы, колькі давялося перажыць беларусам («*вклад нашего народа в спасение континента от фашистского порабощения общеизвестен*»). Гэткі комплекс ахвяры рэгулярна эксплуатуюць усходнееўрапейскія палітыкі, якія шукаюць выгадаў ад заходніх донараў, хаця ён, мабыць, лепш спрацоўвае ў дачыненнях з унутранай аўдыторыяй, чым з замежнай.

Прэзідэнт скарыстоўвае псеўдадэмакратычны аргумент, падаючы сваё абранне як паваротны момант, калі беларусы зрабілі канчатковы выбар на карысць інтэграцыі з Расіяй («*народ «отрезал» раз и навсегда*»). Між тым, я хачу адзначыць, што нават рашэнне, прынятае на рэферэндуме, не можа перашкодзіць грамадзянам прыняць новыя рашэнні. Калі б пытанні вырашаліся «раз і назаўсёды», нарвежцы не маглі б арганізоўваць рэферэндум паводле пытання аб далучэнні да Еўрасаюзу пасля таго, як прапанова была двойчы адхілена (у 1972 і 1994 гг.). З іншага боку, ці можна сказаць, што цяперашнія члены ЕС ніколі не вырашаць некалі яго пакінуць? Нарэшце, аргумент аб «канчатковым рашэнні» можна небяспечна павярнуць так, што няма патрэбы ў далейшых выбарах – нашто, калі аднойчы выбаршчыкі ўжо выказалі сваё меркаванне? Галоўным (і вельмі перабольшаным) довадам супраць празаходняй арыентацыі служыць, аднак, спасылка на эканамічны хаос, які нібыта суправаджае выхад з расійскай зоны ўплыву («*отрезали бы… от источников сырья, у нас безработица достигла бы 85 %, и мы отошли бы от того, что было наработано в едином государстве – Советском Союзе*»).

Прэзідэнт пастаянна дэманструе сваё змешанае стаўленне да

[1] Фактычна ён ужывае паняцці «каталік» і «паляк» як сінонімы («*католики это оценили*» ў адным сказе, «*упростил переход границы для поляков*» у наступным).

Расіі. Яму падабаецца цэнтралізаваная сістэма кіравання ў СССР («*основные решения принимались в Кремле – для того, чтобы отдать дань уважения белорусам*»), ён амаль шкадуе пра няўвагу Расіі да Беларусі ў пачатку 1990-х гг. («*Россия… пыталась влиять на белорусский выбор, но делала это слабо и бессистемно*). З іншага боку, А. Лукашэнка настойвае на тым, што балансуе паміж Захадам і Усходам («*я никому "не сдал" Беларусь – ни Западу, ни Востоку*»), дабіваецца выгадных умоваў для інтэграцыі з Расіяй. Расійская эканоміка характарызуецца як карумпаваная («*страшная коррупция*»), што ёсць ускосным папрокам на адрас расійскага кіраўніцтва. Паказальна, што А. Лукашэнка часта бэсціць расійскіх алігархаў (бяспечная мішэнь), аднак рэдка наўпрост выказваецца пра расійскую палітыку. Гэткім чынам ён не толькі захоўвае дыстанцыю да Расіі, але і негалосна падтрымлівае нядаўнія рашэнні Ўладзіміра Пуціна. Тая ж амбівалентнасць – у прэзідэнцкіх заўвагах пра моўную палітыку. Пачынаючы са сцвярджэння аб тым, што расійская мова для беларусаў родная («*если вы думаете, что русский язык, на котором белорусы разговаривают, это российский язык – заблуждаетесь*»), а беларуская – другасная («*многие науки просто не имеют терминологии на белорусском языке*»), А. Лукашэнка пераходзіць да дэкларавання сваёй любові да беларускай («*это не мешало нам изучать, любить нашу беларускую мову*»). У маім ранейшым артыкуле ў «ARCHE» я адцеміў, што такая непаслядоўнасць, мабыць, з'яўляецца прагматычным выбарам чалавека, што пакідае ў баку пытанне сваёй ідэнтычнасці ў імя дасягнення іншых мэтаў.

БЕЛАРУСКАЯ МАДЭЛЬ

Заявы А. Лукашэнкі ў абарону ўласнага рэжыму ствараюць уяўленне пра «беларускую мадэль развіцця». Галоўным клопатам прэзідэнта ёсць «стабільнасць» («*не дестабилизировать обстановку*»). Адсутнасць на чарговых выбарах ягонай кандыдатуры стварыла б рызыку фатальных збояў у сістэме («*там была война*»). Стабільнасць павінна быць забяспечана свабодай ад замежнага ўмяшання («*как нам жить,*

мы разберемся сами») і абмежаваннем кантактаў з замежнымі краінамі («*пусть беднее, но на своей земле, в своих вузах, для своей страны*»). Эканоміка бачыцца перш-наперш аўтаркічнай («*мы обеспечили свою продовольственную безопасность*»), заснаванай на кантролі над спажываннем («*цените то, что есть*») і сферай гандлю («*все вывезут*»). Прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў разглядаецца як катастрофа («*экономика не разграблена… она в собственности государства*»), а іх цана не звязана з іх рынкавым коштам («*хотят взять бесплатно*»).

Як і ў шмат якіх іншых публічных прамовах, А. Лукашэнка падкрэслівае эканамічны прагрэс у краіне («*экономика Беларуси… по своей структуре аналогична структуре экономик таких передовых стран Европы, как Германия, Франция*»; «*покупаем сырье и сами создаем высокоинтеллектуальный продукт*»). Пакідаю гэтыя заявы без каментару, бо прэзентацыя і параўнанне асноўных характарыстык заходнееўрапейскіх эканомік з беларускай эканомікай забрала б шмат часу і месца. Іншай абвешчанай перавагай ёсць нізкі ўзровень вонкавага доўгу адносна ВУП, што менш звязана са здаровым станам беларускай эканомікі, чым з бояззю эканамічнага ўплыву на палітычныя рашэнні («*олигархи ногой дверь к президенту не открывают*»).

Прэзідэнт шчыра прызнае, што рост эканомікі Беларусі мае карані ў павелічэнні попыту на беларускія тавары ў Расіі, але пераконвае, што адбываецца дыверсіфікацыя рынкаў, на якіх гандлююць беларускія вытворцы («*Если к 1995 году на страны Западной и Восточной Европы ежегодно приходилось всего 8 процентов нашего экспорта, то в 2003 году мы вывезли почти 40 процентов*»). Паводле афіцыйных звестак, якія, бадай, найбліжэйшыя да згаданых прэзідэнтам, у 1995 г. на краіны, што не ўваходзілі ў СНД, прыпадала каля 37 % беларускага экспарту, а ў 2003 г. гэтая лічба вырасла да 45 %. Дыверсіфікацыя беларускага вонкавага гандлю адбылася, але яе тэмпы зусім не такія высокія, як падкрэслена ў прамове. Не Беларусь наблізілася да ЕС, а пашырэнне апошняга зрабіла Беларусь бліжэйшай.

Роля транзіту пададзена як асноватворная («*практически все сырье, станки, машины, новые технологии идут в Европу и из Европы через Беларусь и север Украины*»). Заўважым, што ў гэтай сентэнцыі няма згадак пра Расію. Каб упісаць заяву ў кантэкст, варта нагадаць, што нават пасля апошняга пашырэння на Расію прыпадае 7,6 % імпарту ЕС і 4,4 % экспарту. У свеце ёсць вельмі мала краінаў, якія робяць стаўку на сваю транзітную ролю (напрыклад, Сінгапур і Ганконг). Хоць А. Лукашэнка пагражае Літве («*вот переориентируем мы свой экспорт… они потеряют одну треть государственного бюджета*»), самі імпарцёры ды экспарцёры вырашаюць, з кім гандляваць і якімі камунікацыямі для гэтага карыстацца. Такія рашэнні абумоўліваюць не толькі геаграфічная адлегласць, а разнастайныя эканамічныя ды палітычныя фактары.

На працягу сваёй прамовы А. Лукашэнка выхваляецца сацыяльнымі дасягненнямі («*говорить о наших приоритетах, которыми являются экспорт, продовольствие, жилье, и об основных инструментах решения этих задач – здоровье, образование, наука*»), а таксама разглядае роўнасць як характэрную рысу беларускага грамадства («*нет сверхбогатых и резкого различия доходов*»). Прысутнічае намёк на негалосную дамову паміж прэзідэнтам і пажылымі людзьмі («*белорусская политическая система ориентирована на старшие поколения*»). Палітычная падтрымка («*безоговорочной поддержкой, которую в критические моменты оказывают*») абменьваецца на эканамічную дапамогу («*стараюсь… отработать это доверие*»).

Паколькі выступ адбыўся ў рэгіянальным універсітэце, няма дзіва, што ў ім закранаюцца і праблемы вёскі. А. Лукашэнка падкрэслівае, што сельская гаспадарка – важны абсяг эканомікі («*люди на селе создают много рабочих мест в стране*»). Ён ажыўляе старыя савецкія ідэі аб змычцы вёскі і гораду («*приблизим жизнь этих людей к городской*»), прапануючы стварэнне аграгарадкоў («*небольшие агрогородки*»; «*пять, шесть, десять тысяч гектаров земель*»). (Няясна, хто будзе фінансаваць гэты праект.) Здаецца, аднак, што палітыка адыгрывае тут важную ролю: прэзідэнт абараняе ідэю ўкладання грошай нават у найменшыя вёскі («*бросать не будем, даже если там живет 5-6 человек*»). На яго думку, калі

прыватных інвестыцый няма, павінна ўмяшацца дзяржава. Між іншага, цяжка весці размову аб прыватных інвестыцыях, калі прадпрымальнікі трактуюцца так жа, як і дзяржаўная бюракратыя («*я хочу, чтобы бизнесмены и чиновники поднимали*»). Такім чынам, сельскія раёны ўспрымаюцца як апірышча падтрымкі А. Лукашэнкі, і гэтым тлумачацца яго абяцанні забяспечыць доступ сельскіх жыхароў да сацыяльных дабротаў, паслуг і масавых забаваў.

На маю думку, так званы поспех беларускай мадэлі грунтуецца на кансервацыі сістэмы ў часе. Дзяржава можа падпарадкоўваць сабе эканоміку на працягу доўгага часу, але гэта вымагае ізаляцыі ад вонкавага свету і ў рэшце рэшт вядзе да эканамічнай адсталасці. Эканамічны хаос Усходняй Еўропы ў пачатку 1990-х гг. быў выкліканы не арыентацыяй на Захад (як можа падацца з Лукашэнкавай прамовы), а няпэўнасцю ў цэнавай палітыцы і ў адносінах уласнасці. Каб дасягнуць стану раўнавагі, спатрэбіўся час, і давялося перажыць значныя эканамічныя і сацыяльныя страты. Сваю негатыўную ролю адыграў і брак рынкавага досведу ў палітычных элітаў. Тым не менш, большасць посткамуністычных краінаў дасягнулі поспехаў у гаспадарчай трансфармацыі, што цягам часу палепшыць эканамічныя варункі гэтых краінаў. Беларусь гэтыя працэсы амаль не кранулі, і ёй давядзецца іх перажыць. Калі б гаворка ішла аб вялікай краіне, багатай на прыродныя рэсурсы, рэформы можна было б адкласці на няпэўны тэрмін, але, відавочна, Беларусь да такіх краінаў не належыць. Нават здольнасць быць транзітнай дзяржавай не дае ўсёмагутнасці – дзяржавы, што карыстаюцца паслугамі Беларусі для транзіту, будуць гэта рабіць толькі датуль, пакуль іншыя варыянты будуць даражэйшымі.

КАНТРОЛЬ НАД СІСТЭМАЙ АДУКАЦЫІ

У прамове прэзідэнт гаворыць студэнтам у асноўным тое, што яны нібыта хочуць пачуць. Паколькі ён выступае ва ўніверсітэце з тэхнічнай спецыялізацыяй, А. Лукашэнка паведамляе, што існуе попыт на тэхнічныя спецыяльнасці, у

той час як на астатнія попыту часцяком няма. Ён патрабуе знізіць нагрузку за кошт вучэбных курсаў па гуманітарных і грамадскіх дысцыплінах («*надо освобождаться от лишних предметов*»). Гэткія заявы могуць адлюстроўваць тэхнакратычныя арыентацыі прэзідэнта, а таксама памкненне зберагчы грошы, што выдзяляюцца на адукацыйныя патрэбы («*надо уменьшать эти годы*»). Іншым сродкам заваёвы даверу ў студэнтаў ёсць дэкларацыя падтрымкі навучэнцаў з сельскіх раёнаў («*принято решение поддержать сельскую молодежь*»). З іншага боку, патэрналісцкая палітыка прадугледжвае абавязковае размеркаванне на працу – «*должны быть готовы поехать туда, где вы нужнее*». Агульная парада студэнтам – зніжаць свае запыты і чаканні («*все жили скромно и экономно*»).

Лёс ЕГУ – апошняя тэма гэтай часткі выступу Лукашэнкі. Прэзідэнт спрабуе прыхаваць значэнне падзеі, намякаючы, што інфармацыя пра яе цьмяная і супярэчлівая («*может быть, до вас дошло, что якобы власти закрыли ЕГУ в Минске*») і што дзякуючы гуманным паводзінам уладаў спыненне навучальнага працэсу не мела вялікіх наступстваў («*это наши белорусские ребята, девчата»; «мы же их не можем выбросить на улицу*»). Віна цалкам ускладаецца на кіраўніцтва ЕГУ («*власть вынуждена была лишить лицензии»; «стали жертвами взрослых дядек*»). Урэшце, А. Лукашэнка спрабуе настроіць брэсцкіх студэнтаў супраць мінскіх («*западники в центре Минска готовят… элиту… остальные белорусские вузы… кого готовят – слуг, рабов для этой самой элиты?*»).

Аднак сутнасць канфлікту можна лепей патлумачыць жаданнем уладу забяспечыць сабе ідэалагічны кантроль над адукацыяй («*будущее руководство нашей страны будем готовить сами*») і захаваць уніфікаваную сістэму адукацыі («*в этом вузе должны готовить студентов так же, как в Бресте и Минске*»). Прэзідэнт прызнае, што канфлікт меў даўнюю гісторыю («*решение вынашивалось несколько лет»; «их предупреждали*»). Таму непасрэдных прычын для пазбаўлення ЕГУ ліцэнзіі не было, за выключэннем, мабыць, звароту ЕГУ да міжнародных інстытуцый.

Трэба сказаць, што А. Лукашэнка правільна вызначыў

спадзяванні заходніх донараў – «*подготовить здесь… новую белорусскую элиту, которая должна была бы со временем привести Беларусь на Запад*». Іншае пытанне, ці была яго рэакцыя адэкватнай. Беларуская эканоміка вельмі моцна кантралюецца дзяржавай, гэтаксама як пад кантролем знаходзяцца прызначэнні на дзяржаўную службу. Імавернасць таго, што празаходне адукаваныя выпускнікі ВНУ змянілі б сістэму ці нават праніклі б у яе, малая. Таму рэакцыя прэзідэнта, напэўна, была неадэкватна жорсткай.

Прага да ўзмацнення кантролю над сістэмай адукацыі адчуваецца таксама ў жаданні прэзідэнта змусіць студэнтаў завучваць на памяць афіцыйна прапагандаваныя адметнасці беларускай мадэлі («*преподавателей попрошу, чтобы они на экзаменах… спросили у студентов, что это за особенности*»). Такі падыход да справы спалучае кантроль і над студэнтамі, і над выкладчыкамі, але толку ад яго, напэўна, будзе не болей, чым ад вывучэння т. зв. «навуковага камунізму» ў савецкі час. Ідэалогія можа быць насамрэч эфектыўнай толькі тады, калі існуюць структуры, якія прышчапляюць масам пэўныя ідэалагічныя ўстаноўкі, і асабіста я сур'ёзна сумняюся адносна будучага патэнцыялу «беларускай мадэлі».

ГУЛЬНЯ СА СТАТЫСТЫКАЙ

Калі мы падыходзім да разнастайных статыстычных паказчыкаў, скарыстаных у прамове, мае сэнс нагадаць фразу, прыпісаную брытанскаму прэм'ер-міністру Бенджаміну Дызраэлі: «Ёсць тры віды хлусні: хлусня, вялікая хлусня і статыстыка». Прамова поўніцца недакладнасцямі, якія можна падзяліць на пяць асноўных групаў.

У пэўных выпадках прэзідэнт, здаецца, ужывае афіцыйныя дадзеныя, але робіць няправільныя падлікі альбо перабольшвае значэнне ўжытых дадзеных для падмацавання свайго пункту гледжання. Напрыклад, А. Лукашэнка спасылаецца на афіцыйна зарэгістраваныя 2059,9 % інфляцыі ў 1994 г. («*более двух тысяч процентов в год*») і сцвярджае, што заробкі

абясцэньваліся на палову кожны месяц. Аднак калі выводзіць паказчыкі інфляцыі за месяц з лічбы гадавой інфляцыі, трэба ўлічваць яе экспаненцыйны, а не прыбавачны (exponential, not additive) рост[2]. Таму можна сказаць, што ў 1994 г. кожны месяц нацыянальная валюта траціла прыкладна 22 % сваёй вартасці (хаця такія экстрапаляцыі па сутнасці вельмі падманлівыя). Іншая памылка больш відавочная – рэальны грашовы даход беларусаў у 2003 г. у параўнанні з 1995 г. вырас амаль у тры разы, калі верыць прэзідэнту. Мой асабісты падлік на базе афіцыйных статыстычных звестак дае рост у 2,37 разу, хаця было б больш лагічна браць за кропку адліку 1994 год, у параўнанні з якім даход вырас усяго ў 1,72 разу. Некаторыя іншыя перабольшанні: 90 % беларусаў – праваслаўныя; Беларусь страціла траціну насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны і адна траціна памерла ад ранаў пасля вайны. Ніхто не сумняецца, што праваслаўныя – найбольшая канфесія ў Беларусі ці што Беларусь моцна пацярпела ў Другой сусветнай вайне, але навошта перабольшваць аж да абсурду?

Выкарыстанне няпоўнай інфармацыі вельмі часта вядзе да няправільнага тлумачэння статыстычных звестак. Ад Лукашэнкі зрабіў дзве спецыфічныя заявы пра беларускія грузы, якія праходзяць праз літоўскі порт Клайпеда (5 мільёнаў тон, што забяспечвае нібыта траціну літоўскага нацыянальнага бюджэту). Паводле апошніх афіцыйных звестак адміністрацыі порту, на працягу 6 месяцаў (са студзеня па чэрвень 2004 г.) Клайпеда прыняла 10,5 мільёна тон грузаў, толькі 2,2 мільёна тон з іх былі беларускімі. Важна адзначыць, што Клайпеда не адзіны порт Літвы. Цягам таго ж часу 4,6 мільёна тон складзе 44 нафтапрадуктаў, выраблены у Літве, а таксама расійскай сырой нафты, пайшлі на экспарт праз марскі тэрмінал Бутынге. Такім чынам, беларускі транзіт складае 14,6 % агульных грузаў літоўскіх портаў. Гэта нямала, аднак не надзвычайна многа ў параўнанні з дзвюма суседнімі краінамі. Выходзіць, агульная карціна не супадае з той, што намаляваў прэзідэнт у сваёй прамове.

[2] 1. Лукашэнка: інфляцыя за 20 % за 2004 г. 2. Лукашэнка: 44 % складзе 40.

Іншым шляхам маніпуляцыі статыстычнымі звесткамі ў Лукашэнкавым выступе з’яўляецца блытаніна паміж фактычнымі, запланаванымі і пажаданымі паказчыкамі.

Добрым прыкладам такой блытаніны служыць гутарка пра сярэднія заробкі («*в середине 90-х среднемесячная зарплата – 20–30 долларов США, сегодня 165. К концу года средняя зарплата будет 195 долларов. …В 2005 году мы должны получить 250. …К 2010 году – 750 долларов*»). Магчыма, што ў сярэдзіне 1990-х гг. сярэдняя зарплата сапраўды была 20–30 USD, магчыма нават, што яна сягнула 165 USD у сёлетнім верасні, аднак зусім зразумела, што астатнія лічбы ёсць проста прэзідэнцкімі дырэктывамі. Беручы пад увагу колькасць працоўных у Беларусі, сярэдні заробак у 750 USD запатрабаваў бы выдаткаваць на зарплаты 38,8 мільярда USD на год. Толькі адна лічба для параўнання: паводле афіцыйных ацэнак, дзяржаўны бюджэт Беларусі складае прыкладна 6,4 мільярда USD (13,22 трыльёна рублёў). Іншымі словамі, калі б дзяржаўны бюджэт траціўся толькі на выплату заробкаў, да 2010 г. ён мусіў павялічыцца ў 6 разоў (рост 35% за год у рэальных цэнах). Магчыма, што да 2010 г. заробкі і вырастуць больш чым у 4 разы ў рублях, але гэтае павышэнне будзе з'едзена інфляцыяй.

У некаторых выпадках прэзідэнт яўна змешвае інфармацыю з розных крыніц. Напрыклад, расказваючы, як яго гутарка з Дж. Сорасам у 1994 г. (?) прывяла да рашэння выдзеліць крэдыт у 300 мільёнаў USD («*через несколько недель Беларуси перечислили 300 млн. долларов*»), а Беларусь з гэтага крэдыту не ўзяла ні шэлегу («*их это очень задело*»). У рэальнасці, калі мы звернемся да інфармацыі пра крэдыты, выдзеленыя Беларусі, то ўбачым, што 12 верасня 1995 г. Міжнародны валютны фонд згадзіўся выдаць крэдыт у 293 мільёны USD[3] для падтрымкі эканамічнай праграмы беларускага ўраду на 1995/96 гг. Прыкладна 74,6 мільёна USD[4] былі скарыстаны фактычна. Крэдыт быў вернуты к 14 верасня 2000 г. Магчыма, што прэзідэнт змяшаў гэтую інфармацыю са звесткамі пра іншыя крэдыты, выдача якіх была ўхвалена МВФ 28 ліпеня 1993 і 31 студзеня 1995 г. Аднак абодва гэтыя крэдыты (209 мільёнаў USD) былі выкарыстаныя, і частка грошай дагэтуль не вернута. Але, нягледзячы на ўсе гэтыя недакладнасці, галоўная праблема гэтай заявы сутнасная: Дж. Сорас не кантралюе МВФ і, акрамя таго, апошні мае дастаткова кліентаў, якія хочуць пазычыць грошы.

Урэшце, некаторыя лічбы ствараюць уражанне проста прыдуманых або некарэктна выкарыстаных. Прыкладам можа быць заява аб рэгуляванні эканомікі ЕС («*Более 60 процентов норм, регулирующих экономическую жизнь, утверждается Еврокомиссией в Брюсселе*»). Папраўдзе, такі падлік немагчымы ў прынцыпе, бо ЕС складаецца з вельмі розных эканомік і даволі цяжка размежаваць эканамічныя і неэканамічныя пытанні. Дый хто возьмецца правяраць неймаверную колькасць юрыдычных дакументаў? З 10 сакавіка 1990 г. да 15 ліпеня 2004 г. адзін літоўскі парламент (Сойм) прыняў 4683 законы, 2645 рашэнняў і 266 іншых нарматыўных актаў. Аналагічным чынам выклікае сумнеў прэзентацыя эканамічнага расслаення ў Беларусі: «*Высокооплачиваемая элита – работающие на предприятиях нефтехимии, нефтепереработки… банкиры и так далее – больше 30 процентов общества*». Няясна, што ў дадзеным выпадку лічыцца высокай аплатай і незразумела, ці гаворыць прэзідэнт пра заробкі альбо пра даходы хатніх гаспадарак. Напрыклад, ён не залічвае пенсіянераў, якіх у Беларусі больш за 25 %, у катэгорыю асобаў з нізкімі даходамі, хоць якраз тут прыблізны падлік даходаў магчымы.

Што датычыць долі беларускіх грузаў у літоўскім нацыянальным бюджэце, мушу прызнацца, што не знайшоў пра яе звестак у літоўскіх крыніцах. Найбліжэйшая да тэмы інфармацыя Міністэрства транспарту і камунікацый Літвы, з якой вынікае, што доля транспартных паслуг у літоўскім ВУП складала 9,5 %. Траціна літоўскага дзяржаўнага бюджэту – прыкладна 6,6 % ад літоўскага ВУП. Калі б заява А. Лукашэнкі была слушнай, 70 % даходаў ад усіх транспартных паслуг мелі б беларускае паходжанне і ўсе гэтыя даходы ішлі б у дзяржаўны бюджэт – а другое дапушчэнне гэткае ж нерэалістычнае, як і першае. Такім чынам, і гэтая заява – чыстая выдумка, якая да таго ж абмінае асноўнае – няма эканамічных узаемадачыненняў, выгадных толькі аднаму боку.

Адвольнае ўжыванне статыстычных звестак найлепш праявілася ў словах пра рост ВУП. А. Лукашэнка сцвярджае, што паміж замежнымі экспертамі («*Запад*») няма згоды ў меркаваннях пра рост беларускай эканомікі ў 2004 г. («*говорят, что у нас нет 10 с лишним процентов прироста ВВП,*

3 Больш дакладна, 196,3 млрд SDR.

4 Адпавядае 50 мільёнам SDR.

что только чуть больше восьми»). Логіка гэтага аргумента такая: калі слухачы не паверацъ у максімальную лічбу, ім мусіць запасці ў свядомасць лічба крыху зніжаная. Незразумела, якія заходнія эксперты рабілі ацэнку росту ВУП, але, напрыклад, у верасні МВФ прагназаваў на 2004 г. прырост у 6,4 %. Калі афіцыйныя статыстычныя звесткі гэтак проста вар'ююцца (няма вялікай розніцы паміж 8 і 10 %), хто можа гарантаваць, што яны праўдзівыя? Слабая зацікаўленасць прэзідэнта ў статыстычнай дакладнасці падкрэсліваецца і ў яго звароце да цьмяных крыніцаў. Даволі дзіўна, што прэзідэнт Беларусі атрымлівае інфармацыю пра беларускі транзіт з літоўскага тэлебачання («*литовец, выступая по телевидению, сказал*»). Тут поўнасцю адсутнічае інфармацыя пра крыніцу: невядомы ні канал, ні час трансляцыі, ні асоба, у якой бралі інтэрв'ю.

ЯК ПРЭЗІДЭНТ БАЧЫЦЬ СЯБЕ САМОГА?

З выступу А. Лукашэнкі магчыма зрабіць выснову аб некалькіх рысах яго асобы як палітыка. Яго жаданне кантраляваць сваё атачэнне ёсць ключавым для разумення сістэмы кіравання ў сучаснай Беларусі. З гэтым жаданнем звязаны шматлікія заявы, але я спынюся на самай яскравай – «*Даже если на меня «вешали» вопросы действительно не мои, я нигде не сказал, что это не мои вопросы*». Хоць гэта можа выглядаць як перайманне на сябе большай адказнасці, гэтым падкрэсліваецца найперш кіраўнічая неэфектыўнасць – адзін чалавек не ў стане адэкватна разумець усе другарадныя пытанні і вырашаць іх, нават калі ён гэтага шчыра хоча («*сам по телевидению объявлял темы»; «поступили в вуз под жесточайшим контролем президента*»). Увага да адной сферы непазбежна адцягвае ўвагу ад іншых сфераў. У выніку сістэма працуе ў рэжыме серыі адвольных кароткатэрміновых кампаній і, калі ўвага пераносіцца на другую кампанію, сфера папярэдняй хутка пакідаецца. Больш за тое, увесь высілак скіроўваецца на дасягненне часовага і відавочнага эфекту – іначай жа нельга сказаць, што кампанія была паспяховай! Аднаразовая карцінка становіцца важнейшай за доўгатэрміновыя вынікі, і

падначаленыя могуць папросту пачаць падманваць кіраўніка. Задача гэтая простая, бо асоба, якая лічыць сябе экспертам ва ўсіх галінах, не з'яўляецца экспертам ні ў воднай.

Акцэнтаванне інтуіцыі (процістаўленай рацыянальнасці) ёсць іншай патэнцыйна згубнай рысай – «*я не фаталист, но, может, что-то из этой области есть»; «хватило какой-то интуиции*». Калі такі падыход дапаўняецца прэтэнзіяй на веды, што загадзя лічацца вышэйшымі («*я знал жизнь», «я ошибался, правда, по мелочам*»), ён вядзе да нежадання не тое што працаваць з новай інфармацыяй, а нават і атрымліваць яе. Такая інфармацыя можа трактавацца з падазрэннем, знешняя экспертыза пачынае ігнаравацца, што стымулюе дылетанцтва ў прыняцці рашэнняў. Падначаленыя могуць нават перастаць забяспечваць кіраўніка новай інфармацыяй – навошта, калі ён пра ўсё ведае сам? У такой сістэме падначаленыя менш схільныя думаць самі і дылетанцкія рашэнні ўласцівы ўсім дзяржаўным службоўцам.

Прэзідэнт падкрэслівае таксама валюнтарысцкі фактар у палітыцы – «*если кто-то «внизу»… не срабатывает, значит, не те кадры были подобраны»; «не потому, что неправильно был определен курс, а потому, что там есть некие кадровые и организационные причины*». Насамрэч такі погляд звязаны з адмаўленнем ад рацыянальнасці – калі выкананне рашэння было беспаспяховым, само рашэнне ўсё роўна трэба прызнаць добрым, а віну перакінуць на выканаўцаў. У такім разе выпраўленне рашэнняў становіцца вельмі складанай справай і памылкі «ўнізе» могуць працягвацца доўга, ведучы да марнавання часу і рэсурсаў. Працэс рэкрутавання кіраўнікоў у такой сістэме становіцца вельмі залежным ад выпадку: здольны адміністратар можа страціць сваю пасаду з прычыны кепскіх рашэнняў, прынятых яго начальнікамі. Урэшце, падначаленыя не зацікаўленыя ў прыняцці аптымальных рашэнняў, і лаяльнае выкананне любога рашэння становіцца галоўнай цнотай.

А. Лукашэнка малюе свой вобраз ружовымі фарбамі – «*могу… поспорить в своей преданности, надежности в работе и в служении своему народу*». Ён падкрэслівае сваю сумленнасць («*не украду и не вывезу из страны*»), сціпласць («*подталкивают:*

давайте дом ваш… будет как музей… я не иду на это») і працаздольнасць («*тяжелый, изнурительный труд*»). Прэзідэнцкая вера ў сваю місію («*если не он, то кто*») і непагрэшнасць («*за главу государства говорят его дела*») настолькі настойлівая, што вядзе да адмаўлення рэчаіснасці («*меня на Западе не «долбят»… еще отмахиваюсь, если очень надоедают*»). Адносіны з грамадзянамі абмаляваны ў асабістых, патэрналісцкіх танах («*Лукашенко и другие дадут*»).

Згаданыя рысы кіраўніка замінаюць прызнанню легітымнасці апазіцыі. Больш за іншае скажуць уласныя словы прэзідэнта пра апазіцыю: «*обучены и проплачены*»; «*кто привёл бы Беларусь к послушанию*». Калі гаворыцца пра мэты апазіцыі: «*наша оппозиция собиралась «БелАЗ» закрыть*»; «*то, что в Беларуси отрасли… остались в собственности государства – это кость в горле как для западников, так и их подручных в Беларуси. И олигархов российских*». З гэтага слухач павінен зразумець, што апазіцыя звязана з замежнымі ворагамі і мае намер разбурыць беларускую эканоміку. У найлепшым выпадку апазіцыйныя погляды тлумачацца недахопам досведу («*Хотелось какой-то свободы, ведь молодыми были людьми*»). Нецярпімасць да любой апазіцыі праяўляецца таксама і ў стылі зносінаў з аўдыторыяй. Заклік да адкрытай дыскусіі («*с вами откровенно, честно поговорить*») хутка ператвараецца ў патрабаванне згадзіцца з кансенсусам у пытанні аб падтрымцы прэзідэнта («*естественно, подавляющее большинство… поддерживающие*») і нават у схаваныя пагрозы («*что, надо быть оппозиционером, чтобы попасть к президенту на встречу*»).

А. Лукашэнка адкрыта прызнае аўтарытарныя аспекты свайго рэжыму («*с элементами авторитаризма*»), так што ён не бачыць патрэбы адмаўляцца і ад аўтарытарных тэхнік кіравання. Апраўданне для апошніх ён знаходзіць у беларускім заканадаўстве і ў надзвычайным «пераходным» стане («*такая у нас Конституция и законы в этот переходный период*»). Тлумачэнне даволі цікавае, бо гэтае заканадаўства было прынята па ініцыятыве прэзідэнтам і, паводле яго меркаванняў, пераходны перыяд доўжыцца ў Рэспубліцы Беларусь вось ужо 13 гадоў.

Пераклаў з англійскай Вольф Рубінчык

Спасылкі на інтэрнэт-рэсурсы пададзеныя на момант напісаньня артыкулу ў якасьці крыніц паходжаньня інфармацыі. Уладальнік рэсурсу можа выдаліць інфармацыю ці зьмяніць яе URL, таму адрас спасылкі можа ня быць актуальным у канкрэтны момант прагляду — **заўвага адміністратара**

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/2/28**
[image]

[image]
A R C H E
[image]
[image]
[image]

грамадзянскую пазыцыю.
І як жа прыемна пачуць ад прэзыдэнта Беларусі пацьвярджэньне свайго ўяўленьня:
У гэтай аўдыторыі я мушу выкласьці сваё разуменьне гістарычнага выбару Беларусі, раскрыць лёгіку найважнейшых палітычных рашэньняў за апошнія дзесяць гадоў. Веданьне мэханізму і пабуджальных матываў прыняцьця палітычных рашэньняў на найвышэйшым узроўні дапаможа вам і ў навучаньні, і асабліва ў жыцьці, асабліва тым, хто заўтра або ў хуткім часе прыйдзе ў нашае бурлівае, зьменлівае жыцьцё, якое крыху адрозьніваецца ад таго жыцьця, якое ў вас фармуюць у ВНУ.
Вядома, каму ж як не студэнтам, у якіх усё наперадзе, асноўны занятак якіх – думаць і пазнаваць, патрэбнае разуменьне «гістарычнага выбару Беларусі», каму як ня ім мусіць быць раскрытая «лёгіка найважнейшых палітычных рашэньняў»?
Я таксама ня супраць зразумець, як кіраўніцтва краіны бачыць «*гістарычны выбар*», і мне вельмі карціць разабрацца зь «*лёгікай найважнейшых палітычных рашэньняў*».
Я не наіўны даматур-абывацель, каб не разумець, што часам прэзыдэнт мусіць гаварыць папулісцкімі лёзунгамі, мусіць «агітаваць і матываваць» грамадзянаў. Я не чакаю ад такіх прамоваў прэзыдэнта лёгікі і фармулёвак гістарычнага выбару, нават калі ён і выкарыстоўвае такія катэгорыі. Але да прамоўленага ў студэнцкай аўдыторыі слова «лёгіка» я стаўлюся сур'ёзна, я буду чакаць менавіта лёгікі і аналізаваць сказанае менавіта з пазыцыі лёгікі. І калі выкарыстана катэгорыя «гістарычны выбар», дык я буду думаць і разважаць менавіта пра гістарычны выбар Беларусі.
Скажу больш, я чакаў менавіта гэтага 10 гадоў. Ня проста чакаў, я задаваў адпаведныя пытаньні. У 1994 годзе я зразумеў, што кіраўнікі Рэспублікі Беларусь і грамадзкія лідэры маюць вельмі цьмянае ўяўленьне пра тое, што такое Беларусь. А бязь веданьня і разуменьня таго, што такое Беларусь, ці можна ёй правільна кіраваць? Ці можна яе ўладкаваць? Вызначыць яе гістарычную будучыню? Я пераканаы, што нельга. Таму я й казаў 10 гадоў таму, што Беларусь – гэта праблема. Гэта філязофская праблема, таму трэба разгадаць яе як унікальны фэномэн, як беларускую загадку. Гэта мэтадалягічная праблема, таму для Беларусі мусіць быць свой праект

уладкаваньня краіны, і краіна не павінна «даношваць» нерэалізаваныя праекты разьвітага сацыялізму і індустрыялізацыі БССР. Мусіць быць распрацаваная свая праграма разьвіцьця, бо нават калі мы рухаемся ў адным кірунку з суседзямі – Польшчай, Літвой, Украінай – нашая зыходная пазыцыя ўсё ж такі адрозная ад іншых краінаў, у іх свае магчымасьці для разьвіцьця, у нас іншыя, таму – кожнаму сваё! Кожнаму сваё разьвіцьцё, кожнаму разьвіцьцю – сваю праграму. І такая праграма разьвіцьця ня можа ня быць распрацаваная нідзе, акрамя як у самой Беларусі.

Вядома, усе гэтыя 10 гадоў я ня толькі чакаў адказаў на свае пытаньні і рашэньня сфармуляваных праблемаў ад кіраўнікоў краіны. Я й сам неяк адказваў на пытаньні й вырашаў праблемы. Таму я перадузяты чытач выступу Лукашэнкі перад студэнтамі Берасьця. Я не гатовы прыняць любыя адказы, якія дасьць прэзыдэнт, я не магу прыняць любыя вырашэньні праблемаў. Мне патрэбныя аргумэнтаваныя адказы і абгрунтаваныя рашэньні.

Можа, перадузятасьць – гэта блага? Можа, мне гэта будзе перашкаджаць разумець прэзыдэнта? Можа быць! Але я не магу інакш. Мне не абыякавы лёс краіны, а неабыякавасьць – гэта і ёсьць пачатак перадузятасьці. Я б ня меў рацыі, калі б рабіў выгляд, што гэта ня так, што я магу заняць адстароненую пазыцыю і разглядаць і саму Беларусь, і яе прэзыдэнта як у тэлескоп зь іншай плянэты. Не, я тут жыву, я тутэйшы, і для мяне ўсё тут важна, усё мае сваё значэньне, а часта і баліць. Я шмат з чым ня згодны з таго, што дзеецца ў маёй краіне. І вось з гэтай сваёй нязгодай, зацікаўленасьцю і болем я пачынаю чытаць тэкст выступу Лукашэнкі. І як файна, што на самым пачатку тэксту я знаходжу такія словы:

Хацеў бы і з вамі шчыра, адкрыта пагаварыць. Я заўжды арыентаваў кіраўнікоў ВНУ, выкладчыкаў на тое, каб студэнты самі вызначаліся, хто будзе ў аўдыторыі на сустрэчы з прэзыдэнтам. І, вядома, для мяне будзе вялікім расчараваньнем, калі я даведаюся, што адбор быў паводле нейкіх іншых крытэраў, а не паводле прынцыпаў сапраўднай дэмакратыі, калі студэнт сам у групе, або на факультэце, або на курсе вызначае, каму быць у гэтай залі.

Я зыходжу з таго, што, хоць мы і перажываем пэўны пэрыяд, складаны пэрыяд у палітычным жыцьці нашай дзяржавы, тым

ня менш, хацелася б сустракацца і зь людзьмі, якія, магчыма, увогуле на дух не выносяць прэзыдэнта. Я хацеў бы зь імі пагаварыць і высьветліць непасрэдна ў іх, у чым праблемы. І рэч нават не ў прэзыдэнту, а ў той палітыцы, якую ажыццяўляе сёньня дзяржаўная ўлада на чале з прэзыдэнтам. Таму я вельмі хацеў бы, каб у гэтай залі прысутнічалі людзі, якія думаюць інакш. Натуральна, велізарная большасьць – гэта студэнты, што падтрымліваюць той курс, які праводзіцца. У адваротным выпадку паўстае пытаньне – што, трэба быць апазыцыянэрам, каб трапіць да прэзыдэнта на сустрэчу?

Калі я правільна разумею, дакладчык кажа, што хацеў бы бачыць у аўдыторыі людзей накшталт мяне, але толькі студэнцкага веку? Я заўжды быў у апазыцыі, актыўна або ня вельмі, палітычнай або проста грамадзянскай, але ў апазыцыі. Прэзыдэнт кажа, што хацеў бы з апазыцыяй пагаварыць, непасрэдна высьветліць, у чым нашы, а значыць, у тым ліку мае, праблемы. Калі б гэта было праўдай, дык я б нават зьмяніў сваё стаўленьне да Лукашэнкі (рэч у тым, што я ніколі не хаваў, што належу да тых, хто «*на дух не выносяць прэзыдэнта*»). Але гэта проста рытарычны фрагмэнт дзеля гожага слоўца. І я магу гэта давесьці, як ніхто іншы. Як толькі прэзыдэнт пабачыў мяне ў тэлебачаньні, ён ня толькі не захацеў, каб я сам або вуснамі запрошаных на перадачу апазыцыянэраў гаварыў пра нашыя праблемы, ён катэгарычна загадаў кіраўніцтву каналу АНТ на парог мяне не пускаць і забараніць супрацоўнікам тэлебачаньня гаварыць са мной. Ці магу я паверыць, што ён «*хацеў бы зь імі пагаварыць і высьветліць непасрэдна ў іх, у чым праблемы*», хацеў бы, «*каб у гэтай залі прысутнічалі людзі, якія думаюць інакш*»?

Так, я перадузяты, я думаю інакш. І дзеля таго, каб са мной пагаварыць, ня трэба, каб я прысутнічаў у залі. Дастаткова не звальняць мяне з тэлебачаньня або проста чытаць тое, што я пішу. Бо я ж чытаю, што ён піша!

А ён часам нават піша рэчы, зь якімі нельга не пагадзіцца. Я б спачатку пералічыў усё тое нешматлікае, у чым я згодны з Лукашэнкам. Дакладней, ня зь ім, а з тым, што ён кажа. Мне гэтае адрозьненьне вельмі важнае. Рэч у тым, што аўтар тэксту можа быць зразуметы асобна ад самога тэксту. Я ня буду цяпер спасылацца на філязофію тэксту, на Вітгенштайна, структуралізм, сэміётыку і постмадэрн. Нават неспэцыялісты

ведаюць, што мана існуе. Што ў маўленьні шмат што гаворыцца няшчыра, што мова выкарыстоўваецца ня толькі дзеля таго, каб выказваць свае думкі, але і дзеля таго, каб іх хаваць. Таму я ня маю права думаць, што два выразы: «я згодны з табой» і «я згодны з тым, што ты кажаш» – значаць адно і тое ж. Гэта розныя рэчы. Магчыма, я цяпер выкарыстоўваю вузкае разуменьне пэрфарматыву паводле Дж. Остына (так я ўжо арыентаваны ў сваёй аналітычнай практыцы, гэта падмурак майго аналітычнага мэтаду), але я ніколі не аналізую тэксты самі празь сябе, я аналізую пэрфарматыў, г. зн. чытаю тэкст як учынак, тэкст як дзеяньне. Мяне цікавіць ня гэтак «*што менавіта сказана?», але «навошта гэта сказана?» або «якая мэта гэтым дасягаецца?*». Кожны тэкст мае парадыгматычнае вымярэньне, сынтагматычнае, але мяне больш за ўсё цікавіць прагматычнае вымярэньне. Прагматыка ня толькі ў вузкалінгвістычным значэньні, але і ў сэнсе філязофскага і мэтадалягічнага прагматызму.

Напрыклад, калі чалавек прамаўляе фальшывы тэкст, але ня хоча маніць, ён заўжды можа сказаць гэтак: «Я цяпер скажу няпраўду, вось яна: …». Тады будзе зразумела, што сказанае ёсьць мана. І гэтая прамоўленая мана, тым самым, застаецца тэкстам-маной, але перастае быць дзеяньнем-маной. І наадварот, можна прамаўляць праўдзівы тэкст, і гэтым тэкстам падманваць, уводзіць у зман.

* * *

Дык вось што кажа Лукашэнка студэнтам:

То бок мы будзем усё рабіць дзеля моладзі, каб яна магла атрымаць самае галоўнае ў жыцьці – адукацыю. Нават ня веды. Трэба навучыць чэрпаць веды. Ты ня можаш у ВНУ атрымаць раз і назаўжды неабходны аб'ём ведаў. Цябе тут мусяць навучыць здабываць веды, працаваць з кнігай, Інтэрнэтам, падручнікам. Мусяць навучыць і прышчапіць, калі выйдзе, пачуцьцё неабходнасьці ўвесь час атрымліваць веды і ўдасканальвацца. Гэта галоўная задача ВНУ.

Дзеля таго, каб чалавек рэалізаваўся, дзеля таго, каб ён быў незалежным і вольным, ён мусіць быць адукаваным чалавекам. Таму найвышэйшая каштоўнасьць кожнага чалавека – гэта адукацыя.

Хто ж будзе пярэчыць? Я ня буду. Я нават ня буду казаць, што

закрыцьцё ЭГУ супярэчыць гэтаму сьцьверджаньню. Я нават ня буду пакуль казаць пра тое, што ўвядзеньне ў праграму ВНУ курсу ідэалёгіі карэнным чынам адмаўляе тэзіс «*Нават ня веды. Трэба навучыць чэрпаць веды. Ты ня можаш у ВНУ атрымаць раз і назаўжды неабходны аб'ём ведаў*», бо ідэалёгія – гэта гатовыя, разжаваныя веды, якія ўкладаюцца ў сьвядомасьць і якія мусяць прымацца бяз крытыкі. То бок ідэалёгіі ня месца ў ВНУ, пра якую гаворыць прэзыдэнт. Я ня буду гаварыць пра ўказ Міністэрства адукацыі, які з гэтага году абмяжоўвае магчымасьці студэнтаў і выкладчыкаў беларускіх ВНУ ўдзельнічаць у акадэмічных абменах з эўрапейскімі краінамі, закрывае Беларусі і магчымасьць удзелу ў Балёнскім працэсе, які накіраваны якраз на вольнае неабмежаванае атрыманьне ведаў з усіх даступных у Эўропе крыніцаў пры фінансавай падтрымцы Эўрапейскага Зьвязу.

Мне цікава іншае: навошта Лукашэнка прамаўляе гэты хоць і банальны, але правільны тэкст? Якой мэты ён тым самым дасягае? Ізноў-такі, я перадузяты ў сваім аналізе. Відавочную прагматычную мэту – закласьці асновы ўзаемаразуменьня з аўдыторыяй, я адмыслова аналізаваць ня буду. Гэта зразумела, і ўсімі аратарамі выкарыстоўваецца паводле звычайнай схемы: «Вось простая ісьціна, мы ўсе яе разумеем і падзяляем, значыць, мы зможам падзяляць і разумець і не нагэтулькі простыя ісьціны, якія я маю вам сказаць». Я якраз і займуся пошукам у тэксьце той, менш відавочнай ісьціны, якую аратар хоча прычапіць, як вагон да лякаматыва. І вось што я знайшоў: *Палітыка – гэта мастацтва магчымага, а гэтыя магчымасьці стварае грамадзтва, то бок вы, даруйце за гэтую філязофію. Зыходзячы з гэтых магчымасьцяў, якія вы ствараеце для мяне, я і праводжу адпаведную палітыку. Я б мог сёньня праводзіць тую палітыку, якую праводзяць у іншых дзяржавах. Я ж навучыўся веды здабываць, адукаваны чалавек, у мяне шмат памочнікаў – пісьменных, дактароў навук, акадэмікаў, якія прыйдуць і скажуць: вось сыстэма ў Швэцыі, вось у Нямеччыне, вось спалучэньне, праводзьце гэтую. Я бяру гэтую палітыку, кладу на нашу грэшную зямлю – і ў раёне Берасьця яна тапырыцца. Значыць, непрыдатная палітыка, калі яна на нашу грэшную зямлю не кладзецца, гэтая схема, яе ня трэба браць.*

Дык вось як: «*Я ж навучыўся веды здабываць, адукаваны чалавек, у мяне шмат памочнікаў – пісьменных, дактароў навук,*

акадэмікаў»? Зыходзячы зь зьместу «лякаматыва» пра тое, чаму трэба навучыць студэнтаў, у «вагоне» сьцьвярджаецца, што «*Я ж навучыўся веды здабываць, адукаваны чалавек*». Г. зн. я такі самы, як вы, «мы адной крыві».

Што ж, гэта распаўсюджаны аратарскі прыём. Як і ўсякі тэхнічны прыём, ён ані благі, ані добры. Гэта як пісталет у руках бандыта і ў руках паліцыянта. Важна, на каго скіраваны пісталет, важна, чаго хоча дамагчыся аратар такім прыёмам. А вось чаго: «*Вось сыстэма ў Швэцыі, вось у Нямеччыне, вось спалучэньне, праводзьце гэтую. Я бяру гэтую палітыку, кладу на нашу грэшную зямлю – і ў раёне Берасьця яна тапырыцца. Значыць, непрыдатная палітыка, калі яна на нашу грэшную зямлю не кладзецца, гэтая схема, яе ня трэба браць*». Ізноў я перадузята стаўлюся да такога сьцьверджаньня.

Я дык думаю, і заўжды гэта сьцьвярджаў, што сучасная дзяржаўная адміністрацыя недастаткова кампэтэнтная, каб рэалізаваць у нас тую палітыку, якая патрэбная нашай краіне. А аратар сьцьвярджае, што «*ў раёне Берасьця яна тапырыцца», што «яна на нашу грэшную зямлю не кладзецца*».

Уявім сабе, што нехта бярэ ў рукі пісталет, страляе ў мішэнь і не пацэльвае. Якія могуць быць прычыны ў такой няўдачы? Ня думаю, што нехта ў здаровым розуме можа бачыць прычыну ў тым, што мішэнь маленькая. Кшталту: «Вось каб была мішэнь на ўсю сьцяну, тады я б пацэліў!» Гэта відавочна неразумная вэрсія, хоць і такія часам сустракаюцца ў нашай палітыцы. Але праўдападобныя вэрсіі, якія не супярэчаць здароваму сэнсу, таксама могуць быць розныя. Напрыклад, першая вэрсія: пісталет благі, не прыстраляны, мушка крывая і г. д. І другая вэрсія: стралок нікчэмны. Іншы лёгка б пацэліў у мішэнь з таго самага пісталета. Пацэліць бы ён пацэліў, але ж хто яму пісталет дасьць?

Мадэль мадэльлю, мэтафара мэтафарай, але сутнасьць, якую аратар спрабуе данесьці да студэнтаў Берасьця, палягае менавіта ў тым, што «пісталет благі», г. зн. рынкавая эканоміка, гуманістычная і лібэральная палітыка, якімі кіруюцца ўсе краіны ў Эўропе, «*на нашу грэшную зямлю не кладзецца … і ў раёне Берасьця яна тапырыцца*».

Вось такая лёгіка (я на пачатку папярэджваў, што буду лёгіку шукаць у тэксьце)! Давайце разьбяром яшчэ раз і па кроках. Пытаньне: чаму сучасны беларускі рэжым праводзіць зусім ня

тую палітыку, якую праводзяць ува ўсёй Эўропе? («*У мяне шмат памочнікаў – пісьменных, дактароў навук, акадэмікаў, якія прыйдуць і скажуць: вось сыстэма ў Швэцыі, вось у Нямеччыне, вось спалучэньне, праводзьце гэтую*».)
Адказ: «*у раёне Берасьця яна тапырыцца. Значыць, непрыдатная палітыка, калі яна на нашу грэшную зямлю не кладзецца, гэтая схема, яе ня трэба браць*».
І пры гэтым нельга ж не пагадзіцца з тым, што такая вэрсія адказу лягічна магчымая. Але менавіта магчымая. Бо гэтая вэрсія вызначаецца тым, хто праводзіць гэтую палітыку, г. зн. «у чыіх руках пісталет». Аратар кажа: «*Я бяру гэтую палітыку, кладу на нашу грэшную зямлю*». Лягічны суб'ект або граматычны дзейнік тут «я». Лягічна было б праверыць, «*ці тапырылася б гэтая палітыка ў раёне Берасьця*», калі б гэтую палітыку «*браў і клаў на грэшную зямлю*» (страляў бы ў мішэнь) нехта іншы? Ня трэба быць вялікім філёзафам, каб убачыць, што такі варыянт ня проста лягічны, як адзін з магчымых, гэты варыянт папросту неабходны, зыходзячы зь лёгікі.
Але ў такім разе вяртаемся назад па тэксьце і прыгадваем пра тое, што аратар мусіў «*выкласьці сваё разуменьне гістарычнага выбару Беларусі, раскрыць лёгіку найважнейшых палітычных рашэньняў*», калі ён так сам сказаў. Ці раскрыў ён гэтую «*лёгіку найважнейшых палітычных рашэньняў*»?
Я б сказаў, што раскрыў. Раскрыў з усёй відавочнасьцю. Але сказаць я сказаў бы, і нават кажу, аднак вымушаны гаварыць гэта з засьцярогамі.
Засьцярогі ж у тым, што гэтая «*лёгіка найважнейшых палітычных рашэньняў*» раскрываецца толькі перад тым, хто крыху знаёмы зь лёгікай, тым, хто лягічна адукаваны. А калі не? Калі не, трэба працягваць далей.
Аналізуючы тэкст, чытаць трэба ня толькі словы, трэба ўтрымліваць у галаве яшчэ шмат чаго. Напрыклад, месца і час, калі гэтыя словы сказаныя. Акалічнасьці, у якіх гэта гаворыцца, то бок акалічнасьці спосабу дзеяньня і гаварэньня, кантэкст.
Задамо сабе пытаньне: А якое «*найважнейшае палітычнае рашэньне*» маецца на ўвазе ў гэтым аратарскім лягічным практыкаваньні? Калі ня ўлічваць усяго кантэксту, можна падумаць, што гаворка пра рынкавую эканоміку, прыватызацыю, пра лібэральную палітыку, пра эўрапейскія каштоўнасьці, якія «*тапырацца ў раёне Берасьця*». Так, і пра іх

таксама. Але калі, чытаючы тэкст, памятаць пра дату, калі ён прамоўлены аўтарам, то нельга памыліцца адносна таго, якое «*найважнейшае палітычнае рашэньне*» маецца на ўвазе, гэта, вядома ж, рэфэрэндум пра зьняцьце канстытуцыйных абмежаваньняў на «права трымаць пісталет у сваіх руках» або пра бестэрміновае права «*браць і класьці на грэшную зямлю*» тую палітыку, якую Лукашэнка можа і ўмее «*браць і класьці*». Пакінем пакуль убаку пытаньне пра тое, што там «*тапырыцца ў раёне Берасьця*», канстатуем, што гаворка пра абгрунтаваньне таго, што больш нікому і ня трэба спрабаваць праводзіць такую палітыку, як «*у Швэцыі і ў Нямеччыне*» і ў Эўропе. І як галоўны аргумэнт на карысьць гэтага сьцьверджаньня – «*Я б мог сёньня праводзіць тую палітыку, якую праводзяць у іншых краінах. Я ж навучыўся веды здабываць, адукаваны чалавек, у мяне шмат памочнікаў – пісьменных, дактароў навук, акадэмікаў…*»
Дык вось, зыходзячы зь лёгікі, усё гэта не даведзена і не абгрунтавана. Але вырванае з кантэксту кожнае з выказваньняў не выглядае маной, нават наадварот, здаецца вельмі праўдападобным.
Аднак вельмі неразумна пярэчыць супраць ідэалягічных тэзысаў аратара ідэалягічнымі ж пярэчаньнямі. Толькі лягічны аналіз можа высьветліць, што ж менавіта сьцьвярджае і робіць аратар.
Падыходзячы да тэксту выступу зь лягічных пазыцыяў, можна заўважыць пэўную зьмену ідэалягічнага дыскурсу. Цяпер заходні эўрапейскі шлях разьвіцьця адкідаецца з аксіялягічных меркаваньняў, г. зн. як каштоўнасьці, пра якія няма сэнсу спрачацца. Цяпер сьцьвярджаецца:
— што прэзыдэнт дастаткова адукаваны, амаль гэтак жа, як будуць адукаваныя берасьцейскія студэнты;
— што гэтай адукаванасьці дастаткова, каб рэалізаваць тую эўрапейскую «*палітыку, якую праводзяць у іншых дзяржавах*», якую прапаноўваюць «*пісьменныя прафэсары і акадэмікі*»;
— што прэзыдэнт бачыць далей і глыбей, чым гэтыя «*пісьменныя прафэсары і акадэмікі*», ён у галаве «*бярэ гэтую палітыку, кладзе на нашу грэшную зямлю – і ў раёне Берасьця яна тапырыцца*», з чаго ён высноўвае, што гэта «*непрыдатная палітыка, калі яна на нашу грэшную зямлю не кладзецца, гэтая схема, яе ня трэба браць*»;
— што ўсе «*пісьменныя і адукаваныя*» мусяць з гэтым

пагадзіцца, бо аратар гэта ўжо давёў;
— што ў засваеньні гэтых ведаў, гэтага погляду на парадак рэчаў і ёсьць сутнасьць адукацыі.
Усё астатняе, што аратар асьвяціў у сваім выступе, гэта толькі ілюстрацыя да такой вось «лягічнай схемы». Гэта й пранікнёнае апавяданьне пра тое, як ворагі выкарыстоўвалі добрую ВНУ ЭГУ дзеля пранікненьня ў душы студэнтаў і яго давялося зачыніць, каб эліта рыхтавалася не ў эўрапейскім унівэрсытэце, а ў ВНУ Баранавічаў і Берасьця – паводле змаўчаньня маецца на ўвазе, што яны не эўрапейскія.
Так, каб не прапусьціць галоўнага і не патануць у аналізе кожнага з тэзысаў дакладу, трэба прыгадаць задачу, якую сфармуляваў сам аратар: «*У гэтай аўдыторыі я павінен… раскрыць лёгіку найважнейшых палітычных рашэньняў*». Ці раскрытая аратарам гэтая лёгіка?
Я б сказаў, што так, лёгіка раскрытая. Яна палягае якраз у парушэньні элемэнтарнай лёгікі. У тым, каб не дапускаць лягічнай вэрыфікацыі палітычных тэзысаў і дзеяньняў. Не дапускаць магчымасьці праверкі таго, што робіць сёньня прэзыдэнт.
Ад сябе я б дадаў толькі наступнае. Лёгіка – гэта самы вялікі прабел у беларускай вышэйшай адукацыі. Прабел, які нам дастаўся ад савецкай адукацыі, якая зусім не была найлепшай у сьвеце, ужо толькі з гэтай прычыны. Я б працягнуў гэтую думку і сказаў бы, што менавіта лягічныя памылкі замінаюць палітычнай апазыцыі даць рады пануючаму ў сучаснай Беларусі дыскурсу і рыторыцы. Але я пра гэта ўжо казаў у сваёй старой кнізе (гл. разьдзел «Выбары і лёгіка» ў кнізе «Беларуская дэмакратыя: насуперак відавочнасьці»), таму ня буду паўтарацца.

* * *

Апроч лёгікі прыняцьця найважнейшых палітычных рашэньняў, прэзыдэнт на пачатку сваёй прамовы абяцаў «*выкласьці сваё разуменьне гістарычнага выбару Беларусі*». Гэта ня менш цікавая тэма. Магчыма, нават самая важная. Калі пачаць шукаць выклад гістарычнага выбару ў тэксьце выступу, пачынаеш разумець глыбокі сэнс таго, чаму гэты тэкст прамоўлены менавіта ў Берасьці, а ня ў Гомелі або ў Горадні.
Увогуле, слушна было б спытаць аратара: ці гэтая палітыка

«*тапырыцца і ў раёне Горадні*»? А ў Гомелі або Магілёве? Я мяркую, што ў Магілёве або ў Гомелі гэты тэкст ня меў бы такога сэнсу, які Лукашэнка спрабуе яму надаць, а ў Горадні гэты дыскурс выглядаў бы не пераканаўча. Паспрабуем праверыць гэтае дапушчэньне тэзысамі самога дакладу.

Чаму тады Беларусь не сышла «ў Эўропу» (бяру ў двукосьсе, бо нам ня трэба сыходзіць ні ў якую Эўропу – мы знаходзімся ў сэрцы Эўропы, у цэнтры)? Я не выпадкова закранаю гэтае пытаньне. Бо, згодна з вывучэньнем думкі ў нашых берасьцейскіх ВНУ, ёсьць тыя, хто: «У Эўропу, хочам у Эўропу».

Не, «*не выпадкова закранае гэтае пытаньне*» аратар менавіта ў Берасьці, як бы ў самым «заходнім» горадзе нашай краіны. Вось яшчэ цытата, дзе гэта гаворыцца непасрэдна:

Нейкая (вельмі невялікая) частка людзей, магчыма, зможа адаптавацца да заходняга ладу, але беларускі народ у цэлым – не. Я не баюся гэта сказаць тут, на захадзе, бо тут ёсьць дастаткова вялікія групы людзей, якія маглі б адаптавацца да гэтага, жывучы непасрэдна ў кантакце з гэтай заходняй, калі можна так сказаць, цывілізацыяй. Але народ у цэлым – не.

У прэзыдэнцкім дыскурсе Берасьце выяўляецца як самы заходні або самы эўрапейскі горад Беларусі. І менавіта тут яму важна сказаць, што хоць «*мы знаходзімся ў сэрцы Эўропы, у цэнтры*», але мы не Эўропа. Сказаць такое ў Магілёве – практычна нічога не сказаць. Сказаць такое ў Горадні – могуць і гнілымі памідорамі закідаць (гэта, вядома, перабольшаньне для нашай талерантнай рэспублікі, але, усё ж такі, рызыка ёсьць). Таму гэта прамаўляецца ў Берасьці, прамаўляецца не для Берасьця, а для ўсёй краіны. Message палягае ў наступным: «Вось я кажу гэта ў самым заходнім горадзе Беларусі, самай праэўрапейскай публіцы – студэнтам, у месцы, якое атаясамліваецца з інтэлектуальнай дзейнасьцю, – у ВНУ, і ўсе са мной згодныя. Мы адной крыві. А ўжо калі ёсьць у Магілёве тыя, хто хоча ў Эўропу, дык яны зусім з глузду зьехалі. У Берасьці яшчэ даравальна, а вось у Віцебску зусім нонсэнс».

І зноў-такі гэта мана ад першага да апошняга слова. Берасьце ня ёсьць самым заходнім, чытай – эўрапейскім, горадам Беларусі. Гэтаксама як Шчэцін – ня самы заходні горад Польшчы, а Калінінград – Расеі. Шчэцін быў заселены перасяленцамі, у тым ліку і зь Берасьця: палякамі, беларусамі, украінцамі, габрэямі, – якія не хацелі заставацца на савецкай

тэрыторыі пасьля 1944 году. Калінінград быў заселены зэкамі і перасяленцамі зь Сібіру. Берасьце таксама было заселена сем'ямі дэмабілізаваных вайскоўцаў, беспрытульнымі бадзягамі з Расеі і тутэйшымі з навакольных вёсак і мястэчак. (Гл. «Асаблівасьці нацыянальных зносінаў на фоне культурных катастрофаў».) Усе яны ўтварылі аблічча гарадзкой грамады паваеннага Берасьця, у якім ад старога Брэсту-Літоўскага засталася толькі нерухомасьць, дый тое зусім няшмат. І зусім не заходняя і не эўрапейская была гэтая гарадзкая, у першым пакаленьні, грамада. У кожным разе, нават Менску, Горадні, Лідзе, нават Пінску Берасьце ў гэтым дачыненьні моцна саступае.

Але, тым ня менш, і ў Берасьці тэзыс пра тое, што Беларусь не Эўропа, неабходна даводзіць. І тут аратар дэманструе неўласьцівую яму раней гістарычную абазнанасьць:

Пытаньне гэтае мае ня толькі і ня гэтулькі гістарычнае значэньне. Сёньня апазыцыя спрабуе прыцягнуць на свой бок моладзь лёзунгамі праэўрапейскай арыентацыі. І нямала юных галоваў ёй удаецца зацягнуць лёзунгам, як я ўжо сказаў, «У Эўропу і годзе!». Сапраўды, а чаму б не ў Эўропу, як Польшча, як Прыбалтыка? Можаце з гэтымі тэарэтычнымі разважаньнямі – яны ня новыя, але я іх падтрымліваю – не пагадзіцца, але я, тым ня менш, насьмелюся іх выкласьці як гісторык. Перадусім таму, што Беларусь, у адрозьненьне ад Польшчы і прыбалтыйскіх рэспублік, НІКОЛІ, дазволю сабе сьцьвярджаць, НІКОЛІ не была часткай заходняй культуры і заходняга, асабліва заходняга, ладу жыцьця. Так, мы падпадалі пад уплыў і заходняй культуры, і заходняга ладу жыцьця, больш за тое, Рэч Паспалітая і Вялікае Княства Літоўскае – усё гэта накладала на нас адбітак. Але гэта было і мінулася. Бо «прышыць» нам усё заходняе тады не ўдалося і цяпер, мусіць, ня ўдасца. Таму, яшчэ раз паўтараю, Беларусь НІКОЛІ не была часткай заходняй культуры і асабліва часткай таго ладу жыцьця, які фармаваўся на Захадзе. Так, мы былі, ёсьць і будзем неад'емным складнікам агульнаэўрапейскай цывілізацыі, якая ўяўляе сабой мазаіку розных культураў. Але для каталіцкай, пратэстанцкай заходняй цывілізацыі пераважна праваслаўная, якая стагодзьдзямі жыла разам з Расеяй, расейцамі, Беларусь і беларусы не зьяўляюцца роднымі. Нейкая (вельмі невялікая) частка людзей, магчыма, зможа адаптавацца да заходняга ладу, але беларускі народ у цэлым – не. Я не баюся

сказаць гэта тут, на захадзе, бо тут ёсьць дастаткова вялікія групы людзей, якія маглі б адаптавацца да гэтага, жывучы непасрэдна ў кантакце з гэтай заходняй, калі можна так сказаць, цывілізацыяй. Але народ у цэлым – не. І ня трэба прыніжацца і напрошвацца ў сваякі да тых, каму мы НІКОЛІ ня будзем сваімі.

Я наўмысна вылучыў экспрэсіўнае слова «НІКОЛІ», якое ў гэтым урыўку сустракаецца ажно чатыры разы, што зусім ня сьведчыць пра наяўнасьць бясспрэчных аргумэнтаў. «*НІКОЛІ, дазволю сабе сьцьвярджаць, НІКОЛІ*» або «*таму, яшчэ раз паўтараю, Беларусь НІКОЛІ не была*» – такія выразы неабходныя тады, калі няма пераканаўчых аргумэнтаў. Бо ўсё, што Лукашэнка мог бы (калі б захацеў) ведаць «*як гісторык*», сьведчыць пра адваротнае. Але яму хочацца і «гісторыкам звацца», і ідэолягам быць. Навошта? Навошта гэта трэба прэзыдэнту?

А дзеля таго, калі мы яшчэ не забылі ягонага абяцаньня «*выкласьці сваё разуменьне гістарычнага выбару Беларусі*», каб такі выкласьці гэтае разуменьне гістарычнага выбару. Вось яно: *Дзесяць гадоў таму вашыя бацькі на абсалютна вольных выбарах, насуперак наймагутнейшаму адміністрацыйнаму ціску, абралі прэзыдэнтам зусім яшчэ маладога чалавека, які абяцаў захаваць самабытнасьць беларускага ладу жыцьця і заключыць саюз з Расеяй. Гэта быў ваш наказ – калі вы не галасавалі, дык галасавалі вашыя бацькі. І ўпэўнены: тут вельмі шмат тых, хто менавіта такі даў тады наказ мне, першаму прэзыдэнту нашай краіны. Прагаласавала тады за мяне больш за 80 % выбарцаў.*

Але гэта ня цягне на гісторыю, ня цягне на гістарычны выбар. Гэта выклад дробязных уладалюбных амбіцыяў. Ня можа гістарычны выбар ажыцьцяўляцца праз выбар пэрсоны. Гісторыя выбірае людзей, людзі твораць гісторыю, але ўсе разам, а не паасобку, хай бы ты быў Аляксандар Македонскі, а не Лукашэнка. Але гэты дыскурс будуецца ня як дыскурс гісторыка, а як паэзія, амаль паводле Маякоўскага («мы говорим – партия, подразумеваем – Ленин»): «мы кажам – гістарычны выбар, маем на ўвазе – выбар Лукашэнкі ў якасьці прэзыдэнта».

Так, але як жа інакш? Ніякіх эмпірычных і лягічных пасылак для трэцяга тэрміну няма, тым больш – для пажыцьцёвага

прэзыдэнцтва. А да сакральных аргумэнтаў Лукашэнка яшчэ не дайшоў. Ён пакуль ня можа сказаць, што ён абраньнік Бога, таму чалавечы выбар значэньня ня мае. Пакуль «сучасны беларускі дыскурс» спыніўся ў прамежку паміж штодзённасьцю і эмпірыкай, з аднаго боку, і сакральнасьцю – з другога. Лукашэнка абраны кіраваць Беларусьсю ня Богам, але ўжо і не людзьмі, бацькамі тых студэнтаў, якія яго слухаюць у Берасьці. Лукашэнка – абраньнік гісторыі, ён і ёсьць «*гістарычны выбар Беларусі*».

Але калі гэта так, то ці ёсьць парушэньнем фальсыфікацыя вынікаў рэфэрэндуму? Не, перад абліччам «*гістарычнага выбару Беларусі*» гэта проста тэхнічныя дэталі, выпраўленьне выпадковых флюктуацыяў.

Што ж разумее аратар пад гісторыяй у сваім дыскурсе? Відавочна, што гэта не навука, як гэта разумее, напрыклад, Сагановіч або Краўцэвіч. Гэта папулярызацыя гістарычных ведаў, як у Арлова. Не дасьледаваньне цёмных месцаў і няяснасьцяў, як у Ермаловіча. Гэта нават не разуменьне свайго месца і прызначэньня як палітыка. Гісторыя для Лукашэнкі – гэта як апалёгія ягонага асабістага дзеяньня, як легітымацыя ягонага сацыяльнага статусу. Такая гісторыя апісаная Карлам Попэрам у «Галечы гістарыцызму». Яна мае справу ня з фактамі, а з жарсьцямі і квазіаб'ектыўнымі законамі. Гэта спроба легітымацыі свайго кіраваньня не паводле палітычных законаў, якія распрацоўваюць і прымаюць людзі згодна з усталяванымі правіламі і працэдурай, а праз законы гісторыі, практычна тоесныя законам прыроды.

Гэта можна патлумачыць прыкладна на такой мадэлі. Калі мы, ведаючы законы тэорыі імавернасьці, кінем манэтку дзесяць разоў і дзевяць разоў выпадзе арол, то мы разумеем, што гэта проста рэдкая выпадковасьць. Правільны вынік мусіць быць 5 разоў – авэрс, 5 разоў – рэвэрс. Таму мы з чыстым сумленьнем працягваем лічыць, што калі фактычны вынік «9 да 1» не адпавядае тэарэтычнаму – «5 да 5», то тым горш для фактаў. Ці трэба зьдзіўляцца таму, што гістарыцыст Лукашэнка лічыць вынікі рэфэрэндуму выпадковай флюктуацыяй, якую проста трэба адкарэктаваць у адпаведнасьці з тэарэтычнай ісьцінай? У гэта цяжка паверыць? А як тады разумець такое перабольшаньне, як гэтая: «*Прагаласавала тады за мяне больш за 80 % выбарцаў*»? Бо кожны студэнт можа пайсьці ў бібліятэку

і праверыць гэтую лічбу! Або проста прыгадае, што Лукашэнка зрабіўся прэзыдэнтам толькі пасьля другога туру, значыць, у першым туры за яго не прагаласавала нават 50 % тых, хто прыйшоў на выбары – нават ня ўсіх выбарцаў!
Але аратар разьлічвае, што студэнты гэтаксама падзяляюць ягоны гістарыцызм. Бо менавіта такому сьветабачаньню паранейшаму навучаюць у беларускіх ВНУ. Ён спадзяецца, што студэнты разумеюць, што 80 % – гэта гістарычна правільная лічба, а тое, што было на рэальных выбарах – папросту выпадковае адхіленьне ад «закону».
Ну, а дзеля таго, каб студэнты працягвалі так лічыць, трэба зачыніць ЭГУ, дзе зьмест навучаньня ўжо ня ўтрымлівае гістарыцызму, і трэба пакінуць правінцыйныя ВНУ, дзе гістарыцызму будуць працягваць навучаць і надалей. І тады можна сказаць наступнае:
Тым ня менш, я раблю часам захады, якія ня вельмі папулярныя, але гэтым самым я крыху падштурхоўваю грамадзтва да таго, да чаго мы мусім прыйсьці.
І тады ніхто не спытае, а «*да чаго мы мусім прыйсьці*»? Таму што гэта або вядома ўсім, бо «*гістарычны выбар… ужо зрабілі вашыя бацькі*», або таму, што тое, «*да чаго мы мусім прыйсьці*», вядома толькі «гістарычнаму абраньніку», пра гэта і пытацца нельга, ён дакладна прывядзе туды, куды трэба.
Вось, уласна кажучы, і ўсё, што мяне зацікавіла ў прамове Лукашэнкі перад студэнтамі Берасьця. Я зусім не зьвяртаў увагі на разважаньні пра дружбу з Расеяй, пра разбуральнікаў «вялікай дзяржавы», пра прыхватызацыю і злосных капіталістаў ды апазыцыянэраў. Усё гэта значна яскравей і выразьней Лукашэнка распавядае на сэлектарных нарадах.
Я папросту сур'ёзна паставіўся да абяцаньня «*выкласьці сваё разуменьне гістарычнага выбару Беларусі, раскрыць лёгіку найважнейшых палітычных рашэньняў*». Гэта тое, што я студэнтам хацеў бы пачуць ад кіраўнікоў таго часу, але не пачуў. А ад першага прэзыдэнта Беларусі пачуў. Але я ўжо не студэнт. Мяне такія адказы не задавальняюць. Цікава, а што з усяго гэтага пачулі берасьцейскія студэнты, увогуле беларускія студэнты? Тыя, хто рана ці позна павінен будзе адказваць і за гістарычны выбар, і прымаць найважнейшыя палітычныя рашэньні? Барані Бог ім мець такое самае «разуменьне» гісторыі і гістарычнага выбару, як у аратара, і такую самую

«лёгіку»!
Усё ж нельга не пагадзіцца са словамі аратара: «*Дзеля таго, каб чалавек рэалізаваўся, дзеля таго, каб ён быў незалежным і вольным, ён мусіць быць адукаваным чалавекам. Таму найвышэйшая каштоўнасьць кожнага чалавека – гэта адукацыя*». Але з самім аратарам пагадзіцца ніяк нельга, бо ён сам ня можа пахваліцца ані свабодай, ані незалежнасьцю, ані адукаванасьцю. Правільныя словы можна прамаўляць і не разумеючы іх. Гэта і магнітафон можа рабіць.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/2/28
[image]

Мінулае (1’2000)

[image]
ARCHE

[image]

[image]
[image]2004
рэцэнзіі
[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

Пачатак • Навіны • Форум • Пошук • Аўтары • Цалкам •

звычайна
сьведчаць аб
канчатковай
кансалідацыі
дэмакратычнага
працэсу.
Дарма што ў
Расеі ў
канцы 2003
– пачатку
2004 году
адбыўся ня
трэці, а ўжо
чацьверты
раўнд такіх
выбараў,
тое, што зь
іх
нарадзілася,
ніяк нельга
назваць
загартаванай
дэмакратыяй,
гэта хутчэй
перамадэляваны
аўтарытарызм.
Пасьля
больш чым
дванаццаці
гадоў
высілкаў,
накіраваных
на
рэфармаваньне,
Расея пад
уладаю
прэзыдэнта
Пуціна
вяртаецца
да тых

самых
адносінаў
паміж
уладамі і
грамадствам,
ад якіх яна
так
пакутліва
намагалася
пазбавіцца
цягам 90-х.

Пуцін – гэта штучна прызначаны спадкаемца Барыса Ельцына. Той знаходзіўся на пасадзе прэзыдэнта Расеі з 1991 да 1999 году. У супярэчлівай эканамічнай і палітычнай спадчыне Ельцына быў закладзены патэнцыял як для далейшага пашырэньня здаровай канкурэнцыі ў палітычнай і эканамічнай сфэрах, так і для адкату ў бок аўтарытарызму і выкарыстаньня ўлады для задушэньня эканамічнае канкурэнцыі. Сам Ельцын быў даволі супярэчліваю фігурай. Ён разрываўся паміж сваімі савецкімі каранямі і жаданьнем – часта ўяўным – пазбавіцца ад іх, падтрымліваючы свабоду прэсы, публічных дыскусій і палітычны плюралізм. Пуцін, аднак, хаця ён маладзейшы і больш «сучасны», ад такой дваістасьці не пакутуе. Ён рашуча адвярнуўся ад лібэральнага боку ельцынскай спадчыны і зрабіў свой выбар на карысьць дамаслага аўтарытарызму. Якія фактары стаяць за рэгрэсам расейскай дэмакратыі? Што магло б спыніць гэты адкат? Каб адказаць на гэтыя пытаньні, трэба пачаць з таго, што расейская палітыка 1990-х пакутавала ад унутранай нестабільнасьці, якую спараджалі яе ўзаемавыключальныя прынцыпы. З аднаго боку, сярод расейцаў панаваў такі погляд на ўладу, пры якім яна ўспрымалася як нешта непадзельнае і ўвасобленае ў адным кіраўніку. З другога боку, ранейшыя формы легітымізацыі (такія, як дынастычнае перайманьне трону ці марксісцкая ідэалёгія) састарэлі, і дэмакратычныя выбары засталіся «адзіным сьвятам у горадзе». Такім чынам, сытуацыю можна акрэсьліць як «аднаўладзьдзе з усеагульнай згоды». Як можна меркаваць, зважаючы на стан унутранай напружанасьці сыстэмы, у ёй спалучаюцца стратэгічны кансэрватызм з тактычнымі інавацыямі. Улада

шукае шляхі, каб заставацца самаўзнаўляльнай і незалежнай ад грамадзтва, але дзеля гэтай кансэрватыўнай мэты яна таксама шукае новыя і адмысловыя сродкі дасягненьня легітымнасьці ў вачох народу і дэмакратычнага сьвету.
Да таго ж, рэйтынг дэмакратыі значна панізіўся ў 1990-я, калі эканамічныя хваробы і слабасьць уладных інстытутаў абудзілі настальгію па «моцнай руцэ, якая б трымала стырно». У вялікай колькасьці пачалі праяўляцца старыя і зусім не дэмакратычныя архетыпы – як царскія, так і камуністычныя. Палітыкі і інтэлектуалы нават больш за астатняе грамадзтва супраціўляліся лібэральным зьменам, усяляк даводзячы, што лібэральныя ўстановы і мэтады кіраваньня не зусім падыходзяць да ўнікальных расейскіх акалічнасьцяў і характару. Калі здароўе Ельцына пачало пагаршацца, ягоны клан кінуўся шукаць асобу з сувязямі ў сілавых структурах, якая магла б абараніць іх інтарэсы. У апошнія месяцы кіраваньня Ельцына хісткасьць мэханізмаў ажыцьцяўленьня ягонай улады зрабілася відавочнай. У прыватнасьці, адначасовыя намаганьні з боку алігархічных і папулісцкіх сілаў, накіраваныя на эксплюатацыю недаразьвітых дэмакратычных інстытутаў Расеі, узмацнілі (амаль напэўна перабольшанае) уражаньне, што толькі яшчэ больш моцная выканаўчая галіна ўлады можа ўтрымаць дзяржаву ад поўнага развалу. Уварваньне чачэнскіх сэпаратыстаў у Дагестан, загадкавыя выбухі жылых шматкватэрных дамоў у Маскве і Валгадонску таксама адбіліся на грамадзкіх настроях, як і прыклад, пададзены Ельцыным, калі ён заўчасна, за чатыры месяцы да тэрміну (сакавік 2000), сышоў са сваёй пасады. Гэта, дарэчы, сталася сапраўдным збоем у нармальным дэмакратычным спаборніцтве паміж палітыкамі, бо Пуцін выйшаў на выбары пасьля пэўнага тэрміну фактычнага кіраваньня краінай. Так шэраг структурных, сытуацыйных і сацыякультурных фактараў забясьпечыў умовы для аўтарытарнага выбару Пуціна, які ён пашыраў, узмацняў і ўдасканальваў на працягу некалькіх гадоў.

НОВАЯ МАДЭЛЬ АЎТАРЫТАРЫЗМУ

Парлямэнцкія выбары 2003-га і выбары прэзыдэнта 2004 году

ўзаконілі пуцінскі аўтарытарызм новага ўзору. Мінуліся часы стракатай амбівалентнасьці ельцынскай сыстэмы зь яе элемэнтамі савецкага і дасавецкага пэрсаналізму і з адначасовым захаваньнем плюралізму ды элемэнтарных дэмакратычных працэдураў. Пуцін, як і Ельцын, хоча, каб улада канцэнтравалася ў руках прэзыдэнта, але адмаўляецца да пэўнай ступені ад хаатычнага стылю ельцынскага кіраваньня на карысьць больш сыстэматычнага падыходу, які палягае ўва ўзмацненьні дзяржаўнай бюракратыі, і асабліва, сілавых ведамстваў. Рэжым Ельцына выжыў дзякуючы дэцэнтралізацыі ўлады. Пуцін – цэнтралізатар. Ельцын увесь час тасаваў кадры. Пуцін прытрымліваецца стабільнасьці кадравых прызначэньняў. Ельцын да канца не давяраў спэцслужбам і сілавым міністэрствам. Пуцін зрабіў іх апорамі свайго рэжыму. Шмат якія тэхнакраты-лібэралы, прыцягнутыя ўва ўладу Ельцыным, і сёньня застаюцца ў эшалёнах улады, але роля іх цяпер збольшага дапаможная. Ельцын цалкам давяраўся прэзыдэнцкай «сям'і» або «клану» ўва ўзмацненьні сваёй асабістай улады. Пуцін адмовіўся ад такога падыходу, але тэндэнцыя пэрсаніфікаванай улады давярацца «ценявым» мэханізмам заўжды будзе наноў ствараць базу для нэпатызму – ці то ў простым біялягічным, ці то ў шырэйшым палітычным сэнсе, а таксама для зьяўленьня рэінкарнацый палітычных сыстэмаў, што ствараюцца паводле патрыманіяльнага прынцыпу. Адмаўленьне Пуціным плюралізму азначае таксама, што паміж прэзыдэнтам і грамадзтвам аказваецца яшчэ менш прамежкавых узроўняў або інстытутаў. У гэтым сэнсе Пуцін умацаваў пэрсаніфікаванасьць улады, перанятую ад Ельцына. Карацей кажучы, новы прэзыдэнт узмацніў самаўладныя рысы расейскай уладнай сыстэмы, што бяруць пачатак з часоў Бізантыі ды царскай Расеі і праходзяць праз савецкі ды ельцынскі пэрыяды, адкінуўшы ў той жа час ельцынскую цярпімасьць да плюралізму і аддаўшы перавагу руціннасьці, а ня ельцынскай непрадказальнасьці.

Пакуль што большасьць апісальнікаў такога стану рэчаў ужываюць тэрмін «дэмакратыя» з пэўным азначэньнем: «нясталыя» дэмакратыі параўноўваюцца са «сталымі», а першыя пры гэтым акрэсьліваюцца, як «кіраваныя» або «электаральныя». Гэтага кшталту апісаньні не зважаюць на істотныя асаблівасьці «расейскага выпадку» (у тым ліку на

адрозьненьні паміж Ельцыным і Пуціным) і здаюцца больш засяроджанымі на выратаваньні клясычнай парадыгмы пераходу да дэмакратыі з уласьцівай ёй дэтэрмінісцкай верай у тое, што кожная краіна, якая рухаецца ад таталітарызму, абавязкова рухаецца да дэмакратыі. Ці можна назваць Расею выбарнай дэмакратыяй, калі дзейныя ўлады больш як празь дзесяцігодзьдзе пасьля падзеньня камунізму ня могуць прайграць на выбарах? Нават больш: калі гарантаваная перамога на выбарах – асноўная рыса іх рэжыму? Ці можа Расея быць хаця б «электаральнай у двукосьсі», калі адзіная функцыя выбараў у гэтай краіне – гэта легітымізацыя самаўладзьдзя? Жыцьцё ў Расеі цяпер вальнейшае, чым у часы царызму ды Саветаў, і ў расейскай палітычнай сыстэме прысутнічаюць некаторыя элемэнты дэмакратыі. Але гэтыя элемэнты яшчэ ня ёсьць дэмакратыяй.

Даволі парадаксальна, але ў дачыненьні да Расеі парадыгма пераходу да дэмакратыі робіцца крыніцаю пэсымізму – яе прыхільнікі звычайна прыходзяць да высновы, што тое, што падаецца расейскім дэмакратам недапушчальным аўтарытарызмам, насамрэч ёсьць папросту «мінімалісцкай» формай дэмакратыі, уласьцівай Расеі. На такія характарыстыкі можна было б глядзець скрозь пальцы як на інтэлектуальную гульню пад умоўнай назвай «клясыфікуй гібрыд», калі б спробы ацаніць расейскую рэальнасьць праз прызму «дэмакратыі з азначэньнем» не прыводзілі да спрошчаных ці нават небясьпечна памылковых практычных высноваў. Калі дапусьціць, што тое, што мы маем у Расеі – від дэмакратыі, то ўзьнікае вялікая спакуса дапусьціць, што ў гэтым выпадку Расеі неабходныя толькі некаторыя касмэтычныя рэформы ці нават менш – проста пасіўная тактыка «час сам усё зробіць», якая прадугледжвае, што адбудзецца натуральнае пераражэньне «нясталай» дэмакратыі ў «сталую», накшталт таго, як плод высьпявае на дрэве. Але што калі такое дапушчэньне памылковае? Што калі сыстэма, якая стварылася ў Расеі, вельмі далёкая ад таго, каб разьвіцца ў дэмакратыю і нават фактычна няздольная пачаць самарэфармаваньне? Што калі адзінае выйсьце – поўная перабудова ўсёй сыстэмы ад самага падмурку? Не заглыбляючыся ў спрэчкі вакол дэфініцыяў, мы можам сказаць, што Расея застаецца, як выказаўся Леры Дайманд, у «шэрай зоне».

Але сытуацыя пакуль што застаецца зьменлівай, а таму ацэнкі асобных аспэктаў асобнымі назіральнікамі ў асобныя моманты могуць быць правільнымі, і гэта можа прыдавацца для прыхільнікаў таго ці іншага спэцыфічнага падыходу, нават калі цэльная клясыфікацыя гэтага складанага гібрыду ім не даецца. Я схільная называць ельцынскі рэжым «выбарнай аўтакратыяй», бо гэта дазваляе нам заўважаць рэчы, якія апускаюцца ў іншых азначэньнях, у прыватнасьці нацыянальны і гістарычны кантэкст аўтакратыі (у тым ліку яе сувязь з доўгай традыцыяй расейскага самаўладзьдзя) і яе здольнасьць як прымаць, так і не прымаць пэўных мэтадаў перадачы ўлады.
Калі ельцынскі рэжым назваць дэмакратыяй, хай сабе і «з азначэньнем» або «нясьпелай», тады ўсё, што адбылося пасьля такой дэмакратыі, можна назваць дэвіянтным і нечаканым. Калі ж назваць ельцынскі рэжым яго сапраўдным імем – выбарнай аўтакратыяй, тады пуцінскі аўтарытарызм падасца значна менш анамальным і больш прадказальным. Пуцін ператварыў у пэўным сэнсе зьменлівы тып электаральнай аўтакратыі ў больш цьвярозы і сыстэмны бюракратычна-аўтарытарны рэжым. Я выкарыстоўваю гэты выраз, узяты з манаграфіі аб мадэрнізацыі аўтакратыяў у Лацінскай Амэрыцы, каб падкрэсьліць магчымыя міжрэгіянальныя гістарычныя паралелі. У дачыненьні да пуцінскай Расеі гэты тэрмін цалкам дакладны, бо Расею характарызуе як аўтарытарызм (у сэнсе пэрсаніфікаванай улады), так і моцная залежнасьць ад бюракратычных структураў і мэтадаў, якія выцясьняюць шмат з таго, што ў іншым выпадку можна было б назваць палітычнай актыўнасьцю.
Пакуль дасьледчыкі шукаюць дэфініцыяў, вымалёўваецца новая палітычная рэальнасьць Расеі. На пачатку другога тэрміну Пуціна пэрсаналісцкі аспэкт дамінуе, але ніхто ня можа запярэчыць падвышэньня ўплыву бюракратыі ці нават на пэўным этапе выклік бюракратыі Пуціну. Як гэта можа здарыцца? Ёсьць адзнакі таго, што Пуцін бачыць сябе свайго роду асьцярожным рэфармістам-самаўладцам. Ён выяўляецца празаходнім ці, прынамсі, прагматычным у шмат якіх сваіх поглядах, і можа здарыцца так, што ён пачне працаваць на прасоўваньне і абарону рэформаў – у тым ліку дэмакратычных, а не ўмацоўваць бюракратычны падмурак свайго рэжыму і яго структуры. Адчуўшы ў такіх зьменах пагрозу свайму

дамінаваньню, бюракратыя можа зрабіцца крыніцай маўклівай апазыцыі Пуціну і супернікам яго ўладзе.
Нават цяпер аўтарытарызм пуцінскага кшталту працуе – хоць і з супярэчнасьцямі – на тое, каб падтрымліваць не яго асабістую ўладу, а хутчэй уладу бюракратычных групаў і ўстановаў, якія дзейнічаюць ад яго імя. Нельга пазьбегнуць уражаньня, што на пачатку свайго другога тэрміну Пуцін ужо прайграў бюракратам важную баталію, якая тычылася рэарганізацыі кабінэту. Калі прэзыдэнт хоча прасоўваць рэформы і інавацыі, ён вымушаны зьвяртацца наўпрост да народу, эфэктыўна абмінаючы сваю ўласную бюракратычную базу. Але можна толькі падзівіцца, як далёка ён спадзяецца зайсьці з такой банапартысцкай стратэгіяй у галіне мадэрнізацыі.
У параўнаньні зь ельцынскім рэжымам, які разрывалі ўнутраныя канфлікты і які растрачваў падтрымку грамадзтва, пуцінскі Крэмль выпраменьвае ўражаньне спраўнай, добра адладжанай машыны. У ім не адбываецца канкурэнцыі ўладных груповак, ён згуртаваны вакол вельмі папулярнага прэзыдэнта. Але ў некаторым сэнсе такая карціна можа выявіцца падманлівай, бо ў сыстэме няма цьвёрдай структуры. Кансалідаваны дэмакратычны рэжым мусіць мець «правілы гульні» – канстытуцыю і іншыя асноўныя законы ды ўстановы, якія ня могуць быць лёгка зьмененыя. Але ў выпадку з пуцінскай Расеяй гэтага няма. Прэзыдэнт зьмяніў канстытуцыю і заканадаўства (у тым ліку выбарчыя законы і законы аб палітычных партыях), каб надаць сабе і Крамлю большую вагу. Любы наступны прэзыдэнт таксама зможа больш-менш свабодна зрабіць радыкальныя зьмены. Такім чынам, «правілы гульні» пакуль што хутчэй зьменлівыя, чым сталыя. Больш за тое, захоўваецца моцная тэндэнцыя да палітычнай скрытнасьці: занадта часта рашэньні прымаюцца закулісна і з выкарыстаньнем нефармальных мэтадаў, а не з дапамогай празрыстых працэсаў. Ці можа хоць які рэжым лічыцца скансалідаваным, калі ён настолькі залежыць ад нефармальных сродкаў прыняцьця рашэньняў? У той час як цяперашні рэжым бясспрэчна выглядае стабільным і свабодным ад любых вострых канфліктаў ці крызісаў, можа выявіцца, што база гэтай уяўнай стабільнасці зусім не такая цьвёрдая.
Шмат што трымаецца на асобе Пуціна. Як у сьвядомасьці палітычнай клясы, так і ўсяго грамадзтва асноўныя пытаньні

наконт нацыянальнага курсу Расеі застаюцца нявырашанымі. Якім чынам і ў якой ступені мусіць быць праведзеная прыватызацыя? Якую ролю павінна адыгрываць дзяржава ў эканамічных пытаньнях? Ці павінна Расея інтэгравацца ў такія заходнія структуры, як Сусьветная гандлёвая арганізацыя? Якія функцыі і межы палітычнай апазыцыі? Іншымі словамі – не існуе агульнага бачаньня і ідэалёгіі, якія б аб'ядноўвалі расейцаў. Замест гэтага Пуцін трымае іх згуртаванымі ў значнай ступені празь недастатковае асэнсаваньне магчымых альтэрнатываў, страх перад зьменаю статус-кво і нежаданьне сур'ёзна думаць пра будучыню.

Кажучы груба і пры гэтым не зусім каб няправільна, расейская стабільнасьць трымаецца на высокіх цэнах на нафту і высокай асабістай папулярнасьці Ўладзімера Пуціна.

Але што калі адзін з гэтых паказчыкаў ці абодва пачнуць падаць? Нефармальныя аспэкты пуцінскага рэжыму могуць даць яму значны запас трываласьці, алі ці гэта тое самае, што і гарантыя сапраўднай стабільнасьці?

АСНОЎНЫЯ ФАКТАРЫ

Дынаміку расейскага кіраваньня акрэсьліваюць некалькі асноўных фактараў:

Адказнасьць. З пачаткам свайго другога тэрміну Пуцін стаў у значнай ступені самотнай фігурай. Ён ужо ліквідаваў сваіх магчымых супернікаў – алігархаў ельцынскіх часоў. Ён – гаспадар Крамля. Ён не сустракае арганізаванай і эфэктыўнай палітычнай апазыцыі. Калі Пуцін захавае свой цяперашні аднаасобны кантроль над уладай, то ў выпадку неспрыяльнага павароту падзеяў ён станецца адзіным, каго можна будзе ў гэтым вінаваціць. Калі ж ён паспрабуе перакласьці частку адказнасьці на плечы іншых, напрыклад Думы, ён рызыкуе падрывам сваёй уласнай старанна сканструяванай сыстэмы прэзыдэнцкай вэртыкалі. Іншымі словамі, Пуцін, як і іншыя расейскія кіраўнікі да яго, мусіць паклапаціцца пра тое, каб зрабіць сваю ўладу максымальнай пры мінімальнай адказнасьці – а гэта не найлепшы рэцэпт кіраваньня.

Легітымнасьць. Дэмакратычная ідэя перамагла ў Расеі прынамсі ў гэтым: выбары – адзіная магчымая крыніца палітычнай легітымнасьці. Стаўкі ўраду на вынікі выбараў і

памкненьне іх кантраляваць, якое з гэтага вынікае, – гэта гадзіньнікавая бомба пад самім рэжымам. Былі выпадкі ў сьвеце, і зусім нядаўна ў суседняй Грузіі, калі ўрад руйнаваў усялякую магчымасьць сваёй легітымізацыі празь дзеяньні, якія ён рабіў дзеля перамогі ў выбарчай кампаніі. Чыноўнікі могуць лічыць, што большы кантроль над выбарамі дае перавагу, але на самай справе ўрад, які абапіраецца на электаральнае маніпуляваньне, без асаблівых нацяжак можна разглядаць як урад, які фліртуе са сваёй сьмерцю. Міхаіл Гарбачоў спрабаваў увесьці элемэнты кантраляванай канкурэнцыі ў савецкія выбары, каб ажывіць савецкую сыстэму, але рэальным вынікам яго намаганьняў сталася разбурэньне манаполіі камуністычнай партыі, на якой грунтавалася ўся сыстэма. Пуцін – посткамуніст, але яго сыстэма грунтуецца на падобным манапалістычным падмурку. Такая сыстэма зь яе моцнай схільнасьцю да бюракратычнага кантролю наўрад ці ўстрымаецца ад незаконных спробаў «адсачыць» выбары. Аднак нават зусім сьціплая фальсыфікацыя можа прывесьці да горкага ўроку па лёгіцы непрадбачаных наступстваў. Спытайцеся ў Эдуарда Шэварднадзэ.

Нават калі выбарчыя маніпуляцыі не прыводзяць да такога катастрафічнага падзеньня сыстэмы, якое зьведаў прэзыдэнт Шэварднадзэ ў Грузіі, яны могуць урэшце падважыць легітымнасьць улады да такой ступені, што людзі пачнуць успрымаць яе цалкам па-іншаму, магчыма, проста як дыктатуру.

Суб'ектная дзейнасьць. Праблема аслабленьня легітымнасьці зьвязаная з пытаньнем «суб'ектнай дзейнасьці» ў ажыцьцяўленьні ўлады. На гэты момант расейскі прэзыдэнт, выціснуўшы ўсіх магчымых «суб'ектаў» з палітычнай прасторы, мае фактычную манаполію на такую дзейнасьць. Але гэта таксама азначае ня толькі моц пуцінскага рэжыму, але й недахоп сілы волі ў патэнцыйных суб'ектаў. Апазыцыйныя партыі і палітыкі Расеі падзеленыя, разгубленыя і бездапаможныя. Разам з тым прэзыдэнцкая сыстэма сталася закладніцаю самой сябе, бо яна ня можа ні дасягнуць сваіх мэтаў сілай, ні сабраць дастаткова легітымнасьці, каб дасягнуць іх дэмакратычна. Гэта азначае, што, нягледзячы на пераканаўчы выгляд, унутраная суб'ектнасьць прэзыдэнцтва хутчэй танклявая і кволая, чым дзябёлая і дужая. У моманты

крызысу прэзыдэнцкі апарат сьцьвярджае сваю эфэктыўнасьць як суб'екта з дапамогай дэманстрацыі сілы – выганяючы багатых алігархаў з краіны ці садзячы іх за краты. Аднак такая эпізадычная гульня мускуламі ня можа гарантаваць бясьпекі рэжыму і тым больш даць яму сілу для абнаўленьня грамадзтва, якое так доўга знаходзілася ў пастцы фальшывага і дэфэктнага шляху да сацыяльнай, эканамічнай і палітычнай «сучаснасьці», вядомай пад назвай камунізму.

Перадача ўлады. Спосаб, якім Ельцын аформіў перадачу ўлады свайму штучна падабранаму спадкаемцу, датуль малавядомаму Ўладзімеру Пуціну, зьмясьціў Расею ў сытуацыю, не такую ўжо далёкую ад дыктатуры. Што адбудзецца, калі скончыцца другі тэрмін пуцінскага прэзыдэнцтва ў 2008 годзе? Ці стане гэта момантам лібэральна-дэмакратычнай трансфармацыі ўлады? Якім чынам? Ці, як лічаць лібэралы, з надыходам 2008 году зноў надыдзе час ажывіць «мёртвую» літару закону, ці спрацуюць мэтады «памяркоўнага» ельцынскага аўтарытарызму ў перадачы ўлады? Што калі не? А мо лёсам Расеі стане нейкая больш жорсткая форма аўтарытарызму? Калі гэта адбудзецца – а гэта можа адбыцца пры ўмове, што палітычная і бізнэс-кляса ня знойдуць у сабе сілы выйсьці з стану дэмаралізаванасьці і аслупяненьня, – то хутка зробіцца відавочна, што жорсткі аўтарытарызм ці нават таталітарызм ня змогуць вырашыць праблем стабільнасьці і мадэрнізацыі, якія стаяць перад Расеяй. Таталітарызм – гэта тупіковы шлях, дарога, якая не вядзе да сучаснага сьвету. Наадварот, гэта зачараванае кола, якое вядзе ад стагнацыі да якой-небудзь новай формы дыктатуры. І гэта можа стацца жахлівай доляй Расеі.

ІМПАТЭНЦЫЯ АБСАЛЮТНАЙ УЛАДЫ

Кожная аўтакратыя мае свае абмежаваньні. Як правіла, арганізаваныя паводле вэртыкальнага прынцыпу рэжымы, якія базуюцца на рэглямэнтаванай вонкавай падпарадкаванасьці, сутыкаюцца з аслабленьнем сваёй падтрымкі, асабліва калі падае магутнасьць іх сілавых структураў. Калі стары ельцынскі клан ці іншая амбітная групоўка палічыць, што Пуцін губляе пазыцыі, – што перашкодзіць ім паспрабаваць перахапіць

ініцыятыву? Палітычная і эканамічная эліты трымаюцца на павадку ў пэрсаніфікаванай улады з дапамогай тыповай для апошняй сумесі бізуноў і пернікаў. І калі элітам пачне здавацца, што Пуцін губляе здольнасьць правільна дазаваць адно або другое, ці нават і адно, і другое, яны пачнуць шукаць на трон новага прэтэндэнта, які падасца мацнейшым, больш актыўным і здольным купіць лояльнасьць.
І нават калі Пуцін не аступіцца на гэтым шляху, яго *вэртыкаль* – гэта вежа, якая ўзвышаецца на небясьпечна вузкім падмурку, па-за кантактам з грамадзтвам. Такая ўлада, адпаведна, увесь час рызыкуе памыляцца ў рашэньнях. Пуцін узьняў прэзыдэнцкі апарат на такую вышыню па-над нармальнай плыньню расейскага жыцьця, што здаецца, нібыта ён ня можа спыніцца. Ён працягвае аслабляць іншыя сілы і інстытуты, пэўна, бачачы ў любым намёку на незалежнасьць або амбітнасьць доказ варожасьці. Палітычны краявід Расеі па-за *вэртыкальлю* выглядае як выпаленая зямля. Якія непрадказальныя ініцыятывы і неўтаймоўныя грамадзкія рухі могуць завіраваць на яе неабсяжных абшарах?
Падчас нядаўніх выбараў Крэмль спрытна перавёў стрэлкі грамадзкае нездаволенасьці ў добра пратараванае, але ў апошнія часы перасохлае рэчышча нацыяналізму і папулізму. Ельцынскія алігархі зрабіліся асноўнай мішэньню для абгавораў. Але папулізм і нацыяналізм – гэта небясьпечныя патокі, іх плыні і віры могуць быць непрадказальнымі, і зь цягам часу Пуцін можа выявіць, што яны працуюць супраць яго, асабліва цяпер, калі ён трымае ўсю ўладу і рухаецца курсам памяркоўных рэформаў у тым кірунку, які асабліва непрымальны для папулістаў і нацыяналістаў, уключаючы зьмены, накіраваныя на задавальненьне патрабаваньняў эканамічнай глябалізацыі. Самая цяжкавырашальная праблема Пуціна – структурная. Ня важна, колькі асабістай улады ён набудзе, ён усё роўна ня можа падпарадкаваць увесь апарат улады адно сваёй ўладзе. Сілавыя міністэрствы і бюракратычная машына, якія складаюць мускулятуру яго ўлады, ужо пачалі высоўваць свае ўласныя сьпісы прыярытэтаў. Значныя праслойкі грамадзтва, з інстынктамі, адточанымі стагодзьдзямі самаўладзтва, схаваліся ў сфэру ценявой эканомікі і іншыя «шэрыя зоны» па-за дасягальнасьцю дзяржаўнай улады.

Нават калі б Пуціну ня трэба было вырашаць гэтыя ўнутраныя праблемы і калі б ён мог надзейна скансалідаваць сваю ўладу, ён ня змог бы прэтэндаваць на тую ролю, якую адыгралі ў Чылі Аўгуста Піначэт, а ў Паўднёвай Карэі Пак Чжон Хі. На працягу XX стагодзьдзя аўтарытарным лідэрам удавалася прымусам перацягваць аграрныя грамадзтвы ў індустрыяльную эпоху. Сёньня Расея стаіць перад складанымі постіндустрыяльнымі выклікамі, якім яна можа даць рады толькі праз рэфармаваньне традыцыйнай дзяржавы і выбар шляхоў, якія б вялі да наданьня большай свабоды і прасторы для самарэалізацыі ўнутраных рэсурсаў усяго грамадзтва і творчага патэнцыялу асобных людзей. Раней ці пазьней Крамлю давядзецца прызнаць той факт, што традыцыя саманадзейнай цэнтралізаванай улады хутчэй замінае, чым дапамагае, калі гаворка заходзіць пра дасягненьне большай мадэрнізацыі. Канкурэнцыя і інавацыя, а не захаваньне статус-кво любой цаной павінны стаць мэтай Расеі. Пуцінская вэрсія абсалютызму пакуль што можа падтрымліваць сама сябе, але некалі гісторыя будзе разглядаць яе як перашкоду на шляху да пабудовы новай Расеі, урад якой будзе законным і прадстаўленым адпаведнымі ўстановамі выразьнікам народнай волі, а ня цацкай для якой-небудзь новай каманды, якая завалодае ключамі ад Крамля.

Пуцін меў рацыю, калі спрабаваў знайсьці выйсьце зь ельцынскага алігархічнага капіталізму. Яго выбар на карысьць разбудовы бюракратычнага апарату (замест абраньня цяжэйшага, але вярнейшага шляху адыходу ад старой расейскай гульні ў пэрсаніфікаваную цэнтралізаваную ўладу, каб даць месца для разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці і дэмакратычнага капіталізму) з мэтай перамогі над алігархамі быў няправільны. Ці мог бы ён пайсьці гэтым другім шляхам? Мала вонкавых чыньнікаў штурхалі яго да гэтага.

Пэўна, грамадзтва, кіроўная кляса і міжнародная супольнасьць, якая цяпер у стасунках з Расеяй больш пачала цаніць стабільнасьць, чым дэмакратыю, не аказвалі дастатковага ціску ў кірунку фундамэнтальных рэформаў. У Расеі ёсьць лібэральныя дэмакраты, але іх уплыў нязначны. Пуцін мог бы выкарыстаць сваю вялікую папулярнасьць і адсутнасьць арганізаванай электаральнай апазыцыі, каб рухацца ў бок грунтоўнай трансфармацыі «расейскай сыстэмы ўлады», але нават тады ён бы выпрабоўваў лёс і ставіў сябе перад

небясьпекаю зламаць свой палітычны карак. Прымаючы гэта да ўвагі, зусім ня дзіўна, што ён абраў менш натхняльны, але вонкава больш надзейны шлях.
Сёньня зьяўленьне ў посткамуністычнай Расеі паўнавартаснага бюракратычна-аўтарытарнага рэжыму абмежавала як пэрспэктывы лібэральнай дэмакратыі, так і свабоду дзеяньняў самога прэзыдэнта Пуціна. Парадаксальна, але існаваньне сапраўднага палітычнага спэктру зь левымі, правымі і цэнтрыстамі дало б прэзыдэнту і яго людзям большую прастору для манэўраў, чым яны маюць цяпер. Мабыць, цьмяна ўсьведамляючы гэта і адчуваючы, што мець вакол сябе падатлівых «лібэралаў» і «дэмакратаў» добра для іміджу, некаторыя з найярчэйшых «зорак» крамлёўскай каманды паспрабуюць стварыць лібэральна-дэмакратычны рух, а зь ім і вонкавае падабенства «нармальнага» палітычнага спэктру. Але чакаць ад такой лялечнай апазыцыі, каб яна была сілаю для ажыцьцяўленьня рэальных рэформаў, – тое самае, што трымаць у хаце папяровага тыгра ў спадзяваньні на тое, што яго намаляваная пашча дапаможа адчуць дух джунгляў.
Будучыня Расеі залежыць ад таго, ці змогуць лібэралы і дэмакраты зноў узьняцца з узроўню травы пад нагамі і паўстаць рэальнай альтэрнатываю існуючай уладзе. Падзеі 2004 году не даюць вялікай надзеі на тое, што нешта падобнае можа здарыцца. А тады постсавецкі застойны нэабрэжнявізм, пэўна, і стане ў найбліжэйшай будучыні лёсам Расеі.
Пасьля Брэжнева нарэшце прыйшлі Гарбачоў і перабудова. Ці не чакае нас падобны паварот падзеяў? Можа, вонкава магутны новы парадак Пуціна падзе ахвяраю крыніцаў нестабільнасьці, якія мы акрэсьлілі вышэй. Але да таго як гэтая нестабільнасьць зробіцца бачнай, нам давядзецца зрабіцца сьведкамі яшчэ колькіх этапаў закручваньня гаек прэзыдэнтам і ягоным апаратам, пакуль унутраная лёгіка пэрсаніфікаванай улады і бюракратычнага аўтарытарызму хоцькі-няхоцькі гоніць іх да пошукаў татальнага кантролю.
Магчыма, паваротны момант надыдзе ў 2008 годзе, калі Пуціну давядзецца вырашаць: сыходзіць ці ісьці на трэці тэрмін (на дадзены момант неканстытуцыйны). Што ён будзе рабіць? Гэта пытаньне не сыстэмнага аналізу, а індывідуальнага выбару і характару. Ці ёсьць Пуцін адным з тых шматлікіх людзей, для якіх улада зрабілася наркотыкам? Ці ён зможа адступіцца? Ён –

першы з расейскіх лідэраў ад царскіх часоў, які прыйшоў да ўлады безь неабходнасьці за яе біцца. Ці дапаможа гэта яму сысьці годна? Будзем спадзявацца, што за наступныя чатыры гады ня здарыцца нічога, што зрабіла б перадачу ўлады небясьпечнай для Пуціна і ягонага атачэньня. Што тычыцца завяршэньня ягонай крамлёўскай кар'еры, то яно, верагодна, усё ж будзе дастойным, але ўжо цяпер яму варта падумаць пра тое, што будзе, калі яго прылюдна абвесьцяць няўдачнікам, і пра тое, ці ня будзе ў наступнага «вярхоўнага правадыра» спакусы павярнуць супраць свайго папярэдніка, каб стварыць базу легітымнасьці для новага валадара «ўсяе Русі».

У рэжыме, заснаваным на пэрсаніфікаванай уладзе, новы правіцель заўжды мае спакусу шукаць сваю адметнасьць і легітымнасьць праз адпрэчваньне папярэдніка. Расея дагэтуль ня можа спасьцігнуць простую ісьціну: улада, заснаваная на сыстэме стрымак, процівагаў і падзеле функцыяў паміж інстытутамі, значна больш стабільная і надзейная. Лібэральна-дэмакратычны канстытуцыяналізм вызваляе лідэраў ад неабходнасьці ачарненьня сваіх папярэднікаў і страху перад сваімі пераемнікамі, робіць барацьбу за ўладу не сьмяротнай і дае тым, хто прайграў, надзею, што яны заўжды могуць паспрабаваць яшчэ. У адрозьненьне ад лібэральна-дэмакратычнага лідэра, кіраўнік у расейскай сыстэме пэрсаніфікаванай улады мае патрэбу стварыць палітычную пустэчу і назваць яе стабільнасьцю. Але палітычны краявід у выглядзе пустэльнага абшару – ідэальнае месца для духу адмаўленьня, які аднаго дня можа зьявіцца зьнянацку і стаць надзвычайна магутным.

Чым больш жорсткім і зачарсьцьвелым робіцца рэжым пэрсаніфікаванай улады, тым большая верагоднасьць таго, што справа скончыцца гвалтам, а не законнай перадачай улады. Уладзімер Пуцін меў усе шанцы зьмяніць гульню ў Расеі і перайначыць лёгіку ўлады, каб адвесьці яе далей ад аўтарытарызму ці то самаўладнага, ці то бюракратычнага кшталту да хаця б зародкаў лібэральнага канстытуцыяналізму. Але ягоны выбар быў не на карысьць гэтага шанцу, і аднойчы яму давядзецца сутыкнуцца з наступствамі, якія вынікаюць зь лёгікі расейскай сыстэмы ўлады.

Пераклаў з ангельскай Аляксей Ігнатовіч
паводле: The Limits of Bureaucratic Authoritarianism in Project Muse

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

СЭМЮЭЛ ГАНТЫНГТАН

эбаты вакол нацыянальнай ідэнтычнасці – неўнікнёная адзнака нашага часу. У іх іншы раз падымаюцца рытарычныя пытанні, аднак яны маюць таксама глыбокі ўплыў як на амерыканскае грамадства, так і на замежную ды ўнутраную палітыку Амерыкі. Разуменні таго, што ўваходзіць у паняцце нацыянальнай тоеснасці, бываюць розныя – яны асабліва розныя ў звычайных грамадзян і ў больш касмапалітычнай вярхушкі – і

Сэмюэл Гантынгтан

Мёртвыя душы

Данацыяналізацыя амерыканскай эліты

спараджаюць
розныя
нацыянальныя
інтарэсы і
палітычныя
прыярытэты.

Погляды шырокіх слаёў насельніцтва на праблемы, звязаныя з нацыянальнай тоеснасцю, істотна адрозніваюцца ад поглядаў большасці элітаў. Насельніцтва хвалюе ў асноўным фізічная бяспека, але таксама бяспека соцыуму, адным са складнікаў якой ёсць трываласць і пераемнасць – у межах, прымальных для эвалюцыі, – існых узораў мовы, культуры, камунікацыі, рэлігіі і нацыянальнай тоеснасці. Для большасці элітаў гэтыя справы другасныя ў параўнанні з задачамі ўдзелу ў сусветнай эканоміцы, заахочвання міжнароднага гандлю і міграцыі насельніцтва, узмацнення міжнародных інстытутаў, прасоўвання амерыканскіх каштоўнасцяў за мяжой і спрыяння меншасцям у развіцці іх культуры і тоеснасці ўнутры краіны. Асноўнае адрозненне паміж шырокімі слаямі насельніцтва і элітай можна ахарактарызаваць не як ізаляцыянізм vs інтэрнацыяналізм, а як нацыяналізм, нацыянальная свядомасць vs касмапалітызм, свабода ад нацыянальных прымхаў.

МЁРТВЫЯ ДУШЫ

У жніўні 1804 году Вальтэр Скот скончыў «Песню апошняга менестрэля», у якой ён пытаўся, ці дзесьці

…Ёсць чалавечак з мёртваю душой,
Які сабе ніколі не казаў:
«Вось родны край мой, вось яна – мая
Адзіная і родная зямля»?
Каго не агартала цеплынёй,
Калі нарэшце шлях ён кіраваў
З вандровак і з чужынскіх берагоў
На бераг родны, ў мілы край – дамоў?

Сучасны адказ на пытанне Скота – «так», колькасць мёртвых душаў невялікая, але яна памнажаецца ў асяроддзі бізнесовай, інтэлектуальнай ды навуковай элітаў Амерыкі. Маючы, кажучы словамі Скота, «тытулы, уладу і багацце», яны ўсё больш

страчваюць сувязь з амерыканскай нацыяй. Пры вяртанні ў Амерыку з чужынскіх берагоў іх наўрад ці ахоплівае глыбокае пачуццё любові і адданасці «роднай зямлі». Іхныя паводзіны і стаўленне кантрастуюць з ашаламляльным патрыятызмам і глыбока нацыяналістычнай саматоеснасцю рэшты амерыканцаў. Істотны разрыў паміж мёртвымі ці паміраючымі душамі амерыканскай вярхушкі і «ўдзячным Богу за Амерыку» насельніцтвам працягвае павялічвацца. Гэты разрыў часова засланіла патрыятычнае яднанне пасля падзей 11 верасня. Аднак таму, што падобныя тэрарыстычныя напады не паўтараюцца, усёабсяжныя і фундаментальныя сілы глабалізацыі эканомікі павышаюць верагоднасць таго, што страта элітамі нацыянальных асаблівасцяў будзе працягвацца. Глабалізацыя прадугледжвае рэзкі рост міжнароднага ўзаемадзеяння асобаў, карпарацый, урадаў, недзяржаўных арганізацый і іншых суб'ектаў; рост колькасці і памеру транснацыянальных карпарацый, якія займаюцца інвестыцыямі, вырабам і продажам у сусветным маштабе, а таксама павелічэнне колькасці міжнародных арганізацый, рэжымаў і правілаў. Уплыў усіх гэтых фактараў на розныя групы і ў розных краінах неаднолькавы. Удзел індывідаў у працэсах глабалізацыі амаль наўпрост залежыць ад іх сацыяльна-эканамічнага статусу. Прадстаўнікі элітаў маюць больш – прычым глыбейшых – транснацыянальных інтарэсаў, прыхільнасцяў і магчымасцяў для самаідэнтыфікацыі, чым прадстаўнікі неэлітаў. Амерыканская вярхушка, урадавыя ўстановы, прадпрыемствы і іншыя арганізацыі Амерыкі адыгрывалі і адыгрываюць нашмат больш значную ролю ў працэсах глабалізацыі, чым адпаведныя суб'екты іншых краінаў. Такім чынам, існуюць пэўныя падставы для таго, каб іх нацыянальная свядомасць і адданасць нацыянальным інтарэсам была адносна слабейшай.

Цяперашнія падзеі нагадваюць у глабальным маштабе тое, што адбывалася ў Злучаных Штатах пасля Грамадзянскай вайны. У меру пасоўвання індустрыялізацыі прадпрыемствы ўжо не маглі развівацца паспяхова, калі іх сфера дзейнасці была абмежаваная пэўнай мясцовасцю або толькі адным штатам. Ім даводзілася пераходзіць на агульнанацыянальны ўзровень, каб займець неабходны капітал, патрэбных супрацоўнікаў і рынкі збыту. Амбітным людзям давялося стаць мабільнымі ў

геаграфічным, арганізацыйным і ў нейкай ступені ў прафесійным сэнсе. Яны пачалі імкнуцца рабіць кар'еру на нацыянальным, а не на мясцовым узроўні. Рост нацыянальных карпарацый і іншых агульнанацыянальных арганізацый спрыяў умацаванню нацыянальных поглядаў, нацыянальных інтарэсаў і нацыянальнай улады. Нацыянальныя законы і стандарты атрымалі вяршэнства над адпаведнымі нормамі асобных штатаў. Нацыянальная свядомасць і нацыянальная ідэнтычнасць сталі пераважаць над самаідэнтыфікацыяй з пэўнай мясцовасцю або штатам. Цяперашні ўздым транснацыяналізму, хоць і знаходзіцца на ранняй ступені, у чымсьці гэта нагадвае.

Транснацыянальныя ідэі і асобаў, што іх вызнаюць, можна падзяліць на тры катэгорыі: універсалісцкую, эканамічную ды маралісцкую.

Універсалісцкі падыход – гэта, па сутнасці, развітыя да крайнасці амерыканскі нацыяналізм і вера ў амерыканскую выключнасць. Паводле ўніверсалістаў, выключнасць амерыканскай нацыі не ў яе ўнікальнасці, а ў тым, што яна стала «ўніверсальнай нацыяй». Яна злілася з сусветам дзякуючы прытоку ў Амерыку людзей з іншых краінаў і шырокаму прызнанню амерыканскіх каштоўнасцяў і папулярнай культуры ў іншых краінах. Адрозненні паміж Амерыкай і ўсім светам сціраюцца дзякуючы трыумфу амерыканскай моцы і прывабнасці амерыканскага грамадства і культуры.

Эканамічны падыход засяроджваецца на глабалізацыі эканомікі – трансцэндэнтальнай сіле, што разбурае нацыянальныя межы, сплаўляючы нацыянальныя эканомікі ў адзінае сусветнае цэлае і падрываючы аўтарытэт і функцыі нацыянальных урадаў. Гэтыя погляды пераважаюць у асяроддзі кіраўнікоў транснацыянальных карпарацый, буйных недзяржаўных аб'яднанняў і да таго падобных арганізацый, што дзейнічаюць на сусветным узроўні, а таксама сярод асобаў з высокай (звычайна тэхнічнай) адукацыяй, на якую існуе попыт ва ўсім свеце, што дае ім магчымасці працягваць кар'ерны рост, пераязджаючы з краіны ў краіну.

Маралісцкі падыход асуджае патрыятызм і нацыяналізм, лічыць уплыў гэтых сілаў заганным і сцвярджае, што ўніверсальныя міжнародныя законы, інстытуты, рэжымы і нормы маюць

маральную перавагу над тымі, што існуюць у кожнай асобна ўзятай краіне. Адданасць чалавецтву мае вяршэнства над адданасцю нацыі. Гэты погляд можна сустрэць у асяроддзі інтэлектуалаў, навукоўцаў, выкладчыкаў ды журналістаў. Эканамічны транснацыяналізм абапіраецца на буржуазію, маралісцкі – на інтэлектуалаў.

У 1953 годзе кіраўнік «Джэнерал Мотарз», вылучаны на пасаду міністра абароны, абвясціў: «Што добра для «Джэнерал Мотарз», добра і для Амерыкі». Яго паўсюдна крытыкавалі за тое, што ён не сказаў «што добра для Амерыкі, добра для «Джэнерал Мотарз». Так ці інакш, як ён, так і ягоныя крытыкі мелі на ўвазе пэўнае супадзенне інтарэсаў ягонай карпарацыі і краіны. Аднак цяпер транснацыянальныя карпарацыі разглядаюць уласныя інтарэсы асобна ад інтарэсаў Амерыкі. У меру пашырэння ўласнай дзейнасці на ўвесь сьвет, карпарацыі, што былі заснаваныя і дагэтуль маюць галоўныя офісы ў Злучаных Штатах, паступова робяцца ўсё менш амерыканскімі. У 1990-х гадах такія кампаніі, як «Форд», «Этна» (Aetna), «Матарола», «Прайс Костка» (Price Costco) і «Кімберлі Кларк» (Kimberly-Clark) у адказ на прапанову Ральфа Нейдэра адмовіліся праяўляць патрыятызм і адкрыта абвясцілі сябе транснацыянальнымі. Карпарацыі, што размешчаныя ў Амерыцы, але дзейнічаюць глабальна, набіраюць супрацоўнікаў і адміністратараў, у тым ліку і кіраўнікоў, не звяртаючы ўвагі на нацыянальную прыналежнасць. ЦРУ, як адзначыў адзін з яго прадстаўнікоў у 1999 годзе, не можа больш разлічваць на супрацоўніцтва з амерыканскімі карпарацыямі, як раней, бо самі карпарацыі ўважаюць сябе транснацыянальнымі і зусім не абавязкова лічаць, што дапамагаць ураду Злучаных Штатаў уваходзіць у іх інтарэсы[1].

Нацыяналізм давёў памылковасць канцэпцыі Карла Маркса – ідэі аб'яднанага міжнароднага пралетарыяту. Глабалізацыя пацвярджае правільнасць выказвання Адама Сміта: у той час як «уласнік зямлі абавязкова ёсць грамадзянінам пэўнай краіны, у якой знаходзяцца ягоныя ўладанні… уласнік акцый… ў сутнасці, ёсць грамадзянінам свету і неабавязкова прывязаны да нейкай пэўнай краіны». Заўвага, выказаная Смітам у 1776 годзе, – гэта апісанне таго, як сябе бачаць сучасныя транснацыянальныя бізнесоўцы. Падводзячы вынікі сваіх

[1] How Global Is My Company? // Kearney A. T. Commentique, Global Business Policy Council. 2000. № 2.

сумоўяў з высокапастаўленымі адміністратарамі дваццаці трох амерыканскіх транснацыянальных карпарацый і некамерцыйных арганізацый, Джэймс Дэвідсан Хантэр і Джошуа Ейтс падсумоўваюць:

Гэтыя эліты, несумненна, касмапалітычныя: яны падарожнічаюць па ўсім свеце, і свет – гэта сфера іх дзейнасці. Яны сапраўды лічаць сябе «грамадзянамі свету». Мы чулі ад кожнага з іх, што яны лічаць сябе ў большай ступені «грамадзянамі свету», якія збегам акалічнасцяў маюць амерыканскі пашпарт, чым грамадзянамі ЗША, якія збегам акалічнасцяў працуюць у сусветнай арганізацыі. Яны адпавядаюць усяму, што ўваходзіць у паняцце касмапалітызму. Яны дасведчаныя, адукаваныя і дэманструюць універсалізм у сваіх поглядах і этычных перакананнях.

Разам з «глабалізаванымі элітамі» іншых краінаў гэтыя амерыканскія адміністратары насяляюць «сацыякультурную бурбалку», аддзеленую ад асобных нацыянальных культур, і камунікуюць міжсобку на сацыялагізаванай версіі ангельскай мовы, якую Хантэр і Ейтс ахрысцілі «глабальнай гаворкай».

Глабалізатары-эканамісты апантаныя ідэяй свету як эканамічнай адзінкі. Як пішуць Хантэр і Ейтс,

усе гэтыя арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у глабалізацыі, у тым ліку не толькі транснацыянальныя карпарацыі, дзейнічаюць у свеце, абумоўленым «пашырэннем рынкаў збыту», патрэбай у «высокай канкурэнтаздольнасці», «эфектыўнасці», «эфектыўных укладаннях», «максімальным павелічэнні выгадаў і памяншэнні выдаткаў», «рынкавых нішах», «рэнтабельнасці» і «найніжэйшым узроўні цэнаў». Яны апраўдваюць зацыкленасць на гэтых пытаннях тым, што яны забяспечваюць патрэбы спажыўцоў ва ўсім свеце. Вось іх электарат.

«Чаго глабалізацыя дасягнула, дык гэта пераходу ўлады ад урадаў да глабальнага спажыўца»[2]

Выказванне Дэрэна Дэві (Дырэктарат разведкі, ЦРУ) інтэрв'ю тэлебачанню 11 сакавіка 1999 года.

, – заўважыў адзін з кансультантаў кампаніі «Арчэр Дэніелз Мідланд». У меру таго, як глабальны рынак прыходзіць на змену нацыянальнаму грамадству, грамадзянін краіны саступае месца сусветнаму спажыўцу.

Эканамічныя транснацыяналісты ўтвараюць ядро новага сусветнага звышкласу. Рада ў справах палітыкі ў галіне глабальнага прадпрымальніцтва сцвярджае:

Прыбыткі ад усё больш інтэграванай глабальнай эканомікі нарадзілі новую глабальную эліту. Гэты новы клас, што мянуюць «людзьмі Давосу», «залатымі каўнерыкамі» або «касмакратамі», узброіўся новымі паняццямі глабальнай узаемазвязанасці. У яго ўваходзяць выкладчыкі ВНУ, чыноўніцтва з міжнародных арганізацый і менеджэры сусветных кампаній, а таксама паспяховыя прафесіяналы са сферы высокіх тэхналогій.

Колькасць чальцоў гэтай эліты ў 2000 годзе ацэньвалася прыблізна ў 20 мільёнаў чалавек, з якіх 40 % складалі амерыканцы, і, як чакаецца, да 2010 году яна вырасце ўдвая[3] . Складаючы менш за 4 % усіх амерыканцаў, гэтыя транснацыяналісты не маюць асаблівай патрэбы ў нацыянальных пачуццях, разглядаюць межы паміж дзяржавамі як перашкоды, што, дзякуй Богу, знікаюць, і бачаць у нацыянальных урадах перажыткі мінуўшчыны, адзінай карыснай функцыяй якіх з'яўляецца спрашчэнне міжнародных аперацый, якія гэтая эліта ажыццяўляе. Ужо не за гарамі тыя гады, упэўнена прадказвае адзін з карпаратыўных менеджэраў, калі «*адзінымі людзьмі, якіх будуць хваляваць дзяржаўныя межы, застануцца палітыкі*».

Удзел у транснацыянальных інстытутах, сетках і праектах не толькі з'яўляецца крытэрам прыналежнасці да глабальнай эліты, але таксама мае крытычнае значэнне для дасягнення статусу эліты ў межах асобных дзяржаў. Людзі з выключна нацыянальнымі прыхільнасцямі, ідэнтычнасцю і захапленнямі маюць менш шанцаў дасягнуць вяршыняў у бізнесе, палітыцы, сродках масавай інфармацыі і іншых прафесійных сферах, чым тыя, хто пераходзіць межы нацыянальнага. Паўсюль за

[2] Hunter G. D., Yates G. in the Vangard of Globalization: The World of American Globalizers // Many Globalizations: Cultural Diversity in the Contemporary World / Eds. Peter L. Berger, Samuel Huntington. New York: Oxford University Press, 2000. P. 345.

[3] Micklewait John, Wooldridge Adrian. A Future Perfect: The Challenge and Hidden Promise of

выключэннем палітыкі, тыя, што «застаюцца дома», ўсё ж хвасце. Каб рухацца наперад, трэба мысліць і дзейнічаць у міжнародным кантэксце. Як казаў сацыёлаг Мануэль Кастэльс, «эліты – касмапалітычныя, простыя людзі – тутэйшыя». Тым не менш, магчымасць далучыцца да гэтага транснацыянальнага свету мае толькі невялічкая меншасць насельніцтва ў краінах з развітай прамысловасцю і зусім мікраскапічная жменька людзей у краінах, якія толькі сталі на шлях развіцця.

Globalization. New York: Basic Books, 2000. P. 235; Кастэльс М. Эпоха інфармацыі. Т. 3. Канец тысячагоддзя. Мінск, 2000. С. 235.

Глабальная ангажаванасць транснацыянальнай эканамічнай эліты паступова сцірае ў яе пачуццё прыналежнасці да пэўнага нацыянальнага грамадства. Сацыялагічнае даследаванне, праведзенае ў пачатку 1980-х гадоў, выявіла, што

чым вышэйшы даход і адукацыю маюць людзі, тым больш умоўнай з'яўляецца іх адданасць радзіме. …Ім больш уласціва, чым беднай і неадукаванай частцы насельніцтва, гатоўнасць пакінуць краіну, калі гэта дасць магчымасць падвоіць іх даходы[4].

[4] Judis J. B. Adam. The Marion's Madness // New York Times Magazine. 1983. 11 снежня. С. 47.

У пачатку 1990-х будучы міністр працы Роберт Райх прыйшоў да падобнай высновы, заўважыўшы, што «*людзі з найвышэйшымі даходамі ў Амерыцы… адколваюцца ад іншых народу*»[5]. Гэтая складзеная з адшчапенцаў вярхушка ствараюць Джон Міклетвэйт і Эйдрыен Вулдрыдж,

[5] Reich R. What is a Nation? // Political Science Quarterly. Jieta 1991. С. 193.

усё больш адмяжоўваецца ад рэшты грамадства. Часцяком яе навучаюцца ў замежных універсітэтах, падоўгу працуюць за мяжой, а дома робяць у транснацыянальных арганізацыях. Яны ўтвараюць свет унутры свету, яны звязаныя міжсобку незлічонымі глабальнымі сеткамі, але ізаляваныя ад больш прыземленых прадстаўнікоў іх уласных грамадстваў. Яны больш схільныя бавіць час у памаўленні з сабе роўнымі з усяго свету – праз тэлефон або электронную пошту, – чым у размовах з суседзямі па дварэ[6].

Сучасныя інтэлектуалы ўзмацнілі гэтыя тэндэнцыі. Яны адмаўляюцца ад паняцця адданасці нацыі і сугрупаванняў і сцвярджаюць маральнае вяршэнства салідарнасці з чалавецтвам наагул. Гэтая плынь расквітнела ва ўніверсітэцкім асяроддзі ў 1990-я гады. Марта Нусбаўм з Чыкагскага ўніверсітэту асудзіла ўпор на «нацыянальны гонар» як «маральна небяспечны», заклікала этнічную большасць аддаць перавагу касмапалітызму над патрыятызмам і сцвердзіла, што нам трэба скіраваць сваю адданасць на «чалавецтва як сусветную супольнасць». Эмі Гутман з Прынстану сцвярджае – «брыдка», што амерыканскіх студэнтаў навучаюць, што яны «з'яўляюцца перадусім грамадзянамі Злучаных Штатаў». Амерыканцы павінны быць «перадусім адданыя», пісала яна, «не Злучаным Штатам ці нейкай іншай палітычна суверэннай супольнасці», а «дэмакратычнаму гуманізму». Джордж Ліпсіц з Каліфарнійскага ўніверсітэту ў Сан-Дыега сцвярджаў, што «*ў апошнія гады патрыятызм зрабіўся найперш прытулкам нягоднікаў самага рознага кшталту*». Рычард Сэнэт з Нью-Ёркскага ўніверсітэту горача асудзіў «*заганнасць ідэі адзінай нацыянальнай ідэнтычнасці*» і ацаніў размыванне нацыянальнага суверэнітэту як «*збольшага пазітыўную з'яву*». Пітэр Спіра з універсітэту Гофстра ўхвальна падсумаваў, што «*карыстацца словам «мы» ў кантэксце міжнародных адносін робіцца ўсё цяжэй*». У мінулым людзі ўжывалі слова «мы», маючы на ўвазе нацыянальную дзяржаву, аднак цяпер асацыяцыя з дзяржавай-нацыяй «больш не вызначае інтарэсаў або нават прыхільнасцяў індывіда на міжнародным узроўні»[7].

[7] Michael Ignatieff, Human Rights as Politics and Idolatry, ed. Amy Gutmann (Princeton, NJ: Princeton University Press, 2001), 241–242.

Транснацыянальныя маралісты адмаўляюцца ад ідэі нацыянальнага суверэнітэту або моцна яе крытыкуюць. Яны згаджаюцца з Генеральным сакратаром ААН Кофі Аннанам тым, што нацыянальны суверэнітэт мусіць саступіць шлях «суверэнітэту асобы», каб міжнародная супольнасць магла дзейнічаць з мэтай прадухілення або спынення сур'ёзных парушэнняў дзяржавамі правоў іхных грамадзян. Гэты погляд забяспечвае Арганізацыі Аб'яднаных Нацый падставы для ваеннага або іншага ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў – практыкі, адназначна забароненай Хартыяй ААН. Нягледзячы на агульным узроўні маралісты выступаюць за вяршэнства міжнароднага заканадаўства над законамі асобных краінаў,

Michael Ignatieff, World Disorder: Reflections on the Transition from Cold War to Hegemony (New York: W. W. Norton, 2003), 241–242.

Op. cit.

Martha C. Nussbaum, Patriotism and Cosmopolitanism, in For Love of Country: Debating the Limits of Patriotism, ed. Joshua Cohen (Boston: Beacon Press,

большую легітымнасць рашэнняў, прынятых міжнароднымі, а не нацыянальнымі арганізацыямі, і пашырэнне паўнамоцтваў міжнародных інстытутаў за кошт паўнамоцтваў уладаў асобных краінаў. Юрысты-міжнароднікі, што належаць да плыні маралістаў, развілі канцэпцыю «міжнароднага звычаёвага права», паводле якой нормы і практыкі, што маюць шырокі ўжытак, могуць з'яўляцца падставай для скасавання юрыдычнай моцы законаў асобных дзяржаў.

Ключавым крокам, які перанёс гэты прынцып у рэчаіснасць у Амерыцы, сталася рашэнне, прынятае ў 1980 годзе Апеляцыйным судом Другога ўзроўню пры інтэрпрэтацыі кодэксу 1789 году, зацверджанага з мэтай абароніць амерыканскіх паслоў. У гэтай справе (працэс Філартыга супраць Пэна-Ірала) суд палічыў, што грамадзяне Парагвая, якія пражываюць у Злучаных Штатах, маюць права распачаць грамадзянскі працэс у амерыканскім судзе супраць парагвайскага ўрадавага чыноўніка, абвінавачанага ім у забойстве парагвайца ў Парагваі. Гэтае рашэнне мела вынікам некалькі падобных судовых справаў, узбуджаных у судах ЗША. У гэткіх выпадках суды адной краіны выходзяць за межы сваёй тэрытарыяльнай юрысдыкцыі і пацвярджаюць уласныя паўнамоцтвы дзейнічаць у абарону правоў замежнікаў, меркаванае парушэнне якіх было здзейснена замежнікамі ў замежных краінах.

Спецыялісты ў галіне міжнароднага права, якія належаць да плыні маралізму, сцвярджаюць, што прэцэдэнты міжнароднага звычаёвага права, [маючы першынство], скасоўваюць адпаведныя федэральныя законы і законы штатаў. Паколькі звычаёвае міжнароднае права не сфармуляванае ў кодэксах або пагадненнях, то пад гэтае акрэсленне падпадае што заўгодна, пры ўмове, што эксперты

пераканаюць у гэтым суддзю. Таму яно цалкам здольнае пранікаць усё глыбей ва ўнутраныя справы краіны. Калі існуе норма міжнароднага звычаёвага права, якая забараняе расавую дыскрымінацыю, чаму б не існаваць таксама норме, якая б супрацьстаяла дыскрымінацыі паводле полавай прыналежнасці? Або забароне на дыскрымінацыю на падставе нацыянальнасці,

1996. C. 4–9; Gutmann E. Democratic Citizenship. New York. P. 68–69; Linz J. Dilemmas of Beset Nationhood: Patriotism, the Family, and Economic Change in the 1970s and 1980s // Bonds of Affection: Americans Define Their Patriotism / Ed. J. Bohar. Princeton: Princeton University Press, 1996. P. 256; Sennett R. America is Better Off Without a National Identity' // International Herald Tribune. 1994. 31 студзеня; Spiro P. New Global

мовы ці сексуальнай арыентацыі?[8].

Маралісты сцвярджаюць, што амерыканскае заканадаўства мусіць адпавядаць міжнародным стандартам, і выказваюцца на карысць зацвярджэння на нявыбарных пасадах не толькі амерыканскіх, але і замежных суддзяў, якія б вызнавалі грамадзянскія правы амерыканцаў з гледзішча міжнародных, а не амерыканскіх нормаў. Увогуле, транснацыянальныя маралісты мяркуюць, што Злучаныя Штаты павінны падтрымліваць стварэнне трыбуналаў, такіх, як Міжнародны крымінальны суд, і выконваць прынятыя ім рашэнні, гэтаксама як рашэнні Міжнароднага арбітражнага суду, Генеральнай Асамблеі ААН і да таго падобных арганізацый.

Communities: Non-Governmental Organizations in International Decision-Making Institutions // Washington Quarterly. Зіма 1995. С. 45.

8 Rabkin R. Why Sovereignty Matters. Washington, DC: AEI Press, 1998.

Паўсюднасць антыпатрыятычных настрояў сярод ліберальнай інтэлігенцыі падштурхнула некаторых яе прадстаўнікоў да таго, каб папярэдзіць сваіх субратоў-лібералаў аб магчымых наступствах гэткіх настрояў, і не для будучыні Амерыкі – для будучыні амерыканскага лібералізму. Большасць амерыканцаў, як напісаў амерыканскі сацыяльны філосаф Рычард Рорці, ганарацца сваёй краінай, аднак «шмат якія выключэнні з гэтага правіла можна знайсці ў каледжах ды ўніверсітэтах, на кафедрах, якія даюць прытулак для левых поглядаў». Гэтыя левыя зрабілі «шмат добрага для… жанчын, афраамерыканцаў, геяў і лесбіянак. …Аднак існуе праблема з гэтым левым рухам: ён непатрыятычны». Ён «не прымае ідэі нацыянальнай ідэнтычнасці і пачуцця нацыянальнага гонару». Калі левы рух хоча захаваць сваю ўплывовасць, яму неабходна прызнаць, што

«*пачуццё калектыўнай нацыянальнай тоеснасці… з'яўляецца абсалютна неадлучным кампанентам грамадзянскай пазіцыі*». Без патрыятызму левы рух не будзе ў стане дасягнуць мэтаў, якія ён ставіць для Амерыкі[9] . Адным словам, каб дасягнуць ліберальных мэтаў, лібералы мусяць выкарыстоўваць у якасці сродку патрыятызм.

ПАТРЫЯТЫЧНА НАСТРОЕНАЯ ГРАМАДСКАСЦЬ

У той час як прадстаўнікі амерыканскай бізнес- і інтэлектуальнай эліты ўсё больш атаясамліваюць сябе з сусветам як адзіным цэлым, называючы сябе «грамадзянамі свету», асноўная маса амерыканцаў выказвае ўсё больш адданасці ўласнай краіне. Велізарная большасць амерыканцаў заяўляе пра свой патрыятызм і ганарыцца сваёй краінай. На пытанне, зададзенае ў 1991 годзе: «Наколькі вы ганарыцеся тым, што вы амерыканец?», 96 % амерыканцаў адказалі «вельмі моцна» або «даволі моцна». Тэракты 11 верасня не маглі мець і не мелі істотнага ўплыву на гэты высокі ўзровень патрыятычных перакананняў: у верасні 2002 году 91 % амерыканцаў «выключна моцна» або «вельмі» ганарыліся тым, што яны – амерыканцы[10] .

Гэтыя пацвярджэнні патрыятызму і гордасці за сваю краіну маглі б не мець гэткага значэння, калі б людзі ў іншых краінах давалі б падобныя адказы. Наагул кажучы, гэтага не назіраецца. Амерыканцы паслядоўна і з вялікім адрывам апярэджваюць іншыя народы ў праявах патрыятызму і імкненні атаясамлівацца са сваёй краінай. Амерыка займала першае месца паводле ўзроўню нацыянальнай гордасці сярод краінаў, ахопленых Сусветным аглядам каштоўнасцяў, што праводзіўся ў 1981–1982, 1990–1991 і 1995–1996 гадах. Кожнае даследаванне ахоплівала ад 41 да 65 краінаў. Ад 96 да 98 % амерыканцаў адзначылі, што яны адчуваюць «вельмі вялікі» або «даволі вялікі» гонар за сваю краіну.

Ступень гэтае ідэнтыфікацыі, тым не менш, вагаецца ў залежнасці ад сацыяльна-эканамічнага статусу, расавай

[9] Rorty R. Achieving Our Country: Leftist Thought in Twentieth-Century America. Cambridge, MA: Harvard University Press, 1998; Rorty R. The Unpatriotic Acadmy // New York Times. 1994. 13 лютага.

[10] «Эй-бі-сі», вер. краін. 2002.

прыналежнасці і месца нараджэння. У даследаванні 1990–1991 гадоў больш за 98 % карэнных амерыканцаў, імігрантаў, белых нелацінаамерыканскага паходжання і чарнаскурых амерыканцаў і 95 % амерыканцаў лацінаамерыканскага паходжання (іспанаамерыканцаў) адзначылі, што яны «вельмі» або «даволі моцна» ганарацца сваёй краінай. Аднак пры адказе на пытанне пра прыярытэты ў нацыянальным самавызначэнні выявіліся адрозненні. 31 % карэнных амерыканцаў і белых амерыканцаў нелацінаамерыканскага паходжання адказалі, што ў першую чаргу атаясамліваюць сябе з Амерыкай, але гэтыя лічбы былі істотна ніжэйшыя сярод чарнаскурых амерыканцаў – 25 %, іспанаамерыканцаў – 19 % і нядаўніх імігрантаў – 17 %. На пытанне, ці былі б яны гатовыя ваяваць за Амерыку, «так» адказалі 81 % белых амерыканцаў нелацінаамерыканскага паходжання і 79 % карэнных амерыканцаў – параўнайце адпаведна з 75 % імігрантаў, 67 % чарнаскурых амерыканцаў і 52 % іспанаамерыканцаў[11].

Гэтыя лічбы наводзяць на думку, што нядаўнія імігранты і нашчадкі людзей, вымушаных уліцца ў амерыканскае грамадства, схільныя мець больш амбівалентнае стаўленне да гэтага грамадства, чым нашчадкі першых пасяленцаў і іншых імігрантаў. Чарнаскурыя амерыканцы і іншыя меншасці таксама змагаліся ў амерыканскіх войнах. Аднак значна меншая колькасць чарнаскурых, чым белых, лічаць сябе патрыётамі. У апытанні 1989 году 95 % белых і 72 % чарнаскурых адказалі, што лічаць сябе патрыётамі «ў высокай ступені» або «ў некаторай ступені»[12]. У даследаванні 1998 году, якое ахоплівала толькі дзяцей школьнага веку, 91 % белых, 92 % іспанаамерыканцаў і 91 % імігрантаў былі рашуча згодныя або ў пэўнай ступені згодныя з наступным сцвярджэннем: «Злучаныя Штаты – краіна, лепшая за большасць іншых краін свету». Сярод афраамерыканскіх бацькоў колькасць тых, што гэтак адказалі, складала толькі 84 %. У іншых апытаннях розніца ў адказах чорнага і белага насельніцтва была крыху меншая, і тым не менш у верасні 2002 году, падчас апытання для аддзелу навінаў Эй-Бі-Сі і «Вашынгтон пост», 74 % белага і 53 % каляровага насельніцтва сцвярджалі, што яны «надзвычай» ганарацца тым, што з'яўляюцца амерыканцамі, – адрозненне большае, чым паміж іншымі асноўнымі сацыяльна-

[11] Critical Citizens: Global Support for Democratic Government / Ed. P. Norris. New York: Oxford University Press, 1999. P. 38–42.

[12] Washington Post National Weekly Edition. 1989. 16–20 лістапада.

эканамічнымі катэгорыямі[13] .

Аднак наагул, з нязначнымі адхіленнямі, амерыканцы ў велізарнай большасці сваёй моцна атаясамліваюць сябе з сваёй краінай, асабліва ў параўнанні з іншымі народамі. У той час як эліта Амерыкі страчвае нацыянальныя асаблівасці, амерыканцы ўвогуле, як вельмі дакладна падсумавалі аўтары аднаго з параўнальных даследаванняў, застаюцца «найбольш патрыятычным народам свету».

[13] Farkas Steve et al. A Lot to Be Thankful For: What Parents Want Children to Learn About America. New York: Public Agenda, 1998. P. 35.

НЕПРАДСТАЎНІЧАЯ ДЭМАКРАТЫЯ

Рост рознагалоссяў паміж сацыяльнымі вярхамі і насельніцтвам у пытаннях унутранай і замежнай палітыкі, звязаных з нацыянальнай тоеснасцю, спрычыніўся да ўтварэння асноўнай мяжы культурнага разрыву, якая праходзіць незалежна ад усіх астатніх класавых, рэлігійных, расавых, рэгіянальных і этнічных адрозненняў. Адарванасць амерыканскага істэблішменту – як прадстаўнікоў ураду, так і неафіцыйных асобаў – ад амерыканскага народу нарастае ўсё больш і больш. У палітычным сэнсе Амерыка застаецца дэмакратычнай краінай, бо ключавыя афіцыйныя асобы трапляюць на свае пасады праз свабодныя і справядлівыя выбары. Аднак у шмат якіх сэнсах яна зрабілася непрадстаўнічай дэмакратыяй, бо ў найбольш важных пытаннях – асабліва тых, якія закранаюць праблему нацыянальнай ідэнтычнасці, – яе лідэры праводзяць палітыку і прымаюць законы, супрацьлеглыя поглядам амерыканскага народу. Гэтаму спадарожнічае ўсё большае адчужэнне амерыканскага народу ад палітычнага жыцця і кіравання краінай.

Паводле даследавання, што ладзілася ў 1980-х гадах, стаўленне сучасных амерыканскіх элітаў, за выключэннем вайсковай і бізнесовай, да такіх катэгорый, як СМІ, праца, рэлігія, права і бюракратыя, было амаль удвая і нават больш чым утрая больш ліберальным, чым у насельніцтва ў цэлым. Іншае даследаванне таксама вызначыла, што ў пытаннях маралі эліты выявіліся «значна больш ліберальнымі», чым шараговыя амерыканцы[14]. У асяроддзі элітаў са сферы

дзяржаўнага кіравання, камунікацый і непрыбытковых арганізацый ліберальнасць поглядаў была пашыраная асабліва моцна. Тое самае можна сказаць пра акадэмічна-выкладчыцкае асяроддзе. Студэнты-радыкалы 1960-х зрабіліся штатнымі прафесарамі, асабліва ў элітных навучальных установах. Стэнлі Ротман заўважае: «*Факультэты сацыялогіі ў элітных універсітэтах у сваёй большасці з'яўляюцца ліберальнымі і касмапалітычнымі або належаць да левага кірунку. Амаль любая праява грамадзянскай пазіцыі (civic loyalty) або патрыятызму тамака расцэньваецца як рэакцыйнасць*»[15]. Лібералізму таксама часцяком спадарожнічае антырэлігійнасць. У даследаванні Ліпсэта і Лэда 1969 году не менш за 71 % выкладчыкаў – юдэяў, каталікоў і пратэстантаў, – што акрэслілі сябе як лібералаў, адначасова назвалі сябе «ў цэлым абыякавымі да рэлігіі».

Гэтыя адрозненні ў ідэалогіі, стаўленні да нацыі і рэлігіі спараджаюць адрозненні ў стаўленні да праблем унутранай і замежнай палітыкі, звязаных з нацыянальнай тоеснасцю. Насельніцтва ў масе пераважна хвалюе ваенная бяспека, бяспека грамадства, унутранай эканомікі і суверэнітэту. Вярхушку, звязаную з замежнай палітыкай, гэтыя праблемы хвалююць у меншай ступені, а спрыянне Злучанымі Штатамі міжнароднай бяспецы, міру, глабалізацыі і эканамічнаму развіццю замежных краінаў турбуе іх больш, чым асноўную масу насельніцтва. Існуе, падводзіць выснову Джэк Сітрын, «*бездань паміж адстойваннем мультыкультуралізму, уласцівым элітам, і масавым упартым адстойваннем неабходнасці асіміляцыі да агульнай нацыянальнай тоеснасці*»[16]. Паратэмнае гэтаму разыходжанне паміж нацыянальна свядомым насельніцтвам і касмапалітычнай вярхушкай найбольш яскрава ўплывае на ўзаемасувязь паміж амерыканскай нацыянальнай тоеснасцю і замежнай палітыкай. У даследаванні 1994 году Сітрын і іншыя падсумоўваюць:

Страта аднадушнасці адносна ролі Амерыкі на міжнароднай арэне – непасрэдны вынік страты згоды адносна таго, што значыць быць амерыканцам, адносна характару амерыканскага нацыяналізму. Айчынны фундамент працяглай пасляваеннай

[14] Dillon Russell Citizen Politics: Public Opinion and Political Parties in Advanced Industrial Democracies. Chatham, NJ: Chatham House, 1996. P. 275–276; Ed. P. Norris. 1994 Citizens. P. 38–42; Smith Tom W., Jarkko Lars. National Pride: A Cross-

гегемоніі касмапалітычнага лібералізму і інтэрнацыяналізму добра падгніў, ужо не кажучы пра той факт, што Злучаныя Штаты больш не супрацьстаяць магутнаму ваеннаму суперніку[17].

Насельніцтва і эліта прыходзяць да згоды шмат у якіх пытаннях замежнай палітыкі. Аднак, беручы наагул, адрозненні ў іхных поглядах нашмат пераважаюць над падабенствамі. Народ – нацыянальна свядомы, эліты – транснацыянальныя. У 1998 годзе разыходжанні паміж поглядамі масаў і поглядамі рэпрэзентатыўнай групы замежнапалітычных дзеячоў на 34 асноўныя праблемы замежнай палітыкі складалі ад 4 да 42 %[18]. У шасці апытаннях, што праводзіліся ў перыяд паміж 1978 і 1998 гадамі, прыхільны склад прадстаўнікоў вярхушкі замежнапалітычнай сферы, якія выказваліся за актыўную палітыку ЗША ў свеце, ніколі не апускаўся ніжэй за 96 %, а прыхільны склад прадстаўнікоў насельніцтва, якія падтрымліваліся гэтую палітыку, ніколі не перавышаў 65 %. З неабходнымі выключэннямі, насельніцтва Амерыкі паслядоўна выказвала значна меншую ступень гатоўнасць падтрымаць пазіцыі, якія займаліся супрацьлеглым Фідэля Кастра, і выступалі за выкарыстанне сілы ў Мексіцы ў выпадку патрозы перавароту. Асноўная большасць грамадзянаў тым не менш, таксама прытрымліваецца думкі, што Злучаныя Штаты не павінны ўжываць сілу ў выпадку міжнародных крызісаў дзейнічаць у адзіноце, без падтрымкі саюзнікаў, у той час як сярод эліты – ужо не кажучы пра той факт, што Злучаныя Штаты больш не супрацьстаяць магутнаму ваеннаму суперніку[17].

Насельніцтва і эліта прыходзяць да згоды шмат у якіх пытаннях замежнай палітыкі. Аднак, беручы наагул, адрозненні ў іхных поглядах нашмат пераважаюць над падабенствамі. Народ – нацыянальна свядомы, эліты – транснацыянальныя. У 1998 годзе разыходжанні паміж поглядамі масаў і поглядамі рэпрэзентатыўнай групы замежнапалітычных дзеячоў на 34 асноўныя праблемы замежнай палітыкі складалі ад 4 да 42 %[18]. У шасці апытаннях, што праводзіліся ў перыяд паміж 1978 і 1998 гадамі, прыхільны склад прадстаўнікоў вярхушкі замежнапалітычнай сферы, якія выказваліся за актыўную палітыку ЗША ў свеце, ніколі не апускаўся ніжэй за 96 %, а прыхільны склад прадстаўнікоў насельніцтва, якія падтрымліваліся гэтую палітыку, ніколі не перавышаў 65 %. З неабходнымі выключэннямі, насельніцтва Амерыкі паслядоўна выказвала значна меншую ступень гатоўнасць падтрымаць пазіцыі, якія займаліся супрацьлеглым Фідэля Кастра, і выступалі за выкарыстанне сілы ў Мексіцы ў выпадку патрозы перавароту. Асноўная большасць грамадзянаў тым не менш, таксама прытрымліваецца думкі, што Злучаныя Штаты не павінны ўжываць сілу ў выпадку міжнародных крызісаў дзейнічаць у адзіноце, без падтрымкі саюзнікаў, у той час як сярод эліты – Апытанні, якія праводзіцца Чыкагскай радай па замежных адносінах раз на чатыры гады, уяўляюць сабой незаменную крыніцу меркаванняў насельніцтва і адпаведнага ёй выбаркі лідэраў у сферы замежнай палітыкі. Калі не падаецца іншая крыніца, выкарыстаныя ў артыкуле звесткі паходзяць менавіта з гэтых справаздач.

Асабліва вялікі разрыў паміж масамі і вярхушкай існуе адносна пытання эканамічных дачыненняў Амерыкі і рэшты свету. У 1998 годзе 87 % прадстаўнікоў вярхоў і 54 % насельніцтва лічылі эканамічную глабалізацыю карыснай для Амерыкі, у той

National Opinion Research Center, GSS Cross National Report, 22 да 42 %.

15 Ladd Everett Carll, Jr., Lipset Seymour Martin. Survey of the Social, Political, and educational Perspectives of American College and University Faculty. Washington, DC: National Institute of Education, 1978. P. 141–146; Ladd and Lipset. The Divided Academy: Professors and Politics. New York: McGraw Hill, 1975. P. 141–146; Rothman S. Academics on the Left // Society. 1986. Сакавік-красавік. С. 6; Connecticut Mutual Life Insurance Co. Report on American Values in the 80's: The Impact of Belief. New York: Research and Forecasts, 1986. P. 27–28.

16 Citrin G. The End of American Identity? // One America? Political Leadership, National Identity, and the Dilemmas of Diversity / Ed. Stanley A. Renshon. Washington, DC: Georgetown University Press, 2001. P. 303.

17 Citrin G. et al. Is American Nationalism Changing? Implications for Foreign Policy // International Studies Quarterly. 1994. Сакавік. P. 26–27.

18 Апытанні, якія праводзіцца Чыкагскай радай па замежных адносінах раз на чатыры гады, уяўляюць сабой незаменную крыніцу меркаванняў насельніцтва і адпаведнага ёй выбаркі лідэраў у сферы замежнай палітыкі. Калі не падаецца іншая крыніца, выкарыстаныя ў артыкуле звесткі паходзяць менавіта з гэтых справаздач.

час як 12 % прадстаўнікоў вярхоў і 35 % насельніцтва прытрымліваліся процілеглай думкі. Чатыры пятыя насельніцтва і менш за палову дзеячоў ад замежнай палітыкі мяркуюць, што ўраду Злучаных Штатаў належыць лічыць абарону працоўных месцаў у ЗША «вельмі важнай задачай». 50 або болей працэнтаў насельніцтва, і пры гэтым ніколі не болей за траціну ад колькасці «дзеячоў» падтрымлівалі ці падтрымліваюць скарачэнне эканамічнай дапамогі іншым краінам. У розных апытаннях 60 або болей працэнтаў насельніцтва падтрымлівалі ўвядзенне пошлінаў; прыкладна такая самая частка «дзеячоў» выказваліся за іх зніжэнне або скасаванне. Падобныя адрозненні існуюць і ў дачыненні іміграцыі. У двух апытаннях, што ладзіліся ў 1990-я гады, 74 (54) % насельніцтва і 31 (18) % замежнапалітычных дзеячоў меркавалі, што высокая колькасць імігрантаў заключае ў сабе «крытычную пагрозу» для Злучаных Штатаў.

Гэтыя і іншыя адрозненні паміж элітамі і насельніцтвам спрычыніліся да ўзнікнення ўсё большага разрыву паміж поглядамі насельніцтва і стратэгіямі, якія прадугледжваліся федэральнымі законамі і дзяржаўнымі актамі. Адно з даследаванняў зменаў у поглядах грамадства на шэраг праблем і суадноснага змянення курсу дзяржаўнай палітыкі прадэманстравала паслядоўнае змяншэнне гэтай адпаведнасці, ад 75 %-га супадзення грамадскай думкі і палітыкі ўраду ў 1970-х гадах да 67 %-га супадзення ў 1984–1987 гадах, 40 %-га ў 1989–1992 гадах і 37 %-га ў 1993–1994 гадах. «*Агульныя факты*, – падсумоўваюць аўтары даследавання, – *паказваюць на існаванне з 1980-х гадоў трывалай мадэлі: агульна нізкага, а часамі блізкага да знікнення ўзроўню рэагавання на грамадскую думку, асабліва ў час першых двух гадоў прэзідэнцтва Клінтана*». Такім чынам, адзначаюць яны, няма падставаў меркаваць, што Клінтан і іншыя палітычныя лідэры «патуралі публіцы». «*Павялічваецца трывожны разрыў*, – падсумаваў адзін аналітык, – *паміж тым, што звычайныя амерыканцы ўкладаюць у паняцце належнай ролі Злучаных Штатаў на сусветнай арэне, і поглядамі дзеячоў, адказных за ажыццяўленне замежнай палітыкі*»[19]. Пры канцы XX стагоддзя палітыка ўраду ўсё больш адхілялася ад жаданняў амерыканскага народу.

Няздольнасць палітычных лідэраў «патураць» насельніцтву мела прадказальныя вынікі. Калі палітыка ўраду ў галіне істотных пытанняў рэзка адхіляецца ад пажаданняў народу, можна чакаць страты даверу да ўраду, змяншэння цікавасці да палітычнага жыцця і ступені палітычнай заангажаванасці, адпаведна, звароту да іншых сродкаў уплыву на палітыку, свабодных ад кантролю палітычнай эліты. Усё гэта адбылося пры канцы XX стагоддзя. Усе тры рэакцыі, без сумневу, сталі шмат прычынаў, якія былі ўсебакова разгледжаныя сацыёлагамі, і адна з вышэйпамянёных тэндэнцый – зніжэнне даверу да ўраду – мела месца ў большасці індустрыяльна развітых дэмакратычных краінаў. Аднак, прынамсі ў Злучаных Штатаў, можна сцвярджаць, што павелічэнне разыходжання паміж поглядамі грамадства і палітыкамі ўраду паспрыяла таму, што адзначаліся ўсе тры тэндэнцыі[19].

Па-першае, народны давер да ўраду і асноўных неафіцыйных інстытутаў Амерыкі істотна знізіўся з 1980-х да 1990-х гадоў. Як адзначылі трое выбітных навукоўцаў (Сюзан Фар, Роберт Патнам і Расэл Далтан), у кожным пытанні, што датычыцца даверу да ўраду, прыкладна дзве траціны насельніцтва выказалі свой давер у 1960-х гадах і толькі каля адной траціны ў 1990-х. У красавіку 1966 году, напрыклад,

у той час, як у разгары была вайна ў Віетнаме і крывавыя сутыкненні на расавай глебе ў Кліўлендзе, Чыкага і Атланце, 66 % амерыканцаў былі нязгодныя з думкай, што «людзям, якія кіруюць краінай, насамрэч няма справы да таго, што адбываецца з вамі». У снежні 1997 году, падчас найдаўжэйшага за больш чым два пакаленні перыяду спакою і росквіту, 57 % амерыканцаў падзялялі гэтую думку[20].

У гэтыя дзесяцігоддзі мела месца таксама падобнае зніжэнне ступені грамадскага даверу да асноўных дзяржаўных і недзяржаўных інстытутаў. Павышэнне ступені народнага даверу адзначалася ў дачыненні толькі двух нявыбарных інстытутаў кіравання – Вярхоўнага Суду і войска.

19. Jacobs Lawrence R. and Shapiro Robert Y. Debunking the Populist Myth // Public Perspective. 1997 Снавік–красавік. P. 3–5; Monroe Alan D. Public Opinion and Public Policy, 1980–1993 // Public Opinion Quarterly. 1998. Вясна. P. 6; Morin Richard. A Gap in World-views // Washington Post Weekly Edition. 1999. 19 красавіка. P. 34.

20. Pharr Susan J., Putnam Robert D., Dalton

Па-другое, як паказалі шматлікія даследаванні, ступень грамадскай зацікаўленасці і грамадскага ўдзелу ў амерыканскіх дзяржаўных і недзяржаўных інстытутах Амерыкі ў перыяд з 1960-х да 1990-х гадоў характарызавалася даволі пастаянным зніжэннем. У 1960 годзе 63 % дарослага насельніцтва ўдзел у выбарах, у 1996-м прагаласавалі толькі 49 %, а ў 2000-м – 51 % выбарцаў. У дадатак да гэтага, як заўважае Патэрсан,

з 1960 году актыўнасць насельніцтва знізілася практычна ва ўсіх галінах выбарчай дзейнасці, ад колькасці валанцёраў, што працуюць падчас выбарчых кампаній, да гледачоў, што глядзяць тэледэбаты. У 1960 годзе ў Злучаных Штатах пражывала на 100 мільёнаў чалавек менш, чым у 2000 годзе, аднак, пры ўсім тым, у кастрычніку 1960 году свае каналы на прэзідэнцкія тэледэбаты настроіла болей тэлегледачоў, чым у 2000 годзе. У 1970-х гадах кожны трэці падаткаплатнік пералічваў даляр ад свайго падатку ў фонд, створаны Кангрэсам для падтрымкі палітычных кампаній. У 2000 годзе гэта зрабіў толькі адзін з васьмі[21].

Трэцім наступствам разрыву паміж лідэрамі і народам стала сенсацыйнае павелічэнне колькасці заканадаўчых ініцыятыў па асноўных пытаннях палітыкі, уключна з пытаннямі, што датычаць нацыянальнай ідэнтычнасці. Заканадаўчыя рэферэндумы, ініцыяваныя грамадскасцю, служылі інструментам прагрэсіўных рэформаў да першай сусветнай вайны. Пазней іх ужыванне паслядоўна скарачалася на пяцідзесяці ініцыятыў за двухгадовы выбарчы цыкл да пачатку 1970-х. Адначасова з тым, як заканадаўцы ігнаравалі клопаты сваіх выбарцаў, заканадаўчыя рэферэндумы, ініцыяваныя грамадскасцю, зноўку набылі папулярнасць, пачынаючы з чэрвеня 1978 году, калі, нягледзячы на супрацьстаянне літаральна ўсяго дзяржаўна-палітычнага, дзелавога і медыйнага істэблішменту, 65 % насельніцтва Каліфорніі прагаласавала за Прапанову № 13, што рэзка зніжала падаткі. Гэтая прапанова адкрыла шлюз, і ў перыяд з канца 1970-х да 1998 году колькасць грамадскіх заканадаўчых ініцыятыў патроілася, склаўшы ў сярэднім за

[21] Russell J. Dalton. The Apathetic Citizen: Why (and How) Americans Don't Participate Enough // Dalton R. J. Citizen Politics: Public Opinion and Political Parties in Advanced Western Democracies. 3rd ed. New York: Chatham House, 2002. P. 4–5.

[21] Patterson T. E. The Vanishing Voter: Public Involvement in an Age of Uncertainty. New York: Knopf, 2002. P. 9–10.

гэты час 61 за двухгадовы выбарчы цыкл. У 1998 годзе галасаванне адбылося па 55 ініцыятывах, у 2000-м – па 60 і ў 2002 – па 49. За час з 1980 да 2002 году ў 6 штатах прайшло 14 рэферэндумаў па пытаннях, што мелі дачыненне да нацыянальнай ідэнтычнасці амерыканцаў: 6 ініцыятыў супраць дзвюхмоўя, 6 – у падтрымку ўжывання ангельскай мовы або за абвяшчэнне ангельскай мовы афіцыйнай мовай штату і 2 – супраць расавых прэферэнцый. Ва ўсіх гэтых кампаніях, якія суправаджаліся гарачымі дыскусіямі, палітычныя, кіраўнічыя, акадэмічныя, медыйныя, рэлігійныя, прафесійныя і бізнес-эліты кожнага штату выступалі рэзка супраць кожнай з заканадаўчых ініцыятыў. Ва ўсіх выпадках, за выключэннем аднаго, народ прагаласаваў у падтрымку ініцыятывы, з перавагай, што ў сярэднім складала 63 %, а часамі дасягала 85 %. Дэвід С. Бродэр у кнізе «Крах дэмакратыі» падсумаваў: «*Узаемны давер паміж кіраўнікамі і кіраванымі, ад якога залежыць сапраўдная прадстаўнічасць уладу, у вялікай ступені вычарпаўся*».

У сённяшняй Амерыцы існуе вялізны разрыў паміж вярхушкай і асноўнай масай насельніцтва адносна найважнейшых сутнасных рысаў амерыканскай нацыянальнай тоеснасці, адносна таго, што адрознівае амерыканцаў ад іншых нацый і адносна належнай ролі Амерыкі ў свеце. Усё болей павялічваецца адрыў вялікай часткі прадстаўнікоў эліты ад уласнага народу, а амерыканскі народ, у сваю чаргу, усё болей расчароўваецца ва ўласным урадзе.

АМЕРЫКА Ў СВЕЦЕ

Тое, як ставяцца да сваёй краіны вярхушка і шараговыя жыхары Амерыкі, вызначае яе ролю ў свеце, аднак тое, як бачыць гэтую ролю свет, таксама ўплывае на амерыканскую нацыянальную ідэнтычнасць. Існуюць тры распаўсюджаныя погляды на дачыненні Амерыкі з светам. Амерыканцы могуць сустракаць свет з шырока раскрытымі рукамі, то бок расчыніць сваю краіну перад іншымі людзьмі і культурамі. Яны могуць спрабаваць змяніць форму іншых грамадстваў паводле меркі амерыканскіх каштоўнасцяў і амерыканскай культуры. І яны могуць імкнуцца да захавання адметнасці ўласнага грамадства

і культуры ад грамадстваў і культур іншых народаў.

Першая, касмапалітычная, альтэрнатыва мае на ўвазе аднаўленне тэндэнцый, што дамінавалі ў Амерыцы да 11 верасня. Амерыка вітае ўвесь свет, яго ідэі, яго тавары і, што найважнейшае, яго людзей. Ідэалам было б адкрытае грамадства з адкрытымі межамі, што заахвочвае самавызначэнне паводле субнацыянальных этнічных, расавых і культурных крытэраў, падвойнае грамадзянства і існаванне дыяспар, грамадства, кіраванае элітамі, што ўсё больш выступаюць за перавагу глабальных інстытутаў, нарматываў і законаў над нацыянальнымі. Амерыцы належыць быць мультыэтнічнай, мультынацыянальнай і мультыкультурнай. Разнастайнасць – адна з найвышэйшых каштоўнасцяў, калі не адзіная найвышэйшая. Чым болей людзей, што прыўносяць у Амерыку розныя мовы, вераванні і звычаі, тым болей амерыканскай робіцца Амерыка. Амерыканскі сярэдні клас усё часцей выступае ў падтрымку сусветных карпарацый, у якіх ён працуе, чым атаясамлівае сябе з рэгіянальнымі супольнасцямі, у якіх ён жыве. Дзейнасцю амерыканцаў усё болей кіруе не федэральны ўрад і ўрад штатаў, а нормы, зацверджаныя міжнароднымі органамі, такімі, як ААН ці Сусветная гандлёвая арганізацыя, звычаёвае міжнароднае права і сусветныя пагадненні. Нацыянальная тоеснасць страчвае сваё першынство на фоне іншых ідэнтычнасцяў. З гледзішча гэтай касмапалітычнай альтэрнатывы, свет вызначае форму Амерыкі.

Паводле імперскай альтэрнатывы, сама Амерыка нанова фармуе свет. Канец халоднай вайны знішчыў камунізм як галоўны чыннік, што вызначаў ролю Амерыкі ў свеце. У выніку лібералы атрымалі магчымасць ажыццявіць свае замежнапалітычныя мэты без неабходнасці апраўдвацца перад абвінавачаннямі, што апошнія падрываюць нацыянальную бяспеку; і тым самым заняцца «нацыятварэннем», «гуманітарнымі ўмяшальніцтвамі» і «замежнай палітыкай як сацыяльнай працай». Выключнае месца Амерыкі як адзінай сусветнай звышдзяржавы адначасова мела ўплыў на амерыканскіх кансерватараў. Падчас халоднай вайны ворагі Амерыкі голасна асуджалі яе як імперскую дзяржаву. На пачатку новага тысячагоддзя кансерватары прынялі і сталі

падтрымліваць ідэю амерыканскай імперыі – незалежна ад таго, ці падабаўся ім сам тэрмін – і выкарыстання амерыканскай моцы для перакройвання свету згодна з амерыканскімі каштоўнасцямі.

Імперскі імпульс мацаваўся верай у вяршэнства амерыканскай магутнасці і ўніверсальнасць амерыканскіх каштоўнасцяў. Паколькі Амерыка далёка пераўзыходзіць у сваёй моцы іншыя дзяржавы, яна нясе адказнасць за ўсталяванне парадку і змаганне са злом ва ўсім свеце. Згодна з гэтай верай універсалістаў, людзі з іншых краін, па сутнасці, вызнаюць тыя самыя каштоўнасці, што і амерыканцы, а калі не вызнаюць, то хочуць вызнаваць, а калі не хочуць, то, значыць, яны не разумеюць, што па-сапраўднаму добра для іх грамадства, і амерыканцы нясуць адказнасць за тое, каб іх пераканаць або прымусіць іх прыняць універсальныя каштоўнасці, якія вызнае Амерыка. У гэткім свеце Амерыка страчвае адметнасць як нацыя і ператвараецца ў дамінантны кампанент наднацыянальнай імперыі.

Аднак ані імперскі, ані ўніверсалісцкі падыход не адлюстроўваюць дакладна стану свету на пачатку XXI стагоддзя. Амерыка – адзіная звышдзяржава, аднак існуюць іншыя моцныя дзяржавы: Брытанія, Нямеччына, Францыя, Расія, Кітай, Індыя і Японія – на глабальным узроўні і Бразілія, Нігерыя, Іран, Паўднёваафрыканская Рэспубліка ды Інданезія – на ўзроўні адпаведных рэгіёнаў. Амерыка не здолее дасягнуць ніякіх істотных мэтаў у свеце без супрацоўніцтва хаця б з некалькімі з гэтых краінаў. Культура, каштоўнасці, традыцыі і інстытуты іншых краін часта несумяшчальныя з ідэяй пераўтварэння гэтых краін пад шаблон амерыканскіх каштоўнасцяў. Гэтыя народы наагул звычайна моцна любяць свой спрадвечны лад жыцця, звычаі і вераванні і, адпаведна, зацята супрацьстаяць спробам з боку чужынцаў з іншых культур іх змяніць. У дадатак да таго, якімі б ні былі мэты амерыканскай эліты, звычайная амерыканская публіка настойліва і паслядоўна расцэньвала пашырэнне дэмакратыі ў свеце як непрыярытэтную задачу. Насаджэнне дэмакратыі ў іншых дзяржавах таксама часта абуджае антыамерыканскія настроі і сілы, як у выпадку з папулісцкімі рухамі ў краінах

Лацінскай Амерыкі і экстрэмісцкімі тэрарыстычнымі рухамі ў мусульманскіх краінах.

Касмапалітызм і імперыялізм спрабуюць зменшыць або сцерці сацыяльныя, палітычныя і культурныя адрозненні паміж Амерыкай і іншымі краінамі. Нацыянальны падыход прызнае і прымае тое, што адрозніваe Амерыку ад іншых грамадстваў. Амерыка не можа стаць цэлым светам і пры гэтым застацца Амерыкай. Іншыя народы не могуць стаць амерыканцамі і адначасова застацца самімі сабой. Амерыка асаблівая, і гэтую адметнасць шмат у чым вызначаюць яе рэлігійнасць і англа-пратэстанцкая культура. Альтэрнатывай касмапалітызму і імперыялізму з'яўляецца нацыянальна свядомы падыход, накіраваны на захаванне і ўзмацненне тых якасцяў, што вызначалі Амерыку спрадвеку.

Амаль чатыры стагоддзі англа-пратэстанцкая культура першых пасяленцаў з'яўляецца асноўным і трывалым складнікам амерыканскай тоеснасці. Адзінае, што трэба запытацца: ці была б Амерыка такой, якой яна ёсць сёння, калі б у XVII–XVIII стагоддзях яе засялілі не брытанскія пратэстанты, а французскія, іспанскія або партугальскія каталікі? Адказам будзе «не». Гэта была б не Амерыка, гэта былі б Квебек, Мексіка або Бразілія. Англа-пратэстанцкая культура Амерыкі спалучыла палітычныя і сацыяльныя інстытуты, атрыманыя ў спадчыну ад Англіі, у прыватнасці ангельскую мову, з уяўленнямі і каштоўнасцямі дысідэнцкага пратэстантызму, які паступова звяў у Англіі, але быў забраны з сабой пасяленцамі і атрымаў новае жыццё на новым кантыненце. Спачатку, як адзначыў Олдэн Т. Воган,

амаль усё было ў аснове сваёй ангельскім: формы землеўладання і землеапрацоўкі, сістэма кіравання і асноўны фармат законаў і юрыдычных працэдур, забавы і спосабы баўлення вольнага часу, іншыя незлічоныя аспекты каланіяльнага жыцця.

Артур Шлезінгер-малодшы пагаджаецца: «…*Мова новай нацыі, яе законы, яе інстытуты, яе палітычныя ідэі, яе літаратура, яе звычаі, яе запаветы, яе малітвы перш за ўсё вялі свой пачатак з*

Брытаніі»[22].

З пэўнымі адаптацыямі і мадыфікацыямі, гэтая зыходная культура захоўвалася трыста гадоў. Праз дзвесце гадоў пасля таго, як Джон Джэй у 1789 годзе вызначыў шэсць асноўных элементаў, супольных для амерыканцаў, аднаго з іх – супольнага радаводу – ужо не існавала. Некаторыя з іншых астатніх – мова, рэлігія, прынцыпы кіравання, манеры і звычаі – змяніліся або пабляклі. Аднак у сваёй сутнасці вызначаны Джэем складнікі амерыканскай нацыянальнай тоеснасці хаця і аспрэчваліся, аднак у XX стагоддзі яшчэ вызначалі амерыканскую культуру. Галоўнае значэнне трывала належала і належыць пратэстантызму. Што датычыць мовы, спробы нямецкіх пасяленцаў, якія з'явіліся ў XVIII стагоддзі ў Пенсільваніі, надаць нямецкай мове роўны з ангельскай статус, раз'юшылі ў ліку іншых Бенджаміна Франкліна і не мелі поспеху[23]. Прынамсі, да з'яўлення дзвюхмоўя і вялікіх асяродкаў іспанамоўных імігрантаў у Маямі і на Паўднёвым Захадзе Амерыка заставалася адзінай у сваім родзе мелізарнай краінай з больш чым двухсотмільённым насельніцтвам, што гаварыла на адной і той самай мове.

На працягу XIX стагоддзя і да канца XX-га імігрантаў розным спосабамі прымушалі і пераконвалі прытрымлівацца асноўных элементаў англа-пратэстанцкай культуры. Сучасныя культурныя плюралісты, мультыкультуралісты і прадстаўнікі этнічных і расавых меншасцяў адзначаюць поспех гэтых спробаў. Імігрантаў з Паўднёвай і Ўсходняй Еўропы, як з'ядзіла заўважыў Майкл Новак у 1977 годзе, прымушалі расцерасе амерыканцамі, адаптуючыся да англа-амерыканскай культуры: амерыканізацыя была «працэсам паўсюднай псіхалагічнай рэпрэсіі». Уіл Кімлічка сцвердзіў у 1995 годзе ў падобных выразах, што, пакуль не надышлі 1960-я, ад імігрантаў

[22] Vaughan G. T. Seventh Century Origins of American Culture // The Development of American Culture / Eds. S. Cohen, L. Ratner. New York: St. Martin's Press, 1983. P. 30–32; Schlesinger Arthur, Jr. The Disuninting of America. New York: Norton, 1998. P. 34.

[23] Moreno J. Jones A. The Struggle for American Culture // PS. Political Science Politics. 1996. Вераснень. P. 428–429.;

чакалася, што яны адмовяцца ад сваёй спадчыны, ад сваёй адметнасці і цалкам асімілююцца да існых культурных норм. Ён назваў гэта «мадэллю англаканфармізму»[24] .

Гэтыя крытыкі мелі рацыю. На працягу ўсёй гісторыі Амерыкі людзі, што не былі белымі пратэстантамі англа-саксонскага паходжання, рабіліся амерыканцамі, пераймаючы англа-пратэстанцкую культуру і палітычныя каштоўнасці гэтай краіны. Гэта было карысна як ім, так і дзяржаве.

Мільёны імігрантаў і іхных дзяцей дасягнулі багацця, улады і статусу ў амерыканскім грамадстве менавіта дзякуючы таму, што асіміляваліся з дамінантнай амерыканскай культурай. Такім чынам, няма падставаў сцвярджаць, што амерыканцы вымушаныя выбіраць, з аднаго боку, паміж бела-расавай англасаксонска-пратэстанцкай этнічнай ідэнтычнасцю і, з іншага боку, абстрактнай і плыткай грамадзянскай ідэнтычнасцю, абумоўленай адданасцю пэўным палітычным прынцыпам. Асновай ідэнтычнасці амерыканцаў ёсць культура, створаная пасяленцамі, якую ўсмакталі пакаленні імігрантаў і якая дала пачатак Амерыканскай Веры. У сэрцы гэтай культуры знаходзіцца пратэстантызм.

Рэлігійнасць вылучае Амерыку сярод большасці іншых заходніх краінаў. Амерыканцы, да таго ж, у большасці сваёй хрысціяне, што іх адрознівае ад шмат якіх незаходніх народаў. Рэлігійнасць спрыяе таму, што амерыканцы ўспрымаюць свет у тэрмінах дабра і зла ў большай ступені, чым іншыя народы. Лідэры іншых краін часта знаходзяць гэтую рэлігійнасць не толькі нязвыклай, але таксама раздражняльнай, з прычыны глыбокага маралізму, які яна ўплятае ў разгляд палітычных, эканамічных і сацыяльных праблем.

[24] Novak Michael. Further Reflections on Ethnicity. Middletown, PA: Jednota Press, 1977. P. 23; Kymlicka Will. Multicultural Citizenship: A Liberal Theory of Minority Rights. New York: Oxford University Press, 1995. P. 14.

Digitized by Google

Рэлігія і нацыянальна свядомы падыход таварышавалі адно аднаму ў гісторыі Захаду. Як паказаў гісторык Эйдрыен Хейстынгс, першае часцяком вызначала змест апошняга: «*На фармаванне кожнай этнічнай групы ў значнай ступені ўплывае рэлігія, гэтаксама як і мова… [у Еўропе] хрысціянства вызначыла фармаванне нацый*»[25]. Сувязь паміж рэлігіяй і нацыянальнай свядомасцю выразна захоўвалася пры канцы XX стагоддзя. Больш рэлігійныя краіны вызначаюцца мацнейшай нацыянальнай свядомасцю. Даследаванне на матэрыяле 41 краіны паказала, што тыя краіны, дзе большасць людзей высока ацэньвалі месца Бога ў іхным жыцці, адначасова былі тымі, у якіх людзі адчувалі «вялікі гонар за сваю краіну»[26].

У межах асобных краінаў больш рэлігійныя людзі звычайна таксама характарызуюцца вышэйшым узроўнем нацыянальнай свядомасці. Даследаванне 1983 году на матэрыяле 15 краінаў (збольшага еўрапейскіх) высветліла, што «*ў кожнай з даследаваных краінаў тыя, хто акрэсліў сябе як нявераў, менш схільныя ганарыцца сваёй краінай*». У сярэднім розніца складае 11 %. Большасць народаў Еўропы займае нізкія пазіцыі паводле іх веры ў Бога і гонару за сваю краіну. Амерыка знаходзіцца на адным узроўні з Ірландыяй. Польшчай, блізка да вяршыні рэйтынгу паводле абедзвюх пазіцый. Каталіцызм ляжыць у аснове польскай і ірландскай нацыянальнай ідэнтычнасці. Спадчына дысідэнцкага пратэстантызму займае ў Амерыцы найважнейшае месца. Амерыканцы ў велізарнай ступені адданыя Богу і рэлігіі і лічаць абодва гэтыя паняцці неадлучнымі. У свеце, дзе рэлігія вызначае перакананні, кантакты і канфлікты людзей на ўсіх кантынентах, не павінна здзіўляць тое, што амерыканцы зноўку звяртаюцца да веры ў пошуках нацыянальнай тоеснасці і нацыянальнай мэты.

[25] Hastings A. The Construction of Nationhood: Ethnicity, Religion and Nationalism. New York: Cambridge University Press, 1997. P. 185–187, 205.

[26] Inglehart Ronald, Caballo Marta: Does Latin America Exist? // PS: Political Science and Politics. 1997. Сакавік. P. 38.

Значная частка прадстаўнікоў амерыканскай эліты прыхільна ставіцца да магчымасці пераўтварэння Амерыкі ў касмапалітычную супольнасць. Іншыя прадстаўнікі вярхушкі хацелі б, каб Амерыка ўзяла на сябе ролю імперыі. Пераважная большасць простых амерыканцаў цвёрда выступаюць за нацыянальную дзяржаўнасць і выбіраюць захаванне і ўзмацненне той амерыканскай тоеснасці, што існуе спрадвеку.

Амерыка робіцца сусветам. Сусвет робіцца Амерыкай. Амерыка застаецца Амерыкай. Касмапалітычнай? Імперскай? Нацыянальна свядомай? Выбар, які зробяць амерыканцы, прадвызначыць будучыню – амерыканцаў як нацыі і ўсяго свету.

Пераклала з англійскай Мілана Міхалевіч

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/3/10**
[image]

[illegible] (9’2000)

[image]

A R C H E

[image]

[image]

[image] [image]2004

"да Змястu"

[image] [image]

ялікі падручнік белдзяржідэалогіі («Асновы...») нават не ўтойвае, што ідэалогія выконвае *інструментальную функцыю*, «служыць дасягненню канкрэтных палітычных, эканамічных і матэрыяльных мэтаў». Гэты ж падручнік адкрытым тэкстам гаворыць, што ідэалогія функцыянуе як *матэрыяльная* свядомасцю людзей. Інструменталізацыя інтэлекту усякімі ўладнымі структурамі бадай ва ўсіх культурах заўжды успрымалася

П а ч а т а к **№ 5 (34) - 2004**

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

крытыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

ПЁТР РУДКОЎСКІ ОП

Публікацыі, якія абмяркоўваюцца ў артыкуле:

Основы идеологии белорусского государства. – Минск: Академия Управления при Президенте РБ, 2004.

Мельник Владимир Андреевич. *Государственная идеология Республики Беларусь: Конституционные основы*. – Минск: ТЕСЕЙ, 2004.

Яскевич Ядвига Станиславовна. *Основы идеологии белорусского государства: Мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты*. – Минск: РИВШ БГУ, 2003.

Канашевич Надежда Михайловна. *Политика. Идеология. Менталитет: Курс лекций*. – Могилев: МГУ им. А. А. Кулешова, 2003.

Борушко Александр Петрович. *О национальной идее. Очерк*. – Минск: УП «Технопринт», 2004.

Лукашенко Александр Григорьевич. *За сильную и процветающую Беларусь!* // Советская Белоруссия. 2001. 22 мая.

Доклад Президента А. Г. Лукашенко на постоянно действующем семинаре руководящих работников республиканских и местных государственных органов по вопросам совершенствования идеологической работы // Советская Белоруссия. 2003. 28 марта.

І кароль выдаў распараджэнне
для ўсёй сваёй дзяржавы:
«Усе пагоны быць адным народам,
і няхай кожны адрачэцца ад сваіх звычаяў».

Першая Кніга Махавеяў 1: 41–42

якорьевич. *За сильную и процветающую Беларусь!* // Советская Белоруссия. 2001. 22 мая.

Доклад Президента А. Г. Лукашенко на постоянно действующем семинаре руководящих работников республиканских и местных государственных органов по вопросам совершенствования идеологической работы // Советская Белоруссия. 2003. 28 марта.

абраза чалавечай годнасці, а спробы навязаць інтэлектуальнай эліце грамадства якую-небудзь дактрыну і ўсталяваць кантроль над мысленнем заўжды выклікалі агіду і асуджэнне з боку апошняй. Нічога дзіўнага: інтэлект поруч са свабоднаю воляй – гэта найвялікшая каштоўнасць чалавецтва, тое, што сведчыць аб адметнасці чалавека ў біясферы і ва ўсім космасе.

Падчас агляду падручнікаў па дзяржаўнай ідэалогіі нас будзе цікавіць, наколькі шырокія рамкі палітычнага дыскурсу прадугледжвае беларуская ўлада, наколькі ізаляваны і наколькі адкрыты інтэлектуальны свет аўтараў гэтых работ і, нарэшце, якія магчымасці дыялогу паміж беларускай дзяржаўнай ідэалогіяй і альтэрнатыўнымі канцэпцыямі грамадскага жыцця ў Беларусі.

1. ОСНОВЫ ИДЕОЛОГИИ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВА

Гэта сапраўды «асновы» ў найбольш поўным сэнсе слова: падручнік выдадзены Акадэміяй кіравання пры прэзідэнце, над зместам яго працавалі 24 навукоўцы (філосафы, сацыёлагі, гісторыкі, палітолагі, юрысты, эканамісты, нават адзін біёлаг) пад агульнай рэдакцыяй Станіслава Князева ды Сяргея Рашэтнікава. Досыць ёмістая (блізу паўтысячы старонак) кніга, выдадзеная самым вялікім з усіх астатніх падручнікаў тыражом (5000 асобнікаў), з'яўляецца неблагой кампенсацыяй занядбанняў, за якія збэсціў Акадэмію прэзідэнт падчас памятнага дакладу 27 сакавіка 2003 г.

1.1. Падручнік падзелены на чатыры раздзелы. Першы раскрывае сам панятак ідэалогіі і яе функцыі, значная частка раздзелу прысвечана «вытокам» і «станаўленню» ідэалогіі беларускай дзяржавы (або дзяржаўнасці), разбіраюцца асноўныя сучасныя ідэалогіі – лібералізм, кансерватызм і сацыял-дэмакратыя. Адмыслова падкрэслена, што канстытуцыя ёсць праўнай асновай ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці.

У загалоўку першага раздзелу фігуруе выраз «Тэорыя і метадалогія ідэалагічных працэсаў». Калі хтосьці дбае пра метадалогію, значыць, ён прызнае пэўны *арганон* (набор сродкаў пазнання). Таму можна чакаць, што тэзісы дадзенага дыскурсу прэтэндуюць на адпаведнасць прынцыпам, прынятым у навуцы: г. зн. яны маюць лагічную структуру, прынамсі, апасродкавана абапіраюцца на факты і могуць быць крытыкаваныя (пазбаўленыя дагматызму). Прэтэнзіі на навуковасць яшчэ яскравей выражаны ў прадмове: «Бо ж гэта не нейкае там дзяжурнае, кан'юнктурнае, прапагандысцкае мерапрыемства, а чыста навуковы, сістэмны падыход да

ўсведамлення сутнасці ідэалогіі».
На жаль, у падручніку не выясняецца, наколькі навуковы падыход можа сумяшчацца з падыходам ідэалагічным, і якое разуменне навукі ўкладальнікі маюць на ўвазе. Але нават калі мы прымем найбольш шырокае разуменне навукі і дамо найбольш прыхільнае азначэнне ідэалогіі, то і тады яны ў значнай ступені будуць выключаць адна адную: навука не выконвае ані мабілізацыйнай функцыі, ані – тым больш – кампенсацыйнай і не скіравана на абарону пэўнага палітычнага курсу. Адзінае, што, здавалася б, можа паядноўваць ідэалогію і навуку, гэта *кагнітыўны ўзровень*: у ідэалогіі ён утварае зыходны пункт, а для навукі ён з'яўляецца, па сутнасці, сэнсам. Але і тут ёсць прынцыповыя адрозненні: ідэалогія арыентуецца на пазнанне не як *на мэту*, а толькі як *на сродак*, адсюль яна тэндэнцыйна і выбарачна адлюстроўвае факты, і – што істотна – выключае крытыцызм, не церпіць іншадумства, характарызуецца, як гаворыцца ў падручніку У. Мельніка, *рэпрэсіўнасцю*.
Тым не менш, не трэба спяшацца з абвінавачаннем аўтараў «Асноў…» у аблудзе. Прыкладна 75 % матэрыялу сапраўды мае навуковы характар («навуковы» не значыць, што можна з усім пагадзіцца; маецца на ўвазе тое, што большасць тэкстаў кнігі маюць інфармацыйна-аргументацыйны характар, і гэта дае падставу для рацыянальнай дыскусіі). Хоць у падручніку не пастаўлена наўпрост пытанне пра суадносіны ідэалогіі і навукі, можна меркаваць, што аўтары не надаюць навуковага статусу афіцыйнаму палітвучэнню. Яны пастулююць толькі навуковы разгляд самой сутнасці ідэалогіі, якая цалкам слушна акрэсліваецца як «квазірэлігія», «своеасаблівыя *сімвалы свецкай веры*», як субстытут рэлігіяў, якія згубілі грамадскую ролю ў эпоху Асветніцтва. Адкрыта гаворыцца, што «ідэалогіі падпарадкаваны дыктату пэўных мэтаў і палітычных матываў», падтрымліваецца метафорыка Маркса, што ідэалогія – гэта мысленчая «прызма», праз якую грамадскія слаі глядзяць на свет.
Аднак у гэтым раздзеле паўстае і шэраг менавіта метадалагічных праблемаў. Па-першае, калі раздзел прысвечаны тэорыі і метадалогіі, то з якой прычыны тут з'явіліся два падраздзелы пра гісторыю беларускай дзяржавы (расказаную тэндэнцыйна), завершаныя апалогіяй саюзу

Беларусі і Расеі? Што яна мае супольнага з даследаваннем ці тэорыяй ідэалагічных працэсаў? Падраздзелы гэтыя ўжо ўтвараюць *змест ідэалогіі*, а не з'яўляюцца яе метадалогіяй ці тэорыяй. Па-другое, першы падраздзел намінальна прысвечаны «ідэалогіі беларускай дзяржавы», а рэальна 80 % матэрыялу датычаць агульных тэарэтычных пытанняў. Да таго ж яго тэматыка ў большай ступені крыжуецца з тэматыкай падраздзелу чацвёртага: абодва займаюцца агульнатэарэтычнымі пытаннямі і спецыфікай беларускай ідэалогіі. Між імі ёсць толькі тое адрозненне, што ў першым раздзеле, напісаным Рашэтнікавам ды Старавойтавай, больш строга і сур'ёзна асвятляецца дадзеная праблематыка, а чацвёрты раздзел (аўтарства Сташкевіча і Матусевіча) – гэта папросту тэндэнцыйная газетная публіцыстыка, дзе амаль адсутнічае аргументацыя, а пераважаюць сугестыўныя прыёмы навязвання пэўнага погляду.

З метадалагічнага гледзішча праблематычная і прысутнасць пятага падраздзелу («Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – праўная аснова ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці») у блоку, прысвечаным метадалогіі і тэорыі. Але сам гэты раздзел змяшчае досыць вартасныя зацемы. У загалоўку гаворыцца пра Канстытуцыю як пра аснову ідэалогіі, але пазней аўтар (праф. Рыгор Васілевіч) адважваецца сказаць, што дзейная Канстытуцыя «свабодная ад яўных ідэалагічных «нагрузак» і – падкрэслівае аўтар – у арт. 4 Канстытуцыя замацоўвае прынцып «разнастайнасці палітычных інстытутаў, ідэалогій і поглядаў». Можна спадзявацца, што аўтар гэтага раздзелу, як юрыст, *ex professione* больш адчувальны да правоў чалавека і прынцыпаў грамадскага суіснавання.

1.2. Другі раздзел прысвечаны «дынаміцы ідэалагічных працэсаў». Тут метадалагічных заганаў менш, бо само загалоўкавае паняцце «дынаміка» менш строгае, у аспекце дынамікі можна разглядаць разнастайныя тэмы. Цалкам слушна на першым месцы абмяркоўваецца «палітычная культура», бо яна, як і ўсякая культура, уяўляе сабой сферу духоўнай мабільнасці і дынамікі. Астатнія тры падраздзелы прысвечаныя СМІ, прафсаюзам ды выбарчым кампаніям, прычым да назвы кожнай з гэтых тэмаў неяк механічна пададавана словазлучэнне «і ідэалагічныя працэсы» – мусіць, каб надаць падручніку больш «ідэалагічны» выгляд, без чаго ён

можа ўспрымацца занадта «нейтральным».
Нягледзячы на гіперідэалагічныя загалоўкі, у самім тэксце аўтары вырашылі трымаць інтэлектуальны ўзровень і пазбягаць апалагетычна-прапагандысцкай рыторыкі. Трохі парадаксальна, але найменей інтэлектуальнай культуры – у падраздзеле, прысвечаным палітычнай культуры. Тут адным махам асуджаюцца моладзевыя мітынгі і неаднойчы паўтараецца з'едлівы зацем, што грамадскія канцэпцыі, якія канкуруюць з белдзяржідэалогіяй, (і іх носьбіты) «падкормліваюцца» з-за мяжы як ідэйна, так і матэрыяльна (але як жа сам аўтар мог бы чытаць улюбёнага Гегеля, калі б не захацеў «падкарміцца» ідэямі родам з Нямеччыны?). Асабліва пужае заява, што ідэалагічны плюралізм (неабходнасць якога пацвярджаецца многімі іншымі аўтарамі ў гэтым падручніку) – гэта «задача, якая патрабуе вырашэння». Зусім іначай выглядае параграф пяты гэтага ж падраздзелу. Тут захаваны годны навукоўца ўзровень прэзентацыі тэмы, прысвечанай гістарычна-культурнай спадчыне.
Раздзелы, прысвечаныя прафсаюзам і выбарчым кампаніям, амаль цалкам маюць фактаграфічны характар, у іх няма ніякага апалагетычнага пафасу. Што праўда, гаворачы пра прафсаюзы, праф. Козік сцвярджае, што да Лукашэнкі быў крызіс прафсаюзаў, а пасля яго прыходу да ўлады аднавіўся іх прэстыж і грамадская роля. Гэта найпраўдападобней даніна палітідэалогіі, хоць не трэба выключаць, што аўтар і сам гэтак інтэрпрэтуе гісторыю прафсаюзаў. Але ён адважваецца зрабіць і крытычную заўвагу, што канстытуцыйнае замацаванне паўнамоцтваў прафесійных саюзаў, якое існуе сёння, патрабуе дасканалення: «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь не надзяляе прафсаюзы правам заканадаўчай ініцыятывы, што замінае іх паўнавартаснаму ўдзелу ў нормаўтваральным працэсе».
У тэксце, прысвечаным СМІ, абрана спецыфічная тактыка. Яго аўтар не абірае самага бяспечнага шляху – бэшчання і маралізатарства датычна беларускіх мас-медыяў, – што найбольш задавольвае ўлады. Наадварот, тэкст заканчваецца выразным націскам на плюралізм, на «прызнанне палітычнай разнастайнасці». Аўтар адмыслова згадвае артыкулы 4 і 5 Канстытуцыі, якія можна лічыць «антыідэалагічнымі». Тым не менш, нярэдка паўстае ўражанне, што аўтар заахвочвае медыі ўзяць удзел у палітычнай агітацыі і прапагандзе

белдзяржідэалогіі (нават спрабуе рэабілітаваць такія паняткі, як «прапаганда», «агітацыя», «дэмагогія», указваючы на іх станоўчае этымалагічнае значэнне). Аўтар ахвотна выкарыстоўвае працы заходніх мысляроў, якія, будучы занепакоеныя празмернай уладай СМІ, актыўна крытыкавалі і дэмаскавалі непажаданы феномен «медыякратыі» (П. Вірыльё, П. Бурдзье, Г. С. Джоўэт, В. О'Донэл). Дзмітрыеў быццам бы не заўважае, што даследаванні гэтых заходніх навукоўцаў датычаць рэчаіснасці ў заходніх ды амерыканскім грамадствах, але ніяк не пасуюць да беларускіх рэаліяў, бо беларускія медыі ані не фармуюць самастойна грамадскай думкі, ані не ўплываюць (самастойна) на палітыку. Вырваная з прасторавага кантэксту, крытыка «медыякратыі», якую фармулюе Дзмітрыеў з апорай на заходніх філосафаў, пазбаўлена праўдзівай выясняльнай вартасці.

1.3. Трэці раздзел названы «Дзяржаўныя інстытуты і ідэалагічныя працэсы». Зноў жа, нягледзячы на рытуальную пратэзу «і ідэалагічныя працэсы», раздзел мае пераважна справаздачна-інфармацыйны характар, тут падрабязна апісваюцца функцыі прэзідэнта, парламенту, рады міністраў ды мясцовага кіравання. Бадай адзіным «ідэалагічным месцам» ёсць падраздзел аб прэзідэнту. Перадгісторыя ўвядзення прэзідэнцтва расказана аднабакова ды яшчэ ў трыумфалістычным тоне. Аўтарка навязліва прасоўвае абгрунтаванне, па сутнасці, манархічнага статусу прэзідэнта, увядзенне яго ў ранг «чацвёртай улады», што ўзвышаецца над трыма астатнімі, якія ў сапраўднай рэспубліцы павінны быць аўтаномнымі; яна зусім не ставіць пытання, што рабіць (незалежна, ці гэта будзе Лукашэнка, ці хто-небудзь іншы), калі заўважана будзе карупцыя, маральная дэградацыя ці яшчэ што горшае ў чалавека, які мае аж такую ўладу і можа «канстытуцыйным чынам» анульваць усякія спробы зняцця яго з пасады. Факт, што шляхетная платонаўская ідэя «справядлівага мудраца-валадара» тысячы разоў была скампраметавана ў гісторыі, а чалавецтва ўжо даволі намучылася ад абсалютызмаў усякага роду: асвечаных і неасвечаных, тэакратычных і атэістычных, правых, левых і цэнтрысцкіх, ігнаруецца. Непадкантрольная ўлада – самая няшчасная версія ўлады.

1.4. У чацвёртым раздзеле аўтары палічылі мэтазгодным

паінфармаваць студэнтаў пра «дзяржаўную палітыку ў ідэалагічнай сферы». Спачатку тут абгаворваецца загадкавая арганічная еднасць палітыкі, эканомікі і ідэалогіі, затым намнога больш ясна выкладаюцца «інтэграцыйная ідэя» і «светапоглядныя падставы», потым выясняецца сацыяльная функцыя нашай дзяржавы (ад чаго паўстае ўражанне маткі-дабрадзейкі, якая корміць несамастойнае і інфантыльнае грамадства), нарэшце, сярэдне кампетэнтна расказваецца пра ролю цэркваў і рэлігіі, моладзевую палітыку ды інфармацыйную стратэгію; гэтая апошняя тэма да болю прасякнута антыамерыканскай рыторыкай.
Варта станоўча згадаць пра падраздзелы, напісаныя рэдактарам Рашэтнікавым і спадарыняй Яскевіч, кнігу якой мы яшчэ разбяром ніжэй. Рашэтнікаў прэзентуе няблага апрацаваную філасофію суіснавання адзінства і шматлікасці. Ён паказвае, у чым палягае баланс паміж агульным і адрозным, паміж сталым і зменлівым. Уважліва разгледжаны стасунак паміж роўнасцю і свабодай (абодва гэтыя паняткі часта нядбайна і спрошчана трактуюцца нават заходнімі сацыяльнымі філосафамі), філасофія права пры гэтым абапертая на ліберальныя ідэі Імануэля Канта: а) чалавеку дазволена ўсё, што не забаронена законам; б) дзяржаве і яе органам забаронена ўсё, што не дазволена законам. У Канта ёсць і яшчэ адна каштоўная антрапалагічная сентэнцыя: «Чалавек свабодны, калі падпарадкоўваецца не другому чалавеку, а закону». У параграфе, прысвечаным «стабільнасці і зменлівасці палітычнай сістэмы», знаходзім пасаж, які выглядае як асцярожны напамін пра сапраўдную дэмакратыю і свабоду: *Нам трэба звярнуцца тварам да будучыні, а не да мінулага. Неабходна вызваленне сілаў чалавека з улікам яго рэальнай сутнасці: кожны ж чалавек імкнецца да шчасця, дабрабыту і добраўладкавання сваёй сям'і. (...) Мы мусім адысці ад атамізацыі, нецярпімасці, ад сацыяльнага дзікунства. Бо ж дэмакратыя – гэта не проста ўлада большасці, а выключэнне дыктату супраць меншасці, улік інтарэсаў гэтай меншасці.*
Антрапалогія, ды яшчэ спалучаная з этыкай персаналізму, чалавекалюбствам ды верай у чалавека, – гэта вялікая рэдкасць у афіцыйнай ідэалогіі, і таму на фоне антрапалагічнага мінімалізму (каб не сказаць – нігілізму) гэткае выказванне асабліва ўзрушае.

Аб «светапоглядных падставах» спадарыні Яскевіч будзе яшчэ гаворка пры разборы яе падручніка, тут варта толькі адзначыць, што яна прэзентуе памяркоўна адраджэнскую версію нацыянальнай ідэі, з захаваннем, праўда, лаяльнасці адносна афіцыйных догмаў тыпу славянскага братэрства ці антыамерыканскай установкі.

Падагульняючы, варта адзначыць, што падручнік не характарызуецца цвёрдай артадоксіяй. Яго можна назваць падручнікам па грамадазнаўстве з прымешкам палітідэалогіі. У тэкстах гэтай кнігі можна вылучыць два слаі: філасофска-навуковы і ўласна ідэалагічны. Дзякуючы першаму слою (які значна пераважае), студэнты і іншыя чытачы будуць мець магчымасць узбагаціць свае паліталагічныя, філасофскія ды гістарычныя веды, што можа нават спрычыніцца да выпрацоўкі самастойнага крытычнага погляду на сучасную грамадска-палітычную рэчаіснасць у Беларусі.

Ідэалагічны слой старанна ўплецены ў навуковы. Ён палягае не толькі ў ін'екцыі прапагандысцкіх тэкстаў, але ў значнай ступені і на сімволіцы. Сам факт напісання «Асноў…» на расейскай мове дае зразумець, што беларускамоўныя беларусы надалей павінны лічыцца «нязначнай меншасцю», якая не бярэцца пад увагу мак'явелісцкімі палітыкамі. Некаторыя тэксты багата насычаны цытатамі з прамоваў прэзідэнта, пару аўтараў (Антонава, Землякоў) у спісе літаратуры прозвішча Лукашэнкі змясцілі не ў алфавітным парадку, а на першым месцы. У бібліяграфіі пры канцы кнігі прамовы прэзідэнта не толькі аднесены да катэгорыі «нарматыўна-прававыя крыніцы», але змешчаны на першым месцы, у той час як Канстытуцыя фігуруе на другім, а Ўсеагульная Дэкларацыя правоў чалавека – на трэцім. Тут семантыка ясная: грамадзяне павінныя верыць у гнасеалагічную іерархію, ці, кажучы словамі самога прэзідэнта, «ідэалагічную вертыкаль»: лідэр валодае поўнай Ісцінай, астатнія – па меры паслухмянасці.

Апрача двух слаёў, у падручніку можна вылучыць і дзве тэндэнцыі, якія даюць аб сабе знаць і ўтвараюць чарговую антыномію: «афінская» і «спартанская». Для першай уласціва ліберальна-прававая ўстаноўка, для другой – устаноўка на дысцыплінаванае іерархічнае грамадства і прынцып безумоўнага падпарадкавання. Першая адкрытая на нерэвалюцыйныя рэформы, а другая мае ментальнасць

«надзвычайнага становішча», лічыць, што ўсім трэба скансалідавацца вакол лідэра для барацьбы з бачным і нябачным ворагам.
Можна заўважыць таксама лёгкае напружанне паміж славянафільска-прарасейскай стыхіяй і памяркоўнай адраджэнскай. Некаторыя аўтары прэзентуюць кансерватыўна-савецкую ментальнасць, але дамінуе рэвізіянісцкая, «перабудовачная» плынь, дарма што на словах перабудова гарбачоўскага перыяду малюецца пераважна ў чорных фарбах. Для большасці аўтараў усё ж уласціва «новае мысленне» і патаемная сімпатыя да еўрапейскіх каштоўнасцяў.

2. В. А.
МЕЛЬНИК.
ГОСУДАРСТВЕННАЯ
ИДЕОЛОГИЯ
РЕСПУБЛИКИ
БЕЛАРУСЬ:
КОНЦЕПТУАЛЬНЫЕ
ОСНОВЫ

Гэта другі паводле накладу (2100 асобнікаў) падручнік. Ён складаецца з пяці раздзелаў, тэматыка якіх мае досыць лагічную паслядоўнасць: у першым раздзеле разбіраецца сутнасць ідэалогіі і яе грамадскае прызначэнне, у другой тэма канкрэтызуецца і ўвага факусуецца на дзяржаўнай ідэалогіі, а затым аўтар засяроджваецца на ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Апошнія два раздзелы прысвечаны аналізу сацыяльнай арыентацыі нашай дзяржавы і стратэгіі развіцця Беларусі ў сучасных умовах.
Мельнік шмат увагі надае тэрміналагічным пытанням: што такое ідэалогія, як яна суадносіцца з утопіяй, ці ёсць розніца паміж нацыянальнай і дзяржаўнай ідэалогіяй і інш. Ідэалогіі тут акрэсліваюцца як «адмысловыя тыпы веравызнанняў і пераканання людзей». Ім прыпісваюцца наступныя рысы: *спекулятыўнасць* («не рэчаіснасць спараджае ідэалогію, а, наадварот, ідэалогія – рэчаіснасць»), *дагматычнасць* («яўныя і ўнутраныя супярэчнасці ідэалогіі, яе разыходжанне з рэчаіснасцю зазвычай не ўлічваюцца»), *апалагетычнасць, аўтарытарнасць* («ідэалогія не церпіць іншадумства, дысідэнцтва. (...) Праз гэтую ўласцівасць яна ўсюдыісная і

ўсёпранікальная, ідэалогія не пакідае выбару, акрамя аднаго: хто не з намі, той супраць нас») і, нарэшце, *рэпрэсіўнасць*. Аўтар таксама падкрэслівае, што неадлучны кампанент ідэалогіяў – *палітычныя міфы*, якія «настойліва прышчапляюцца і эксплуатуюцца ў якасці моцнага аргументу для апраўдання існай улады і ажыццяўлянай палітыкі». Апрача таго, «палітычныя ідэалогіі дазваляюць пазбегнуць пачуцця вінаватасці, якое можа авалодаць людзьмі, якія здзяйсняюць пэўныя палітычныя дзеянні».

Цытатаў, бадай, дастаткова. Усе названыя Мельнікам прыкметы ідэалогіі даволі красамоўныя і маральнае асуджэнне ідэалогій напрошваецца само сабой. Найбольш пільную ўвагу варта звярнуць на апошнюю рэпліку: «ідэалогіі дазваляюць пазбегнуць пачуцця вінаватасці». Выснова з гэтага такая: *ідэалогія вядзе да дэфармацыі чалавечага сумлення*. Мы можам прывесці шэраг прыкладаў такой дэфармацыі: фашысты, якія жыўцом спальвалі нявінных людзей, сербы, якія знішчалі баснійцаў альбо праводзілі этнічныя чысткі ў Косаве, амерыканцы, якія здзекаваліся з вязняў у Абу Грэйб, АМАПаўцы, здольныя збіваць мірных дэманстрантаў, калечыць жанчын і дзяцей. Усё гэта было для іх магчымым, бо ідэалогія – тая ці іншая – вырашала праблемы сумлення.

Такая непрывабная характарыстыка ідэалогіі, здавалася б, павінна мець у якасці лагічнага наступства тое, што аўтар непрыхільна паставіцца да ўвядзення афіцыйнай ідэалогіі, ці, прынамсі, не пахваліць гэтага. Але кожны чалавек повен неспадзевак: дарма што палітідэалогіі па сваёй сутнасці *аўтарытарныя, рэпрэсіўныя* і маюць *міфагенны характар*, Мельнік, быццам мантру, паўтарае праз усю кнігу (па-рознаму фармулюючы), што «супольнасць, арганізаваная ў дзяржаву, заўжды патрабуе дзяржаўнай ідэалогіі». Гэты тэзіс суправаджаецца іншым, больш фундаментальным тэзісам, што «ідэалогія ёсць іманентная свядомасці ўсякага сацыяльнага суб'екта», гэта значыць: таварышы, кожны з нас з'яўляецца ідэолагам і нікуды не дзенешся. Але найбольшы Мельнікаў радыкалізм выяўляецца ў наступных словах: «Разбурэнне дзяржаўнай ідэалогіі азначае разбурэнне і самой дзяржавы». Ад такіх словаў кроў стыне ў жылах: крытычны падыход да ідэалогіі можа быць расцэнены як антыдзяржаўная дзейнасць. Што ж, нялёгкія часы надыходзяць для тых, хто хоча жыць

згодна з сумленнем і верыць у маральныя прынцыпы...
Калі ўжо Мельнік так адназначна выказаўся за аўтарытарна-рэпрэсіўны прынцып грамадскай арганізацыі, сцвярджаючы неабходнасць і непазбежнасць такога варыянту, то як жа з ідэалагічным плюралізмам, які гарантуюць нам беларуская Канстытуцыя і Дэкларацыя правоў чалавека? Тут па-сапраўднаму гегельянскае вырашэнне праблемы: шматлікасць ідэалогій – так, але толькі ў межах гэтай адзінай ідэалогіі! Мельнік тут надзвычай непасрэдны: усякі ідэйны плюралізм, які не ўпісваецца ў рамкі дзяржідэалогіі, ёсць плюралізм «антынацыянальны, калабарацыянізм і кампрадорства, якія ва ўсіх краінах пераследуюцца законам». Вось і па плюралізме – амэн.
Крыху далей аўтар гаворыць пра ЗША, дзе адбываецца быццам бы зрух у кірунку адной ідэалогіі. Тэзіс гэты настолькі інтрыгуе, што хочацца папрасіць, каб аўтар падрабязна апісаў, які змест гэтай ідэалогіі, паводле якога закону пераследуюцца нязгодныя з ёй і як гучыць гэты таемны закон. Усё ж хай будзе дазволена заўважыць, што нават у часы панавання неакансерватыўнага Буша, нават у такі нервовы час, як час вайны ў Іраку, тысячы інтэлектуалаў на чале з Чомскім маглі без страху крытыкаваць ваенную ідэалогію прэзідэнта. Частка рэспубліканцаў, якія, здавалася б, павінны безагаворачна падтрымаць свайго лідэра, выкупілі старонку ў «The New York Times», каб публікаваць крытыку бушаўскай палітыкі, і нават высокапастаўленыя генералы (!) у вольны ад працы час па тэлебачанні выказвалі непапулярныя ў Пентагоне меркаванні. Дык будзем удзячныя Мельніку, калі ён напіша – не трэба пра ўсе краіны, хопіць нават адной еўрапейскай, напрыклад Літвы ці Польшчы, – дзе ёсць *акрэсленая* дзяржідэалогія, паводле якога закону пераследуюцца нязгодныя і якія канкрэтна факты пацвярджаюць гэты пераслед.
Шчыра кажучы, часам паўстае пытанне, ці можна які-небудзь тэзіс Мельніка браць сур'ёзна, бо ў кнізе столькі супярэчнасцяў і некагерэнцыі, што – адаптуючы выказванне Сакрата датычна абвінавачання Мэлетоса – узнікае ўражанне, што аўтар праводзіць інтэлектуальную гульню і хоча праверыць, ці будуць чытачы дастаткова спрытнымі, каб разблытаць тое, што ён наўмысна наблытаў. Так, напрыклад, мы маем сцвярджэнне, што «ідэакратыя» – навязванне дзяржавай адзінай ідэалогіі –

гэта недапушчальна, але праз колькі старонак аўтар даводзіць, што ўсе аўтарытэтныя кнігі, радыё, тэлебачанне, прэса павінны перадаваць людзям дзяржідэалогію, нават падчас спартыўных мерапрыемстваў або праз рэкламу! Ён заяўляе аб рэпрэсіўнай сутнасці ідэалогіі, але тут жа абвяшчае, што ідэалогія павінна быць атрыбутам дзяржавы (*sic!*), якая, у сваю чаргу, ёсць плюралістычнай, і асоба чалавека – найвышэйшая каштоўнасць. Мельнік дашукваецца супярэчнасці ў расейскай Канстытуцыі, якая забараняе ўвядзенне дзяржаўнай ідэалогіі (арт. 7), кажучы, што ўжо сам такі запіс сведчыць аб наяўнасці пэўнай ідэалогіі, але не заўважае, што сам ён аперуе тэрмінам «ідэалогія» ў розных значэннях. Аналагічная праблема і з поглядам на Полацкае княства. На с. 104 ён піша: «Полацкае княства мела ўсе асноўныя прыкметы, уласцівыя дзяржаўным утварэнням», а на с. 119 – «...яўным перабольшаннем ёсць уяўленне Полацкага княства як крыніцы беларускай дзяржаўнасці ці, тым болей, як уласна беларускай дзяржавы». Калі Полацкае княства мела прыкметы, уласцівыя дзяржаўным утварэнням, то для якога сучаснага народу яно павінна быць крыніцай дзяржаўнасці? Для палякаў? расейцаў? украінцаў? Тое, што тады не існаваў беларускі народ у сучасным разуменні, не з'яўляецца падставай адмаўляцца ад полацкай спадчыны, якая адыграла важную ролю для далейшага фармавання беларускага этнасу.

Нягледзячы на ўсе гэтыя супярэчнасці і няяснасці, прысутнічае ў гэтай кнізе тэзіс, які пададзены даволі адназначна, – *тэзіс аб расейскай*[1] *сутнасці беларуса*. Менавіта ў расейскасці, «расейскай ідэі»[2] палягае базавая каштоўнасць беларускага народу. Ігнараванне расейскасці азначае «адхіленне беларусаў ад сваёй генетычнай сутнасці». Некаторыя схізматыкі (Ластоўскі, Цвікевіч) спрабавалі змяніць генетычны код, але праўда засталася праўдай: «наш народ з задавальненнем аддае перавагу называнню нашай краіны Беларуссю, а сябе – беларусамі. Тым самым ён прызнае сваю агульнарускасць...» Некаторыя кажуць аб русіфікацыі беларусаў у Расейскай імперыі – што за глупства, ісціна тут такая: «тое, што аўтары падобных сцвярджэнняў называюць русіфікацыяй беларусаў, па сутнасці, было не чым іншым, як вяртаннем беларусаў да сваіх гістарычных каранёў, да сваёй славяна-рускай тоеснасці. (...) Няма сэнсу казаць пра русіфікацыю народу, які паводле свайго

азначэння ёсць расейскі (русский)!».

Адкуль жа ўзялося гэтае «азначэнне», на што яно абапіраецца? Метад тут такі просты: Мельнік разбівае слова *беларусы* на складовыя часткі і робіць выснову: «*расейцы* (русские) – родавая прыналежнасць і наша відавое адрозненне – *беларусы*. Адначасна гэтая формула ёсць генетычным кодам беларусаў».

Увядзенне заалагічных тэрмінаў пры апісанні антрапасферы – гэта прыклад філасофскага шарлатанства. Калі ўжо разглядаць чалавека ў біялагічна-эвалюцыйным аспекце, то трэба ясна адзначыць, што *ўсе* людзі ўтвараюць адзін-адзіны заалагічны від, і гэта ёсць эмпірычная аснова для ажыццяўлення агульначалавечай еднасці. Абсурдам ёсць стасаванне заалагічных таксонаў для апісання адрозненняў унутры віду *homo sapiens*. Тое самае датычыцца і выразу «генетычны код». Этнічныя і нацыянальныя адрозненні маюць характар хутчэй культурны, чым псіхалагічны, і яшчэ менш – біялагічны, бо чалавек – гэта істота, у якой сувязь паміж генатыпам і фенатыпам «аслабленая»: той ці іншы генетычны код не перадвызначае псіхалагічнай, ані тым больш культурнай «сутнасці» чалавека ці групы людзей. Феномен *homo culturalis* якраз у тым і палягае, што чалавек трансцэндэнтуе, узносіцца па-над біялагічнымі дэтэрмінантамі, можа актыўна пераўтвараць той ці іншы культурны матэрыял, уводзіць новыя элементы.

Апрача біялагічнага эсенцыялізму ў Мельнікавым «азначэнні» бачны *паняццевы рэалізм*; ён аперуе архаічнай, прымітыўнай тэорыяй пазнання, дзе няма розніцы паміж аб'ектам, паняццем аб'екта і назвай аб'екта. Згодна з такой логікай можна даказаць, што Мельнік – млынар, бо сама назва на гэта ўказвае, Катляроў (хай даруюць мне людзі, што выкарыстаю іх прозвішчы ў дыдактычных мэтах) павінен працаваць пры катлах, Мясніковіч – быць мясніком, а Замяталін – замятаць... А тое, што кожны з іх выконвае не тое, што заключана ў назве-сутнасці, – гэта непамыснае парушэнне генетычнага коду.

З такім разумаваннем ніхто з названых не згодзіцца, а мо' і пакрыўдуе – і слушна. Але нельга таксама гэткім метадам

[1] Для расейскамоўных аўтараў ідэалагічных падручнікаў няма розніцы паміж «рускі» і «расейскі», яны атаясамліваюць гістарызмы «рускі», «Русь» з сучаснымі панятkамі «расейскі», «Расея» і дзякуючы гэтаму могуць сцвярджаць, як Мельнік, што насельнікі ВКЛ называючы сваю мову «рускай», тым самым сцвярджалі сваю родnасць з «русским», г. зн. расейскім народам.

зывуць сваіх суседзяў. У беларусаў ён такіх адмоўных адзнак не выявіў. Ён адзначае, што беларусы дэманструюць «рэдкую талерантнасць», але ў іх няма «моцнага пачуцця ўласнай годнасці». Мельнік робіць выснову, што беларусы «хоць і маюць свой асобны тып, але ў ім адсутнічаюць рысы, якія б адрознівалі іх ад іншых славянскіх плямёнаў». Мы ўжо адзначалі, што падобныя меркаванні характэрны для ўсіх расейскіх, і яны ў прынцыпе не супярэчаць ідэі аб тым, што беларусы – гэта этнаграфічная група рускага народа. Але ў гэтым выпадку Мельнік не можа растлумачыць, чаму беларусы не хочуць зліцца з расейцамі, чаму яны не ідуць на інтэграцыю з Расеяй. Ён можа толькі канстатаваць, што беларусы – «самастойны тып», але не можа растлумачыць, чаму яны ім з'яўляюцца

нацыянальнай ідэі» і сцвярджае дадатную ролю ідэалогіі ў палітычнай сацыялізацыі асобы, але сутнасным адрозненнем паміж Яскевіч і Мельнікам у трактоўцы ідэалогіі ёсць стаўленне да ідэйнага плюралізму. Спадарыня Яскевіч сцвярджае: «...Станаўленне грамадска значнай прыярытэтнай ідэі не прадугледжвае пераходу да адзінай дзяржаўнай ідэалогіі, бо там, дзе знікае разнастайнасць, плюралізм поглядаў і падыходаў і ўсталёўваецца адзіная справядлівая навуковая ідэалогія, надыходзіць канец дэмакратычным пачаткам і парасткам». У гэтым падручніку адназначна крытыкуецца «ідэалагізацыя палітыкі» і «палітызацыя ідэалогіі».

Другім адрозненнем ёсць само разуменне ідэалогіі. Для Мельніка характэрна разуменне ідэалогіі як фактару, які гарантуе інтэлектуальную лаяльнасць, падпарадкаванне розуму палітычнаму веравызнанню, устанаўленне грамадска-культурных табу, кантроль над культурай і чалавечым сумленнем. Гэтае разуменне назавём – «ідэалогія-стабілізатар» (1). Для Яскевіч характэрна разуменне ідэалогіі як руху ідэяў і канцэпцый, якія ва ўмовах плюралізму і свабоды слова, гарантаваных Канстытуцыяй, уплываюць на грамадскую свядомасць і, апасродкавана, на палітычна-эканамічныя працэсы. Гэта можна назваць – «ідэалогія-каталізатар (генератар)» (2). Варта было б апераваць багацейшым лексіконам і для адрознення ідэалогіі 1 ад ідэалогіі 2 называць іх рознымі тэрмінамі. Для 2 мог бы пасаваць тэрмін «(палітычны) дыскурс», «(палітычная) парадыгма», што значыла б: адносна адкрытая (на дыскусію і дыялог) сістэма перакананняў і ідэяў, выражаная ў пісьмовых і вусных тэкстах. «Прапаганда» ў гэтым выпадку ажыццяўлялася б не толькі і не столькі дзеля мабілізацыі масаў, колькі *дзеля стварэння магчымасці для крытыкі і карэкцыі* з боку іншых – тых, хто інакш глядзіць на праблематыку, што асвятляецца ў тэкстах дадзенага дыскурсу.

Размежавальную лінію паміж ідэалогіямі 1 – а-ля Мельнік – і ідэалогіямі 2 – а-ля Яскевіч – трэба праводзіць паводле крытэру *грэхапрызнання* (*фалібілізму*): наколькі прыхільнікі дадзенага грамадска-палітычнага выбару дапускаюць магчымасць

памылкі і наколькі дапускаюць магчымасць крытычнай ацэнкі іх выбару. Паводле гэтага крытэру ідэалогіі 1 можна залічыць да разраду *палітычнага фундаменталізму* (які ў крайніх выпадках можа ператварыцца ў фанатызм), ідэалогіі 2 – да *палітычнага дыялогу*. Першыя раз'ядноўваюць, заключаюць у сябе ўстойлівую дыскрымінацыю, вядуць да сацыяльнай варажнечы ды палітычнага дарвінізму і ніяк не могуць стацца падставай для кансалідацыі. Другія ж спрыяюць дынамічнаму развіццю грамадства, павышаюць узаемны давер і з'яўляюцца прыкладам практычнага ажыццяўлення прынцыпу верхавенства асобы.

Падручнік Яскевіч усё ж нясе і невялікую ідэалагічную нагрузку: ёсць у ім стрыманая апалогія сённяшняга палітычнага курсу і апалогія кантраверсійнага рэферэндуму-96, прамовы Лукашэнкі ў бібліяграфіі змешчаныя перад Канстытуцыяй і Ўсеагульнай Дэкларацыяй правоў чалавека і інш. Тым не менш, адсутнічае славяна-руская метафізіка, а гісторыя Беларусі расказана ў аспекце культурных і нацыятворчых працэсаў. Апавядаецца ў кнізе і пра мастацка-культурную самабытнасць Полацкай зямлі, і пра хрысціянскіх асветнікаў, і пра дамінацыю беларускага фактару ў Вялікім Княстве Літоўскім. Дыяметральна іншая, чым у Мельніка, і ацэнка Берасцейскай уніі, адзначана яе роля ў захаванні беларускіх адметнасцяў і народных традыцый. Перыяд знаходжання ў складзе Расейскай імперыі названы перыядам страты самабытнасці і асіміляцыі, а генацыд і дэфармацыя нацыянальнага аблічча беларусаў у савецкі перыяд названы пайменна. Яскрава заўважаецца ў Яскевіч адраджэнская ўстаноўка: яна адмыслова вылучыла ўсе адраджэнні ў беларускай гісторыі, пачынаючы ад «раннехрысціянскага Адраджэння» часоў асветнікаў Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, калі пачаўся «першы сінтэз творчых парываў маладога этнасу», праз вялікае агульнаеўрапейскае Адраджэнне часоў Гусоўскага і Скарыны, Адраджэнне пачатку XX ст. аж да Адраджэння першай паловы 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

Гістарыясофія Яскевіч пазбаўленая гістарыцызму. Характаралогія беларуса, паказаная аўтаркай, не

суправаджаецца «філасофіяй наканавання». Хоць культура называецца «генатыпам», у гэта не ўкладваецца дэтэрмініcтычны сэнс, затое моцна падкрэсліваецца неабходнасць і непазбежнасць «культурных інавацыяў». «Беларускую ідэю» Яскевіч разглядае паводле аналогіі з «расейскай (русской) ідэяй», але гэта ніяк не вядзе да рэдукцыі адной да другой. Тое, што аўтарка выкарыстоўвае ў салаўёўскай версіі «расейскай ідэі», – гэта вера ў еднасць Усходу і Захаду. Спецыфіку беларускай культуры Яскевіч бачыць у яе «памежным» характары. Наша культура сфармавалася на аснове ўзаемадзеяння з культурамі літоўцаў, расейцаў, татараў, яўрэяў і г. д. Даследніца падкрэслівае супольнасць яе пэўных рысаў з расейцамі і ўкраінцамі, напрыклад «калектывізм», але тут жа адзначае, што «грамадства ніколі не набывала ў беларусаў такога прыгнятальнага і глабальнага характару, як у расейцаў, калі служэнню супольнай справе ахвяруюцца ўсе сілы асобы. Беларусам характэрна адчуванне асабістай незалежнасці, аўтаномнасці».

Што да палітычнай філасофіі спадарыні Яскевіч, то яна прэзентуе «стратэгію рызыкі». Гэтая канцэпцыя апісана і ў яе адмысловым артыкуле «Стратэгія рызыкі ва ўмовах гістарычнага выбару Беларусі» (Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 2). У некаторых пунктах яна супадае з Поперавай канцэпцыяй «частковай грамадскай інжынерыі» (piecemeal social engineering): абедзвюм уласціва адмова ад кібернетычнай устаноўкі – імкнення ўзяць пад татальны кантроль усе грамадска-культурныя, гаспадарчыя і палітычныя працэсы ў дзяржаве. «Пераход ад мінулага да будучыні, – кажа Яскевіч, – ажыццяўляецца праз дастатковае праяўленне выпадковасці». Пры гэтым «трэба адмовіцца ад пазіцыі безумоўнай маніпуляцыі і поўнага кантролю над сацыяльнымі працэсамі».

Гэткая пазіцыя сапраўды перспектыўная з гледзішча палітычнай прагматыкі: ступень свабоды, «веер магчымых выбараў» нейтралізуе бунтаўніцкія і раскольніцкія памкненні. (Магло б не быць столькіх крывавых сутычак міліцыі з дэманстрантамі, калі б ад пачатку быў абраны курс талерантнага абыходжання з апазіцыяй. Тое, што ўлады часта

называюць «экстрэмізмам», ёсць у значнай ступені спараджэннем аўтарытарна-рэпрэсіўнай этыкі сённяшняй палітыкі.) Канцэпцыя Яскевіч вартасная яшчэ і тым, што мае пад сабой акрэсленую антрапалогію. Яна грунтуецца на ідэях Марціна Гайдэгера, паводле якога чалавек – гэта «праект», пастаянная «магчымасць», адкрытая «мадальнасць»; чалавек «прасцірае і працягвае час». Адсюль бярэцца і філасофія ўлады: «Няздольнасць суб'екта ўлады забяспечыць згоду без выкарыстання фізічнага гвалту азначае, што ўлада не існуе, а ёсць толькі спроба ўчыніць ціск». Нічога дзіўнага, што шэраг старонак Яскевіч прысвячае «культуры выканання ўлады», а таксама энергічна дэмаскуе таталітарызм, паказваючы яго антычалавечы характар.

Вера Рыч, аналізуючы кнігу Я. Яскевіч (разам з выдадзенай у 2001 г. кнігай Альфрэда Майхровіча «Идеология: сущность, назначение, возможности»), выказвае меркаванне, што яна можа стацца «траянскім канём» сённяшняга рэжыму. Падаецца, усё ж, што няма сэнсу драматызаваць разыходжанні паміж «зададзеным» кірункам мыслення і кірункам мыслення многіх выканаўцаў. Кнігу Яскевіч (і іншых прыхільнікаў лібералізацыі) варта ўспрымаць не як траянскага каня, а як сімптом «афінізацыі» Спарты. Можна спадзявацца, што спартанска-кансерватыўны інтэлектуальны лагер будзе слабнуць, а чалавекалюбныя і мудралюбныя Афіны знойдуць шырокі распаўсюд. Такім чынам, запуск дзяржідэалогіі можа стацца прэтэкстам пашырэння рамкаў палітычнага дыскурсу і спрычыніцца да масавага ўсведамлення грамадскіх праблемаў і новых магчымасцяў.

4. Н. М. КАНАШЕВИЧ. ПОЛИТИКА. ИДЕОЛОГИЯ. МЕНТАЛИТЕТ: КУРС ЛЕКЦИЙ

Гэты падручнік (наклад 500 асобнікаў), так, як і папярэдні, цяжка назваць ідэалагічным. У ім выкладзены – коратка і зразумела – асноўныя веды з сацыяльнай філасофіі і паліталогіі, даволі многа ўвагі прысвечана псіхалогіі палітыкі і псіхааналітычнаму падыходу ў сацыяльных навуках, чаго бракавала ў папярэдніх падручніках. Рэфлексія аб ментальнасці беларусаў грунтуецца на сацыялагічных

даследаваннях, а ў ацэнцы глабальных і рэгіянальных працэсаў найноўшай гісторыі аўтарка абапіралася на У. Салаўёва, М. Бярдзяева, С. Франка, філасофская пазіцыя якіх вартасная спалучэннем высокай адухоўленасці з выдатнай навуковай кампетэнцыяй.

Кніга складаецца з сямі лекцыяў, якія прысвечаны палітычнай свядомасці, палітычнай ідэалогіі і псіхалогіі, а таксама тром ідэалогіям: кансерватызму, лібералізму і сацыялізму. Завяршае кнігу тэкст пад загалоўкам «Прыярытэты дзяржаўнай ідэалогіі», які пачынаецца са сцвярджэння, што ў Беларусі яшчэ не склаўся кансенсус што да базавых каштоўнасцяў грамадскага развіцця.

Навукова-эмпірычны аналіз, праведзены Канашэвіч, дазваляе ўсвядоміць складанасць і супярэчлівасць беларускага менталітэту. Тут выяўляецца багацце і драматычнасць, веліч і амбівалентныя нашай культуры. Яе рэканструкцыя пачынаецца ад сцвярджэння пастулату, якога трымаюцца Яскевіч, Екадумаў і шэраг іншых даследнікаў: абумоўленасць «*сумежжам*», цесным суіснаваннем з рознымі народнасцямі, канфесіямі і культурамі. Адсюль бярэцца *інтэрферэнцыя* нашай культуры, накладанне розных культурных пластоў, і *дыфузія культурных формаў*. Да гэтага даходзяць «*хвалі*», культурныя прылівы то з Захаду, то з Усходу. Апрача гэтых рысаў трэба браць пад увагу трайны субстрат беларускай культуры і ментальнасці: дахрысціянска-славянскі, хрысціянскі і заходне-рацыянальны. Хрысціянства ж, у сваю чаргу, традыцыйна прысутнічала ў пяці разгалінаваннях: праваслаўе, каталіцтва, уніяцтва, пратэстантызм і старавер'е (стараверы, пераследаваныя ў Расеі, знайшлі прытулак у «ліберальнай» Беларусі).

«Анатомію» палітычнай свядомасці сённяшняга беларускага грамадства Канашэвіч падае наступным чынам:

1. Свядомасць «савецка-сацыялістычная» – катэгорыя людзей, якія захавалі «ўнутраны камунізм» і імкнуцца «жыць пры сацыялізме пасля яго падзення». Гэтая свядомасць характэрна толькі 30 % насельніцтва, сярод якіх пераважаюць пенсіянеры і людзі з нізкай адукацыяй.

2. Свядомасць ліберальна-дэмакратычная[3] *і сацыял-дэмакратычная* – гэта катэгорыя пераважае: 45 % адносяць сябе да гэтых арыентацый, сярод якіх больш за ўсё прадстаўнікоў новага пакалення ўладнай эліты, студэнтаў і прадпрымальнікаў.

3. Няўстойлівая свядомасць – тыя, хто прывязаны да савецка-сацыялістычнай мінуўшчыны, але схільныя таксама падзяляць ўспрымаць свабоду, індывідуалізм і ідэйна-палітычны плюралізм.

4. Нацыянал-патрыёты, прыхільнікі народна-кансервацыўнай ідэалогіі. Часткова або цалкам гэтую арыентацыю прызнаюць каля 30 % (часта яны належаць адначасова і да іншых арыентацый нацыянал-лібералы, нацыянал-дэмакраты і г. д.).

5. Права- і леваэкстрэмісцкія рухі, якія маюць маргінальны характар.

Беларускае грамадства дыферэнцыяванае таксама паводле іншых прыкметаў: канфесійнай, моўнай, этнічнай, партыйнай, ідэалагічнай і іншай прыналежнасці. Гэта сведчыць пра тое, што формула нацыянальнай ідэі павінна быць адкрытай, а канцэпцыя нацыі – дастаткова шырокай, каб мог праходзіць натуральны працэс дыферэнцыяцыі і кансалідацыі. Адзіная перспектыўная версія кансалідацыі – гэта кансалідацыя шляхам дыялогу, а штучныя, адверхныя спосабы аб'яднаць грамадства шляхам увядзення дзяржаўнай ідэалогіі не маюць сэнсу.

[3] Каб пазбегнуць непаразуменняў, трэба адзначыць, што ў ліберальнай дэмакратыяй, пра якую гаворыцца ў культурным свеце, амаль нічога супольнага не маюць дэмагагічна-аўтарытарныя партыі Жырыноўскага і Гайдукевіча, хоць і называюцца «ліберальна-дэмакратычнымі».

5. А. П. БОРУШКО. О НАЦИОНАЛЬНОЙ ИДЕЕ: ОЧЕРК.
Барушкава эсэ адрасавана «прафесіяналам і экспертам», але паколькі я не з'яўляюся ані тым, ані тым, то хай даруе аўтар, што буду па-простаму, неглыбока і халодна рабіць агляд гэтай кніжкі. Барушка ў цэнтры ўвагі ставіць ідэю творчасці, ды і самі разважанні яго хіба аж занадта творчыя. Увесь час аўтар спасылаецца на загадкавую «постнармальную навуку», толькі цяжка сцеміць простаму чалавеку, якой метадалогіяй аперуе гэтая навука, чым яна займаецца і чаму не хоча быць «нармальнай». Цяжка зразумець, што значыць тут прэфікс

«пост-», але «пасля-», бадай, не значыць, бо Арыстоцель, які жыў пасля Платона, вызнаваў, паводле Барушкі, «нармальную» навуку, а Платон – постнармальную. Тады, можа, «пост-» азначае адмаўленне, такім чынам, «пост-нармальная» значыць «не-нармальная навука», і з гэтым можна цалкам згадзіцца, яна сапраўды ненармальная. Пад канец кнігі аўтар змясціў ксеракопію ўласнага ліста да прэзідэнта і экзарха, але з якой мэтай – невядома. Каб гэта быў ліст прэзідэнта або экзарха, скіраваны да аўтара, тады, можа, і цікава было б з ім азнаёміцца.

Калі ўважліва пачытаць, у тэксце можна знайсці невялікую частку «нармальнага» роздуму і значную частку «постнармальнага». Да нармальнага можна аднесці павучальную рэфлексію над цытатай з вершу Я. Купалы «А хто там ідзе?», над вобразамі з твораў В. Быкава і агляд ранняй гісторыі Полацкага княства. Яшчэ як нармальную можна прыняць арыгінальную інтэрпрэтацыю вобразаў Рагнеды і Еўфрасінні: праз першую хрысціянства прыйшло на беларускія землі (паводле Барушкі, яна натхніла Ўладзіміра на ўвядзенне гэтай рэлігіі), а праз другую – замацавалася. Такім чынам, кажа аўтар, ля вытокаў нашай хрысціянскай эпохі ляжыць жаночы пачатак. Такая інтэрпрэтацыя мае пэўныя падставы, таму беларускі фемінізм можа тут знайсці для сябе добрую крыніцу натхнення.

Але далей ужо дае пра сябе знаць «постнармальная навука». Барушка дзеліцца сваімі эзатэрычнымі ведамі наконт свядомасці і працэсаў мыслення князя Ўладзіміра. Высвятляецца, хрысціцель Русі быў такі праніклівы, што «мог прадугледзець з'яўленне ў будучым Тамаша Аквінскага, які жыў праз 200 год пасля яго». Уладзімір шляхам надзвычайнай інтраспекцыі бачыў усю каталіцкую дактрыну – і Падую, і Балонью, і Парыж – і ведаў, што каталіцкая філасофія стане арыстоцелеўскай і наблізіцца такім чынам да старазапаветнай этыкі. І калі Ўладзімір усё гэта прадугледзеў, ён вырашыў: наша вера будзе праваслаўнаю, дзе пануе Платон, Новы запавет, «со-весть, со-знание, со-вет, со-борность, со-чувствие, со-страдание...».

Увогуле, у разважаннях Барушкі надта шмат рэлігійнай тэматыкі, але як з гледзішча праваслаўнай, так і каталіцкай тэалогіі ўзнікае нямала засцярог. Не будзем аналізаваць усіх няясных месцаў у Барушкі, звернем увагу толькі на некаторыя. Па-першае, нельга так супрацьпастаўляць Стары запавет Новаму. Радыкальнае супрацьпастаўленне гэтых дзвюх частак Пісання ўласцівае было ерасі гностыкаў (II–III стст.), а для праваслаўных і каталікоў яны ўтвараюць адну арганічную крыніцу Божага аб'яўлення. Другая заўвага адносіцца да нязграбнай фармулёўкі тыпу: «Праваслаўе, якое сцвярджае (утверждающее) быццё Бога з чалавека (из человека)...». Такое выказванне надзвычай «слізкае», яно можа весці да пераканання, што існаванне Бога залежнае ад чалавека, што Бог – гэта прадукт нашых псіхічных працэсаў, які не мае рэальнага самастойнага існавання. Ясна, што ў такім поглядзе няма нічога агульнага ані з праваслаўнай, ані з каталіцкаю верай. Нават агностык К. Юнг, на якога Барушка любіць спасылацца, рабіў час ад часу зацемы, што архетып Бога, які ён апісвае як частку чалавечай псіхікі, нельга атаясамліваць з той пазапсіхічнай Істотай, якую немагчыма пазнаць і спасцігнуць эмпірычнымі метадамі. Па-трэцяе, варта пазбягаць супрацьпастаўлення «каталіцкая–праваслаўная вера» пры апісанні эпохі хрышчэння Русі, адбытага (афіцыйна) у 988 г. У тыя часы існавала рэлігійная і нават юрысдыкцыйная еднасць паміж лацінскім Захадам і візантыйскім Усходам. Фармальны раскол адбыўся ў 1054 г., а рэальны – пасля 1204 г., калі лаціннікі спустошылі Канстантынопаль, каб сілком навязаць еднасць на сваіх умовах. Таксама нярэдка можна сустрэць тэзіс, што праваслаўе, у адрозненне ад каталіцтва, найбольш захавала з таго, што было ўласціва першым хрысціянам. Мы, хрысціяне, можам да канца свету таўчы адзін аднаго і маніякальна даказваць, хто «праўдзівейшы», але так і не дойдзем да паразумення. Праўдзівыя хрысціяне – гэта тыя праваслаўныя, каталікі, пратэстанты, якія пераадолелі ўласную ганарыстасць і здзяйсняюць місію любові дзеля Хрыста.

Варта прывесці яшчэ адзін прыклад ужытку «постнармальнай навукі»: «У момант напісання гэтага радка ўстаноўлена, што пара максімальнай рызыкі памерам 9,8 млрд долараў надышла! Гэта значыць, што, калі б была ў нас нацыянальная

ідэя сёння, аб'ём УВП быў бы ў два разы (!) большы». Барушка апантана даводзіць, што наяўнасць і пашырэнне нацыянальнай ідэі (НІ) наўпрост перакладаецца на амерыканскія даляры: чым вышэйшая ступень «прышчэпкі НІ», тым большы УВП і тым болей грошай будзе мець у кішэні беларус! Усё гэта распісваецца мовай матэматыкі і даводзіцца пры дапамозе мудрагелістых раўнанняў. А праграма імгненнага ўзбагачэння краіны распісана аж да 2018 г. У 2018 г. імавернасць «прышчэпкі НІ» будзе роўная 1, а страта магчымасцяў роўная 0. У 2011–2013 гг., на жаль, імавернасць прысваення нацыянальнай ідэі толькі 0,8 і таму мы згубім «3,25 мільярдаў даляраў». Але цяжкія часы ўжо мінуліся: у 2001–2003 гг. мы гублялі аж 9,8 млрд даляраў, і гэта таму, што імавернасць прысваення нацыянальнай ідэі была 0.

Гэта можна палічыць прыватнай забавай, якая нікога не зацікавіць, хіба што аматараў эзатэрыкі і магіі. Шукаць філасофскі камень ці чарадзейную палачку беларусы не будуць, але варта зацеміць, што чарадзеі а-ля Барушка носяцца з адмысловай ідэяй – стварыць «*маральны эквівалент вайны*». Гэта сапраўды можа часткова ўдацца, бо ёсць многа людзей (і справа, і злева), якія мараць аб тым, каб быць апантанымі агульнай ідэяй, кінуцца ў вір ірацыянальнай стыхіі, актывізаваць свой дыянісійскі пачатак і перажыць эйфарыю, энтузіязм, экзальтацыю, стыхійнае групавое ўзрушэнне (менавіта гэтую стыхію, т. зв. «*furor germanicus*», – паводле псіхалагічнага аналізу Юнга і Фрома – выкарысталі фашысты ў Нямеччыне ў 1930-х гг.). Гэтаму мае служыць «маральны эквівалент вайны». Гэта яшчэ раз пацвярджае неабходнасць інтэлектуальнай мабілізацыі, каб знейтралізаваць аматараў усеагульнага ап'янення ірацыянальнай ідэяй.

6. А) А. Г. ЛУКАШЕНКО. ЗА СИЛЬНУЮ И ПРОЦВЕТАЮЩУЮ БЕЛАРУСЬ! (2001 Г.)

Б) ДОКЛАД ПРЕЗИДЕНТА А. Г. ЛУКАШЕНКО НА ПОСТОЯННО ДЕЙСТВУЮЩЕМ СЕМИНАРЕ РУКОВОДЯЩИХ РАБОТНИКОВ РЕСПУБЛИКАНСКИХ И МЕСТНЫХ ГОСУДАРСТВЕННЫХ ОРГАНОВ ПО ВОПРОСАМ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ

ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ (2003 Г.).

Гэтыя дзве прамовы прэзідэнта цытуюцца і рэкамендуюцца ў спісе літаратуры ва ўсіх падручніках ідэалогіі. Першы тэкст у значнай ступені прысвечаны эканоміцы, вонкавай палітыцы і справам бяспекі, а на заканчэнне Лукашэнка выказаўся пра прэзідэнцкія выбары, якія тады набліжаліся. Другі тэкст паводле задумы датычыць праблемы «цвёрдага ідэалагічнага падмурку».

Абедзве прамовы характарызуюцца высокай эмацыйнай насычанасцю, ёсць шмат маралізатарскіх уставак, інвектываў ды незразумелай іроніі пры адсутнасці аргументацыі. Найбольш апісальны характар мае «эканамічная частка» першай прамовы, астатнія носяць адно толькі мабілізацыйны характар. «Мы паднялі народ з каленяў» – менавіта ў гэткім праметэйскім ключы паказана эканамічная сітуацыя, а «эфектыўна супрацьстаяць агрэсіі» – гэта асноўны матыў фрагментаў пра вонкавую палітыку і бяспеку.

У дакладзе на семінары прэзідэнт падымае такія пытанні, як: што такое ідэалогія, у якой ступені мы прымаем камунізм, кансерватызм ды лібералізм і якое насамрэч нацыянальнае аблічча беларуса. Гэтую частку прэзідэнт называе «тэарэтычнай», але, відавочна, слова «тэорыя» ён разумее надзвычай свабодна, бо яна нічым не нагадвае рацыянальную рэфлексію. Лукашэнка перакананы, што кожная з трох вялікіх «ідэалогіяў»[4] – марксізм, кансерватызм і лібералізм – у нечым прымальная для беларусаў. Разгляд гэтых трох канцэпцыяў зводзіцца да некалькіх экспрэсіўных выказванняў, якія крайне дэфармуюць сутнасць кожнай з іх. Што да марксізму, аўтар дакладу кладзе націск на ленінскі марксізм, які ёсць бадай найвялікшай кампраметацыяй таго добрага, што можна знайсці ў Маркса. У ленінізме навуковы падыход заменены на ідэалагічны, а Марксава вера ў абмежаванне грамадскай ролі дзяржавы з перспектывай яе адмірання заменена Леніным на найгоршую версію дзяржаўнага ўсемагуцця – таталітарызм. Ленінізм, дапоўнены пазней сталінізмам, трэба залічыць да разраду дэструктыўнай рэлігійнай секты, якая здабыла

дзяржаўную ўладу.

Кансерватызм зведзены ў дакладзе да сцвярджэння яго роднасці з такімі беларускімі рысамі, як «памяркоўнасць» і «талерантнасць». Тым часам у беларускім кантэксце вельмі б асвоіць іншыя кансерватыўныя ідэалы, як падпарадкаванне дзяржавы маралі, павага да народнай самабытнасці, гісторыі, мовы, культуры і рэлігіі, адмова ад іх палітызацыі. Прэзентацыя лібералізму пачынаецца словамі: «Дамінуючай і выключна агрэсіўнай з'яўляецца сёння ідэалогія лібералізму». Насуперак рацыянальнаму парадку – спачатку *пазнаць*, а ёй *ацэньваць*, – тут адразу пачынаюцца злосныя экспрэсіі на адрас гэтай мысленчай плыні. Характарыстыка лібералізму дадзеная тут у карыкатурным выглядзе: «яскрава выражаны індывідуалізм, бездухоўнасць, гатоўнасць жыць у бездушнай пагоні за набыткам. Ды ўсё хапаць, і тое, што побач, і дзе далёка ляжыць. Адным словам, сацыяльны дарвінізм, калі моцны паглынае слабога і лічыцца, што так і трэба». Цікава, што было б даведацца: у якіх тэарэтыкаў лібералізму знаходзілася гэтыя «каштоўнасці»[5]?

Часта ўзнікае шмат непаразуменняў вакол ідэі лібералізму і індывідуалізму, многім ён асацыюецца з эгаізмам, а таксама ды этычным нігілізмам. Таму дзеля яснасці ўдакладнім, пра які індывідуалізм ідзе гаворка ў лібералізме: 1) *метадалагічны індывідуалізм*, які датычыць спосабу пазнання і апісання супольнасцяў: пазнанне супольнасцяў адбываецца праз пазнанне індывідаў, а не наадварот. Адсутнасць метадалагічнага індывідуалізму яскрава відаць у размовах Лукашэнкі з людзьмі: ён легітымуе сваю палітыку не волей *канкрэтных людзей*, а воляй *народу* – калектыўнага, ананімнага, безасабовага суб'екта; 2) *эканамічны індывідуалізм* – погляд, што чалавек лепш і больш прадуктыўна працуе на ўласнай гаспадарцы, чымся на калектыўнай (гэта ўласцівасць вельмі глыбока ўкарэнена ў прыроду чалавека, і міфы, дзе быццам бы калектыўную істоту беларуса не маюць сэнсу); 3) – *першаснасць асобы* перад усякага роду структурамі, інстытутамі і традыцыямі. Што да астатніх «каштоўнасцяў», тыпу «бездухоўнасці і хапання таго, што побач», – гэта напрыём або ўласціва ўсякім грамадствам: і кансерватыўным, і сацыялістычным, і ліберальным, з тым толькі адрозненнем, і нават інтэлектуальны

[4] Гэтыя ідэалогіі лепш было называць грамадскі-палітычнымі кампаніямі. Кожная з іх у сваёй сэнсе адной фундаменальная, і адкрытая, калі ж. Цікава тут ідэалогія.

[5] Гісторыя атамізмаў, і Гобса і Лока, якія сапраўды ацэнтуюць эгаізм і індывідаў, не могуць успрымацца ды падставы лібералізму. Зладзеныя сэнсу; 3) – інстытутамі метадалагічны прыём або нават інтэлектуальны

што ва ўмовах лібералізму дзякуючы прынцыпу галоснасці, эксперымент, можна адкрыта змагацца з недахопамі і прадухіляць іх, у той час як у кансерватыўных і сацыялістычных гэтыя недахопы маскуюцца і замоўчваюцца. А сацыяльны дарвінізм сутнасць прывілеяваная прыкмета аўтарытарных дзяржаваў, калі дзяржава з'яўляецца агрэсіўным манапалістам і не ствараць ніякай канкурэнцыі (прадпрымальнікі павінны баяцца, каб выпадкам не разбагацець).

Цікава, што вартымі прысваення прэзідэнт прызнаў якраз тыя рысы лібералізму, якія з'яўляюцца слабасцю гэтага кірунку: «Думаю, няма нічога благога ў жорсткай канкурэнцыі». Калі канкурэнцыя становіцца занадта жорсткай і несправядлівай, напрыклад моцныя прадпрымальнікі выцясняюць слабейшых і паўстаюць магутныя манаполіі, якраз тады неабходна ўмяшанне дзяржавы. Але ў канцы застаецца загадкай, ці можна беларусам любіць лібералізм, ці ўсё ж не, бо прэзідэнт кажа такія словы: «Думаю, гэтая ідэалогія найменш падыходзіць для беларусаў, і нават увогуле не падыходзіць».

Ва ўсёй прамове бачна таксама тэндэнцыя задаволіць і кансерватыўных камуністаў, і незалежніцкую частку беларусаў: узвялічваюцца моманты «яднання» з Расеяй, савецкі перыяд гісторыі пастаўлены па-над астатнімі перыядамі, але адначасна выражаецца пачуццё гонару, што «ў Вялікім Княстве Літоўскім афіцыйнаю мовай была беларуская», а Беларусь пасля распаду Саюзу нарэшце здабыла незалежнасць. (Лукашэнка ў гэтай прабеларускасці пасоўваецца аж задалёка: з навуковага гледзішча не зусім апраўдана называнне канцылярскай мовы ВКЛ беларускаю.) Народная метафізіка, такім чынам, не мае злітнай і адназначнай формы, што стварае шанец на існаванне разнастайных версій дзяржаўных ідэалогій, і гэта ў дадзенай сітуацыі паратунак для людзей, што думаюць самастойна. Тым не менш, разнявольвацца няма падставаў: прэзідэнт вельмі заклапочаны тым, «што дзеецца ў ВНУ» і нават у непасрэдна падначаленай яму Акадэміі Кіравання: «Калі не падзяляеш ідэяў, вызнаваных уладай і прэзідэнтам, не ідзі працаваць у дзяржаўную ВНУ. Чаго ты прыходзіш туды і балбочаш, вярзеш немавед што?».

Лукашэнка здзіўляецца, што ў іншых краінах «выкладчыкам нават да галавы не прыйдзе крытыкаваць дзяржаўную ўладу ды нацкоўваць на яе АБСЕ». Магчыма, ён дрэнна паінфармаваны, бо крытыка дзяржаўнай улады інтэлектуаламі ды навукоўцамі – заўсёды на парадку дня ў дэмакратычных краінах. У Польшчы, прыкладам, многія выкладчыкі ВНУ і на лекцыях, і на канферэнцыях адкрыта крытыкавалі ідэю ўваходжання Польшчы ў Еўразвяз, хоць гэта была асноўная лінія вонкавапалітычнай ідэалогіі ўраду, прэзідэнта і бальшыні парламенту. Нядаўна некалькі дзесяткаў аўтарытэтных навукоўцаў выступілі з крытыкай прапарцыйнай выбарчай сістэмы ў Польшчы. У адказ на гэта Кваснеўскі не папрасіў іх пакінуць ВНУ і не пачаў перадражніваць «вярзеш немавед што», а склікаў экспертную групу, каб сур'ёзна абмеркаваць іх заўвагі. Гэта праўда, што крытыка ў заходніх краінах мае зазвычай частковы характар і спалучаецца з прынцыповай лаяльнасцю ў дачыненні да дзяржаўнай улады (*respective dissent*). Але гэта таму, што дзяржаўныя дзеячы шануюць культуру плюралізму і не ўжываюць рэпрэсіяў супраць тых, хто іх крытыкуе. Дзяржава, якая шануе крытыку сваіх апанентаў і велікадушна ставіцца да меншасцяў, натуральным чынам здабывае аўтарытэт і павагу.

***

Дзяржаўнай ідэалогіі ўласцівы ліхаманкавы пошук «нацыянальнай ідэі» ды «цвёрдага апірышча». Для адных гэта палітыка, для другіх – псіхалагічная патрэба, а для трэціх – экзістэнцыяльны выклік. Каб абгрунтаваць неабходнасць і непазбежнасць ідэалогіі, пачалася маніпуляцыя пэўнымі паняткамі, многія ідэолагі перасталі адрозніваць ідэалогію ад светапогляду, ад рэлігіі, іерархіі каштоўнасцяў, навукі, навуковай установы, грамадска-палітычнай канцэпцыі, дыскурсу – для іх усё гэта ідэалогія, а ўсе людзі нараджаюцца і паміраюць ідэолагамі. Выходзіць, што кожны, хто думае, – ідэолаг.

Беларуская ідэалогія маскуе адсутнасць нацыянальнай, метапалітычнай ідэі. Тое, што прапануецца дзяржаўнымі

ідэолагамі, зазвычай спавядае толькі частка насельніцтва Беларусі. Цяперашняя версія «ідэі» найбольш адпавядае расейскамоўным людзям з крэольска-спартанскай ментальнасцю, якія пераважна абыякавыя да беларускай культуры. Афірмацыя беларускасці, нярэдка дэкларараваная ідэолагамі, не мае тут асаблівага значэння, кожны разумее, што гэта зроблена дзеля «адчапнога». Каб было больш парадаксальна, поруч з ігнараваннем беларускай культуры ідзе містыфікацыя беларускага народу як крыніцы палітычнай улады і легітымізацыі канкрэтных дзеянняў, у тым ліку і пераследу палітычных апанентаў. Многія непрывабныя і заганныя бакі сучаснай палітыкі лёгка апраўдваюцца ідэалагемамі тыпу: «*народ* адназначна выказаўся… *народ* пацвердзіў правільнасць курсу… *народ* даверыў… *народ* чарговы раз аказаўся мудры…». Народаўладдзе, безумоўна, павінна іграць асноўную ролю ў працэсе прыняцця рашэнняў, але рашэнні народу могуць паддавацца крытыцы, а часам нават асуджацца (варта згадаць смерці Хрыста і Сакрата, якія ў абодвух выпадках былі «святой воляй народу»). Далёка не заўсёды «народ» можа быць крыніцай каштоўнасцяў.

Беларуская ідэалогія выклікае і трывогу, і пэўнае спадзяванне. З аднаго боку, яна можа спрычыніцца да ўзмацнення «раскольніцтва». Калі ідэолагі сапраўды зацікаўленыя ў кансалідацыі народу, то няхай сур'ёзна пачытаюць расейскіх філосафаў пачатку XX ст. – Бярдзяева, Булгакава, Ізгоева, Струве і інш., – якія ў «Вехах» і «Из глубины» даюць дыягностыку перадрэвалюцыйнай ментальнасці расейцаў, задумваюцца над прычынамі крывавай рэвалюцыі 1905 г. Менавіта рэпрэсіўная тактыка дзяржавы вядзе да фармавання «падпольніцкай» ментальнасці і генеруе рэвалюцыйныя настроі. Палітычны плюралізм і прынцып першынства асобы – гэта не капрыз Захаду, а неабходнасць для мірнага існавання і развіцця якіх-кольвечы грамадстваў.

Але магчымы і іншы зыход. Беларуская ідэалогія ніколі не зможа стаць маналітам, ёй, калі яна будзе існаваць, наканавана быць кампраміснай і эклектычнай, а гэта значыць, што кантроль над мысленнем і грамадска-палітычнымі дыскурсамі будзе абцяжараны. Большасць выкладчыкаў, праўдападобна,

выкарыстаюць гэтую неакрэсленасць ідэалогіі, каб развіваць вартасныя ідэі і павышаць палітычную культуру студэнтаў. І нават, як ужо падкрэслівалася, гэтая неакрэсленасць можа стацца прэтэкстам пашырэння палітычнага дыскурсу, узняцця пытанняў, якія раней не падымаліся. А калі студэнты зацікавяцца некаторымі працамі, рэкамендаванымі ў спісе літаратуры ідэалагічных падручнікаў, напрыклад Юнгавай псіхалогіяй палітыкі, Попэравай канцэпцыяй адкрытага грамадства, лібералізмам Хаека, то можна лічыць, што «афінізацыя Спарты» непазбежная.

Калі інтэлігенцыя і навукоўцы здадуцца, то першае, што пацерпіць, – гэта Праўда. Ідэалогія пачне ўстанаўліваць рэчаіснасць згодна з гегельянскім выслоўем: калі факты пярэчаць тэорыі, тым горш для фактаў. Другое, што пацерпіць, – гэта Свабода. Дзяржідэалогія накіравана на тое, каб пэўная цэльнасць – дзяржава-народ – паглынула чалавечую індывідуальнасць, абвяшчаючы сябе «вышэйшым», «праўдзівым Я» (адаптацыя думкі І. Берліна). Трэцяе, што пацерпіць, – гэта Сумленне. Нават некаторыя людзі «старога гарту» без настальгіі згадваюць пра панаванне савецкай ідэалогіі, кажучы, што яна гадавала канфармістаў і прыстасаванцаў, пазбаўленых якіх-кольвечы ідэяў і маральных прынцыпаў. Ну, і пацерпіць «цярплівы» Народ, бо ягоная дзяржава, апантаная змаганнем з апазіцыяй, не заўважае, што сама сталася апазіцыяй Еўропы, прычым далёка «неканструктыўнай» апазіцыяй, няздольнай да дыялогу і супрацоўніцтва.

Варшава, 8 жніўня 2004 г.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (34) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10

[image]

Мінарыя (9’2000)

[image]

A R C H E

[image]

[image]

крытыка [image]2004

"да Зыкасту"

[image] [image]

еларускі ідэалагічны праект, распачаты ў 2003 годзе, выклікаў гучную рэакцыю і занепакоенасць у інтэлектуальных колах ды незалежнай прэсе. Шмат кімітой праект быў успрыняты як маніпуляцыі ў лапы канчатковага падпарадкавання свядомасці беларусаў і як чарговы крок у таталітарызацыі беларускага палітычнага рэжыму.

П а ч а т а к

№ 5 (34) - 2004

[image]

Пачатак Навіны Форум

Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

Андрэй Ягораў

Жабрацтва ідэалогіі

Выданні, якія можна рэзюмаваць у пакуле:

АНДРЭЙ ЯГОРАЎ

палітоляг, сябар рэдакцыі незарэгістраванага часопісу «Палітычная сфера».

Михеев В. М. *Идеология: рациональная и неводы*. Минск: ОДО «Тонпик», 2004.

Основы идеологии белорусского государства: Учеб.-метод. пособие / В.В. Шинкарев, В.А. Вартанова, В.А. Зенченко и др.; под. ред. В.В. Шинкарева. Минск: БГПУ, 2004.

БЯССУТНАСЦЬ ПРАЕКТУ

Між тым, на сёння мы можам канстатаваць бяссутнасць і фармальнасць ідэалагічнага праекту: ёсць ідэолагі – няма ідэалогіі. Прынамсі, чагосьці новага, чаго не ведалі раней, ад ідэалогіі беларускай дзяржавы дачакацца не пашчасціла. Ідэалагічныя «фішкі», натуральна, ужо існавалі ды проста былі замацаваныя прэзідэнтам у колькіх прамовах. Праца астатняй ідэалагічнай «машыны» звялася да тыражавання словаў прэзідэнта з дадаткамі лікбезу па сацыяльна-гуманітарных навуках. Натуральна і тое, што інакш і быць не магло. Як

«апалагетыка» функцыянаваў у савецкія часы навуковы камунізм, мэтай якога было – даводзіць «слушнасць» палітычнага курсу краіны на шляху да абавязкова светлай будучыні. На гэтае ж, паводле логікі, скіраваны і «наш» ідэалагічны праект. Але ідэалогія беларускай дзяржавы не мае моцнага тэарэтычнага грунту марксізму-ленінізму, зыходзячы з якога можна было абгрунтаваць пастфактум правільнасць таго ці іншага рашэння. У выніку гэта прыводзіць не да рацыянальнага апраўдання праз наяўную ідэалогію, а да паўтарэння – на манер будыйскай мантры – нейкай цытаты з «першакрыніцы».

Адсутнасць завершанай ідэалогіі як такой канстатуюць і самі ідэолагі. Возьмем некалькі апошніх тэматычных выданняў. Адзін з творцаў ідэалагічнага праекту (паводле асабістага прызнання, «*автор был в гуще событий, когда готовилось известное (март 2003 г.) этапное занятие по идеологии постоянно действующего семинара руководящих работников республики*» і «*не все материалы вошли в официальные документы семинара, часть осталась за кадром*») Валерый Міхееў у кнізе «Ідэалогія: развагі і высновы» ў дачыненні да ідэалогіі беларускай дзяржавы нярэдка выкарыстоўвае мадальныя дзеясловы або будучы час, як да незавершанага праекту: «*идеология должна быть…*», «*платформой государственной идеологии … должны стать…*», «*нужна новая, понятная людям современная идеология, которая будет воспринята и поддержана не только верхами государства, но и всей нацией*». А вось падручнік па асновах ідэалогіі для БДПУ імя Максіма Танка пад рэдакцыяй Васіля Шынкарова: «*концепция идеологии и дальнейшего развития белорусской государственности зарождается*», «*мы переживаем скорее фазу теоретической и практической неопределенности*». Усё гэта сведчыць пра праблемнасць рэальнага напаўнення ідэалогіі ўласна ідэямі.

Пошук тэарэтычнага грунту, аднак, ідзе, і гэтым цікавая вышэйзгаданая кніга Міхеева. Аўтар шукае нейкія падваліны для беларускай ідэалогіі ў крыніцах расійскага паходжання. Беларусі прысвечана толькі апошняя частка развагаў. У першых жа дзвюх трацінах кнігі аўтар разглядае пераважна праблематыку «обустройства России» і «русской идеи» ў творах розных расійскіх інтэлектуалаў ад Гогаля да Салжаніцына.

Цывілізацыйны падыход (аўтар – спецыяліст па філасофіі гісторыі Данілеўскага), які дазваляе аб'ядноўваць першае з другім, дапаўняецца і высокай легітымацыяй: «*России и Беларуси… самим Господом Богом суждено не жить друг без друга… У нас с Россией общее информационное и духовное пространство, общая история и общее будущее на пути независимого суверенного развития… Те социальные процессы, которые овладевали Россией, хотим мы того или нет, в той или иной степени затрагивали и затрагивают Беларусь*».
Беларуская культура ставіцца ў агульны культурны кантэкст расійскай цывілізацыі. Адсюль і само прачытанне беларускай культуры і гісторыі: «*У белорусского народа было и остается одно стремление – жить в мире с соседями, занимать «свой пачэсны пасад між народамі». «У нас были и есть свои пророки и просветители: Евфросинья Полоцкая, Франциск Скорина, Янка Купала, Якуб Колас, Владимир Короткевич, Иван Шамякин…*».
Звернем увагу на выбар прозвішчаў прапанаваных «культурных герояў» – па-першае, незаўважным застаецца значны перыяд ад Скарыны да Коласа, а па-другое, сэнсавая (і ідэалагічная) накіраванасць значна зменіцца, калі мы дадамо да гэтага спісу імёны, напрыклад Каліноўскага і Быкава.
Увогуле тэндэнцыя прыпісвання беларускай культуры да культуры расійскай дастаткова пашыраная сярод тых, хто атрымаў вышэйшую гуманітарную адукацыю ў савецкія часы. Просты недахоп ведаў пра сваю гісторыю і краіну, прыніжаны статус мовы, а ў выніку – і сваёй этнічнай групы штурхаў да ідэнтыфікацыі з больш прэстыжнай культурнай групай, якою найчасцей была расійская. Развагі пра «вялікую расійскую культуру» і агульную «славянскую цывілізацыю» – не што іншае, як спроба рацыяналізацыі бессвядомых псіхалагічных уцёкаў ад уласнай этнічнасці, дзе асобе было няўтульна. «Павяртанне» назад, да сваёй групы, праблемнае, бо звязана з псіхалагічным бар'ерам. Адсюль і ірацыянальны жах нацыяналізму: мяне прымусяць стаць тым, кім я ўжо адмовіўся быць. Хаця на рацыянальным узроўні можна выказваць тыя ж нацыяналістычныя ідэі, праўда, праз «прышчэпку» да іншага *азначальніка*, напрыклад «патрыятызму».
Цэласнай, лагічна звязанай і зразумелай ідэалагічнай карціны ў «развагах і вывадах» Міхеева не відаць. Пакуль што ідэалогія беларускай дзяржавы – разнародны набор абстрактных і часам

супярэчлівых ідэяў. Асноўныя тэарэтычныя ўстаноўкі, якія, на думку аўтара, трэба пакласці ў аснову ідэалогіі, пазбаўлены канкрэтнага зместу. Большасць такіх тэзісаў настолькі ідэалагічна нейтральныя, што іх можна знайсці ў праграмах апазіцыйных партыяў. Незалежная дзяржава, сацыяльна арыентаваная рынкавая эканоміка, эфектыўнае дзяржаўнае кіраванне ў інтарэсах кожнага грамадзяніна – пад такімі словамі сапраўды можа падпісацца большасць насельніцтва. Дарэчы, з пункту гледжання ідэолагаў, толькі такія ідэі і павінны складаць ідэалогію беларускай дзяржавы, а легітымізаваць адну са складовых частак новай сучаснай ідэалогіі – «Статут маральнасці грамадзяніна» – прапануюць (на поўным сур'ёзе) праз «усенародную раду».
У падручніку па асновах ідэалогіі пад рэдакцыяй Шынкарова збольшага мы бачым тое самае, што і ў кнізе Міхеева: канстатацыя агульнапрызнаных ідэяў дэмакратыі, правоў чалавека, неабходнасці пабудовы моцнай і незалежнай дзяржавы. Тая ж банальная гістарыяграфія: раней былі нацыяналісты ды іншыя злыдні, якія хацелі прадаць нас Захаду, прыйшоў Лукашэнка – і стала ўсё добра. Ідэалагічна-ідыятычны дыскурс паляпшэння сацыяльна-эканамічных умоваў жыцця, забеспячэння правоў чалавека, высокай дэмакратычнасці пры ўмове адваротнай рэпрэзентацыі гэтых рэчаў у масавай свядомасці (паводле апытанняў незалежных сацыялагічных цэнтраў) увогуле нагадвае дыялог з наркаманам: «Вось ты сусліка бачыш?» – «Не». – «А ён ёсць!»
Калі ў некалькіх словах падвесці агульны вынік, то выйдзе наступнае: ідэалогіі беларускай дзяржавы як пэўнай закончанай, цэласнай і несупярэчлівай сістэмы ідэяў не існуе, на сёння маецца толькі аморфная сукупнасць ідэалагемаў – каркас ідэалогіі, з агульнай тэндэнцыяй канстатавання пазітыўнасці сацыяльна-палітычнага жыцця ў Беларусі і правільнасці дзяржаўнай палітыкі.

ФАРМАЛЬНАСЦЬ ІДЭАЛОГІІ

Звычайны марксісцкі аналіз ідэалогіі інтэрпрэтуе яе як скажоную свядомасць і супрацьпастаўляе ёй наяўнасць нейкай аб'ектыўнай рэчаіснасці, праз апеляцыю да якой можна давесці лжывасць ідэалагічных цверджанняў. Постмарксізм засяродзіў

увагу на функцыянаванні ідэалогіі ў сацыяльнай рэчаіснасці, на пытанні неабходнасці ідэалагічнага скажэння для ўстойлівасці гэтай рэчаіснасці. Пры гэтым патрабуецца наяўнасць веры суб'ектаў у праўдзівасць ідэалагічных пастулатаў і фармаванне паводзінаў у адпаведнасці з патрабаваннямі ідэалогіі. Аднак у сучасным свеце функцыянаванне ідэалогіі адбываецца інакш.

У кнізе «Ўзвышаны аб'ект ідэалогіі» Славой Жыжак, следам за Петэрам Слатэрдайкам, апісвае феномен «цынічнага розуму». Сутнасць яго палягае ў тым, што цынічны розум не апантаны ідэалогіяй, ён не наіўна падпарадкоўваецца ідэалагічным патрабаванням – наадварот, цынічны розум ведае пра лжывасць ідэалагічных універсаліяў, аб прыватных інтарэсах, што стаяць за імі, але не адмаўляецца ад гэтых універсаліяў. Цынічны розум – дамінанта пры стварэнні ідэалогіі беларускай дзяржавы: «нават яе стваральнікамі больш не *маецца на ўвазе*, што яна будзе ўспрымацца сур'ёзна, яна набывае маніпулятыўны, абсалютна вонкавы і інструментальны статус, яна кіруецца не каштоўнасцю ісціны, а звычайным пазаідэалагічным гвалтам ці *абяцаннем нажывы*».

Як некалі іранічна заўважыў метадолаг Уладзімір Мацкевіч, асноўная апора рэжыму – простыя настаўнікі, якія, седзячы ў выбарчых камісіях, шораз стабільна фальсіфікуюць вынікі выбараў. Ці можна сцвярджаць, што яны робяць гэта праз веру ў ідэалогію? Зразумела, не. Яны кіруюцца страхам матэрыяльнага пакарання, звальнення і г. д. і таму выконваюць патрабаванне ўлады. Ці кіруецца ідэалагічнымі меркаваннямі той, хто аддае загад «зверху»? Таксама не! Яго матыў – альбо жаданне атрымаць грошы за выкананы план, альбо тыя ж страхі. І які б сегмент грамадства мы ні разгледзелі, мы не знойдзем ідэалагічнай веры як значнага сацыяльнага фактару, бо ідэалогія беларускай дзяржавы не патрабуе сур'ёзнага альбо літаральнага стаўлення да сябе.

Інстытуалізацыя ідэалогіі як наяўнага праекту нічога не змяняе ў логіцы функцыянавання рэжыму. Артыкуляванасць яе ў вонкавых крыніцах (сістэме адукацыі, сярод ідэалагічных работнікаў) вялікага значэння не мае. Ідэалагічная рэальнасць так ці інакш функцыянуе на больш глыбокім узроўні, на ўзроўні таго, што Жыжак назваў ідэалагічным фантазмам. Мы можам асэнсоўваць рэальны стан рэчаў, але працягваць

дзейнічаць, нібыта не разумеючы гэтага. Сацыяльная рэальнасць падтрымліваецца «пэўным *нібыта* («Мы паводзім сябе так, нібыта верым ва ўсёмагутнасць бюракратыі, нібыта прэзідэнт увасабляе волю народу…») Як толькі выяўляецца, што гэтая вера страчаная, – распадаецца сама тэкстура сацыяльнага поля». Логіка работы фантазму – гэта логіка трансферту.

Пазаідэалагічны прымус, фармальна не легітымізаваны ў вонкавых ідэалагічных крыніцах, надаваў неабходнасць самастойна фармуляваць «логіку» і «новую маральнасць» траўматычнага і бязглуздага закону ці загаду ўлады. Для ўлады няма патрэбы абгрунтоўваць свой загад, бо яна мае на гэта неад'емнае «права». Падпарадкаваныя самі надаюць сэнс загаду, пераадрасоўваючы праз трансферт сваю логіку Іншаму, які пачынае верыць (і ведаць) за іх. Фармальная (вонкава выяўленая) ідэалагічная апалагетыка можа не супадаць з самасфармуляваным трансфертным тлумачэннем, чым будзе падрываць ужо складзеную сістэму сацыяльных адносінаў. На вонкавым узроўні ўсё гэта можа мець рэакцыю поўнага адчужэння ўсіх ідэалагічна-выхаваўчых захадаў: я магу рабіць тое, што хочаш, але я не магу верыць так, як ты хочаш. Поўная ідэнтыфікацыя з ідэалагічнай «ілюзіяй» – просты шлях да вар'яцтва.

Цікава, што сістэма ідэалагічнай адукацыі насамрэч дае інструмент для выпрацоўкі крытычнага стаўлення да ідэалогіі беларускай дзяржавы. Ускрываючы механізмы функцыянавання ідэалогіі – няхай сабе й на павярхоўным узроўні, – гэткая адукацыя зніжае яе маніпуляцыйны статус, робіць яе яшчэ больш вонкавай і фармальнай. Крытыка ідэалагічных пазіцыяў «ворагаў» дазваляе развярнуць «зброю» і ў адваротным кірунку. А акцэнтаванне асаблівай ролі і значэння «адзінай моладзевай арганізацыі» раўназначнае вывешванню шыльдачкі «Стоп: прамыўка мазгоў» на дзвярах БРСМ.

Фармальны статус ідэалогіі і ідэалагічнай працы яскрава быў відаць на апошніх парламенцкіх выбарах і рэферэндуме, дзе кампанія вялася не на «ідэалагічным фронце», а за простай маніпуляцыйнай схемай навязвання нібыта адзіна магчымага «за».

І зноў звернемся да рэцэнзаваных выданняў:

Глубокий анализ, обобщение результатов многочисленных

социологических исследований и многолетних наблюдений позволяют сделать вывод, что значительная часть белорусов не всегда отождествляет себя с государством. Государственная власть для большинства их как бы внешняя, а не внутренняя потребность. Государство для них – это «они». Белорусы слабо еще воспринимают тезис, что государство – это мы» (Шынкароў, с. 124–125).

Моцна сказана і правільна. Толькі яшчэ трэба дадаць, што тым больш беларусы не ставяцца да ідэалогіі беларускай дзяржавы як да сваёй уласнай.

[image]

[image]

Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

Мінулыя (1’2000)

[image]
ARCHE

[image]

[image]
Бібліятэка [image]2004
Падпіска

Пачатак № 5 (34) - 2004
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
Дзень Незалежнасці
Дзень Перамогі
Дзень Волі
Дзень Канстытуцыі
Дзень Свабоды
Дзень Рэспублікі
Дзень Беларусі
Дзень Свабоды Амерыкі
Дзень Незалежнасці
Дзень Волі
Дзень Перамогі
Дзень Канстытуцыі

гэтыя словы
нагадваюць
больш –
сінонімы ці
амонімы.

Кнігі, выдадзеныя для нас амерыканцамі, вядома ж, абараняюць першы, універсалісцкі тэзіс. Айчынная ідэалагічная літаратура, якая даволі шырока асвятляецца ў «ARCHE», старанна гуртуе доказы процілеглага. Але незалежна ад высілкаў беларускага ідэалагічнага генштабу амерыканскія выданні пакідаюць у душы сумненні ў амерыка-беларускай аўтэнтычнасці, і гэта наўрад ці заслугоўвае дакору: змест падобных сумненняў амаль што картэзіянскі: сумняемся – значыць, існуем. Зашыфраваны пратэст супраць наступу на нашу беларускую ўнікальную ідэнтычнасць.
Але чарговы доказ існавання беларусаў – справа пабочная. Разгляданыя кніжкі займаюцца не пытаннем, ці існуюць беларусы, а тым, *як* яны існуюць.
Радыё «Свабода» выдала аж тры тэматычныя зборнікі перадачаў, паклаўшы, так бы мовіць, галасы на паперу. У выніку адбылася непазбежная метамарфоза: тэксты, першапачаткова прызначаныя для аднаразовага гучання, аператыўнага водгуку на бягучыя падзеі, зрабіліся раздзеламі кніг, сюжэтным стрыжнем якіх па-ранейшаму застаецца каляндар, а змест – гэтак, як і раней, – вычэрпваецца зместам добра знаёмых сталым слухачам тэкстаў-перадачаў. Самае складанае, калі гартаеш гэтыя шматстаронкавыя тамы, – зразумець, што тут дадалося, дзеля чаго яны паўсталі і што, акрамя ўяўлення пра фінансавыя магчымасці адпаведнай установы, можна атрымаць з гэтых кніжак.

ЧАСТКА 1.
УСВЕДАМЛЕННЕ НЕАБХОДНАСЦІ

Стракаціць у
назвах слова
свабода, і
памяць
паслужліва
падсоўвае

адпаведную цытату. Калі згадаць усвядомленую неабходнасць, дык неабходнасць з’яўлення разгляданых кніжак усведамляецца як даволі нязначная. Чытанне іх мае даволі аддаленае дачыненне да інтуітыўнага і спрошчанага, але такога мілага кожнаму разумення свабоды: раблю тое, што хачу, а чаго не жадаю – не раблю. Але падчас гэтага нямілага занятку адчуваеш пэўны зрух у свядомасці, і тычыцца ён якраз-такі

згаданага
кананічнага
азначэння.

Свабода ў выглядзе ўсвядомленай неабходнасці падаецца хутчэй сінонімам непазбежнасці, чымся волі. Людзі свабодна ідуць на суботнік, свабодна падпісваюць нявыгадныя ім працоўныя кантракты, свабодна купляюць бясконцыя латарэйкі – будзённыя прыклады ўсвядомленай неабходнасці з жыцця звычайнага дзяржаўнага прадпрыемства.

У кнігах радыё «Свабода» гаворыцца пра іншае. Можна не пісаць вершаў, не дасылаць іх на конкурс, не змагацца за Курапаты, можна (чаму б не?) застацца беларускім савецкім пісьменнікам, лаўрэатам Ленінскай прэміі і г. д. або не мяшацца ў палітыку, спаслаўшыся на ўзрост... У кожным выпадку неабходна рабіць выбар. Калі паўтары тысячы старонак, аплачаныя амерыканскімі падаткаплатнікамі, чаму-небудзь вучаць, дык гэта таму, што свабода там, дзе ў чалавека ёсць выбар. Чым больш людзей заўважаюць і ўсведамляюць наяўнасць альтэрнатывы абранаму імі шляху жыцця, тым больш у грамадстве свабоды. Чым больш у іхніх мазгах усвядомленай неабходнасці – тым свабоды менш.

Адзіная рэч, у існаванні якой немагчыма ўсумніцца, кажуць філосафы, ёсць сумненне. Сумненне ж утрымлівае ўсведамленне альтэрнатывы, выбару – і, адпаведна, неабходнасці яго зрабіць.

Шмат якія творы з разгляданых кніг варта аднесці да прыкладаў не зусім удалага выбару, калі магчымасць, скажам, падаць свой верш на конкурс разглядалася аўтарам хутчэй як голас неабходнасці. Матывы самапрымусу можна знайсці і ў публіцыстычных тэкстах Быкава, найперш у ягоных інтэрвію. Гэтыя ўчынкі, хай сабе шляхетныя, да свабоды могуць мець адно ўскоснае дачыненне. Але як навучыцца *жыць без прымусу*? Наўрад ці вычарпальны адказ на гэтае пытанне змесціцца і на пятнаццаці тысячах старонак, тым не менш адзін варыянт адказу на падставе збору вершаваных практыкаванняў на тэму «свабода», публіцыстыкі Быкава ды хронікі змагання за Курапаты ёсць: разглядаць магчымыя варыянты і *рабіць свой выбар*. *Right or wrong, my choice* нашмат лепей за *right or wrong, my fuehrer*.

Тэксты падносяць гэтую навуку не столькі праз свой змест, колькі праз факт з'яўлення ў канкрэтна гэткім выглядзе і акалічнасцях. Скандэнсаваны выбар шматлікіх людзей з немалога шэрагу альтэрнатыў спрычыніўся да таго, каб яны сабраліся разам ды пабачылі свет у «бібліятэцы свабоды», трапілі ў Беларусь. Сустрэліся беларускі і амерыканскі спосаб светабачання, кнігі зафіксавалі іх сумяшчэнне ў часе і прасторы.

Гаварыць пра нейкае ўзаемадзеянне менталітэтаў можна – што ў прынцыпах складання анталогіі «вершу на свабоду», што ў заходніх стандартах журналістыкі, адбітых у матэрыялах карэспандэнтаў RL пра Быкава і Курапаты. (Падзейны складнік амаль суцэльна беларускі.) Казаць пра прыкметы нейкага сінтэзу – можна наўрад ці.

Падаецца, нават выдадзены па-ангельску «Верш на Свабоду» павінен пакінуць у заходняга чытача гэткае ж адчуванне не зусім свайго, якое засталося ў мяне (здавалася б, і слова чужога няма, але выразны *след дотыку чужой рукі*). Аналіз гэтых слядоў можа быць надта цяжкай і мітрэнжнай справай, але гэта спосаб ацаніць выданні паводле інтэнцыяў выдаўцоў. Паводле іхняга выбару. Асноўны мэсідж чытаецца добра: заўсёды выбірай сам. Застаецца, што праўда, без адказу пытанне, ці не выбера чытач іншую кнігу. Давер (ці абыякавасць) да гэтага – чыста па-амерыканску. А як па-беларуску?..

ЧАСТКА 2.
НАША
СВАБОДА

Басяцкі зразумеў. Што ўсё скончана. Толькі не ўтрымаўся, каб не буркнуць:

— Свабода... Свабода... Кожны раз, як вы яе клікнеце – яна падымае галаву. Не торгайце вы яе. Яна харошая баба. Дайце вы ёй год сто паспаць спакойна, а там хаця канец свету – няхай устае.

— Яна харошая баба, – сказаў Хрыстос. – Наша баба. А паколькі яна наша баба – не твая, мніх, справа, у які час ночы нам яе будзіць.

У. Караткевіч. Хрыстос прызямліўся ў Гародні

«Дзеянне» ў разгляданай «трылогіі» разгортваецца дакладна паводле Караткевіча: Васіль Быкаў тлумачыць, чаму нам не досыць свабоды, хлопцы ў Курапатах супрацьстаяць намаганням паслядоўнікаў Басяцкага ўтрымаць свабоду ў стане спячкі, паэтычнымі сродкамі развіваецца ідэя Юрася Братчыка пра тое, што як свабода – наша баба, то можам вырабляць з ёю што заўгодна, дзе заўгодна і калі заўгодна.

Васіль Быкаў паўстае ў разгляданым выданні як свабодалюбца з грамадства з наймагутнейшай традыцыяй несвабоды. Пазіцыя свабодалюбцы ў гэткіх умовах паўсюль і ўсюды – ідэалістычна-спрошчаная: свабода нясе дабро, несвабода ўвасабляе зло. Васіль Быкаў выступае апосталам гэтай праўды. Асаблівасць ягонай пазіцыі ў тым, што ён не спадзяецца на (хуткі) поспех сваёй місіі і стрымана, каб не сказаць безнадзейна, глядзіць на перспектыву свайго служэння. У ягоных словах шмат дзе гучыць Галілеева **e pur si muove**. Гэткае адданае служэнне ісціне свабоды дзеля самое ісціны выклікае не меншы водгук у душах, чымся апантанае перакананне ў хуткай перамозе. Адсутнасць паспешлівых прароцтваў уцяляснення ідэалу робіць больш пераканаўчым галоўны тэзіс: magna est veritas et praevalebit.

Эпічны маштаб задаецца самой фігурай Быкава, падкрэсліваецца тым, што кніга змяшчае выступы апошніх гадоў, месяцаў, дзён ягонага жыцця. Яму не супярэчаць і падзеі, якія стваралі нагоду для выказванняў пісьменніка. У выніку кніга атрымалася нязмушана цэльнай і пакідае ўражанне не столькі хронікі, колькі гутаркі з цікавым суразмоўцам.

Гісторыя пра змаганне з наступам на Курапаты выглядае жывым пацвярджэннем найчарнейшых прароцтваў з быкаўскай публіцыстыкі. З іншага боку, гэтае не зусім паспяховае служэнне ісціне пераконвае ў трывушчасці не толькі цёмнага боку (абаронцаў несвабоды), але і светлага. Нягледзячы на знешнюю непрэзентабельнасць апошняга, яго хочацца назваць рыцарскім бокам, хай сабе нават з адценнем донкіхоцтва. Істотна, што валанцёры – абаронцы Курапатаў ад будаўнічага вандальства – выступаюць публічна, а іхнія супараты прыкрываюцца бюракратычнай ананімнасцю ўлады, маскарадным касцюмам хуліганаў... З беларускага гледзішча

вельмі істотна, што абаронцы светлага сталінскага мінулага імкнуцца заставацца ў цені: мы выдатна памятаем, што гэтак было не заўсёды, і гэткая сітуацыя ёсць невялікай, але сапраўднай перамогай свабоды. Гэтае супрацьпастаўленне не здымаецца, а падкрэсліваецца ананімнасцю некаторых валанцёраў: людзі не хаваюцца, але робяць неабходныя крокі, каб запабегчы непатрэбнай рызыкі.

Зборнік вершаў у параўнанні з гэтым можна было б назваць сапраўдным фэстам пераможцаў – каб толькі ведаць, каго яны перамаглі. Што праўда, шмат у якіх выпадках адказаць на гэтае пытанне лёгка: шматлікія аўтары перамаглі сябе, зрабіўшы крок ад прыватнага жыцця да публічнага. І гэта не так і мала для беларуса.

Святочную атмасферу задае прадмова Аляксандра Лукашука, які згадвае пра музычны сімвал праекту – мелодыю з Вердзіевай оперы «Набука». Высокая атмасфера балю, аднак, хутка саступае месца стракатаму карнавальнаму эгалітарызму, бо побач стаяць вершы старых і маладых, пачаткоўцаў і амаль класікаў, сціплыя і прэтэнцыёзныя, мадэрныя і традыцыйныя, глыбокія і праставатыя, рыфмаваныя і свабодныя. Тое ж стракаценне ў тэматычным полі: ад сачыненняў на зададзеную тэму да вольных паэтычных роздумаў пра ўсё на свеце. Атмасфера волі яднае, стракатасць паэтычнага матэрыялу ставіць пытанні. Не застаецца сумневаў, што для аўтараў вершу на свабоду свабода як такая – «наша баба». Але ж яна заслугоўвае не толькі захаплення, але і павагі. Яе трэба славіць – але публічна гэта лепей рабіць бліжэй да ўзроўню «Набуку», а не школьнага сачынення. Хай сабе сваю бабу *можна* будзіць пасярод ночы, але ці не варта запытацца сябе, што ты можаш ёй пры гэтым прапанаваць?

Гэта, відаць, тое месца, дзе амерыканскі і беларускі погляды найбольш істотна разыходзяцца. Дзякуючы заакіянскай схільнасці вітаць свабоднае самавыяўленне ў кожнай магчымай форме, «Верш на Свабоду» пазбег ператварэння ў да болю знаёмы з савецкіх часоў тэматычны зборнік вершаў, захаваў рысы чагосьці большага і больш чалавечага, чымся шэраг выказванняў на зададзеную складальнікам тэму, даў нам магчымасць праз сутыкненне несумяшчальнага з гледзішча літаратуры адчуць за словамі непаўторныя асобы – не аўтараў, а проста людзей, якім тым ці іншым спосабам дарагая свабода.

Беларускае (шмат хто тут скажа – еўрапейскае) разуменне культуры патрабуе ад мастацкага твору большае вытанчанасці і дасканаласці формы. Свабода, кажа ўнутраны эстэт, не дзяўчынка, не дзеўка, яна дарослая жанчына, баба, цётка, і не варта ўслаўляць яе абы-як. Але як толькі мы адкінем гэтае «абы-як», людзі схаваюцца, застануцца адныя аўтары. І будзе нецікава.

Іншая справа, што нам рабіць з амаль пазалітаратурным досведам «Вершу на Свабоду», як уплесці яго ў беларускую сістэму культурных каардынатаў. Зноў, як і першы раздзел гэтай нібы рэцэнзіі, варта закончыць словамі: *а як гэта будзе па-беларуску*? Адказу шукаць, хутчэй за ўсё, трэба не ў Празе, а ў сабе. Апеты Эмерсанам «давер да сябе» – тыпова амерыканская катэгорыя. То што – няма выбару, як зрабіцца амерыканцам? А дзе ж тады Свабода?

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10

[image]

[image]

A R C H E

[image]

[image]

крытыка

[image]2004

"да Зямлі"

[image]

П а ч а т а к

№ 5 (34) - 2004

[image]

Пачатак Навіны Форум

Пошук Аўтары Цалкам Іншае

крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image]

і ня самае значнае сучаснае дасьледаваньне ў галіне беларускае літаратуры, пісанае арабскай графікай, было абароненае як дысэртацыя на філязофскім факультэце ўнівэрсытэту Цюрыху. Швайцарскі дасьледнік Паўль Зутэр Suter Paul: *Aljurkan Tatarski: Der litauisch-tatarische Koran-Tefsir*. Köln, Weimar; Wien: Bohlau, 2004.

СЯРГЕЙ БОГДАН выпускнік факультэту міжнародных адносінаў БДУ. Вывучае ўсходнія мовы і культуры.

Княства
Літоўскага.
Гэта
запатрабавала
часу:
дасьледаваньне
было
распачатае
яшчэ ў 80-я
гады. 555
старонак
кніжкі
ўтрымліваюць
самую
навуковую
працу і
трансьлітараваныя
тэксты
асобных
манускрыптаў.
«ТАТАРЫ»,
АЛЬБО ШТО
СУПОЛЬНАГА
ПАМІЖ
БЕЛАРУСЬСЮ,
АЗЭРБАЙДЖАНАМ
І ХАКАСІЯЙ

Нягледзячы на сапраўды вялікую каштоўнасьць гэтага дасьледаваньня, вока зь першай жа старонкі пэрыядычна сутыкаецца ў кнізе з закарэненымі азнакамі нашай каляніяльнай мінуўшчыны. Аўтар апісвае вобласьць расьсяленьня «літоўскіх татараў», як ён іх называе, выкарыстоўваючы сучаснае палітыка-адміністрацыйнае дзяленьне, што прыхоўвае адзін істотны факт – тое, што гістарычна вобласьць пражываньня «літоўскіх татараў» цалкам ляжыць у межах беларускае этнічнае тэрыторыі.
Аднак варта аддаць належнае Паўлю Зутэру – ён характарызуе «літоўскіх татараў» як «мусульманскую меншасьць», не паддаючыся тэндэнцыі апошніх дзесяцігодзьдзяў да

абвяшчэньня іхнае этнічнае адрознасьці (маю на ўвазе ўплыў на мусульманскае насельніцтва Беларусі з боку Крыму й Казані, напрыклад, інсьпірацыі «татарскага» моўнага адраджэньня). Тут варта падкрэсьліць, што мусульманскае насельніцтва Беларусі ніколі не было этнічна аднастайнай групай «татараў», але толькі зьмяшанай групай эмігрантаў, прышлых з Усходу. Гэта адзначае і Паўль Зутэр, кажучы пра літоўскіх татараў як прыхадняў з тэрыторыяў, падуладных Залатой Ардзе і Крыму. Ужо гэтыя словы сьведчаць пра немагчымасьць этнічнае аднароднасьці per definitionem. Акурат прымаючы пад увагу гэтую разнароднасьць, можна зразумець прычыны хуткага (адно-два пакаленьні, як сьведчаць крыніцы) адміраньня мовы імігрантаў: папросту паразумецца нават паміж сабой мусульманам ВКЛ было магчыма хіба што на lingua franca – (стара)беларускай. Праўда, пра значэньне нашае мовы швайцарскі навукоўца старанна маўчыць, бо, паводле яго, у ВКЛ дома гаварылі на «ruthenisch/weissrussische Umgangssprache» (*русінска-беларускай гутарковай*) «prostaja mova», а ўрадаваньне паслугоўвалася «westrussische Kanzleisprache» (што значыць *заходнярускай канцыляршчынай*, а зноска ўдакладняе: «eine ruthenisch-kirchenslavische Mischsprache» – *русінска-царкоўнаславянская мяшаная мова*). Словам, мы патанаем у моры іншасказаньняў ужо зь першых старонак.

Пачнем з самое назвы «татары», якая падманвае амаль гэтаксама, як і «беларусы». Як беларусы ня «белыя расейцы» (хаця для Зутэра існуе акурат Weissrussland), так і «літоўскія татары» зусім не сваякі Мінцімеру Шаймієву. Яшчэ на пачатку XX стагодзьдзя «татарынам» у Расейскай імпэрыі быў ці ня кожны магамэтанін – і татарын казанскі, і бакінскі (сёньняшні азэрбайджанец), і ўсе сяроднеазіяцкія народы (хіба толькі таджыкаў у гэтую катэгорыю не пісалі), і нават паганцы-хакасы!

ТАТАРЫ І КАРАІМЫ

Абмяркоўваючы пытаньне паходжаньня «літоўскіх татараў» і прычыны «страты» імі роднай мовы, варта зьвярнуцца да прыкладу цюрскага народу караімаў (юдэяў паводле веравызнаньня). Падобна мусульманскім перасяленцам,

караімы таксама былі запрошаныя князем Вітаўтам дзеля ўмацаваньня вайсковае магутнасьці дзяржавы ды сяліліся кампактна. Караімы да сёньня зьбераглі сваю мову, нягледзячы на свой ня менш пакручасты, чымся ў татараў лёс. Чаму?
У глыбіні кнігі (на с. 106) аўтар пагаджаецца з прыведзенай намі вышэй думкай, разважаючы пра караімска-татарскія гістарычныя паралелі:
Калі літоўскія караімы выводзілі сваё паходжаньне па даволі простай лініі з Крыму й крымскіх татараў, то літоўскія татары складаліся з аскепкавых групаў (Splittergruppen), паходжаньне якіх было зьвязанае з аддаленымі абласьцямі Залатой Арды, Цэнтральнай Азіі і таксама Крыму. Этнічнай і моўнай аднароднасьці караімаў супрацьстаіць этнічная і моўная разнароднасьць і раздробненасьць татараў. Гэтае адрозьненьне дапамагае зразумець, чаму караімы здолелі захаваць сваю родную цюрскую мову, калі татары хуценька забыліся на сваю, якая ўяўляла сабой разнастайныя цюрскія гаворкі.
Тут ізноў узьнікае пытаньне: ды што ж гэта была за мова? Ці ўсё-ткі гэта быў толькі канглямэрат гаворак, а ня мова?
Сярод іншых чыньнікаў, што спрыялі захаваньню караімскае мовы, Зутэр называе рэлігійнае значэньне, надаванае караімамі сваёй мове, якая бытавала ў іх рэлігійнай практыцы побач з жыдоўскай. «*Наадварот, літоўскія татары не маглі абаперціся на ўласную рэлігійную традыцыю, у якой бы іх родная цюрская мова выконвала ролю носьбіта для разьвіцьця пісьменства*» (с. 107). Ізноў можа скласьціся ўражаньне пра наяўнасьць нейкай адзінай цюрскай мовы ў літоўскіх татараў. Падмацоўваецца ўсё спасылкай на досыць тэндэнцыйны дакумэнт – ліст пэўнага паломніка да асманскага ўладара ад 1558 году, які сыходзіць да, мякка кажучы, сэрвільнасьці ў сваім імкненьні ўбіцца ў ласку да Рустам-пашы дый выяўляе якнайвялікшыя сымпатыі да «вялікай і магутнай» асманскай мовы.
Відаць, усьлед за гэтым дакумэнтам Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі таксама піша пра татараў, што «паступова забылі родную мову» (артыкул «Кітабы»). І якую мову яны забылі? Татарскую? Але яшчэ сто гадоў таму татарскай называлі і кыргыскую мову, і хакаскую, і многія-многія іншыя. Нават калі прымітыўна падысьці да пытаньня на адукацыйным узроўні сёньняшняга выпускніка школы, то і тады застаецца пытаньне, якую мову яны забыліся – тую, на якой гавораць у Крыме ці ў

Казані?

АСМАНЫ ЯК ПРЫКЛАД

Асобна хочацца адзначыць, што, кажучы пра ўжыванне літоўскімі татарамі турэцкай/асманскай мовы, швайцарскі навукоўца чамусьці ня згадвае пра тое, што зварот мусульманаў ВКЛ да асманшчыны быў натуральнай зьявай з аб'ектыўных прычынаў. Бо гэта была найбліжэйшая мусульманская краіна, бо гэта была наймагутнейшая мусульманская дзяржава сьвету, бо адтуль яны маглі атрымаць узоры рэлігійна афарбаванае мусульманскае культуры, якой бракавала ў хрысьціянскім асяродзьдзі.

Таму яны і карысталі з асманскае мовы – у навуковай манаграфіі аўтар называе яе das Türkische (с. 108), гэта значыць турэцкая, а не асманская, – уцякалі на землі асманскае дзяржавы зь негасьціннай Радзімы. Але ня варта паддавацца спакусе перанесьці гэткія сувязі ў нейкую спакрэўненасьць! Тое самае датычыць і крымчакоў (ізноў жа пазьнейшых асманскіх васалаў), да чыіх выправаў «літоўскія татары», як вядома, адмаўляліся далучацца.

На жаль, Паўль Зутэр не згадаў пра дасьледаваньні Дубінскага (1972; 1982) і А. Заянчкоўскага (1935), якія паказалі, што аналіз наяўных крыніцаў дазваляе зрабіць выснову пра існаваньне ў моўнай практыцы мусульманаў ВКЛ двух значных наслаеньняў: старэйшага – усходнецюркскага (стараўйгурскага) – і маладзейшага – паўднёвацюркскага (асманска-турэцкага). Гэтыя наслаеньні тлумачацца першапачатковым (у XIV–XV стагодзьдзях) культурным уплывам Сярэдняй Азіі і Залатой Арды ды пазьнейшым (XVI–XVII стагодзьдзі) уплывам Асманскае імпэрыі.

ЖМЕНЬКА ДАСЬЛЕДНІКАЎ І МОРА КНІГ

Зноў падкрэсьлю, што большасьць гэтых недарэчнасьцяў – наступствы нераспрацаванасьці пытаньня айчыннымі навукоўцамі. Бо сп. Зутэр аб'ектыўна зьвярнуўся да ўсіх магчымых дасьледаваньняў на тэму, ці ня ўсе зь якіх зробленыя навукоўцамі беларускага паходжаньня, і прасачыў гісторыю

кітабістыкі – дасьледаваньня кітабаў (як павялося называць літаратуру мусульманскага насельніцтва Вялікага Княства / Беларусі).
Гісторыя ж пачынаецца зь першых публікацыяў цюрколяга Антонія Мухлінскага 1857 і 1858 гадоў. Далей да тэмы зьвярталіся публіцысты «Нашай Нівы» – Луцкевіч, Цьвяткоў, Вольскі – ды акадэмік Карскі. Асобна Зутэр аддае належнае Яну Станкевічу і ягонай вялікай працы, хаця зазначае, што трансьлітарацыя, выкарыстаная беларускім мовазнаўцам, «даволі суб'ектыўная і непасьлядоўная» (с. 4).
Асновай сучаснай кітабістыкі стала дасьледаваньне прафэсара Віленскага ўнівэрсытэту Антона Антановіча «Белорусские тексты, писанные арабским письмом, и их графико-орфографическая система» (1968). Пасьля таго былі падрыхтаваныя, але не апублікаваныя дасьледаваньні Шырын Акінэр, што працавала ў Лёндане, і Віктара Несьцяровіча зь Віцебску.
За час пасьля манаграфіі праф. Антановіча можна згадаць вобмаль сур'ёзных публікацыяў па гэтым пытаньні – польскамоўнае дасьледаваньне Чэслава Лапіча (1986), выдадзены Галінай Александровіч-Мішкінене ў супрацы з Сяргеем Шупам «Турэцка-беларускі размоўнік 1836 г.» ды паасобныя артыкулы. Вядома, знайсьці гэтыя працы вельмі няпроста, як і інфармацыю пра гэты пласт нацыянальнай культуры наагул. Што казаць, калі нават «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» не палічыла патрэбным прысьвяціць аўтару фундамэнтальнае працы па кітабістыцы праф. А. Антановічу асобнага артыкулу.
Як зазначае сп. Зутэр, поўнага інвэнтару манускрыптаў «літоўскіх татараў» не існуе дагэтуль, а вядомыя рукапісы расьцярушаныя паміж Вільняй, Менскам, Пецярбургам, Казаньню, Варшавай, Ляйпцыгам і Лёнданам. Невядомая колькасьць гэтых кніг знаходзіцца таксама ў прыватным уладаньні. «*Зноў і зноў некаторыя манускрыпты незваротна губляюцца, дзеля нядбайнасьці альбо абыякавасьці да ісламска-татарскай спадчыны*», – справядліва піша аўтар.

НЕЧЫТАНЫЯ РУКАПІСЫ

Вялікі кавалак нацыянальнай культуры, створанай

мусульманскай часткай насельніцтва Беларусі, занядбаны, недасьледаваны, замоўчаны ды ўжо і не заўважны за плоймай іншасказаньняў. Праблема, вядома, не ў апошнюю чаргу спрычыненая складанасьцямі, зь якімі зьвязаная магчымасьць азнаёміцца з самімі кітабамі. Зутэр адзначае малую колькасьць апублікаваных тэкстаў кітабаў, і гэта сапраўды так. У сваёй кнізе ён падае ці не найбольшы дагэтуль (на многія дзясяткі старонак) аб'ём трансьлітараваных тэкстаў.

Наколькі недарэчным зьяўляецца гэты прагал, патлумачым на некалькіх адметных фактах аб значэньні, якое належыць літаратуры, створанай мусульманскім насельніцтвам (не закранаючы іншых аспэктаў яго ўдзелу ў гісторыі краіны).

– Мусульманскае насельніцтва першае стварыла арыгінальную графічную сыстэму, дапасаваную да гукаў нашае мовы, якая ў асобных момантах дакладнасьцю пераўзыходзіць нават сёньняшнюю кірылічную азбуку (праўда, у іншых саступае, але пра тое пазьней).

– Мусульманская літаратура ў пэрыяд да XX стагодзьдзя стварыла найбольшую з усіх веравызнаньняў традыцыю беларускамоўнай рэлігійнай літаратуры.

– Мусульмане адзіныя з усіх жыхароў краю бесьперарыўна падтрымлівалі традыцыю беларускамоўнага пісьменства.

Толькі пра іх можна з упэўненасьцю сказаць, што яны захоўвалі, пісалі і памнажалі кнігі па-беларуску (хай сабе і зь некаторымі польскімі тэкстамі) нават у самыя цёмныя для беларускае літаратуры вякі.

Гэтыя факты сьведчаць пра неабходнасьць вывучэньня гэтае літаратуры, бо адна яна толькі і можа закрыць прыкрыя стогадовыя прагалы ў школьных хрэстаматыях, што прыпадаюць на XVIII–XIX стагодзьдзі. Але дзе там! Апрача маленькіх энцыкляпэдычных зацемак вы ня знойдзеце і сьледу мусульманскае літаратуры.

Sapienti sat, альбо разумным гэтага дастаткова. Што ж гэта была за невядомая беларуская літаратура, якое прысьвячаюць свае дасьледаваньні хіба што швайцарскія навукоўцы?

НЯ ЎСЕ
КІТАБЫ
ЁСЬЦЬ
КІТАБАМІ

Кітабы (што ў перакладзе з арабскае значыць «кнігі») – гэта агульная народная назва кніг, пісаных па-беларуску ці польску з выкарыстаньнем графічнай сыстэмы, створанай на падставе арабскае графікі. Аднак, строга кажучы, кітабы ёсьць толькі асобным жанрам гэткае літаратуры. Зутэр прымае да выкарыстаньня існы падзел манускрыптаў на тэфсіры, тэджвіды, кітабы, хамаілы, дуалары (далавары), граматкі і слоўнікі (Glossare). Ягоныя дэфініцыі нараканьняў не выклікаюць і могуць быць узорам для беларускіх энцыкляпэдыстаў.

Тэфсіры – тлумачэньні (а фактычна – пераклады) Кур'ану. Зутэр апісвае іх як «*агульны арабскі тэкст Кур'ану, разам з падрадковым перакладам на польскую, з экзэгетычнымі тлумачэньнямі, дапаўненьнямі ды парафразамі*». Апрача таго, у іх могуць зьмяшчацца асобныя трактаты рэлігійнага зьместу.

Тэджвіды ўяўляюць сабой асманскія трактаты аб правільным вымаўленьні арабскіх фанэмаў і чытаньні тэксту Сьвятое Кнігі. Асманска-турэцкі тэкст у падрадкоўніку перакладзены на беларускую.

Кітабы ёсьць зборнікамі тэкстаў разнастайнага зьместу. Часьцяком яны пачынаюцца з генэалягічных табліцаў паходжаньня прарокаў, імамаў і ханаў. Далей ідуць экзэгезы Кур'ану, катэхізісы, што нярэдка пераходзяць у маральныя павучаньні, у якіх цытуюцца паданьні з жыцьця Прарока ды сам Кур'ан. Могуць прысутнічаць тэксты тэджвіднага тыпу, легенды – пра сьмерць Мар'ям, размову Прарока з Д'яблам, падарожжа прарока на неба і г. д. Асманскі тэкст суправаджаецца беларускім перакладам. Беларуская мова ў кітабах заўжды пераважае.

Хамаілы – рукапісы меншага фармату, якія можна насіць з сабой (на гэтую іх асаблівасьць указвае назва, якая з арабскае перакладаецца як «тое, што носяць»). У хамаілах зьмешчаныя практычныя тэксты на ўсякую прыгоду. Напрыклад, апісаньні рытуалаў, цырымоніяў, малітвы, заклінаньні і г. д. па-арабску, па-асманску і часам па-чагатайску (мова цюрскага насельніцтва Сярэдняй Азіі, прыкладна на абшарах сёньняшняга Ўзбэкістану). Пра прысутнасьць беларускіх тэкстаў у хамаілах Зутэр маўчыць, трэба меркаваць, што па аналёгіі чытач сам здагадаецца, што яны там ёсьць. Наагул жа, толькі ў жанры тэфсіру мы сутыкаемся з польскай мовай як асноўнай.

Пра **дуалары** (невялікія малітоўнікі), **граматкі** і **слоўнікі**
Зутэр толькі згадвае, хаця яны таксама ўяўляюць сабой цікавасьць, мяркуючы хаця б з ужо апублікаванага «Турэцка-беларускага размоўніка». Асабліва гэта датычыць прыкладаў нерэлігійных тэкстаў граматак, прыклад якіх можна знайсьці ў манаграфіі праф. А. Антановіча. Гэткае абмінаньне прыводзіць да таго, што пасьля прачытаньня кнігі швайцарскага дасьледніка ў паспалітага чытача складзецца ўражаньне, нібыта ўсё пісанае арабскімі літарамі па-беларуску мела рэлігійны зьмест і накіраванасьць. А гэта не зусім так, сьведчаць пра тое граматкі і слоўнікі.

БІТВА ЗА
БЕЛАРУСКІ
КУР'АН:
ІЗНОЎ ПРА
МОЎНАЕ
ПЫТАНЬНЕ

Паўль Зутэр піша пра чатырохмоўнасьць кітабаў, якая ахоплівае беларускую, польскую, арабскую і турэцкую (больш карэктна было б казаць пра асманскую: паміж асманскай і турэцкай вялікая розьніца, у тым ліку па геаграфічным ахопе) мовы. «*Усходнія тэксты часта запісаныя ў даволі перакручанай (korrupt) артаграфіі, бо перапішчыкі не заўжды былі абазнаныя ў мовах*» (с. 9). Тэксты на беларускай і польскай мовах збольшага ўяўляюць сабой пераклады арабскіх і турэцкіх першакрыніцаў. Але ўзаемасувязь гэтых перакладаў з усходнімі крыніцамі дагэтуль застаецца недасьледаванай.
У выпадку літоўска-татарскага пісьменства йдзецца аб прынцыпова славянамоўным пісьменстве. Беларуская і польская мовы цалкам пануюць у рукапісах. Усходнія мовы прадстаўленыя выключна ў выглядзе цытатаў-уставак альбо арабскіх/турэцкіх арыгінальных твораў з падрадковымі перакладамі на польскую ці беларускую ды камэнтарамі... Побач з больш рэдкімі чыста беларускімі ці чыста польскімі тэкстамі мы ў большасьці выпадкаў бачым, аднак, мяшанку дзьвюх моваў, якую можна ахарактарызаваць як беларуска-польскую ці польска-беларускую, у залежнасьці ад таго, асабліваьці якое мовы дамінуюць.
Гэта, на думку дасьледніка, ёсьць адлюстраваньнем канкурэнцыі паміж беларускай і польскай мовамі і адпавядае

дзьвюхмоўнай сытуацыі ў ВКЛ XVI стагодзьдзя.
Мы падыходзім да ключавой дыскусіі аб тым, якая зь дзьвюх моваў была першапачатковай для перакладаў. Найбольш аўтарытэтная гіпотэза была сфармуляваная А. Антановічам у 1968 годзе, сутнасьць якой у тым, што тэксты перакладаліся сьпярша на беларускую мову, а польскія тэксты паўсталі пасьля на аснове беларускіх. Доказам зьяўляецца тое, што многія польскія тэксты з пункту гледжаньня лінгвістычных асаблівасьцяў дэманструюць на сабе ўплыў беларускіх формаў. «*Польскія тэксты, што знойдзеныя ў кітабах, павялічваюцца ў колькасьці з XVIII стагодзьдзя – тэндэнцыя, якая будзе мацнець далей у XIX стагодзьдзі*». Заўважым, што пры ўсім яе ўзмацненьні яна ніколі (!) не пераможа канчаткова.
Гіпотэза праф. А. Антановіча была падмацаваная Дзямідчыкам у 1987 годзе:
Ёсьць усе падставы меркаваць, што на польскую мову пераклады ажыцьцяўляліся зь беларускай. Пасьля крушэньня Літоўскага Княства, афіцыйнай мовай якога была руска-беларуская мова, улада ў дзяржаве перайшла да польскіх каралёў. Частка мусульманаў, для якіх беларуская мова сталася ўжо роднай, літаратурнай, кніжнай, апынулася ў зоне актыўнай палянізацыі, і таму ўзьнікла неабходнасьць перакладу ўсіх тэкстаў і на польскую мову. Больш за тое, мусульмане Беларусі й Польшчы, зьвязаныя адзінствам супольнасьці, стварылі так званую сярэднебеларуска-польскую мову, якую акад. Карскі апісаў наступным чынам: чалавек, які піша на гэтай мове, на самай справе гаворыць і разважае па-беларуску, але пнецца пісаць па-польску. Гэтую ж характарыстыку прыняў і Крачкоўскі.
Вілянчук, аўтар хрэстаматыйнага перакладу Сьвятога Кур'ану на расейскую мову Ігнат Крачкоўскі добра ведаў, што такое віленская пальшчызна. На Віленшчыне й Гарадзеншчыне гэтая мова ня ўмёрла і дагэтуль. Зутэр выносіць «сярэднебеларуска-польскую» мову ў зносках, але відавочна, што гэтае пытаньне мае далікатны характар, бо пры наяўнасьці такой зьявы кітабы набываюць яшчэ больш беларускую афарбоўку. Дарэчы, да гэткай пазыцыі схіляецца і адзін зь лідэраў аб'яднаньня «Зікруль-Кітаб» Ібрагім Канапацкі. Але не швайцарскі навукоўца.
Гіпотэза гэтая была сфармуляваная А. Антановічам на падставе дасьледаваных кітабаў, але ён пашырыў яе і на тэфсіры, хаця ўсе дагэтуль дасьледаваныя тэфсіры зьяўляюцца

польскамоўнымі. Дзеля таго што ў кітабах сьвет цытатаў з Кур'ану ў перакладзе на беларускую мову, якія тэкстуальна суадносяцца з адпаведнымі тэкстамі ў тэфсірах, праф. А. Антановіч выказаў меркаваньне пра існаваньне першакрыніцавага беларускага тэфсіру, які загубіўся, але сьляды яго засталіся ў выглядзе асобных цытатаў у кітабах: *Хаця поўнага тэксту Кур'ану з падрадковым яго перакладам на беларускую мову да гэтае пары ня знойдзена, аднак ёсьць падставы меркаваць, што такі пераклад у мінулым існаваў. Пра тое красамоўна сьведчыць наяўнасьць у некаторых кітабах вялікіх адрыўкаў тэксту Кур'ану на беларускай мове. Гэтыя тэксты часта выкарыстоўваюцца як цытаты ў многіх кітабах.* Нібыта ўсё ясна. Першапачаткова ўся літаратура перакладалася на беларускую. Пасьля з пачаткам палянізацыі ў гэтую сфэру пранікае польская мова, якая цалкам захоплівае самы «высокі» жанр – тэфсіры, якія фактычна ёсьць арыгінальнымі тэкстамі Кур'ану зь перакладам. У працэсе гэтага польская й беларуская мовы параджаюць крэсавую пальшчызну / сярэднебеларуска-польскую мову.

Але Паўль Зутэр высоўвае інакшую тэзу аб моўным распадзеле ў мусульманскай літаратуры нашага краю.

На падставе літоўска-татарскіх рукапісаў, што дайшлі да нас, можна ўстанавіць наяўнасьць выразнай моўнай дыфэрэнцыяцыі паміж тэфсірамі і кітабамі. Мова тэфсіраў – польская. Пануючая ж мова іншых рукапісаў, кітабаў, – беларуская, прычым нават нібыта польскія тэксты кітабаў часьцяком маюць моцную беларускую афарбоўку. Ідзецца пры гэтым пра моўную дыфэрэнцыяцыю паміж двума сьвядома адрозьнымі відамі тэкстаў. Пераклад і тлумачэньне тэксту Кур'ану, Слова Боскага [гэта значыць тэфсіры], робіцца ў больш узьнёслай і шляхетнай мове Вялікага Княства Літоўскага XVI стагодзьдзя – польскай. Тэксты ж манускрыптаў-кітабаў ёсьць практычнымі тэкстамі для ўсеагульнага навучаньня й асалоды вернікаў ды апісваюць ісламскую рэлігію й рытуалы часта даволі тэхнічным чынам і стылем. Гэтыя тэксты пісаныя па-беларуску (с. 11).

Пісьмовасьць «літоўскіх татараў», пачаткі якой Паўль Зутэр адносіць да другой паловы XVI стагодзьдзя, была, на яго думку, дзьвюхмоўнай ад самага пачатку, прычым выкарыстаньне тае ці іншае мовы вызначалася сацыялінгвістычнымі чыньнікамі (што адпавядае агульнай сытуацыі дзьвюхмоўя ў ВКЛ таго

часу). Ну, а далейшая палянізацыя спрычынілася да таго, што ў кітабах таксама пачалі ўсё часьцей зьяўляцца польскія (ці нібыта польскія) тэксты.
Гэтая тэза, кажа швайцарскі навукоўца, прынцыпова не пярэчыць назіраньням А. Антановіча.
Але няма патрэбы пастуляваць існаваньне зьніклага Кур'ану-тэфсіру на беларускай мове. Падаецца надта сумнеўным, каб кніга памерам з Кур'ан спачатку была перакладзеная на беларускую, а тады з гэтае мовы на польскую. Такім перакладам нічога не дасягалася, балазе літоўскія татары разумелі абедзьве мовы Вялікага Княства – і беларускую, і польскую (с. 12).

АСМАНСКАЕ ПАНАВАНЬНЕ, АЛЬБО ЭЎРАПЕЙСКІ КАНТЭКСТ ДЛЯ КІТАБАЎ

Кітабныя манускрыпты дэманструюць надзіва добрае прыстасаваньне арабскае пісьмовасьці для польскіх і беларускіх тэкстаў, адзначае Паўль Зутэр, што выклікае зьдзіўленьне, бо «*здаецца прадуктам сьвядомага аналізу, што засноўваецца на дакладным веданьні фаналягічных сыстэмаў беларускае, польскае, асманска-турэцкае ды арабскае моваў*».
Пісьмовасьць «літоўскіх татараў» належыць да шэрагу эўрапейскіх літаратураў, вядомых пад назвай літаратураў альхаміяда (aljamiado). Першапачаткова гэтае гішпанскае слова арабскага паходжаньня пазначала раманскамоўную літаратуру насельніцтва Пірэнэйскай паўвыспы, запісаную арабскім шрыфтам. У 1928 годзе гэты тэрмін быў застасаваны басьнійскім навукоўцам Фэгімам Байрактаравічам у дачыненьні да басьнійскай пісьмовасьці на падставе арабскай графікі – alhamijado-književnost.
Да альхаміяднага шэрагу Паўль Зутэр дадае і пісьмовасьць, створаную мусульманскім насельніцтвам нашага краю. Цікавае параўнаньне, якое ён робіць паміж разьвіцьцём альхаміяднае літаратуры Босьніі і Беларусі – абедзьве, дарэчы, паўставалі прыблізна раўналежна ў другой палове XVI стагодзьдзя. Зьдзіўленьне, праўда, выклікае такі пасаж: «*Паўстаньне як*

басьнійскай альхаміяднае літаратуры, так і такой самай славянскае пісьмовасьці літоўскіх татараў цесна павязанае з гісторыяй асманскага панаваньня» (с. 13). Але ж асманы ў нас ніколі не панавалі! Абедзьве літаратуры на самай справе ствараліся ў розных палітычных і сацыяльных умовах і з гэтае прычыны моцна розьняцца ў жанравым пляне.

Ад самага пачатку басьнійская альхаміядная літаратура складалася амаль выключна з паэтычных і лірычных твораў сьвецкай накіраванасьці, напрыклад любоўнай лірыкі. Толькі на другім этапе, у XVIII стагодзьдзі, зьяўляецца проза – збольшага маральна-рэлігійнага зьместу. Але басьнійцы ніколі не перакладалі Кур'ану.

З нашай альхаміяднай літаратурай справа такая, што яна дэманструе ў сваім разьвіцьці толькі другі этап. Мусульманскае насельніцтва ВКЛ было меншасьцю ў хрысьціянскай дзяржаве, і, «*каб захаваць сваю ісламскую веру, татары разьвілі культуру перакладу, што была засяроджаная на перакладзе рэлігійных тэкстаў у беларускую ці, адпаведна, польскую мову*». Зутэр піша пра наяўнасьць уласнае дынамікі ў басьнійскай літаратуры і адсутнасьці яе ў мусульманаў Беларусі. Толькі колькасьць пераходзіць у якасьць, і падобную басьнійскай дынаміку літаратурнага працэсу складана разьвіць у шмат меншай лікам групе мусульманаў ВКЛ, якія да таго ж займалі асобную сацыяльную нішу ў грамадзтве (вайсковая справа), тады як у Босьніі мы назіраем сацыяльную разнастайнасьць вялікага мусульманскага грамадзтва.

Праўда, хаця нашая альхаміядная літаратура дэманструе збольшага прозу рэлігійнага зьместу, сьведчаньні існаваньня паэтычных твораў ёсьць. Напрыклад, Дзямідчык адзначаў: «*Грунтуючыся на «Бібліяграфічных нататках» Л. Крычынскага, Алі Варановіч рыхтаваў да выданьня рэлігійную паэзію беларускіх мусульманаў, але, мяркуючы з усяго, яна так і не была выдадзеная. Л. Крычынскі пацьвердзіў наяўнасьць паэтычных твораў у рукапісах і матэрыялаў, што датычацца гісторыі беларускіх мусульманаў*». Алі Варановіч цытаваў асобныя вершы ў 1935 годзе ў сваіх публікацыях.

Галоўным прызначэньнем кітабаў было падтрыманьне веры. Нашай альхаміяднай літаратуры ўласьцівы кансэрватызм, бо параўнальна абмежаваны корпус тэкстаў і рукапісаў капіяваўся з пакаленьня ў пакаленьне. Відаць, гэтым і тлумачыцца

захаваньне іх беларускамоўных тэкстаў нават у самыя цяжкія для нацыянальнае культуры часіны. Тэксты, праўда, адрозніваюцца рэдакцыямі і дыялектнымі асаблівасьцямі. Цікава, што традыцыі ручнога перапісваньня кітабнай літаратуры выявіліся доўгажывучымі і датрывалі ледзь не да сёньня. Апошні вядомы перапішчык, колішні імам Даўбуцішак Лют Мухля, памёр у 1979 годзе. Ён пільна трымаўся традыцыяў у справе перапісваньня ды ўласнаручна вырошчваў шафран, каб вырабіць адмысловае чарніла.

У нас ніколі не было друкаваных выданьняў арабскай графікай, як у Босьніі. Аднак артаграфія кітабаў больш пасьлядоўная і вытрыманая, чымся ў аналягічнай басьнійскай літаратуры. Ці гэта таксама трэба тлумачыць параўнальна невялікай колькасьцю мусульманаў у ВКЛ? Менш крыніцаў – менш разнабою.

«ДЭРВІШ
ХАДЖЫ
ЧЭЛЕБІ
МУРЗІЧ –
КАДЗІ
ВЯЛІКАГА
КНЯСТВА
ЛІТОЎСКАГА…»

Мусульманскае насельніцтва ВКЛ пастаянна заставалася за рэлігійным бар'ерам, нягледзячы на адносную талеранцыю, што панавала ў Княстве. Мэрэдыт-Оўэнс і а. Надсан справядліва зазначылі:

Ужо ў апошняй рэдакцыі Літоўскага статуту 1588 году татары былі пазбаўленыя права займаць любыя дзяржаўныя пасады, ім было забаронена мець нявольнікаў-хрысьціянаў. Новыя абмежаваньні былі ўведзеныя на пачатку XVII стагодзьдзя. Шлюбы паміж татарскім і хрысьціянскім насельніцтвам былі забароненыя пад страхам сьмяротнага пакараньня для абодвух бакоў. Татарам было забаронена займаць афіцэрскія пасады ў іх уласных палках, ім было забаронена будаваць і рамантаваць мячэты альбо набываць вольныя землі.

Гэты час супадае з пачаткам тэндэнцыяў палянізацыі і рэлігійных канфліктаў у ВКЛ. Адной зь іх праяваў стаў рост хрысьціянскага фанатызму. Зутэр разглядае адзін з прыкладаў

антымусульманскае літаратуры – польскамоўнае выданьне, магчыма, езуіцкага паходжаньня, «Альфуркан татарскі» (Вільня, 1616), што перавыдаваўся аж чатыры разы. Хіба толькі на аўтарскі гумар трэба сьпісаць тое, што назва кніжкі Паўля Зутэра супадае з назвай гэтага антымусульманскага памфлету. Найвялікшым жа ўдарам, як для ўсяго краю, так і для «літоўскіх татараў», стала вайна 1654–1667 гадоў. Апрача стратаў, якія панесла мусульманскае насельніцтва ў часе вайсковае службы, значную шкоду ўчыніла міграцыя. У часе швэдзкага ўварваньня ў ВКЛ у 1656 годзе многія татары выехалі на тэрыторыю Польскае кароны. Але неўзабаве швэды ўварваліся і ў Польшчу, таму нядаўнія перасяленцы вярнуліся дамоў, у ВКЛ. Польская шляхта рабавала і забівала ўцекачоў-сарацынаў. У гэты час адбываецца пераломны зрух у гісторыі мусульманскага насельніцтва Вялікага Княства: многія татары вырашаюць выехаць у Асманскую імпэрыю, іншыя пераходзяць у хрысьціянства. Колькасьць гэтае рэлігійнае групы зьмяншаецца ў разы ды ўжо ніколі больш ня будзе расьці. (Нагадаю, што на пачатку XVII стагодзьдзя яе колькасьць, паводле розных дасьледнікаў, складала ад 40 да 200 тыс. асобаў. Сёньня – каля 10 тыс.)

Але тыя, хто застаецца верным свайму краю і веры, працягваюць захоўваць адметную спадчыну. Хто ж ствараў і перахоўваў традыцыі мусульманскае культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім?

Пра вучоных людзей, што перакладалі, пісалі й перапісвалі кітабы, амаль нічога невядома. Але перакладнік разгляданага ім тэфсіра, падкрэсьлівае Паўль Зутэр, несумненна быў высокаадукаванай асобай. Ён ня толькі выдатна ведаў арабскую і асманскую мовы, але й добра знаўся ў тэалягічных пытаньнях і трактоўцы Кур'ану – менавіта гэта можна сьцьвярджаць пасьля дасьледаваньня тэксту.

Гістарычныя крыніцы сьведчаць пра хутчэй невысокі адукацыйны ровень імамаў мячэтаў ВКЛ. Спрэчна, ці варта называць іх «духавенствам», як робіць сп. Зутэр, які, бясспрэчна, ведае пра своеасаблівасьць ісламу, дзе можна аспрэчваць наяўнасьць гэтае катэгорыі наагул. Да таго ж, калі малны мячэтаў – гэта «ніжэйшае духавенства» (niedere Geistlichkeit), дык хто тады, на думку Паўля Зутэра, зьяўляецца вышэйшым (ці хаця б сярэднім) мусульманскім духавенствам?

Агулам кажучы, нават калектыўнае (ня кажучы ўжо пра асабістае) выкананьне рэлігійных практык ісламу не патрабуе наяўнасьці жаднага духавенства. Імам – гэта проста чалавек, што каардынуе дзеяньні тых, хто моліцца. Усе малны/імамы/кадзі – гэта вучоныя ў рэлігійнай сфэры людзі, чыё меркаваньне мае вагу для менш абазнаных вернікаў.
Імамаў мусульмане ВКЛ запрашалі збольшага з-за мяжы, найперш з Крыму ці Залатой Арды. У 1558 годзе яны пісалі асманскаму султану Сулейману: «Пры большых мячэтах звычайна трымаем імамаў з Крыму альбо з ордаў, утрымліваючы іх за свой кошт; у іх таксама навучаюцца нашы дзеці». Мусульманская грамада сёньняшняе Беларусі можа сказаць пра сябе амаль тое самае, замяніўшы Крым ды Арду на Турэччыну і арабскі сьвет. Часам абыходзяцца проста замежнымі студэнтамі менскіх ВНУ. Традыцыя (мо і не найлепшая) жыве.
Аднак гісторыя літоўскіх татараў не зусім безаблічная. З дакумэнтаў Літоўскайе мэтрыкі паўстае ўнікальная асоба Дэрвіша Хаджы Чэлебі Мурзіча. Ён – «*кадзі ўсіх Татараў Вялікага Княства Літоўскага*». Тэалягічную адукацыю Мурзіч атрымаў у Асманскай імпэрыі, а ў 80–90-я гады XVI стагодзьдзя быў кадзіем, то бок судзьдзём мусульманаў ВКЛ. Адначасова, паводле дакумэнтаў, ён зьяўляўся імамам мячэту ў Даўбуцішках на Ашмяншчыне. Крычынскі пісаў, што прызначэньне Чэлебі Мурзіча кадзіем было зацьверджанае ў 1586 годзе самім каралём Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў!

РУКАПІСЫ
ЧЫТАЦЬ
МОЖНА ПА-
РОЗНАМУ

Ня менш цікавай нават для неспэцыялістаў зьяўляецца рэшта кнігі – разгляд асобных аспэктаў тэкстаў кітабаў, культурнага кантэксту, асаблівасьцяў графічнае сыстэмы ў пісьмовасьці мусульманаў ВКЛ, разбор фанэтычных асаблівасьцяў, вялікі граматычны камэнтар ды дзьве сотні старонак трансьлітараваных тэкстаў. Паўль Зутэр разьбірае:
1) тэфсір 1725 г. з Скарынаўскай бібліятэкі ў Лёндане (асноўны аб'ект дасьледаваньня);
Для параўнальнага аналізу ён зьвяртаецца да наступных

крыніцаў:
2) тэфсір к. XVIII ст. з Інстытуту ўсходазнаўства ў Пецярбурзе;
3) тэфсір 1825 г. зь Пецярбурскага ўнівэрсытэту;
4) тэфсір к. XIX ст. з прыватнай калекцыі Ібрагіма Канапацкага;
5) кітаб пач. XIX ст. з Брытанскага музэю.
Як разнастайныя камэнтары, так і трансьлітараваныя тэксты, бясспрэчна, заслугоўваюць максымальнай увагі і будуць цікавыя ўсім аматарам беларускае гісторыі. Старасьвецкая мова надае перакладу Кур'ану акурат тое сакральнае ці нават містычнае адценьне, якога бракуе сучасным перакладам. Захапленьне выклікаюць сваім стылем і моўнай самабытнасьцю іншыя тэксты, нават тыя зь іх, што напісаныя нібыта па-польску. Азнаёміўшыся з кнігай Паўля Зутэра, ніхто ўжо не ўсумніцца ў наяўнасьці мусульманскага складніку ў беларускай культуры ды ў натуральнасьці прысутнасьці ісламу на нашай зямлі.
Але мусова трэба адзначыць яшчэ адзін момант. Кніга гэтая падобная да саміх кітабаў – і першую, і другія чытаць можна па-рознаму, гэта значыць гледзячы ад таго, што вы *хочаце* прачытаць.
Справа ў тым, што графічная сыстэма, якое карысталіся мусульмане Вялікага Княства, пры ўсіх яе вартасьцях мае яшчэ адну асаблівасьць (добрую і кепскую адначасова) – яна першапачаткова збудаваная на графічнай сыстэме сэміцкае мовы. Уласна галосных літараў нават пасьля ўсіх-усіх дапрацовак і дапаўненьняў, зробленых пэрсыдзкімі й турэцкімі навукоўцамі, у літоўскіх татараў было толькі дзьве – ا і ى! Умоўна сюды можна далучыць літару و. Не кажыце, што гэтага мала, бо ў першапачатковай арабшчыне і таго не было. Гэтага хапала для арабаў, якім ня так важныя галосныя, сяк-так хапала пэрсам і туркам (але ўскладняла працэс пісьма на іхных мовах), але не ставала для поўнай галоснымі (якія маюць вялікае значэньне) беларушчыны. Тут давялося дадаць агаласоўкі, якія звычайна ў іншых мовах выкарыстоўваюцца толькі ў выключных выпадках (як у кірыліцы – знакі націску). Але і іх няшмат: ٘ ٙ ٚ. Да таго ж, апошняя зь іх таксама гуку не пазначае.
Што выходзіць? А тое, што ідэнтыфікаваць з дакладнасьцю можна хіба толькі гукі [а] ды [і]. Пры тым [і] можа таксама аказацца [ы], а там, дзе вы думаеце [а], пісар хацеў перадаць

штосьці накшталт е/э. Мала таго, калі вы паляк, дык можаце патрыятычна абвесьціць: тое, што беларус лічыць [а], на самай справе праўдзівае [ą] носовэ!
Адрозьніваць [о]/[у]/[ў]/[в] таксама варта шляхам лягічных заключэньняў. Урэшце, фокусаў зь перадачай галосных багата. Як вам, напрыклад, тое, што [э] можна перадаваць праз літару ە – h?
Такія праблемы ёсьць ува ўсіх несэміцкіх мовах, што карыстаюцца арабскай графікай, але калі ў пэрсыдзкай называйце вы агонь хоць [аташ], хоць [атэш], вас усё адно зразумеюць, то ў беларускай ад таго, як вы прачытаеце – [а] ці [э], можна казаць часам пра зьмену сэнсу, а часам – нават пра зьмену этнічнае афарбоўкі. Пэўныя заканамернасьці ў пазначэньні галосных існуюць, але яны вагаюцца нават у межах аднаго рукапісу.
Абсалютнае пэўнасьці няма і з зычнымі. Ня будзьма кранаць праблему [г] фрыкатыўнага і [ґ] выбухнога. Яе пераважвае тое, што літару р – ر, якая ва ўсіх мовах, якія ёй карыстаюцца, пазначае гук [р], у польскіх тэкстах можна чытаць і як [rz]! Такім чынам, любы тэкст можна праінтэрпрэтаваць як больш беларускі ці як больш польскі, што нескладана, улічваючы своеасаблівасьць беларуска-польскіх моўных дачыненьняў і моўную блізкасьць.
Тут мне згадваецца прымаўка арабістаў: «Эўрапеец, каб ведаць, мусіць прачытаць; араб, каб прачытаць, мусіць ведаць». То бок, каб слушна прачытаць, вам лепш было б ведаць наперад, што там напісанае. Гэта было сказанае наконт суадносінаў графікі ў эўрапейскіх мовах і арабскай, але тое самае датычыцца пісьменства мусульманаў ВКЛ.

* * *

Гісторыя вывучэньня кітабаў выклікае зьдзіўленьне і абурэньне тым, як лёгка беларусы адкінулі ўбок кавалак нацыянальнае культуры ды фактычна адлучылі ад сябе цэлую рэлігійную групу. Сёньняшняя дзяржава ў сваім імкненьні прыпадобніцца да шматнацыянальнага СССР прагне бачыць свае ўласныя карлікавыя й марыянэткавыя нацыянальныя групы, годныя хіба на тое, каб ладзіць карнавальныя шэсьці ў краіне, дзе нават прадстаўнікі тытульнай нацыі ня маюць магчымасьці напоўніцу карыстацца сваёй мовай. Іншая культурная спадчына

сёньняшняй дзяржаве абыякавая, а таму руйнуюцца сынагогі, у забыцьці марнеюць цэлыя пласты культуры іншаверных зь сёньняшнімі ўладарамі групаў насельніцтва.
Паўль Зутэр зрабіў вельмі значны ўнёсак у дасьледаваньні *іншае* беларускае традыцыі. Нават нягледзячы на пэўныя штампы й спрэчныя меркаваньні, гэтым томам заўжды можна абараніцца ад аматараў гісторыі ў стылі «Настасьсі Слуцкай». Што да беларусаў, дык ім важна дасягнуць разуменьня спадчыны кітабаў як арганічнага складніку нашае агульнае культуры, а таксама ролі ісламу ў беларускай гісторыі. Гэта й будзе наш шлях да Беларусі, у якой знойдзецца месца ўсім этнічным і рэлігійным групам.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

[image]

A R C H E

[image]

[image]

5 [image] [image] 2004

"да Зыхасту"

[image] [image]

П а ч а т а к

№ 5 (34) - 2004

[image]

Пачатак Навіны Форум

Пошук Аўтары Цалкам Іншае

эта ж палітычная арганізацыя!» – усклікнула паджылая паня з тэленачальства, калі Тацяна Дабрынеўская з Моладзевай рэдакцыі тэлебачаньня выратыла запрасіць Ты маладых сяброў клюбу «Сучасьнік» на перадачу, прысьвечаную нефармалам. «Але камсамол таксама палітычная арганізацыя!» – адцяла Тацяна.

[image]

СЯРГЕЙ НОСАЎ

менскі журналіст.

* Радок зь песьні А. Макарэвіча.

Таго, хто у маладосьці ня быў рэвалюцыянэрам, у старасьці прыкмецна ўсё нават начальнікам пажарнай каманды.

Ўінстан Чэрчыль

УВОДЗІНЫ

Гэта быў першы выхад палітклюбу «Сучасьнік» у шырокае грамадзтва. Пачалося ўсё з знаёмства на абмеркаваньнях у кінаклюбе «Профіль» (што расшыфроўвалася як «Праблемны фільм»), першай ластаўцы перабудовачных дыскусіяў у Менску. Ішоў 1986 год. Потым, на 5-гадовым юбілеі АДПБ, Валер Карбалевіч уздыме тост за дэмакратаў першай хвалі, што разьбілася аб камяні. Так, няма Ігара Герменчука, Генадзя Карпенкі, цяжка хворы Аляксандар Тамковіч, далёка Навумчык, Пазьняк і г. д.

Ня будзем пералічваць усіх; драма ў тым, што Лукашэнка

адправіў у сьцёк цэлую генэрацыю, якая вырасла ў Беларусі, пачынаючы зь перабудовы і першых гадоў незалежнасьці. Зь імі паступілі так, як Брэжнеў – з шэсьцьдзясятнікамі пасьля разгрому «праскай вясны». Ды яны і ёсьць, уласна, «шэсьцьдзясятнікамі», толькі зь беларускай душой (то бок з папраўкай на беларускасьць), якую некаторыя лічаць душком і мараць вытруціць. Пра іх пагутарым асобна.
АГП – гэта, па сутнасьці, АДПБ, а папярэднікам АДПБ шмат у чым быў «Сучасьнік», клюб лібэральнай інтэлігенцыі, які моцна адрозьніваўся ад іншых «нефармалаў». «Тутэйшыя» складаліся з нацыянальна-пісьменьніцкай інтэлігенцыі, а «Талака» – з моладзі, арыентаванай на беларускае адраджэньне. Наагул, тады ўсё (за выняткам «Сучасьніка») мысьлілася толькі пад сьцягам нацыянальнага адраджэньня.

КАДРЫ
ВЫРАШАЮЦЬ
УСЁ

Мы вырашылі стварыць клюб для абмеркаваньня палітычных, эканамічных пытаньняў, якія тады сталі надзвычай пякучыя. Леў Крывіцкі, імкнучыся стварыць «мазгавы цэнтар», прыцягваў грамадазнаўцаў. Зь Беларускага інстытуту мэханізацыі сельскай гаспадаркі (цяпер БАТУ), дзе ён працаваў, – Валера Карбалевіча, дацэнта Віктара Чарнова, Ільяса Хусаінава. «Сучасьнік» наагул быў арганізацыяй грамадазнаўцаў. Там я атрымаў пачатковую палітэканамічную адукацыю. Я хадзіў у «Сучасьнік» на «канцэрты эканамістаў», паводле тадышняга выразу Жванецкага.
Карбалевіч і Чарноў цяпер вядучыя палітолягі АГП. Карбалевіч – удзельнік расейска-беларускіх слуханьняў на ўзроўні парлямэнту, вядучы аналітык Беларускай службы радыё «Свабода».
З Інстытуту культуры прыйшоў Яўген Анішчанка, з БДУ – Алег Цітоў і іншыя. Раман Якаўлеўскі, здаецца, прыцягнуў Сяргея Процьку. Плюс Дзіма Зільбер, будучы ізраільскі журналіст, Пашка Сіманоўскі, будучы ізраільскі фотажурналіст, Сяргей Корзун. Зільбер вучыўся на гістфаку БДУ з Паўлам Шараметам. Пра Зьмітра Емяльянава, Сяржука Няхамеса, Зьмітра Шараверу будзе ніжэй. Зьбіраліся спачатку на кватэры Крывіцкага, потым былі памяшканьні ў танцавальнай залі «Вільня» і ў Доме

палітасьветы.
Грамадазнаўцы рыхтавалі даклады. Напрыклад, праграма аднаго зь вечароў выглядала так: Павал Данейка і Ўладзімер Усоскі разабралі Маркса на складовыя часткі, а Крывіцкі і ягоны напарнік Чарноў адстойвалі старога, робячы зь яго крытыка савецкай сыстэмы. У «Сучасьнік» уваходзіў Генадзь Уласаў, ён выйшаў пасьля з дэмакратаў у лідэры патрыятычнага таварыства «Русь». Ён не адзін такі. Емяльянаў пазьней уваходзіў у ЦК БПСМ.

ПАПЛЕЧНІКІ
КРЫВІЦКАГА
ПА
ДЫСЫДЭНЦКІМ
РУХУ
БЕЛАРУСІ

«Сучасьнік» быў у пэўнай ступені пераемнікам дысыдэнцкага руху. Леў Крывіцкі – монстар дысыдэнцтва Беларусі, які ведаў Кіма Хадзеева, Вячаслава Зайцава (апошні за прапаганду праваслаўя 14 гадоў правёў у зьняволеньні і псыхбальніцах). Дарэчы, ідэю палеакантакту Эрых Дэнікен, паводле Крывіцкага, пазычыў, калі не сказаць больш, у Зайцава. А потым мы хадзілі ў кінатэатар дакумэнтальнага кіно «Навіны дня» (цяпер у гэтым памяшканьні месьціцца Малая сцэна Купалаўскага) і з разяўленым ротам глядзелі заакіянскую стужку Дэнікена «Ўспамін пра будучыню». Як гэта адбылося? Амэрыканец прыляцеў, каб выслухаць дысыдэнта, якога ў Менску ніхто слухаць не жадаў і лічылі, як Цыялкоўскага, гарадзкім вар'ятам. Яны сядзелі некалькі дзён у маскоўскім гатэлі з дыктафонам, потым Дэнікен паляцеў назад. Ён зрабіў на гэтым свой бізнэс – квазінавуку. Уфалёгія ў злучэньні з доказамі таго, што найвялікшыя дасягненьні цывілізацый старадаўнасьці не маглі адбыцца без дапамогі больш высакаразьвітай цывілізацыі, унесьлі несумненны ўклад у культуру. Ідэя была настолькі прыгожай, што спарадзіла цэлы напрамак у гістарычнай фантастыцы.
У 1984 годзе да Крывіцкага на працу прыйшлі капітан і палкоўнік КДБ, пагражаючы адправіць яго ў мардоўскія лягеры на падставе перахопленай перапіскі зь Леанідам Лайвандам з Клайпеды: маўляў, Леў Вульфавіч стварае цэлую антысавецкую

сетку. Крывіцкі даў органам падпіску аб тым, што наўперад ня будзе ў перапісцы выкладаць антысавецкія ідэі. Яго рэгулярна выклікалі ў вядомы будынак праз уваход на вуліцы Ўрыцкага. Увесну 1985-га перасталі.
Ягоны сябар Арык Цэйтлін у застойныя часы быў лідэрам мясцовых сіяністаў. З дысыдэнтаў – Эдуард Буданіцкі, які ў 70-я гады выкрываў перад рабочымі Сталіна, за што быў адпраўлены ў псыхушку. Пазьней пра яго пісала «Газета Андрея Климова».

ЭКСТРЭМІСТЫ Ў ЛЯГЕРЫ ПАЛІТНЕФАРМАЛАЎ

Быў і такі экстрэміст, як Валеры Савянкоў, які расьпісваў сьцены гаркаму як сьцены ў прыбіральні, сябар Алеся Пушкіна, што выставіў тады каля Тэатральна-мастацкага інстытуту плякат «Жыве Беларусь без жыдоў і камуністаў!». Пазьней Савянкоў стаў Савянковасам, дзеячом беларускай дыяспары ў Вільні. Ён рэкамэндаваў сваіх памочнікаў наступным чынам: «Начальнік службы бясьпекі Першамайскага раёну!» Але ён, на думку Крывіцкага, справу рабіў. Хадзіў па ўсіх паліттусоўках і будзіў. А ў Доме літаратара «Тутэйшыя» яму адказвалі: «Пачакай…»
Пазьняк пры мне сказаў Савянкову: «Пачытайце «Кліма Самгіна». Там паказаная тая гаварыльня, якая стаяла сярод расейскай інтэлігенцыі пачатку ХХ стагодзьдзя. Цяпер тое самае». Вельмі дакладная ацэнка.
Трэба адзначыць, што Пазьняк заўсёды вельмі дакладны. Шэф-дызайнэр цяперашняга «Новага часу», а да таго «Нашай свабоды» Андрэй Дзегцяроў казаў мне, што бачыў на працягу аднаго дня двух розных Пазьнякоў. «Гэта Жырыноўскі. Ён пралічвае аўдыторыю. На мітынгу гэта псыхапат, які пырскае сьлінай на тры мэтры ў сваіх паплечнікаў. У Чырвоным касьцёле на сустрэчы з інтэлігенцыяй паўставаў акуратны, дакладны чалавек. Нават калі яго абражалі, ён культурна і, галоўнае, дакладна адказваў». Пазьняк тады быў старшынём «Мартыралёгу Беларусі», а БНФ стварыў на грунце «Талакі».

ПОГЛЯДЫ КРЫВІЦКАГА

Арганізацыю вырашылі, з ідэі Крывіцкага і «ў гонар традыцыяў расейскай інтэлігенцыі», назваць «Сучасьнікам». Крывіцкі быў зацыклены на «рэвалюцыянэрах-дэмакратах» як папярэдніках бальшавікоў і ўсё мысьліў паводле іх прыкладу. Пастаянна цытаваў нам Леніна. «Жандарм пытае: «Як жа вы супраць сьцяны, малады чалавек?» – «Сьцяна, ды гнілая, ткні пальцам, і разваліцца», – адказваў Ільіч». Карацей, кепскі Сталін, добры Ленін – слабасьць шэсьцьдзясятніцкай інтэлігенцыі. А пачынаў Леў Уладзімеравіч разам з Аронам Цэйтліным як «марксіст-ленінец» (так пазначалі свой антысталінізм трацкісты, марачы пра «сапраўдны сацыялізм»). Цэйтлін, калі стаў у Ізраілі заможным чалавекам, перадаў Крывіцкаму ліст з адмовай ад марксізму. Гэта крыху сапсавала іхныя адносіны.

У часы «Сучасьніка» ў Крывіцкага толькі й мовы было пра «сапраўдны сацыялізм, народны сацыялізм». Цытаваў «вялікую тройку»: Маркса, Энгельса, Леніна. Не ўхваляў празаходніх дысыдэнтаў, марачы па-трацкісцку зваліць кепскі лад і там. Штосьці было ў ім ад габрэяў ленінскай гвардыі.

Кожнай генэрацыі ўласьцівы свае абмежаваньні і памылкі, кожны – чалавек свайго часу. Як казаў Леў, у тым, што «праская вясна» і «парыская вясна» 1968-га супалі, быў нейкі вышэйшы знак. «Гэта паказала, што абодва сьветы ў крызісе». Многія шэсьцьдзясятнікі пра гэта марылі. У Эрыха Фрома можна прачытаць цэлыя кавалкі такога кшталту, і нездарма. У 1962 годзе Фром стварыў Сацыялістычную партыю ЗША. Гэта была не сацыял-дэмакратычная партыя паводле сваёй ідэалёгіі! Фром заходняе грамадзтва адмаўляў наагул, называў хворым. Ролю сацыял-партнэрства выконвала ў ЗША Дэмакратычная партыя, што была традыцыйна лявейшая за рэспубліканцаў.

З Грыцанавым для яго першага ў Беларусі «Філязофскага слоўніка» мы абмяркоўвалі артыкул пра трацкізм. Але Грыцанаў справядліва патрабаваў нежурналісцкага падыходу. «Артыкул для навуковага слоўніка павінен ня ставіць пытаньні, а закрываць». Артыкул я ў выніку не напісаў, але мне хапіла трацкістаў у жыцьці. А калі ня стала Зільбера і залібэраліўся Крывіцкі, зьявіліся хлопчыкі з «Чырвонага жонду», якія заяўлялі на моладзевым форуме ў ІВВ аб імкненьні да сусьветнай рэвалюцыі. У тыя часы матэрыялу для «Навінак» было багата.

АКТЫВАВАНАЯ

ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ

Палітыка была тады ў модзе. Гэтая мода на першы плян выводзіла інтэлект. Выкладчык ліцэю пры кансэрваторыі Генадзь Кагановіч, які зь сяброўства з Крывіцкім наведваў «Сучасьнік», выпісваў усе дзясяткі часопісаў, што выходзілі тады ў Маскве і Ленінградзе. Тоўстыя сур'ёзныя выданьні зьяўляліся валадарамі дум.

У лютым 1987-га ў Белсаўпрафе зьявіліся «Філязофскія чацьвяргі», арганізаваныя маладым выкладчыкам катэдры філязофіі БДУ Аляксандрам Грыцанавым, і чальцоў «Сучасьніка» паболела. Дзецішча Грыцанава, які імкнуўся весьці асьветную працу ў галіне філязофіі, прыкрываў ягоны сябар, тадышні сакратар гаркаму па ідэалёгіі Пятро Краўчанка. Пасьля кожнай абвесткі ў «Вечернем Минске» з тэмай чарговага вечару тэлефон у гаркаме разрываўся. Па такой тэме, як «Адольф Гітлер – клінічны выпадак нэкрафіліі» вэтэраны наагул паднялі скандал. Краўчанка кожны раз атрымліваў нагонку з ЦК і трываў гэта.

Грыцанаў потым соваўся ў АДПБ, выдаў у БДУ шэраг прагрэсіўных падручнікаў у сваёй галіне, першы ў РБ філязофскі слоўнік. Да таго як яго пасадзілі за краты, быў адным зь вядучых палітаглядальнікаў «Белорусской газеты». Ён, як Фядута, ведаў палітыку і ўладу знутры, праз кішэчнік. І праз тое крыху іх ненавідзеў, нянавісьцю інтэлігента, вымушанага кланяцца ўладзе, каб мець магчымасьць рабіць сваю справу і прыстойна жыць. У ягоным паслужным сьпісе па гэтай частцы былі Вышэйшая партыйная школа і лектарства ад імя ЦК КПБ. Доўгі час быў кандыдатам у члены КПСС і ўступіў у яе толькі падчас перабудовы. Грыцанаў шукаў не партыйнай пасады, а магчымасьці далучыцца да эліты, якая ў таталітарнай сыстэме можа быць толькі каля ўлады. Гэтага не жадаюць разумець тыя, хто ня бачыць цяпер прагрэсіўнай ролі Паўла Якубовіча. Што да Грыцанава, выйшаўшы з-за кратаў, ён ня згубіцца, ягоны інтэлект і прадпрымальная натура заўсёды знойдуць ужытак. Дый за кратамі ўжо не ўпершыню, ведае, як і ва ўсім, хады-выхады.

Краўчанка быў не адзіным яго добрым прыяцелем з гэтага шэрагу. У мэнталітэце Аляксандра Аляксеевіча прысутнічала такая саслоўнасьць. Лукашэнку ён недалюбліваў не як

антыдэмакрата, а як плябея.
Пасьля нуды застойных гадоў сяму-таму карцела гарачанькага. «Чацьвяргі», дарэчы, арганізавалі першую сустрэчу Філарэта зь міранамі (у красавіку 1988-га, да 1000-годзьдзя Хросту Русі). У «Сучасьнік» увайшоў прафэсар Валер Няфёдаў (сёньня ён ужо не жыве), аўтар кнігі гутарак зь Філарэтам, што стала падручнай сярод беларускага духавенства. Сьпярша ён хадзіў на «Талаку», але яму там не спадабалася. Няфёдаў быў славянафілам, выдаў шэраг кніг пра Буніна. У пачатку 90-х надрукаваў у «Во славу Родины» артыкул «Тут русский дух, тут Русью пахнет». Так, не арыентаваная на беларускае адраджэньне інтэлігенцыя сьцягвалася ў «Сучасьнік». Я сьвядома пайшоў на каструбаватасьць стылю. Звычайна пішуць накшталт: «нацыянальна арыентаваная інтэлігенцыя», забываючы пра славянафілаў, якія таксама лічаць сябе «тутэйшымі» і, трэба зацеміць, па-свойму нязгодныя з рэжымам.
«Яны касмапаліты», – казаў пра «Сучасьнік» Няхамес. Лідэры «Талакі» Вячорка, Івашкевіч і іншыя бачылі ў «Сучасьніку» інтэлектуальны зародак патэнцыйнага беларускага Інтэрфронту.

ЯШЧЭ
АДЗІН
НАПРАМАК
ПАЛІТЫЧНАЙ
ДУМКІ
БЕЛАРУСІ

Крывіцкі ўваходзіў у клюб аматараў фантастыкі «Сусьвет», створаны маім выкладчыкам па Інстытуце культуры Станіславам Саладоўнікавым. Як ацэньваў Крывіцкі, у савецкія гады гэта было адзінае месца, дзе можна было дыскутаваць, уносіць сьвежую думку. Але пачаліся часы перабудовы, якая разьяднала апазыцыю, і, сустрэўшыся на вечарыне часопісу «Наш современник» у Менску, Саладоўнікаў і Леў Вульфавіч апынуліся, вобразна кажучы, па розныя бакі барыкадаў. Станіслаў Васілевіч хадзіў у таварыства «Айчына». Яно зьбіралася таксама ў Доме палітасьветы і стала свайго роду папярэднікам «Славянскага сабору».
Уладзімер Бягун абараніў кандыдацкую таксама шмат у чым

дзякуючы перабудове, – ён ездзіў у Ленінград чытаць лекцыі самой «Памяці»! Гэта даказвае, што тут, у Беларусі, гэта ўзгадавана на больш высокім інтэлектуальным гноі.
Віктар Чыкін, пазьней лідэр камуна-патрыятычнага Народнага руху Беларусі, трапіў тады ў гаркам. Цяпер Чыкін, ён жа Нікольскі (вельмі вядомае прозьвішча), – рэдактар газэты «7 дней», органу БелТА, выданьня, што ўварочвае такія выражызмы, як «адраджэньне эўразійскай велічы».
Так, тыя таксама былі дысыдэнтамі. Шафарэвіч сядзеў за кратамі і быў ляўрэатам Нобэлеўскай прэміі, а Емяльянава, аўтара кнігі «Дэсіянізацыя», Бібліі сучаснага расейскага нацыянал-радыкалізму, пасадзілі ў вар'ятню. Ён, як і Шафарэвіч, не з галечы пайшоў у дысыдэнты – працаваў перакладчыкам у Суслава.
На «Філязофскіх чацьвяргах» наладзілі сустрэчу з публіцыстамі «Политического собеседника». Атрымала вядомасьць вядучы публіцыст «Политсобеседника» Тацяна Бумажкова, пазьней яна рэдагавала «Славянские ведомости», зачыненыя Кебічам на патрабаваньне габрэйскай грамадзкасьці. «Што вы зрабілі? – сказаў тады аўтарам скаргаў Крывіцкі. – Нам цяпер няма пра што пісаць!» Мае сукурсьнікі па Інстытуце культуры Ігар Сахараў і Алег Ляўковіч, дзеля прыколу апрануўшы шынэлі, зьявіліся на мітынгу «Славянскага сабору». «Пакуль ёсьць юнакі ў шынэлях!..» – лямантаваў беснаваты аратар, пабачыўшы іх. Ім падарылі «Славянские ведомости».

РАМАН ВАСІЛЕВІЧ, АЛЬБО НАШ БАРБАРОСА

Рамана Якаўлеўскага, які працаваў у аддзеле забесьпячэньня БДУ, калегі пыталіся – што там, на «чацьвяргах»?
– А чаго ж самі не ідзяце?
– Вас там спэцыяльна зьбіраюць, каб адправіць пасьля ў Курапаты.
«Комплекс 37-га году», – камэнтаваў Раман. Сам ён вёў свой адлік ад іншай даты: «Я нарадзіўся ў 1953-м годзе. Сусед кажа: «Такія сьмелыя маглі зьявіцца толькі пасьля сьмерці Сталіна». Раман славіўся сваёй чорнай, як смоль, барадой. «Раман, што гэта такое, барада?» – заўважала начальства. «У вас у

партбілеце барадаты!» – адказваў наш бунтаўнік. «Але ён жа стары…» – спрабавала запярэчыць кіраўніцтва. «Старасьць вызначаецца ня гэтым», – намякаў Раман на старэчую нямогласьць. «Раман, ідзі!» – адмахвалася начальства.
Раман Якаўлеўскі і Аляксандар Галькевіч згуртаваліся такім самым чынам, як студэнт філфаку БДУ, будучы шэф-рэдактар «Музыкальной газеты» і часопісу для падлеткаў-мэляманаў «Уши» Сашка Зеленер і Дзіма Зільбер, што сышліся на любові да тоўстых часопісаў. Якаўлеўскі і Галькевіч сталі зьбіраць свой гурток на кватэры Рамана. «Альтэрнатыва-2», называў іх Крывіцкі. Пра першую і непаўторную «Альтэрнатыву» ніжэй.
Пачалася мода на недзяржаўныя газэты. У тыя часы яны, вядома, афіцыйна выходзіць не маглі. Кожная група хацела мець свае выданьні. Гэтыя газэты куплялі нават з чыстай цікавасьці. Нефармальная прэса была пераходным этапам ад самвыдату да недзяржаўнага, апазыцыйнага друку. Раман абвясьціў знаёмым з пракуратуры: «Ну што мы будзем у хованкі гуляцца? Выпускаю нумар – нясу вам». З таго часу набыў зь іх боку ўдзячных чытачоў. Тады ў бок апазыцыі дзьмуў спадарожны вецер. Газэта называлася «Гражданин»; пазьней такую назву мела газэта АГП. Гэта нагадвае выпадак з гісторыяй газэтнай назвы «Правда».

«АЛЬТЭРНАТЫВА»
ЎСЯМУ, У
ТЫМ ЛІКУ
«СУЧАСЬНІКУ»

У траўні 1988-га на першым мітынгу ў Курапатах , прысьвечаным памяці ахвяраў рэпрэсій, да мікрафона прабіўся Дзіма Зільбер, які быў шалёным прыхільнікам Троцкага. Ускараскаўшыся на пень, ён заявіў, што арганізацыя «Менская альтэрнатыва» запрашае праз два тыдні на больш рашучы мітынг каля Опэрнага тэатру.
У дзень мітынгу, пазначаны ва ўлётках і ў курапацкай прамове Зільбера, парк перад тэатрам Опэры і балету быў паўнюткі людзьмі ў штацкім, а крыху ўбаку – з «газікамі». Чакалі тых, хто залезе на які-небудзь пастамэнт і пачне. Зьляканыя ўлады наладзілі ў парку прабег, прыгналі музыкаў у нацыянальных строях.
Калі «Сучасьніку» далі памяшканьне ў танцзалі кінатэатру

«Вільня», кампанія Емяльянава «Моладзь, за мной!» адышла ўбок. «Менская альтэрнатыва» была моладзевай групоўкай у «Сучасьніку» і так і ня вылучылася ў асобную арганізацыю, хаця адразу ж стала займацца самастойнымі праектамі. Маладосьці ўласьцівы радыкалізм. Емяльянаў і кампанія ціснулі на Крывіцкага, каб арганізаваць дэманстрацыю.
Дзіма Емяльянаў паходзіў зь сям'і партработніка, глыбока грэбаваў усім савецкім. Ён не здымаў італьянскіх акуляраў зь фірмовым бяльмом на шкле. Зьміцер Шаравера быў сынам работніка гарвыканкаму. Хутка яны пачалі ладзіць свае асобныя сходы ў аўторкі ў парку Янкі Купалы. Хто пачынаў у «Альтэрнатыве»? Сяржук Няхамес, кіраўнік роварнага клюбу «Пагоня» (назва адпавядала сутнасьці), пазьней паліграфіст. Прыйшоўшы на зборку «ля Панікоўскага» (скульптура «Хлопчык зь лебедзем»), ён затараторыў сваім таненькім галаском: «Камунякі – каты! Трэба ісьці на пляцы…» Ён з пачуцьцём рубануў паветра рукой, і зь ягонай штаніны вываліўся завостраны кухонны нож. Ён азірнуўся і схаваў нож за шкарпэтку.
Юру Ганчара, пазьней аднаго зь дзеячоў Партыі аматараў піва, зрабілі старшынём. Гэтая моладзь, яшчэ не абламаная жыцьцём у постсавецкай дзяржаве, заляпіла транспарт улёткамі. Да майго сябра даходзілі размовы, што ёсьць такая «Альтэрнатыва», якая робіць усё, што адбываецца.
Дзіцячая рэдакцыя запрасіла альтэрнатыўных на тэлебачаньне. Запіс прызналі добрым і таму ня сьцёрлі, паклаўшы на паліцу. Емяльянаў і Няхамес езьдзілі ў Вільню, дзе выступілі на стотысячным мітынгу «Саюдзісу». Былі сустрэтыя бурнымі воплескамі. Кроў і віно ўдарылі ў голаў, вяртаньне адзначылі банкетам з бойкай і спробай згвалтаваньня.
У новай групоўцы было сем сяброў і некалькі кандыдатаў у сябры. Тады ўвесь час казалі: «Стварылася новая суполка!» Маладыя «бесы» зьбіраліся ў парку Янкі Купалы і здавалі справу ў сваім вузкім коле аб зробленай працы.
Хутка ўлады выпусьцілі цыркуляр па нефармалах, які адразу ж трапіў у іх асяродзьдзе і з задавальненьнем там чытаўся. Палітбамонд дзякуючы гэтаму даведаўся адзін пра аднаго і расцаніў як прызнаньне. У зводцы пералічвалася ўсё, што мела дачыненьне да «адраджэньня», у тым ліку школьныя «беларускамоўныя» клюбы. Гэта дапамагло ім наладзіць

кантакты, і да таго ж гэта цешыла як прызнаньне з боку ўлады. Хіба не да гэтага заўсёды імкнуліся расейскія дысыдэнты? Яны жадалі размаўляць з уладай наўпрост, мець зь ёй блізкія стасункі – і самым вартым гэта ўдавалася.

ЗАРАДЖЭНЬНЕ
ПРЫВАТНАЙ
УЛАСНАСЬЦІ

Палітыка была стартавай пляцоўкай для бізнэсу. Крывіцкаму прыйшло запрашэньне з Галяндыі ні многа ні мала як лідэру апазыцыйнай партыі. Ён не любіў далёка езьдзіць і аддаў яго Дзіму Шараверу. Той прарваўся ў Галяндыю і з гэтага пачаў выдавецкі бізнэс. Валодзя Сац, які езьдзіў па ўсіх зборах нефармалаў як спэцыяліст па наладжваньні сувязяў, пасьля выкарыстаў набыты досьвед у бізнэсе. Цяпер ён сябар Партыі Свабоды. Многім, вельмі многім бізнэсмэнам дапамог раскруціцца «Сучасьнік». Гэта і Сяргей Корзун, і Сяржук Няхамес, і Віктар Процька. Усе – выдаўцы.

«СУЧАСЬНІК»
НАБЫЎ
УСЕСАЮЗНУЮ
ВЯДОМАСЬЦЬ

Дарэчы, пра зьезды нефармалаў. У «Сучасьнік» прыяжджалі прадстаўнікі Дэмакратычнага саюзу, Віктар Дуброўскі з Горадні, які стварыў там у 80-х аддзяленьне «Салідарнасьці». Ён служыў падчас страйкаў жніўня 1980-га ў Польшчы і проста ў савецкай вайсковай форме прыйшоў у «Салідарнасьць», дзе зьвярнуўся па-польску і з гонарам абвясьціў, што ён з Горадні. Быў прыняты з захапленьнем.

КАНЕЦ
«СУЧАСЬНІКА»
І
НЕФАРМАЛЬНАСЬЦІ

«Сучасьнік» памёр ад родаў. У вялікай залі Дому палітасьветы (цяпер канцэртная заля «Менск») ім ініцыяваўся сход грамадзкасьці, які прыняў зварот да творчых саюзаў стварыць Народны Фронт. Так быў запачаткаваны БНФ. На наступны сход клюбу прывезьлі прыблізна па пяцьдзясят перадавых

рабочых вядучых менскіх заводаў з ідэалягічным авангардам у выглядзе Ўладзімера Бегуна, клясыка барацьбы з масонствам. Бягун прыслаў Крывіцкаму на трыбуну запіску: «У залі сядзіць чалавек, якога вы толькі што назвалі псыхічна неўраўнаважаным». Міліцыя перакрыла ўваход у будынак, ля якога сабралася процьма ахвотных. Першы сакратар гаркаму Галко сказаў Крывіцкаму: «Улічыце, у залі ёсьць савецкая ўлада…» «Сучасьнік» выкінулі з Дому палітасьветы. Пачалася газэтная кампанія.

«Саўбелія» і «Вечерний Минск» перадрукоўвалі адна ў другой артыкул, дзе абыгрывалася імя па бацьку Крывіцкага – Вульфавіч. Крывіцкі трапіў нават у «Правду», менскі карэспандэнт якой пракаціў нефармалаў. «Политический собеседник» пяражываў час сваёй адыёзнай папулярнасьці. Часопіс падкрэсьліваў, што калега Крывіцкага па дысыдэнцкім руху Арон Цэйтлін зьехаў не куды-небудзь, а ў Ізраіль. У ход відавочна ішлі матэрыялы КДБ. Пайшлі дзіўныя званкі па тэлефоне.

Акрамя скандалу ў друку пачаліся звальненьні з працы. Крывіцкага звольнілі з БІМСГ, у Карбалевіча і іншых былі праблемы на працы. Грамадазнаўцаў выклікалі ў парткам, дзе патрабавалі даць падпіску пра няўдзел у «Сучасьніку». Уладзімер Някляеў, рэдактар «Крыніцы» – можна сказаць, амаль «апазыцыйнага» выданьня, – намесьнікам якога быў Якубовіч, што палемізаваў на яе старонках з «Политсобеседником», казаў мне, што калі дастану гэтыя падпісныя лісты, ён іх надрукуе. Мяне адлічылі з Інстытуту культуры, а пасьля ўскладаньня БНФам 7 лістапада 1990 году Леніну вянка з калючага дроту па наводцы выклікалі ў пракуратуру. Тады туды ішлі масавыя выклікі. Аднавіўся я ў МІК ужо ў жніўні 1991-га.

У 1988–1990 гадох Крывіцкі et cetera зрабілі першую спробу стварыць сацыял-дэмакратычную партыю Беларусі. Крывіцкі насіў значку лейбарыстаў – чырвоную ружу ў кулаку. Пасьля ён эвалюцыянаваў управа і стаў сябрам АГП. На рэфэрэндум і парлямэнцкія выбары 17 кастрычніка 2004-га ён увайшоў у Першамайскую выбарчую камісію ад АГП.

У 1990 годзе Гарбачоў адмовіўся ад прынцыпу аднапартыйнасьці і тэрмін «нефармальныя аб’яднаньні» адносна да палітарганізацый састарэў. Было прынятае «Часовае

палажэньне аб парадку рэгістрацыі палітычных партый і грамадзкіх арганізацый», якое ў Беларусі дзейнічала да 1995 году, пакуль Вярхоўны Савет не прыняў закону «Аб палітычных партыях і грамадзкіх арганізацыях», дзе планку ліку сяброў партыі паднялі ад 100 да 500.
У Расеі першай з ініцыятывы КДБ была створана ЛДПСС, а ў Беларусі ў тым жа 1990-м узнікла першая апазыцыйная партыя – Партыя народнай згоды, якую ўзначаліў Генадзь Карпенка, а ў аргкамітэт па стварэньні ўваходзіў Аляксандар Лукашэнка. Як распавядаў мне Ігар Гермянчук, у тыя часы Зянон Пазьняк прапаноўваў яго ў ценявы кабінэт, створаны БНФ, міністрам сельскай гаспадаркі – як прагрэсіўнага дырэктара саўгасу.

ПАСЛОЎЕ І
РЭЗЮМЭ

Часы дыскусійных клюбаў мінулі, але проста дзіўна, як той час перагукаецца зь цяперашнім. Нібыта і не было першай паловы 90-х, росквіту ваймарскай беларускай дэмакратыі.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

Doch ist es natürlicher fuer das Denken, wenn es im Befremdlichen wandert, statt sich im Verstandlichen einzurichten.

M. Heidegger

ы ў люстраным пакоі, у якім розум бачыць бясконцую гульню сваіх уласных адбіткаў. Ілюзорнасць выявы тым больш небяспечная, чым больш яна падобная на рэальнасць. Але ці можна ўвогуле назваць рэальным тое, што ляжыць за люстэркам? Зазірнуць па той бок люстэрка немагчыма, не разбіўшы люстэрка. Зазірнуць па той бок люстэрка ўвогуле немагчыма. Там можна толькі апынуцца. Калі мы гаворым, што «там» нічога няма, мы ўжо ведаем, што можна было б назваць рэальным.

П а ч а т а к **№ 5 (34) - 2004**
[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

Пачатак [image] 5 (34) 2004
Архіў Пошук Аўтары
Публіцыстыка • Навіны • Форум • Крытыка • Эсэістыка • Літаратура • Гісторыя • Філасофія • Крытыка • Эсэістыка • Літаратура •
Архіў Пошук Аўтары Цалкам Іншае

Зазірнуць за люстэрка немагчыма, не разбіўшы люстэрка. Зазірнуць за люстэрка ўвогуле немагчыма. Там можна толькі апынуцца. Калі мы гаворым, што «там» нічога няма, мы ўжо ведаем, што можна было б назваць рэальным. Зазірнуць па той бок люстэрка немагчыма, не разьбіўшы люстэрка. Зазірнуць па той бок люстэрка ўвогуле немагчыма. Там можна толькі апынуцца. Калі мы гаворым, што «там»

ІГАР БАБКОЎ
філёзаф. Летась выдаў кніжку «Філязофія Яна Сьнядэцкага».

анталягічна
Іншае, што
мы маем на
ўвазе?

.....
Крызыс формы. Задуха. Думка ня можа ані ў чым затрымацца.
З аднаго боку – акадэмічны дыскурс, які ўлучаны ў машыну «вытворчасьці веды».
Зь іншага – інтэлектуальная крытыка, якая ўлучаная ў практыкі дэканструкцыі наяўнага абнаўленьня карціны сьвету.
Думка вяртаецца да мэдытацыі, да прапаэзіі, да фрагмэнту, да бязмэтнага і безабароннага блуканьня «сярод рэчаў».
Думка вучыцца быць даверлівай.
.....
Жыць у цені цішыні ўласнай сьвядомасьці.
Быць сьведкам таго, што там адбываецца.
Сьведчыць.
.....
Клінамэны – асыстэмная думка, якая адцяняе анталягічную й эпістэмалягічную непрытомнасьць сучаснага нармалізаванага суб'екта Вялікай Заходняй Эпістэмалёгіі.
У эпікурэйцаў клінамэн – панятак, што апісвае адхіленьне атаму ад сваёй найпростае траекторыі.
Клінамэны – выклік прычыннасьці, самыя загадкавыя і самыя свабодныя героі гісторыі мысьленьня.
.....
Прычыннасьць у навуцы:
мы думаем, што калі мы пусьцілі з адхону шар і вымяраем яго хуткасьць, мы дасьледуем «законы прыроды».
Але ж гэта МЫ пусьцілі шар з адхону.
Магчыма, шар, пушчаны з адхону Богам, не зьбіраецца паслухмяна каціцца ўніз, а... наадварот, узьлятае ў неба?
.....
Магчыма, мае рацыю Разанаў, і сапраўдная задача мысьленьня палягае на тым, каб «рабіць словы істотнымі».
Але як яны стаюцца такімі? У якім месцы? І ці так ужо ім самім гэтага хочацца?
Магчыма, думкі ападаюць з чалавека, як лістота з дрэва.
Павольна апускаюцца побач, у цёплы і ўтульны цень. Каля

каранёў. Альбо наадварот, падхопленыя раптоўным ветрам, імкнуцца за далягляд...
.....
Кундэра ў «Мастацтве раману» выказвае думку, што розьніца між філёзафам і літаратарам палягае на тым, што філёзаф імкнецца давесьці пэўную думку пра экзыстэнцыю і сьвет як цэлае сродкамі мысьленьня, а літаратар прапаноўвае думку як «анталягічную гіпотэзу» й запрашае на прагляд: як яна працуе на прасторы раману, апавяданьня альбо верша.

Раман сатканы зь нітак прычыннасьці, экзыстэнцыя аблытаная імі. Клінамэны – гэта калі прычыннасьць дае збой, героі робяць учынкі ня з тых матывацый, якія ім дазволены псыхалёгіяй...
.....
Мы выйшлі ў сьвет і знайшлі яго невыносным.
.....
Настае эпоха, у параўнаньні зь якой савецкі таталітарызм здаецца мілай забаўкай.
Час, калі людзі ня могуць нават памерці – бо яны яшчэ і не нараджаліся.
.....
Амаль адначасова: жаданьне бунту, пратэсту, адчайнае і безнадзейнае апошняе вайны з той фальшывай і вабнай «нармальнасьцю», у якой мы апынуліся.
І ў той жа час разуменьне, што гэтая нармальнасьць здатная ператравіць які-колечы пратэст, увесьці ў «прымальнае» і ўрэшце прадаць усялякі бунт.
І ў лепшым выпадку помнікам такога выхаду на паверхню стаецца зьяўленьне яшчэ аднаго пэрсанажа... які з камічнай неабходнасьцю займае сваё (?) месца на паверхні сьвету.
.....
Сучасная філязофія ўжо не базуецца на рэспэктабэльным акадэмізьме, на «школах», якія дамінавалі ў другой палове XIX стагодзьдзя.
Ужо няма прэтэнзіяў на веду і кумулятыўнасьць.
Сучасная філязофія функцыянуе як сыстэма «высокае моды» мысьленьня, інтэгруючы ў сябе элемэнты шоў, поп-культуры, дзе акторамі выступаюць «ідэі», а рэжысёрамі – аўтары.
На самым версе функцыянуе сыстэма «акадэмічных зорак» – высокааплатных аўтараў філязофскіх бэстсэлераў, задача якіх

ствараць увесь час «новае» (у сыстэме моды гэта адпавядае топ-дызайнэрам). Пад іх ладзяцца канфэрэнцыі, выдаюцца зборнікі, пад іх працуе машына мультыплікацыі (памнажэньня дыскурсу).
У выніку: сучасная філязофія ёсьць машынай па вытворчасьці дыскурсу, машынай, якая ўлучае ў сябе ўсе спробы бунту.

Бедны Дэрыда. Ён так марыў пра дэканструкцыю.
.....
Ідэалёгіі і ідэі, дыскурсы і контрадыскурсы, сыстэмы і тэорыі – усё гэта даўно ўтылізаванае і функцыянуе на паверхні ў лёгіцы абмену.
.....
Дух застаўся ў катакомбах.
Бо ён ня можа «абменьвацца» і не падлягае «ацэнцы».
.....
Мысьленьне – скальпэль, які расьцінае закарэлую халодную паверхню сьвету.
Паэзія – наркотык, які дазваляе забыцца і ня бачыць яго крывавай кульці.
.....
Катакомбы... у небе, чаму б і не?
Сярод аблокаў нябачныя штольні, у якіх здабываюцца бязважкія скарбы.
Схавацца ў небе, сярод пустэчы, там, дзе нічога няма.
Тунэлі, лябірынты, эмоцыі, самадастатковыя фрагмэнты словаў, што адарваліся ад зямлі і існуюць самастойна... альхімік Ластоўскі, аматар паветранай хады Жылка...
.....
Мэтафізыка сёньня – усё тое, што ня можа быць рэпрэзэнтавана, адкладзена ў знак і арганізавана ў дыскурс, але пры гэтым вырываецца за межы рэдукцыі да маўклівага аб'екту рэальнасьці (фізыкі).
Усё тое, што «маўчыць» на нашым сёньняшнім узроўні легітымнае веды, тое, што застаецца «паміж», у цьмянай прасторы непрысутнасьці, вырванае зь неіснаваньня (нішто).
Тэмы і аб'екты традыцыйнае мэтафізыкі ўсё больш і больш інкарпаруюцца ў фізыку.
Прычыны ўсё больш і больш кантралююцца, вытворваюцца.
Застаюцца такія рэчы, як «духі, анёлы, Бог і інтэлігенцыі» (як

прадмет натуральнае тэалёгіі).
Трэба прызнаць, што і яны сёньня завісьлі ў паўпрысутнасьці.
.....
Філязофія распачалася як крытыка доксы ў імя эпістэмы.
Распачалася на Атэнскім кірмашы, у сытуацыі, калі адарванасьць ад традыцыі, гэтага нябачнага каркасу доксы, сталася відавочнай – і невыцерпнай.
Мы дасюль так і ня выйшлі з гэтага кірмашу.
.....
Філязофія доўгі час была крытыкай доксы ў імя эпістэмы.
У гэтай крытыцы яна сама брала на сябе ролю эпістэмы.
Так было да таго часу, пакуль месца эпістэмы канчаткова не замацавалася за навукай.
Ад гэтага новага часу філязофія стаецца крытыкай эпістэмы ў імя гнозысу.
.....
Толькі на мяжы думкі і ня-думкі можна мысьліць сьвядомасьць.
Знайсьці сябе ў сьвядомасьці.
.....
Сьвет як паверхня.
.....
Пошукі апошняе паверхні, на якой мы маглі б затрымацца.
Лад жыцьця, спосаб думак, якія нам прапаноўвае кожная эпоха і якія мы лічым «нармальнымі», нас часам стамляе, і тады мы шукаем ратунку ў ненармальнасьці.
Але ненармальнасьць палягае на той жа самай паверхні: ненармальнасьць не ратуе.
.....
Пункт анталягічнае затрымкі, апошняя паверхня – альбо бясконцы палёт у прадоньне.
.....
Усё жыцьцё Клакоцкі змагаўся з «рэальнасьцю», у якую ня верыў, якую выкрываў. Ня дзіва, што ўрэшце ён запісаў на палёх «Голасу ў пушчы» Генрыка Жавускага: «Літва сёньня – самае нерэальнае месца ў сьвеце».
.....
Усе цывілізацыі так альбо інакш вымушаныя былі даваць сабе рады зь непазьбежнымі зьменамі – узьлётамі і падзеньнямі, затрымкамі і пераходамі, праваламі, энтрапіяй...
Усе так альбо інакш шукалі магчымасьць захаваць раўнавагу,

застацца, намацаць штосьці нязьменнае.
І толькі эўрапейская мадэрнасьць імкнецца «асядлаць хвалю», зьмяняцца хутчэй за самі зьмены.
.....
Слова «прагрэс» выклікала ў Клакоцкага гістэрычны сьмех.
.....
Сьвет – астывае.
.....
Веда, якая паўстае ў пэўным кантэксьце, у пэўны момант гісторыі, няспынна астывае, натуралізуецца, ператвараючыся такім чынам у міт.
У выніку гэтага веда запаўняе сабой усю прастору, стаецца карцінай сьвету, доксай.
Максымальна натуралізаваная сыстэма веды прадстаўляе сябе як культура.
Крытыка веды, такім чынам, стаецца крытыкай культуры і наадварот, крытыка культуры немагчыма сёньня бяз крытыкі веды.
Крытыка веды – гэта дэстабілізацыя міту, дэканструкцыя наяўнага.
Крытыка веды – перш за ўсё крытыка словаў, канцэптаў, сыстэмаў значэньняў.
Задача такой крытыкі – узнаўленьне ў нашай сьвядомасьці таго, што мы ня ведаем.
Мы існуем на мяжы веды і няведы, і задача ня ў тым, каб максымальна выцясьніць адно другім, а ў тым, каб застацца на мяжы, утрымацца.
Мысьленьне магчыма толькі на мяжы. Гэтая мяжа мае анталягічны характар.
Стан існаваньня на мяжы сьвету: анталягічны непакой.
.....
Літаратура таксама няспынна астывае і абсалютную большасьць сучаснае літпрадукцыі складаюць «халодныя» формы, паўфабрыкаты, гатовыя да ўжываньня, расфасаваныя доксай, пазбаўленыя энэргіі.
Папрок у няплоднасьці сёньня – гэта, па сутнасьці, папрок у адмове ад саўдзелу ў гэтай фабрыцы літмакдоналдзаў.
Іншы бок гэткае плоднасьці – гэтыя рэчы пераважна аднаразовыя – яны прызначаныя для хуткага спажываньня і вымываюцца з культурнай памяці амаль што адразу.

.....
Так няшмат трэба, каб зьбіць чалавека зь ягонай упэўненасьці, што жыцьцё ведае, што робіць, калі вымыкае чалавека з таго месца, у якім ён знаходзіўся «да нараджэньня».
Чалавек ня ў стане затрымацца ў «сваім» часе, ён сплывае ў нікуды.
Нашая эпоха прыняла гэтае сплываньне як кон і назвала яго «апошняй свабодай».
.....
Жыцьцё – дасканалы лябірынт сацыяльных адбіткаў, празь які мы праходзім хутчэй па інэрцыі, чым у пошуках Мінатаўра.
.....
Зацісьнуты між дзьвюма няведамі: таго, што было да майго нараджэньня, я ня памятаю (кім я быў да нараджэньня?), таго, кім я стануся пасьля сьмерці, я ня ведаю.
Адсюль: няпамяць і няведа – самыя істотныя рэчы (паняткі? словы?) майго жыцьця, яго межы і яго форма.
.....
Кітайская традыцыя ня ведае страху сьмерці, пераляканага трымценьня перад нябытам, здранцьвелай засяроджанасьці на Нішто ці на Нічым, адсутнасьці.
Гэтая традыцыя, якая «акультурыла» нябыт, навучылася існаваць на мяжы быцьця і нябыту, прымаць пустату Нябёсаў як анталягічную гарантыю Быцьця, якое патрабуе пераменаў і глядзіцца ў гэтыя перамены, як у люстэрка.
.....
Мы – барбары на руінах сьвету. Мы адчайна спрабуем адгадаць значэньні знакаў, што калісьці мелі сэнс.
Пра што яны? Да каго зьвернутыя?
.....
Беларусь варта было б прыдумаць, каб на гэтых прасторах можна было б штосьці любіць.
.....
Вялікія нацыі пераконваюць саміх сябе, што яны ў стане запанаваць над татальнасьцю самога быцьця – і над часам.
Малыя – пакутуюць ад уласнае нерэальнасьці.
.....
Малым культурам дадзена адчуваньне крохкасьці і лятучасьці сьвету.
Разуменьне таго, што ўсяго гэтага магло б і ня быць, альбо яно

магло быць іншым.
Брутальная ўпэўненасьць у сваім Я – што можа быць больш чужым для гэтай далікатнай паўпрысутнасьці?
.....
Беларусь – краіна без культурнага алібі.
.....
Супольнасьць, якая ня верыць у рэальнасьць самой сябе. Нацыя на разломе між быцьцём і нябытам. Менавіта на такім разломе надзвычай ясна ўсьведамляецца галюцынагенны характар таго, што завецца «рэчаіснасьцю».
Часам здаецца, што адчайныя спробы прысьніць супольны сон пад назвай Беларусь таму й не ўдаюцца, што ня хочацца пакідаць гэты разлом, гэтую мяжу. Ня хочацца быць «як усе».
.....
Беларускае мысьленьне можа сыходзіць альбо з ідэі чыстае мяжы, чыстае адрознасьці, альбо з ідэі тутэйшасьці як факту сымбалічнае адмены ўсіх межаў, якія стаюцца празрыстымі і растаюць у паветры...
.....
Тое, што сёньня завецца Заходнім канонам; – гэта значыць, тэкстава, дыскурсіўна і інстытуцыйна замацаваныя нормы, каштоўнасьці і набыткі Заходняга сьвету, – уступіла ў паласу праблематызацыі і самапраблематызацыі.
Што істотна – Заходні канон стаўся праблемай ня толькі для Іншага (альбо для Іншых), але таксама і для самога сябе.
У часы савецкага камунізму, калі заходнія каштоўнасьці былі пастаўлены пад пытаньне ў ладнай частцы сьвету, сытуацыя была не такой складанай.
Сёньня атака на Заходні канон ідзе па трох накірунках:
– кантынэнтальна-акадэмічная традыцыя (Ніцшэ, Гайдэгер, Дэрыда), постмадэрнізм і дэканструкцыя,
– радыкальны мультыкультуралізм у ЗША,
– посткаляніяльны крытыцызм, які інстытуцыйна расьцярушаны па ўсёй прасторы сьвету.
Да гэтага можна дадаць праект дэканструкцыі Захаду, які зыходзіць з эўрапейскіх пэрыфэрыяў.
Парадаксальна – у той час, калі постсавецкія інтэлектуалы спадзяваліся пабачыць унівэрсальны і адзіны сьвет, яны знайшлі няспынную культурную вайну ўсіх супроць усіх.
.....

Беларусь – прастора анталягічнага непакою. Калі і ёсьць нейкая мэтафізычная задача, дык, магчыма, гэта інтэлектуальная партызанка.
У пэрспэктыве – ініцыятарка разнастайных «бунтаў», эпістэмалягічнай нязгоды.
Бо што яшчэ можна вярнуць сьвету, які так імкнецца давесьці, што «цябе няма».
Эпістэмалёгія супраціву – гэта перадусім аналіз вытворчасьці веды, дэнатуралізацыя веды пра нас саміх, якая прадукуецца «недзе там» і прапануецца тут як форма, якая мусіць аформіць наш уласны досьвед.
.....
Эўрапейская філязофія працятая «палітыкай адказнасьці» перад унівэрсальным, усеагульным, належным.
Яны адчуваюць сябе ў цэнтры, адказнымі за Захад.
Мы знаходзімся на мяжы, і супадаем ня столькі зь іхнай «адказнасьцю», колькі з сваёй пытальнасьцю.
.....
У нас зь Міцкевічам ня толькі супольная зямля, але – і гэта больш істотна – супольнае неба.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

адай, ніводная навука так не палітызавалася і так часта не станавілася звышактуальнай для пераходных грамадстваў кшталту сённяшняга беларускага, як гісторыя. Акурат яна дае народу-«дрэву» ілюзію разгляданьня ўласных каранёў. Акурат яе ўпрыгожаныя ці прыхаваныя факты становяцца падмуркам для любові ці нянавісьці аднаго народу да другога. Крышталёва «чыстай», цалкам аб’ектыўнай –

5 [image] [image] [image]

незалежнай ад чаканьняў ці ўплываў носьбітаў улады ў самых розных іпастасях (урад, прэзыдэнт, чытач, навуковы кіраўнік, грантадаўца) – гісторыі не існуе і ня можа існаваць. Гісторыя творыцца гісторыкамі. Гісторыя – гэта не археалёгія, яна ня мае справы з рэчамі, вызваленымі ад пакосту чалавечых думак і інтарэсаў.

Гістарычная навука мае сваю акрэсьленую гісторыю. Афармленьне і замацаваньне яе навуковага статусу вялося ад пачатку XIX ст., у час агульнай хвалі пераўтварэньня цэласных сыстэмаў ведаў у канкрэтныя навуковыя дысцыпліны. Гэты працэс, ініцыяваны пазытывістамі, меў на мэце вызваліць навуку ад старасьвецкіх мэтафізычных і тэалягічных забабонаў.

Зь цягам часу гісторыя аформілася ў «пазытыўную» навуку, якая апісвала мінуўшчыну з карысьцю для сучасьніка. Прычым гэтая карысьць палягала ў тым, што дадзеная навука распрацоўвала гісторыю народаў, падводзячы гэтым падмурак пад тагачасныя нацыянальныя дзяржавы і імпэрыі. Нацыі, якія атрымлівалі дзяржаўнасьць з спазьненьнем, вымушаныя былі ўжо адваёўваць уласную гісторыю ў суседзяў, што часта прыводзіла да наўмысных скажэньняў мінулага. Для беларусаў гэты працэс меў два асноўныя этапы – 20-я і 90-я гады XX ст.[1]. Цяпер, у 2000-я, мы мусім крытычна яго ацаніць, бо маем ужо характэрную карціну.

Доўгі і заблытаны шлях гісторыкаў па пошуку ўнівэрсальнай і станоўчай мэтадалёгіі гістарычнага дасьледаваньня прывёў іх да пэўнага фіяска: як ні круці, але гісторык шукае ў цямрэчы вякоў зусім ня нешта аб'ектыўнае (рэч, падзею, зьяву) – ён цалкам заняты пошукам *значэньня* (рэчы, падзеі, зьявы)[2] . А дакладней, гэтае значэньне ён альбо атрымлівае ў спадчыну ад іншых гісторыкаў – пры адсутнасьці фантазіі, – альбо вынаходзіць саматугам. Гэты факт вядзе да нэгатыўнай, але непазьбежнай высновы: аб'ектыўная сутнасьць гістарычна аддаленых фэномэнаў неспасьцігальная. Але ў чым тады задача гісторыкаў? Для постмадэрністаў тут усё ясна: гісторык – ня большы навуковец, чым бэлетрыст.

Постмадэрністы ўважаюць, што сёньняшняя гістарычная навука няўмольна набліжаецца да літаратуры, бо дыскурс гістарычнай навукі «усё яшчэ апавяданьне», і, значыць, «на іхныя працы распаўсюджваюцца фундамэнтальныя прынцыпы ўсякага апавяданьня»[3]. Выходзіць, цалкам залежны ад уласных перакананьняў, адукацыі, інтарэсаў і г. д. гісторык можа пісаць якасьці літаратара, што імкнецца зацікавіць чытача самёю вэрсіяй гісторыі альбо сваім жвавым разважаньнем, здольнасьцю тонка падаць матэрыял, нарэшце, густоўнаю падборкай ілюстрацыяў ці гістарычных анэкдотаў. І, выходзіць, посьпех яго высілкаў добра прасочваецца паводле камэрцыйнага посьпеху ягоных кніг. У Беларусі посьпех кніжак гістарычнай скіраванасьці прасачыць цяжка, бо асноўная колькасьць такой літаратуры, прызначанай масавага чытача, прадаецца на амаль некантраляваным кніжных развалах і найчасьцей мае мала супольнага з навукай і зь беларускай нацыянальнай ідэяй. Нашмат лягчэй прасачыць

[1] Гістарычная навука ў БССР ня мела ў сваім складзе самастойнага інстытуту гісторыі Беларусі, а існавала толькі пры кафэдрах ВНУ.

[2] Філюшкин А. И. «Постмодернистский вызов» и его влияние

на сокрушенную теорию белорусской науки // Голос, 2000, № 3. С. 69)

Аполлинарыі ці 2) паводле іх, што 1) гісторыі бязумоўна навуковы дослы

Першым у шэрагу стваральнікаў постсавецкай канцэпцыі беларускай гісторыі быў Мікола Ермаловіч. Цяжка пераацаніць ягоны ўнёсак як у працэс ломкі савецкіх ідэалягічных стэрэатыпаў, так і ў працэс якасна новай ідэалягізацыі ВКЛ-аўскай спадчыны. Сярод усіх яго працаў мы тут вылучым галоўную, на наш погляд, работу – «Па сьлядах аднаго міфа», – выхад якой выклікаў пераварот у нашай гістарычнай навуцы. Нават пры ігнараваньні археалягічнага матэрыялу, пры слабой даказальнасьці асноўных тэарэтычных палажэньняў кнігі, нарэшце, пры відавочнай сумнеўнасьці некаторых высноваў, Ермаловіч не выступае ўсё ж як ненавукоўца, наадварот, ягоным найвялікшым навуковым унёскам сталася наданьне вядомым фактам новых значэньняў. Догма аб паняволеньні літоўцамі беларусаў у часе стварэньня ВКЛ стаяла на такім самым хісткім навуковым падмурку, што й беларусацэнтрысцкая тэорыя Ермаловіча, але падтрымлівалася яна хутчэй за кошт ідэалягічных падпорак, прыцягненых спачатку расейскімі імпэрскімі, а затым савецкімі гісторыкамі з мэтай вывядзеньня вызвольнай ролі маскоўцаў у гісторыі беларусаў. Гэтак і тэорыя Ермаловіча актуальная не за кошт гістарычнай, а за кошт ідэалягічнай навізны. Ермаловіч ператварыў беларусаў з гледачоў у дзеячоў гістарычнай сцэны.

Мэтастазы расейскай дагматыкі адносна сярэднявечнай гісторыі Беларусі цяпер праяўляюцца выключна ў прафанацыйных выданьнях, якія ня маюць дачыненьня ні да гісторыі, ні да навукі наагул. Найяскравейшым прыкладам падобнай прафанацыі гісторыі можна назваць брашуру магілёўскага прафэсара, доктара тэхнічных навук Р. Ігнацішчава, з паэтычнай назвай «Разберёмся: родной ли белорусу русский язык? Родной!» (Магілёў, 1994 г.), саматугам раскіданую аўтарам па родным горадзе і нават перавыдадзеную ў 1999 г. На падставе словаў Ф. Скарыны аб «рускай» мове як роднай, без уліку шматзначнасьці слова «рускі» ў разгляданы пэрыяд, прафэсар робіць далекасяжныя

высновы: «Язык Ф. Скорины (называемый сторонниками аднамовья «старабеларускай мовай», «матчынай мовай») ближе к современному русскому языку, чым да сучаснай беларускай мовы и таварыству беларускай мовы імя Францыска Скарыны можно рекомендовать открыть у себя 2-е отделение – товарищество современного русского языка имени Франциска Скорины»[4] (артаграфія арыгіналу захаваная. – **Аўт.**).

У брашуры, выдадзенай хутчэй як палітычны памфлет з гістарычнымі спасылкамі (што праўда, здольнымі прымусіць самагубства гісторыка-прафэсіянала), добра прасочваецца асноўная функцыя гістарычнага факту – стаяць на абароне пэўных палітычных інтарэсаў. У разгляданым выпадку гэта было зьвязана з імкненьнем умацаваць пазыцыі расейскай мовы, істотна пахіснутыя ў першыя гады незалежнасьці.

4 Игнатищев Р. М. Указ. соч. С. 3–4.

5 Гарбачэвіч А. К. Беларуская літаратурная мова. Мінск, 1999. С. 37–55.

Гісторык як апавядальнік – хто гэта, як не Ўладзімер Арлоў? Калі Ермаловіч патрос чубы навукоўцам, то на долю сп. Арлова выпала давесьці масам новую праўду аб гісторыі краю новым беларусам, выхаваным на самым досьвітку незалежнасьці. Грамадзянін новай краіны прагнуў цікавага, ён прагнуў казак пра нашэсьці дэманаў на горад – калыску беларускай дзяржаўнасьці; пра бібліятэкі й скарбы, схаваныя ў катакомбах. Ён прагнуў разам з аўтарам пагардліва і гнеўна скрывіцца зь неадукаванасьці шараговага масквіча, які называе Полацак «древним русским городком», а Скарыну – вучнем расейскага першадрукара Івана Фёдарава. Чытач прагнуў таямніц і атрымаў іх. «Таямніцы полацкай гісторыі», некалькі разоў перавыдадзеныя, разьляцеліся вокамгненна, стаўшы ці ня першым навукова-папулярным гістарычным бэстсэлерам і ці не найлепшым камэрцыйным праектам у гісторыі беларускай бэлетрыстыкі. Вонкава пісьменьнік вядзе аповед менавіта пра свой родны горад, але ў мінуўшчыне Полацку, прачытанай і інтэрпрэтаванай Арловым, як у кроплі адбіваецца гісторыя большая, гісторыя нацыі, сэрцам і душой якой становіцца горад на Дзьвіне. Калі б нейкі сёньняшні Напалеон разважаў над плянам захопу Беларусі, прачытаўшы гэтую кнігу, ён без ваганьняў рушыў бы на Полацак, сьцярожка абмінаючы маленькія рачулкі пад Воршай.

Вонкава пры такім аповедзе гістарычнае апавяданьне драбнее, звужаецца да канкрэтнай мясцовасьці, але па сутнасьці сам гістарычны дыскурс глыбее, хінецца да ўсюдыіснасьці.

Незалежная Беларусь патрабавала новай, страшнай праўды пра самую болевую кропку ўрадавых ідэалягічных пабудоваў – пра ўзаемадачыненьні з Расеяй. Такая праўда існавала і толькі чакала сваіх дасьледчыкаў. Незалежная Беларусь патрабавала тэарэтычных падставаў для адстойваньня незалежнасьці ад расейскіх «братэрскіх» абдымкаў. І ў мінулым яна мела добрыя прыклады барацьбы супраць іх. «Невядомая вайна» Г. Сагановіча, як пазначаў сам аўтар, ставіла на мэце «паказаць рэальнае аблічча» вайны 1654–1667 гг., вайны, гісторыя якой была ці ня самай сфальсыфікаванай.

Але ж гэта ўсё вялося акурат пра *Незалежную Беларусь*. *Беларусь Афіцыйная* ідэі Беларусі Незалежнай успрымае цяжка, з напругай, калі ўспрымае наагул. Беларусь Афіцыйная, эканамічна ды ідэалягічна «павязаная» з Расеяй, ня мае патрэбы ў такой гісторыі, якая прыводзіла б да высноваў аб сумнеўнасьці тых ідэалягем, што складаюць падмурак цяперашніх беларуска-расейскіх адносінаў.

Возьмем, напрыклад, сучасныя інтэрпрэтацыі такой праблемнай тэмы эўрапейскай гісторыі, як прыняцьце ў Рэчы Паспалітай Канстытуцыі 3 траўня 1791 году і далейшае ўключэньне беларускіх зямель у склад Расейскай імпэрыі. Акцэнты тут расставіць можна па-рознаму. Калі б, скажам, пасьля прыняцьця Канстытуцыі адбылося ператварэньне Рэчы Паспалітай ува ўнітарную дзяржаву, гэта прывяло б зь цягам часу да поўнага зьнікненьня беларускага этнасу, тады як падзелы гэтай дзяржавы мелі ў гэтым сэнсе адваротны эфэкт. Значыць, уваходжаньне беларускіх зямель у склад Расеі стала падзеяй, якая дазволіла захавацца беларускаму этнасу. Калі прыняцьце Канстытуцыі 3 траўня пры далейшым захаваньні Рэчы Паспалітай ня мела б ніякіх ні асаблівых станоўчых, ні адмоўных наступстваў для беларускага этнасу, значыць, гэтая падзея магла быць ацэненая цалкам нэўтральна. Урэшце, калі дапусьціць, што захаваньне Рэчы Паспалітай з Канстытуцыяй 3 траўня, якая абвяшчала надзвычай прагрэсіўныя правы і

свабоды ў краіне, прывяло б да кансалідацыі беларускай этнічнай супольнасьці ў нацыю і далей дало б падмурак для станаўленьня ўласна беларускай дзяржаўнасьці, то тады апошнія падзелы Рэчы Паспалітай мелі б выключна адмоўнае значэньне.

Але вядома, што гісторыя ня ведае ўмоўнага ладу, а значыць, любая прагностыка падобнага кшталту патрэбная не дзеля абстрактнага тэарэтызаваньня на тэму гістарычных падзеяў, а дзеля фармаваньня ў сучаснага чалавека пазыцыі адносна той падзеі. Шматзначнасьць прагностыкі мусіць сьведчыць аб сумнеўнасьці любога канкрэтнага і канчатковага азначэньня разгляданай падзеі. Хаця сёньняшнія падручнікі з гісторыі якраз і маюць больш-менш акрэсьленыя пазыцыі, гэтыя пазыцыі дыктуюцца, хутчэй, сёньняшнімі перакананьнямі іх аўтараў, чым аб'ектыўнай характарыстыкай падзеяў.

Так, у першую чаргу ў падручніках зазначаецца, што ў выніку прыняцьця Канстытуцыі «перастаў існаваць гістарычны падзел Рэчы Паспалітай на ВКЛ і Карону», што адбылося поўнае зьліцьцё ВКЛ з Польшчай[5] . Спыняючыся на гэтым, папулярны падручнік для ВНУ дазваляе чытачу дадумаць наступствы такога зьліцьця: дамінаваньне палякаў і цэнтралізатарскіх настрояў з паступовым аслабленьнем пазыцыяў той беларускай шляхты, якая адстойвала ідэю незалежнасьці ВКЛ.

У той жа час іншы падручнік характарызуе гэтую падзею іначай: самастойнасьць ВКЛ была значна абмежаваная, а на патрабаваньне літвінскіх паслоў сойм прыняў спэцыяльны дакумэнт аб «узаемнай гарантыі» ВКЛ і Польшчы, у якім агаворваліся ўмовы раўнапраўнага ўдзелу літвінаў у справах і палякамі ў кіраваньні дзяржавай[6] .

«Захоп Рэчы Паспалітай быў гвалтоўным актам у дачыненьні да дзяржавы, якая ўваходзіла ў пэрыяд свайго гаспадарчага і грамадзкага рэфармаваньня»[7] . «Беларусь зрабілася каланіяй»[8]. «Далучэньне да Расеі дало імпульс паскарэньню працэсу капіталістычнага разьвіцьця на Беларусі... садзейнічала кансалідацыі беларускага народу»[9].

Нярэдкія й выпадкі, калі аўтары падручнікаў бяруць кірунак на

[5] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Мн., 1994. С. 237; Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1 / Пад рэд. Я. І. Новіка, Г. С. Марцуля. Мн., 1998. С. 231.

6 «Гістарычная памяць» Ул. Абэцэдарый, дапаможнік для настаўнікаў / Пер. з англ. А. Г. Краўцэвіча. Мінск, 1997. С. 168.

7 Гл. напр.: Трашчанка Я. Гісторыя Беларусі. Курс лекцый. Мінск, 1999. С. 160.

8 Гл. напр.: Трашчанка Я. Гісторыя Беларусі. Курс лекцый. Мінск, 1999. С. 160.

9 Гл. напр.: Трашчанка Я. Гісторыя Беларусі. Курс лекцый. Мінск, 1999. С. 160.

Такая пасьці. На жаль, такое ўхіленьне мае мала супольнага з аб'ектыўнасцю. Гісторык прамінае мяжу, што аддзяляе яго ад храніста, пры той акалічнасьці, што старадаўні храніст мог сабе дазволіць і эмацыйныя камэнтары да сухіх датаў. У выніку губляецца ці не найважнейшая функцыя гісторыка – вучыць мінуўшчыне дзеля будучыні. Губляецца таксама вартасьць гістарычнага факту, ягоная каштоўнасьць для нас сёньняшніх.

Урадоўцы штосьці падкрэсьліваюць актуальнасьць пабудовы дзяржаўнай ідэалёгіі. Але ў гатовым выглядзе ўлады яе яшчэ ня маюць. Выразнага ідэалягічнага стрыжня (простай і дасьціпнай «сюжэтнай лініі» гісторыі этнасу, што прасочвалася б у любую эпоху) не існуе. Простыя і дасьціпныя лёзунгі «Свабода, роўнасьць, братэрства», «Панаваньне арыйскай расы», «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся» зразумелыя адразу. Прапанаваная беларускімі ідэолягамі ідэалягема «Моцная і квітнеючая Беларусь» тушуецца ў параўнаньні з папярэднімі і нярэдка выклікае сарамлівыя ўсьмешкі ў саміх ідэолягаў, зьдзіўленых ад сваёй жа дзёрзкасьці. Да таго ж, яе немагчыма прыстасаваць да мінуўшчыны і яна пазбаўленая галоўнай функцыі ідэалягемы – накіраванасьці ў будучыню, праекцыі ў заўтра (Беларусь моцная і квітнеючая цяпер, – значыць, можна складьці рукі).

Замацаваная сёньня ў падручніках канцэпцыя беларускай гісторыі не дае асаблівага «месца для разгону» – часьцей за ўсё факты падаюцца шматзначна, з улікам любых магчымых інтэрпрэтацыяў. Але для ідэалёгіі інтэрпрэтацыя патрэбная адна і канкрэтная. На дапамогу ў такім выпадку можа прыйсьці хіба вяртаньне старых гістарычных мітаў і догмаў. Найлепшы прыклад такога вяртаньня – сумнавядомая кніжка з гісторыі Беларусі Я. Трашчанка. Ня маючы патрэбы разьбіраць тут памылкі і хібы магілёўскага гісторыка, зьвернемся да асноватворнай ідэі ўсёй канцэпцыі Трашчанка. Пры тым, што

аўтар гэтых радкоў цягам некалькіх гадоў быў вымушаны слухаць лекцыі Якава Іванавіча ў магілёўскім дзяржунівэрсытэце, задача падаецца вырашальнай.

Зыходны пункт разважаньняў Трашчанка – несумнеўная этнічная цэльнасьць усходніх славянаў цягам усёй іх гісторыі. Прычым адзіным усходнеславянскі этнас гісторык уяўляе аж ад самага сьвітанку гісторыі яго дзяржаўнасьці. Усе гістарычныя калізіі і трансфармацыі ўсходніх славянаў, што прывялі да ўзьнікненьня трох нацыяў і трох самастойных дзяржаваў, бачацца Трашчанку выпадковымі ці часовымі. Як сучасныя беларусы, расейцы і ўкраінцы, так і іх продкі першага тысячагодзьдзя н. э. зьяўляюцца для магілёўскага гісторыка адзіным племем, разадраным на кавалкі падступнымі суседзямі з мэтай іх аслабленьня і заваяваньня. Пазыцыя ня новая, аднак для сучаснай гістарыяграфіі несумнеўна новым ёсьць поўнае ігнараваньне гістарычнай рэчаіснасьці і выключная непавага да паняцьця гістарычнай дыстанцыі, што аддзяляе нас ад часоў Кіеўскай Русі. Родава-грамадавае грамадзтва тысячагадовай даўніны ня мае нічога супольнага з нацыяй эпохі капіталізму, а значыць, не павінна і ацэньвацца адпаведна. Сучасная навука больш-менш упэўнена прасочвае, што грамадзтва тае эпохі ядналася паводле родавай прыкметы (пры гэтым прыкметамі роднасьці, свойскасьці валодалі хіба прадстаўнікі самых блізкіх грамадаў, а ніяк не далёкія насельнікі Кіева, Ноўгараду, Тмутаракані), паводле рэлігійнай адзнакі (аднак пры гэтым праваслаўныя баўгары ня сталі расейцамі), паводле агульнай васальнай залежнасьці ад аднаго князя ці княскага роду (такі этап у гісторыі ўсходніх славянаў часоў Кіеўскай Русі не налічваў і стагодзьдзя, а значыць, наўрад ці мог забясьпечыць фармаваньне адзінага этнасу), паводле мовы (колькі дыялектаў на адным толькі Палесьсі цяпер? А колькі было іх на абшарах Усходняй Эўропы тысячагодзьдзе таму? Адзіную старажытнарускую мову дакладней будзе назваць старажытнабаўгарскай паводле паходжаньня – і выконвала яна тыя ж функцыі, што лаціна ў Эўропе Заходняй), нарэшце, паводле тэрытарыяльнай прыкметы (непралазныя лясы, балоты – прыродных бар'ераў паміж усходнеславянскімі этнасамі хапала).

Мяркуючы, што гістарычны працэс быў кіраваным, падуладным волі канкрэтных асобаў, Трашчанок ігнаруе яго аб'ектыўныя заканамернасьці, і падчас ацэнкі тых ці іншых падзеяў няўмольна выносіць за дужкі ўсе фактары, якія ўплывалі на здабыцьцё беларусамі і ўкраінцамі дзяржаўнай незалежнасьці. Падобная канцэпцыя беларускай гісторыі – гэта ня толькі рэстаўрацыя расейскай каляніяльнай ідэалёгіі, гэта непрыхаваны намёк на гістарычную апраўданасьць такога геапалітычнага прывіду, як Саюз Расеі і Беларусі, адкрытага й для ўкраінцаў, вядома. Трашчанкоўскія выкладкі добра пасуюць да ідэалёгіі саюзнай дзяржавы, аднак яе лёс асуджаны.

Гістарычная мінуўшчына тады мае *значэньне*, калі яна суадносіцца з сучаснасьцю. У іншым выпадку яна ператвараецца ў неактуальную экзотыку. Моцнае і незалежнае Друцкае княства – цікавы прыклад фэадальнай раздробненасьці на беларускіх землях. Моцнае і незалежнае Полацкае княства – калыска беларускай дзяржаўнасьці для адных гісторыкаў і павучальны прыклад фэадальнай раздробненасьці на рускіх землях – для іншых. У 1548 годзе войскі Івана Жахлівага далучылі Вялікі Ноўгарад да Маскоўскага княства, спыніўшы тым самым працэс фармаваньня на гэтых землях самастойнай народнасьці. Калі б ня гэтае далучэньне, сёньня, магчыма, Усходняя Эўропа была б багатая чатырма славянскімі нацыямі. Аднак, ізноў жа, гісторыя ня мае ўмоўнага ладу, і ноўгарадзкі этнас – ня больш чым гістарычная экзотыка.

Беларуская мінуўшчына – выдатнае поле для экспэрымэнтаў, прыдатнае для ўзаемасупярэчлівых ідэалягічных парадыгмаў. Так, была бітва пад Воршай, і было паўстаньне Каліноўскага, але ж былі і лісты магілёўскага, полацкага, мсьціслаўскага і г. д. праваслаўнага сялянства расейскаму цару з просьбай узяць іх землі пад сваю сьвятарную ўладу. Прага сумясьціць усе падобныя болевыя кропкі нашай гісторыі ў адзіны дыскурс найчасьцей прыводзіць дасьледніка або да пазыцыянаваньня на франтах гэтага дыскурсу, або да адмаўленьня ад уласнай ініцыятыўнай пазыцыі, неабходнай для сацыяльна значнай і нацыятворчай працы. У такой сытуацыі сучаснасьць як мерка для выдзяленьня сапраўднага ў царстве няіснага, як рыса гарызонту, што праступае з туману, непазьбежна навязвае

дасьледніка прыярытэты, не даруючы, аднак, поўнай творчай свабоды ў кожным выпадку. Сучаснасьць жа супярэчлівая ня менш, чым мінуўшчына.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/3/10**
[image]

рамвай прагрукатаў па мосце, і ўсё аціхла. Час нібы спыніў ход, і ніякага жаданьня спраўджваць яго ў спадара Бортніка не было. Ад тае хвіліны, як патэлефанавалі з вышку і сказалі пра няшчасьце з дачкой, час страціў для яго звыклую штодзённую вартасьць. Так што гадзіньнік на руцэ дарэмна намагаўся нагадаць пра сябе навязьліва-мэтадычным ціканьнем, нібыта пошум дажджу, ад якога ўжо добра стаміўся і чакаеш не

ФРАНЦ СІЎКО нарадзіўся ў 1953 г. у вёсцы Вята на Мёршчыне. Піша прозу і публіцыстыку. Апошняя публікацыя – апавяданьне «Бацечка Зэн» (Дзеяслоў. 2004. № 9).

Асымэтрыя

Аповед

дачакаешся,
калі ж ён
урэшце
скончыцца.

Вада пад мостам дыхала парай, але самой вады не было відаць. Толькі ў адным месцы, якраз там, дзе два тыдні таму ўсё і здарылася, зеўрала няўмольнаю стыласьцю цёмна-шэрая пляма віру. З моста, з амаль пятнаццацімэтровае вышыні, яна нагадвала прадоньне студні. Пара раз-пораз ахутвала і гэтую страхавітую пляму – праўда, ненадоўга, на якое імгненьне, бо тае ж хвіліны, падхопленая ветрыкам, расьсейвалася ўсьцяж парослага альхоўем спуску.
Спадар Бортнік прыхінуўся грудзьмі да парапэта, каб як сьлед угледзецца ў ваду, і зноў, як і надоечы, пачуў крокі. Дзявочая постаць таропка ступіла на мост з процілеглага берагу, нерухомаю зданьню застыла над вадой.
Лера?
Гэта была яна. Пастава, вопратка, звычка глядзець з-пад рукі, перанятая ў Нэлі, – усё было даччынае, знаёмае да драбніцаў. Дрыжыкі хваляю прабеглі па ягоным целе, сьсяродзіліся дзесьці понізу каленяў. Ён склаў далоні ў пярэплаціну, каб гукнуць дзяўчыну, ды не пасьпеў: з пагорка зноў пачуліся крокі.
Двое мужчынаў імкліва спусьціліся да моста, спыніліся ў якой сотні мэтраў ад Леры. Яна, аднак, не зрэагавала на зьяўленьне стараньніх, як стаяла, учапіўшыся далонямі ў парапэт, так і засталася стаяць. Адзін з мужчынаў падышоў зусім блізка да яе, нешта сказаў. Яна нічога не адказала. Тады мужчына пасунуўся яшчэ бліжэй, абхапіў дзяўчыну за стан і моцна, ажно тая войкнула, сьціснуў у абдымках.
«Дык вось як усё было», – падумаў спадар Бортнік і ўздыхнуў. Адвярнуўся, каб ня бачыць, што будзе далей, стаіўшыся ў вусьцішным маўчаньні пры калёне зь ліхтаром. А калі праз хвіліну зноў павярнуўся да тых траіх на другім беразе, яны ўжо зноў разышліся. Мужчыны шыбавалі краем моста да месца, адкуль ён цікаваў, а дзяўчына, спусьціўшы рукі долу, засяроджана вадзіла паглядам па паверхні вады. Раптам яна перахінулася цераз парапэт, склала папарадзе сябе рукі, як гэта робяць плыўцы, і рынулася стоць галавой у вір.
Вада ўзбуджана гайданулася пад цяжарам яе цела, пырснула на

кустоўе дробным асымэтрычным веерам літараў і лічбаў.
Спадар Бортнік матлянуў галавою, каб прагнаць насланьнё, аднак літары ўсё плылі і плылі перад вачмі, і чым далей, тым гусьцейшым рабіўся іх бясконцы шыхт. Так доўжылася колькі хвілінаў, аж покуль рэклямны ролік ня выбухнуў на экране ўпацелымі торсамі ды фляконамі дэзадарантаў і не вярнуў ягоную растузаную мроямі сьвядомасьць да рэальнасьці. Рэальнасьць была гэткая ж бязладная і няўцямная, як і тыя мроі. І ён, не жадаючы патураць ёй, машынальна памкнуўся рукою да пульта тэлевізара. І зноў спазьніўся: літары-гіпнатызёры павыпаўзалі з кута, паплылі ўпоперак пукатага, бы перакормленая рэптылія, экрану. Спачатку літары, за імі – выведзеныя тлустым шрыфтам, лічбы. Шэсьць лічбаў, падзеленых на пары кароткімі, больш падобнымі да кропак, рыскамі. Дзяўчына шукае працу. Нумар тэлефона. Дзяўчына шукае... Нумар... Дзяўчына...
Нумар быў нібыта знаёмы. Ён напружыўся, каб успомніць, дзе бачыў яго, але ня даў рады: у галаве ўсё зблыталася.
Тым часам літары, а за імі і лічбы, сплылі. Але праз хвіліну, ледзь скончыўся ролік, зьявіліся зноў – быццам наўмысна, каб яго пазлаваць ды яшчэ больш растузаць.
Дзе ён усё-ткі іх бачыў? Можа, у нататніку?
Спадар Бортнік сунуў руку ў шуфляду шафкі, натыкаючыся пальцамі то на нажніцы, то на шпулькі зь ніткамі, то яшчэ на нейкую драбязу, дастаў з-пад ісподу важкі, з зашчапкай упоперак абгорткі нататнік. Разгарнуў яго – і адразу натрапіў вачмі на нумар з экрану – шасьцізначны, той, які дачка самаручна ўпісала ў нататнік у дзень, калі сыходзіла з дому на прыватную кватэру. За ўвесь гэты час ён так ніводнага разу і не патэлефанаваў ёй, не надаралася нагоды. Спачатку Лера раз на тыдзень наведвалася дахаты, каб узяць што-нішто з вопраткі ці абутку, – гэтага ім абаім было даволі, аж з каптуром. Затым і такія стасункі сышлі на нішто. Зрэшты, ні ён, ні яна ў больш цесных ня мелі патрэбы... А можа, яму толькі здавалася, што ня мелі? Вунь жа як яно ўсё павярнулася...
Каб жа ж ведаць загадзя, што гэтак скончыцца...
З таго часу, як занемагла Нэля, паміж бацькам і дачкой ужо ніколі не ўзьнікала ранейшага ўзаемаразуменьня і шчырае зацікаўленасьці справамі адно аднаго. Ад самага пачатку ён падазраваў, што Лера вінаваціць у матчынае хваробе яго. Гэта

быў акурат той час, калі ягоныя любошчы з Тамарай сягнулі піку, і пэўна да дачкі што-небудзь пра іх дайшло. Праз каго? Ды хаця б праз Нэлю: дзеці заўжды вельмі чуйныя да настрою бацькоў. А што Нэля ледзь не ад самага пачатку ўсё ведала пра ягоную каханку, ён, спадар Бортнік, зразумеў значна пазьней, калі жонка трапіла ў лякарню. Так што калі ведала пра здраду Нэля – ведала і Лера. Хоць, папраўдзе, зь ёю, як і з самой Нэляй, на гэтую тэму гамонкі не было. Зрэшты, прыкметаў нейкага супраціву ягоным паводзінам з боку дачкі – таксама. Толькі аднойчы, калі трываць жончыны прыступы зрабілася невыносна і ён, скарыстаўшы сякія-такія сувязі, дамогся для Нэлі месца ў прэстыжнае лякарні, Лера адкрыта выказала сваю нязгоду. Тады яму ўдалося пераканаць яе, што так будзе лепш для ўсіх, і найперш – для маці, і яна нібыта пагадзілася. Нібыта – бо адносіны між імі ад таго дня пакрысе сапсаваліся ўшчэнт. Усё, што ён рабіў і што яна раней ухваляла, цяпер яе раздражняла і выклікала відавочнае непрыманьне. Скончылася тым, што яна сышла з дому. Апошняю кропляй, што падтачыла іхнія адносіны, стала – сьмеху варта – Лерына нежаданьне вучыцца. Ён даводзіў пра неабходнасьць мець належную адукацыю і ўжо амаль пераканаў яе, але ў апошні момант яна занатурылася і не пайшла на іспыты ва ўнівэрсытэт. Тады ён і завёў тую гамонку пра працу. Лера пакрыўдзілася, сказала, што знойдзе сабе занятак безь ягонае дапамогі і наагул сыдзе з дому. Ён пагадзіўся – з разьлікам, вядома, што вельмі хутка яна зразумее сваю памылку і вернецца.

У кватэры, якую дачка зьняла ў складкі зь нейкаю дзеўкай, ён быў аднойчы, у дзень пераезду, калі дапамагаў перавозіць клункі. Тады Лера і ўпісала нумар тэлефона ў некалі агульны, а цяпер толькі ягоны нататнік. Хто б мог падумаць, што давядзецца пабачыць той нумар на экране тэлевізара. Сапраўды, ён не тэлефанаваў ёй, але яна аднаго разу такі патэлефанавала, амаль праз два месяцы зацятага маўчаньня. Холадна папыталася пра ягонае асабістае жыцьцё, паведаміла (менавіта так – паведаміла), што вось-вось знойдзе сталую працу. А яшчэ сказала, што хацела б разам зь ім наведаць Нэлю ў лякарні. Размова была нечаканая і сухая, як восеньская бліскавіца. А праз тыдзень пасьля яе Леру знайшлі ў віры пад мостам.

У аддзеле вышуку, куды яго паклікалі ў той самы дзень,

схіляюцца да высновы, што гэта – самагубства. Яму такое прыпушчэньне служкаў Фэміды ад самага пачатку падалося дзікім і неверагодным. І ён вырашыў пагутарыць па тэлефоне зь Лерынай дзеўкай – супольніцай па кватэры. Тая прызналася, што справы і ў яе, і ў Леры былі дрэнь: абедзьве перабіваліся выпадковымі заробкамі ў нейкім начным бары. Што гэта былі за заробкі, ён, каб не вярэдзіць лішне душу, высьвятляць ня стаў, і так збольшага было зразумела. Але сама навіна яго ашаломіла. Ягоная дачка зарабляла на пражыцьцё ў нейкім бары?! Ашаломленасьць зьмянілася адчуваньнем вінаватасьці – упершыню, бадай, за ўсе апошнія гады. Ды, звыклы да завядзёнкі ўва ўсім гнуць сваю лінію, ён гэтаму адчуваньню вырашыў не паддавацца. Самагубства! А можа, зусім і не! Вунь колькі бадзяецца поначы рознага быдлячча, ад якога чаго заўгодна можна чакаць...

Літары на экране працягвалі свой няўмольны карагод. Адны і тыя ж, адным і тым жа навязьлівым рэфрэнам: дзяўчына шукае, нумар, дзяўчына шукае...

Ён дачакаўся, калі зьявіцца нумар рэклямнае службы, хуценька запісаў яго на паперчыну. Затым, двойчы змыліўшыся ад хваляваньня, набраў яго.

– Вы з абвесткай? Ведаеце нашыя тарыфы? – дзявочы голас гучаў лагодна і пачціва. – Калі так – дыктуйце тэкст.

– Я наконт той, што ідзе на вашым канале, – як мага стражэй сказаў ён. – Чалавека няма ў жывых, а ягоная абвестка без супынку круціцца. Што гэта за парадак! Тэрмінова спыніце!

– Мы ня маем права спыняць без дазволу замоўцы, – таксама строга, але па-ранейшаму пачціва запярэчыла дзяўчына. – Ці вы і ёсьць замоўца?

– Ня я – мая дачка.

– То няхай яна сама і патэлефануе. А лепш, калі зойдзе з квітком...

– Яна два тыдні таму памерла.

– Як гэта? – дзяўчына сумелася, змоўкла. Яму нават падалося – паклала слухаўку, але праз хвіліну голас яе загучаў зноў. – Як прозьвішча?

– Маё? – цяпер ужо сумеўся ён.

– Вашае дачкі.

Ён сказаў прозьвішча, і яна зашамацела нейкімі паперамі. Шамаценьне доўжылася хвіліны тры, і нарэшце яна зноў

азвалася:
– Лера Бортнік? Не, гэтая абвестка аплачаная іншым чалавекам.
– Кім жа?
– Гэтага я ня маю права вам сказаць.
– Як гэта – ня маеце? Нумар тэлефона маёй дачкі, а вы ня можаце сказаць, хто замовіў абвестку?
– Прабачце, не магу. Не крыўдуйце, – яна вытрымала, мусіць, са спачуваньня да ягонага няшчасьця, невялікую, усяго на нейкае імгненьне, паўзу і паклала слухаўку.
Цяпер адзінае, што яму заставалася, – патэлефанаваць на тую кватэру. Ён хуценька, быццам баючыся страціць запал, зь якім узяўся за справу, набраў нумар. Слухаўку зьнялі хутка, нібы знарок чакалі пры апараце. «Лерын бацька?» – дзеўка расчаравана хмыкнула і пасьпяшалася надаць голасу адценьне адчужанае абыякавасьці. Так, абвестку яны далі ўдзьвюх зь Лерай, яна не зьняла яе пасьля няшчасьця, бо сапраўды шукае працу. Калі ён жадае забраць Лерыны рэчы, можа прыехаць на кватэру ў любы час, хоць цяпер, ёй чужога ня трэба. Дарэчы, кошт абвесткі яна сплачвала адна, бо Лера якраз сядзела тады бяз грошай. Таму, калі ў яго і наконт гэтага ёсьць які сумнеў, яна можа паказаць квіток.
Надзіва, практычнасьць дзяўчыны яго ня толькі не абурыла – наадварот, чамусьці ўсьцешыла. Маладая – а гэткая ўчэпістая! Ня тое што Лера – сьпешчанае дзіця, кроку ня ўмела ступіць без бацькоўскае апекі.
Але ж во – ступіла...
Ад згадкі пра дачку ў мінулым часе патыхнула злавеснасьцю і дакорам: ці пра тое сьлед яму, бацьку, цяпер думаць? Можа, сапраўды лепш паехаць па Лерыны рэчы, раптам на месцы пашэнціць вывудзіць зь дзеўкі яшчэ якія зьвесткі? Рук, казаў той, не падкладзеш, дык хоць, можа, боль трохі адпусьціць.
Ён падняўся з канапы, трымаючыся за скроні – надта ж балела, ажно расколвалася, галава, – і паплёўся ў ванны пакой мыцца. Зачапіўся мімаходзь паглядам за цыфэрблят ходзікаў у вітальні і сьцепануўся ад зьдзіўленьня: адзінаццаць гадзінаў, а адчуваньне такое, быццам ужо ноч.
Дзеўка чакала яго, бо валіза зь Лерынымі рэчамі стаяла спакаваная пры дзьвярох, і дзьверы адчыніліся ўвобміг, ледзь ён пасьпеў дакрануцца да кнопкі званка.

– Жадаеце паглядзець, ці не засталося чаго з рэчаў?
Ён прайшоў у адзін з двух пакойчыкаў, сьлізгануў паглядам па выцьвілае шпалерыне, па дыванку пры ложку, перавёў позірк на стол. Усё акуратна прыбрана, так, як ён заўжды патрабаваў ад дачкі. З абведзенага чорнае тушшу ці не двухгадовае даўніны здымку на падвоканьні паласнула па зрэнках пара сумнаватых Лерыных вачэй. Ён памкнуўся да акна, каб узяць здымак, але дзеўка спыніла яго.
– Ня трэба, хай застанецца мне на памяць. Мы зь Лерай, хоць і не заўсёды адна адну разумелі, няблага бавілі час разам. У вас, пэўна, іншыя фоткі ёсьць, а ў мяне адна – гэтая.
– Ну, хай сабе, – пагадзіўся ён і знарок павольна адышоўся ад акна. Просьба дзеўкі расчуліла яго, і цяпер яму патрэбны быў час, каб прыкілзаць эмоцыі.
– Можаце паглядзець тут, – сказала яна і адчыніла дзьверцы шафы. – Нічога не засталося, усё я спакавала ў валізу.
– Мяне гэта не турбуе, – не зірнуўшы нават у бок шафы, сказаў ён. – Калі хочаце ўзяць што-небудзь зь Лерынага – вазьміце. Хоць і ўсю валізу... Але адкажыце на адно пытаньне...
– На якое?
– Што за праца была ў вас? Ну, у вас зь Лерай...
– Праца як праца. Дапамагалі дзядзькам пазбавіцца самоты, за грошы, вядома... Разумееце?
– Не зусім. Вы што – спалі зь імі? – голас спадара Бортніка здрадліва затрымцеў. – Так?
– Так. Праўда, не заўсёды. Надараліся выпадкі, калі абыходзілася драбязой. Пагаварыць там, пасьпяваць ці яшчэ што... Не з прыемных занятак, ды што зробіш...
Ён хацеў спытаць, ці часта даводзілася ім усё тое рабіць, але не наважыўся з боязі натыкнуцца на хлусьню і памкнуўся перавесьці размову на іншае, што найбольш вярэдзіла душу ўвесь гэты час:
– Лера... яна што-небудзь казала вам пра мяне?
– Сёе-тое... А тое, што думала пра вас, і бяз словаў няцяжка было здагадацца. Пра вас і пра маці, гэта дакладна.
– Думала? Адкуль вы ведаеце? – дыялёг даваўся яму цяжка, вельмі цяжка.
– Я не такая бессардэчная і дурная, як вам, мабыць, здаецца.
– І што яна думала?
Дзеўка пастаяла колькі хвілінаў моўчкі, моўчкі кранула здымак

на падваконьні.
– Яна казала, што чалавек павінен жыць дзеля сябе і дзеля сваіх блізкіх.
– Гэта фраза з Талстоя... У дзявятай клясе я, памятаю, дапамагаў ёй пісаць сачыненьне на такую тэму.
– Ня ведаю, не чытала Талстоя. Чытаньне не для мяне.
– Што яшчэ яна казала?
– Што вы змалку прывучалі яе да парадку. Што любы непарадак і асымэтрыя ў вас, а праз вас і ў яе выклікаюць агіду. Мяне ж дык якраз яны прываблівaюць, таму мы часта сварыліся. Нават у той дзень, калі яна скокнула... прабачце, калі яна...
– Вы думаеце, яна сама гэта зрабіла?
– Не сумняваюся. Нашыя знаёмцы, вядома, ня надта сабе, але яны на такое няздатныя, я ведаю. Так што, хутчэй за ўсё, яна сама... Я б такога ніколі не магла вычварыць.
– Чаму?
– Яшчэ чаго! Бацька кінуў нас з маці, калі мне было шэсьць гадоў. Потым маці пасадзілі... Я не дзеля таго выбівалася адна з усяго гэтага гаўна, каб... А вы... вы не вінавацьце сябе. – Яна падышла зусім блізка, трымаючыся адною рукою за рог стала, і раптам пацалавала яго ў шчаку.
– Што гэта вы? – спытаў ён зьбянтэжана і адступіў убок.
– Так, падумала, што вам гэта будзе прыемна. Замест Леры... Абвестку я здыму заўтра. Яшчэ тры дні яна мае трываць, але як ужо такая справа...
Надзіва, такое рашэньне дзяўчыны ня выклікала ў яго вялікае радасьці. Нечакана для сябе ён пасунуўся да яе, паклаў правую руку ёй на клуб. Цела яе здрыганулася, бы ад удару, хіснулася ў глыб пакою.
– Перастаньце!
– Прабачце, – панура сказаў ён і падхапіў валізу. Але тут жа паставіў яе на месца. – Ня ведаю, як гэта выйшла. Прабачце...
– Зацяжкая? Можа, дапамагчы? – дзеўка спачувальна глядзела на яго.
Яе нежаданьне гаварыць на казытлівую тэму дадало яму ўпэўненасьці.
– Ня трэба. Хай застаецца пакуль што ў вас. Можа, пазьней калі забяру.
– Як хочаце. Мяне зваць Ірынаю.

Ён выйшаў з кватэры і, не азіраючыся, хоць чуў, што дзеўка выйшла сьледам за ім на пляцоўку, пасунуўся ўлегцы да прыпынку.
Намер паехаць у лякарню да Нэлі высьпеў у яго нечакана, калі было ўжо добра апоўдні. Адзіным, што замінала тае ж хвіліны сесьці ў аўто, быў сумнеў, ці мінуўся ў жонкі пазаўчорашні прыступ, пра які надоечы паведаміў па тэлефоне доктар. І як не, то ці ня здарыцца так, як здарылася аднойчы, калі пры канцы размовы, якая датуль нагадвала дыялёг двух глухіх, яна ні села ні пала ўпершыню ўспомніла пра Тамару. Адчуваньне прыкрасьці тым разам так доўга квяліла яго, што ён некалькі тыдняў не наважваўся паехаць да Нэлі зноў. Але, можа, цяпер усё будзе іначай? Зрэшты, можна загадзя патэлефанаваць доктару і даведацца, як яна сябе адчувае.
А яшчэ яго турбавала, ці дайшло да Нэлі што-небудзь пра дачку. Вядома, сьвет цесны, ледзь здарыцца што, як усе пра тое ведаюць. Няма сумневу, рана ці позна і ёй увядзе ўсё ў вушы які-небудзь зычлівец. Хай сабе, абы не цяпер. Чым пазьней дойдзе да яе навіна, тым лепш будзе і ёй, і яму. Цяпер жа, калі зьявілася, хоць і зусім кволая, надзея на выздараўленьне, лішні стрэс ім зусім без патрэбы.
Ён набраў нумар доктара, злуючыся на гарачыню, якую адчуў толькі цяпер, і, уключыўшы кандыцыянэр, што вокамгненна напоўніў пакой шапаткім пошумам, прыклаў слухаўку да вуха. Доктар зьдзіўлена алёкнуў два разы, хутка-хутка забалбатаў пра крызу, што, здаецца, дзякаваць Богу, учора мінулася, пра непярэліўкі зь лекамі, пра нейкую нечаканую праверку, што вось ужо трэці дзень трасе ўсю ўстанову і яго асабіста, ды ён, на шчасьце...
Што на шчасьце – ён так і не зразумеў, але што Нэля адчувае сябе няблага, ён пад канец размовы ўсё ж дацеміўся.
Жонка захварэла раптоўна, як знарок – пасьля адной іх сутычкі дзелянейкае драбязы (што Нэля ўжо тады ведала пра ягоную здраду, ён здагадаўся значна пазьней). Драбязы – для яе, бо для яго дробязяў не існуе. Усё, чым жыве, чым дыхае сям'я, для яго ніколі не было драбязою. Многія тыцкалі гэтым у вочы, ды яму тое не абыходзіла. Рэпутацыя пэданта яго не бянтэжыла і не палохала: хіба гэта блага, калі ведаеш дакладна, чаго хочаш, і патрабуеш гэткага ж веданьня ад іншых?
Спачатку яму падалося, што ўся тая хваробіна – звычайная

жаночая гістэрыка. Але калі пабялелі Нэліны вочы і сьліна раптам выступіла па куточках скусанага зубамі рота, ён спалохаўся. Выклікаў «хуткую», і тая завезла Нэлю ў лякарню. Хвароба працякала цяжка, суправаджалася праваламі памяці. Абсанс, або зблытанасьць памяці – так сказаў доктар, і нічога іншага не заставалася, як яму паверыць. Нэля схуднела, была то занадта нэрвовая, то, наадварот, занадта апатычная. Апатычная – зазвычай калі памяць вярталася да яе, і тады Нэля была як Нэля – ранейшая ўсьмешлівая кабета, якую ён ведаў зь юнацтва, трошкі рэзкая, але дасьціпная, з асаблівай інтуіцыяй. Прасьвятленьні здараліся нячаста, але сёньня быў, відаць, адзін з такіх выпадкаў. Гэта спадар Бортнік адразу зразумеў, як толькі ўбачыў жонку.

– Прывёз кепскую навіну? – спытала яна і акінула яго праніклівым паглядам. – Так?

Пытаньне засьпела яго зьнянацку, і ён, зьбянтэжаны, моўчкі сеў побач з Нэляй.

– Не камплексуй занадта, – працягвала яна. – Я бачыла абвестку па тэлевізары... Праца па абвестцы – гэта вельмі кепска. Ты падказаў ёй такое? Гэта небясьпечна, вельмі небясьпечна. Ці мала на якога злыдуха можна ўзьбіцца... Вунь колькі жанчын трапляе ў рабскае сіло! Ты павінен што-небудзь зрабіць. Скажы ёй, каб кінула гэтую справу. – Яна гаварыла лягічна і пераканаўча, але ўсё адно адчувалася – паводле ледзь улоўнага трымценьня голасу, – што і лягічнасьць гэтая, і пераканаўчасьць часовыя. – Чаму Ляруня не прыехала? Той раз абяцала.

Думка, што яна нічога ня ведае пра сьмерць дачкі, дадала яму ўпэўненасьці.

– Ты ж ведаеш, мы цяпер рэдка бачымся, – сказаў ён першае, што прыйшло ў голаў.

– Яна твая дачка, не забывайся, – сказала Нэля дакорліва і паклала сваю руку на ягоную. – Твая і мая.

– Твая і мая, – падтакнуў ён і лагодна дадаў: – Нашая.

Ягоныя словы неяк дзіўна паўзьдзейнічалі на Нэлю. Яна пазяхнула, па-старэчы ссутулілася і тут жа – галава на ягоным плячы – заснула. А можа, адно ўдавала, што заснула? Бо як толькі ўвайшла мэдсястра, каб паклікаць яе на нейкую працэдуру, увобмігпадхапілася і, быццам усьцешаная мажлівасьцю як хутчэй разьвітацца зь ім, весела пашыбавала

прэч.
– Калі не дачакаешся, крыўдаваць ня буду, – сказала з усьмешкай, і ў голасе яе зноў, падалося яму, прагучала жаданьне, каб так яно і сталася.
Ён у самоце пасядзеў некалькі хвілінаў на канапе, аглядаючы пакой. Пакойчык, аж занадта просты для жанчыны такога складу, як Нэля, цяпер, калі яна пайшла, выглядаў зусім пустым і непрытульным. І яму падумалася, што вось гэткім, напэўна, уявіцца ён чарговаму тубыльцу, калі яе, Нэлю, выпішуць адсюль. Калі, вядома, наагул выпішуць: дэпрэсія – рэч непрадказальная. І яшчэ адно казытала сьвядомасьць: чаму яна гэтак холадна зь ім абышлася? Магла б і папрасіць дачакацца. Можа, знарок так зрабіла, каб прымусіць яго пахвалявацца? Можа, сказаць ёй пра Леру, яна маці і мае права ведаць... Напэўна, гэта будзе правільна. Ці, можа, спачатку параіцца з доктарам, каб крый Бог не нарабіць бяды?
Ён выйшаў у калідор, стараючыся не зьвяртаць на сябе ўвагу хворых, што панура чакалі сваёй чаргі ля працэдурнага пакою, і пасунуўся да кабінэта доктара.
Доктара на месцы не было. Ён патузаў для пэўнасьці шыкоўную ручку дзьвярэй, што ніяк не пасавала да ўбогага калідорнага інтэр'еру, і паціху пайшоў далей. Людзі з чаргі, абуджаныя ягонымі няпэўнымі крокамі, паўздымалі галовы, нібы прыцэньваючыся, што за пацыент зь яго будзе, і зноў застылі ў здранцьвелым чаканьні.
Дзьверы працэдурнага пакою расчыніліся, і доктар, той самы, якога ён шукаў, выйшаў у калідор. Сьледам за ім выйшла Нэля. Ён памкнуўся да жонкі, каб загаварыць, але яна адхіснулася ад яго, мармычучы штосьці неўразумелае, кінулася наўцёкі. Вочы яе, чвэрць гадзіны таму лагодныя і ціхмяныя, адсьвечвалі хваравітым бліскам, дыханьне было перарывістае, няроўнае. Яна дабегла да пераходу ў другі бальнічны адсек, не разьлічыўшы хуткасьці, моцна выцялася бокам аб выступ сьцяны, павалілася на падлогу. Яны з доктарам пасьпяшаліся да яе, каб памагчы падняцца, але яна сама ўсхапілася, гістэрычна закрычала:
– Не хачу! Не!
Мэдсястра, адзіная, хто, мусіць, даваў усім тут рады ў гэткія крытычныя моманты, таксама высьлізнула з пакою, абхапіла няшчасную за плечы і павяла ў палату.

– Вам лепш пайсьці, – вінавата ўсьміхнуўся доктар і нырнуў у дзьверы сьледам за Нэляй і сястрой.
Чарга, узрушаная на хвіліну надзвычайным здарэньнем, праводзіла яго цікаўнымі і, як падалося яму (а можа, толькі падалося?), непрыхільнымі позіркамі.
У кватэры гуляў скразьняк ад кандыцыянэра, гэта ўзлавала яго. Пакінуць на гэтулькі часу нявыключаным прыбор – так і да жабрацтва можна дайсьці, вунь колькі, пэўна, нашчоўкаў лічыльнік.
Хацелася піць. У лядоўні, аднак, нічога не было, апроч «біфіды». Ён надрэзаў пакет, наліў пітва ў кубак, паставіў на пліту, каб сагрэлася. Затым перайшоў у спальню, машынальна ўключыў тэлевізар, утаропіўся вачмі ў экран.
Рэклямы, на дзіва, сёньня не было, і гэта супакоіла яго.
Затое даймала смага. Ён памкнуўся да дзьвярэй, каб ізноў пайсьці ў кухню, як у гэты момант на экране зьявілася рэкляма.
Сплюшчаны між жаданьнем спатоліць смагу і конча ўбачыць, што далей будзе ў тэлевізары, спадар Бортнік уладкаваўся на канапе, не зважаючы на гарачыню, што запанавала ў пакоі, як толькі ён выключыў кандыцыянэр, пачаў пільна ўзірацца ў неахайныя, падобныя адзін да аднаго тэксты абвестак.
Але ўсё было ня тое, чаго ён употайкі чакаў. І толькі калі ён ужо амаль прыснуў, скурчыўшыся ў куце канапы, штосьці падобнае да ўчорашняга роліку мільгнула ўрэшце на экране, разанула па вачох аляпаватасьцю літараў.
Ён страсянуўся ўсім целам, раскідваючы рукамі плот зь літараў і лічбаў, што чапляліся за вопратку і дзерлі скуру, а затым з асалодаю рынуўся наперад, да моста, з адчайным жаданьнем нарэшце пачуць знаёмыя крокі.
І пачуў.
Жанчына імкліва спусьцілася да моста, хаваючы твар у каўнер палітона, збочыла ў хмызы, прыхінулася плячмі да камля вербалозіны.
«Тамара!»
Тонкая рука, гэтым разам, аднак, не Тамарына, а Ірыніна (ён пазнаў яе па бранзалеце) высунулася з хмызоў, павабіла яго да сябе.
«Ірына!» – зноў гукнуў ён і стрымгалоў рынуўся бегчы да таго берагу. Але не пасьпеў дамчацца і да сярэдзіны, як мост незадаволена рыпнуў, нібы наўмысна хочучы перашкодзіць

дапяць да дзяўчыны, выгнуўся вужакаю, шпурнуў яго вобзем. Ёлкі густы смурод, няведама скуль узяўшыся, ахінуў ягонае цела, палез жывасілам у вочы, нос, скуру. Ён дацягнуўся далонямі да бліжэйшае прэнціны парапэта, празь сілу падняўся...

У пакоі было шэра ад дыму.

Ён падхапіўся з канапы, ачмурэлы ад смуроду, пакіраваў у кухню. Вобмацкам (за дымам нічога не было відаць) выключыў пліту, сашмаргнуў з газьніцы ў мыйку абгарэлы кубак, кінуўся расчыняць фортку. Вецер уварваўся ў памяшканьне, вольна пагойсаў па падстольлі, пазьбіваў дым у рваныя клубы, загуляў па нагох.

Усё яшчэ хацелася піць.

Спадар Бортнік набраў з крана ў шклянку вады, колькімі глыткамі асушыў яе да дна.

Затым прычыніў, каб не напусьціць у кватэру сьцюжы, фортку, вярнуўся ў спальню.

Рэкляма ўсё яшчэ ішла на экране, але даччыной і Ірынінай абвесткі спаміж іншых не было. «Дзякаваць Богу», – падумаў ён і зноў скурчыўся на канапе. Літары, дражнячыся, зь яшчэ большым імпэтам замільгацелі на экране.

Крок, яшчэ крок, яшчэ...

«Пэўна, тыя двое», – падумаў ён і азірнуўся.

На сьцежцы, што вілася ад пагорка да моста, не было ні душы. Ён ізноў азірнуўся – цяпер ужо туды, дзе мінулым разам бачыў Леру.

Дачка стаяла на мосьце, выпрастаўшы рукі, і адчужана, бязь ценю страху на твары глядзела на дзьве мужчынскія постаці, што таропка спускаліся да ракі ад трамвайнага прыпынку.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/3/10**

[image]

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ

самы чад кіраваньня ў Грэцыі рэжыму «чорных палкоўнікаў» (1970 г.) археоляг Мікас Тэлемакас у часе раскопак пад г. Кастэрыя выявіў фрагмэнты рукапісу II ст. да н. э. Пры бліжэйшым азнаямленьні высьветлілася, што гэта ўрыўкі няведамай паэмы, якая паслужыла ўзорам для рымскага паэта Авідыя ў яго «Мэтамарфозах». Першаўзор у пэўных момантах разьмінаўся з клясычным тэкстам. Спаміж гэткіх

розьмінаў
было і
ўдакладненьне
легенды пра
птушку
фэнікс. Калі
ў Авідыя
рабілася
адно
цьмяная
намінка на
асырыйскі
радавод
гэтай
птушкі, то ў
грэцкім
тэксьце
радзіма
фэніксаў
лякалізуецца
зусім у
іншых
мясьцінах:

«Фэнікс» яго асырыйцы завуць, а ў Нэўрыдзе ваўчынай,
Дзе Барыстэн і Нірэя плывуць, называюць «бацянам» (βατςαυ).
Любіць ня хлеб ці траву – фіміям ды бярозавік трушчыць,
Дык жа паўтысячы год пражыве й не самлее. Прад сконам
Віць пачынае гняздо, напаўняючы нардам і мёдам,
Каб загарэцца пасьля ў дабрапахах, пасьлей жа зьняцейку
З попелу ўзьняцца, паўстаць – Ані лыс! – і зьляцець на радзіму[1].

(пераклад Алесі Гарматовіч)

Арыгінал, так і ня ўведзены ў шырокі навуковы ўжытак, згарэў у машыне разам зь Мікасам Тэлемакасам, якога за апазыцыйныя погляды прыбралі спэцслужбы грэцкіх фашыстоўцаў. Фатакопіі ж знойдзеных ім фрагмэнтаў былі абвешчаны камуністычнаю фальшыўкай. Між тым іншыя гістарычныя росшукі сьведчаць, што археоляг дакапаўся да праўды.

Нэўрыдай старажытныя грэкі называлі паўночна-ўсходнюю, усходнюю і паўднёвую Беларусь. Згаданыя рэкі Барыстэн і

Нірэя – старагрэцкія назвы Дняпра й Сажа. «Бацяном» у паўднёвых і цэнтральных беларускіх гаворках аж да сёньня называюць бусла. У гэтым канкрэтным выпадку, найбольш верагодна, гаворка вядзецца не пра звычайнага бусла, а пра нейкі пераходны разнавід ад крылатай рэптыліі да птушкі. Тое, што наш край быў радзімаю фэнікса, ускосна пацьвярджае, напрыклад, чарнігаўскі сьпіс XI ст. пратлумачэньня грэцкага «Фізіёляга»: «*Так пречечено бысть Фисилохом, нам жь видно естьство финиксов, егда летають над сивер и радимичська земли, изроня иноды на головы неблюдников яицы своя желязны*»[2]. Цікава, што пра гэтую ж акалічнасьць праз два стагодзьдзі ўспамінаў і царкоўны дзяяч Вялікага Княства Літоўскага Рыгор Цамблак: «*Финиксам час яйце метати, людем веремя гузы собирати*»[3]. Як вынікае з т. зв. «Яцьвяскіх пэргамінаў» (захавалася выданьне ў перакладзе на польскую мову Аляксандра Рыпінскага пад агульнай рэдакцыяй Адама Клакоцкага), у X–XI стст. фэніксы сапраўды вяліся на Палесьсі й шанаваліся, прынамсі, яцьвягамі, як сьвятарныя стварэньні: «*Для гадаваньня чуласьці да нашай звабнай Яцьвезі вельмі добра пілігрыміку ў далёкія куткі сьвету чыніць. Адно тады дойдзеш да цяму, чаго ж з-за цёплых мораў бацяны, знаныя там фэніксамі, сьпяшаюцца вярнуцца на Прыпяць*»[4].

З пратографу «Аповесьці мінулых гадоў» даведваемся, што ключ фэнікса, які ўвесну 945 г. ляцеў да родных берагоў, выратаваў драўлянскую сталіцу, горад Іскарасьцень, ад чарговых спробы кіеўскае княгіні Вольгі вынішчыць яго: «*Голубие врабьеве полетеша до гнезда своя: голуби до голубиник, врабьи под стрехи, абыхом тамо взгарахуться. Но летеша яко финиски и согнаше птичство мало в болото дико*»[5]. Праўда, драўляне не скарысталі з гэтай дапамогі і праз пэўны час сталі паддаліся кіеўскай правакацыі. Мабыць, за падобныя ўчынкі тагачасныя падпальнікі войнаў ды іхныя прыдворныя ідэолягі ня надта паважалі бацяну-фэніксаў. Нехта Лука Вясонны у лісьце да Аўрама Смаленскага (1199 г.) дазволіў сабе наступнае: «*Вы тамъ всегды стоишь олтовью завете, а фрязкесы черны, аки смолу, в сей олтовьне дали наперьсье пособници*»[6]. Адпаведна ня ўсе трымаліся гэтых поглядаў. Кіеўскі мітрапаліт Іларыён (XI ст.) у першым варыянце знакамітага «Слова о законе и благодати», нечырызна азываюцца аб беларускіх землях, пра фэнікса разважаў у станоўчым ракурсе: «*Тако*

1 Полное собрание русских летописей. Т. 1. Лаврентьевская летопись. Изд. 4-е. М., 1997. С. 32.

2 Греческий «Физиолог» по черниговскому краткому списку XI века. Киев, 1848. С. 39.

3 Церковь и литература в Западной Руси во времена литовских князей (от Гедимина до Витовта). Ревель, 1898. С. 91.

4 Pergaminy Jadźwingów. Paryż, 1834. S. 15.

5 Цыт. паводле: Коленко Ф., Шанцев И. История Руси: Что от нас прятали? Ростов-на-Дону, 1995. С. 60.

6 Эпистолярное наследие русской православной церкви:

Древний Псков. Очерки по истории города. Л., 1972. С. 140.

7 *Пехтелев В. Вопрос о жилищах и поселениях в местах, где не встречается камень // Вопросы истории. 1992. № 1. С. 56.*

8 Quellen des Mittelalters. Darmstadt, 1962. Band XIa. S. 654.

9 Тайны летописец Великих князей Литовских. Рукапіс з прыватнага збору гомельскага калекцыянера старасвецтчыны Сяргея Янсана. Пераклад з нямецкай А. І. Нагнацкай адкрыты.

Многія жыхары Беларусі XIII ст. сімпатызавалі францускім крыжакам. Рэч у тым, што ахоўнай гэтыя крылатыя страхавыя адбаранілі практычна ўсе абшары нашае краіны ад мангола-татарскага нашэсьця. Блізу 1239 г. пад татарскім націскам паў Гомій (Гомель), але вырушыць на поўнач нязваныя госьці не наважыліся. Італьянскі пілігрым Алінард Гротафэрацкі, што цудам ацалеў ад гомельскага пажару, хаваючыся ў прысожаўскіх зямлянках, згадваў пазьней пра тыя падзеі: «*Кароль тартарскі прыслаў на Гомель паглумленьне – дождж стрэлаў гострых і мора страшнае агню. Ваяводы мангольскія зазьбіраліся былі й далей з паўночным ветрам пайсьці, і пэўна зрабілі б тое, калі б фэніксы – птушкі чорныя – іскрою вачэй сваіх не паказілі іхныя замеры*»[8]. Дзіўная прыгадка пра «іскру вачэй» троху разьясьняецца іншай гістарычнай крыніцай. «Тайны летапісец вялікіх князёў літоўскіх», апавядаючы пра паход галіцка-валынскіх князёў Данілы і Васількі Раманавічаў у 1253 г. на яцьвягаў, удакладніў прычыны наяўнасьці ў ваяроў спэцыфічнага рыштунку: «*Мняше на ятвингов рушити, имали надобу одевати хытрость резинову на себе, и кони такожде опрятнули. А то не ради похвалки якой, но здравия власного для, ыбо знавали уже в тых краех поражки, которы финисты своими бодцами рыхло чинили през силу их ентарну, она же в еллинах електрикой ся прозываеть*»[9]. Адсюль вынікае, што фэніксы-бацяны мелі здольнасьць выпраменьваць электрычныя разрады. Але як што згадкі пра гэтую свомасьць нерэгулярныя, можна памеркаваць, што біць токам умелі толькі вельмі старыя птахі, якія ўсё жыцьцё назапашвалі прыродную электрычнасьць. Кагадзе памянёныя «яйцы желязны», імаверна, патрабавалі электра-магнітнага імпульсу, каб зь іх маглі вылупіцца птушаняты. Што праўда, фэніксы былі бацькамі нядбалымі, бо многія яйкі так і прападалі. Недасьведчанае паспольства, «ничтоже сумяшеся», уважала іх іншым разам за тэстыкулы старажытных волатаў. Рыскія біскупы, аднак, нярэдка выпраўлялі ў заходнюю Беларусь адмысловыя гастранамічныя рэйды. Прыпамінак пра тое знаходзім у «Другой інфляндзкай рыфмаванай хроніцы» Дытлеба фон Альпэнштока (XIII ст.):

Пойдзем па яйкі, што фэніксы марна губляюць.
Пойдзем і возьмем! Мы – ваяры! Ваяры не купляюць!
Пойдзем пад Берасьце, Пінск, Ваўкавыск не забудзьма!
Браць, забіраць, не пытаць – частавацца яечняю будзьма![10]

(пераклад наш. – ***Аўт.****)*

Лішне казаць, што часьцей бравым крыжацкім ваякам даводзілася, шылам патакі хапіўшы, вяртацца ў сваё калёніі. «*Лето 1290 з благославенства божъего немцам в карчемъ натолкали, дабы не покушалися гнезды ботяновы розгадывать, ища Потравы утробам своим ненасытным*», – паведамляе прыпіска да «Наваградзкага эвангельля»[11]. Тагачасныя кніжнікі цудоўна разумелі, што зьнікненьне фэнікса-бацяна можа спрычыніць крызу экалягічнай сыстэмы. У пасланьнях Гедыміна ёсьць добрае тамушаць вярджэньне: «*Жывелу і птушку біем памяркоўна, каб і прырода да нас талеранцыю мела. Вот, скажам, бацян, або фэнікс (batsian sive phaenix), птушка бязладная быццам, але мусім дбаць, каб жыла і яна, бо бязладзьдзе ейнае ёсьць часткай суладзьдзя агульнага*»[12].

Бязладнасьць фэніксаў прыгадваюць і іншыя дакумэнты. Вышэй паменаваны Р. Цамблак называў нашых бацяноў-фэніксаў не інакш як «блазны летащи»[13]. Што тут за прычына? У зборніку павучальных карацелек Івана Касабокага «Літуанскі дзесяцідзён» (канец XIV – пачатак XV ст.) занатавана гісторыя пра фэнікса, які спыніў бой паміж ліцьвінамі й крыжакамі: *В низине под горой да под дубом разложистым сойтися хотели наши литвины руськия з немчины рымськия в бою крывавом, в сечи бесщадной. Брали уже силы и отвагу ку початку сей марсовой деи. Але, оком мигнув, огледили фюнкиста-птицу в небеси, которая в полети оморочны крунгели вписовала и даже в древо тое вечистое ся стукнула звучне. По сем добре ся з дуба ляснула, на земли посела и якбы з подивленьем голову вбок свернула и смешно барзо «о-оу!» молвила. З того ооуканья воины обопольно животы со смеху надрывати стали, и смех трвал годину целую, по сей нихто уже не рачил брань усчинати, поехав восвояси улыбчиво*[14].

У т. зв. «Дзёньніку караімаў» XV–XVI стст. (шматтамовы

[10] Scriptores Rerum Livonicarum. Riga–Leipzig, 1854. Band 1. Teil 2. S. 272.

[11] Штогоднік Беларускага Архіву Сноў. Менск, 2002. С. 18.

[12] По Вышэй Гедыміне. У зборніку Каліфорнія, 2000. С. 42.

[13] Церковь и литература в Западной Руси во времена литовских князей (от Гедимина до Витовта). Ревель, 1898. С. 92.

[14]

рукапісны мэмуар вялікакняжацкіх целаахоўнікаў дэ Сіта (Decameron Lithuanicum; інструктараў) апісваецца сцэна з гаспадарскага паляванняў Белавескай пушчы. Вялікі князь Вітаўт, упаляваўшы за дзень пяцёх зуброў, ладзіў на вялізнай лясной паляне імпазантны банкет для ўсяе прысутнае брацыці. У ёмістых чопах ставіўся слаўны крупнік – гарачы хмяльны напой на мёдзе й духмяных травах. Почат (то бок сьвіта) усяляк пацяшаўся ў скокі і песьнях. У гэты момант і прыляцеў бацян-фэнікс. Дамалясава сьведку:

Мы карашмы спратов не поискивали, бо ж долг пред князьством великим литовским имали господаря славного от всякой ходеры ослонити. То и обуступавали восемью Витовта, а еще пятех на плечи тых восьми постали. И было то, яко намет, мечами навонки ощепереный. Бухтян же не глянул ани до почату, ани до мяса жубрынаго, а як поземлился, ик крупнику пошибовал, неуклюдне и, од смаги своей дикий, чан з гестым трунком до дна спорожнил, дуду у дудоря отнял, играти пробуючы, не од хмельной той утехи ся пал невомнози долу и тризнил през сон песни вояцкие литовския ненадобне кривляючы[15].

Дэ Сіта (Decameron Lithuanicum; інструктараў) апісваецца сцэна з гаспадарскага паляванняў Белавескай пушчы. Вялікі князь Вітаўт, упаляваўшы за дзень пяцёх зуброў, ладзіў на вялізнай лясной паляне імпазантны банкет для ўсяе прысутнае брацыці. У ёмістых чопах ставіўся слаўны крупнік – гарачы хмяльны напой на мёдзе й духмяных травах. Почат (то бок сьвіта) усяляк пацяшаўся ў скокі і песьнях. У гэты момант і прыляцеў бацян-фэнікс. Дамалясава сьведку:

Мы карашмы спратов не поискивали, бо ж долг пред князьством великим литовским имали господаря славного от всякой ходеры ослонити. То и обуступавали восемью Витовта, а еще пятех на плечи тых восьми постали. И было то, яко намет, мечами навонки ощепереный. Бухтян же не глянул ани до почату, ани до мяса жубрынаго, а як поземлился, ик крупнику пошибовал, неуклюдне и, од смаги своей дикий, чан з гестым трунком до дна спорожнил, дуду у дудоря отнял, играти пробуючы, не од хмельной той утехи ся пал невомнози долу и тризнил през сон песни вояцкие литовския ненадобне кривляючы[15].

[image]Птушку на просьбу Вітаўта так і пакінулі на пачатковы самі перабраліся на іншае месца. Караімы змаўчалі, а сакратар з тых часоў колькі фэніксаў прыручылі для дзяржаўных патрэбаў. Недалёка ад Вільні быў зладжаны адмыслоўы гадавальнік. Чарада фэніксаў у небе над сталіцай Вялікага Княства адлюстравана на гравюры ў «Універсальнай хроніцы» Сэбастыяна Мюнстэра (Базэль,1545). У 1579 г., калі войскі Паспалітай пад загадам Сьцяпана Батуры вызвалялі маскоўскага непрыяцеля Полацак, «*дождж і непагоддзе вельмі дапамагалі асаджаным так, што просты жаўнер прыпісваў гэта якім-небудзь чарам…*». Таму была прынята пастанова выкарыстаць фэніксаў для разгону хмараў. «*Кароль загадаў, каб баявыя птахі ляцелі да полацкіх сьцен і не адляталі да тых часоў, пакуль апошняя хмурынка не растане ў нябёсах*», – паведамляе каралёў сакратар Райнгольд Гайдэнштайн[16]. У гаспадарыча Ўладыслава Вазы быў свой пэрсанальны фэнікс (personal phaenix). Ён узяў яго з сабою ў 1610 г. да Масквы, калі

[15] Дневники царствования Царя Василия Іоанновича 1606-1610 гг. Рукапіс Публічнай бібліятэкі Бухэнцы Айрэсі. Інв. № 1506. С. 140.

сам у выніку геапалітычнага посьпеху атачэньня свайго бацькі быў пасаджаны на тамтэйшы вялікакняскі сталец. Пражыла птушка менш, чым Уладыславу давялося ўладарыць Маскоўшчынай, бо баяры спаілі яе гарэлкай. «*Слабовата есть королевская птица, коль нас перепити не в силах*», – цынічна заяўляў адзін зь вінаватых у тым злачынстве Фядотка Марозаў[17].

Паказальна, што за часы ваеннага ліхалецьця сярэдзіны XVII ст. фэніксы, незадзейнічаныя ў дзяржаўнай службе, упарадзе[16] Гайдэнштайн спрабавалі трымацца нэўтралітэту. Ставалася так, што Надушкі рабіліся ахвярамі ўсіх бакоў тагачаснага канфлікту. Так, у 1654 г. пад Шкловам дзесяць маскавітаў пулялі ў фэнікса з ручніцаў, прымаўляючы: «*На кой ляд ты здеся кружишь? Коль не имаеш второй головы, то мы тебе сим часом перекрутим открутим*»[18]. Троху раней, улетку 1649 г., нехта Раманоў загадаў служкам, каб злоўленаму ў сіло бацяну «*стеклянуют, прутов прописали, поелику сей мужикам на украйну не хотел летати помогал*»[19]. Дзеля справядлівасьці трэба адцеміць, што потым сам распарадзяльнік быў за свае самаўпраўства пакараны высокім спагнаньнем у «восемсот грошей пенезных» (амаль кілятам срэбра), бо «*фигчеваных свесток для избиенья птицы пригнул и злым обычаем безвинну птаху звиновател а на здирство з наругой спустил*»[20]. Між тым самі «мужыкі», напрыклад, літоўскім дзяячком 1654 г. у Быхаўскім павеце, «*яко птицы сопливые у битьина из рагулек стрыгли*»[21]. Пенькі пена Грывольскі з гэтай нагоды адзначаў:

Дзівосная кроніка XVII ст. Ці ўсе птушкі – птушкі, а мужыкі ўмеюць толькі мець?

Рэчы прыгожыя, але ці ўсе яны патрэбныя?

Трывожны сон Рэнэ Дэкарта

Пра цікавы момант дазнаемся з сатырычнага твору другой

Дзівосная кроніка XVII ст. Ці ўсе птушкі – птушкі, а мужыкі ўмеюць толькі мець? // Наш век. – 2008. – № 2000. – С. 80.

Рэчы прыгожыя, але ці ўсе яны патрэбныя? // Наш век. – 2000. – № 2000. – С. 80.

Трывожны сон Рэнэ Дэкарта // Наш век. – 2000. – № 2000. – С. 80.

Пра цікавы момант дазнаемся з сатырычнага твору другой

16 Гайдэнштайн Р. Надушкі // Наш век. – 2000. – № 2000. – С. 80.

17 Сношения с Польшей. Центральны дзяржаўны архіў старажытных актаў (Масква). Ф. 79 біс. Воп. 1. Спр. 86. Арк. 31.

18 Цыт. паводле: Цывін Л. Нашэрх з гісторыі беларуска-маскоўскіх дачыненьняў цягам XVI–XVIII стст. Чыкага, 1975. С. 75.

19 Литовская метрика. Книга публичных дел // Русская историческая библиотека. Юрьев, 1914. Т. XXX. Н. 2. [Слупок 681.]

20 Там жа. Слупок 690.

21 Быхаўскія кроніка XVII ст. // Наш век. – 2008. – № 2000. – С. 80.

22 Дыпломатычны архіў старажытных актаў (Варшава). Ф. 1. Воп. 1. Спр. 80.

паловы XVII ст. «Казанье поляшуцке схызматычне». Ананімны аўтар, прамаўляючы ад імя праваслаўнага, верагодна, насамрэч ня быў ані праваслаўным, ані каталіком, бо ў творы жорстка высьмейваюцца абедзьве канфэсіі. Як што ў сатырычную аблямоўку патрапілі вылучна рэальныя падзеі і асобы, то нельга сумнявацца, што і згадка пра бацяна-фэнікса не разьмінаецца з рэчаіснасьцю:

Та ж вы нам мерзености робыты горазды. Тильки мы помыслылы, абыхом ку вере наськой истинной ботяна повернуты, яко обачылы в сьроде обитанья оных птыц вас – попов папэжских. И що ж тэпэр маемо? Горэ, бида, огорченье! Ибо крычаты сталы тыя птыцы святодавныя: «Аллах акбар!», од вас одступовавшы. Що вы там робылы?[23].

З азначанага часу фіксуецца сугучча (для некаторых вушэй) клёкату фэніксаў з пачаткам мусульманскіх модлаў і ўспышку нядзіўна, што ў 1683 г., на аснове адмыслова заключанага «ряда», колькі фэніксаў разам з войскамі Рэчы Паспалітай загадам Яна Сабескага адправіліся да аўстрыйскай Вены, якая цярпела ад асманскае пагрозы. Параза турэцкіх войскаў на чале з Кара Мустафой была прадвызначаная: налёт страхатных фэніксаў, якія нікога не чапалі, а толькі на ўсю моц драпалі горла, прывяла туркаў у сьвятарнае трымценьне, паводле якой і скарысталі нашыя войскі. З кім каралеўскія ўлады заключылі «ряд», з рэшты дакумэнта цяжка даступіцца аналізу. Але факт вымушанасьці польскамоўнае вярхушкі Рэчы Паспалітае ствараць па-беларуску афіцыйны дакумэнт той парою, калі палітычныя эліты амаль цалкам зь беларушчынай разбраталіся, вельмі важны. За фэніксамі стаяла нейкая таямнічая палітычная (?) сіла. Што за яна? На жаль, у паперы, папсаванай мышамі й стрыжамі, дзірка між літарамі «К» ды «Ы»[24]. Купцы? Курвы? Крэвы? Пытаньне застаецца адкрытым.

Фэніксы ня сталіся зьявішчам штодзённым. Іх вобраз заховаў арэол загадкавасьці і казачнасьці як для многіх абывацеляў ВКЛ, так пагатоў для жыхароў суседняй Масковіі. Дзівакам уражвалі сваіх сяброў і расчульвалі сэрцы каханых жанчын. Запісы 1695 г. гавораць, што нейкі «*пан Михал Богданявский оповедал и до актовых книг головных трибунальских*

[23] Кунцэвіч Зуціш Пукайпад Вянок, нага страхатных (Вакуленка). [24] Акт № 5903, 43 адз. с.

Пастрамізоновичем.

вечистых уписати дал светченье, же пан Францишек Сахадольский, Копаць – каштелянич брестянский – през ботяна-фенкса Миколя Кгедройтя, Криштофа Малхеровича а Бальцерака Кгедройця злякал до хоробливости вомитной. А имали пред тым банкет, игде тылко водку злую за колнер проливали. А Копаць оный пил мизерне, бо юж а priori постанову собе учынил: фортель який-колвек пред другове свои выкинути. Гды тыя три паны добре пьяныя уробилися а хотели кони седлати и ехати до шуканья пригод на подспинье свое, пан Копаць мовил хитре: «Рыцареве, паны-братья мои, ходемте валей цмока звальчим». Панове смехом ся пробрали, але рушили веспол в показуемое Копцем мейсце»[25]. Захмялелая брацьця сьцяміла, хто сядзіць на ўзгорку, і стала «похвалки чынити», цьвелячы фэнікса выклікамі на бой: «*Пане цмоче, растули очи. Имаем мечы готовы ку сечы*». Птах тым часам драмаў і «*в ленитве своей велькой*» пракрумкаў: «*А лоха в дар?*» Гэтае пытаньне з «цмачынае» зяпы зрынула шляхцюкоў да ўцёкаў. І беглі яны так хутка, што апынуліся неўзабаве ў страшэнным для здароўя стане, калі «*похмелье еще не зачалося, а глова юж болестна ест*». Як вынікае, праўдзівы сэнс бацяновай фразы быў інакшым, чым многім здавалася. Птах цікавіўся, ці атрымае ён у дарунак за сваю працу цмокаімітатарам лоха. Лохамі ў тыя і крыху пазьнейшыя часы называлі конскіх самцоў (прыраўн. суч. дыял.: «лошадзь», «лашак», «лашонак»).

У верасьні 1715 г. шляхціц з Ашмяншчыны Ян Раноч, кінуўшы жонку і дачку-падлетка, адправіўся ў вёску Сухадолы ў наведкі да маладзенькай Талімэны Андрыеўскай. Бацька ейны сумяшчаць ня быў, мысьлячы, што «*стары конь маладое баразны не портсуе, а фанабэрыю бабскую, якая з дачкі бяз ладу прэ, утаптуе*». Фанабэрыя, паводле сьведчаньня т. зв. «Леапардавай раптуляра» Ранка (1714–1718), сапраўды з Талімэны фантанавала. Што ў бацьку, што ў бок ягоных пахолкаў, неспадзяванага жаніха ляцелі ня толькі кепікі ды кпіны, але і глякі ды збаны. «Я чакаю князя», – цьвердзіла ўпартая паненка. Вырашыўшы даць Яну гарбуза, яна шмыгнула із сваіх пакояў да гародчыка. Талімэна меркавала неўпрыкмет для ўсіх падрыхтаваць ганебны падарунак. У блізкіх ліпах ганарліўка ўчула дзіўнаваты шолах, азірнулася на гук і аж зьнерухомела: велізманыя вочышчы плюскалі ў цемры. «Ну шо, красуня? Паляцелі?» – так запыталася няведамае ёй страшыдла. Паненка

[25] Вацлаў Owadowicz. Tom 2. Kraków, 1887. T. 2. S. 431.

[25] Пересказ цитируется по: Архив Юго-Западной России. Киев, 1866. Ч. 3. Т. 2. С. 315–318.

колькі часу стаяла з разяўленым ротам, урэшце разгледзіўшы «дзюбу, скрыдлы і крывыя капцюры» фэнікса. «Чаго я з табой палячу? – азвалася-такі яна. – Я ўжо вялікая дзяўчына, каб лётаць. Дый ня ведаю я цябе, дзядзьку. А во зараз мой жаніх прыйдзе, ён табе хваста накруціць-надзярэ». Нібыта выпадкова побач апынуўся пан Ранок і як мага больш сур'ёзна спытаўся:

– Хіба князь да пані прыехаў?

Тая толькі кіўнула ў бок ліпаў. Ян з барочнай велягурыстасьцю ўзяўся крычаць да фэнікса:

– Ах ты, злосны, паскудны, брыдкі, нехарошы дракон! Гэта мая нявеста, я абараняцьму яе, хоць бы месяц і зоры абваліліся на галовы збройных чужаземнікаў, нячэсных прыяцеляў нашага гаспадарства!

– А лоха ў дар? – прагучэў прадказальны, але незаплянаваны для гэнага спэктаклю запыт.

– А ў вока даць? – перапытаў кемлівы шляхцюк і кінуўся на фальшывую бітву. Разам з бацяном яны схаваліся за дрэвамі ды сталі «*водку жаландковую бахусаваці*», а каб Талімэна думала, што «валка цягнецца», ушчалі «*па дзераве, каменьні і зялезе грымеці*». Па ўсім паненка выйшла замуж за «пераможцу фэнікса», але так і не змагла даўмецца, чаму пасьля бязьлітаснага бою ад рыцара ейнага сэрца патыхала гарэлкай[26].

Той парой, калі Ян Ранок фальшывымі баямі вырашаў свае любосныя праблемы, па Беларусі грымелі рэальныя баі нячэсных прыяцеляў і чэсных непрыяцеляў. Ішла т. зв. Паўночная вайна паміж Расеяй і Швэцыяй. Калі беларускія аднарогам удавалася часьцяком караць чужымнікаў, дык фэніксы, трымаючыся сваёй даўняй мірнай традыцыі, больш самі цярпелі ад ворагаў. Нельга, аднак, сказаць, што дзівотныя птахі зусім ухіліліся ад супраціву. Іх супраціў мае выразна негвалтоўны характар, у чым яны значна апярэдзілі і Магатму Гандзі, і нават Джына Шарпа із сваімі 198 мэтадамі негвалтоўнага супраціву.

[26] Гэта пераклад з беларускай: *Зъехались, Тамбіўскай абласьці, Хілі і Пагінацыя адсутнічае.*

Сраженье у Головчина обещало зело претруднейшим быть. Его

императорское величество Петр Алексеич бдели деннонощно целую седмицу, радея об одержании виктории над супостатами шветскими, – згадвае невядомы расейскі мэмуарыст пра падзеі 1708 г. – *И всей времянный промежуток претерпели Они неединожды сильно от летающего урода литовскаго. Сие уродище прилетало к шатрам царским и корчило рожи, коих описать здеся никак нельзя, дабы не оскорбляти паметь об императоре руссийском. Белоруссцы полоумно рекут оного летягу «бацяном» (сиречь отцем) всего птичства. Средь буйной шляхты литовской сей выблюдок крилатый называется фениксом. Бывают в людех умопомрачения!*[27].

А вось што прыгадваў пра падзеі сярэдзіны 1708 г. швэдскі жаўнер Ёхан Свэнсан:

Сутоньнела ў ваколіцах Магілёва (Mohuljew), і ў гэтую брыдкую шарую гадзіну, калі нам не дазвалялі запальваць агнёў, у небе зьявіліся велізманыя птушкі. Яны ціха ляцелі над намі і мелі ў сабе (у каго пазычыць глуздоў, каб зразумець, як гэта выйшла!) агні, што стваралі сабою асобныя літары і іх спалучэньні. Сэрца паўспаўнялася трывогай, шлуньне пераварочвалася ад вусьцішы. «Фіндос пад нос вам, швэды», – разабралі нашыя знаўцы тутэйшых моваў усю фразу, але перакласьці яе ў швэдзкую цалкам так і не змаглі. Гэта кепскі знак[28].

У 1768 г., калі ў ваколіцах Рагачова ішлі ўпорыстыя бакі паміж расейцамі і партызанамі барскай канфэдэрацыі, фэнікс засьведчыў сябе іначай. Расейцы ўлетку таго году нашлі на сьлед аддзелу нейкага Іванькі Балахона. Аддзел быў тым болей для іх ненавідным, бо складаўся не із шляхты, а зь мяшчанаў і сялянаў. Пасьля кароткага, але дужа зацятага бою партызаны былі разьбітыя і ўзятыя ў палон. Расейскае камандаваньне лічыла супраціўленцаў «мятежниками» і рыхтавала жорсткае пакараньне. Пяць дзясяткаў паланёных па чарзе былі прывязаныя да гарматаў і расстраляныя ў сьпіну (празь якія 90 гадоў гэтакі спосаб пакараньня пазычаць ангельцы для расправы над індыйскімі паўстанцамі-сіпаямі). Сьведкам гвалту стаўся фэнікс. Але ратаваць беларусінаў было запозна – на вачах птаха апошнім гарматным стрэлам быў разарваны Іванька Балахон.

[27] Рассказ неизвестного солдата российского, бывшего участником Северной войны. Санкт-Петербург, 1800. С. 5.

[28] Kriegsmerk Dagböcker. Lund, 1902. V. 2. S. 57.

Сей воровской разбойник Ваня Болохонин пред смертию восклицал в небеси, взывая не к Богу, но к иному могуществу, – прыпамінае ў сваім тайным дзёньніку расейскі афіцэр Павал Галаўнёў-Седаўласаў. – *В очех солдат, кои приводили присуд в исполненье, замелькало сомненье, ибо над главами нашими воспарила преотвратительнейшая птица. Я приказал продолжать исполненье присуда, а остальным – начать стрельбу по страшилищу. Оное изронило истошный вопль, от коего средь многих наших кровь чрез уши проступить изволила. По сем же оно начяло в нас огнем, аки Змей Горыныч, рыгати. Огонь его, справедливости ради укажу, невидимым был, ибо обуглилися наши ребятушки прямо на месте, не воспламеняясь даже. Как спасенье обрел, предположить не смею, уповая токмо на Господа, восхваляя Его. Укрылся я на телеге в сундучке древляном, мысля, коль уж умереть суждено, так пускай хоть в подобии гроба лежащим*[29].

Пасьля гэтага інцыдэнту расейцы перасталі выкарыстоўваць у сваёй практыцы памянёны разнавід пакараньня беларускіх партызанаў. Лавіць фэнікса тады ніхто не рызыкнуў, хіба Галаўнёў-Седаўласаў «*кровную обиду на белорусскаго фомиста поимел*».

[29] Гусаць у Сердюкасов Ю. Ю. В фомистанья о ратных трудах. Нижний Новгород, 1832. С. 220.

І ўсё-такі цяжка адказаць на пытаньне: адкуль «усмирители» ды «освободители» назапасілі ў сабе столькі нянавісьці да нашай чароўнай птушкі? 4 ліпеня 1796 г. злоўлены пад Лоцкай бацян-фэнікс быў дастаўлены расейцамі ў Менск. Там на нейкім «низком месте», паводле сьведчаньня Тадэя Булгарына, апавітай ланцугамі птушцы расейцы «*пытались отсечь главу. Попытка превратилась в пытку как для яе, тако ж и для русских*, – тлумачыць акалічнасьці мэмуарыст. – *Мастерить гильотину местные высшие чины поленились, и десяток русских солдат был вынужден орудовать топорами*». Кроў цэлымі патокамі хлынула з фэнікса, і нягеглыя ваякі апынуліся «*сначала по локоть, а затем и по горло в густой крови*». Выбрацца з той гушчы не ўдалося нікому [30]...

У сьнежні 1812 г. на Віцебшчыне расейскія войскі без Булгарин стратэгічнай мэтазгоднасьці ўпалявалі фэнікса і, зьвязанага канатамі, залілі на марозе халоднай вадой[31]. У красавіку 1831

[30] Ф. Кнага о ставках 1831

г. пад Ашмяной казакі і чаркесы пасеклі на кавалкі Юзэфа, зь перабітым крылом, фэнікса-бацяна[32]. У часе паўстання 1863–1864 гг. расейская карная група ў няведамы спосаб замардавала нашу чароўную птушку. Жаўнеры нават сфатаграфаваліся каля трупа. На зваротным баку здымку, што захаваўся да нашых дзён, цынічны надпіс: «*Смотрите, мышонка, с одним чудовищем справились. Осталось найти Калиновскаго. Экст. 1 июня 1863 г., село Накрышки Гродненской губ.*»[33].

Юзэфа нумізматыка 1827–1862 Сентябрь.

31 Cudzoziemcy o Polsce i Litwie. Kraków, 1973. S. 75.
32 Dodatek do pamiętników Ignacego Domeyki. Warszawa, 1901. S. 18.
33 Фатаграфія з прыватнага збору гомельскага калекцыянэра старасьветчыны Стывэнсана Я. П.

Даволі цяжка паддаюцца зьясьненьню пэўныя падзеі 1905–1906 гг. Традыцыйна лічыцца, што ў адпомсту за загад расстраляць мірную маніфэстацыю ля Віленскага вакзалу ў Менску (17 кастрычніка 1905 г.) эсэр Іван Пуліхаў ажыццявіў замах на губэрнатара Курлова, быў схоплены і неўзабаве павешаны на варотах Пішчалаўскага замку. Ягоны труп чатыры дні вісеў, нібыта для застрашэньня гараджан. Як высьвятляецца, насамрэч улады ніяк не маглі знайсьці сьмеляка, каторы б наважыўся зьняць цела з бэлькі. Іван Пуліхаў быў не зусім чалавекам. Знойдзеныя нядаўна Ахрэмам Шыбтымавым фрагмэнты апісаньня патолягаанатамічнага агляду цела знакамітага эсэра сьведчаць пра мноства дзіўнотаў: «*элементы чешуи по всему телу», «строение глаз выразительно птичье», «шестипалость обеих рук», «странные уплотнения на предплечьях». «Провести должным образом вскрытие не удалось. После первого надреза по неизвестной причине тело воспламенилось*», – занатаваў патолягаанатам Ёсель Цынгель[34]. Магчыма, Пуліхаў быў фэніксам-пярэваратнем – апрычоным адгалінаваньнем ад галоўнага віду? Такія, як Пуліхаў, вырозьніваліся меншымі памерамі і дзівоснай здатнасьцю выглядаць як *homo sapiens*. Пра іх нам гавораць і беларускія легенды: часьцяком у іх прыгадваецца, як вогненны зьмей або цмок здатны абяртацца ў чалавека[35]. А беларускаму народу мы можам цалкам давяраць, бо ён мудрэйшы за ўсе акадэміі навук.

Фэніксы ахвотна супрацоўнічалі зь дзеячамі навукі і культуры Беларусі XIX ст. Філяматам, што надта любілі правадзіць досьледы з электрычнасьцю, даводзілася камунікаваць з гэтым перастарым фэніксам, што жыхарыў у ваколіцах Вільні. Да нас дайшлі чарнавыя запісы для спавешчаньня «Апісаньне Беларусі для высьвятленьня наступстваў узьдзеяньня электрычнасьці (Менск)». Ф.

34 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Мінск). Ф.

фэнікса на малако і мёд» (каля 1817 г.). Аўтарам спасылкі быў адзін зь філямацкіх фізыкаў Аляксандар Карнэліюс Дзядэцкі. Вынікі экспэрымэнтаў былі сэнсацыйнымі: пчолы малака, што зь мёду пасьля электраўдару ўтваралася гарэлка[36]. Як ведама, удзельнікі тайных студэнцкіх таварыствау у сваім ставленьні да ліцьвінаў не адрозьніваліся ад большыні сваёй эпохі: іншынародцаў, нават і слабейшае. Аднак гэтае адкрыцьцё ня стала ведамае для шырэйшага навуковага й грамадзкага кола.

[36] Dziadecki A. K. Lustracja sproby... [Рукапіс. Нацыянальная бібліятэка Польшчы (Варшава). Інв. № 68958 I]. С. 9.

У 1880-я гг. нейкі фэнікс жыў на Ўзьдзеншчыне ў маёнтку Над-Нёман, які належаў прыродазнаўцу Якубу Наркевічу-Ёдку. Маёнтак быў ператвораны пад экспэрымэнтальную лябараторыю, у якой дасьледаваўся шырокі спэктар фізычных зьяваў улучна з электрычнасьцю. Дзякуючы фэніксу ставіліся досьледы і з радыёхвалямі. Паводле сьведчаньня юрыста Януар'я Плескачэўскага, 29 кастрычніка 1887 г. Наркевіч-Ёдка, «*выкарыстоўваючы электраздатнасьць фэнікса, бяз дроту перадаў гук з Над-Нёмну ўва Ўзду. З адмысловай скрынкі ў маіх узьдзенскіх апартамэнтах я пачуў у хрыпеньні і шоргаце знаёмы голас навукоўцы: «Літва! – родна зямелька, – ты маўляў здароўе!*» Радасьць мая крэсаў ня знала»[37]. Запатэнтаваць вынаходку, на жаль, не ўдалося – у навуковых колах расейскай імпэрыі вельмі моцнымі былі прапапоўскія настроі (але ці праводзіў тады Папоў свае вышуканьні, невядома). Дый сам ліцьвін-беларус не жадаў лішні раз нагадваць расейцам пра дзівоснага птаха, які так моцна ад іх цярпеў.

[37] Pleskaczewski I. Wspomnienia z przeszłości. Lwów, 1933. S. 125.

Асобна варта адцеміць заслугу беларускага фэнікса ў нашай Нацыянальнай Рэвалюцыі 1918 г. (паводле выразу Алеся Луцкевіча). Калі Беларусь рэзалі лініяй фронту, калі ейны лёс, як і лёс усёй Сярэдняй Эўропы, здаваўся вельмі няпэўным, найлепшыя сыны нашае Бацькаўшчыны гучна абвесьцілі пра незалежнасьць Беларускае Народнае Рэспублікі. Бо, як ведама, 25 сакавіка 1918 г. Вырашальную ролю ў прыняцьці Вялікага Сакавіковага Акту – Трэцяй Устаўной Граматы БНР – адыгралі віленскія дзеячы, якія 23 сакавіка далучыліся да працы Рады БНР. А маглі б і не далучыцца, бо падарожжа па віленска-менскім адцінку Лібава-Роменскай чыгункі ледзьве ня скончылася трагедыяй. Недалёка ад вёскі Турэц-Баяры банда маладэчанскіх разбойнікаў на чале з Антонам Шадрыным

(мянушкі – Ангел, Белы, Сьняжок) рыхтавалі напад на цягнік. Атаман меркаваў, нібыта ў адным з вагонаў тайна перавозіцца каштоўны груз: золата і дыямэнты. Разбойнікі зазвычай нікога з пасажыраў жывым не пакідалі. Нездарма ж на сваім чорным сьцягу з выяваю белага чэрапа і костак атаман зьмясьціў покліч: «Без царя во главе». Віленчукоў чакала немінучая расправа. Аднак у бандыцкія пляны ўмяшаўся злы рок. Калі бандыты ўжо сядлалі коняў, над лесам, дзе яны таіліся, праляцеў незвычайна вялізны фэнікс. І хоць цемра агарнула хеўру на зусім кароткі адцінак часу, яна (гэтая цемра) падалася бясконцаю. Атаман Шадрын, які ўперад быў настаўнікам расейскае славеснасьці, адразу прыгадаў «Слова пра паход Ігараў» і сьпехам адмяніў выправу[38].

Не зусім ясна, ці ведалі самі беларускія дзеячы, якая зьява ім іх абмінула. Мабыць, што так. Ускосна пра гэта цьвердзіць агентурнае паведамленьне з Акадэмічнай канфэрэнцыі 1923. рэформе беларускага правапісу і азбукі (лістапад 1926 г.). Агент ГПУ «Катя» перадаў у цэнтар наступнае:

[38] Нагодзе рудзкіе школы 1923. (Парыж). С. 30–32.

Антисоветские вылазки наблюдались и в кулуарах. Иосиф Лесик по неизвестным, однако заведомо провокационным причинам затеял спор о белорусском правописании слова «феникс». Отказывая трудовому белорусскому народу в праве иметь в своем алфавите букву «ф», он предложил писать это слово через «п», а вторую букву, дабы не выкликать неуместных ассоциаций, – заменить на «ё» («пёникс»). Присутствовавшие при этом отдельные участники конференции, согласившись с первым утверждением, в остальном воспротестовали. Степан Некрашевич настаивал на написании «хвэнікс» или даже «хэнікс». Петр Бузук – «тэнікс». Лишь Ластовский, категорически отметая все варианты, в свойственном ему мелкобуржуазно-нацдемовском угаре заявил о необходимости воскрешения давнего смысла белорусского слова «бацян», предлагая писать его через «цьц» («бацьцян»), а после возможной реформы по возврату старобелорусской письменной традиции – через «тт» («баттян»). При этом он ссылался на какие-то «дакумэнты» беспросветного прошлого Белоруссии времен крепостничества и поповско-ксендзовской вакханалии[39].

Чым бліжэй да нашага часу, тым менш сьведчаньняў пра

[39]

дзівоснага птаха. Вельмі цяжка выявіць сярод разнастайных паведамленьняў пра НЛА над Беларусьсю апісаньне істоты, падобнай да бацяна-фэнікса, а не лятучай талеркі ці чайніка. Нарэшце, у хуткім часе пасьля нямецка-савецкай вайны ў 1941 г. чырвоныя памежнікі неаднакроць фіксавалі зьяўленьне ў небе рознага кшталту летакоў – ня толькі звычайных самалётаў, але й самалётаў, нібыта «*окрашенных в подобие птиц, со странным механизмом помахивания крыльями и непривычной амплитудой полёта*»[40]. Сяляне вёсак Ласі й Мясота, што туляцца да дарогі Маладэчна–Радашкавічы, захавалі легенду пра вялізнага чорнага бусла, які ўлетку векапомнага 1941 г. урэзаўся зь неба ў калёну фашысцкае тэхнікі. Пэўны час гэтае паданьне лічылася народным ліра-эпічным пераўвасабленьнем зьвестак аб вычыне лётчыкаў экіпажу Міколы Гастэлы. Аднак больш дакладныя апытаньні бабуляў і дзядуляў падчас палявых дасьледзін дазволілі маладым этнографам выясьніць праўду. «*Не, дзіцятка, самылёт патом паляцеў на немцаў. Пярвей ж ішоў, вялікая, з магутнымі крыламі, у фашысцкія машыны і кабы ўпала*», – адзначыла сьведка падзеяў, настаўніца гісторыі Васіліна Язэпаўна Арцюшэня (1926 году нараджэньня, Чаўсы).

Вучэньні войскаў беларускай вайсковай акругі 1952 г. над Слонімам фактычна ператварыліся ў бітву між Савецкай Арміяй і беларускімі партызанамі з атраду «Чорны ястраб». Партызаны блякавалі камандзіра Беларускай вайсковай акругі Сямёна Цімашэнку, і партызанскі генэрал Міхал Вітушка, пераапрануты ў савецкую форму, камандаваў замест яго вучэньнямі, аддаючы наўмысна няправільныя загады[41]. Страты былі як з боку савецкіх салдатаў, так і з боку беларускіх партызанаў. Яны маглі быць у колькі разоў большымі, каб не ўмяшаньне ў канфлікт фэнікса. Птах замаруджваў, а то нават і спыняў у лёце артылерыйскія снарады, што ляцелі на галовы вайскоўцаў. Пасьля арышту Вітушка быў абменены на Цімашэнку. Даведаўшыся пра фэніксаў учынак, партызанскі генэрал упаў у задуменьне і ўрэшце вырашыў спыніць збройную барацьбу супраць савецкае ўлады[42].

Ці ня самы апошні раз бацяна-фэнікса беларусам давялося бачыць у сярэдзіне 80-х гг. XX ст. 26 красавіка 1986 г. адбыўся выбух на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Вітушка //

40 Шапуцько И. Кабы не стрэлі // Сталінскі сакол. 1941 год. Супэрсэнсацыя. 2000. № 12 (ліпень).

41 Ёрыш С. Пенадбыўся

Радыяактыўныя аблокі вецер гнаў у бок Масквы. Савецкае кіраўніцтва прыняло рашэньне разьвярнуць аблокі, каб зьняць імаверную пагрозу савецкай сталіцы. Лётчыкі, што траўляліся жывымі пасьля гэтай спэцапэрацыі, пазьней апавядалі пра агромністую птушку, што паглынала аблокі. «*Было очень страшно от осознания непонятности происходившего. Нам ведь толком что к чему не объяснили*, – успамінаў лётчык Клім Алегаў, – *тем более пришлось ужаснуться, видя, как эта птица пожирала тучи, словно старалась опередить нас*»[43].

Нельга забыць таго наймацнейшага патрыятычнага парыву, зь якім птушка фэнікс імкнулася асланіць сваю родную зямлю ад жудаснай бяды. Ці выжыла яна пасьля гэтага, мы ня ведаем. Вельмі хочацца верыць, што яна й да сёньня жыве ў гушчарах Палесься, дзе не заўважна чалавека. Жыве і спрыяе тайны, каб урацце ахоўваць Маскву, адным не 50, даводзячы сьвету сваю і нашу неўміручасьць.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (34) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

[image]
A R C H E

П а ч а т а к № 5 (34) - 2004
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image]
[image]2004
"да Зямлі"
паэмыка • эналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

АЛЕСЬ МАКРАЦОЎ
паэт

Алесь Макрацоў

Цела бацькі -
На могілках.
У хаце -
душа і рэчы...

Гляджу
на затоку ракі:
як душы
з іншага свету,
з дна
падымаюцца
бурбалкі...

Што паразіты
ў поўсці,

хцівыя людзі
ў лесе...

Не стаў
будзіць маці:
у сне -
пабыла на вяселлі...

***

***

***

[image]
[image]

№ 5 (34) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

Мінулыя (1'2000)

[image]
A R C H E

[image]

[image]
[image]2004
[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

Пачатак № 5 (34) - 2004
[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

там белых
дзевак
катавалі.
Нават ад
назвы нашай
установы
хоць ты
сьмейся,
калі б не
было так
млосна, –
кнігарня для
дарослых
«Афрадыта».

Уваходзіць Дзіна, наша прыбіральшчыца. Клятчасты пакет у яе руцэ сьведчыць, што вячэра будзе з суседняе піцэрыі. Мы зь Дзінай дамовіліся, што па дарозе на працу яна купляе пад'есьці на дваіх. За вячэры заўсёды плачу я. Дзіне гадоў 60 – добрая жанчына, якую жыцьцё ня надта шкадавала. Ад яе сышоў муж; яна згадвала яго пару разоў, відавочна хвалюючыся. Маўляў, ён шмат вандруе – Атлянтык Сіты, Бэрмудзкія выспы, – а яна вось працуе ў такім месцы. Але досыць, не мая гэта справа.

— Сьвятар сёньня тут, – кажа Дзіна, калі мы сядаем за маленькі столік і адчыняем плястыкавыя скрынкі.

— Адкуль ты ведаеш?

— Бачыла машыну ягоную ля крамы.

— Во як.

— Так, аднойчы я пайшла выліць ваду, калі ён з крамы выходзіў. Хацела пабачыць, ці ён на «Мэрсэдэсе». Бальшыня сьвятароў ездзіць на «Мэрсэдэсах» ці, прынамсі, на «Кадылаках».

— Ага.

— Але ў яго толькі просьценькая шэрая «Акура», хоць гэта нічога й ня значыць...

Сьвятар. Я проста маю адну тэорыйку наконт аднаго мужыка. Белы, прыкладна маіх гадоў – трохі за 40, – прыходзіць да нас некалькі разоў на год. Ён нечым непадобны да іншых. Яго твар, хада, позірк сьведчаць пра нейкую нутраную барацьбу. «Мо Вам чым дапамагчы?» – пытаюся я шораз, калі ён падыходзіць да касы. Ён увесь час адказвае прыкладна так: «Што б Вы маглі

параіць?» Тады я пытаюся: «А што Вам даспадобы?» – і ён адразу ж змаўкае. Відаць, што ён ніколі не набярэцца сьмеласьці расказаць пра свае густы. Таму я пытаюся, ці падабаецца яму тая ці іншая «цёлка», і ён ідзе з касэтай у кабінку.
— Дзе ён? – пытаецца Дзіна, углядаючыся ў маніторы па-над прылаўкам. Яна з тых людзей, што нічога ня бачаць на экране. Уладальнік «Афрадыты» усталяваў камэры сачэньня пасьля таго, як з адным з кліентаў здарыўся інфаркт і ніхто не заўважыў, пакуль Дзіна не пайшла прыбіраць.
— Вунь там, ніжні экран зьлева.
— Ён робіць гэта?
Я паглядзеў на абрыс у блакітным сьвятле кабінкі. Прыватная кабінка для відэапрагляду; сьвятар заўсёды выбірае яе.
— Не-а. Ён пакуль што проста глядзіць фільм.
— А-а, – Дзінін голас гучыць расчаравана, нават сумна. Яна сапраўды лічыць гэтага мужыка сьвятаром. – Добра, – кажа яна, адсоўваючы ўбок скрынку з рэшткамі лазаньі. – Час папрацаваць.
Я назіраю, як Дзіна йдзе да каморкі, бярэ швабру, вядро, бутэльку мыйнай вадкасьці і гумовыя пальчаткі.
Заўважыўшы яе, наведнікі саромеюцца. Яны не чакалі ўбачыць тут жанчыну. Потым яны яшчэ й здагадваюцца, што яна тут робіць. Як быццам іхныя маці прыйшлі прыбіраць за імі. Нейкі момант у іх на тварах зьяўляецца вінаватасьць і адначасова спроба апраўдацца, але вось усё зьнікае – і яны вяртаюцца да таго, дзеля чаго прыйшлі.
Я сачу за маніторам, на якім Дзіна ўваходзіць у цёмную залю для прагляду парнафільмаў. Галовы ў асьветленых кабінках варушацца ад рыпеньня Дзінінага вядра на маленькіх колах. Мне падабаецца ўяўляць сабе іх думкі, калі яны чуюць гэтае рыпеньне, амаль віскат. Мо гэта паліцыя прыехала сканфіскаваць незаконныя матэрыялы? Ці хуткая дапамога забірае нейкага старога, у якога ня вытрымала сэрца? Дзіна спыняецца каля першай пустой кабінкі, аглядае яе і пачынае прыбіраць.
Пайшоў самы напружаны час – ад адзінаццатай да гадзіны ночы. Тузін хлапцоў разглядаюць часопісы і відэакасэты, а каля прылаўку ўтвараецца чарга. Усё напісана ў іх на тварах. Маладыя хлопцы ў пакамечаных джынсах. Ад іх яшчэ пахне

адэкалёнам – сёньняшнія спатканьні зь дзяўчатамі скончыліся ня так, як яны спадзяваліся. Ашалелыя «камандзіровачныя», гальштукі ў іх павылазілі з-пад пінжакоў па дарозе з матэлю праз дарогу. І сталыя кліенты – збольшага пажылыя мужыкі, бляклыя і трухлявыя, нібы грыбы. Жанчын няма, хоць часам і загляне якая прастытутка ды падміргне мне, паважна шпацыруючы па залі. Але ім тут не шанцуе. Ня тая кліентура. Мяне трохі турбуе, што я не магу сачыць за Дзінай. Мы зь ёй неяк пасябравалі. Недзе зь месяц, пакуль ёй рамантавалі старэнькі «Опэль», я штораніцы падвозіў яе дадому. Пра што яна толькі ні апавядала ў тыя шарыя ранішнія гадзіны, калі большасьць народу толькі зьбіраецца на працу. Пра свайго сабаку. Пра кратоў у сваім двары. Пра падарожжа ў Лас-Вэгас яшчэ ў 60-я. Я паркаваўся каля Дзінінага дому, і штораз пачынаўся аднолькавы невялічкі рытуал. Дзіна не хацела й чуць, каб я зьехаў, не пакаштаваўшы ейнага печыва. Ня тое каб мне было цяжка – я ж бачыў, як ёй самотна жывецца. Але штораз я думаў, як дзіўна і падазрона гэта выглядае – нэгр заходзіць у хату да белай жанчыны ў такі час. Дом у яе быў рыхтык як можна было чакаць: паўсюль парцалянавыя ягняткі, кацяняткі ды малюнкі Ісуса пад лямпадкамі. Тыповы «цацачны» сабака такса скакаў на яе ў калідоры. Мы йшлі на кухню есьці печыва ды піць шэры з маленькіх кілішкаў, на якіх ля абадочкаў быў намаляваны вінаград. Дзіна пякла вельмі смачнае печыва, і да таго ж было нешта прывабнае ў цяплыні кухні, утульнай і пахкай, пасьля ночы ў нашай «кнігарні». Мы размаўлялі пра сёе ды тое, найчасьцей пра тыя часы, што Дзіна правяла ў падарожжах з мужам-фокусьнікам. Яна казала, што была ў маладосьці прыгожай і заўжды падазравала, што яе ногі прываблівалі мужыкоў на шоў больш за мужавы фокусы. Чарадзей з мужа быў слабенькі. Ён кінуў Дзіну, калі той споўнілася 40. Калі я неяк прызнаўся Дзіне, што сядзеў у турме, яна толькі моўчкі кіўнула.

Мне здаецца, што нам абоім не стае тых ранішніх пасядзелак, хоць мы пра гэта ня кажам. Мы зь ёй сябры, але ў пэўных межах, як два ўдаўцы, што не жадаюць забывацца пра ўласнае гора. Але ўсё роўна я за яе хвалююся. Ня тое каб яе тут асабліва турбавалі – адзін толькі раз быў выпадак. Я так і не даведаўся, што ж дакладна адбылося. Дзіна мне сказала толькі: «Там нейкі хлапец прычапіўся да мяне ў мужчынскай

прыбіральні». Я запытаўся, як той выглядаў і ў што быў апрануты. Пасьля выцягнуў з-пад прылаўка пісталет і пайшоў туды.
У прыбіральні было пуста, таму я выйшаў у залю і пачаў адмыкаць кабінкі сваім ключом, адну за адной. Мае габарыты ўражваюць большасьць людзей. Я амаль два мэтры ростам і важу больш за 110 кіляў; некалі я займаўся амэрыканскім футболам ледзь не прафэсійна, пакуль ня трапіў за краты. Але калі я адамкнуў кабінку гэтага хлопца, ён пэўна нават не заўважыў, які я здаравенны мужык; ён убачыў толькі *чарнамазага*. Выгляд у пацана быў брыдкі: твар нібы пацучыны – востры ды выцягнуты, і блізка пасаджаныя чорныя вочы. Можаце казаць, калі хочаце, што нельга ацэньваць чалавека па выглядзе – аднак гэтую птушку можна было разгадаць зь першага погляду. Я загадаў яму вымятацца.
— За што гэта? – прахрыпеў хлопец; тым часам на экране нейкая «цёлка» з ашклянелымі вачыма станавілася ракам.
— Скажам так, ты мне не падабаешся.
— Вы чулі? – завіскацеў ён так, нібы чакаў, што мужыкі з суседніх кабінак, якіх цяпер цікавіць толькі адно, прыбягуць яму на дапамогу. – Адчапіцеся, я нічога вашай прыбіральшчыцы не рабіў.
— Ты, відаць, не зразумеў. Я не прашу цябе сысьці, я кажу, каб ты вымятаўся.
— А што ўвогуле тут робіць белая жанчына? Вам трэба знайсьці некага з вашых чорных.
Я трымаў пісталет. Гэтая даўбня не разумела, што пісталет быў для *ягонай* бясьпекі. Салодкая радасьць. Гэта было як кароста – калі ты стрымліваешся гадзінамі, а потым прыходзіць такая палёгка, такая жывёльная асалода, і толькі потым ты заўважаеш, што парваў сабе скуру.
За маёй сьпінай зьявілася Дзіна. Я пачуў яе голас нібы здалёк:
— Эд, ня слухай гэтага дурня. Ён проста дурань.
Сьвет вакол мяне зрабіўся суцэльнай плямай, за выняткам жывёльнага твару з агіднай усьмешкай. Я нібы вісеў над глыбокай студняй, ведаючы, што аддаў бы ўсё, *усё*, каб даць выйсьце сваёй нянавісьці.
Раптам нібы нейкі агеньчык згас у гэтых агідных чорных вачох. Хлопец схіліў галаву, прашмыгнуў міма мяне і зьнік.
Дзіна вяртаецца ў залю а першай гадзіне ночы. Кліенты

збочваюць, нібы ідзе нейкая каралева. Ужо час зрабіць перапынак. Дзіна любіць час ад часу выпаліць добрую цыгарэту. Ёй хапае адной ці дзьвюх на ноч. Яна глядзіць удалечыню, смакуючы кожную зацяжку. У нас ёсьць маленькі чайнічак, у якім я кіпячу ваду, каб зрабіць кавы.
— Я ўжо ўсё парабіла, – кажа Дзіна, – акрамя прыватнай кабінкі. Сьвятар яшчэ там?
— Так, там яшчэ.
— Робіць гэта?
Я гляджу на манітор. Так, кажу я ёй.
— Праўда? Зноўку моліцца? – Яна павольна прыціскае цыгарэту да попельніцы – старая кабета, паглыбленая ў думкі.
– Цікава, аб чым ён моліцца.
— Мо просіць, каб Бог яму дапамог.
— Што дапамог?
— Каб больш сюды не прыходзіць.
Дзіна глядзіць у акно пустым позіркам.
— Я не разумею.
— Ты калі-небудзь глядзела такі фільм, Дзіна?
— Не, Эд, – шэпча яна. – Папраўдзе, мяне ад іх на ваніты цягне.
— Гэта сапраўды бруд. Усе ведаюць, калі іх глядзяць, што робяць нешта, чаго рабіць нельга. Але гэта й вабіць людзей. У некаторых такія фільмы націскаюць на патрэбныя кнопкі.
Дзіна нічога ня кажа, моўчкі абдумваючы мае словы.
— Вазьмі, напрыклад, такога, як наш сьвятар. Яму цяжка. Ён разумны чалавек, ён усё ведае пра гэтыя фільмы. Напэўна ён нават ведае, чым такія рэчы яго прыцягваюць. Аднак гэта нічога не зьмяняе. Яны робяць зь ім тое, што і зь іншымі. Але разумееш, нават калі ён глядзіць, ён ня можа забыцца, які гэта бруд, якая пахабень ды прыніжэньне. І калі агіда пераважвае, ён глядзіць на сьцяну і пытаецца, што ж яго прымушае прыходзіць сюды. Але адказу не бывае. Таму ён моліцца.
— Яшчэ моліцца?
Я пераводжу погляд на манітор: «Не, ён ужо зноўку глядзіць».
— Ён сёньня забавіўся.
— Ён заплаціў за тры фільмы.
Дзіна ўздыхае.
— Сумна гэта ўсё-такі, – кажа яна.
Каля прылаўку ўжо ўтварылася невялічкая чарга. Кліенты ветліва чакаюць, гледзячы ўбок, пакуль мы размаўляем;

звычайныя шэрыя твары зьліваюцца са сьценамі. Стары ў баваўняным гарнітуры вяртае касэту пад назвай «Гарэзьлівыя мэдсёстры», калі раптам Дзіна рэзка пытаецца:
— Эд, як ты думаеш, працаваць у такім месцы – ня грэх?
Кліенты стаяць нерухома, нібы статуі, робячы выгляд, што нічога ня чулі. Вельмі няёмкае становішча. Але гледзячы на Дзіну, я бачу, што яе па-сапраўднаму хвалюе гэтае пытаньне.
— Ня ведаю, – ціха адказваю я. – Але калі нават і грэх, дык невялікі.
Недзе а другой гадзіне Дзіна вымывае галоўную залю ды зьяжджае дадому. Пасьля другой кліентаў ужо няшмат. Да таго ж, большасьць зь іх іншага кшталту. Галоўныя падзеі адбываюцца ў агульнай залі. Рухі кліентаў. Фігуры на нейкі момант зьяўляюцца на экране, расплываюцца і зьнікаюць у цемры па-за аглядам камэраў. Брудныя справы. Нават праз манітор адчуваеш сябе так, нібы запэцкаўся.
Але адначасна мяне апаноўвае нейкая асалода – кажуць, што тое самае адчувае наркаман, калі бачыць шпрыц, ці алькаголік, які глядзіць на шэраг пляшак у бары. Асалода празь іншых. Захапленьне ад таго, што зло поруч, што да яго можна дакрануцца. Надыходзіць начная гадзіна, калі мы зь сябрукамі некалі выходзілі на справы. За свае выбрыкі я зарабіў мянушку «Шалёны», і калі ўжо мае карашы такое казалі, дык гэта аб нечым сьведчыць. Мне падабалася, калі людзі адмаўляліся аддаваць грошы. Радасьць нібы цякла праз мае косткі, і, пакуль я малаціў кулакамі, твар маёй ахвяры быццам зьнікаў, ці зьнікаў я сам. Думкі спыняліся ўсе, усе пачуцьці спыняліся, і кропля за кропляй мной авалодвала пустэча, халодная і стэрыльная, як зьмерзлыя памыі пад арктычным сьнегам. Я хацеў адчуваць гэта зноўку і зноўку. У параўнаньні з гэтым, сэкс быў нечым бляклым і другасным. Часам мне рабілася брыдка ад успамінаў, але ненадоўга; хутка я зноў прагнуў гэтай пустэчы так, як іншыя прагнуць жанчыны.
Я пражыў так большую частку маладосьці – натуральна, калі быў на волі. Чаму? Ня ведаю, тут няма простага адказу. Я мурын, але мае бацькі былі ня бедныя. Як кажуць, «сярэдняя кляса». Бацька быў дырэктарам школы, маці працавала ў банку. Усе мае браты ды сёстры паступілі ў каледжы. Мне здаецца, – не, ня трэба хавацца за хлусьлівую сьціпласьць – *я ведаю*, што розумам мяне Бог не абдзяліў. Але я заўсёды меў нешта, чаго

не было ў іншых. Нейкую загану, сапсаваны ген, нейкае ліха, што кіравала маёй рукой, калі я ў чацьвертай клясе выцяў суседзкага хлопчыка па плячы бэйсбольнай бітай. Бабуля, пачуўшы пра мае чарговыя паскудзтвы, звычайна казала, гледзячы на мяне: «*Д'ябал, мусіць, ганарыцца сваёй працай*».
Я ня згодны з тымі, хто лічыць турму жартам, «курортам». Што б там ні казалі, тэлевізар, більярд і трохразовае харчаваньне ня робяць зь вязьніцы «Гілтану». Але ў турме можна навучыцца. Шмат для каго з нас гэта быў адзіны шлях набыць веды ў базавых дысцыплінах: сум, самота, сьмерць. Свой урок я атрымаў у выглядзе сталёвай заточкі. Пацан, якога я амаль ня ведаў, кінуўся на мяне падчас гульні ў карты. Калі ён скончыў, я быў падобны да дзіравай накрыўкі для слоікаў, у якіх мы ў дзяцінстве трымалі вужы ды яшчаркі. Дваццаць сем дзірак. Я памятаю, як выплываў з уласнага цела ў апэрацыйным пакоі. І калі я пабачыў лекараў і мэдсёстраў, што сабраліся вакол майго цела, шчыруючы над ім з усіх сілаў, я, памятаю, падумаў: «Чаму? Якая ім розьніца?» Я не кажу, што тое быў момант нейкага там рэлігійнага прасьвятленьня. Проста мяне неяк узрушыла, што ўсе гэтыя людзі так адчайна змагаліся за маё нікчэмнае жыцьцё.
У краму ўваходзіць парачка наманікюраных гомікаў. Яны праглядаюць часопісы, гыгыкаюць ды робяць выгляд, нібы саромеюцца непрыстойных малюнкаў. Пасьля накіроўваюцца да кабінак. Не люблю гомікаў. Я згодны, права іхнае – жыць, як ім падабаецца. Прызнаю – у філязофскім сэнсе, – што ў мяне адсталыя погляды, практычна забабоны. Але я стаўлюся да іх з пагардай. Гэта ўсё з турмы; там я пабачыў, як такія вось маніпулююць мужыкамі, мной у тым ліку. На волі лёгка казаць: «Ну, я б так ніколі не зрабіў», але, калі малады мужык пасядзіць шэсьць ці сем гадоў без жанчыны, якія толькі пачварныя мроі ня зьявяцца ў галаве. Натуральна, гэта ўсё гармоны, інстынктыўныя поклічы да працягу роду – так можна на ўсё гэта глядзець. І пэдзікі гэта разумелі, карысталіся з гэтага. Тут была крыніца іх улады. Але ўсё роўна яны ніколі ня ведалі свайго месца паміж іншымі. Мы любілі малаціць іх проста так, дзеля сьмеху.
Я назіраю за парачкай на маніторы. Яны ўваходзяць у кабінку побач зь сьвятаром. Адзін зь іх сядае другому на калені, яны пераключаюць каналы, шукаючы «блакітны» фільм. Так яны

сядзяць у сьвятле экрану нейкі час; потым пачынаюцца пацалункі, пагладжваньні ды кручэньне. Я ведаю, што трэба адвярнуцца, але пад маёй злосьцю ды агідай прачынаецца нешта іншае – прага, кароста – што прыцягвае мяне да экрану. Штука вось у чым: на кожных дзьвярах ёсьць надпіс, што ў кабінку можна заходзіць толькі па адным. Я маю поўнае права пайсьці ды выкінуць гэтых гомікаў. І вось яно абуджаецца, старое пачуцьцё, цёплыя і павольныя сыгналы залозаў, нібы расьліна, кранутая сонцам пасьля зімовага сну...
Але тут варушыцца сьвятар. Ён пэўна таксама іх чуе. Ён аглядаецца, пасьля раптам задзірае галаву і заўважае камэру. Ён глядзіць на яе спакойна, быццам у люстэрка. Ён нібы чакаў гэтага. І вось, замест таго каб зьбегчы, ён толькі нахінае галаву і прыціскае далоні да твару пад міргаценьне экрану. Маліся за нас. Маліся за нас усіх.
З ангельскай пераклаў Аляксей Знаткевіч
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

[image]

A R C H E

[image]

[image]

5 [image]

[image]

[image]

[image]

П а ч а т а к

№ 5 (34) - 2004

[image]

Пачатак Навіны Форум

Пошук Аўтары Цалкам Іншае

літаратура

[image]2004

"да Зыкасту"

паэмікa • аналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ТОМ СТОПАРД

(нар. у 1937 г. у чэхаславацкім горадзе Зьлін) – брытанскі драматург і тэатральны крытык. Адна зь яго апошніх п’есаў – «The Invention of Love» (1997).

Том Стапард

Догаў Гамлет

Кагутаў Макбэт

УВОДЗІНЫ

оска, якая падзяляе «Догавага Гамлета» і «Кагутавага Макбэта», адначасова аб’ядноўвае дзьве ўзаемазалежныя п’есы: першую ўвогуле цяжка назваць п’есай без другой, а другую немагчыма выконваць бязь першай. «Догаў Гамлет» – гэта аб’яднаньне ў адну дзьвюх п’есаў, напісаных для Эда Бэрмана й «Узаемадзеяньня», а менавіта: «Дог – нашая хатняя жывёла», якая адчыняла

«Амаль вольны тэатар» у Соха ў сьнежні 1971-га, і «15-хвілінны Гамлет Догавай трупы», якая была напісаная (ці, хутчэй, апрацаваная) для выкананьня на двухпавярховым аўтобусе.

Вытокі «Догавага Гамлета» трэба шукаць у адным з разьдзелаў філязофскіх дасьледаваньняў Вітгенштайна. Уявіце сабе наступную сцэну. Чалавек будуе памост з кавалкаў драўніны рознай формы й памеру. Іх кідае яму па адным другі чалавек – як толькі першы папросіць. Назіральнік можа заўважыць, што кожным разам, як першы чалавек выкрыквае: «Ліштва!» – яму кідаюць доўгі пляскаты кавалак. Калі ён крычыць: «Плашка!» – яму кідаюць кавалак іншай формы. І гэтак паўтараецца некалькі разоў. Потым выкрыкваецца: «Блёк!» – і ляціць кавалак яшчэ адной формы. Нарэшце, за выкрыкам: «Брусок!» – кавалак яшчэ аднаго кшталту. Назіральнік, магчыма, зробіць выснову, што названыя словы адпавядаюць розным формам і памерам матэрыялу. Але гэта не адзінае магчымае тлумачэньне. Дапусьцім, напрыклад, што той, хто кідае кавалкі, загадзя ведае, якія зь іх і ў якой пасьлядоўнасьці неабходныя будаўніку. У гэткім выпадку будаўніку няма патрэбы называць неабходныя кавалкі – ён можа проста даць знак, што гатовы прыняць наступны кавалак. Такім чынам, выкрыкі можна патлумачыць як:
Ліштва = Гатова Блёк = Наступны

Плашка = Парадак Брусок = Дзякуй
У гэтым выпадку назіральнік памыліўся б у сваіх меркаваннях, але той факт, што ён, з аднаго боку, і будаўнікі – з другога, карыстаюцца дзьвюма рознымі мовамі, не абавязкова павінен быць відавочным абодвум бакам. Больш за тое, цалкам магчыма, што абодва будаўнікі таксама гавораць на розных мовах, і калі б іхнае жыцьцё складалася толькі з будаваньня памостаў гэткім чынам, у іх не было б нагоды высьветліць, што кожны зь іх карыстаецца мовай, невядомай другому. Гэткі шчасьлівы стан рэчаў цягнуўся б, вядома ж, толькі датуль, пакуль, дзякуючы чыстай выпадковасьці, выказваньні абодвух людзей мелі б сэнс (нават не аднолькавы) для кожнага зь іх. Мяне прываблівала магчымасьць напісаць п'есу, якая б навучыла гледачоў той мове, на якой яна напісаная. Дадзены тэкст – сьціплая спроба зрабіць гэта. А магчыма – і большае.
«Кагутаў Макбэт» прысьвячаецца чэхаславацкаму драматургу Паўлу Кагоўту. За апошнія дзесяць гадоў «нармалізацыі», якая надышла за падзеньнем Дубчака, тысячы чэхаў і славакаў былі пазбаўленыя магчымасьці займацца сваёй справай. Сярод іх – шматлікія пісьменьнікі й акторы.
Падчас кароткага наведваньня Прагі ў 1977-м я пазнаёміўся з Кагоўтам і Паўлам Ландоўскім – вядомым акторам, якому на многія гады забаранілі працаваць празь нямілаcьць уладаў. (Гэта Ландоўскі кіраваў машынай у лёсавызначальны дзень у студзені 1977-га, калі паліцыя спыніла яго й ягоных сяброў і сканфіскавала першыя экзэмпляры дакумэнту, вядомага як Хартыя-77). Неяк вечарам Ландоўскі правёў мяне за кулісы аднаго з тэатраў, дзе ён выканаў калісьці лепшыя з сваіх роляў. На той час паказваўся нейкі спэктакль, і цяжка апісаць гэнае пачуцьцё глыбокага расчараваньня, якое адчуў Ландоўскі.
Праз год Кагоўт напісаў мне:
Як ты ведаеш, у апошнія гады шмат каму з чэскіх людзей тэатру забаронена ў ім працаваць. Але як чалавек, які ня можа жыць без тэатру, я шукаў магчымасьцяў займацца тэатральнай дзейнасьцю, нягледзячы на абставіны. І цяпер я рады паведаміць табе, што празь некалькі дзён, пасьля васьмі тыдняў рэпэтыцыяў, адчыняецца «Тэатар у гасьцёўні» – і ня чым-небудзь, а «Макбэтам».
Што такое «Тэатар у гасьцёўні»? Група па выкліку. Кожны, хто хоча ўбачыць дома «Макбэта» з двума вялікімі й забароненымі

чэскімі акторамі – Паўлам Ландоўскім і Ўластай Храмоставай, можа запрасіць сваіх сяброў і паклікаць нас. І прыйдуць пяць чалавек з адной валізай.
Павал Ландоўскі й Уласта Храмостава граюць Макбэта й лэдзі Макбэт. Вядомы й забаронены малады сьпявак Уласьціміл Траснак сьпявае МАЛКАЛМа й выконвае музыку. Адна маладая дзяўчына, якая не змагла вывучаць тэатральнае мастацтва, – Тарэза Кагоўтава, воляю лёсу мая дачка, – грае малыя ролі й чытае рэмаркі. І апошні чалавек (гэта я!) чытае й крыху грае астатнія ролі, ад імя свайго вялікага калегі.
Я думаю, што яму няма чаго хвалявацца, бо прызначэньне й пэрспэктывы п'есы – ня толькі выйсьце з нашай сытуацыі, але й цікавая тэатральная падзея. Я, натуральна, адаптаваў п'есу, але я ўпэўнены, што гэта, тым ня менш, «Макбэт»!
Ліст быў напісаны ў чэрвені, а ў жніўні была зробленая прыпіска: *«Макбэт» цяпер ставіцца ў праскіх кватэрах»*.
«Кагутаў Макбэт» быў натхнёны гэнымі падзеямі. Аднак Кагут – гэта не Кагоўт, і гэты змушана скарочаны «Макбэт» не прэтэндуе на адпаведнасьць файнай сямідзесяціпяціхвіліннай вэрсіі Кагоўту.
Том Стопард
Жнівень 1980

Догаў Гамлет

* * *

«Догаў Гамлет» прысьвячаецца прафэсару Догу й Догавай трупе ўзаемадзеяньня.

* * *

АСОБЫ:

БЭЙКЕР
АБЭЛЬ
ЧАРЛІ
ІЗІ
ДОГ

ДАМА
ФОКС МАЖОР
МІСІС ДОГ
ШЭКСЬПІР
ГАМЛЕТ
ГАРАЦЫЁ
КЛАЎДЗІ
ГЕРТРУДА
ПАЛОНІ
АФЭЛІЯ
ЛАЭРТ
ЗДАНЬ
БЭРНАРДА
ФРАНЦЫСКА
МАРЦЭЛ
ДАЛАКОП
ОЗРЫК
ФАРЦІНБРАС

* * *

Першае сцэнічнае выкананьне «Догава Гамлету, Кагутава Макбэту» было зьдзейсьненае ў Цэнтры мастацтваў унівэрсытэту Ўорвіка, Ковэнтры, 21 траўня 1979 году Брытанска-амэрыканскай тэатральнай кампаніяй (BARC – British American Repetory Company). Склад кампаніі быў наступным:

Джон Чаліс
Элісан Фрэйзэр
Бэн Готліб
Пітэр Грэйер
Дэвіс Хол
Люіс Хаслар
Рут Хант
Стэнлі Макгі
Стывэн Д. Ньюман
Джон Строб
Элан Томпсан
Сара Вэнэйбл

Жыльбэрт Вэрнан

Сцэнаграфія – Норман Коўтс
Рэжысура – Эд Бэрман

П'еса выконвалася на працягу сэзону ў Акадэмічным тэатры, Лёндан. Першы паказ – 30 ліпеня 1979 году.

* * *

Пераклад з
Догавай
мовы
падаецца ў
дужках там,
дзе гэта
лічыцца
неабходным.

Пустая
сцэна.

БЭЙКЕР (*за кулісамі*). Цэгла! /*Сюды!/ (*Зь левай кулісы ў правую ляціць футбольны мяч. Бэйкер падхоплівае мяч*.) Брусок. /*Дзякуй./

АБЭЛЬ за
кулісамі,
кідае
ранец
зьлева на
сцэну.
АБЭЛЬ
уваходзіць
на сцэну.
Гэта
школьнік у
шэрых
флянэлевых
шортах,

жакеце,
школьнай
фуражцы й
г. д. Нясе
ранец. Ён
кідае
ранец
пасярод
сцэны й
падбірае
першы
ранец, які
ставіць
побач з
сваім.
АБЭЛЬ
выходзіць
направа й
вяртаецца
зь
мікрафонам
і стойкай,
якую
ставіць на
сцэну. На
мікрафоне
ёсьць
пераключальнік.

АБЭЛЬ (*у мікрафон*). Сьняданак, сьняданак… сонца-шчаўе-раса… /*Праверка, праверка… раз-два-тры…/ (*Ён разумее, што мікрафон адключаны. Колькі разоў шчоўкае пераключальнікам, а затым ізноў гаворыць у мікрафон.*) Сонца-шчаўе-раса-патэльня-вугольле…/*Раз-два-тры-чатыры-пяць… / (*Мікрафон усё роўна не працуе. Абэль кліча некага за сцэнай.*) Пікша сьвятар! / *Мікрафон не працуе!/

Паўза. З
таго ж

боку
ўваходзіць
БЭЙКЕР. Ён
таксама
школьнік,
апрануты
адпаведна.

БЭЙКЕР. Га? /*Га?/
АБЭЛЬ. Пікша сьвятар!
БЭЙКЕР. Пікша?
АБЭЛЬ. Сьвятар.

БЭЙКЕР
ідзе да
мікрафона.
Пасярод
дарогі
кідае
ранец.

БЭЙКЕР. Сонца-шчаўе-раса. (*Мікрафон не працуе. Бэйкер лаецца.*) Равары!

БЭЙКЕР
ідзе назад
за сцэну.
У калёнках
нешта
патрэсквае.

АБЭЛЬ. Плашка? /*Парадак?/
БЭЙКЕР (*крычыць з-за сцэны, невыразна*). Плашка!
АБЭЛЬ (*у мікрафон*). Сонца, шчаўе, раса, вугольле, патэльня.

Мікрафон
працуе.
АБЭЛЬ
паказвае
вялікі
палец і
крычыць

БЭЙКЕРУ.

АБЭЛЬ. Плашка! /*Парадак!/

За сьпінай АБЭЛЯ, падскокваючы, уваходзіць задам-наперад яшчэ адзін школьнік – ЧАРЛІ. Ён гуляе з кімсьці нябачным у мячык. На ЧАРЛІ сукенка, але на ім таксама школьныя шорты, чаравікі, шкарпэткі. Ён без парыка.

ЧАРЛІ. Цэгла! Цэгла! /*Сюды! Сюды!/

З-за кулісаў яму кідаюць мяч. АБЭЛЬ адбірае мяч у ЧАРЛІ.

АБЭЛЬ. Брусок! /*Дзякуй!/

ГОЛАС (*за сцэнай*). Цэгла! /*Сюды!/

ЧАРЛІ
спрабуе
ўзяць мяч,
але АБЭЛЬ
не аддае.

ЧАРЛІ. Спадар! /*Выradак!/ (*Абэль кідае мяч нябачнаму чалавеку за кулісамі, але ня Чарлі.*) Рамонкавы спадар! /*Подлы выradак!/

АБЭЛЬ. Паўднё! /*Заткніся!/

ЧАРЛІ (*вельмі засмучана*). Ванільны спадар! /*Агідны выradак!/

АБЭЛЬ (*паказвае Чарлі дулю*). Паўднё! (*Абэль пачынае падскокваць і крычыць за кулісы, каб яму кінулі мяч.*) Цэгла! /*Сюды!/

Мяч ляціць
да АБЭЛЯ
праз
галаву
ЧАРЛІ.
ДОГ,
дырэктар у
катэдралцы
й мантыі,
уваходзіць
з
супрацьлеглага
боку. Калі
АБЭЛЬ
ловіць
мяч, ДОГ
адбірае
яго.

ДОГ. Брусок! /*Дзякуй!/ Мір! /*Цурбан!/ (*Дае Абэлю поўху й зьбіраецца выходзіць зь мячом у руках.*)

АБЭЛЬ (*з павагай да Дога*). Крэтын, прэч? /*Колькі часу, сэр?/

ДОГ (*паварочваецца*). Га?

АБЭЛЬ. Крэтын, лыч сьвіны, прэч? /*Вы не падкажаце, колькі

часу, сэр?/

ДОГ дастае
гадзіньнік
з кішэні ў
камізэльцы
й глядзіць
на яго.

ДОГ. Росныя пранцы. /*Палова на чацьвертую./
АБЭЛЬ. Брусок, прэч. /*Дзякуй, сэр./
ДОГ. Дагары нагамі арцішок амаль Лемінгтонскі курорт? /*Вы ня бачылі грузавік зь Лемінгтонскага курорту?/
АБЭЛЬ. Арцішок, прэч? /*Грузавік, сэр?/
ЧАРЛІ. Зь Лемінгтонскага курорту, прэч? /*Зь Лемінгтонскага курорту, сэр?/
ДОГ. Дагары нагамі? /*Вы ня бачылі яго?/
АБЭЛЬ (*матае галавой*). Гніда, прэч. /*Не, сэр./
ЧАРЛІ (*матае галавой*). Гніда, прэч. /*Не, сэр./
ДОГ (*зноў сыходзіць*). Ц-с-с. Ц-с-с. /* Ц-с-с. Ц-с-с./ Бессэнсоўна. /* Добрага вам дня./
АБЭЛЬ і ЧАРЛІ. Бессэнсоўна, прэч. /* Добрага дня, сэр./

ДОГ
выходзіць
зь мячом.
Уваходзіць
БЭЙКЕР. Ён
глядзіць
на свой
наручны
гадзіньнік.

БЭЙКЕР. Росныя пранцы. /*Палова на чацьвертую./

Пасярод
сцэны
цяпер тры
ранцы.
БЭЙКЕР
падыходзіць

да аднаго
зь іх і
дастае
пакет з
бутэрбродамі.
Гэта ж
робяць і
АБЭЛЬ з
ЧАРЛІ. Усе
тры хлопцы
сядаюць і
пачынаюць
разглядаць
свае
бутэрброды.

АБЭЛЬ (*глядзіць на свае бутэрброды*). Пеліканава банкруцтва. /*Плаўлены сырок./ (*Пытаецца ў Бэйкера.*) Нават пабег? /*Што ў цябе?/
БЭЙКЕР (*глядзіць на свае бутэрброды*). Мальва ружовая. /*Кумпяк./
АБЭЛЬ (*пытаецца ў Чарлі*). Нават пабег? /*Што ў цябе?/
ЧАРЛІ (*глядзіць на свае бутэрброды*). Мышыная нара. /*Яйка./
АБЭЛЬ (*да Чарлі*). Пахаваеш сонечнае пеліканава банкруцтва шчыра мышыную нару? /* Памяняеш адзін з плаўленым сырком на адзін зь яйкам?/
ЧАРЛІ (*дабрадушна паціскае плячыма*). Плашка. /* Добра./

АБЭЛЬ і
ЧАРЛІ
абменьваюцца
палавінкамі
бутэрбродаў.

БЭЙКЕР (*да Абэля*). Пахаваеш ружовую мальву шчыра сонечнае пеліканава банкруцтва?
АБЭЛЬ. Ружовую мальву? Гніда!
БЭЙКЕР. Спадар!
АБЭЛЬ. Паўднё!
БЭЙКЕР (*абмахваючыся фуражкай*). Паўднё! Фу, роварныя багажнікі наўрад ці масьленая зьнямога скончыцца. /

**Камэнтар наконт гарачыні./*
ЧАРЛІ (*пагаджаецца зь ім*). Зьнямога скончыцца, відаць, як масла лягічна вынікае.
АБЭЛЬ. Рацыя. /* Трэба солі./
ЧАРЛІ. Га?
АБЭЛЬ (*працягвае руку*). Рацыя.

ЧАРЛІ
дастае з
свайго
ранцу
сальнічку.
ЧАРЛІ
перадае
АБЭЛЮ
соль.

АБЭЛЬ. Брусок. /*Дзякуй./ (*Пасыпае сольлю бутэрброд і прапаноўвае соль Бэйкеру.*) Рацыя? /*Трэба солі?/
БЭЙКЕР (*бярэ соль*). Брусок. /*Дзякуй./ (*Пасыпае бутэрброды й ставіць салонку каля сябе.*)
ЧАРЛІ (*працягваючы да Бэйкера руку*). Цэгла. /*Сюды./

БЭЙКЕР
перадае
ЧАРЛІ
ягоную
сальнічку.
Яны ядуць
бутэрброды.

Наступная
частка
тлумачыцца
гэткім
чынам.
АБЭЛЬ і
БЭЙКЕР,
якія
павінны
неўзабаве

ўдзельнічаць
у школьным
спэктаклі,
пастаўленым
у
арыгінале
– на
звычайнай
мове,
пачынаюць
паўтараць
свае
словы.

АБЭЛЬ (*нечакана*). Хто там?
БЭЙКЕР. Не, ты мне адкажы спачатку.
АБЭЛЬ. Няхай жыве кароль! Ідзі ўжо спаць.
БЭЙКЕР. Вялікі дзякуй за дазвол ваш добры.
АБЭЛЬ (*устае*). Ну што, ізноў зьяўляўся гэты самы?
БЭЙКЕР (*становіцца каля Абэля*).
Маўчы! Глядзі, ён зноў ідзе сюды.
АБЭЛЬ. Якраз такі, як наш кароль-нябожчык!
Яны зусім
ня граюць
роляў.
Проста
невыразна
мармычаць
словы.

БЭЙКЕР. Я небам заклінаю, гавары!
АБЭЛЬ. Ён тут! (*Паказвае ў левы бок сцэны.*)
БЭЙКЕР. Ён там! (*Паказвае ў правы бок сцэны. Іхныя рукі няўклюдна перакрыжоўваюцца.*)
АБЭЛЬ. Яно сышло.
БЭЙКЕР. Але глядзі – мядовы плашч… (*Зьбіўся. Паўза.*)
АБЭЛЬ (*спрабуе дапамагчы яму*).
Апрануты – брыдзе…
АБЭЛЬ і

БЭЙКЕР не
заўсёды
правільна
будуюць
сказы.

БЭЙКЕР (*трасе галавой і ціха лаецца сабе пад нос*). Равары! (*Дастае з кішэні п’есу. Праглядае яе й знаходзіць, дзе зьбіўся.*) Сьвітанак! Сьвітанак…
…ў ружовы плашч апрануты,
брыдзе праз росы ад усходняга ўзгорку.
АБЭЛЬ. Трэба паведаміць,
што бачылі мы сёньня ўночы…
(*Паказвае на Гамлета, трымаючы руку на ўзроўні поясу.*)
маладому Гамлету…
Плашка? /*Парадак?/ Блёк. /*Наступны./
БЭЙКЕР (*матае галавой і сядае*). Гніда! /*Не!/

ЧАРЛІ бяз
дай
прычыны
пачынае
сьпяваць
«My Way».
Ён ня
ведае ўсіх
словаў у
трэцім
радку.
БЭЙКЕР
далучаецца
да яго на
чацьвертым
радку,
амаль
сугучна.

ЧАРЛІ (*сьпявае*). Наймі віншуй дзяржаўны жахлівы кірмашовы пляц.
Вось гад аэрадром абходзіць і на мяжы знаходзіць чакаляд.

Мурын ізноў ла-ла-ла-ла ды моцна крыкнуў яйка…
І дыназаўр паверыў задаволіў яйка…

АБЭЛЬ
плюецца з
трубачкі
малінай у
якасьці
ацэнкі
таго, што
адбываецца.
Калі
песьня
заціхае,
чуваць, як
пад'яжджае
грузавік.
Усе тры
хлопцы
ўстаюць,
адкладаюць
убок
паперу ад
бутэрбродаў
і ўсё
астатняе й
чакальна
глядзяць у
бок
грузавіка.

БЭЙКЕР. Арцішок. /*Грузавік./ (*Ідзе наперад, выглядвае за кулісы й экспрэсіўнымі жэстамі пачынае паказваць грузавіку – які, відавочна, рухаецца заднім ходам, – куды ехаць.*) Цьвятная капуста… Цьвятная капуста… наўрад ці… Онікс наўрад ці… /*Улева… улева… правей… правей да мяне./ Насоўка… насоўка… Плашка! /*Проста… Проста… Парадак!/

Чуваць, як
кіроўца
грузавіка,

ІЗІ,
зачыняе
кабіну. Ён
зьяўляецца
на сцэне.
На ім
белая роба
й кепка з
тканіны.
Ён нясе
скручаны
чырвоны
дыван і
скрынку зь
сьцяжкамі.
Ён кладзе
ўсё гэта
на зямлю.

ІЗІ. Бакстанскія – блёкі й астатняе.
АБЭЛЬ. Га?
ІЗІ. Служба дастаўкі Бакстана зь Лемінгтонскага курорту. У мяне груз блёкаў і астатняга. Мне спатрэбіцца крыху дапамогі.

Паўза.
Хлопцы
глядзяць
на яго
зьбянтэжана,
зьбітыя з
панталыку.

АБЭЛЬ. Га?
ІЗІ. Мне спатрэбіцца крыху дапамогі, бо я адзін. Мне давялося ўбачыць, як у навальніцу майго напарніка ўдарыла маланкай. На А-412, каля Рыкманзворту. Дзіўнае здарэньне. Гром сярод яснага неба. Зыгзагнула проста па прадзіраўленай мысе ягонага процівагазу ў выглядзе Мікі Маўса. Ён вёз пяць гэткіх на дзіцячае сьвята бактэрыялягічных дасьледаваньняў. Толькі пачаў адчуваць адпаведны настрой – і тут на табе: сезам! Гэткі

наэлектрызаваны момант. Ягоны нос выглядаў потым, хутчэй, як у Дональда Дака, а вушы – гэтак, быццам яны выскачылі з тостэра. Ён крычаў, як зязюля ў гадзіньніку, калі яна абвяшчае 12-ю гадзіну. (*Пераказвае гісторыю з значным імпэтам, але, да ягонага расчараваньня, яна ня робіць належнага ўражаньня, бо, канечне ж, яе ніхто не разумее.*) Ну добра, хлопцы. Куды вы хочаце, каб я іх паклаў?

Ізноў
доўгая
паўза.
БЭЙКЕР
робіць
крок да
ІЗІ,
задаволены
сабой праз
тое, што
яму ў
галаву
прыйшла
выдатная
ідэя.

БЭЙКЕР. Я небам заклінаю, гавары!

Паўза.

ІЗІ. А ты хто гэткі будзеш?
БЭЙКЕР (*заахвочваючы*). Ўільям Шэксьпір.
ІЗІ (*да Абэля*). Ён крэтын?
БЭЙКЕР (*глядзіць на наручны гадзіньнік*). Росная таксоўка.
ІЗІ. Я гэтак і думаў. (*Глядзіць на Чарлі.*) Вы ўсе тут крыху дзівакі, так? Дзе ваш начальнік?

Жвава
ўваходзіць
ДОГ.

ДОГ. Бессэнсоўна! /*Добры дзень!/
ХЛОПЦЫ. Бессэнсоўна, прэч! /*Добры дзень, сэр!/
ІЗІ. Добры дзень, спадар. /*На Догавай мове гэта значыць

«Замоўкні, вырадак»./
ДОГ (*пагрозьліва хапае Ізі за штрыфелі*). Марцыпанавы гадзіньнік! /*Асьцярожней!/ (*Выцягвае аркуш паперы з накрысам канструкцыі, якая мусіць быць пабудаваная на сцэне. Гэта даволі вялікі аркуш, і на ім можна разгледзець прыступкі й сьцены, якія трэба будзе пабудаваць. Дог коратка разглядае аркуш, потым пачынае расстаўляць хлопцаў.*) Абэль…
АБЭЛЬ. Плашка, прэч. /*Так, сэр./
ДОГ (*паказвае на грузавік*). Крышыць пантон.
АБЭЛЬ. Плашка, прэч. (*Абэль ідзе да грузавіка.*)
ДОГ. Бэйкер… (*Бэйкер зьвяртае на яго ўвагу.*) Цэгла. /*Сюды./ (*Ставіць Бэйкера каля кулісы побач з грузавіком.*)
БЭЙКЕР. Плашка, прэч.
ДОГ. Брусок. /*Дзякуй./ (*Да Чарлі.*) Чарлі.
ЧАРЛІ. Плашка, прэч.
ДОГ. Цэгла. (*Ставіць Чарлі гэтак, што Чарлі, Бэйкер і грузавік – на адной лініі. Ізі стаіць каля Чарлі там, дзе мусяць быць пабудаваныя прыступкі.*) Ліштва? /*Гатовыя?/
БЭЙКЕР і ЧАРЛІ. Ліштва, прэч. /*Гатовыя, сэр./
ДОГ (*крычыць Абэлю*). Ліштва?
АБЭЛЬ (*з-за сцэны*). Ліштва, прэч.

ДОГ дае
аркуш ІЗІ,
які
асьцярожна
яго
разглядае.
ІЗІ кладзе
накрыс у
кішэню.

ДОГ (*гучна крычыць Абэлю – літаральна гарлае*). Ліштва!

ІЗІ
адчувае
зьдзіўленьне
й палёгку,
бо да
БЭЙКЕРА
ляціць
ліштва,

каторую
той
падхоплівае
й перадае
ЧАРЛІ, які
перадае яе
ІЗІ, які
кладзе яе
на сцэну.
ДОГ
усьміхаецца.
Падбадзёрліва
глядзіць
на ІЗІ.

ІЗІ (*няўпэўнена крычыць*). Ліштва! (*Ён зноў адчувае зьдзіўленьне й палёгку, бо новая ліштва ляціць з-за кулісаў і перадаецца Ізі, як і папярэдняя. Ён кладзе яе.*) Ліштва!

Ляціць
трэцяя
ліштва й
гэтаксама
разьмяшчаецца.
Задаволены
ДОГ
выходзіць.
Заўвага:
ІЗІ
зьбіраецца
пабудаваць
памост,
выкарыстоўваючы
«ліштвы»,
«плашкі»,
«блёкі» й
«брускі»,
гэткім
чынам, што
памост

будзе мець
прыступкі,
якія
знаходзяцца
ў задняй
частцы
сцэны.

ІЗІ (*крычыць з упэўненасьцю*). Ліштва!
Замест
плянкі яму
кідаюць
блёк. Калі
той
далятае да
ІЗІ, ён
кідае яго
назад
ЧАРЛІ, які
перадае
яго назад
БЭЙКЕРУ, а
той
паварочваецца
й кладзе
яго на
падлогу ў
задняй
частцы
сцэны.
Пакуль
БЭЙКЕР там
знаходзіцца,
ІЗІ зноў
паўтарае
свой
загад.

ІЗІ. Ліштва!

Другі блёк ляціць проста ЧАРЛІ ў рукі. ЧАРЛІ перадае яго ІЗІ, які вяртае яго ЧАРЛІ, а той нясе блёк у заднюю частку сцэны, каб пакласьці да першага на падлогу.

ІЗІ (*крычыць з усёй моцы*). Ліштва!

Проста да ІЗІ ляціць ліштва, і ён удзячна кладзе яе на падлогу побач з папярэднімі трыма. ІЗІ яшчэ раз разглядае накрыс і потым кладзе яго ў кішэню.

ІЗІ (*зноў моцна крычыць*). Плашка!

БЭЙКЕР і ЧАРЛІ зноў занялі свае месцы. На сцэну ляціць плашка, падхоплівaецца БЭЙКЕРАМ, перадаецца ЧАРЛІ, потым перадаецца ІЗІ, які кладзе яе на ліштвы.

ІЗІ (*моцна крычыць*). Плашка!

Ляціць другая плашка й перадаецца ІЗІ, які кладзе яе. Гэткім жа чынам ІЗІ атрымлівае трэцюю плашку. Для ягонай канструкцыі яму неабходныя чатыры.

ІЗІ (*моцна крычыць*). Плашка!

Да БЭЙКЕРА
ляціць
блёк,
перадаецца
ЧАРЛІ,
перадаецца
ІЗІ, які
нецярпліва
перадае
яго назад
БЭЙКЕРУ,
БЭЙКЕР
адносіць
блёк у
заднюю
частку
сцэны.

ІЗІ (*моцна крычыць*). Плашка!

Ляціць
яшчэ адзін
блёк,
проста да
ЧАРЛІ, які
перадае
яго ІЗІ,
які
перадае
яго назад
ЧАРЛІ, а
той ідзе
зь ім у
заднюю
частку
сцэны й
кладзе яго
на
падлогу.

ІЗІ. Плашка!

АБЭЛЬ (*уваходзіць, усьміхаючыся*). Плашка?
ІЗІ. Гніда!
АБЭЛЬ. Гніда?
ІЗІ. Прэч! Плашка!

АБЭЛЬ
выходзіць
і праз
момант
яшчэ адзін
блёк
ляціць да
ІЗІ, які
падхоплівае
яго,
разьюшана
кідае ў
БЭЙКЕРА й
ЧАРЛІ,
якія
ловяць яго
й кладуць
на
падлогу.
ІЗІ
выходзіць
за кулісы.
З свайго
ранца
ЧАРЛІ
дастае
маленькае
радыё,
якое затым
уключае.
Яму
пашчасьціла,
і ён
злавіў
сваю
любімую

песьню на
сярэдзіне
першага
куплету,
які мы ўжо
чулі.
ЧАРЛІ
сьпявае.

ІЗІ (*з-за сцэны*). Бессэнсоўна.
АБЭЛЬ (*ветліва, за сцэнай*). Бессэнсоўна, прэч.

Чуваць
плюху
аплявухі й
пранізьлівы
крык
АБЭЛЯ. ІЗІ
ўваходзіць
з плашкай
у руках.
Уваходзіць
ДОГ з
падносам
бутаньерак.
Ён ставіць
паднос на
падлогу й
бярэ
скрынку зь
сьцяжкамі.

ДОГ (*крычыць за сцэну Абэлю*). Абэль!
АБЭЛЬ. Плашка, прэч.
ДОГ. Цэгла.

Уваходзіць
АБЭЛЬ,
трымаючыся
за вуха й

пакрыўджана
гледзячы
на ІЗІ.
ДОГ
пачынае
раздаваць
сьцяжкі.
Ён пачынае
з АБЭЛЯ,
які
атрымлівае
сьцяжок і
ідзе за
сцэну. ДОГ
дае
сьцяжкі
БЭЙКЕРУ,
ЧАРЛІ й
сяму-таму
з публікі.
Пры гэтым
ён
падлічвае
сьцяжкі,
каторыя
раздае.

ДОГ. Сонца, шчаўе, раса, вугольле, патэльня, шкарпэтка, лёгкі, яскравы, ніякі, бочка, што, боўдзіла…

ІЗІ, які
ўжо паклаў
плашку й
назірае за
ДОГАМ,
робіць
крок да
яго.

ІЗІ. Што?
ДОГ (*прымае гэта за папраўку*). Боўдзіла.
ІЗІ. Што?!
ДОГ. Боўдзіла!
ІЗІ. Што?!
ДОГ (*раздражнёна пералічвае ўслых, каб пераканацца, што меў рацыю*). Сонца, шчаўе, раса, вугольле, патэльня, шкарпэтка, лёгкі, яскравы, ніякі, бочка, што, боўдзіла…
ІЗІ. О-о!
ДОГ (*змучана*). Мір!

ДОГ
пераключае
ўвагу на
бутаньеркі.
ІЗІ чакае,
што яму
таксама
дадуць
адну.

ДОГ (*да Ізі*). Гніда! (*Дае бутаньерку Чарлі.*)
ЧАРЛІ. Брусок, прэч.
ДОГ. Блёк. /*Наступны./

БЭЙКЕР
выходзіць
наперад і
атрымлівае
сваю
бутаньерку.

БЭЙКЕР. Брусок, прэч.
ДОГ (*кліча Абэля*). Блёк! Абэль!

АБЭЛЬ
выходзіць
на сцэну й
атрымлівае
сваю
бутаньерку.

Ён
пакрыўджана
трымаецца
за вуха й
глядзіць
на ІЗІ.

АБЭЛЬ. Брусок, прэч. (*Ідзе назад да грузавіка.*)

ДОГ
чакальна
глядзіць
на ІЗІ.

ДОГ. Плашка? /*Парадак?/
ІЗІ. Блёк.
ДОГ. Плашка.
ІЗІ. Блёк.
ДОГ. Плашка.

Ён
відавочна
чакае, што
ІЗІ
працягне
працу. ІЗІ
пераглядае
накрыс,
зноў
кладзе яго
ў кішэню й
нэрвова
крычыць
АБЭЛЮ.

ІЗІ. Блёк!

Ён
зьдзіўляецца
й адчувае

палёгку,
бо ляціць
блёк. Да
гэтага
часу
ЧАРЛІ, які
вінавата
выключыў
радыё, як
толькі
зьявіўся
ДОГ,
пасьпеў
заняць
сваё
месца,
гэтаксама
й БЭЙКЕР.
Блёк
перадаецца
па ланцугу
да ІЗІ,
які кладзе
яго на
плашкі.

ІЗІ (*выкрыквае*). Блёк!

Яшчэ адзін
блёк
перадаецца
гэткім жа
шляхам.
Задаволены
ДОГ
сыходзіць.

ІЗІ (*выкрыквае*). Блёк!

На сцэну

шпурляецца
плашка.
БЭЙКЕР
падхоплівае
яе й
перадае
ЧАРЛІ,
які,
аднак,
прадчувае
рэакцыю
ІЗІ, і
нясе
плашку ў
заднюю
частку
сцэны, каб
пакласьці
да блёкаў
на
падлогу.

ІЗІ (*гучна выкрыквае*). Блёк!

Шпурляецца
яшчэ адна
плашка, і
БЭЙКЕР зь
няменшай
кемлівасьцю
адносіць
яе ў
заднюю
частку
сцэны. ІЗІ
ваяўніча
выходзіць
да АБЭЛЯ.

ЧАРЛІ. Ён што, крэтын?

БЭЙКЕР. Ён што, крэтын? Раса – таксоўка – варэньне. /* «Варэньне» азначае задавальненьне й адабрэньне./
ІЗІ (*за сцэнай*). Несусьветны дурань!
АБЭЛЬ. Прэч?

Пасьля гэтага АБЭЛЬ ізноў крычыць ад болю. ЧАРЛІ зноў уключае радыё. Па радыё піпчыць знаёмы сыгнал часу. БЭЙКЕР зьвярае свой гадзіньнік.

Голас з РАДЫЁ. Праверце мармытаць наўрад знадворку. / *Перадаём футбольныя вынікі./

ЧАРЛІ дастае з ранца купон з стаўкамі й пачынае зьвяраць іх. Інтанацыя мовы, якая ліецца з радыё, – даволі пазнавальная. З гэткай

інтанацыяй
абвяшчаюць
перамогі
на сваім
полі, на
полі
праціўніка
й вынікі
лятарэяў.
Вось
пераклад
лічбаў:
Нуль =
даволі 3
= раса
1 =
сонца 4
= вугольле
2 =
шчаўе 5
=
патэльня.
Акрамя
таго,
«Гадзіньнік»
і
«Супрацьтуманная
фара»
адпавядаюць
«Сіты» й
«Юнайтэд».
Такім
чынам,
вынік
«Пікша
Гадзіньнік
– Пікша
Супрацьтуманная
фара –
даволі:раса»

будзе
паведамляцца
інтанацыяй,
адпаведнай,
скажам,
«Манчэстар
«Сіты» –
«Манчэстар
«Юнайтэд»
– 0:3,
перамога
на полі
працiўніка».
Радыё
пачынае
абвестку з
словаў
«Прадаўгаватае
сонца» з
інтанацыяй
«Дывізія –
адзін».

Голас з РАДЫЁ. Прадаўгаватае – Трушок – сонца:даволі, Кромка – Стаянка таксовак – шчаўе:шчаўе, Дыван Гадзіньнік – Труба Гадзіньнік – даволі:шчаўе, Сумка – Пікша Гадзіньнік – шчаўе:даволі, Пікша Супрацьтуманная фара – Цуд – раса:даволі, Пікніковая…

ЧАРЛІ пры
гэтым
прысьвіствае:
перамога
на полі
працiўніка
5:0. Тым
часам
ізноў
уваходзіць
ІЗІ з

высокім
стосам
блёкаў. За
ім кульгае
АБЭЛЬ з
падобным
стосам.
ІЗІ
ставіць
свае блёкі
на зямлю.
Ён
заўважае
радыё й
тое, што
ЧАРЛІ
зьвярае
стаўкі.
ІЗІ
выцягвае
свой купон
з стаўкамі
й аловак,
але потым
усьведамляе,
што нічога
ня можа
разабраць
з таго,
што
гаворыцца
па радыё.

ІЗІ (*агаломшана*). Вы ня супраць, калі я ў вас нешта запытаю? На якой вы хвалі?

Тым часам
БЭЙКЕР
пачаў
складаць

акуратную
сьценку з
блёкаў і
плашак,
якія былі
прынесеныя
дагэтуль.
Цяпер
відаць,
што на
некаторых
блёках
напісаныя
розныя
літары.
ІЗІ
адкладае
свой купон
з стаўкамі
й дадае
блёкаў да
прыступак.
АБЕЛЬ
кідае свой
стос
блёкаў
каля
БЭЙКЕРА й
кульгае
назад за
сцэну, да
грузавіка.
Уваходзіць
ДОГ.

ДОГ (*да Ізі*). Ідыёцкі падхалім. /*Чырвоны дыван./
ІЗІ (*хапае Дога за штрыфелі*). Асьцярожней!
ДОГ
зьдзіўлена

вызваляецца.

ДОГ (*да Ізі*). Паўднё – ідыёцкі падхалім?
БЭЙКЕР (*да Дога*). Цэгла, прэч. /*Сюды, сэр./
ДОГ. Ах, брусок.

БЭЙКЕР паказвае на дыван. ДОГ разгортвае чырвоны дыван так, што атрымліваецца дарожка ад мікрафона да кулісаў. Як толькі ДОГ увайшоў, ЧАРЛІ адключыў радыё, і цяпер БЭЙКЕР ізноў далучаецца да яго, каб разам будаваць сьцяну. ІЗІ ўжо скончыў прыступкі. Зробленая й сьцяна. БЭЙКЕРА й ЧАРЛІ не відаць, бо

яны
будавалі
сьцяну,
стоячы за
ёю, і
цяпер
схаваныя
за ёю.
Такім
чынам,
відаць
толькі
ІЗІ, які
стаіць
перад
сьцяной.
Ён яшчэ не
заўважыў
літар,
якія
складаюць:ІЗІ
дастае з
кішэні
накрыс і
зноў
вывучае
яго. ДОГ
заўважае
сьцяну. Ён
глядзіць
на ІЗІ.
ІЗІ
глядзіць
на сьцяну,
потым – на
ДОГА. Ён
усьміхаецца.
ДОГ
зьлёгку
б’е ІЗІ па

шчацэ. ІЗІ адкрывае рот, каб выказаць пратэст. ДОГ моцна б’е яго кулаком па другой шчацэ, і ІЗІ ляціць празь сьцяну, якая ад гэтага развальваецца. ДОГ бярэ аркуш паперы з кішэні ІЗІ й уважліва разглядае яго. ІЗІ падымаецца з падлогі. ЧАРЛІ й БЭЙКЕР ізноў займаюць свае пазыцыі. ДОГ аддае ІЗІ паперу.

ГАД
ЕЎ ТОЛ
ГАМ

ІЗІ. Слухайце, што ў вас за гульні?
ДОГ. Брусок. /*Дзякуй./
ІЗІ. Га?
ДОГ. Брусок. (*Затым ён крычыць Абэлю.*) Брусок! Абэль!

Да БЭЙКЕРА
ляціць
брусок,
перадаецца
ЧАРЛІ,
перадаецца
ІЗІ, які
кладзе
яго, куды
трэба.

ДОГ (*да Чарлі й Бэйкера*). Плашка?
ІЗІ. Брусок.
ДОГ. Плашка.
ЧАРЛІ і БЭЙКЕР. Брусок, прэч!
ІЗІ (*злосна*). Прэч!

ДОГУ гэта
прыемна й
ён
усьміхаецца.
ІЗІ цалкам
разгублены.
Задаволены
ДОГ
выходзіць.

ІЗІ. Брусок!

Яшчэ адзін
брусок
гэтак жа
трапляе на
месца.

ІЗІ. Брусок!

Павольна

ляціць
плашка, і
ЧАРЛІ з
БЭЙКЕРАМ
разам
падхопліваюць
яе. У тую
ж хвіліну
яны нясуць
яе ў
заднюю
частку
сцэны й
кладуць на
падлогу ў
падмурак
новай
сьцяны.
Яны
пачынаюць
будаваць
сьцяну
наноў. Тым
часам ІЗІ
выходзіць
да АБЭЛЯ,
і, як
толькі ён
апынаецца
за сцэнай,
чуваць
моцны ўдар
кулаком і
крык
АБЭЛЯ.
Уваходзіць,
кульгаючы,
АБЭЛЬ, які
трымаецца
за вуха й

паціpае
сьпіну.

ІЗІ (*за сцэнай*). Брусок!

Праз
АБЭЛЕВУ
галаву
павольна
ляціць
брусок.
Засьпеты
зьнянацку
АБЭЛЬ
хапае
брусок і
кладзе яго
на
прыступкі.
Гэта
паўтараецца
зноў і
зноў,
пакуль
БЭЙКЕР і
ЧАРЛІ
будуюць
наноў
сьцяну.
АБЭЛЬ,
аднак,
робіць з
брускоў
вежу,
замест
таго каб
класьці
новы
ўзровень.
Пасьля
сямі

брускоў,
як радасны
сабачка,
уваходзіць
ІЗІ,
бачыць
брусковую
вежу, якая
пагражае
зрынуцца,
і ледзь
пасьпявае
прадухіліць
яе
падзеньне.
Тым часам
БЭЙКЕР і
ЧАРЛІ
схаваліся
зь віду,
бо зноў
пабудавалі
сьцяну, на
якой цяпер
напісана:Уваходзіць
ДОГ. Ён
нясе
маленькі
столік з
срэбнымі
прызамі,
прыкрытымі
аксамітнай
матэрыяй.
Ён
падыходзіць
да
мікрафона
й правярае
яго.

ГОГАТ
МЛЕЎ
АД

ДОГ. Сонца, шчаўе, раса…

Мікрафон
не працуе.

ДОГ (*да Бэйкера*). Пікша сьвятар.
БЭЙКЕР. Пікша, прэч?
ДОГ. Сьвятар.

БЭЙКЕР
ідзе да
мікрафона
й уключае
яго.

ДОГ. Сонца, шчаўе, раса… Кеды. /*Выдатна./

Мікрафон
працуе.
Тым часам
ІЗІ
належным
чынам
паклаў
брускі,
якія
ўтвараюць
пляцоўку
над
прыступкамі.
Аднак яму
не хапае
аднаго
бруска.
АБЭЛЬ ідзе
назад да
грузавіка.

ІЗІ. Бруска не хапае.

ДОГ (*да Ізі*). Цэглы?
ІЗІ. Бруска!
ДОГ. Цэглы.
ІЗІ. Бруска!

З
грузавіка
павольна
ляціць
брусок,
ІЗІ
падхоплівае
яго – і
прыступкі
гатовыя.
ДОГ
паварочваецца,
каб
выйсьці,
бачыць
новую
сьцяну з
надпісам і
глядзіць
на ІЗІ.
ІЗІ
глядзіць
на сьцяну.
Затым – на
ДОГА.

ІЗІ. Мір!

ДОГ куляе
яго ўдарам
празь
сьцяну,
якая
развальваецца.
ДОГ
выходзіць.

ЧАРЛІ й
БЭЙКЕР
пачынаюць
зьбіраць
кампанэнты
сьцяны.

ІЗІ (*крычыць наўздагон Догу*). Паршывец! /*Кветкі!/

ЧАРЛІ,
БЭЙКЕР і
ІЗІ стаяць
няроўным
ланцужком
уздоўж
дывана.
ДОГ зараз
жа
зьяўляецца
з букетам,
загорнутым
у цэляфан
і
перавязаным
чырвонай
стужкай.
Важна, каб
букет
кідаўся ў
вочы, бо
ён
зьяўляецца
ў другой
частцы
п’есы. ДОГ
дае букет
ЧАРЛІ.
Грае
маршавая
музыка.

ЧАРЛІ
перадае
букет
БЭЙКЕРУ,
які дае
яго ІЗІ.
ІЗІ торкае
букет ДОГУ
ў рукі, як
той
выходзіць.
Разьюшаны
ДОГ
вяртаецца
й аддае
кветкі
назад ІЗІ,
які дае іх
АБЭЛЮ, як
той
уваходзіць.
АБЭЛЬ
аддае іх
ЧАРЛІ, той
губляе іх,
калі будуе
наноў
сьцяну.
ІЗІ
выходзіць
і
вяртаецца
з
насьцілам
для
пляцоўкі.
ЧАРЛІ й
БЭЙКЕР, да
якіх цяпер
далучыўся

АБЭЛЬ, будуюць наноў сьцяну, затым дастаюць з кішэняў свае маленькія сьцяжкі й пачынаюць махаць імі. Няшчасны ІЗІ далучаецца да іх. Уваходзіць ДАМА, за ёю з ухмылкай ідзе ДОГ. Грае музыка, трапечуцца сьцяжкі. ДАМА падыходзіць да мікрафона. Музыка сьціхае, і ДАМА зьбіраецца сказаць прамову, напісаную на акуратнай паштоўцы,

якую ДАМА
трымае ў
руцэ,
апранутай
у
пальчатку.

ДАМА (*мілым голасам*). Неахайныя падлюгі, паршыўцы, цяжкія падлеткі, шалёнікі й чысьцёхі… (*Кшталту: «Вашая Сьветласьць, спадары й спадарыні, хлопчыкі й дзяўчынкі…»*) Сумны факт, малалетні вылюдак скуголіць, рыгае, харкаецца, ягоны начны гаршчок сьмярдзіць; дурні вырастаюць і крадуць; сьмярдзючыя шкарпэткі, мокрыя саплівыя насоўкі, азартныя гульні, даўгі; другасортныя кнігі, мацюкі, дваровая багна, мастурбацыя, пранцы, прышчы, падлюгі, вісячыя замкі, напрошваюцца, каб ім далі ў карак ці скруцілі рукі, недатумкі; трапляюць у пастарунак, рабуюць, жлукцяць кока-колу, зьдзяйсьняюць налёты на банкі. …Калі шчыра, не магу лупцаваць дзяцей. Mens sana in corpore sano.

Аплядысмэнты.
ДАМА
сыходзіць
з
плятформы
пры
дапамозе
ДОГА. Яны
становяцца
каля
століка.
ДОГ здымае
аксаміт, і
мы бачым
школьныя
ўзнагароды.

ДОГ (*паказвае школьныя прызы й чытае*). Чапяла ў варэньні, узышло сонца – Фокс Мажор.

ФОКС
выходзіць
з публікі,
зь левага
боку,
узыходзіць
па
прыступках
на сцэну й
забірае
свой прыз.
Ён
паціскае
руку ДАМЕ,
якая
сьвеціцца
ад
шчасьця.

ФОКС. Брусок, печ. /*Дзякуй, мадам./ (*Сыходзіць уніз да публікі, але ўправа.*)
ДОГ. Як грымзала прымат што, узышло сонца – Фокс Мажор.

ФОКС, які
ўсё яшчэ
знаходзіцца
каля
пярэдніх
крэслаў,
паварочваецца
й
нязграбна
праціскаецца
паміж
двума
радамі.

ФОКС (*пераступаючы празь людзкія ногі, перапрашальна ўскрыквае*). «Жалязьзё» /*Прабачце./ (*Выходзіць на сцэну й*

забірае гэты прыз, як і папярэдні.)

ДОГ. Карункавыя манжэты пусты крыж… Шалёныя ранішнія прабежкі… Адстаўка пудзеляў… Дынныя ногі арачныя ліхтары… Штамп за раскачваньне тазам… У чорную сажу пірогні нас… Справядліва чэлесы падвойваюцца… Неўтаймавана элегантны… Шпунт… Фокс Мажор. (*Дог увесь час ставіць гэтыя прызы на аксаміт, якім яны былі раней прыкрытыя і які ён паклаў на памост, пабудаваны Ізі.*)

ФОКС
ускрыквае
ад
радасьці,
калі чуе
сваё імя,
і
сьпяшаецца
на сцэну,
як і
раней, але
бярэ
столік,
які цяпер
ужо амаль
пусты, і
выходзіць
трыюмфальна
ў левую
кулісу.
Падчас
прэзэнтацыі
АБЭЛЬ,
БЭЙКЕР і
ЧАРЛІ
махаюць
сьцяжкамі
кожны раз,
як ФОКС
узыходзіць
на сцэну,
але на

тварах у
іх
незадаволенасьць
і нудота.

ДОГ. Практычна… Гелмет шкарпэткі на ноч Данііі. /*А цяпер… Гамлет, прынц Дацкі./
МІСІС ДОГ (*папраўляе яго*). Гамлет…
ДОГ. Гамлет шкарпэткі на ноч Данііі, сьнежны чалавек Шэксьпір. (*Да Місіс Дог.*) Паршывец?
МІСІС ДОГ. Паршывец… паршывец… паршывец? /*Кветкі?/ (*Яна глядзіць на школьнікаў, якія ня ведаюць, дзе што. Місіс Дог адварочваецца ад іх і дае Даме сваю бутаньерку, зь лёгкім рэвэрансам. Да Дамы.*) Грыжа, гнілыя ныркі, сьмярдзючыя нарывы, шчыра гангрэна пад пахамі прарываюцца лічынкамі мясных мух…
ДАМА (*з імпэтам і шармам*). Хай спруцянее клюб багатыроў!

Музыка.
ДОГ, МІСІС
ДОГ і ДАМА
выходзяць
уздоўж
сьцяны.
ДАМА
заўважае
надпіс на
сьцяне,
дзе
гаворыцца:Яна
агаломшаная,
але храбра
працягвае
выходзіць.
ДОГ кідае
гняўлівыя
позіркі на
ІЗІ. Як
толькі
ДАМА й

МІСІС ДОГ
сыходзяць
з сцэны,
ДОГ
разварочваецца
й маршыруе
назад да
ІЗІ. ІЗІ
глядзіць
на ДОГА.
ДОГ
глядзіць
на сьцяну.
ІЗІ
пакорліва
кідаецца
празь
сьцяну,
каторая
разбураецца.
ДОГ
выходзіць.
ІЗІ ўстае.

ДАМЕ
ГЛОГ
АЎТ

ІЗІ (*разьюшана крычыць наўздагон Догу*). Мех з друхлом! Тыфозны ёлупень!

АБЭЛЬ,
БЭЙКЕР і
ЧАРЛІ
таксама
пакрыўджаныя
на ДОГА, і
ўсе іхныя
наступныя
словы, як

і словы
ІЗІ, –
гэта
абразы ў
адрас
ДОГА, хаця
неабавязкова
выкрыкнутыя
наўздагон.

БЭЙКЕР. Мір! Айва гараж!
ІЗІ. Крывадушны сутэнэр і падхалім!
ЧАРЛІ. Рамонкавы спадар!
ІЗІ. Садыст! Фашыст!
АБЭЛЬ. Рыбкі! Паўднё!
ІЗІ. Надакучлівы выродак! Вар'ят!
АБЭЛЬ. Авакадна-замкавая канапа Дог!
ІЗІ. Я павыпускаю яму вантробы! Не сысьці мне з гэтага месца, калі я гэтага не зраблю!
АБЭЛЬ (*да Ізі пра Дога*). Авакадна-замкавы сігарны дым.
ІЗІ (*да Абэля*). Праўда! Не сысьці мне з гэтага месца! Дам яму пад задніцу!
БЭЙКЕР (*да Ізі*). Айвовы таросісты лёд!
ІЗІ (*да Бэйкера*). Праўда!
ЧАРЛІ. Рамонкавы спадар!
БЭЙКЕР. Плашка прэч, гніда прэч.
ІЗІ. Тры мяхі з друхлом! Шалёны выскачка-неданосак!
ЧАРЛІ. Рамонкавая ваніль!
ІЗІ. Спадар! Айвовая багна! Каб ягоную машыну пранцы ўзялі за ягоны мір – так што дапамажы мне, Дог, пабачыш авакада!
Плашка.
БЭЙКЕР. Ідыёцкі падхалім.
ІЗІ. Плашка. Крэтын, лыч сьвіны?
БЭЙКЕР. Крэтын, лыч сьвіны? Вугольле: боўдзіла. /*4:10./
ІЗІ. Што?
БЭЙКЕР. Боўдзіла.
ІЗІ. Брусок.

Увесь гэты
час АБЭЛЬ,
БЭЙКЕР і

ЧАРЛІ
наноў
будавалі
сьцяну, а
ІЗІ
скручваў
чырвоны
дыван.
Цяпер ІЗІ
пачынае
зьбіраць
усе
сьцяжкі,
пачынаючы
зь
сьцяжкоў
АБЭЛЯ,
БЭЙКЕРА й
ЧАРЛІ,
пакіданых
з агідай
на
падлогу.
Ён забірае
сьцяжкі ў
публікі й
адначасова
падлічвае
іх, пры
гэтым ён
дзякуе
кожнаму,
кажучы:
«Брусок».

ІЗІ. Сонца, шчаўе, раса, вугольле, патэльня, шкарпэтка, лёгкі, яскравы, ніякі, ночка, што, боўдзіла!

АБЭЛЬ,
БЭЙКЕР і

ЧАРЛІ
толькі што
скончылі
будаваць
сьцяну й
схаваныя
за ёю. ІЗІ
ідзе да
выйсьця,
калі мы
чуем…

БЭЙКЕР (*з-за занавеса паказвае на мікрафон*). Пікша.

ІЗІ
вяртаецца
й забірае
з сабой
мікрафон.
Перш, чым
выйсьці…

ІЗІ. Гамлет шкарпэткі на ноч Данії. Сьнежны чалавек Шэксьпір.

На сьцяне
напісана:Мяняецца
асьвятленьне,
і чуваць
фанфары.
Уваходзіць
ДОГ,
апрануты
для ўдзелу
ў «15-
хвілінным
Гамлеце».
Ён ідзе да
памосту,
зь якога
кажа

пралёг да
«Гамлета»,
і затым
выходзіць.
Пасьля
гэтага
сьцяна й
прыступкі
выкарыстоўваюцца
ў якасьці
сьценаў і
крапасных
валоў
Эльсынору.
На заднім
пляне, на
сцэне,
зьлева й
справа па
шырме. На
левай
шырме
ўверсе –
карніз,
пры
дапамозе
якога з-за
шырмы
выкідаюцца
выразаныя
сонца,
месяц ці
карона. На
пярэднім
пляне
сцэны
начэпленая
на
стрыжань
дзвюхмерная

выразаная
магіла
АФЭЛІІ.

ДОГАЎ
ГАМ
ЛЕТ

ПРАЛЁГ

Уваходзіць
ШЭКСЬПІР,
кланяецца.

ШЭКСЬПІР. Вялікі дзякуй за дазвол ваш добры.
Такі парадак. І хоць я тутэйшы,
І мог бы прызвычаіцца – аднак
Яго лепш адмяніць, чым захаваць.
Што ж. Будзе так.
Гніль завялася ў Дацкім каралеўстве.
Пытаньне: быць альбо ня быць? Што лепей?
У небе й на зямлі ёсьць болей рэчаў,
Чым сьніцца філязофіі тваёй.
Ёсьць нехта, хто канчае нашы справы
Па-свойму, не зважаючы на нас.
У вар'яцтве гэтым ёсьць свая пасьлядоўнасьць.
Я жорсткім стаў, але хацеў быць добрым.
Трымаць іх, як люстэрка перад прыродай.
Хутчэй здавацца сумным, чым сярдзітым.

ДАМА, якая
сядзіць
сярод
публікі,
крычыць:
«Варэньне!»

Дама зашмат абяцае.
Кот мяўкае, і Дог глядзіць у лес!

ШЭКСЬПІР
кланяецца
й
выходзіць.
Канец
пралёгу.

Зубчастыя
сьцены
замку.
Грымоты й
вецер.
Уваходзяць
два
вартаўнікі:
БЭРНАРДА/
МАРЦЭЛ і
ФРАНЦЫСКА/
ГАРАЦЫЁ.
Вартаўнікоў
граюць
АБЭЛЬ і
БЭЙКЕР
адпаведна.
Яны
апранутыя,
як для
тыповай
Шэксьпіраўскай
п’есы –
праўда, на
іх
кароткія
нагавіцы.
Вартаўнікі
на
пляцоўцы.

БЭРНАРДА. Хто тут?
ФАНЦЫСКА. Адказвай першы; стой і адзавіся.
БЭРНАРДА. Няхай жыве кароль! Ідзі ўжо спаць.
ФАНЦЫСКА. Вялікі дзякуй за дазвол ваш добры.
БЭРНАРДА. Ну што, ізноў зьяўляўся гэты самы?
ФРАНЦЫСКА. Маўчы! Глядзі, ён зноў ідзе сюды!
БЭРНАРДА. Якраз такі, як наш кароль-нябожчык.
ФРАНЦЫСКА. Я небам заклінаю, гавары!
БЭРНАРДА (*паказвае й глядзіць у левы бок сцэны*).
Ён тут!
ФРАНЦЫСКА (*паказвае й глядзіць у правы бок сцэны*).
Ён тут!
БЭРНАРДА (*глядзіць управа*).
Пайшоў.
ФРАНЦЫСКА: А вось і золак у плашчы пурпурным
Выходзіць на расістыя ўзвышшы.

На словах «А вось і золак» выразанае сонца пералятае празь левую шырму й апускаецца на яе.

БЭРНАРДА. Патрэбна, каб прынц Гамлет знаў пра тое,
Што бачылі мы ўночы…

Выходзяць. Канец сцэны.

Каралеўскі пакой у замку. Празь левую шырму

перакідваецца
выразаная
карона.
Фанфары.
Уваходзяць
КЛАЎДЗІ і
ГЕРТРУДА,
якую грае
МІСІС ДОГ.

КЛАЎДЗІ. Хаця нябожчык Гамлет, любы брат наш,
Пакінуў нас нядаўна…

Уваходзіць
ГАМЛЕТ,
якога грае
ФОКС
МАЖОР.

Мы нашую сястру і каралеву
Ўзялі за жонку.
А ты, сваяк мой Гамлет, любы сыне?..
ГАМЛЕТ. Амаль сваяк, але зусім ня сын.

КЛАЎДЗІ і
ГЕРТРУДА
выходзяць.

О, растаўчы б крутое гэта цела,
Разьбіць ушчэнт, рассыпаць, як расу!
Двух месяцаў, як ён памёр, няма,
Той, хто любіў так моцна і аддана!
Падступнасьць – вось тваё імя, жанчына!
Пайшла за майго дзядзьку, брата бацькі.
Бо тое, што з памінак засталося,
Даесьці трэба – вось табе і шлюб.

Карона
ляціць
уніз.
Убягае
ГАРАЦЫЁ.

ГАРАЦЫЁ. Сягоньня ўночы бацька ваш прыходзіў,

Прынц, на пляцоўцы, там, дзе мы вартуем.
ГАМЛЕТ. Дзіўна, вельмі дзіўна.
Узброен, кажаце?
ГАРАЦЫЁ. Узброен, прынц…
Хутчэй здаваўся сумным, чым сярдзітым.
ГАМЛЕТ. Дух бацькі ў зброі! гэта не к дабру.
Тут нешта ёсьць. Не дачакацца ночы.

Выскоквае месяц. Выходзяць на парапет. Канец сцэны.

Зубчастыя сьцены замку. Шум пагулянкі, гарматных стрэлаў, фаервэркаў. ГАРАЦЫЁ й ГАМЛЕТ зьяўляюцца на пляцоўцы, пабудаванай ІЗІ.

ГАМЛЕТ. Кароль банкет спраўляе на ўсю ноч.
Такі парадак, і хоць я тутэйшы,
Я мог бы прызвычаіцца – аднак
Яго лепш адмяніць, чым захаваць.

Гудзе вецер.

ГАРАЦЫЁ. Глядзіце, прынц, глядзіце, вунь ідзе.

ЗДАНЬ уваходзіць

па сьцяне,
пабудаванай
з блёкаў.

ГАМЛЕТ. Ратуйце нас, о сэрафімы неба!
Гніль завялася ў Дацкім каралеўстве!
Здань бедная.
ЗДАНЬ. Я твайго бацькі дух.
Адпомсьці за ягоную душу
Й нялюдзкае і подлае забойства.
ГАМЛЕТ. Забойства?
ЗДАНЬ. Ведай, сын мой: люты змей,
Што атруціў мяне, надзеў маю карону.
ГАМЛЕТ. Мая душа, ты прадчувала! Дзядзька!
(*Здань выходзіць. Гамлет – да Гарацыё.*)
У небе й на зямлі ёсьць болей рэчаў,
Чым сьніцца філязофіі тваёй. (*Гарацыё выходзіць.*)
На нейкі час прыкінуся вар'ятам.
Век вывіхнуўся. О, пракляты лёс,
Навошта ты мяне сюды прынёс
Лячыць хваробы часу!

ГАМЛЕТ
выходзіць.
Месяц
зьнікае.

Пакой у
замку.
Зьяўляецца
карона.
Фанфары,
за імі
гучаць
флейта й
клявэсін.
Уваходзіць
ПАЛОНІ.
Падбягае
АФЭЛІЯ.

АФЭЛІЮ
грае,
натуральна,
ЧАРЛІ.

ПАЛОНІ. А ты чаго, Афэлія? У чым справа?
АФЭЛІЯ. Я, татачка, хусьцінку вышывала,
Ў пакоіку сядзела; раптам – стук;
І вось прынц Гамлет – без капелюша
Камзэлька нарасхліст, сам белы-белы.
Трасецца, уздрыгвае, блукаюць вочы,
Ён жаласны, разгублены такі
Ўбег і стаў.
ПАЛОНІ. Шалёны ад каханьня?
Вар'яцтва Гамлета прычыну я знайшоў!
(*Уваходзіць Гамлет, Афэлія выходзіць.*)
Вось ён ідзе, маркотны, і чытае.
Што гэта Вы чытаеце, мой прынц?
ГАМЛЕТ. Словы, словы, словы.
ПАЛОНІ. У гэтым вар'яцтве ёсьць свая пасьлядоўнасьць.
ГАМЛЕТ. Я вар'ят толькі пры норд-норд-вэсьце: калі вецер дзьме з поўдня, я адрозьніваю сокала ад бусла. (*Закрывае кнігу, б'ючы ёю Палонію ў грудзі.*)
ПАЛОНІ. Да нас прыехалі акторы, мой прынц. (*Выходзіць.*)
ГАМЛЕТ. Тады мы заўтра п'есу паглядзім.
Я чуў, калісь ў тэатры ліхадзеі
Бывалі так мастацкаю ігрою
Узрушаныя часам, што нарэшце
Публічна прызнаваліся ў злачынствах.
Дык вось няхай акторы перад дзядзькам
Пакажуць што-небудзь, што б нагадала
Яму забойства брата. Пагляжу,
Калі ён дрогне – ясна будзе ўсё.
Паставім п'есу: пастка і пятля, –
І выявім сумленьне караля.
(*Паўза.*)
Пытаньне: быць альбо ня быць?
(*Прыстаўляе да сэрца кінжал, выцягнены з рукава. Уваходзяць Клаўдзі і Афэлія.*)
Што лепей?

АФЭЛІЯ. Мой прынц!
ГАМЛЕТ. У манастыр!

АФЭЛІЯ й
ГАМЛЕТ
выходзяць.

КЛАЎДЗІ. Тут не каханьне – іншая хвароба.
Аднак ён не вар'ят. Яго туга
Наседжвае штось іншае, таму
Ён безадкладна ў Англію паедзе.

КЛАЎДЗІ
выходзіць.
Канец
сцэны.

Заля ў
замку.
Фанфары.
Уваходзяць
ГАМЛЕТ,
АФЭЛІЯ,
МАРЦЭЛ з
ГАРАЦЫЁ
(жартуючы),
КЛАЎДЗІ і
ГЕРТРУДА.
Лялечныя
акторы
зьяўляюцца
над левай
шырмай.

ГАМЛЕТ (*да лялечных актораў*). Прамаўляйце свае словы, малю вас, бойка, як я вам наказаў. Няхай будуць яны люстэркам перад прыродай.

Усе
сядаюць,
каб
паглядзець
гульню

лялечных
актораў.
Музыка як
у
батлейцы.

ГАМЛЕТ (*да Гертруды*). Мая каралева, як Вам падабаецца п’еса?
ГЕРТРУДА. Як па мне, дама зашмат абяцае.
ГАМЛЕТ. Ён атручвае яго ў ягоным уласным садзе. Зараз вы ўбачыце, як забойца дамагаецца каханьня Ганзагавай жонкі. (*Клаўдзі устае.*) Кароль устае. (*Спыняецца музыка. Усчынаецца гуд галасоў.*) Што, спужаўся халастога стрэлу?

КЛАЎДЗІ
выходзіць.

УСЕ. Спыніце спэктакль!

Лялькі
зьнікаюць,
зьнікае
карона.

ГАМЛЕТ. Сьвятла! Сьвятла! Сьвятла! Даю тысячу фунтаў, здань мела рацыю!

Выходзяць
усе,
акрамя
ПАЛОНІЯ.

ПАЛОНІ (*стоячы ўбаку*). Да маці ён пайшоў. За дываном ёсьць месца,
Дзе я схаваюся – там чутна будзе ўсё.

Канец
сцэны.

Пакой
каралевы.
ПАЛОНІ
стаіць за
правай
шырмай. З-
за шырмы

ён
перавешвае
полаг.
Грае
лютня.
Уваходзяць
ГАМЛЕТ і
ГЕРТРУДА.

ГАМЛЕТ. Ну, маці, што мне скажаш?
ГЕРТРУДА. Гамлет, ты моцна пакрыўдзіў свайго бацьку.
ГАМЛЕТ. Маці, ты моцна пакрыўдзіла майго бацьку.
(*Хапае яе.*)
ГЕРТРУДА. Што ты надумаў, Гамлет?
Ты хочаш загубіць мяне? Ратуйце!
ПАЛОНІ (*за габэленам*). Гэй! Гэй! Ратуйце!
ГАМЛЕТ. Ага, пацук! (*Заколвае Палонія.*) Даю дукат, забіты!
ГЕРТРУДА. О божа, што ты нарабіў?
ГАМЛЕТ. Я сам ня ведаю.
ГЕРТРУДА. А божа, ён вар'ят!
ГАМЛЕТ. Я жорсткім стаў, але хацеў быць добрым. Дабранач, маці.

ГАМЛЕТ
выходзіць
і цягне за
сабой
ПАЛОНІЯ.
ГЕРТРУДА
выходзіць,
рыдаючы.
Полаг
уцягваецца
назад за
шырму.
Канец
сцэны.

Іншы пакой
у замку.
Фанфары.

Вывешваецца
карона.
Уваходзяць
КЛАЎДЗІ і
ГАМЛЕТ.

КЛАЎДЗІ. Што скажаш, Гамлет, дзе Палоні?
ГАМЛЕТ. На вячэры. (*Няўклюдна хавае шпагу.*)
КЛАЎДЗІ. Мы вырашылі як мага хутчэй
Дзеля твайго спакою, мілы Гамлет,
Цябе адсюль справадзіць. Дык рыхтуйся,
Бо Англія вам рукі прасьцірае.
(*Гамлет выходзіць.*)
О Англія! Калі шануеш ты
Маю прыхільнасьць і маю магутнасьць –
Уважыш ты дзяржаўны наш загад.
Адзначана ў лісьце – мы прапануем
Сьмерць Гамлета. І ты зрабі нам гэта.
КЛАЎДЗІ
выходзіць.
Карона
зьнікае.
Канец
сцэны.

У моры.
Марская
музыка.
Над левай
шырмай
зьяўляецца
ветразь.
На памост
узыходзіць
ГАМЛЕТ і
раскачваецца,
як на
карабельным
мосьціку.
Ён выцірае

сьлёзы, і
яму
робіцца
дрэнна
праз
марскую
хваробу.
Марская
музыка
сьціхае.
ГАМЛЕТ
выходзіць,
трымаючы
руку каля
роту.

Яшчэ адзін
пакой у
замку.
Фанфары.
Уваходзяць
КЛАЎДЗІ і
ЛАЭРТ.

ЛАЭРТ. Дзе бацька мой?
КЛАЎДЗІ. Памёр.

Уваходзіць
АФЭЛІЯ ў
вар'яцкім
трансе.
Сьпявае й
трымае ў
руцэ букет
кветак,
загорнуты
ў цэляфан
і
перавязаны
чырвонай
стужкай.

Грае
лютня.

АФЭЛІЯ. У труне ляжыць ён непакрыты,
(*Пасьля першага радка яна дае кветку Лаэрту.*)
Гэй люлі-люлі, гэй люлі!
(*Пасьля другога радка яна б'е букетам Лаэрту па жываце. Гэта, вядома ж, гэны букет, якога не знайшлі пасьля прамовы.*)
Сьлёзы горкія над ім пралітыя…

Пасярод
трэцяга
радка яна
зьнікае за
левай
шырмай і
спыняецца
там.
КЛАЎДЗІ і
ЛАЭРТ
узіраюцца
ў той бок,
дзе яна
зьнікла, а
яна
перабягае
за імі на
другі бок.

ЛАЭРТ. Агонь, спалі мяне – о, любая сястра,
(*Афэлія падае на зямлю. Яна падхоплівае кветку, кінутую з-за правай шырмы.*)
Каб мела розум ты і гаварыла:
Адпомсьці, брат, – лягчэй бы мне было.
Пара мне разьлічыцца!
КЛАЎДЗІ. Так, пара.
Крыўдзіцель не ўцячэ ад тапара.

КЛАЎДЗІ і
ЛАЭРТ
выходзяць.
АФЭЛІЯ

сядае, каб
дацягнуцца
да
надмагільнай
памяткі,
якую яна
падцягвае
ўніз, і
хаваецца
за ёю.
Звон
зьвініць
чатыры
разы.
Канец
сцэны.

Цьвінтар.
Уваходзяць
ДАЛАКОП і
ГАМЛЕТ.

ГАМЛЕТ. І двух дзён мы не былі ў моры, як вельмі ваяўнічыя піраты пагналіся за намі. Калі яны пайшлі на абардаж, я пераскочыў да іх. У адно імгненьне адчапіліся яны ад нашага карабля; і я адзін быў паланёны. Яны да мяне ставіліся як высакародныя разбойнікі.
ДАЛАКОП. Хто будуе трывалей за муляра, карабельніка ды цесьлю?
ГАМЛЕТ. Трунар. Ягоныя дамавіны павінны трымацца ажно да Суднага дня.
(*Далакоп дае Гамлету чэрап.*)
Чый гэна?
ДАЛАКОП. Гэты самы чэрап, сэр, належаў Ёрыку, каралеўскаму блазну.
ГАМЛЕТ. Шкада, бедны Ёрык. (*Аддае чэрап далакопу.*) Але цішэй – ідзе Лаэрт. (*Адыходзіць убок.*)
Уваходзіць
ЛАЭРТ.

ЛАЭРТ. Які яшчэ абрад?
Бярыце дамавіну, апускайце, –
Няхай жа з хараства і чысьціні
Фіялкі ўзыдуць! Знай, бяздушны поп,
Мая сястра сярод анёлаў будзе,
Калі ты сам узвыеш у смале.
ГАМЛЕТ (*хаваецца за цагляным памостам*).
Чароўная Афэлія?!..
ЛАЭРТ. Праклятy тройчы! Не, зямлі ня рушце,
Хачу ў апошні раз цябе абняць.
ГАМЛЕТ (*выходзіць на месца дзеяньня*).
Чый гэта сум так пышна выяўляўся?
Я – Гамлет, Дацкі прынц!
ЛАЭРТ. Няхай цябе ухопіць д'ябал!

Усчынаецца
бойка.

ГАМЛЕТ. Прэч рукі!
КЛАЎДЗІ і ГЕРТРУДА раздымаюць іх.
КЛАЎДЗІ і ГЕРТРУДА. Гамлет! Гамлет!
ГАМЛЕТ. Ды я кахаў Афэлію. Скажы мне,
Што ты гатоў зрабіць дзеля яе?
ГЕРТРУДА. Лаэрт, ня слухай – ён вар'ят!
Выходзяць КЛАЎДЗІ, ГЕРТРУДА, ЛАЭРТ.
ГАМЛЕТ. Кот мяўкае, а воўк глядзіць у лес!

Выходзяць.
Канец
сцэны.

Заля ў
замку.
Фанфары,
перакідваецца
карона.
Уваходзіць
ГАМЛЕТ.

ГАМЛЕТ. Ёсьць нехта, хто канчае нашыя справы па-свойму, не зважаючы на нас. Але ты не ўяўляеш, як у мяне на сэрцы

цяжка. Ды ўсё адно. Што нам прадчуваньні? У падзеньні вераб'я ёсьць воля лёсу. Калі адбудзецца цяпер, ня здарыцца пасьля. Ня здарыцца пасьля – адбудзецца цяпер. А не адбудзецца цяпер, усё роўна калі-небудзь ды здарыцца. Быць напагатове – вось і ўсё.

(*Уваходзяць Лаэрт з Озрыкам, якія нясуць шпагі. За імі Клаўдзі і Гертруда з кубкамі.*)

Пачнём, сэр!

ЛАЭРТ. Пачнём, мой прынц.

Фанфары. Яны скрыжоўваюць шпагі й б'юцца.

ГАМЛЕТ. Ёсьць.

ЛАЭРТ. Не.

ГАМЛЕТ. На суд?

ОЗРЫК. Удар, удар выразны.

КЛАЎДЗІ. Чакайце, вып'ем. Гамлет, жэмчуг – твой. Здаровы будзь!

(*Кідае перліну ў кубак.*)

Нясіце кубак прынцу.

ГЕРТРУДА. За посьпех сына каралева п'е!

КЛАЎДЗІ. Ня пі, Гертруда!

ГЕРТРУДА. Я вып'ю.

ЛАЭРТ. А зараз я крану яго! Гэй, сьцеражыся!

Яны кідаюцца адзін да аднаго й б'юцца.

КЛАЎДЗІ. Яны забыліся. Яны ў крыві. Разьняць.

ОЗРЫК і КЛАЎДЗІ раздымаюць іх.

ЛАЭРТ. Я паміраю за сваю нявернасьць. (*Падае.*)

ГЕРТРУДА. Пітво! Пітво! Мяне атрутай напаілі. (*Памірае.*)
ГАМЛЕТ. Злачынства! Здрада! Гэй! Шукайце, дзе яна!

Уваходзіць
ФАРЦІНБРАС.

ЛАЭРТ. Яна тут, Гамлет. Гамлет, ты забіты.
І я ляжу тут, не ўздымуся болей.
Кароль. Кароль віноўнік.
ГАМЛЕТ. І тут?
Дык давяршай, атручаная шпага…
(*Забівае Клаўдзія.*)

Карона
зьнікае.

ЛАЭРТ. Даруй жа мне, як я табе дарую,
высакародны Га… м…
(*Памірае.*)
ГАМЛЕТ. Усьлед іду я!
Не прыйдзецца мне чуць навін ангельскіх.
Далей – маўчаньне.
(*Памірае.*)
ГАРАЦЫЁ. Сьпі, мой добры прынц.
І скон няхай твой адпяюць анёлы.
(*Паварочваецца й глядзіць у бок, супрацьлеглы публіцы.*)
Ідзіце, даць залп салдатам загадайце.

З-за сцэны
чуваць
чатыры
залпы. Усе
ўстаюць.
Кланяюцца
й
выходзяць.
Канец.

ВЫКАНАНЬНЕ
НА БІС

Знакі

«біс»
зьяўляюцца
над
абедзьвюма
шырмамі.
Фанфары.
Перакідваецца
карона.
Уваходзяць
КЛАЎДЗІ і
ГЕРТРУДА.

КЛАЎДЗІ. Мы нашую сястру і каралеву
(*Уваходзіць Гамлет.*)
Ўзялі за жонку.
Карона
зьнікае.

ГАМЛЕТ. Да гэткага дайсьці!
КЛАЎДЗІ і
ГЕРТРУДА
выходзяць.
Шуміць
вецер.
Зьяўляецца
месяц. Па
версе
ўваходзіць
ГАРАЦЫЁ.

ГАРАЦЫЁ. Сягоньня ноччу бацька ваш прыходзіў,
Прынц…
ГАМЛЕТ. Ратуйце нас, о сэрафімы неба!
(*Кажучы астатнія словы, бяжыць за кулісы.*)
Гніль завялася ў Дацкім каралеўстве!
Па версе
ўваходзіць
здань.

ЗДАНЬ. Я твайго бацькі дух.
Ведай, сын мой: люты зьмей,

(*Па версе ўваходзіць Гамлет.*)
Што атруціў мяне, надзеў маю карону.
ГАМЛЕТ. Мая душа! Ты прадчувала!
На нейкі час прыкінуся вар'ятам.

Выскоквае
месяц.
Выходзяць.
Кароткія
фанфары.
Бегам па
нізе
ўваходзіць
ПАЛОНІ.
Выскоквае
карона.

ПАЛОНІ. Вунь ён ідзе, маркотны, і чытае.

ПАЛОНІ
выбягае.
Уваходзіць
ГАМЛЕТ.

ГАМЛЕТ. Я чуў, калісьці у тэатры ліхадзеі
Бывалі так мастацкаю ігрою
Узрушаныя моцна…
(*Уваходзяць Клаўдзі, Гертруда , Афэлія; Марцэл і Гарацыё ўваходзяць жартуючы. Усе сядаюць, каб паглядзець уяўную п'есу. Над шырмай зьяўляюцца лялькі.*)
Калі той дрогне – ясна будзе ўсё.
(*Музыка як у батлейцы. Клаўдзі ўстае.*)
Кароль устаў!
УСЕ. Спыніць спэктакль!

Усе
выходзяць,
акрамя
ГЕРТРУДЫ й
ГАМЛЕТА.
Выскоквае
карона.

ГАМЛЕТ. Даю тысячу фунтаў, здань мела рацыю!
(*Уваходзіць Палоні, ідзе за габэлен. Кароткія фанфары.*)
Маці, ты моцна пакрыўдзіла майго бацьку.
ГЕРТРУДА. Ратуйце!
ПАЛОНІ. Гэй, гэй, ратуйце!
ГАМЛЕТ (*заколвае Палонія*).
Даю дукат, забіты!

Мёртвы
ПАЛОНІ
валіцца за
кулісы.
ГЕРТРУДА й
ГАМЛЕТ
выходзяць.
Кароткія
фанфары.
Уваходзіць
КЛАЎДЗІ,
за ім –
ГАМЛЕТ.

КЛАЎДЗІ. Дзеля твайго спакою, мілы Гамлет,
Цябе адсюль справадзіць.
(*Гамлет выходзіць.*)
Зрабі нам гэта, Англія.

КЛАЎДЗІ
выходзіць.
Уваходзіць
АФЭЛІЯ,
валіцца на
падлогу.
Устае й
падцягвае
магільную
памятку,
каб
накрыцца
ёю. Звон
зьвініць
два разы.

Уваходзяць
ДАЛАКОП і
ГАМЛЕТ.

ГАМЛЕТ. Піраты пагналіся за намі. І я адзін быў паланёны.
(*Бярэ ў Далакопа чэрап.*)
Шкада, бедны Ёрык. Але цішэй.
(*Аддае чэрап Далакопу.*)
Я – Гамлет, Дацкі прынц!

ДАЛАКОП
выходзіць.
Уваходзіць
ЛАЭРТ.

ЛАЭРТ. Няхай цябе ўхопіць д'ябал!

Яны
пачынаюць
біцца,
потым
кідаюць.
Уваходзіць
і
становіцца
паміж імі
ОЗРЫК са
шпагамі.
Яны
скрыжоўваюць
шпагі.
Выскоквае
карона.
Уваходзяць
КЛАЎДЗІ і
ГЕРТРУДА з
кубкамі.

ГАМЛЕТ. Пачнём, сэр!

ЛАЭРТ і
ГАМЛЕТ
б'юцца.

ОЗРЫК. Удар, удар выразны.
КЛАЎДЗІ. Нясіце кубак прынцу. Ня пі, Гертруда!
ГЕРТРУДА. Мяне атрутай напаілі!
(*Памірае.*)
ЛАЭРТ. Гамлет, ты забіты!
(*Памірае.*)
ГАМЛЕТ. Дык давяршай, атручаная шпага.
(*Забівае Клаўдзія. Карона зънікае.*)
Далей – маўчаньне. (*Памірае.*)

Два залпы
за
кулісамі.
Канец.

Усе акторы
ўстаюць,
каб
пакланіцца
публіцы.
Тым часам
уваходзіць,
сьвістаючы,
ІЗІ,
здымае
накрыўку з
прыступак,
бярэ
брусок і
ідзе зь ім
за кулісы.
Акторы
сыходзяць.

ІЗІ (*кажа да публікі*). Брусок. (*Выходзіць за кулісы.*)

Кагутаў Макбэт

«Кагутаў Макбэт» прысьвячаецца чэхаславацкаму драматургу Паўлу Когаўту.

* * *

АСОБЫ:

МАКБЭТ
ЛЭДЗІ МАКБЭТ
БЭНКА
МАКДАФ
РОС
ДАНКАН
МАЛКАЛЬМ
ПЕРШАЯ ВЕДЗЬМА
ДРУГАЯ ВЕДЗЬМА
ТРЭЦЯЯ ВЕДЗЬМА
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА
ДРУГІ ЗАБОЙЦА
ЛЕНАКС
ГАНЕЦ
КАГУТ
ІНСПЭКТАР
ГАСПАДЫНЯ
ІЗІ
ТРЫ ПАЛІЦЭЙСКІЯ
ГОСЬЦІ, ГАЛАСЫ, ГОЛАС ДЗІЦЯЦІ.

* * *

Скарочаны
«Макбэт» не
разьлічаны
на нейкую
пэўную

колькасьць
актораў.
Лепш за ўсё
было б
выконваць
п’есу, калі
ўсе акторы
граюць
збольшага
па адной
ролі. Але
яна таксама
можа
выконвацца
зь мінімум
трыма
акторамі й
дзьвюма
акторкамі. У
чэскіх
пастаноўках
Когаўт
разьмяркоўваў
ролі
наступным
чынам (*я ня
выкарыстаў
ДОНАЛБЭЙНА,
ПАРАНЕНАГА
КАПІТАНА,
ЖОНКУ
МАКДАФА й
ДРУГОГА
ГАНЦА*):
Першы
актор:
МАКБЭТ
Другі актор:
ДАНКАН,
БЭНКА,

МАКДАФ,
ПЕРШЫ
ЗАБОЙЦА,
ГАНЕЦ
Трэці актор:
РОС,
МАЛКАЛМ,
ДРУГІ
ЗАБОЙЦА,
ТРЭЦЯЯ
ВЕДЗЬМА
Першая
акторка:
ДРУГАЯ
ВЕДЗЬМА,
СЛУЖКА
Другая
акторка:
ЛЭДЗІ
МАКБЭТ,
ПЕРШАЯ
ВЕДЗЬМА

* * *

Дзея
адбываецца
ў
гасьцёўні
адной
кватэры.
Грымоты й
маланка.
ТРЫ
ВЕДЗЬМЫ ў
цьмяным
асьвятленьні.

ПЕРШАЯ ВЕДЗЬМА. Калі сустрэнемся мы зноў
У час залевы й перуноў?
ДРУГАЯ ВЕДЗЬМА. Калі заціхне сумятня

Й крывёй насыціцца гайня.
ТРЭЦЯЯ ВЕДЗЬМА. Дык значыць – на зыходзе дня.
ПЕРШАЯ ВЕДЗЬМА. А дзе?
ДРУГАЯ ВЕДЗЬМА. На верасоўі гэтым.
ТРЭЦЯЯ ВЕДЗЬМА. Тут мы сустрэнемся з Макбэтам.
РАЗАМ. Дабро ў мане, у праўдзе зман,
Ляцім жа ў морак і туман!

Гучаць
чатыры
барабанныя
ўдары.

ТРЭЦЯЯ ВЕДЗЬМА. Барабан! Барабан!
Новы йдзе да нас тыран!

Уваходзяць
МАКБЭТ і
БЭНКА.

МАКБЭТ. Ганебны дзень, аднак і справядлівы.
БЭНКА. Да Форасу далёка? Гэта хто?
Такія ссохлыя і ў строях дзікіх?
Не выдаюць на жыхароў зямлі,
Хаця й стаяць на ёй.
МАКБЭТ. Адказвайце, як здольныя на гэта!
Хто вы?

Ведзьмы
абкружаюць
МАКБЭТА.

ПЕРШАЯ ВЕДЗЬМА. Хвала табе, Макбэт, Глямісκі тан!
ДРУГАЯ ВЕДЗЬМА. Хвала табе, Макбэт, Каўдорскі тан!
ТРЭЦЯЯ ВЕДЗЬМА. Хвала Макбэту, новаму манарху!
БЭНКА. Прарочце мне – таму, хто не благае
У вас спагады й злосьці не баіцца!
ТРЭЦЯЯ ВЕДЗЬМА. Ты – продак каралёў, ды – не кароль.
Хвала, хвала, хвала, Макбэт і Бэнка!
ПЕРШАЯ ВЕДЗЬМА. Хвала вам, Бэнка і Макбэт!
МАКБЭТ. Яшчэ, вяшчухі сквапныя, яшчэ!
БЭНКА. Куды яны падзеліся?

Загараецца

сьвятло, і
робіцца
бачнай
гасьцёўня.

МАКБЭТ. Ў паветра.
Ах, лепш бы засталіся!
БЭНКА. Ці сапраўды было, пра што гаворым,
Ці мы надыхаліся багуну,
Што паланіў наш розум канчаткова?
МАКБЭТ. Твае нашчадкі будуць каралямі.
БЭНКА. Ты будзеш каралём.
МАКБЭТ. Яшчэ яны вярзьлі – Каўдорскім танам?
БЭНКА. Так, слова ў слова.
(*Уваходзіць Рос.*)
Хто тут?
РОС. Кароль шчасьлівы быў пачуць навіны
Пра посьпехі твае, Макбэт. Мяне ж
Даслаў з падзякай ад яго імя.
Ды як задатак міласьцяў вялікіх
Цябе Каўдорскім танам ён абвесьціў.
БЭНКА. Што? Д'ябал нам сказаў сьвятую праўду?
МАКБЭТ. Але Каўдорскі тан яшчэ жывы.
Нашто мне скрадзеная апранаха?
РОС. Хто танам быў, яшчэ жывы; ды здрадзіў
І выкрыты, і здраду сам прызнаў.

РОС аддае
МАКБЭТУ
ланцуг і
пячатку
Каўдора.

МАКБЭТ (*убок*). Гляміс, Каўдорскі тан.
Прароцтва адбылося. Вось пралёг
Да п'есы з каралеўскім антуражам –
Вялікі дзякуй, джэнтэльмэны, вам.
РОС. Хвала, Каўдор магутны!

РОС і
БЭНКА
выходзяць.

МАКБЭТ (*убок*). Вы мне ў душу не зазірайце, зоркі,
Там чорнага жаданьня прывід горкі.

МАКБЭТ
выходзіць.
Барабаны.
Уваходзіць
ЛЭДЗІ
МАКБЭТ.
Яна чытае
ліст.

ЛЭДЗІ МАКБЭТ (*чытае ўголас*). «Калі я застыў нерухома ад зьдзіўленьня, прыйшлі пасланцы караля й віталі мяне як «Каўдорскага тана» – тытулам, якім раней прывіталі мяне багіні лёсу, а далей жа зьвярнуліся яны да мяне гэтак: «Слава наступнаму каралю». Я падумаў, што варта паведаміць табе пра гэта, мая дарагая спадарожніца ў вялікасьці, каб не пазбавіць цябе законнай радасьці ад таго, што ты ня будзеш ведаць, якая вялікасьць цябе чакае».
Ты танам стаў Гляміса і Каўдора
І пойдзеш далей, як наканавана.
Ды сумняюся я ў тваёй натуры:
Ты сырадоем дабрыні прапах,
Ня здольны крочыць напрасткі да мэты.
Хутчэй дадому! Плынь атрутных словаў
Залью табе я ў вушы. Языком
Зруйную перашкоды, што стаяць
Паміж табой і залатой каронай,
Якою лёс цябе каранаваў.
(*Уваходзіць Першы Ганец.*)
Якія весткі?
ГАНЕЦ. Увечары сюды кароль прыедзе.
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Ты што, здурнеў?
Хіба твой гаспадар ня зь ім?
ГАНЕЦ. Адзін з ганцоў прымчаў раней, чым ён.
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Ён добрую прынёс нам навіну.
(*Першы Ганец выходзіць.*)
Ужо круган хрыпаты напрарочыў
Прыезд фатальны Данкана сюды.
О, духі цемры, прагныя забойства,

Жаноцкасьць павысмоктвайце зь мяне,
Кроў атруціце лютасьцю халоднай.
(*Уваходзіць Макбэт.*)
Вялікі тан Глямісксі і Каўдорскі!
Стакроць вялікшы тытулам наступным!

Яны
абдымаюцца.

МАКБЭТ. Кароль да нас увечары прыедзе.
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Калі зьяжджае?
МАКБЭТ. Думае, што заўтра.
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Каб заўтра гэтаму ня ўбачыць сонца!
Здавайся кветкай, сам жа будзь зьмяёй.
(*За сцэнай чуваць галасы.*)
Сустрэчу мы павінны рыхтаваць
Сваім гасьцям.
МАКБЭТ. Пазьней мы пагаворым.
(*Выходзіць у дзьверы з правага боку сцэны.*)

Зьяўляецца
ДАНКАН з
БЭНКА й
РОСАМ, а
таксама
двума
няпрошанымі
гасьцямі ў
паліцэйскай
форме.
Апошнія
пачынаюць
аглядаць
актораў і
публіку,
высьвечваючы
іх
кішэннымі
ліхтарыкамі,
а потым
зьнікаюць
за

кулісамі.

ДАНКАН. У добрым і прыемным месцы замак.
Так лёгка дыхаць, сьвежае паветра.
(*Лэдзі Макбэт выходзіць, каб сустрэць яго.*)
А вось і гаспадыня.
(*Лэдзі Макбэт робіць рэвэранс.*)
А дзе Каўдорскі тан?
МАКБЭТ (*уваходзіць, з парога*).
Да Вашых я паслугаў.
(*Робіць крок наперад і кланяецца.*)
ДАНКАН (*да Лэдзі Макбэт*).
О найшляхетнейшая гаспадыня.
Мы – госьць Ваш сёньня. Дайце нам руку.

ЛЭДЗІ МАКБЭТ выводзіць яго ў суправаджэньні РОСА й БЭНКА. МАКБЭТ застаецца.

МАКБЭТ. Вось каб – удар, і скончылася справа…
Кароль тут у падвойнае бясьпецы.
Па-першае, ягоны родзіч я
ды падначалены – ужо хапае,
каб не рабіць таго, што я зьбіраўся.
Затым, ён госьць, і я як гаспадар
павінен берагчы яго пэрсону –
Ня кідацца з кінжалам на яго.
Няма чым распаліць свае намеры,
Мо толькі славалюбства, што мяне
Самога ж і прыдушыць.
(*Уваходзіць Лэдзі Макбэт.*)
Навіны ёсьць? Ці клікаў ён мяне?
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Канечне, клікаў.
МАКБЭТ. Нам бы лепш спыніцца.
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. І баязьліўцамі сябе лічыць?

Каб «Не магу» перамагло над «Мог бы»,
Як палахлівы кот, што хоча рыбкі,
Але баіцца лапкі намачыць?
А ты ўсю сьмеласьць укладзі ў свой меч –
І не прайгаеш. Разам пераможам
Нябогу-Данкана, калі засьне.

Набліжаецца
БЭНКА.

МАКБЭТ (*крычыць за сцэну*).
Хто там? (*Падыходзіць да акна. За ім – Лэдзі Макбэт.*)
БЭНКА (*праз вакно*). Свае.
Што, сэр, яшчэ вы не сьпіцё?
Кароль у ложку ўжо. Я ўчора ноччу
Сасьніў праўдзівых тых сясьцёр-вяшчухаў.
МАКБЭТ. Я ўжо забыў пра іх. Ну, то дабранач.
БЭНКА. Вялікі дзякуй, сэр. І вам таксама.

МАКБЭТ
зачыняе
аканіцы.

МАКБЭТ. Што тут, перада мной, – няўжо кінжал?
І мне ў руку кладзецца рукаяцьце.
Рукой не адчуваю, бачу сэрцам.
(*Чуваць звон.*)
Пайду зраблю я справу. Кліча звон.
Ня слухай, Данкан, гэта звон хаўтурны,
Што ў рай ці ў пекла кліча за сабой.

МАКБЭТ
выходзіць.
Чуваць, як
крычыць
сава,
траскочуць
цвыркуны.
Уваходзіць
ЛЭДЗІ
МАКБЭТ з
кубкам у
руцэ.

ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Яны п’янеюць – я раблюся сьмелай;
Адчыненыя дзьверы, вартавыя
Абжэрліся й паснулі ўсе на службе,
Бо я ў пітво ім зельля падмяшала,
(*Гукі савы й цвыркуноў.*)
кінжалы іх паклала на вачах.
Калі б у сьне ня быў такі падобны
Да майго бацькі, то сама б забіла.
(*Уваходзіць Макбэт з двума акрываўленымі кінжаламі.*)
Мой муж!
МАКБЭТ. Зрабіў я справу. Чула шум?
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Я чула толькі цвыркуна й саву.

Чуваць, як
да дому
набліжаецца
паліцэйская
сырэна.
Пакуль
прамаўляецца
наступны
дыялёг,
машына
пад’яжджае,
і грукаюць
дзьверцы.

МАКБЭТ. Той рагатаў у сне, а той: «Забойства!»
Адзін: «Ратунку!», – а другі: «Амін!»
(*Сырэна сьціхае.*)
Мо бачылі мяне з рукамі ката?
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Да сэрца не бяры. Ня трэба надта
Табе раздумваць пра такія справы,
Бо так і звар’яцець нядоўга.
МАКБЭТ. Мне чуўся голас: «Болей не засьнеш!
Макбэт забіў свой сон!»
(*Рэзкі грукат у дзьверы.*)
Што там за грукат?
(*Ізноў рэзкі грукат у дзьверы.*)
Навошта кожны стук мяне пужае?
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Больш за цябе запляміла я рукі

Й саромлюся за сэрца чысьціню.
Хадзем у наш пакой.
МАКБЭТ. Каб Данкана ты грукатам сваім
(*Рэзкі грукат у дзьверы.*)
Мог пабудзіць!

Яны
выходзяць.
Грукат за
сцэнай
працягваецца.
За сцэнай
адчыняюцца
й
зачыняюцца
дзьверы.
Дзьверы ў
пакой
адчыняюцца,
і ў пусты
пакой
уваходзіць
ІНСПЭКТАР.
Выдае, што
ён
зьдзіўлены
тым, дзе
апынуўся.
Ён
гаворыць з
удаванай
саркастычнай
ветлівасьцю.

ІНСПЭКТАР. Ах, прабачце. Гэта Нацыянальны тэатар?

З боку
публікі
набліжаецца
жанчына –
ГАСПАДЫНЯ.

ГАСПАДЫНЯ. Не.
ІНСПЭКТАР. Не? Чакайце хвілінку… Магчыма, я памыліўся. Гэта Нацыянальная акадэмія драматычнага мастацтва, ці, на савецкі манер, НАДраМа? Не? Я цалкам разгублены. У мяне, відаць, недзе правады пазаблытваліся. (*Ён прахаджваецца па пакоі, паглядаючы на столю і сьцены.*) Праверка, праверка – раз, два, тры… (*Зьвяртаючыся да столі. Іншымі словамі, у пакоі маюцца жучкі для падслухоўваньня.*) А можа, гэта прытулак Багемскай опэры?
ГАСПАДЫНЯ. Гэта мой дом.
ІНСПЭКТАР (*зьдзіўлена*). Вы тут жывяце?
ГАСПАДЫНЯ. Так.
ІНСПЭКТАР. Вам не здаецца, што гэта не зусім зручна, калі ў цябе па ўсёй хаце – галасы ганарлівых эксгібіцыяністаў – і гэта ўсяго толькі публіка? Я хачу сказаць, каму хочацца, каб вечар за вечарам у тваю кватэру набіваўся натоўп з модных грыпозьнікаў, якія хрыпяць: «Я думаю, гэтым разам у яго атрымалася горш, чым апошнім», – ды яшчэ адвольна карыстаюцца тваёй прыбіральняй? Ня кажучы ўжо пра тое, што мусіш аддавацца на міласьць якога-небудзь Тома, Дзіка ці Бэртольта, якія ня могуць унівэрсалізаваць нашае цяжкае становішча й не пашкодзіць тваёй мэблі. Не разумею, чаму вы мірыцеся з гэтым. У вас жа ёсьць асабістыя правы. (*Вынюхваючы, ён падымае начайнік і знаходзіць тэлефон.*) У Вас нават і тэлефон ёсьць. Я бачу, вы не за рысай беднасьці. Чым вы займаецеся?
ГАСПАДЫНЯ. Я мастачка.
ІНСПЭКТАР (*радасна*). Што ж, яшчэ адна памылка з майго боку. Гэты тэлефон працуе? (*Зноў да столі.*) Шэсьцьдзесят сем – восемдзесят адзін – адзінадцаць. (*Кладзе слухаўку на месца.*) Так, калі б вы хаця б крыху ганарыліся сваім домам, вы б не займалі гэтак пакорліва стаячае месца ў сваёй жа гасьцёўні. (*Тэлефон звоніць у ягоных руках. Ён здымае слухаўку.*) Шэсьцьдзесят сем – восемдзесят адзін – адзінаццаць? Чуваць цудоўна. Каго вам трэба? (*Ён азіраецца навокал.*) Тут ёсьць Чайка? (*У слухаўку.*) Якая Чайка? Прыём скончаны? (*Ён адводзіць слухаўку ад вуха й хмурыцца, гледзячы на яе.*) Нават не разьвітаўся. Куды толькі падзелася старасьветная ветлівасьць у гэтай краіне? (*Стаўляе тэлефон на месца, якраз як Макбэт і Лэдзі Макбэт уваходзяць у пакой.*)

А ты хто, лыч сьвіны?
«МАКБЭТ». Ландоўскі.
ІНСПЭКТАР. Актор?
«МАКБЭТ». Прыбіраньнік на бойлеры.
ІНСПЭКТАР. Гэта ён. Я ваш вялікі паклоньнік, каб вы ведалі. Я гадамі сачу за вашай кар'ерай.
«МАКБЭТ». А я ўжо гадамі не працую.
ІНСПЭКТАР. Пра што гэта вы? Я бачыў вас у мінулым сэзоне. І жонка мая са мной была…
«МАКБЭТ». Гэта ня мог быць я.
ІНСПЭКТАР. Гэта былі вы. Вы выдатна глядзеліся. І гучалі таксама. Дзе вы былі мінулым годам?
«МАКБЭТ». Я прадаваў газэты ў…
ІНСПЭКТАР (*пераможна*). У газэтным кіёску каля канцавога прыпынку трамвая. І гэта было непаўторна! Я сказаў сваёй жонцы: «Гэта Ландоўскі, актор, ну хіба ён не цудоўны?!» Які характар! Цудоўны голас. «Вашая газэта!» – проста адсюль (*б'е сябе кулаком у грудзі*), і ніякага напружаньня, кожны гук вымаўляецца выразна. …Так-так-так. Значыць, цяпер вы падмятаеце падлогу, га? Я памятаю вас з самага пачатку. Памятаю, як вы працавалі начным вартаўніком на будаўніцтве, і як яшчэ раней вы былі грузчыкам у моргу, і як да таго вы былі гузікавым майстрам у «Пэр Гюньце»… Сапраўды, Павал, вы зрабілі сабе нейкую дзіўную кар'еру. Ясна, гэта не мая справа, але вы самі ведаеце, чаго хочаце? На маю думку, публіка цалкам зьбянтэжаная вашымі намерамі. Няўжо вы гэтак уяўлялі сабе свой шлях, калі ўсё гэтак сьмела пачыналася столькі гадоў таму? Я памятаю вас у вашай першай ролі. Вы былі ганцом – нешта пра пошту, здаецца, ці як?..
«МАКБЭТ». «Антоні і Клеапатра».
ІНСПЭКТАР. Рацыя! Бачыце, я й сам цалкам заблытаўся. Скажыце, Павал, чаму вы пакінулі сцэну? Вы ж былі зоркай! Я бачыў вашага Гамлета, вашага Стэнлі Кавальскага, я бачыў вашага Рамэа зь як яе там – цудоўная дзяўчына, цікава, што зь ёю здарылася? О, мой Божа, не кажыце мне! – можна мне ваш аўтограф? Гэта не для мяне, а для маёй дачкі…
«ЛЭДЗІ МАКБЭТ». Думаю, ня варта. Калі я апошнім разам нешта падпісала, дык потым сядзела бяз працы два гады.
ІНСПЭКТАР. Слухайце, ня трэба вінаваціць нас, калі вам не даюць роляў. Можа, вы ўжо надакучылі публіцы.

«ЛЭДЗІ МАКБЭТ». Я працавала ў рэстарацыі на гэны час.
ІНСПЭКТАР (*спакойна*). Вось бачыце. У публікі дзіўнае стаўленьне да ўсяго гэтага. Яны ня хочуць прыбірацца, наймаць нянек толькі дзеля таго, каб высьветліць, што заплацілі немалыя грошы за Геду Габлер у выканаьні афіцыянткі. Я пачынаю разумець, чаму кола вашых гледачоў абмяжоўваецца вашымі знаёмымі. (*Да публікі.*) Заставацца на месцах! Я маю на ўвазе, гэта прымушае таўчыся на месцы, ці ня праўда? Сёньня ўвечары Макбэта будзе выконваць спадар Ландоўскі, які ў мінулым сэзоне карыстаўся вялікім посьпехам у газэтным кіёску на канцавым прыпынку трамвая, а нядаўна быў заўважаным за мыцьцём падлогі ў бойлернай нумар 3. Роля лэдзі Макбэт – у спрытных ручках Веры з «Бруднай лыжкі». Пасьля гэткага будзе цяжкая ноч.

Словы
«цяжкая
ноч»
гучаць як
знак, што
час
выходзіць
МАКДАФУ.
Уваходзіць
МАКДАФ.

МАКДАФ. О, жах! О, жах!
Падступнае забойства!
ІНСПЭКТАР. А ў цябе што здарылася, сонейка? Толькі не кажы мне, што ты знайшоў труп – я прыйшоў сюды, каб разьвеяцца, а не для таго, каб мне нагадвалі пра маю будзёншчыну. Чаму б табе ня выйсьці й не зайсьці зноў? Я сыду з дарогі. Гэтае месца вольнае?
ГАСПАДЫНЯ. Баюся, спэктакль закрыты для чужых людзей.

Уваходзяць
«РОС»,
«БЭНКА»,
«МАЛКАЛМ»,
але ня
граюць.

ІНСПЭКТАР. Спадзяюся, вы памыляецеся. Інакш гэта значыла б, што вы граеце без нагляду! Вы не паверыце, але я згодны выправіць гэта й застацца з вамі… Так! Прабачце, што перапыніў. (*Ён сядае.*)

Паўза.

ІНСПЭКТАР. Як толькі будзеце гатовыя.

ГАСПАДЫНЯ
выходзіць.
Акторы
працягваюць
нерухома
стаяць на
сцэне,
чакаючы
рэакцыі
«МАКБЭТА».
ІНСПЭКТАР
устае з
свайго
месца й
падыходзіць
да
«МАКБЭТА».

ІНСПЭКТАР (*да «Макбэта»*). Цяпер слухай, ты, дурнаваты выродак, лепш кінь прыдумляць, што ёсць нейкі незвычайны «Макбэт», якога вы граеце, калі мяне няма побач, і нейкі іншы «Макбэт», якога нават няварта выконваць, калі я ёсць паблізу. У вас ёсць толькі адзін «Макбэт». Бо я замаўляю тут музыку, і іншай няма. Гэта тое, што мы называем аднапартыйнай сістэмай. Я – вяршкі ў вашай каве, цукар у вашай гарбаце, ветрык, які абдувае вам шыі. Так што давайце ўзгадаем пра стары акторскі гарт, бо калі я буду вымушаны сысьці з вашага спэктаклю, то я забяру вас з сабой. (*Ён вяртаецца на сваё месца й дабрадушна кажа публіцы.*) Прабачце, калі ласка, што замінаю вам.

Ён сядае.
«МАКБЭТ»
усё яшчэ

ня хоча
граць.
Тады «РОС»
бярэ на
сябе
ініцыятыву.
Ён ціха
размаўляе
з «БЭНКА»,
пасьля
чаго той
выходзіць,
каб
увайсьці
зноў.
«ЛЭДЗІ
МАКБЭТ»
заходзіць
за левую
шырму.

РОС. Кароль зьяжджае сёньня?
Паўза.

МАКБЭТ. Так. Ён так прызначыў.
Граюць
хутка й
нядбайна.

РОС. Ноч неспакойнаю была.
МАКБЭТ. Так, была цяжкая ноч.
Як і
раней,
уваходзіць
МАКДАФ.

МАКДАФ. О, жах! О, жах!
Каварнае забойства!
Забойца па-блюзьнерску ў Божы храм
Няпрошаны ўварваўся й скраў жыцьцё!
МАКБЭТ. Пра што ты кажаш? І чыё жыцьцё?

Ці не Яго Вялікасьці?
БЭНКА. Трывога!
Забойства! Здрада!
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Здарылася што?
Скажыце мне! Скажыце!
МАКДАФ. Спадарыня, ваш далікатны слых,
Баюся я, нязвыклы да такога,
Што маю тут сказаць.

Звон б'е
трывогу.

Забіты наш магутны валадар.
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Якое гора! Дый у нашым доме!
РОС. Дзе б ні было, усё ж занадта жорстка.
МАКБЭТ (*уваходзіць з акрываўленымі кінжаламі*).
Калі б памёр я за гадзіну да
Забойства – то памёр бы я шчасьлівы.
Няма нічога вартага ў жыцьці –
Адныя цацкі. Велічнасьць памерла.
Віно жыцьця дапітае – асадак
Застаўся мутны.

Уваходзіць
МАЛКАЛМ.

МАЛКАЛМ. Няшчасьце нейкае?
МАКБЭТ. З табою. Толькі лепш бы ты ня ведаў,
Што здарылася!
МАКДАФ. Бацька твой забіты.
МАЛКАЛМ. Забіты кім?
МАКБЭТ. Здаецца, гэта слугі:
І твары іх, і рукі ўсе ў крыві,
Як вострыя кінжалы, што знайшлі мы
На ложку і, прызнаюся, з шаленства
Я іх забіў.
МАЛКАЛМ. Нашто вы іх забілі?
ЛЭДЗІ МАКБЭТ (*страчвае прытомнасьць*).
Дапамажэце!
МАКБЭТ. Памажыце лэдзі!
МАКДАФ. Паклапаціцеся пра лэдзі!

ЛЭДЗІ

МАКБЭТ
выносяць.

МАКБЭТ. Давайце хутка апранем дасьпехі
Й сустрэнемся ў галоўнай залі.
Усе
выходзяць,
акрамя
МАЛКАЛМА.

МАЛКАЛМ. Падробленую выказаць спагаду
Няцяжка. Трэ мне ў Англіі схавацца:
Страла забойцы шчэ не дасягнула
Сваёй мішэні. Нам надзейна лепей
Стралы пазьбегчы той. Хутчэй на коней! (*Выходзіць.*)
МАКДАФ. І Доналбэйн, і Малкалм, што па праву
Кароны спадкаемцы, зьбеглі ўпотай,
І запасочаньне на іх кладзецца.
РОС. А значыць, каралём быць, найхутчэй,
Макбэту?
МАКДАФ. Ён ім ужо абвешчаны й паехаў
Каранавацца ў Скоўн.
Фанфары.
Яны
сыходзяць
з сцэны.
МАКБЭТ
стаіць у
мантыі над
шырмай і
сам сябе
карануе.
ІНСПЭКТАР
пляскае ў
далоні й
выходзіць
у кола
сьвятла.

ІНСПЭКТАР. Вельмі добра. Вельмі добра. І як прыемна

паглядзець нарэшце п’есу з шчасьлівым канцом.

Астатнія
акторы
выходзяць
на сцэну
пры
агульным
асьвятленьні.

ІНСПЭКТАР (*да «Лэдзі Макбэт»*). Дарагая, гэта было цудоўна.
«ЛЭДЗІ МАКБЭТ». Я вам не дарагая.
ІНСПЭКТАР. Я ведаю. І цудоўна гэта таксама не было, але з ваўкамі жыць – па-воўчы выць. Насамрэч, я думаю, па радыё вы лепш гучыце.
«ЛЭДЗІ МАКБЭТ». Я ніколі не выступала на радыё.
ІНСПЭКТАР. Я слухаў вас па сваім радыё. (*Зьвяртаецца да публікі.*) Калі ласка, не пакідайце памяшканьне. Вы можаце карыстацца прыбіральняй, але дзьверы пакідайце адчыненымі. (*Да «Макбэта».*) Надзвычайна! Неверагодна! Цалкам так сабе!
«МАКБЭТ». Не плявузгайце!
ІНСПЭКТАР. Слухайце, калі я голасна не сьмяяўся, гэта ня значыць, што мне не спадабалася. (*Да Гаспадыні.*) А вы кім былі?
ГАСПАДЫНЯ. Я ня ўдзельнічала.
ІНСПЭКТАР. Вы ўдзельнічалі, дагэтуль. Мне цалкам зразумела, што вашая кватэра выкарыстоўваецца, каб забаўляць мужчын. А ў нас ёсьць законы на гэты конт, каб вы ведалі.
ГАСПАДЫНЯ. Я спадзяюся, вы не «Макбэта» маеце на ўвазе.
ІНСПЭКТАР. А хто цяпер скажа, што мелася на ўвазе? Словы могуць быць вам і сябрам, і ворагам, у залежнасьці ад таго, хто шые справу, так што сачыце за тым, што кажаце. (*Ён праводзіць пальцам па мэблі.*) Вы толькі паглядзіце! Які бруд! Калі гэта ня дом распусты, то тады ня ведаю, што гэта такое. А я ведаю, што гэта такое, бо я назіраў за гэтым месцам, каб вы ведалі.
ГАСПАДЫНЯ. Я ведаю.
ІНСПЭКТАР. Усё-ткі яны выдалі сябе?
ГАСПАДЫНЯ. Галоўным чынам іхная форма й тое, што яны стаялі паабапал дзьвярэй.
ІНСПЭКТАР. Мая маленькая каманда. Борыс і Морыс.
ГАСПАДЫНЯ. Адзін зь іх правяраў ува ўсіх дакумэнты, а другі

запісваў імёны.
ІНСПЭКТАР. Так, адзін зь іх умее чытаць, а другі – пісаць. Таму мы й ходзім паўсюль утрох: я мушу не спускаць вока з гэтых чортавых інтэлектуалаў.
«МАКДАФ». Слухайце, якой вам халеры трэба?
ІНСПЭКТАР. Я хачу ведаць, хто сёньня прысутнічае. (*Ён праглядае нейкі сьпіс у сваім нататніку й кідае позіркі на публіку.*)
ГАСПАДЫНЯ. Усе яны – мае асабістыя сябры.
ІНСПЭКТАР. Што ж, давайце паглядзім, хто тут у нас. (*Гледзячы ў сьпіс.*) Тры кацельных машыністы. Два рабочыя, прыяцель кіроўцы «рафіка», брамнікі, дворнікі, садоўнік на паўстаўкі, мастак-афармляльнік, пакаёўка, два афіцыянты, шабашнік… Здаецца, вы вырашылі праблему далучэньня працоўнай клясы да тэатру. Калі тут няма ніякай пасткі, то я запішу вас у валькірыі рэвалюцыі. Я хацеў сказаць, контррэвалюцыі. Не, маню, – нармалізацыі. Так, я ведаю. А хто гэты хлопец ад сахі з мазолістымі рукамі?

ІНСПЭКТАР
скіроўвае
ліхтарык
на розных
людзей
сярод
публікі.

ГАСПАДЫНЯ (*гледзячы на публіку*). Гісторык сярэднявечча… прафэсар філязофіі… мастак…
ІНСПЭКТАР. Афармляльнік?
ГАСПАДЫНЯ. Не… лектар… студэнт… студэнт… адвакат… міністар аховы здароўя часовага ўраду.
ІНСПЭКТАР. А цяпер ён хто?
ГАСПАДЫНЯ. Часова беспрацоўны.
ІНСПЭКТАР. Так, што ж, павінен сказаць, калёна танкаў – вялікі ўраўняльнік. А як наконт адваката?
ГАСПАДЫНЯ. Ён цяпер падмятае вуліцы.
ІНСПЭКТАР. Бачыце, адныя падняліся, іншыя апусьціліся. Прыродны балянс. Што ж, вось што я вам скажу. Я не хачу змарнаваць увесь дзень на запісы паказаньняў. Ня вартая аўчынка вырабу, бо дадуць вам сама болей тры гады. Да таго ж,

наколькі мне вядома, вам апошнім часам кругом не шанцуе: седзяцё бяз працы, дзеці правальваюць іспыты, лістоў не прыносяць, правы кіроўцы адабралі, пашпартаў не аддаюць – і нічога на паперы. Як быццам бы сыстэма задумала нешта сваё. Гэткім чынам, чаму б вам ёй не дапамагчы? А я дапамагу вам. Я сапраўды рады, што засыпеў вас, перш чым вы скончылі. Калі дазволіце мне адну невялічкую заўвагу… Шэксьпір, ці старызна Вільлі, як мы клічам яго ў органах, не падабаецца майму шэфу, бо занадта папулярны сярод народу, ці быдла, як мы клічам яго ў органах. Справа ў тым, што калі ўзяць гэткага ўнівэрсальнага аўтара на ўсе часы, як Шэксьпір, то зьяўляецца моцнае ўражаньне, што ён плюе ў вочы гледачу, хаця й гаворыць пра Вэрону – бадзяючыся каля мужчынскай прыбіральні. Разумееце, што я маю на ўвазе? Незнарок, вядома. Ён ня ведаў, што робіць гэта; прынамсі, мы ня можам давесьці, што ведаў, і менавіта таму мой шэф гэтак перадузята да яго ставіцца. Шэф кажа, што вам лепш было б устаць і сказаць: «У гэтай краіне няма свабоды». І тады не было б ніякіх таямніцаў, і мы б ведалі, хто з намі, а хто супраць нас. Вы зьбіраеце сваіх хлопцаў, мы зьбіраем сваіх хлопцаў, а калі ўсё сканчаецца, адзін з нас – ва ўладзе, а вы – у турме. Гэта свабода ў дзеяньні. Але што нам не падабаецца, дык гэта калі столькі людзей нешта цямняць і кажуць, што яны проста Юлі Цэзар, ці Карыялян, ці Макбэт. Але тады мы мусім абыходзіцца зь імі гэтак жа, як і з тымі, хто называецца Напалеонам. Зразумела?

«МАКБЭТ». Мы падпарадкоўваемся законам і нічога больш у вас ня просім.

ІНСПЭКТАР. Законам? Ландоўскі, дык Крымінальны кодэкс выгравіяваны ў мяне на сьвістку, і ў ім шмат чаго напісана пра вас. Параграф 98, зьвяржэньне: кожны, хто варожа дзейнічае ў дачыненьні да дзяржавы… Параграф 100, падбухторваньне: кожны, хто варожа дзейнічае ў дачыненьні да дзяржавы… Я мог бы засадзіць вас толькі за тое, што вы працягваеце граць – а за арганізаваныя дзеяньні тэрмін удвая большы. І я мог бы прышыць гэта нават Рабінзону Круза зь ягоным прыяцелем, якім бы днём ён ні называўся. Так што не кажыце мне пра законы.

«МАКБЭТ». Мы знаходзімся пад аховай Канстытуцыі…

ІНСПЭКТАР. Мой божа, і мы завём іх інтэлектуаламі. Асабіста я не магу чытаць гэтую лухту. Ніхто гэтак не размаўляе, і няма

чаго чакаць, што нехта будзе сябе гэтак жа паводзіць. Наколькі я гэта разумею, сапраўднае жыццё не падпарадкоўваецца гэнаму афіцыёзу. У рэшце рэшт, для напісаных словаў гэта занадта па-чалавечы, гэта – мэтафара, гэтак бывае толькі ў кіно. Колькі гадоў таму вы як сыр у масьле купаліся, але калі вас пусьцілі ў гарод, вы паабяцалі забіць казла, а самі пачалі секчы сук, на якім сядзелі. Таму вам і перакрылі кісларод, і вы цяпер у поўнай дупе… Гэта толькі голыя факты, калі казаць мэтафарычна. Я апісваю, што з вамі здарылася, гэтак, каб усім было зразумела.

БЭНКА, які
ёсьць
КАГУТАМ,
вые па-
сабачаму,
гаўкае,
потым
кідаецца
на карачкі
й
замаўкае.

ІНСПЭКТАР. Сядзець! Вось так, мой хлопчык. Як яго завуць?
«МАКБЭТ». Кагут.
ІНСПЭКТАР. Паразыт грамадзтва й паклёпнік на дзяржаву?
КАГУТ. Пісьменьнік.
ІНСПЭКТАР. Так, гэта ён. Ведаеце, вы вельмі папулярны ў турме. Мы нават думаем максымальна наблізіць вас да вашых чытачоў – на пару гадочкаў. Калі б вы належалі да нейкай пэўнай школы, то – на чатыры, але не бяда: я мог бы прышыць гэта нават шымпанзэ з кубікамі-альфабэтам. (*Усьміхаецца.*) Вы не маглі б зрабіць якую-небудзь заяву?
КАГУТ. «Цяпер твае: Гляміс, Каўдор, карона, –
Што ведзьмы абяцалі…»
ІНСПЭКТАР. Папрашу вас, калі ласка, не чапаць сямью маёй жонкі.
КАГУТ. «І баюся,
Што шляхам зману ты дамогся мэты...»
ІНСПЭКТАР. Дабро ў мане, у праўдзе зман? А, гэта дзьве ведзьмы. Трэба яшчэ адну – й можна працягваць п’есу з гэтага

месца.
КАГУТ. «Ды сказана – ня будзе спадкаемцаў
Тваёй кароны між тваіх дзяцей».
ІНСПЭКТАР. Кагут, калі вы думаеце, што можаце паставіць калёсы перад кабылай і чухаць сабе па законах подласьці, цытуючы мне ў твар белыя вершы, баюся, вам прыйдзецца сутыкнуцца з тым, што называецца паэтычным правасудзьдзем. Гэта значыць, калі мы будзем вымушаныя адправіць вас на дыбу, не дзівіцеся, калі дасьцё дубу. Вы ведаеце гэтак жа добра, як і я, што ваш спэктакль цалкам супярэчыць духу нармалізацыі. Калі чысьцяць канюшні, Кагут, навоз выкідаецца ў канаву, а не назад у стойла. (*Да ўдзельнікаў і публікі.*) Ведаеце, я лічу, што ўва ўсім вінаватыя спорт і рэлігія. Алімпійскія гульні сям, візыт Папы там, і раптам вы ўжо дазваляеце сабе разам з сваёй свабодай розныя вольнасьці: аматарскія спэктаклі, арганізаваныя сходы, рознага кшталту камітэты. Паслухайце, я арыштаваў больш камітэтаў, (*да «Бэнка»*) чым адведзена гадоў у Вашым сабачым жыцьці. Я арыштаваў «Камітэт па абароне несправядліва перасьледаваных» за тое, што яны сказалі, быццам я несправядліва перасьледваў камітэт «За свабоду слова». А іх я арыштаваў за тое, што яны казалі, што ў нас гэткай свабоды няма. Таму, калі я палічу, што з вашых паводзінаў можа скарыстаць «Ліга па абароне сабак», то вы адчуеце ўсе наступствы гэтага на сваёй скуры. І мне напляваць, калі маскоўскае «Дынама» грае ў Эўрапейскім чэмпіянаце ў Ватыкане. (*«Бэнка» рыкае.*)
Што зь ім?
«МАКБЭТ». Ён больш не пачуваецца чалавекам.
ІНСПЭКТАР. Праўда? Слухайце, паміж намі… і гэтымі трыма сьценамі й асабліва стольлю… Брахаць не на той пень падпадае пад антыдзяржаўную агітацыю. Я не дазволю яму заплямiць нашую сыстэму, ня кажучы ўжо пра тратуары, толькі таму, што ў яго крызыс асобы.
«МАКБЭТ». Вашай сыстэме не зашкодзіць некалькі антыцелаў, калі вы баіцеся рызыкі заражэньня якой-небудзь непадкантрольнай ідэяй. Першая ж зь іх паразіць вашую сыстэму, бы тая іншародная бацыла. Узгадайце апошні раз.
ІНСПЭКТАР. Так, з таго часу шмат вады пралілося праз Крымінальны кодэкс. Усё цудоўна нармалізуецца. Я спадзяюся,

і гэтая кватэра празь пяць хвілінаў будзе нармалізаванай. Га? Добры цюцька. Так, цікава, якое там надвор'е… (*Рухаецца.*) Калі ласка, выходзьце па чарзе. І пры выхадзе не абзываць паліцэйскага. (*Тэлефонны званок. Ён бярэ слухаўку, слухае, кладзе яе на месца.*)
Воблачна. Магчымы дождж.
Ён выходзіць. Чуваць, як з уключанай сырэнай ад'яжджае паліцэйская машына.
КАГУТ. Няхай ён пральецца!

Спэктакль
працягваецца
ад першай
сцэны
трэцяга
акту. Усе
выходзяць,
акрамя
КАГУТА.

БЭНКА. Цяпер твае – Гляміс, Каўдор, карона, –
што ведзьмы абяцалі; і баюся,
Што шляхам зману ты дамогся мэты.
Ды сказана – ня будзе спадкаемцаў
Тваёй кароны між тваіх дзяцей.
Я ж буду продкам многіх каралёў.
Калі і гэта праўда, дык чаму б
І мне на лепшае не спадзявацца…
Але цішэй – даволі.
МАКБЭТ. Сёньня будзе
Ўрачыстая бяседа, на якую
Вас шчыра запрашаю я. Вы ўдзень
паедзеце?
БЭНКА. О так, мілорд.
МАКБЭТ. Не прапусьціце ж нашае бяседы.
БЭНКА. Мілорд, не прапушчу.
(*Бэнка выходзіць.*)
МАКБЭТ. Я люта Бэнка
баюся, велічнасьць яго натуры
наводзіць часам вусьціш на мяне.
Бо нават ведзьмаў ён тады прыструніў,

Як тыя каралём мяне назвалі,
Ды змусіў і яму сказаць прароцтва.
І тыя прадказалі: будзе ён
Шматлікіх каралёў славутых продкам.
Маю ж карону ў спадчыну ніхто
Ня возьме, бо мой скіпэтар няплодны,
І выдзярэ яго рука чужая –
Ня сынавая. Калі гэта так,
То вынікае – дзеля Бэнка я
Грэх на душу узяў – Данкана забіў.
Дык слухай, лёс, цябе я выклікаю
На бойку дый у ёй перамагу.
(*Макбэт адсоўвае шырму й бачыць двух Забойцаў.*)
Здаецца, з вамі ўчора размаўляў я?
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Так, Вашая вялікасьць.
МАКБЭТ. Што ж, скажыце,
Ці добра вы падумалі пра тое,
Што я вам апавёў? Ці зразумелі,
Што гэта ён – крыніца вашых бедаў,
Ён, а ня я, як вы раней лічылі?
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Вядома ж. Растлумачылі вы ўсё нам.
МАКБЭТ. Так, растлумачыў. І вы што – сьвятыя,
Каб за таго маліцца, хто ў магілу
Вас ледзь ня зьвёў і з торбамі пусьціў?
ДРУГІ ЗАБОЙЦА. Мой гаспадар, я з тых, каму абрыдла
Несправядлівасьць сьвету, і гатовы
На ўсё я, каб адпомсьціць.
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Я таксама,
Ад недасяжнасьці багацьця так
Стаміўся, што жыцьцё на кон пастаўлю,
Каб гэта выправіць альбо памерці.
МАКБЭТ. Вы ведаеце, што ваш вораг – Бэнка.
ЗАБОЙЦЫ. Так, сапраўды, мілорд.
МАКБЭТ. І мой таксама.
І я забіць яго, канечне, мог бы
Ў адкрытую і загадаць учынак
Мой ухваліць. Але разумней будзе
Зрабіць інакш.
ДРУГІ ЗАБОЙЦА. Мілорд, мы ўсё гатовы
Зрабіць, як загадаеце.

ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Мілорд,
Мы поўныя рашучасьці.

Чуваць, як
знадворку
пад'яжджае
грузавік
ІЗІ.
Забойцы
падыходзяць
да акна й
адчыняюць
аканьніцы.
МАКБЭТ
выходзіць.

МАКБЭТ (*убок*). Я Бэнка падпісаў прысуд; калі
Яго душы наканавана неба,
Яна туды да вечару пасьпее.

Забойцы
робяць
засаду на
БЭНКА.
Каля вакна
зьяўляецца
ІЗІ.

ІЗІ. Бакстанз… Амаль Лемінгтонскі курорт.

ЗАБОЙЦЫ
зьдзіўляюцца
зьяўленьню
ІЗІ. ІЗІ
адыходзіць
ад акна, і
яны
высоўваюцца,
каб
паглядзець,
куды ён
пайшоў,
але тым

часам ІЗІ
ўваходзіць
у пакой.

ІЗІ. Скікаюць пірагі.
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Хто загадаў табе да нас прысьці?
ІЗІ. Бакстанз.
Паўза.

ДРУГІ ЗАБОЙЦА (*з апаскай*).
Што ж, мы табе павінны давяраць,
Бо ён дакладна аддае загады.
ІЗІ. Га?
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Дык станавіся з намі. Дагарае
На захадзе прамень сьвятла, і вершнік
Запозьнены прышпорвае каня,
Каб на заезны двор пасьпець у час,
І блізка той, каго мы тут чакаем.
Паўза.

ІЗІ. Га?
БЭНКА (*за кулісамі*). Сьвятла нясі! Хутчэй!
ДРУГІ ЗАБОЙЦА. Так, гэта ён.
У акне
зьяўляецца
БЭНКА.

ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Стрымаем слова!
БЭНКА. Будзе дождж уночы.
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Няхай жа ён пральецца!
Абодва
ЗАБОЙЦЫ
кідаюцца
на БЭНКА.

БЭНКА. Здрада! Здрада!
БЭНКА
ўцякае за
кулісы, і
ЗАБОЙЦЫ
гоняцца за

ім. ІЗІ
застаецца
й выглядае
разгубленым.
Ізноў з
публікі
выходзіць
ГАСПАДЫНЯ.

ІЗІ. Бакстанз… скікаюць пірагі… амаль Лемінгтонскі курорт…

ГАСПАДЫНЯ
выводзіць
ІЗІ за
кулісы.
Сьвятло й
музыка да
балю ў
замку
Макбэта.
Уваходзіць
МАКБЭТ
разам з
ЛЭДЗІ
МАКБЭТ і
гасьцямі.

МАКБЭТ. Сядайце адпаведна рангу й чыну –
Мы прывітаем першых і апошніх.
ГОСЬЦІ. Мы вельмі ўдзячныя.
МАКБЭТ. Сам сяду я
сярод гасьцей як сьціплы гаспадар.

ГОСЬЦІ
прынесьлі
з сабой
свае
ўласныя
крэслы й
кубкі.
Гэтаксама
й ЛЭДЗІ

МАКБЭТ.
Разам з
ІЗІ
ўваходзіць
ПЕРШЫ
ЗАБОЙЦА,
але яны
застаюцца
з боку
сцэны.

МАКБЭТ. Вам ад душы пацешыцца жадаю.
Мы вып'ем кругавую.
(*Заўважае Першага Забойцу й падыходзіць да яго.*)
У цябе на твары кроў!
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Ну так, кроў Бэнка гэта.
МАКБЭТ. Адправілі яго вы на той сьвет?
ПЕРШЫ ЗАБОЙЦА. Так, горла перарэзалі, мілорд.
Я сам. Рукою ўласнаю.
МАКБЭТ. За гэта
Вам дзякую. Цяпер ідзіце! Заўтра
Мы зноў сустрэнемся.

ПЕРШЫ
ЗАБОЙЦА
выходзіць.
За ім –
ІЗІ.
Падчас
размовы
ІЗІ
мітусіцца
па краі
сцэны,
спрабуючы
зьвярнуць
да сябе
ўвагу.
Уваход і
выхад ІЗІ
супадаюць

зь
зьяўленьнем
і
зьнікненьнем
здані
БЭНКА,
якую ніхто
ня бачыць,
акрамя
МАКБЭТА.
МАКБЭТ
намагаецца
не
зьвяртаць
на яе
ўвагі.

ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Мой доблесны спадар,
Забыліся вы тост гасьцям прамовіць.
МАКБЭТ. Каханая мая, як добра мне
Ты нагадала! Вашае здароўе!
Каб смачна вам і елася й пілося!
РОС. А можа б, вам прысесьці з намі, вашаць?
МАКБЭТ. Была б у нас краса ўсяе краіны,
Калі б да нас і Бэнка завітаў.
РОС. Няхай яго адсутнасьць
дакорам будзе абяцаньням Бэнка.
Нас, вашая вялікасьць, ушануйце
Прысутнасьцю сваёю. Вось і месца.
ІЗІ
ўваходзіць
на сцэну
праз
правыя
дзьверы.

МАКБЭТ. Дзе?
РОС. Вось, мілорд. Што вашую вялікасьць
узрушыла?
МАКБЭТ. Хто гэта з вас зрабіў?

РОС. Ды што, мілорд?
МАКБЭТ. Не, ты не давядзеш,
Што я забойца. На мяне ня трэба
Сабак навешваць.
РОС. Госьці, уставайце.
Яго вялікасьці, здаецца, дрэнна.
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Прашу сядаць, шаноўнае спадарства.
Бывае час ад часу так зь мілордам.
І вокам не пасьпееце міргнуць,
Як будзе ён здаровы.
(*Яна падыходзіць да Макбэта.*)
Які зь цябе мужчына?
МАКБЭТ. О, харобры!
Глядзець на сьвет, як я цяпер, ня змог бы
Сам д'ябал.
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. О, такі адказ разумны!
Дык што ты крывішся? Пасьля ўсяго,
Што зроблена, так пяліцца на крэсла!

У акне
зьяўляецца
ІЗІ.

МАКБЭТ. Прашу цябе, зірні туды!
Глядзі! Глядзі! О!

Ён
паказвае
на ІЗІ,
але той
ужо
страціў
цярпеньне
й зьнікае,
як толькі
ЛЭДЗІ
МАКБЭТ
паварочваецца.

ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Ты што, зусім здурнеў?
МАКБЭТ. Мне зь месца не сысьці, яго я бачыў.
І гэта горай за само забойства.

ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Мой гаспадар шаноўны,
Бяз вас сумуюць дарагія госьці.
МАКБЭТ. Ну так, ізноў забыўся. (*Узгадвае нешта.*)
Ня трэба, мае госьцейкі, дзівіцца.
Я маю незвычайную хваробу,
Але, хто звык, увагі не зьвяртае.
Усім здароўя! Дайце мне віна.
Ды келіх да краёў! Яго я вып'ю
За сябра Бэнка – я па ім сумую.
Шкада, яго няма. Дык за яго
Мы вып'ем і за вас. І ўсім ўсяго!
ГОСЬЦІ. Сьвятая справа нам за гэта выпіць!

Аднак ІЗІ
зноў
паўтарае
сваю
спробу й
зьяўляецца
МАКБЭТУ,
стоячы за
правай
шырмай.

МАКБЭТ. Прэч з маіх вачэй!
(*Ізі зьнікае зь ягоных вачэй.*)
Няхай жа, здань, зямля цябе схавае!
Мазгі ўжо выцеклі з тваіх касьцей,
І кроў астыла!
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Прыміце гэта, дарагія пэры,
За звыклае здарэньне – не бяды.
На жаль, псуецца радасьць ад сустрэчы.

ІЗІ зноў
зьяўляецца
ў акне.

МАКБЭТ. Сыдзі, жахлівы цень!
Зьдзек прывідны, прэч! Зьнікні!
(*Зачыняе аканьніцы. Ён ізноў ачуняў.*)
Як ён сышоў, дык адчуваю зноў
Сябе я чалавекам. Не ўставайце.

ЛЭДЗІ МАКБЭТ (*убок, да Макбэта*).
Вы сьвята сапсавалі ўсё, а добра
Так пачалося. Вы ж перакруцілі
Ўсё з ног на галаву. (*Да гасьцей.*) Усім дабранач.
Вас, госьці, я прашу: сыходзьце разам,
Без цырымоній.

Госьці
ўстаюць і
выходзяць.

РОС. Зычу добрай ночы.
Хай акрыяе Вашая вялікасьць!
ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Усім маё сардэчнае дабранач!

Сьвятло
згасае.

МАКБЭТ. Крыві ён прагне. Кажуць, кроў за кроў.
У казаньнях і дрэвы размаўлялі,
І ссоўваліся зь месца камяні.
Пайду да ведзьмаў, нат праз гэты грэх
Гатовы я дазнацца праўды горкай.

Грымоты й
маланка.
ТРЫ
ВЕДЗЬМЫ.

ВЕДЗЬМЫ. Чары, вусьціш і бяда!
Грэй, агонь, кіпі, вада!
ПЕРШАЯ ВЕДЗЬМА. Калі пальчыкі сьвярбяць,
Час нам грэшніка страчаць.

Уваходзіць
МАКБЭТ.

МАКБЭТ. Што, злосныя паўночныя стварэньні?
Чым вы тут заняліся?
ВЕДЗЬМЫ. Безназоўным.
МАКБЭТ. Я заклінаю гэтай чорнай сілай,
Якой слугуеце, адказ знайдзёце,
Як хочаце, – ды толькі дайце знаць…
ПЕРШАЯ ВЕДЗЬМА. Скажы, ты з нашых вусен хочаш чуць
Ці ад гаспадароў?

МАКБЭТ. Паклічце іх!
Дазвольце іх убачыць.

Чуваць
толькі
галасы
зданяў з
Шэксьпіраўскай
п’есы.
Узмоцненыя
галасы
гучаць з
розных
бакоў
глядацкай
залі.
Відавочна,
што МАКБЭТ
бачыць
здані.
Грымоты.

ПЕРШЫ ГОЛАС. Адно Макдафа бойся ты ў жыцьці,
Што ў Файфе танам! А мяне пусьці...
МАКБЭТ. Хто б ты ні быў, ды за прароцтва дзякуй.
Ты адгадаў мой страх.
ДРУГІ ГОЛАС. Макбэт, Макбэт, Макбэт!
МАКБЭТ. Трыма б я слухаў
Вушамі, каб былі.
ДГУГІ ГОЛАС. Будзь сьмелы і рашучы ў барацьбе,
Людзей ня бойся. Не заб’е цябе
Народжаны жанчынай.
МАКБЭТ. Дык няхай
Макдаф жыве. Нашто яго баяцца?
(*Грымоты. Ведзьмы выходзяць.*)
А гэта хто, падобны да дзіцяці,
З каронай залатой на галаве?
ДЗІЦЯЧЫ ГОЛАС. Б’юць ворагі, кадзяць паслугачы –
Ты не зважай, да мэты ідучы.
Ты неадольны, покуль не палез
На ўзгорак Дансынан Бірнамскі лес.

МАКБЭТ. Таму ня быць. Ніхто яшчэ ня стрэў,
Каб па зямлі хадзіла войска дрэў.
Ды толькі сэрца б’ецца ад жаданьня
Адно дазнацца…
ВЕДЗЬМЫ (*за сцэнай*). Болей не пытайся.
Жудой яго ахутай, здань,
І ценем уначы растань!
МАКБЭТ. Хто гэта? Прэч! Я гэты змрочны час
Пазначу чорным у календары.
Хто там? Заходзьце.

Уваходзіць
ЛЕНАКС.

ЛЕНАКС. Чаго жадае Вашая вялікасьць?
МАКБЭТ. Ты бачыў ведзьмаў?
ЛЕНАКС. Не, мілорд, ня бачыў.

За акном
праходзіць
ІЗІ.

МАКБЭТ. Хто там прайшоў?
ЛЕНАКС. Там некалькі ганцоў.
Яны прывезьлі весткі пра Макдафа,
Што ўцёк у Англію.
МАКБЭТ. Макдаф уцёк?

Нясьмела
ўваходзіць
ІЗІ.

ІЗІ. Бессэнсоўна… бессэнсоўна… Бакстанз… скікаюць пірагі… арцішок амаль Лемінгтонскі курорт… /*Добры дзень… добры дзень… Бакстанскія блёкі й гэты грузавік зь Лемінгтонскага курорту./
МАКБЭТ. Што?

Агульнае
сьвятло.
Астатнія,
акрамя
МАЛКОЛМА й
МАКДАФА,

выходзяць
празь
цікаўнасьць.

МАКБЭТ (*да Гаспадыні*). Што гэта за чорт?
ГАСПАДЫНЯ (*да Ізі*). Хто вы?
ІЗІ (*паказвае сваю пляншэтку*). Бакстанз скікаюць пірагі.
ГАСПАДЫНЯ. Я ня буду нічога падпісваць.
ІЗІ. Коўдры да пасрэднасьці калі сэзон працягнецца, затым разэтка ляснула як у літаўры лёгка А-412 мякка Рыкмазворт – лёд скаваў ваду жахліва, жарнула – забрызгала паквартальных трэнэраў як Мікімаўсавую сапелку – кубак – відавочна карантын для цацак толькі калі бактэрыялягічныя камізэлькі раструшчацца труба – шмыргаюць тады паштовую скрынку, але сэзам!!! Нават плятформы – фарсун дзядзька Дональд Дак тым ня менш мятныя часопісы! /*Пераклад гл. на с. 215./

Паўза.

МАКБЭТ. Га?

ІЗІ дастае
размоўнік
і пачынае
яго
гартаць.

ІЗІ (*пераможна*). О!

ІЗІ
перадае
ГАСПАДЫНІ
размоўнік
і
паказвае,
што трэба
прачытаць.
Яна
ўважліва
чытае.

ГАСПАДЫНЯ. Ён кажа, ягонага фарэйтара забіла маланкай.
ІЗІ. Паліца для капелюшоў цымбалы зязюля сьвіное выйсьце

боўдзіла!
МАКБЭТ. Што?
ІЗІ. Зязюля сьвіное выйсьце што. (*Качае галавой у знак згоды.*) Пірагі скікаюць як сьлед Бакстанз.

ГАСПАДЫНЯ
хутка
гартае
кнігу.

ГАСПАДЫНЯ. Пірагі скікаюць.
ІЗІ. Пірагі скікаюць.
ГАСПАДЫНЯ. Лесаматэрыялы й драўніна.
ІЗІ. Лесаматэрыялы й драўніна – як сьлед Бакстанз.
ГАСПАДЫНЯ. Мне вельмі шкада…
ІЗІ. Так. Лесаматэрыялы й драўніна – як сьлед Бакстанз. Мне вельмі шкада. (*Ён адчыняе аканьніцы, і мы бачым ягоны грузавік.*) Шчыкалатка гэтак арцішок – амаль Лемінгтонскі курорт.
ЛЕНАКС. О! У яго там грузавік.
ГАСПАДЫНЯ. Грузавік, гружоны лесаматэрыяламі й драўнінай.
ІЗІ. Мне вельмі шкада.
ГАСПАДЫНЯ. Ня трэба прасіць прабачэньня.
ІЗІ. Ня трэба прасіць прабачэньня.
ЛЕНАКС. А! Дык вы гавораце па-наску!
ІЗІ. А! Дык вы гавораце па-наску!
МАКБЭТ. Не – мы гаворым па-наску бяз «дык».
ЛЕНАКС. Ён што, крэтын?
ІЗІ. Патэльня-палка-раса.

Усе
выходзяць.
Уваходзяць
МАЛКАЛМ і
МАКДАФ.

МАЛКАЛМ. Давайце знойдзем мы куток зацішны,
дзе можна гора выплакаць да дна.
МАКДАФ. Давайце лепш трымаць мячы мацней,
Абараняць свой занядбаны край,
Дзе кожны дзень удовы лямантуюць,
І крыўды новыя – як поўха небу,

Якая над Шатляндыяй гучыць
гаротным рэхам.
МАЛКАЛМ. Мы таго тырана,
чыё імя нам сёньня рэжа слых,
сумленным уяўлялі.
МАКДАФ. Няхай крывёй сьцякае бедны край!
Чуваць, як
на
адлегласьці
гучыць
паліцэйская
сырэна.

МАЛКАЛМ. Крывёю і сьлязьмі сьцякае край.
І новых ранаў кожны дзень прыносіць.
МАКДАФ. Шатляндыя, гаротная краіна,
З тыранам, што памазаны крывёй,
Ці ўбачыш лепшы дзень?.. Хто йдзе сюды?
Сырэна
сьціхае.

МАЛКАЛМ. Зямляк, здаецца, ды не пазнаю.
Паліцэйская
машына з
выцьцём
едзе
назад.
Уваходзіць
ІНСПЭКТАР.

МАКДАФ. Стаіць яшчэ Шатляндыя на месцы?
ІНСПЭКТАР. Ага. Ноч чудесная. Сьвеціць месіц, сьвеціць, ясны, как вашыя галовы. Недавумкі з апілкамі ў башке. Вы думаеця, я ўчара радзілся? (*Далей гаворыць без акцэнту. Да публікі.*) Усім заставацца на месцах. Прыбіральняй карыстацца забаронена… (*Уваходзіць Кагут.*) Кагут, даражэнькі. А дзе ж сам МакЛандоўскі?
Уваходзіць
ІЗІ. За ім
–

ІЗІ. Бессэнсоўна, прэч! / *Добры дзень, сэр./
ІНСПЭКТАР. Ты хто, лыч сьвіны? (*Кідаецца на Ізі.*)
ІЗІ (*вішчыць і глядзіць на свой гадзіньнік*). Пранцы… кароль! / *Дваццаць на… ой! / Марцыпанавы гадзіньнік! / *Асьцярожней!/
ІНСПЭКТАР. Што?
ГАСПАДЫНЯ. Ён вас не разумее.
ІНСПЭКТАР. На якой гэта мове ён размаўляе?
ГАСПАДЫНЯ. На дадзены момант мы ня ведаем, мова гэта ці клінічны выпадак.
ІЗІ (*засмучона*). Айва гараж! (*Працягвае пляншэтку.*) Пірагі скікаюць. Бакстанз амаль Лемінгтонскі курорт.
ГАСПАДЫНЯ. Ён займаецца дастаўкай драўніны й хоча, каб хто-небудзь расьпісаўся за груз.
ІНСПЭКТАР. Драўніны?
ГАСПАДЫНЯ. У яго там дзьвюхтонны арцішок.
ІНСПЭКТАР. Што???
ГАСПАДЫНЯ. Я хачу сказаць, грузавік.
КАГУТ (*ляпае Ізі па плячы*). Бессэнсоўна. / *Добры дзень./
ІЗІ (*адсутна*). Бессэнсоўна. (*Потым бачыць, хто гэта.*) Кагут! Геранькі? / *Як маешся?/
КАГУТ. Кеды. Геранькі? /*Файна. А самі?/
ІЗІ. Кеды.
КАГУТ. Дагары нагамі пірагі скікаюць? / *Прывёз блёкі?/
ІЗІ. Плашка. /*Так./
КАГУТ. Амаль Лемінгтонскі курорт? / *Зь Лемінгтонскага курорту?/
ІЗІ. Плашка, прэч. Нават арцішок. / *Так, сэр. У мяне грузавік./
КАГУТ. Брусок. / *Дзякуй./ (*Бярэ папку й падпісвае паперу.*)
ІЗІ. Брусок, прэч. / *Дзякуй, сэр./
ІНСПЭКТАР. Хвіліначку. Пра якую трасцу вы размаўляеце?
КАГУТ. Паўднё, спадар!
ІНСПЭКТАР. Паўднё. Хто ваш сябар?
ГАСПАДЫНЯ. Чалавек зь пірагамі-скакунамі.
ІНСПЭКТАР. Чаму ж ён сам гэта ня скажа?
КАГУТ. Ён размаўляе толькі на Догавай мове.
ІНСПЭКТАР. Што?
КАГУТ. Догавай.

ІНСПЭКТАР. Догавай?
КАГУТ. Хіба вы пра гэткую ня чулі?
ІНСПЭКТАР. А дзе вы ёй наўчыліся?
КАГУТ. Ёй ня вучацца – яе пераймаюць.

ІЗІ
заўважае
«МАЛКАЛМА».

ІЗІ. Бессэнсоўна. /*Добры дзень./
«МАЛКАЛМ». Бессэнсоўна… Геранькі?
ІЗІ. Кеды. Геранькі?
«МАЛКАЛМ». Кеды… брусок…
ІЗІ (*да Кагута*). Коўдры да пасрэднасьці, калі розум працягнецца, затым разэтка ляснула як у літаўры лёгка А-412 мякка Рыкмазворт.
«МАЛКАЛМ». Рыкманзворт.
«МАКДАФ» (*«Малкалму», ідучы да дзьвярэй*). Трэба яму дапамагчы.
ІЗІ. Плашка.
«МАЛКАЛМ» (*выходзячы*). …зь пірагамі-скакунамі.
ІЗІ. Лёд скаваў ваду жахліва, жарнула.
КАГУТ. Ягонага напарніка забіла маланкай.
ГАСПАДЫНЯ. Сезам!
ІЗІ. Плашка.
КАГУТ (*працягвае Ізі накрысы*). Альбатрос. /*Накрысы./ (*Да Ізі.*) Ізі! Цэгла…
ІЗІ. Плашка, прэч.
КАГУТ. Цэгла. (*Ён стаўляе Ізі, каб будаваць прыступкі.*)
ІЗІ. Цэгла? /*Тут?/
КАГУТ. Пірагі скікаюць. Цэгла.
ІЗІ. Брусок, прэч.
КАГУТ і ГАСПАДЫНЯ. Кеды. /*Выдатна./
ІНСПЭКТАР. Дазвольце мне нагадаць вам, што ў вас тут павінен быў усталявацца пэрыяд нармалізацыі.
ГАСПАДЫНЯ. Будзьце ласкавым, пакіньце сцэну. Зараз пачнецца пяты акт.
ІНСПЭКТАР. Няўжо? Мушу вас папярэдзіць, што ўсё сказанае вамі будзе запісана й выкарыстана супраць вас падчас судовага працэсу.
ГАСПАДЫНЯ. Равары! Ліштва? /*Гатовыя?/ (*Да Інспэктара.*)

Плашка. Кеды!

КАГУТ і
ГАСПАДЫНЯ
выходзяць.
ІНСПЭКТАР
і ІЗІ
застаюцца.

ІНСПЭКТАР. Якія кеды?
ІЗІ. Што, прэч? /*Адзінаццаць, сэр?/
ІНСПЭКТАР. Кеды!
ІЗІ. Плашка, прэч.
ІНСПЭКТАР (*здаецца*). Бессэнсоўна…
ІЗІ (*з энтузіязмам*). Бессэнсоўна, прэч! /*Добры дзень, сэр./
ІНСПЭКТАР. Правільна – так і ёсьць! (*Да столі.*) Прыём! (*Да публікі.*) Рукі за галаву – пляцай манас пэр капіта… нікс туалетто!

Звоніць
тэлефон.
Слухаўку
здымае ІЗІ
й перадае
яе
ІНСПЭКТАРУ.

ІЗІ. Чайка.
ІНСПЭКТАР (*у слухаўку*). Вы ўсё запісалі? Наколькі вам зразумела? Варожыя дзеяньні ў дачыненьні да Рэспублікі. Дзесяць гадоў мінімум. Мне патрэбнае кожнае слова.

Уваходзіць
ЛЭДЗІ
МАКБЭТ з
запаленай
сьвечкай.

ЛЭДЗІ МАКБЭТ. Гэй вы, рамонкавыя эльфы! Гэй, цьфу на вас!
Шчаўе, сонца, шкодзяць загароджы
Для каровы! Маленькія паўліны!
Гарачыя шатляндцы, прэч, гарачыя!
Камін раскіданы, з варэньнем эмігруем?

Звоніць
тэлефон.
ІНСПЭКТАР
здымае
слухаўку.

ІНСПЭКТАР (*пасьля паўзы*). А якой халеры мне ведаць? Але калі гэта не свабода слова, то тады я ня ведаю, што гэта. (*Кладзе слухаўку.*)
ЛЭДЗІ МАКБЭТ (*быццам мыючы рукі*).
На іх пякельнай блытаніны попел.
Аўтобусныя рэйсы справядліва ў Арабію старыя імы.
Крапіўніцай манашка – ой-ёй-ёй.
/*Крывёй дагэтуль пахне.
Ўсе водары Арабіі ня змогуць
Зрабіць духмяней гэтую маленькую руку…/
(*Выходзіць.*)
ІНСПЭКТАР (*да Ізі*). Яна ўсё прыдумляе па ходзе дзеяньня. Вы, можа, думаеце, што я…

Але ІЗІ
ажно
сьвеціцца
ад таго,
што пазнаў
п’есу.

ІЗІ. А-а… «Макбэт!»

Гарматныя
стрэлы.
Дым. На
крапасной
сьцяне
зьяўляецца
ўзброены
МАКБЭТ.

МАКБЭТ. Толькі радно – ніякіх швадароў! – кінасэанс аконца. Гэтак Бірнамскія скікаюць пірагі ў Дансынан папойка!
…Хвост голуба габой Малкалм? Сварліва шыба ў раме!
/*Больш вестак не прынось. Няхай лятуць.

Бірнамскі лес ня прыйдзе ў Дансынан.
Я не баюся: што мне Малкалм гэты?
Хіба ён не народжаны жанчынай?/

Звоніць
тэлефон.
ІНСПЭКТАР
хапае
слухаўку.

ІНСПЭКТАР (*у слухаўку*). Што? Не – «Сварліва шыба ў раме», я думаю… Будзьце паблізу.
МАКБЭТ. Капыты балянс ягоны мясьціны крычалі карамелька!
Бірнамская калыска скікаюць пірагі Дансынана бэлька!
/*Праклён ня страшны, покуль не палез
На ўзгорак Дансынан Бірнамскі лес!/

Адчыняецца
задні борт
грузавіка,
і мы бачым
там
МАЛКАЛМА й
астатніх.
Яны
выгружаюць
будаўнічыя
матэрыялы.
ІНСПЭКТАР
заўважае
гэта.

ІНСПЭКТАР (*крычыць па рацыі*). Паклічце шэфа. Паклічце шэфа!

Адзін-два
чалавекі,
напрыклад,
РОС і
ЛЕНАКС,
злазяць з
грузавіка
й
утвараюць

жывы
ланцуг,
каб
перадаваць
блёкі,
плашкі й
астатняе
ад
МАКДАФА,
які стаіць
на
грузавіку,
да ІЗІ,
які будуе
прыступкі.

МАЛКАЛМ (*да Макдафа, які разам зь ім стаіць на грузавіку*). Зубчастыя пірагі-скакуны хутка пакажам?
/*Што там за лес наперадзе?/
ІНСПЭКТАР (*па рацыі*). Вас зразумеў. Зебра, прыём!
МАКДАФ. Бірнам грэх пірагі скікаюць, прэч.
/*Бірнамскі, сэр./
ІНСПЭКТАР. Зялёны Чарлі-анёлак пятнаццаты, прыём скончаны.
МАЛКАЛМ. На дзяржаўным узроўні палае гарэшнік абылганы…
/*Няхай салдаты зрубяць па галіне…/
ІНСПЭКТАР. Ізі Дог!
ІЗІ (*да Інспэктара*). Плашка, прэч?
МАЛКАЛМ. Засмажце цыбулі адрачэньне!
/*І сьпераду нясуць!/

МАКДАФ
яшчэ з
адным
чалавекам
саскокваюць
з
грузавіка.
Блёкі
перадаюцца

па ланцугу
да ІЗІ,
які будуе
прыступкі.
За
кулісамі
енчыць і
крычыць
ЛЭДЗІ
МАКБЭТ.
Уваходзіць
ГАНЕЦ.

ГАНЕЦ. Прэч! Зьбіты з панталыку маргарын!
/*Мілорд, памерла каралева./
МАКБЭТ. Даміно, эт даміно, эт даміно,
Кола гісторыі намазаць тлушчам патрабуе
Кляча ляванда бурапенных плаўнікоў…
/*Мы кожны дзень гаворым: «Заўтра, заўтра» –
І так ідзем нясьпешнаю хадой
Да самае апошняе старонкі
У летапісе нашага жыцьця./
ІНСПЭКТАР (*у слухаўку*). Так, бос! Я думаю, усё больш-менш пад кантролем, бос…

Ён маніць.
Будуюцца
прыступкі,
МАКБЭТ
працягвае
свой
маналёг на
Догавай
мове;
чуваць
гукі
барабанаў
й
гарматныя
стрэлы…

МАКДАФ. Мытная пошліна на танкі, та-ра-ра-ра!
/*Няхай цяпер за нас гавораць трубы!/

Гучаць
трубы. Да
МАКБЭТА
сьпяшаецца
ГАНЕЦ.

ГАНЕЦ. Зьбянтэжаная прэч! /*Вашая вялікасьць!/
МАКБЭТ. Мытная пошліна! /*Кажы./
ГАНЕЦ. Помнік невядомаму салдату
Сплаціць Бірнаму, які пануе,
Пірагі скікаюць добраахвотна.
/*Як я стаяў на варце й назіраў
За ўзгоркам, падалося мне, што лес
На нас пайшоў./
МАКБЭТ. Айва марозіва ў брыкетах! /*Манюка, рабская душа!/

ГАНЕЦ
выходзіць.
Падчас
папярэдняга
дзеяньня
ІЗІ
выкрыквае
назвы
будаўнічых
матэрыялаў
і
атрымлівае
іх у
правільным
парадку:
чатыры
ліштвы,
тры
плашкі,
пяць
блёкаў і
дзевяць

брускоў.
Ён
мімаволі
карыстаецца
звычайнай
мовай. Тым
часам
МАКДАФ
сутыкаецца
твар да
твару з
МАКБЭТАМ.

МАКДАФ. Сьпіраль, ровар трохколавы, сьпіраль!
/*Стой, сабака, стой!/
МАКБЭТ. Бэлькі Бірнам скікаюць і пірагі кульгаюць Дансынан,
Смажаніна коўдра пастрыгаваная сварліва
Гніда шыба ў раме, дзіўным чынам прадаўгаватае!
Розная брыдота грыміць бы камэргер.
Лягла ў аснову згубы забарона масла для смажаніны.
Разьюшаны Макдаф ды лістападаўскія кіны!
/*Хаця Бірнам прыйшоў да Дансынану,
А ты ня быў народжаны жанчынай,
Я шчэ трымаю шчыт! Памры, Макдаф!
Праклён таму, хто першым загалосіць
І літасьці папросіць…
ІНСПЭКТАР (*перапыняе*). Добра! Досыць!
ІНСПЭКТАР
караскаецца
на ўжо
пабудаваную
плятформу.

ІНСПЭКТАР. Дзякуй. Дзякуй! Дзякуй! Неахайныя падлюгі! Сьмярдзючыя паршыўцы, круцялі! Лічыце, што вас ужо засадзілі, шатляндзкая салдатня! Мяне нудзіць ад панкаў. Я адплачу вам гэнай жа манетэй. Паскручваю вам шыі. Зраблю з вас адбіўныя. Пасаджу вас, шчанюкоў, пад замок і падтасую факты. Задушу на карню вашыя сутэнэрскія памкненьні.
КАГУТ (*пляскае*). Кеды. Варэньне. Паршывец?

Агульныя
апладысмэнты.

ІЗІ. Цяжкі падлетак, прэч.
ІНСПЭКТАР. Борыс! Морыс!

Паліцэйскія
ўваходзяць
і
становяцца,
каб
прымаць
плашкі,
якія ім
кідаюць
празь
дзьверы.

МАКДАФ. Сьпіраль, ровар трохколавы, сьпіраль!
ІНСПЭКТАР. Плашка!

Цяпер
падаюцца
шэрыя
плашкі, іх
падхопліваюць
БОРЫС і
МОРЫС і
будуюць зь
іх сьцяну
ўздоўж
авансцэны.
Гэтым
часам
МАКБЭТ з
МАКДАФАМ
б’юцца й
МАКБЭТ
гіне.
Звоніць
тэлефон.
ІЗІ здымае

слухаўку.

ІЗІ. Ах, бессэнсоўна, прэч!

Пакуль ІЗІ
размаўляе
па
тэлефоне,
ІНСПЭКТАР
кіруе
будоўляй
сьцяны.
МАЛКАЛМ
узыходзіць
на
плятформу,
здымае
карону з
МАКБЭТА й
ускладае
яе сабе на
галаву.

МАЛКАЛМ. Вартая сьмеху гніда крэтын паскудная сьвіньня.
ІЗІ. Крэтын фашыст сьвіньня як першая гадзіна. Плашка?
МАЛКАЛМ. Перавагу аддаю пасьля карысным прагным эт фактотум курапаткам.
ІЗІ. Шпікі. Жандары – быдла!
МАЛКАЛМ. Цэнтар іншасказальны, калі газонакасілкі ружовыя кусты.
ІЗІ. Доўбня. Цэгла як надта ліштвы. Плашка.
МАЛКАЛМ. Літасьцівае слабіцельнае. /*Мёртвы мясьнік./
ІЗІ. Рыбкі вырадак. Загрэю па азадку, дапамажы мне Дог. Не сысьці мне з гэтага месца, калі не загрэю. Нармалізацыя.
МАЛКАЛМ. Віва гістэрыка прыпаркі насавыя.
ІЗІ. Варажба, варажба, зьнямога, гора ды бяда.
МАЛКАЛМ. Алябастар злавесны й сьмярдзючы, коўдра паўднём Краты камінныя завыце стрэльбы соваў у Скоўн скакнём.
/*Што ж, дзякую, сябры, вам за спагаду
Й чакаю ў Скоўне, дзе прыму я ўладу!/
Фанфары.
ІЗІ (*перакрыквае фанфары*). Чары, чары… Чары, чары. Чары,

вусьціш і бяда! Не. Шэксьпір. (*Маўчаньне.)*
Што ж, гэта быў нейкі дзіўнаваты тыдзень. Але я павінен вярнуцца да аўторка.

Пераклала з ангельскае Марыя Салаўёва паводле:
Tom Stoppard. The Real Hounds and Other Plays. New York, 1993.
Пры перакладзе п'есы выкарыстаны пераклад «Гамлета» Юркі Гаўрука.
Пераклад «Макбэта» зроблены з удзелам Андрэя Хадановіча.
У рэдагаваньні тэксту браў удзел Андрэй Курэйчык.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/3/10**
[image]

Мінулыя (1’2000)

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (34) - 2004**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image]2004
Літаратура
Навіны
Пошук
Аўтары
Цалкам
Іншае
Пачатак
Форум
Літаратура • Навіны • Пошук • Аўтары • Цалкам • Іншае
Пачатак • Форум •

сабе нейкі дадатковы імпульс. Радок вершу нагадвае пушчаную стралу, часткі стралы адпавядаюць адзінкам радка. Нездарма Алесь Разанаў адзін з сваіх зборнікаў назваў «Вастрыё стралы». Бо нават сэнс вершу такі самы няўлоўны, як тое вастрыё, дзе зьмяшчаецца ня менш як паўтузіна думак. А Аляксандар Пушкін у мініятуры «Празаік і паэт» дасьціпна апісаў вершаваньне:

вымяраецца пэўным рухам. Арыстотэль

Чаго празаік там бядуе?
Давай мне думку хоць якую:

Яе узброю я асном,
Аздоблю рымаю-пяром
І, лук узяўшы, наастачу,
Яе ў сутужыну ўкладу,
А там пашлю ужо наўдачу
І незычліўцу на бяду.

Як выразіць
гэты рух у
ясных і
вабных
панятках?
Некалі
Зэнон
Элейскі, каб
паказаць
складанасьці
ўсякага
руху,
прыдумаў
чатыры
апорыі,
ведамыя
сёньня як
Дзяльба,
Ахілес,
Страла, Бегі.
У
Арыстотэля,
празь якога
яны
захаваліся,
гэтых
вобразных
найменьняў
апорыяў
няма і
Страла, як
найпрасьцейшая
з усіх,

успамінаецца
першаю.
Таму я
дазволю
сабе
памяняць іх
парадак ды
задзіночыць
вобразнасьць.
Уявім сабе
стралу, што
можа ляцець
бясконца, і
пакажам
апорыі яе
лёту:

1. Страла. *Пушчаная страла стаіць, бо час яе лёту складаецца з процьмы нерухомых «тут», якія яна займае.*
2. Страла і дрэва. *Ніякая страла не даляціць да дрэва, бо перш мусіць праляцець паўдарогі, потым чвэрць дарогі і г. д.*
3. Страла і птушка. *Порсткая страла не дагоніць павольнае птушкі, бо перш мусіць даляцець туды, дзе ўжо была птушка, а тая тым часам яшчэ трохі праплыве, і г. д.*
4. Страла, птушка і дрэва. *Сустрэчныя страла і птушка, летучы паўз дрэва, таўшчынёю роўнае іх даўжыні, адна паўз адну праляцяць за час удвая меншы, чым час, за які яны праляцяць паўз дрэва.*

Ня будзем тут успамінаць тых аспрэчаньняў ды зьясьненьняў апорыяў, якія паўсталі ад часоў Зэнона, а проста паспрабуем трымаць парадоксы ў памяці як архетыпы, да якіх нам давядзецца вяртацца ня раз. Першая апорыя паказвае рытмічнасьць усякага руху як праяву лінейнае сымэтрыі. Другая даводзіць, што лінейны рытм, узяты як завершаны адцінак, можа дзяліцца напалам да апошняга кванту. У трэцяй падзел ускладняецца рухомым пунктам адліку і набывае ўласьцівасьці асымэтрыі. І ў чацьвёртай, урэшце, узьнікаюць рухомы і нерухомы пункты адліку, якія гранічна ўскладняюць асымэтрыю.
Калі эліны глядзелі на пушчаную стралу, дык зусім не сумняваліся ў яе лёце. У тэорыі ж страла нават зь месца не

магла зрушыцца. Радкі вершу гэтаксама «ляцяць» у гучаньні. І на старонках кнігі яны не спыняюць нутранога хвалевага руху, нібы ланцуг, які мы паднялі ўгору і рэзка пацягнулі на сябе. Але цяпер нашае заданьне ня ў тым, як спыніць «стралу», а ў тым, як перадаць яе хвалевы рух.

1. Прапэдэўтыка асноўных паняткаў. Рыторыка вучыць: перш чым сьцьвярджаць нешта новае, нязвыклае, г. зн. *патас* (ці, па-беларуску, *рымасьць*), трэба як сьлед успомніць даўно ведамае, звыклае, г. зн. *этас* (ці, па-беларуску, *звыкласьць*). Досыць разгарнуць першы, які трапіцца пад рукі, паэтычны «лемантар», каб даведацца, дзей у беларускай (а таксама ўкраінскай і расейскай) літаратуры ў розныя часы паўставалі тры сыстэмы вершаваньня: *сылябічная, сыляба-танічная* і *танічная*. Сылябічная, ці складалічыльная сыстэма засноўваецца на аднолькавай колькасьці складоў у радку, незалежна ад колькасьці націскаў. Тарнавалася яна ў кніжнай старабеларускай паэзіі. Танічная, наадварот, улічвае толькі колькасьць радковых націскаў без увагі на астатнія склады. З даўных часоў тоніка панавала пераважна ў фальклёры. У ХХ ст. пачала шырока ўжывацца ў літаратуры. Сыляба-танічная сыстэма парадкуе і яднае патрабаваньні дзьвюх першых. Таму галоўнае ў ёй – раўнамернасьць чаргаваньня націсьненых ды ненацісьненых складоў. Захоўваецца, часьцей за ўсё, і даўжыня радка. Адзінкаю вымярэньня гэтага ідэальнага рытму служыць ступа.

Рызыкну, аднак, заявіць, што насамрэч усё значна складаней. Падзел г. зв. «канвэнцыйнага» вершу на тры сыстэмы праводзіцца вылучна на падставе «сыляба-танічнага» мысьленьня і слушны з гледзішча толькі гэтага мысьленьня. Можна нават сказаць, што мы нічога, апрача сыляба-тонікі, ня ведаем і рэшту тэкстаў ацэньваем ды аналізуем выходзячы з ідэалаў сыляба-танічнае дактрыны. Пацьверджаньнем таму служаць і працы тэарэтыкаў вершаваньня, і практыка нашых сучасных паэтаў. Сыляба-танічны верш – адзіны, які рэальна існуе, дамінуючы над астатнімі. Уласьцівыя для яго ступовыя структуры можна прасачыць нават у модных ды разбуялых, як пустазельле, вэрлібрах. А ў масавай «дылетанцкай» сьведамасьці адзінаю паэтычнаю моваю, якая на слых успрымаецца як «складныя», дасканалыя вершы, ёсьць толькі сыляба-тоніка. Таму, апрача яе, ні пра які іншы вершазнаўчы

этас няма сэнсу гаварыць.
Такім парадкам, сучасная паэтыка практыкуе пяць асноўных ступ – дзьве двухскладовыя і тры трохскладовыя, якія маюць адумысную пасьлядоўнасьць чаргаваньня складоў, націсьненых (пазначаныя тоўстымі літарамі) і ненацісьненых (пазначаныя звычайнымі літарамі):
1) *харэй:* **о**о;
2) *ямб:* о**о**;
3) *дактыль:* **о**оо;
4) *амфібрах:* о**о**о;
5) *анапэст:* оо**о**.
У тэкстах гэта можна паказаць на прыкладзе найбольш пашыраных памераў: *чатырохступовых двухскладовых і трохступовых трохскладовых.*
Чатырохступовы харэй:
Др**у**жа! | К**і**нь на | н**е**ба | в**о**ка –
К**о**лькі | з**о**рак,| к**о**лькі | з**о**р!
Як пры|в**о**льна,| **я**к да|л**ё**ка
Зьз**я**е,| сьв**е**ці|цц*а* пра|ст**о**р!
Якуб Колас
Чатырохступовы ямб:
Бліш**ч**ыць | у н**е**|бе з**о**р | пас**е**ў;
У п**о**|лі – рунь | і ў н**е**|бе – р**у**нь.
Да р**э**|чкі *ле*|цяч**ы**,| ўзьляц**е**ў
Між **і**|мі м**а**|рай б**е**|лы л**у**нь.
Максім Багдановіч
Трохступовы дактыль:
Ср**э**бная | з**о**рка блі|сн**у**ла
Ц**і**ха над | с**о**ннай зя|млёй,
С**э**рца сва|б**о**дна ўзды|хн**у**ла –
Ч**у**е вя|ч**о**рны спа|к**о**й...
Хведар Чарнышэвіч
Трохступовы амфібрах:
Так ц**і**ха...| так ч**ы**ста...| так б**е**ла...
І ўс**ю**ды | вял**і**кі | спак**о**й...
Зямл**я** бы | зус**і**м а|бамл**е**ла,
Ня ц**е**шы|цца **я**снай | зар**о**й...
Зоська Верас
Трохступовы анапэст:
Закац**і**|лася с**о**|нца чырв**о**|нае,

І дал**і**|на сьпяш**ы**ць | пацямн**е**ць…
Узышл**і** | ў небе з**о**р|кі чар**о**|ўныя,
Сталі в**е**|села, **я**|сна гарэць…
Алесь Гурло

Нават гэтыя, адумысна падабраныя прыклады не пазбытыя супярэчнасьцяў, якім жадная паэтыка пакуль што не дае рады. Першае: ступовы падзел не супадае з слоўным, значыць, ступа як «адзінка вымярэньня рытму» праціўляецца «асноўнай адзінцы маўленьня» слову. Другое: з тэкстаў відаць, што не заўсёды слоўны націск супадае зь месцам *ікту* (рытмавага націску). Паводле падлікаў В. Рагойшы, сярэдняя даўжыня беларускага слова – 3,27 складу. Таму асабліва цяжка запоўніць рытмарады двухскладовых памераў. У нашых прыкладах рытмавыя лякуны (пазначаныя курсівам) назіраюцца ў чацьвёртым радку харэю і трэцім радку ямбу. Пры ўжываньні аднаскладовых слоў могуць таксама ўзьнікаць «лішнія», пазасхемавыя націскі. Для абазначэньня падобных зьяў ад часоў В. Трэдзіякоўскага тарнуецца такі дарэшты застарэлы сёньня панятак, як *дапаможныя ступы*:

1) *пірых:* оо;
2) *спандэй:* **оо**.

Ідэя дапаможных ступ на пачатак ХХ ст. вылілася ў тэорыю *гіпастаз* (падстановак), дзе практычна кожная ступа магла быць замененая іншаю з багатага антычнага набору (гл. ніжэй), а памер вершу ў цэлым вызначаўся нібыта паводле асноўнае ступы. Заразом тэорыя не адказвала, на падставе чаго адбываецца замена і якую колькасьць іншародных ступ здольны зьмясьціць верш, чым у такім разе верш розьніцца ад прозы. Атрымаўшы ў В. Брусава свой закончаны выгляд, тэорыя адразу ж заняпала. Крыху пазьней і паралельна ёй стала разьвівацца тэорыя *леймаў* – паўзаў, прызначаная найперш для апісаньня неступовых, «танічных» вершаў. Калі ў першай тлумачэньне вершу нічым ня розьнілася ад тлумачэньня прозы, дык у другой за кошт нагрувашчваньня леймаў нават прозу можна было апісаць як верш.

Пазьней вершазнаўцы адмовіліся ад абедзьвюх тэорыяў, а для прапушчаных іктаў сталі ўжываць такі панятак, як *моцныя месцы*, і… весьці статыстычныя падлікі, ізноў жа, мала задумваючыся, *што* і *навошта* яны лічаць. Насамрэч ніякіх іншаякасных ступ у радку, калі ён слушны, няма і быць ня

можа. Вельмі часта адхіленьні ад рытмавае схемы, нават некалькі ўзапар, згладжваюцца магутнаю *рытмаваю інэрцыяй* вершу. З гэтае нагоды інэрцыйнае ўжываньне націсьненага складу як ненацісьненага найлепей пазначаць тэрмінам *сыстала*, а ненацісьненага як націсьненага – *дыястала*. Бо «спандэй» і «пірых» ня ўлічваюць інэрцыі і пасуюць толькі для двухскладовых памераў. У трохскладовых дадатковая ступа «трыбрах» даўно ўжо не практыкуецца. Дарэчы, інэрцыя неадменна дзеіць менавіта ў трохскладовых памерах, дзе адхіленьні і без таго рэдкія.

Варта зацеміць, што многія вершазнаўцы спаквaля пачалі адмаўляцца ад умоўнага панятку «ступа». Л. Цімафееў наагул прыйшоў да высновы, дзей за аснову вершу варта браць радок. Для спраўджаньня гэтае ўмоўнасьці ўчынім маленькі досьлед і ў якасьці «жывых» ступ возьмем словы з адпаведным парадкам націскаў: *г**о**рад* (харэй); *гар**о**д* (ямб); *х**о**ладна* (дактыль); *халодна* (амфібрах); *халадн**о*** (анапэст). Як вучыць тэорыя гіпастазаў, злучым гэтыя «ступы» ў «радкі»: 1) *г**о**рад-гар**о**д*; 2) *х**о**ладна-хал**о**дна-халадн**о***. Як бачым, «двухскладовыя» ступы раптам сталі «трохскладовым» «дактылем», а «трохскладовыя» – наагул «чатырохскладовым» «пэонам» (гл. ніжэй), які можна праскандаваць як «харэй»: *х**о**ладн**а**-хал**о**дна-х**а**ладн**о***. Ясна, што ў гэтай «лёгіцы» нешта ня так, але дзе тут «сафізм», думаю, варта разьбірацца спаквaля.

У антычнасьці, адкуль паходзіць бальшыня вершазнаўчых тэрмінаў і ўяўленьняў, панавала мэтрычная сыстэма вершаваньня і ўжывалі яшчэ шэраг ступ, якія варта ведаць, – *трыбрах:* ооо; *амфімакр* (*крэцік*): **о**о**о**; *бакх:* **оо**о; *антыбакх:* о**оо**; *трымакр* (*молас*): **ооо**; *дыпірых*: оооо; *антыспаст* (*ямбахарэй*): о**оо**о; *харыямб:* **о**ооо**о**; *пэон першы:* **о**ооо; *пэон другі:* о**о**оо; *пэон трэці:* оо**о**о; *пэон чацьвёрты:* ооо**о**; *эпітрыт першы:* о**ооо**; *эпітрыт другі:* **о**о**оо**; *эпітрыт трэці:* **оо**о**о**; *эпітрыт чацьвёрты:* **ооо**о; *ёнік горны:* оо**оо**; *ёнік дольны:* **оо**оо.

Чаргаваліся тут ня моцныя і слабыя склады, як у сучаснай беларускай мове, а доўгія і кароткія. Таму антычная мэтрыка ў традыцыйнай паэтыцы яшчэ называецца *квантытацыйнай* (колькасьцевай) супраць *квалітацыйнае* (якасьцевае), уласьцівае бальшыні сучасных эўрапейскіх моў. Адзінкаю вымярэньня ў ёй служыла *мора*: доўгія склады замыкалі ў сабе дзьве моры, а кароткія – адну. Адпаведна, ступы былі ад

дзьвюх- да васьміморавых. Калі-нікалі адзін доўгі склад маглі заступаць два кароткія. Сёньня антычная тэрміналёгія захоўваецца – як даніна традыцыі. Многае, што было ў антычнасьці падставовым, у славянскіх мовах мусіць зысьці на маргінэз, і наадварот, *дапаможныя антычныя ступы могуць спатрэбіцца як асноўныя*.

Вельмі часта навукаю ступ абмяжоўваюцца тэарэтычныя веды цяперашніх паэтаў. У пару клясыцызму ад песьняра патрабавалі большага – уменьня зьвязваць радкі ў строфы. Уся левая частка радка ад «вастрыя», *анакрузы*, да *канстанты*, апошняга апорнага націску, становіць сабою «сьпічак стралы» – менавіта яна вызначае якасьць рытму. Але неабыякавая да гучаньня вершу і замыкальная, параўнальна малая група складоў пасьля апорнага націску, «апераньне стралы», якую называюць *кляўзулай*. Кляўзулы бываюць *мужчынскія* – націск на першым складзе ад канца; *жаночыя* – на другім; *дактылёвыя* – на трэцім і *гіпэрдактылёвыя* – на чацьвёртым. У А. Кантэміра, дарэчы, кляўзулы мелі адпаведныя найменьні: *тупыя, простыя, сьлізкія* і, дапоўнім ад сябе гэты куды ўдалейшы шэраг, – *засьлізкія*.

Хоць традыцыйныя найменьні кляўзулаў вынікаюць з мэтрыкі, аднак сучасныя вершазнаўцы даўно зразумелі, як, прыкладам, М. Трубяцкой, што «той ці іншы кшталт канчара ня зьвязаны з тым ці іншым кшталтам ступовае будовы вершу». Характар кляўзулы не вызначае, а толькі «інструмэнтуе» рытм. Менавіта ў гэтай «інструмэнтоўлі» і палягае ўведзенае клясыцыстамі правіла *альтэрнансу* – чаргаваньня кляўзул рознае якасьці, часьцей за ўсё простых і тупых. Надалей, каб унікнуць супярэчнасьцяў з айчыннаю сылябічнаю традыцыяй, дзе істотна дамінавала простая кляўзула, яе мы і будзем уважаць за «норму». Адсюль жа – чаргаваньне даўжэйшых кляўзул з карацейшымі (прыкладам, простых з тупымі) назавем *лінейным* альтэрнансам, карацейшых з даўжэйшымі – *адваротным*, а немень чаргаваньня – *нулёвым*. Як альтэрнанс уплывае на рытміку, пакажам на прыкладзе трохступовых анапэстаў.

Лінейны альтэрнанс:

Падымі угару сваё в**о**ка,
І ты будзеш ізноў, як дзіц**я**,
І адыдуць-адлынуць дал**ё**ка
Ўсе трывогі зямнога жыцьц**я**.

Максім Багдановіч
Адваротны альтэрнанс:
Цішыня… Галасы… Разнаб**о**й…
Сьмех і сьлёзы у песьні зьвіл**і**ся.
Пралятаюць яны над таб**о**й,
Як цяпер, як даўно, як кал**і**сьці.
Уладзімер Дубоўка
Нулёвы альтэрнанс:
Я грамнічная сьвечка прад Б**о**гам.
Ціхай, ціхай згараю мал**і**твай
За блакітную к небу дар**о**гу,
За ўзрунелыя зелена р**ы**твы.
Уладзімер Жылка
Важную ролю ў паэтыцы клясыцызму адыгрывала таксама *цэзура* – сталая ўнутрырадковая паўза, якая радкі, даўжэйшыя за 8 (ці 9) складоў, дзеліць як мінімум на два паўрадкі. Цэзураю яшчэ як калі называюць усякі падзел слоў, а рэгулярны падзел – *мэдыянаю*. Зрэшты, такое пашыранае разуменьне цэзуры ня надта прадукцыйнае, для гэтага ёсьць іншыя паняткі. Супадзеньне граніцы ступы з граніцаю слова ў паэтыцы абазначаюць тэрмінам *дыярэза*, для несупадзеньня ж, якое нітуе радок, будзем тарнаваць адваротны тэрмін – *сынэрэза*. Што такое цэзура, пакажам на прыкладзе шасьціступовага ямбу – дарэчы, ім у сыляба-тоніцы зазвычай перадаецца клясычны *александрыйскі* верш:
Вось псальма сьл**і**чная. // «Як той алень шук**а**е
Крыніцы чыстай, т**а**к // шукаю Бога **я**».
Як вее сьв**е**жасьцю // яе краса жыв**а**я!
Як радасна дал**е**й // сьпяшыць душа ма**я**!
Максім Багдановіч
Пачатныя паўрадкі першага і трэцяга радкоў тут не зусім тыповыя, яны маюць лякуны на месцы рытмавае *канстанты*, а апорныя націскі нібы «адсоўваюцца» ўлева. У другім радку цэзуравы распадзел не супадае з распадзелам сынтаксычным. І толькі чацьвёрты радок, у цэлым добры. Лічыцца, што калі б не падобныя «адхіленьні», дык цэзураваны сыляба-танічны верш выглядаў бы невыносна манатонным.
Аднак ёсьць нямала ладных вершаў, якім «манатоннасьць» чамусьці зусім ня шкодзіць:
Звоны авадз**ё**на // у паветры н**о**сяцца

Над цьвітучай н**і**вай // збожжа-ярын**ы**,
І трава кас**і**цца // ў касавіцы пр**о**сіцца,
Дзесь над канюш**ы**най // чутны кос звон**ы**.
Алесь Гурло

Калі альтэрнанс у сучаснай паэзіі з правіла ператварыўся ў прыём, дык цэзура ўсё больш занепадае. Яе ўспрымаюць як пустую забаўку клясыцыстаў. Нездарма А. Хадановіч, камэнтуючы пераклады з Э. Паўнда, упікнуў калегаў, дзей яны «імкнуцца да вэрлібру, амаль ня ведаючы дакладнай рымы і маючы досыць [цьмянае] ўяўленьне пра цэзуру (беларускія пераклады французскіх «александрын» – яскравае таму сьведчаньне!)». Праўда, прычына гэтага заняпаду не ў непісьменнасьці нашых паэтаў і не ў манатоннасьці цэзураванага вершу. Ляжыць яна значна глыбей.

Аналітычны апарат, што дастаўся нам у спадчыну ад антычнасьці і клясыцызму, можна параўнаць з базавымі катэгорыямі фармальнае лёгікі. Згодна з прынцыпам брытвы Окама пяць гэтак званых вершавых памераў, а таксама дадатковыя ступы, становяць сабою мінімум вычарпальных схемаў, якія можна накласьці амаль што на ўсе імаверныя адменьнікі *ідэальнага рытму*, каркас якога здаўна называюць *мэтрам*. Адступы ад ідэальнага рытму апісваюцца пры дапамозе шэрагу дадатковых тэрмінаў. Рэшта ступ, нават калі яны мажлівыя ў нашай мове, як, прыкладам, пэоны, лічацца лішнімі існасьцямі. Яны падлягалі адсячэньню брытваю Окама, бо апісваць вершы ў абсягах традыцыйнае тэорыі значна эканомней бяз гэтых тэрмінаў.

Аднак яшчэ ў XIX ст. А. Кубараў прапанаваў увесьці замест дзьвюхскладовых чатырохскладовыя ступы. Ён прыйшоў да высновы, што ямбы і харэі не пасуюць расейскай мове, іх абы час прыходзіцца дапаўняць пірыхамі ці, зрэдку, спандэямі. За савецкім часам А. Квяткоўскі распрацаваў адмысловую *тактамэтравую сыстэму*, паводле якое ў рытмавым працэсе вылучаецца малая мера – *кроць* (па-расейску *крата*) – і вялікая мера – *тактамэтравы пэрыяд*. У абсягах тактамэтравага пэрыяду існуюць чатыры клясы мнагадольнікаў.

Трохдольнікі:

1) **О**оо;
2) о**О**о;
3) оо**О**.

Чатырохдольнікі:
1) **О**ооо;
2) о**О**оо;
3) оо**О**о;
4) ооо**О**.
Пяцідольнікі:
1) **О**ооОо;
2) о**О**ооО;
3) Оо**О**оо;
4) оОо**О**о;
5) ооОо**О**.
Шасьцідольнікі:
1) **О**оооОо;
2) о**О**оооО;
3) Оо**О**ооо;
4) оОо**О**оо;
5) ооОо**О**о;
6) оооОо**О**.
Новая сыстэма складанейшая за старую, але дакладней апісвае саму *дынаміку* рытмавага працэсу. Трохдольнікі адпавядаюць у ёй трохскладовым памерам, чатырохдольнікі і шасьцідольнікі – збольшага двухскладовым. Крыху складанейшую групу становяць пяцідольнікі. Праўда, пэўныя сьцьвярджэньні сыстэмы выклікаюць моцны сумнеў. Асабліва – падзел рытмаў на поўнаскладовыя і леймаваныя (паўзавыя), дзе ўсе леймы строга абмежаваныя паводле цягласьці вымаўленьня. А шэраг звычайных сыляба-танічных вершаў у ёй наагул нязручна апісваць.
Абедзьве сыстэмы – і старая, і новая – маюць чыста канвэнцыйную прыроду. Таму вінавачаньне альтэрнатыўных тэорыяў вершу з боку традыцыяналістаў у «ненавуковасьці» і «бездаводнасьці», як гэта робіць У. Халшэўнікаў у дачыненьні да А. Квяткоўскага, несправядлівае. «Музычная» тактамэтрыя – такая самая канвэнцыя, як і традыцыйная мэтрыка. Вартасьць іх мусіць вымярацца не даводнасьцю, а зручнасьцю ў практычным карыстаньні. Спасылкі на даньні экспэрымэнтальнае фанэтыкі ня могуць нічога ні давесьці, ні аспрэчыць. Л. Шчэрба адумысна падкрэсьліваў, што спакмянём фанэтыкі ёсьць не фізычныя і не фізіялягічныя аб’екты, а *гукавыя ўяўленьні*, г. зн. аб’екты псыхалягічныя,

«суб'ектыўныя». Тым больш гэта мусіць датычыць такіх складаных гукавых «арганізмаў», як вершы.
Наіўна думаць, быццам усе памянёныя ступы іманэнтна ўласьцівыя вершаваным тэкстам. Іх, як і законы фармальнае лёгікі, мы прытарноўваем да жывога маўленьня звонку. Ведама, няма нічога дзіўнага, калі асобныя сказы ў маўленьні маюць форму лягічных выракаў. Гэтаксама няма нічога дзіўнага, калі асобныя вершы запраўды адпавядаюць схемам *ідэальнага*, ступовага рытму. На жаль, панавальная школа расейскага статыстычнага вершазнаўства, ад фармалістаў да структуралістаў, у цені якое прыжылася і беларуская навука, запраўды ігнаруе (ня так сьведама, як з прычыны свае мэтадалёгіі) каўзальна-генэтычныя падыходы да прыроды вершу. Асобныя адкрыцьці ў гэтым кірунку трэба шукаць у такіх буйных «маргіналаў», як Л. Цімафееў ды А. Квяткоўскі, што захавалі «арганічнасьць» паглядаў. Цікава зазначыць, што статысты, больш за ўсё прэтэндуючы на навуковасьць, – здавольваюцца архаічнаю тэрміналягічнаю базай часоў М. Ламаносава.
А горш за ўсё тое, што мэханістычная статыстыка ня можа выяўляць працэсаў каўзацыі, а менавіта – паходжаньня рытмавых структур ды іх арганічнага сынтэзу ў рамах вершу і паэзіі ў цэлым. А калі штучна паядноўваюцца рознапрыродныя зьявы, тады «найнавуковейшыя» апісаньні трацяць жадны практычны сэнс. Вывучэньне сучаснага вершу немажлівае без уліку яго станаўленьня і, у прыватнасьці, такога важнага пэрыяду ў гісторыі беларускае паэзіі, калі панавала г. зв. «сылябічная сыстэма». Мушу зацеміць, зьвяртаючыся да вытокаў вершу, я ня стаўлю сабе за мэту даць гісторыю беларускага вершаваньня, а толькі паспрабую, наколькі гэта можна, паказаць, што тэорыя вершу неадлучная ад яго эвалюцыі.
2. **Рэфлексія дэклямацыйная.** У сучасным разуменьні сылябікі вылучаюцца дзьве скрані. Пакажам іх на прыкладзе папулярных дэфініцыяў з навучальнае літаратуры.
І. Гутараў (1967): «*Сылябічнае вершаваньне засноўваецца на чаргаваньні радкоў з аднолькавай колькасьцю складоў... Націскі ў такіх вершах разьмяркоўваюцца свабодна*».
М. Гарэцкі (1924): «*Сылябічнае вершаваньне... грунтуецца на роўным ліку складоў у радку, прычым у нашай мове і словы ў*

гэтым радку павінны быць такія, што націскі ў іх ствараць пэўны рытм».
Дэфініцыя І. Гутарава вельмі просталінейна выражае расейскае разуменьне, выкліканае шматстагодзьдзевым маўчаньнем сылябічнае традыцыі, якое, аднак, прэтэндуе на пазнаньне даўніны. М. Гарэцкі, наадварот, перадае практычнае гледзішча беларускіх паэтаў, што яшчэ ня мелі патрэбы гадаць пра даўніну. Пры ўсіх сваіх плюсах яно небясьпечнае мадэрнізацыяй праблемы.
Спрэчным, як бачым, ёсьць толькі адзін момант: ці націскі ў вершы «разьмяркоўваюцца свабодна», ці «ствараюць пэўны рытм»? А дакладней, што ў сылябічным вершы пераважае – *ізасылябізм* (уразнастаены *гетэрасылябізмам*) ці *канстантавы рытм*? Аднак гэтага пытаньня нельга разьвязаць без уліку такіх важных рытмаўтваральных сродкаў, як *цэзура* і *кляўзула*. Слоўнік В. Рагойшы што да сылябікі ўспамінае іх неяк мімаходзь, зусім не паказваючы, як «працуюць» гэтыя адзінкі, як яны ўплываюць на зьяўленьне *рытмавае канстанты*. А цэзура ў сылябічным вершы ня менш, калі ня больш, важны сродак рытмаўтварэньня, чым роўнаскладовасьць. І *загадка сылябікі палягае ў цэзуры*, а загадка ўсяго вершаваньня, сваім парадкам, замыкаецца ў сылябіцы.
Паасобныя тэарэтыкі, такія, як Халшэўнікаў, спрабавалі зьвесьці ролю рытмавае канстанты, а зь ёю міжволі і цэзуры ледзь не да нуля, упор робячы толькі на роўнаскладовасьць. Іх тэарэтызаваньне стварала замкнёныя віртуальныя сусьветы, ня маючы нічога супольнага ні з колішняю, ні зь цяперашняю вершавальнаю практыкаю. Новы крок да зразуменьня прыроды сылябічнага вершу зрабіў беларускі літаратуразнаўца А. Яскевіч. Сылябічныя вершы, паводле А. Яскевіча, чытаюцца рэчытатывам ня ў складалічыльным, а ў такталічыльным рытме, дзе кожнае слова, апрача службовых, стаіць пад моцным націскам. На жаль, у сваіх высновах аўтар ня рушыў далей. Ці не таму, што адмовіўся прызнаць першаснасьць *радковага* рытму, беручы ў якасьці падставовых рытмы *складалічыльны* і *такталічыльны* (што, дарэчы, далёка ня тое самае). Іншымі словамі – узяў рацыю А. Квяткоўскага, але не прыняў Л. Цімафеева.
Падсумоўваючы шматгадовую спрэчку аб сылябіцы, можна вылучыць наступныя пазыцыі: Г. Шэнгелі, В. Жырмунскі, М.

Гарэцкі, А. Квяткоўскі, Л. Цімафееў, П. Беркаў і А. Яскевіч *прызнаюць* у сылябічным вершы танічны прынцып; Б. Тамашэўскі, І. Яромін, У. Халшэўнікаў, А. Панчанка, І. Гутараў і В. Рагойша *адмаўляюць* яго. У прыватнасьці, паводле Б. Тамашэўскага ўсе склады ў сылябічным вершы прамаўляюцца *як ненацісьненыя*, паводле І. Яроміна – усе склады прамаўляюцца *як націсьненыя*, П. Беркаў за апорныя акцэнты бярэ *рытмавую канстанту* кляўзулы і цэзуры, А. Яскевіч пашырае націскі на *ўсе значальныя словы*. І ўсё ж ніводнае з гэтых правілаў ня можа разгадаць дэкляраваны М. Гарэцкім *парадак* націскаў ды завесьці «матор» сылябічнага вершу.
Калі б гэтак званы беларускі «сылябічны» верш грунтаваўся *толькі* на роўнаскладовасьці, ці, дакладней, *складалічэньні*, то ён наагул ня змог бы існаваць, бо супярэчыў бы жывому маўленьню, дзе націскі адыгрываюць далёка не апошнюю ролю. Прыкладна так вершазнаўцы і разважалі, мала задумваючыся, чаму ж гэты верш трываў ладны час. У разважаньнях утваралася зачараванае кола: *верш быў складалічыльны і таму заняпаў; верш заняпаў, бо быў складалічыльны*. Ні ў той, ні ў другой палове зьмеркаваньня няма праўды. Надта ўжо зацягнуўся гэты заняпад, заняўшы чатыры стагодзьдзі паміж Францішкамі – Скарынам і Багушэвічам. А ў творчасьці Янкі Купалы ён пераможна запачаткаваў пятае стагодзьдзе.
На жаль, сучаснае літаратуразнаўства (у тым ліку слаўнае сваёю «дакладнасьцю» вершазнаўства) разьвіваецца ў глыбокім вакуўме – з прычыны нейкае фатальнае няздатнасьці скарыстоўваць даньні лінгвістыкі дзеля ўласных мэтаў. Тым часам мовазнаўства даўно падтачыла падваліны традыцыйна-банальных уяўленьняў пра верш. Прыкладам, такі славуты паліглёт і тэарэтык мовы, як Я. Паліванаў, пісаў: «Чысты выпадак сылябічнага вершаваньня... – без дамешку акцэнтуацыйнага моманту – мы мала ў якіх мовах знойдзем: у прыватнасьці, у японскай і рукюскай, а таксама, зь іншага боку, і ў народнай паэзіі эрзя-мардоўскага дыялекту». Я. Паліванаў не праводзіў рэзкае граніцы паміж «сылябічным» вершаваньнем палякаў ды французаў з аднаго боку і «сыляба-танічным» расейцаў ды немцаў зь іншага, адпаведна тарнуючы да іх куды карэктнейшыя тэрміны: *сылябічна-танічнае* і *танічна-сылябічнае*.
Каштоўныя для паэтыкі і пакуль што малаўсьведамленыя

вынікі даюць дасьледаваньні сучаснае беларускае лінгвісткі Т. Паплаўскай:
Практычная немень у беларускай мове рэдукцыі ў агульнапрынятым разуменьні слова сягае складалічыльнае базавае рытмавае структуры беларускае мовы, тым часам як дынаміка бязнаціскавага вакалізму ў расейскай мове лучыцца з выражаным такталічыльным рытмам. Адначасна беларуская рытміка адпавядае рытміцы літоўскае мовы, мы можам, зважаючы на даведзенасьць усходнебалтыйскага субстрату для асноўнага арэалу беларускае мовы, разглядаць тую як яе спадкі. Варта зважаць і на такі факт, што літоўская мова належыць да чыста тонавых, якою была і праславянская. Сярод сучасных славянскіх моў тонавыя характарыстыкі захавалі сэрбска-харвацкая і славенская. Рэшта ў той ці іншай меры іх страціла. Беларуская мова, аднак, страціўшы тонавыя характарыстыкі, захавала зьвязаную зь імі рытмавую структуру, да чаго мог у пэўнай ступені спрычыніцца другасны балцкі субстрат, замацаваўшы даўную рытмавую тэндэнцыю.
Гэта вельмі істотнае, а ў пэўнай ступені – нават збытнае сьведчаньне. Яно наводзіць на разважаньні і штурхае да далейшага вывучэньня пытаньня, чаму ў беларускай паэзіі «сылябічны» (сылябічна-танічны) верш прыжыўся лепш, чым у расейскай. Якія фактары – культурныя ці празадыйныя – адыгралі тут галоўную ролю? Цікава зазначыць, што расейскія знаўцы паэзіі і раней, нават ня маючы ўзораў з практыкі, зрэдку выказваліся на карысьць сылябікі. Адно што іх ніхто ня слухаўся. Прыкладам, В. Брусаў пісаў:
Сьцьвярджэньне некаторых даўнейшых падручнікаў, быццам сылябічная сыстэма тарнуецца ў мовах, дзе націск займае той самы склад ў усіх словах (напрыклад, апошні, перадапошні і да т. п.), – ані няслушнае і аспрэчваецца прыкладам хоць бы італійскае мовы, дзе ў жывым маўленьні націскі падаюць на ўсенькія склады (ад апошняга да чацьвёртага і пятага з канца і нават далей).
Каб разьвязаць пастаўленую праблему вершаваньня, спашлюся на ўласны досьвед. У час лекцыяў з гісторыі беларускае культуры мне ня раз даводзілася цытаваць творы нашых даўнейшых паэтаў. Бо як без жывых ілюстрацыяў расказаць, што такое панэгірычныя вершы Андрэя Рымшы, што такое зьвярыныя гратэскі Дамініка Рудніцкага? Як паказаць, што *ўжо тады беларуская мова мала чым розьнілася ад сучаснае*? Я і сам

не заўважыў, калі і якім спосабам у мяне вырабілася рытмічная манера чытаньня старабеларускіх паэтаў. Іх вершы аказаліся зусім не грувасткімі, як мне здавалася раней і як да гэтае пары цьвердзяць нашыя літаратуразнаўцы. Проста трэба засвоіць існасьць падставовых паняткаў – двух старых, *цэзуры* ды *канстанты*, і аднаго новага, *пульсанты*, – на якіх палягае беларускі «сылябічны» верш. Месца цэзуры падлягае строгаму разьліку, але на практыцы мы знаходзім яе свабодна і лёгка. Чаму?

Без інтуіцыі цэзуры радок на дзесяць і болей складоў наагул ня змог бы паўнаварта функцыяваць. Сэнс цэзуры зводзіцца да таго, каб падкрэсьліць *рытмавую канстанту*, моцны акцэнт на месцы цэзуры і на кляўзуле. Канстанта часьцей за ўсё прыпадае на другі ад канца склад, радзей – на першы ці трэці. Другі склад тут замацаваўся пад уплывам польскае мовы, дзе месца націску, апрача аднаскладовых слоў, заўжды другое ад канца. Практычна законам цэзуры ды рытмавае канстанты прыхільнікі «націскавай» тэорыі і абмяжоўваюць правілы чытаньня сылябічных вершаў. Але калі мы пачнем улічваць і цэзуру, і канстанту – верш усё роўна прагучыць як проза. Крыху бліжэй да фактычнае праўды патрабаваньне А. Яскевіча вылучаць кожнае значальнае слова. Зрэшты, на практыцы гэта яшчэ больш заблытвае, бо нямала значальных слоў, якія акцэнтаваць зусім без патрэбы, а на некаторыя, наадварот, прыпадае па два рытмавыя націскі.

Дзеля рытмічнасьці ў кожным паўрадку мусіць зьявіцца *пульсанта*, яшчэ адзін моцны націск, фармальна ніяк не пазначаны. Шуканьне пульсанты яшчэ ў большай ступені грунтуецца на інтуіцыі. Ад рытмавае канстанты яна не павінна стаяць ні надта блізка, ні надта далёка. Гэтае месца ў істотна абмежаваным дыяпазоне ўвесь час мяняецца. Часьцей за ўсё рытмавы націск падае на значальнае слова і, у ідэале, імкнецца супасьці з націскам лягічным. Месца лягічнага націску, сваім парадкам, залежыць ад разуменьня вершу. А гэта яшчэ ў большай ступені прымушае віхтацца дадатковы акцэнт. Пэўнымі парамэтрамі пульсанта збліжаецца з тою адзінкаю, якую Г. Шэнгелі называў *інтэнса*, пры той розьніцы, што інтэнсаю лічылася і канстанта, і ўсякі іншы значальны акцэнт. Такім парадкам, калі канстанта і цэзура палягаюць на інтуіцыі формы, найперш даўжыні радка, дык пульсанта ўлічвае зьмест

і паглыбляе форму. Да *вонкавага* радковага рытму дадаецца *нутраны* рытм – правобраз мэтрычнага.
Увага наконт лягічнага націску асабліва істотная, бо пацьвярджае ідэю, да якой пакутліва, але няўхільна мусіла прыйсьці сучаснае вершазнаўства: складоваю адзінкаю радка ёсьць не ступа і ня склад, а цэлае значальнае слова. *Пульсанта адмаўляе ступы* і паказвае, што рытмічнае чытаньне вершаў грунтуецца на іх разуменьні. Рытм – ня нешта вонкавае, паралельнае сэнсу, ён сам зьяўнік гэтага сэнсу. Узьнікненьне рытму як нутраное меры тэксту – зьява ня менш рэвалюцыйная, чым адкрыцьцё кола ці агню. Пры пераходзе ад «першабытнага вэрлібру» як формы высокаарганізаванае рыторыкі да канвэнцыйнага вершу «крытычнаю масаю» служылі і даўжыня радка, і рытмавая канстанта. З таго моманту, слушна зазначае А. Яскевіч, «колькасьць апорных, структурна значальных рытмавых ярусаў у сылябіцы нашмат узрастае».
Паспрабуем паказаць правілы чытаньня сылябічных вершаў на прыкладзе Сімяона Полацкага. Заразом трэба мець на ўвазе, што *рытмічнае акцэнтаваньне апорных слоў мусіць быць мацнейшым за вылучэньне ступ пры мэтрычным чытаньні:*
Кр**а**сная в**е**сна // н**ы**не нам си**я**ет,
и д**е**нь пресв**е**тлый // вс*е*л**е**нней блист**а**ет.
Аще вся сн**е**гом // зр**я**тся покров**е**нна,
и л**ю**тым хл**а**дом, // **а**ки умерщвл**е**нна:
*о*б**а**че в**е**сна: // с*е* бо цв**е**т там п**о**лный,
прозябе Хр**и**стос, // с*ы*й же кр**и**н юд**о**лный.
Б**е**лший от сн**е**га // пл**о**ти чист**о**тою,
кр**а**снейший с**о**лнца // д*у*ш**и** доброт**о**ю.
Он же есть ш**и**пок, // ч**е**рмно обагр**е**нный
кр**о**вию, с з**е**мли // ч**и**стыя рожд**е**нный.
Рытмавую канстанту мы захавалі нават там, дзе яна супярэчыла беларускай акцэнтуацыі. А калі паасобныя словы чытаць бяз «польскіх» націскаў – *весн**а**, Христ**о**с, шип**о**к, земл**и***, – тады рытмавая будова вершу істотна зьменіцца, але ў цэлым не разбурыцца. Жаданьне зьмяніць канстанту ўзмацняецца тым, што калі моцныя апорныя акцэнты «зрушыць» у бок беларускасьці, дык празь іх выразна «прасьвечвае» шасьціступовы цэзураваны харэй:
Кр**а**сная весн**а** // н**ы**не н**а**м си**я**ет...
Адначасна пры рытмічным чытаньні здаецца натуральным

перамясьціць апорныя націскі ў паасобных радкох на тыя склады, што пазначаныя курсівам. Калі б усе пульсанты там, дзе ёсьць гэткае разыходжаньне, занялі «курсіўныя» месцы, дык мы замест пульсанты фактычна атрымалі б *другую канстанту*, а ў канчальным выніку – *канстантавы рытм*. Але ня будзем прысьпешваць падзей, да гэтага нам яшчэ давядзецца вярнуцца. А пакуль што зазначу, што мы зробім неабачлівую абмылу, пасьпяшаўшыся заявіць, наўсьлед за А. Яскевічам, быццам «рэчытатыўны» рытм уласьцівы толькі «сылябічным» вершам. Падобны рытм назіраецца і ў г. зв. сыляба-тоніцы. У якасьці прыкладу разгледзім колькі строфаў зь вершу А. Пашкевічанкі «Мора», які традыцыйна ўважаецца за чатырохступовы харэй:

Не такое цяпер мора,
Не такі у хвалях шум:
Цяпер бурна, страшна мора!
Хваля поўна дзікіх дум.

Мора вуглем цяпер стала,
Мора з дна цяпер гарыць,
Мора скалы пазрывала,
Мора хоча горы змыць.

Мора злуе, крэпнуць хвалі,
Зь дзікім шумам бераг рвуць;
Гром грыміць у сіняй далі,
З мора брызгі ў неба б'юць.

Месцам хваля стогнам рыкне,
Месцам плач сарвецца з губ,
Месцам бераг болем ікне,
Гром грыміць у тысяч труб.

Пачнем чытаць верш, пасьлядоўна скандуючы ўсе харэевыя ступы – і ўжо ў першай страфе меціме ці то мэтрычны збой:
Н**е** так**о**е цяп**е**р м**о**ра,
ці парушэньне націску:
Н**е** так**о**е ц**я**пер м**о**ра...
Абодва выпадкі непажаданыя. Аднак пры звычайным чытаньні таго збою не адчуваецца. Прынамсі, гэта нельга назваць збоем, бо *рэальна замест чатырох звыклых харэевых ступ у кожным радку гучаць толькі два моцныя акцэнты*:

Не так**о**е цяпер м**о**ра,
Не так**і** у хвалях шум:
Цяпер б**у**рна, страшна м**о**ра!
Хваля п**о**ўна дзікіх д**у**м.

З гледзішча антычнае мэтрыкі перад намі не харэй, а *пэон трэці* (ооо**о**). Традыцыйная сыляба-танічная тэорыя, якая абмяжоўваецца пяццю асноўнымі ступамі, зь лёгкае рукі Б. Тамашэўскага такое чаргаваньне моцных і слабых націскаў (Оо**О**оОо**О**о) называе *альтэрнаваным рытмам*. А паводле тактамэтрыі А. Квяткоўскага мы маем звычайны прыклад *чатырохдольніка трэцяга* (ооо**о**). Розныя тэарэтычныя матрыцы тут нібы накладваюцца адна на другую, больш ці менш удала апісваючы той самы радок. Такое *накладваньне матрыцаў* мы будзем тарнаваць і ў далейшых апісаньнях. Заразом існаваньне харэю ў беларускай мове адным гэтым прыкладам (а прыкладаў такіх нямала) ставіцца пад пытаньне.

Варта таксама зьвярнуць увагу, як Пашкевічанка ўдала тарнуе існы «рытмавы рэсурс». Невыпадкова малазначальнае слова *цяпер*, ці яно ўжываецца ў сярэдзіне радка, ці ў пачатку, кожны раз стаіць у *слабой* – ненацісьненай – пазыцыі. А ўсе значальныя словы, наадварот, супадаюць з рытмавымі націскамі. Зладжанае чаргаваньне моцных і слабых пазыцыяў паказвае высокае майстэрства паэткі. У першай страфе *мора* як новы вобраз выступае патасам, які адумысна дэманструецца чытачу. У другой – яно становіцца этасам і, ужытае як анафара, зводзіцца да ролі чыста фармальнае, а патасам выступаюць яго дзеяньні і праявы: *вуглем стала, з дна гарыць, хоча горы змыць*. У трэцяй страфе патасам становяцца іншыя вобразы – і гэтак праз увесь верш.

Далей у вершы збоі харэю назіраюцца ў словах *сьвяты, расьце, растуць, такім,* кожнае зь якіх стаіць у слабым месцы рытмавае амплітуды. Такім парадкам, харэй парушаецца даволі часта, затое пэон трэці захоўваецца праз увесь верш. У чатырохступовым харэі такая зьява наагул стала амаль што нормаю – і на тое ёсьць свае гістарычныя ды празадыйныя прычыны. Мерную амплітуду пэонаў ускладняе (але не парушае) на карысьць харэю толькі эпітэт *страшна* ў трэцім радку. Зрэшты, яго вылучанасьць зьвязаная зь пералічальнаю інтанацыяй і мае чыста сэмантычны характар, незалежны ад вершу. Аб ролі інтанацыйных націскаў, іх дачыненьнях з

рытмам трэба гаварыць асобна.
Ілюзорнасьць існаваньня дзьвюхступовых памераў пацьвярджаецца нават тады, калі яны прызнаюцца ў тэорыі. Прыкладам, «Энцыкляпэдычны слоўнік маладога літаратуразнаўцы» піша: «Ступовы харэй наагул удае на два розныя памеры, бо радкі з цэзураю і без цэзуры надта не падобныя адзін да аднаго. Параўнайма: *Ах, метель такая, просто чёрт возми* (С. А. Ясенін) і *И за это меня матушка бранила* (А. А. Дэльвіг)». Можна падабраць аналягічныя беларускія прыклады: *Хай старонку родну сьнегам занясе* (Г. Леўчык); *Хай ніколі не забуду цябе я* (М. Багдановіч). Слоўнік памыляецца толькі ў адным: уплыў цэзуры тут чыста ўскосны. Рознасьць прыкладаў замыкаецца ў тым, што перад намі запраўды неаднолькавыя рытмавыя структуры: *пэон першы* з цэзураю (**о**ооо**о**о//**о**ооо**о**) і *пэон трэці* без цэзуры (оо**о**ооо**о**ооо**о**о). Як яны ўзьнікаюць у вершы – варта разгледзець падрабязьней.
Зрэшты, разглядаць мы мяркуем ня тыя ці іншыя ступы, а рэальныя вершы. Ступы, і «слушныя», і «няслушныя», наагул варта адпрэчыць, як гэта зрабіў А. Квяткоўскі. Але мы іх пакінем, хаця б дзеля таго, каб не ўтвараць новых тэрмінаў-дублетаў. Надалей тарнаваньне антычных паняткаў ня варта ўспрымаць «усур'ёз». Яны маюць згад толькі пры *статычным* апісаньні рытмавых фігур як элемэнты свайго роду *арнамэнту* вырваных з кантэксту адцінкаў. Запраўдным жа спакмянём вывучэньня рытмалёгіі ёсьць вершавы радок, дынаміка націскаў у якім ня мае нічога супольнага ні зь якім мэтрам. Менавіта таму паасобныя апісаньні тут даваліся і пры патрэбе будуць давацца нібыта адразу ў розных «сыстэмах» і тэорыях, даўнімаючы ў ідэале *мэтатэорыю*.
3. **Дэскрыпцыя сымэтрыі і хаосу.** Найпапулярнейшым памерам беларускае літаратуры яе «арганічнае пары» (XIX – пач. XX ст.) быў чатырохступовы харэй. Побач і ў спалучэньні зь ім шырока ўжываўся харэй трохступовы. Гэтым амаль што абмяжоўваўся мэтрычны рэпэртуар беларускіх паэтаў. Ямбы спатыкаліся вельмі рэдка – пераважна ў носьбітаў расейскае вершавальнае школы. Вышэй мы зьвярталіся да чатырохступовага харэю А. Пашкевічанкі. Чатырохступовы харэй адпавядае сылябічнаму *васьміскладовіку*. Ступень урэгуляванасьці націскаў у васьміскладовіку ледзь не ад

пачатку яго ўзьнікненьня была гэтак высокаю, што мала чым розьнілася ад таго, што мы называем уласна сыляба-тонікаю. Дзеля прыкладу досыць успомніць хрэстаматыйны верш паэта XVII стагодзьдзя Я. Пашкевіча:

Польска квітнець лаціною,
Літва квітнець русчызною.
Бяз той ў Польсцы не прабудзеш,
Бязь сей ў Літве блазнам будзеш.

Каб паказаць, як паводзяць сябе рытмавыя структуры васьміскладовіка харэевае кадэнцыі, возьмем да разгляду ўрывак з драмы Г. Марцінкевіча «Адвячорак». Усе радкі тут маюць розную ступень урэгуляванасьці, што можна пазначыць графічна. Рэальныя моцныя націскі будзем вылучаць **тоўстымі** літарамі. Уяўныя націскі ці, дакладней, рытмавыя лякуны мажлівых пэонаў – *курсівам*. А інвэрсію ў харэі – р а д з ь в о ю. Такім спосабам, нават ня ўчытваючыся ў верш, можна бачыць: усюды, дзе ёсьць курсіў – парушаны пэон, дзе ёсьць радзьва – парушаны харэй, а дзе няма ані курсіву, ані радзьвы – маем перад сабою структуру ідэальнага рытму. Мушу зацеміць: тарнуючы паняткі *пэону трэцяга, харэю* і пад., я ўжываю іх перш-наперш у дачыненьні да радка як цэлага, і толькі зрэдку, іранічна, – у дачыненьні да фрагмэнтаў. Так, фрагмэнт можа ўтрымваць лякальнае парушэньне памеру, але датычыць яно амплітуды радка ў цэлым.

Эй, брат Гр**ы**шка, п а к і н ь в**ы**ці, (1)
Шт**о** ж, што ц*е*рабнулі хв**о**ст? (2)
Па паўс**о**тні можна ж**ы**ці, (3)
Не п а в *я* з **у** ц ь на паг**о**ст. (4)
Вот я н*а* п р **о** ш л а й нядз**е**лі (5)
На т о р г з др**о**ўцамі шлап**у**, (6)
Н я ч **ы** с ь ц *і* к і падглядз**е**лі (7)
І ус**ы**палі кап**у**. (8)

Добрымі з гледзішча ідэальнага рытму пэонавае кадэнцыі могуць лічыцца 1-ы, 3-і, 6-ы і 8-ы радкі. Адначасна радкі 3-і і 8-ы слушна вытрымліваюць харэевую кадэнцыю, што дазваляе ў традыцыйнай мэтрыцы гаварыць пра альтэрнаваны рытм, а ў тактамэтрыі – пра чатырохдольнік трэці. Затое ў 1-м ды 6-м радкох словы *пакінь, на торг* парушаюць пасьлядоўнасьць харэю, утвараючы *рытмавую інвэрсію*, або «ямб», як сказаў бы Трэдзіякоўскі. 2-і радок, наадварот, слушны з гледзішча харэю,

але інвэрсіяваны з гледзішча пэону трэцяга. І, нарэшце, 4, 5 і 7-ы радкі супярэчаць як харэям, так і пэонам. (Заўважу, зь іх 4-ы і 5-ы, чыста разумова, можна ператлумачыць як дактылі, але на слых у кантэксьце ўрыўку гэта не адчуваецца.)
Прачытаўшы ўрывак вольна, ненапружана, нельга не заўважыць, што сама сьпеўна гучаць радкі пэонавае кадэнцыі. Нават у 1-м і 6-м рытмавая інвэрсія (з гледзішча харэю) не ўспрымаецца як збой рытму, бо словы *пакінь, на торг* стаяць у слабой, ненацісьненай (з гледзішча пэону) пазыцыі. Затое 2-і, харэевы радок, дзе парушаны пэон, паводле сьпеўнасьці моцна саступае 1-му і 6-му. А поўнае разбурэньне сьпеўнасьці назіраецца ў 4, 5 і 7-м, дзе не вытрымваюцца ані харэі, ані пэоны. Асабліва дэструкцыйна ўспрымаюцца псэўдадактылі (4-ы і 5-ы). У выніку мы бачым: пэон – «голас», а харэй – толькі «падгалосак». Далей, разьвіваючы антычную мэтафару рытму як плыні, моцныя ікты назавем – *валы*, слабыя – *усплёскі*, рэшту складоў – *роўні*. З гледзішча радка ці ўрыўку яны суіснуюць як інтэгранты нейкага большага цэлага. Іншыя рытмавыя структуры не працуюць на цэлае. На гэтым этапе вывучэньня для нас найважней тое, што *рытміка пэонаў дамінуе над рытмікаю харэяў*.
Ведама, такая колькасьць адхіленьняў ад мернага рытму, якую мы толькі што разгледзелі, ня так ужо і часта сустракаецца. Васьміскладовікі нашых песьняроў ад самага пачатку імкнуліся да інварыянтнае структуры, дзе рэй вялі пэоны. Хоць тут катэгарычна нельга пагадзіцца з І. Ралько, быццам беларуская «сылябіка» «эвалюцыянавала» ў бок «сыляба-тонікі». Часамі верш XVII ст. быў куды ўрэгуляванейшы, чым верш XIX ст., але як нутраную тэндэнцыю зладжаньне рытму адмовіць нельга. Абмінаючы чыста схалястычнае пытаньне, да якое «сыстэмы» адносіць тыя ці іншыя вершы, зазначу, што ў беларускай паэзіі спаквaля ўсталяваліся не дактрынальныя, а ўзуальныя абсягі сыстэмнае анамаліі, якая дапушчала неабмежаваную інвэрсію харэю, але практычна не дапушчала інвэрсіі пэону, прыкладам:
Б р у к а р м**о**латам стал**ё**вым
Звоніць, б’**е** па камян**ё**х:
Хоча шл**я**х праклaсьці н**о**вы,
Каб ня р**а**ніць л ю д з я м н**о**г.
Пятрусь Граніт
Інвэрсію ж пэону трэцяга мы сустракаем хіба толькі як рэдкае

ўкрапленьне ў добра зладжаны мэханізм рытмавага стэрэатыпу. Яе можна было б наагул сьпісаць на рахунак «перажыткаў» ці паэтычных «недасканаласьцяў». Аднак у запраўдных майстроў інвэрсіі нават гэтая дэструкцыйная анамалія праяўляецца як кампэнсатарная, працуючы на агульнае эстэтычнае заданьне вершу, інтанацыйна вылучаючы патрэбнае слова ці радок:

Трэ’ зьліз**а**ць усіх мін**і**страў,
Бюракр**а**таў, антыхр**ы**стаў.
Чую *я* ш ч **э** голас зь н**е**ба,
Што цар**а** павесіць тр**э**ба!

Алаіза Пашкевічанка

Апрычоную мадуляцыю рытму дае замена простых кляўзулаў на сьлізкія. На слых не адразу й пазнаецца тоеснасьць інварыянту:

Дзе ты, кр**а**ска, зорка Б**о**жая?
Між нар**о**ду ты сьвяц**і**лася;
У глух**і**м кутку, між хв**о**ямі,
Па жыцьц**і** ты ўсё нудз**і**лася.

Якуб Колас

Другім беларускім клясычным памерам «арганічнае пары» быў трохступовы харэй. Праўда, ступень інвэрсіяванасьці таго была так высокая, што можна ўсур’ёз сумнявацца: з харэем мы маем справу ці з *шасьціскладовікам*? Як працуе гэты памер, пакажам на прыкладах, адумысна з аднаго аўтара. Найнатуральней у г. зв. «трохступовым харэі» гучаць радкі з будоваю пэону першага, прыкладам:

В**і**храм закруц**і**ла,
Х**о**ладам дан**я**ла,
Сьн**е**гам запыл**і**ла,
Г**у**рбы панагн**а**ла.

Карусь Каганец

Іх мы і возьмем у якасьці нормы. Наступнае чатырохрадкоўе мае два радкі слушныя (2-і, 3-і) і два інвэрсіяваныя (1-ы, 4-ы):

А м**а**ці прадучы (1)
П**е**сьню засьпяв**а**е, (2)
Н**і**тачку вяд**у**чы, (3)
Д*ы* ў п**е**ч пагляд**а**е. (4)

Здавалася б, іх яскравая інвэрсіяванасьць магла б «згладзіцца» за кошт пераносу пульсантаў на службовыя словы (пазначаныя

курсівам) ды ўзьнікненьня «спандэю». Але гэта адбываецца толькі часткова. І зь дзьвюх прычынаў: раз – бо інвэрсія ня моцна шкодзіць рытму, а два – бо словы *маці* і *печ* стаяць пад лягічным націскам. Таксама можна заўважыць, што інвэрсіяваныя радкі, чыста схематычна, прачытваюцца як дзьвюхступовыя амфібрахі. І ўсё ж, хоць з гэтага «квазіамфібраху» пачынаецца страфа – у цэлым верш мае «настойлівую» тэндэнцыю да пэону першага. (Апошняя загадка наагул вымагае асобнага зьясьненьня.)

Возьмем іншы прыклад, дзе 1-ы і 2-і радкі інвэрсіяваныя, як з гледзішча харэю, так з гледзішча пэону першага, 3-і інвэрсіяваны з гледзішча пэону, але слушны з гледзішча харэю, а 4-ы – цалком слушны:

Б*а*л**і**ць маё с**э**рца, (1)
Д*у*ш**а** уныв**а**е, (2)
Х*о*ч з друг**о**й жан**а**ты, (3)
Т**о**й не забыв**а**е... (4)

3-і радок, дзе вытрымваецца харэй, але мацнейшы адступ ад пэону, гучыць як больш інвэрсіяваны, чым 1-ы і 2-і, дзе ёсьць падвоеная інвэрсія, але меншы адступ ад пэону. Гэта гаворыць пра тое, што ў шасьціскладовіку, гэтаксама як і ў васьміскладовіку, – пэон дамінуе. Але супраць васьміскладовіка тут харэй наагул мала што значыць, бо адступы ад яго зусім ня шкодзяць сьпеўнасьці.

Адначасна, пры пільным чытаньні, заўважаецца, што радкі шасьціскладовіка, дзе слушны харэй, але інвэрсіяваны пэон першы, імкнуцца да аднаўленьня пэону і «перацягваюць» рытмавы націск на першы склад, утвараючы нейкі «дадатковы акцэнт». Гэтакім спосабам доўгаму слову можа надавацца пабочны націск (1-ы радок):

Ж*а*йвар**о**нча м**а**лы, (1)
Пт**у**шачка ты г**о**жа... (2)

Або службовыя словы могуць рабіцца «мацней націсьненымі» (1-ы, 2-і радкі):

Б*о* я т**а**к мяркк**у**ю, (1)
Шт*о* для шч**а**сьця мала... (2)

Пры скандаваньні імаверныя націскі «ўяўнага» пэону ў шасьціскладовіку харэевай кадэнцыі з пульсантаю на другім ікце надаюць вершу надзвычай энэргічнае, «выбуховае» гучаньне. А пры скандаваньні радкоў амфібрахавай кадэнцыі

«перацягваньня» націску практычна не адчуваецца, бо «ўяўны» ікт пэону першага стаіць змычком з рэальным іктам амфібраху, што надае радку зьменлівае, «пералівістае» гучаньне. Фактычна мы маем дзьве праявы: дыясталу і інвэрсію. Надалей інвэрсію пэону першага ў шасьціскладовіку з націскам на другім складзе (г. зн. амфібрахавай кадэнцыі) вобразна называцьмем *пераліў*, а дыясталу на першым складзе (харэевай кадэнцыі) – *выбух*. З грунту ж, калі шукаць больш уніфікаваных тэрмінаў, дык пераліў і выбух – гэта *рэгрэсійная інвэрсія пульсанты*, адпаведна, *першае* і *другое ступені*, ці, яшчэ прасьцей, – *першая* і *другая рэгрэсія пульсанты*.

Цікава, што пры пераліве сэмантычны слоўны націск, які дае пульсанту, і рытмавы, які ўтварае *другую канстанту*, задаючы тым самым *канстантавы рытм*, могуць падаць нават на адну лексэму, як у цытаваным вышэй вершы – на словы *бал**і**ць, душ**а***. Яны існуюць нібы ў розных вымярэньнях, адначасна і незалежна адзін ад аднаго. Гэта, на першы пагляд, не паддаецца рацыянальнаму зьясьненьню. Менавіта ў такой *разнамежневай біакцэнтнасьці* і замыкаецца ўся цяжкасьць бытаваньня гэтак званага сылябічнага вершу. Пэўна што на месцы меркаваных моцных іктаў за кошт інтанацыі можа ўзьнікаць (або даўнімацца) рытмавы націск *іншае прыроды*, які зусім не ўступае ў супярэчнасьць з *слоўным моцным*, г. зн. дынамічным, эксьпіраторным. Ці можа такое быць?

Традыцыйная тэорыя вершу палягае на старых «школьных» уяўленьнях аб прыродзе беларускага (адпаведна, украінскага, расейскага) націску як дынамічнага, заснаванага толькі на моцы. Аднак лінгвісты даўно ўжо прыйшлі да высновы, што ўсе славянскія націскі ў той ці іншай меры *камбінаваныя* і маюць у сабе розныя адзнакі, якія могуць і супадаць, і разыходзіцца. Прыкладам, у сэрбскай і харвацкай мовах праяўляюцца і моц, і тон, але пераважае апошняе, у чэскай мове назіраюцца моцныя (на першым складзе) і доўгія націскі, якія заразом не супадаюць. Відаць, і ў вершы адбываюцца складаныя, пакуль што мала вывучаныя фанэтычныя працэсы, у тым ліку – зьява, ведамая як *інтанацыйнае падаўжэньне* ў пэўных фразавых пазыцыях.

Услухаемся ў словазлучэньні: *усе чыста*; *але будзе добра*. Калі разглядаць іх па словах, дык тут мусілі б назірацца зьбегі націскаў, называныя ў вершазнаўстве спандэямі. Аднак

беларуская мова ўнікае падобных зьяў. У фразе слаба націсьненыя словы *усе, але* нібыта пераносяць акцэнты з другога складу на першы: ***у**се, **а**ле.* Думаю, што насамрэч націскі тут ня проста пераносяцца – склады *акцэнтуюцца іншым спосабам*. Менавіта гэты рэсурс скарыстоўвае беларуская «сылябіка», дзе цесната паэтычнага шэрагу прымушае моўныя патэнцыі працаваць інтэнсіўней. Скажам, пры пераліве адбываецца *расслаеньне* націску, і лёгкая даўжыня з адначасным павышэньнем тону менавіта «пераліваецца» ў суседні склад, што стварае *храматычную* канстанту змычком з *эксьпіраторнаю* пульсантаю. А пры выбуху пульсанта стаіць на аддаленьні ад моцнага месца інварыянту, таму ненацісьнены склад вымаўляецца мацней і, мажліва, крыху даўжэй. Пры супадзеньні ж пульсанты з інварыянтам рытмавы націск захоўвае ўсе звычайныя парамэтры.

Праблема вывучэньня рытму заўжды абцяжарваецца тым, што фанэтычныя акцэнты цесна пераплятаюцца з сэмантычнымі. Вышэй зазначалася, дзей месца пульсанты залежыць ад значаньня цэлага радка. У якасьці гэткае сэмантычнае інвэрсіі можна ўзяць наступны прыклад:

В**а**м д**о**бра здар**о**ўя, (1)

Ст**а**тку памнажэньне… (2)

Тут пульсанта падае на слова *добра*, бо значальнае слова *вам*, хоць і стаіць у моцнай, пэонавай пазыцыі, аднак не нясе сэмантычнае нагрузкі, утвараючы рытмавую лякуну.

Калі-нікалі адрозьніць сэмантычную інвэрсію ад інвэрсіі рытмавае амаль што немажліва. Зрухі ў разуменьні вершу выклікаюць адпаведнае віхтаньне пульсанты, прыкладам:

Р**о**дны край вітае, (1)

Н*а* ўсярэдзьдзі с**е**ўшы. (2)

Лягічны націск падае на слова *родны*, таму рытм 1-га радка неінвэрсіяваны. А калі націск пераносіцца на слова *край* – рытм становіцца інвэрсіяваным:

Родны кр**а**й вітае, (1)

Н*а* ўсярэдзьдзі с**е**ўшы. (2)

Абстрагаваўшыся ад вершавое мовы, варта зазначыць, што ў словазлучэньні *родны край* пад лягічным націскам стаіць апошняе слова. Таму ў першай адмене аказанага прыкладу сэнс аддаецца ў ахвяру рытму, а ў другой – рытм у ахвяру сэнсу. Гэтыя радкі можна перарабіць:

Кр**а**й р о д н ы вітае, (1)
Се**ў**шы на ўсярэдзьдзі. (2)
Цяпер зьяўляецца іншая праблема: гук *[о]*, які ў беларускай мове ніколі не бывае не пад націскам, апынаецца ў слабым месцы рытмавае амплітуды.
Пераробім радок у некалькі спосабаў:
Кр**а**й л ю б ы вітае, (1)
Се**ў**шы на ўсярэдзьдзі. (2)

Кр**а**й сьвяты вітае, (1)
Се**ў**шы на ўсярэдзьдзі. (2)

Кр**а**йняга вітае, (1)
Се**ў**шы на ўсярэдзьдзі. (2)
Мы маем тры прыклады слушнага пэону. У першым зь іх харэй інвэрсіяваны (зь «ямбам»), у другім – добры, а ў трэцім – добры, але зь «пірыхам». Істотнае розьніцы ў гучаньні радкоў не заўважаецца. І нарэшце можна пераканацца, што ў шасьціскладовіку дамінуе пэон, харэй жа – рэч другарадная, але не пустая (пра што таксама трэба гаварыць асобна).
Заразом зазначым: свабода віхтаньня пульсанты ў шасьціскладовіку большая супраць васьміскладовіка, бо абымае як слабыя, так і моцныя ікты, што скрайне непажадана ў апошнім, а перамяшчэньне пульсанты ў шасьціскладовіку часьцей залежыць ад сэмантыкі. Дарэчы, шасьціскладовік не зусім самастойны памер. Узьнік ён, пэўна што, праз распад цэзураванага дванаццаціскладовіка, які мае быць разгледжаны ніжэй.
А пад канец зьвернем увагу на «другі бок мэдаля», на тое, як кляўзулы адцяняюць гучаньне вершу. Спачатку разгледзім наступныя радкі:
Гн**е** зь б е р а г о ў гн**е**ў – (1)
і ў завір**у**се, – (2)
р *а* д з **і** ў новы сьп**е**ў (3)
н**о**вай Белар**у**сі. (4)
Андрэй Александровіч
Верш Александровіча супраць Каганцовага напісаны ў часы апатэозу тонікі, але ў аснове яго ляжыць тая самая, знаёмая нам схема, амаль што без адхіленьняў: 3-і радок нават

утрымвае традыцыйную для сылябікі першую рэгрэсію пульсанты, а ў 2-м – *ў* нескладовае хаця-нехаця мусім чытаць як *[у]* складовае. Істотна варыюе рытм зьбег націскаў *берагоў гнеў* – зрэшты, і тут няма нічога новага. Але гэты верш куды энэргічнейшы за Каганцовыя. Бо тупыя кляўзулы няцотных радкоў, якія разам з простымі кляўзуламі ўтвараюць адваротны альтэрнанс, надаюць рытмаваму інварыянту адценьне рэзкасьці, хуткасьці.

Вельмі цяжка ў вершы разгляданага тыпу спаткаць сьлізкія кляўзулы, якія, наадварот, мусілі б рабіць яго «плаўным» ды запаволеным. Такім рэдкім узорам аказваецца стылізаваны пад фальклёр урывак з паэмы расейскага аўтара, дзе менш за ўсё можна было чакаць падабенства з сылябікаю:

Н*а* мо**е**й на р**о**дине (1)
Не | вс**е** дороги пр**о**йдены. (2)
Вс**я** она ос**о**кою (3)
З*а*росл**а** выс**о**кою, (4)
В**е**никами б**а**нными, (5)
Хр*е*бт**а**ми каб**а**ньими, (6)
М*е*дв**е**жьими шк**у**рами, (7)
Л*о*хм**а**тыми, б**у**рыми… (8)
Павал Васільеў

У расейскай паэзіі пануе дактрына харэю і першая рэгрэсія пульсанты нібыта не практыкуецца, аднак… хіба ж перад намі ня той самы інвэрсіяваны першы пэон, які мы назіралі ў Каганца і Александровіча? Праўда, тут ён моцна «завуаляваны» пад «танічны» верш. Сьлізкія кляўзулы ды парныя рымы надаюць тэксту адценьне манатоннае сказавасьці. Апрача таго, у анакрузе 2-га радка ёсьць анамалія – адзін (адзінюткі!) лішні склад, які крыху заблытвае ўспрыманьніка. Але з грунту ўсё гэта нічога не мяняе: нутраная будова вершу застаецца пэонавай, блізкай да канону славянскага сылябічнага шасьціскладовіка.

Калі ж мы той «лішні» склад уявім ужо на пачатку кожнага радка, дык замест анамаліі атрымаем новую інварыянтную норму: *пэон другі*, які традыцыйна зьясьняецца як *трохступовы ямб*. У беларускай паэзіі гэты памер зьявіўся запозна і доўгі час амаль што не практыкаваўся. Тым часам у расейскай літаратуры трохступовы ямб тарнуецца яшчэ ад пары клясыцызму і ведамы як памер «анакрэантычны», далей –

проста *анакрэонтык*. Такі назоў варта зацьвердзіць як знак жанравага вытоку формы, хоць гэта не зусім адпавядае першаму беларускаму пэону другому, які найчасьцей перадаваў элегічныя настроі. Аднак менавіта расейская сылябатоніка выракавала кшталт анакрэонтыка, і адзінаю сыстэмнаю анамаліяй, якая ў ім разьвілася, быў выбух (гл. 4-ы радок):

Між р**а**лаў абгал**е**лых (1)
Дакучны, прыкры ш**у**м (2)
Збудж**а**е рой збал**е**лых (3)
І н*е*адчэпных д**у**м. (4)

Альбэрт Паўловіч

У беларускай паэзіі апошняе стагодзьдзе верх брала расейская традыцыя. І пакуль пад яе ўплывам шасьціскладовік эвалюцыянаваў, «згладжваючыся» да «харэю» ці, дакладней, чыстага пэону першага – анакрэонтык за доўгія гады бытаваньня мала зьмяніўся, бо ня меў на тое патрэбы. Хіба толькі рымы ўскладніліся, што паказвае прыклад з сучаснага, бадай, сама «анакрэантычнага» беларускага паэта:

І зм**о**ўкнуў голас пт**у**шчын. (1)
На д**о**ле ліст зав**я**ў. (2)
Вих**о**р у шале тр**у**шчыў, (3)
Крущ**ы**ў і завыв**а**ў. (4)

Юрка Голуб

Найменьне харэю перакладаецца з элінскае мовы як «скокавы». Вясёлую, сьпеўную прыроду ён мае і ў тутэйшай традыцыі. Менавіта чатырохступовым харэем (часта ў спалучэньні з трохступовым) укладзеныя ці ня ўсе нашыя прыпеўкі – вось дзе тутэйшая анакрэонтыка! Сёньня цяжка меркаваць пра адметнасьці элінскае мовы, але сьпеўнасьць беларускага «харэю» ўяўная. Дасягаецца яна толькі там, дзе вытрымваюцца пэоны ці, інакш кажучы, альтэрнаваны рытм. Верш з вытрыманым «харэем» і нявытрыманым пэонам – суцэльная какафонія. Праўда, такіх узораў вельмі мала, бо канон чатырохступовага харэю сягае сылябічнага васьміскладовіка, дзе альтэрнаваны рытм стаў ужо нормаю. Нават расейская літаратура XVIII стагодзьдзя, выхаваная М. Ламаносавым, якая не падазравала пра «альтэрнаваны рытм», ня здолела працівіцца магутнай сылябічнай традыцыі, яе *рытмавым стэрэатыпам*.

Ямб здаўна ведамы як памер «гутарковы». Але на прыкладах

анакрэонтыка мы мелі змогу ўпэўніцца і ў адваротным. Гутарковасьць датычыць перш-наперш «чатырохступовага ямбу». І, зноў жа, прычына гутарковасьці ня ў ім самым, а ў традыцыі, якая ўплывала на яго прыроду. Чатырохступовы ямб фармальна адпавядае сылябічнаму дзевяціскладовіку. Праўда, апошні памер у сылябіцы практычна не існаваў, не пашыраныя яго адпаведнікі і ў фальклёры. У выніку – да зьяўленьня кніжнага тэарэтычнага ямбу ня вырабілася яго жывая гутарковая інэрцыя: не было ў рытмавай памяці паэтаў такіх вершаў. А школа Ламаносава, якая шырыла ямб, не магла зразумець, выходзячы з сваіх пастулятаў, што дзеля мернасьці трэба ставіць «пірыхі» ў строга азначаныя «месцы», каб такім ходам задавалася альтэрнацыя і «чатырохступовы ямб» абяртаўся пэонам чацьвёртым.

Спаквaля прырода брала сваё, і, як заўважыў яшчэ Андрэй Белы, на пачатак XIX ст. «альтэрнаваны» чатырохступовы ямб (пэон чацьвёрты) такі ўсталяваўся ў расейскай літаратуры. Аднак аж да гэтае пары ў расейскай паэзіі, а празь яе – і ў беларускай традыцыя альтэрнаванага ямбу ня надта трывалая. Адсюль – славутая ямбавая «гутарковасьць». Ведама, такая характэрная ўласьцівасьць гучаньня ня зводзіцца да браку альтэрнацыі. Адумысны акустычны эфэкт стварае і задоўгая трохскладовая анакруза пэону чацьвёртага, але гэта, як можна даўнімаць, фактар менш уплывовы, дый яго яшчэ рана кранаць. Перш чым брацца за «тыповыя» і пакуль што неразгаданыя прыклады ямбу, возьмем «нетыповы» выпадак, сугучны разгледжаным вышэй узорам «харэю». Песьняры, мала зьвязаныя з кніжнаю расейскаю культурай, ужывалі «ямб» «сылябічнага гатунку», альтэрнаваны і месцамі – інвэрсіяваны, прыкладам:

Як ён нажн**е** багата хл**е**ба (1)
Ды п а ч н е б**у**льбачку кап**а**ць, (2)
Усё ач**ы**сьціць, як патр**э**ба – (3)
Н і в у, гар**о**д і сенаж**а**ць. (4)

Стары Ўлас

Тут 2-і і 4-ы радкі маюць пераліў, яго мы ўжо спатыкалі ў «харэі». Як і «харэй», гэты «скандальны» інвэрсіяваны «ямб» гучыць лёгка ды нязмушана, быццам тых адхіленьняў няма ані, хоць Ламаносаў і наступнікі такія зьявы строга забаранялі. За доўгія гады практыкі забарона ня толькі ня зьнікла, але была

ўзьведзеная ў ранг правіла, ведамага сёньня як «недапушчальнасьць пераакцэнтуацыі», г. зн. на «слабое месца» «ямбу» не павінен падаць націск неаднаскладовага слова. Аднаскладовыя ж словы могуць стаяць як на моцных, так і на слабых месцах, бо іх ужываньне не парушае парадку «ямбу». Р. Якабсон, які ўпершыню сфармуляваў правіла забароны пераакцэнтуацыі, нават паспрабаваў узьвесьці тое ў ранг фаналягічнага закону. І вось, малапісьменны беларускі паэт-селянін адным росчыркам пяра перакрэсьлівае высокаінтэлектуальную гарадзьбу сусьветнае славутасьці. Інвэрсія ў прыточаных вершах настолькі натуральная, што яе нельга назваць ні дэструкцыйнаю, ні нават сыстэмнаю анамаліяй. Проста ў структуры «чатырохступовага ямбу», як і ў «харэі», дамінуюць акцэнты, што ствараюць пэонавую кадэнцыю, а дакладней – *пэон чацьвёрты*. Разумова выснаваныя рамы ямба-харэевае канвэнцыі выяўляюцца завузкімі для існае прыроды рытму. І каб толькі гэта – дык тае бяды! Але штучная дактрына двухскладовых памераў абы час выклікае запраўдную дэструкцыю рытмавых інварыянтаў. Дэструкцыйныя моманты дае якраз «тыповы» ямб. Вось радкі, што належаць сучаснай паэтцы, добра знаёмай з агульнапрынятымі, «школьнымі» правіламі вершаваньня:

Закалых**а**й мяне, уб**о**гую,
Хусьц**і**нкай / *а*хіні мур**о**жнаю, –
І ўзыдзе г**а**й па-над дар**о**гаю,
І ж**ы**там / з*а*рунеюць п**о**жні.

Анжаліна Дабравольская

Тут мы не сустрэнем *інвэрсіі*, як сказаў бы А. Квяткоўскі, ці «пераакцэнтуацыі», як вучыў Р. Якабсон. Аднак ёсьць іншая, зусім новая анамалія. У 2-м і 4-м радкох рытм запавольваецца і нібыта ламаецца, што паказана ў нас знакам слабое цэзуры (/) . Складваецца такое ўражаньне, нібыта словаформы *хусьцінкай* і *жытам* інтанацыйна падкрэсьліваюцца, вылучаюцца. У нейкай ступені гэта так і ёсьць. Але вылучэньне мае тут не інтанацыйную, а рытмавую прыроду. Інакш кажучы, чыста інтанацыйнае вылучэньне чытаньнік можа пацьвердзіць, а можа праігнараваць. Тут жа іначай як з вылучэньнем цытаваныя радкі прачытаць нельга, і невыпадкова. «Рытм, – прыйшла да высновы Н. Чарамісіна, – кіруе пры спараджэньні вуснага і пісьмовага маўленьня інтанацыйнаю структурай». Затое мы

можам зьмяніць парадак слоў і аднавіць знаёмы нам альтэрнаваны рытм, дзе жаднага гвалтоўнага вылучэньня слоў ужо ня будзе:

І ўзыдзе г**а**й па-над дар**о**гаю,
І зарун**е**юць жытам п**о**жні.

Чаму так адбываецца? Рэч у тым, што ў 2-м і 4-м радкох Анжаліны Дабравольскай назіраецца аднолькавая зьява: тут бракуе націскаў на моцных месцах пэону чацьвёртага, але затое ёсьць націск на месцы першае ступы «ямбу», якая заўжды слабая і досыць часта стаіць не пад націскам. У выніку радок разломваецца на два паўрадкі, узьнікае нешта накшталт «нерэгулярнае цэзуры». Далей гэтую зьяву, каб ня блытаць яе з цэзураю-мэдыянаю, будзем пазначаць як *разлом*. Менавіта разлом выклікае запаволеньне рытму, якое нельга не заўважыць на слых. Разлом заўжды прыпадае на словападзел. Дзьве няроўныя часткі радка ператвараюцца ў самастойныя адзінкі, кожная з якіх мае сваю канстанту. Традыцыйнае вершазнаўства разлом апісвае аблудна як «пропуск» акцэнту, а А. Кваткоўскі сьведама ігнаруе.

І вось тут пачынаецца найскладанейшы момант ямба-харэізму, на якім спатыкнуліся бадай што ўсе бытныя тэорыі. І тыя, якія пацьвярджалі гэтую дактрыну, і тыя, якія яе аспрэчвалі. Настала пара, калі мы мусім адмовіцца ад ямбу і весьці апісаньне толькі выходзячы з пэонавае кадэнцыі. Калі мы не адмовімся, хоць бы чыста эўрыстычна, дык *volens nolens* мусім прыйсьці да такіх недарэчнасьцяў, як «гіпастаза пірыху», або «пропуск акцэнту на моцным месцы». Насамрэч ніякіх ні «гіпастазаў», ні «пропускаў» быць ня можа. Як бы мы ні ўкладалі двухскладовыя памеры, амплітуда пэонаў бярэ верх і вызначае ўвесь рытмавы каркас. Узяўшы ж пэоны за дамінанту – у радкох з разломамі мы ўбачым складанае і неадназначнае парушэньне адзінства рытмавага працэсу. Андрэй Белы ў сваіх праслаўленых дасьледаваньнях рытму (гл.: Белы А. Символизм. М., 1910) трапна, але не зусім дакладна зазначае, што такія радкі «ёсьць *камбінацыяй двух пэонаў* (*пэона другога і пэона чацьвёртага*) (С. 256)».

Заўважаліся такія зьявы даўно. Але тыя самыя ўяўныя ямбы ды харэі вярталі вершазнаўцаў ува ўлоньне догмаў. Прыклад Андрэя Белага ў гэтым сэнсе надта павучальны. У адных

выпадках ён слушна піша, дзей «ямб, з грунту, далёка ня ямб (С. 259)» і «мы мусім учыніць два чыста ўмоўныя, гвалтоўныя галасавыя націскі для таго, каб падкрэсьліць, што гэты радок – ямбавы (С. 256)». У іншых – нібыта тое самае, але больш супярэчліва: «Чыста вытрыманага ямбу не існуе… амаль заўжды мы маем камбінацыю ямбу з пэонам, пірыхам, спандэем і г. д. (С. 256)». У Белага было глыбокае разуменьне гэтае супярэчнасьці, якое дазваляла яму пайсьці слушнаю дарогаю. Ён піша: калі розныя ступы могуць спалучацца адвольна, «тады наагул *сьціраецца граніца паміж паэзіяй і прозаю* (С. 258)». Заставалася выбраць: пэон ці ямб.

Аднак расейскі паэт адразу ж, быццам спалохаўшыся ўласных адкрыццяў, заяўляе: «Дзеля чаго ў вывучэньне мэтрыкі ўводзіць умоўныя формы грэцкага вершаваньня, якія мелі сэнс толькі ў той мове, дзе сама паэзія музычна складалася ў ямб, харэй, амфібрах ды інш. (С. 257)». Менавіта – навошта? І ўсё ж, насуперак сабе самому паэт старанна апісвае «ўмоўную форму» – ямб. «Даводзіць рытмавыя мадуляцыі ямбаў пры дапамозе «пэонаў», – працягвае ён, – значыць толькі загрувашчваць праблемы мэтрыкі тою самаю мэтрыкаю (С. 257)». Гэты довад, ізноў жа, аспрэчваюць словы самога Белага: «Мы яшчэ ня ведаем, што становіць сабою расейскі мэтар і ў чым яго адрозьненьне ад іншых мэтраў (С. 281)». Дык чаму ямб, а не пэон? Пэон, дарэчы, у антычнай мэтрыцы быў менавіта дапаможнаю, «умоўнаю» ступою. Можа, у славянскіх мовах яму наканаваны іншы лёс?

Дэградацыя адкрыццяў Андрэя Белага надта добра відаць на ягоным зьясьненьні разлому. Бездакорны слых паэта падказвае, што радок з чыстым пэонам чацьвёртым гучыць «у тэмпе *allegro*» (С. 263), а радок з «камбінацыяй пэонаў» «гучыць павольней, у тэмпе *andante*» (С. 263). Першую зьяву ён абазначае як «паскарэньне» («паўнаціск»), а другую – як «затрыманьне перад паскарэньнем» (С. 265). Нават не «запаволеньне», а менавіта «затрыманьне перад…». Што гэта, як не ўсьведамленьне разлому? Далей паэт выказваецца таксама слушна, хоць і менш дакладна: «На адных ступах паўнаціск запавольвае агульны плыў вершу, на іншых паскарае (С. 272)». Але паступова ім авалодвае спакуса статыстыкі, аўтар забываецца і на «затрыманьне», і на «запаволеньне». Усе пропускі націскаў Белы называе «паскарэньнямі», маўляў:

«Мажлівая статыстыка… паскарэньняў… іх паданьня на ступы» (С. 286). Урэшце ён даходзіць да поўнага абсурду, калі піша: «Радкі з паскарэньнем на другой ступе» (С. 291) даюць «уражаньне maximum'у запаволенасьці» (С. 294).
Белы так захапіўся, што страціў галоўнае. З тэрміну *паскарэньне* дарэшты выветрыўся той рэальны «імпрэсіяністычны» зьмест, які выклікаў яго да жыцьця. У эпігонаў тэрмін фігуруе ўжо ў «высушаным» выглядзе як канстатацыя пропуску акцэнту. Але навошта такое «паскарэньне», якое нічога не «паскарае»? Заставалася толькі, як выказаўся сам паэт, «сыстэматызаваць графічныя фігуркі» (С. 260). Як бачым, у Белага была геніяльная інтуіцыя рытму, пільны аналіз рытмавых структур, але гранічна ўбогі сынтэз тэорыі вершаваньня. Сымптаматычная такая яго заўвага: «Далейшая праца ў гэтым кірунку залежыць ня так ад абагульненьняў, як ад пільна зьбертага і сыстэматызаванага матэрыялу (С. 330)». «Крыху ўседлівасьці ды любасьць да паэзіі – вось і ўсё, што патрэбна для дасьледніка (С. 395)». А што зьбіраць і што лічыць – няведама! Гэтая легкадумнасьць дорага абышлася вершазнаўству.
Вось жа, выбар на карысьць пэону прымушае нас прызнаць як факт «камбінацыю пэонаў» у радкох з разломамі, а выбар на карысьць ямбу – прызнаць невытлумачальныя *лякуны* на месцы меркаваных іктаў, што, ізноў жа, можна пераказаць як *ямб зь пірыхам*. У чым большае зло? Насуперак устаялай традыцыі меншым злом трэба прызнаць пэоны. Так, ямбы і харэі зручныя для статыстыкі, бо іх вельмі лёгка лічыць. Але ўсплёскі слабых іктаў маюць сэнс толькі як адзінкі, падначаленыя моцным іктам. А выдуманыя «ямбы» і «харэі» ў абход пэонаў – гэта мёртвыя, чыста разумавальныя існасьці. (Трупам заўсёды проста маніпуляваць!) Усякі рытм з цотнаю амплітудаю чыста матэматычна можна зьвесьці да ямбаў і харэяў, але прырода рытму акустычная і ад пераразьлікаў не памяняецца.
Радкі з разломамі запраўды рэзка выбіваюцца з агульнае мернасьці вершу. Найчасьцей яны здараюцца ў «ямбах»:
Ты чуеш рэха бур уд**а**лі (1)
і ц**і**хі / в*е*кавы праклён? (2)
Гані хутч**э**й трывогі хв**а**лі, (3)
удар у с**а**мы большы зв**о**н! (4)
Міхась Машара

І вельмі рэдка бываюць у «харэях»:

Дзе таёмна, сьцішна, змрочна, (1)
Дзе вільготны, мяккі мох, (2)
Дзе ўзіраецца ставочна (3)
Збуджаны / Перапалох. (4)
Уладзімер Жылка
Чаму ж не дапусьціць у 2-м радку Машары ды 4-м Жылкі нейкага адхіленьня, *мадыфікацыі* рытму, раз тыя, пры аднолькавасьці ўсіх вонкавых фармальных паказьнікаў, гучаць інакш супраць астатніх, і адрозьненьне гэтае досыць рэзкае? Тым часам інвэрсіяваныя радкі даюць нам не мадыфікацыю, а толькі *варыяцыю* пэону, якія б месцы ўсплёскаў, і нават валоў, ні кранала інвэрсія. (Дарэчы, статыстыка тут магла б зьявіць вельмі цікавыя вынікі, бо інвэрсіяваных радкоў у беларускай літаратуры нашаніўскае пары было значна больш, чым з разломамі. Але спакваля меншала першых і большала другіх.)
Вось жа, інвэрсія можа стаяць:
– перад канстантаю:
А во’ і зайчык д р ы ж ы ц ь скурай.
На кветках пчолак град пабіў.
Алаіза Пашкевічанка

Страляйце, біце, м а е вочы
Над краем бачаць ўжо зару.
Уладзімер Дубоўка

– на анакрузе:

Д у х і мінуўшчыны куцьцю
На старасьвецкі лад спраўляюць.
Янка Купала

І гэты моцны дух здаровы
Л ю б і ц ь, надзеецца, жыве.
Алесь Гурло

– адразу ў некалькіх сэгмэнтах:

Эх, кіньце кр**ы**ўдамі карм**і**цца, – (1)
К о ж н ы нар**о**д сам с а б е п**а**н; (2)
І белар**у**с м о ж а зьмясьц**і**цца (3)
Ў сям'і нял**і**чанай слав**я**н? (4)
Янка Купала
Асобнае гаворкі вымагае рэгрэсійная інвэрсія пульсанты першае ступені, якая прыпадае на моцнае месца пэону. Куды яе адносіць – да варыяцыяў ці мадыфікацыяў? Раз захоўваецца цэльнасьць радка – значыць, перад намі варыяцыя. З грунту, гэта істотнае і часьцей за ўсё непажаданае адхіленьне. У кантэксьце мастацкага цэлага інвэрсія пэонавага ікту можа разглядацца і як дэструкцыйная, і як кампэнсатарная анамалія – усё залежыць, наколькі ўдала яе паэт прытарнаваў. Аднак варта помніць: зачастае ўжываньне гэтае анамаліі вядзе да поўнае дэструкцыі рытмавага інварыянту.
Разломы клясыфікуюцца ў залежнасьці ад падзелу слоў. Яны могуць даваць спалучэньне:
– двух пэонаў другіх:
Той быў пав**і**нен толькі н**а**м,
Майстр**о**м, / буд*а*ўніком ад р**о**ду…
Цішка Гартны

Прыйдзі, у х**а**ту упушч**у**,
І н**о**ч / мы пр*а*вядзем адн**ы**…
Язэп Пушча

– пэона другога і пэона першага:

Там сьцены м**о**хам парасьл**і**,
Вясё**л**кай / *а*длівалі ш**ы**бы.
Максім Багдановіч

Бяспынна, гл**у**ха процьма ч**а**су
Глыт**а**е / х*а*раство і м**о**ц.
Уладзімер Жылка

– пэона другога і пэона чацьвёртага (або пэона другога і дактылю):

Тады Дав**і**да зваў Саул,

І з **а**рфаю / Д*а*від зьяўл**я**ўся…
М. Арол

Зьвіняць у н**е**бе песьні пт**у**шак.
На б**е**разе / п*а*-над Дзьвін**о**й…
Янка Журба

Як бачым, сьцьвярджэньню Белага адпавядае толькі трэцяя камбінацыя. Цікава, што першы выпадак, дзе разлом супадае з дыярэзаю, падаецца найменш спрэчным, але менавіта ён найрадзей здараецца. Пасьля кожнага разлому, як можна заўважыць, курсівам пазначаныя дыясталы – зрэшты, яны такія слабыя (запраўды «паўнаціскі»), што ня здольныя захаваць цэльнасьці радка. Да таго ж, пераразьмеркаваньне даўжыні паўрадкоў намяркоўвае дыясталы ў месцах, якія часта супярэчаць ямбам. Зрэалізаваць гэтыя дыясталы можна толькі ператварыўшы разлом у запраўдную цэзуру і падкрэсьліўшы напружанаю рэцытацыяй асобнасьць узьніклых паўрадкоў.
І ўсё ж, ёсьць рытмавыя сытуацыі, калі разлом практычна згладжваецца рытмаваю інэрцыяй, і пад тое мацней выбухвае дыястала:
Малюся **я** тваёй крас**е**,
Як, можа, *а*ніхто яшч**э**.
Язэп Пушча

Унікальныя рытмавыя сытуацыі стварае «разгойданы» «ямб» XIX стагодзьдзя:

На Тройцу, зв**ы**чай як у сьв**я**та, (1)
Пад'еў і ўзд**у**маў сабе сп**а**ць, (2)
Аж ч**у**ю, / з *а* г а м а н **і** ў т**а**та: (3)
«Ідзі пчол п**а**нскіх пільнав**а**ць!» (4)
Фелікс Тапчэўскі

Тут у 3-м радку словаформа *загаманіў* дае рытмавую інвэрсію, якая, аднак, рэалізуецца не як пераліў, а як адначасныя сыстала і дыястала. Шчыльная сыстала («спандэй») на апошнім складзе словаформы «правакуе», нібы «выштурхоўвае на паверхню» моцную дыясталу на першым складзе гэтага ж слова – і разлом, хоць ён і пазначаны ў нас, фактычна не ўзьнікае.
У кантэксьце сказанага паўстае чыста тэарэтычнае пытаньне: ці нельга разлом зьясьняць як варыяцыю, а дакладней –

прагрэсійную інвэрсію пульсанты другой ступені? Думаю, што нельга. Рух пульсанты таксама мае свае абмежаваньні. Пры адказе перш-наперш трэба зважаць на акустыку, якая паказвае: разлом радка зазвычай дае нам не адну, а дзьве рытмавыя адзінкі з асобнымі канстантамі, што, пэўна ж, ёсьць мадыфікацыяй. А калі фанэтыка слоў і рытмавая інэрцыя здольныя захаваць цэласьць радка – тады перад намі варыяцыя. Але ў такім разе паўстае практычнае пытаньне: як разьвязваецца рытмавае заданьне вершу? Застаецца толькі адзін спосаб – праз *сылябізм*. І якраз сылябізм у найгоршым сэнсе гэтага слова, што дае нам *псэўдаканстантавы рытм*. Разлом выклікае пераразьмеркаваньне моцных пэонавых пазыцыяў і мяняе, як сказаў бы Г. Шэнгелі, *вядзеньне голасу*. Нутраною праяваю разлому ёсьць зьява, якую можна абазначыць як *перасмык*. Калі б мы будавалі нармацыйную паэтыку, дык, пэўна ж, разлом забаранілі б. А так – верш вытрымае! Ён і не такія анамаліі можа вытрымваць. Чаго вартыя лягаэды, ці г. зв. «чыста танічныя» вершы! Прынамсі, ізасылябізм пры разломе захоўваецца. І здараюцца разломы параўнальна нячаста. Да таго ж яны маюць аднастайную праяву. Хіба толькі «напеўнасьць» страчваецца. Але затое зьяўляецца «гутарковасьць». Сама праблема, да якой катэгорыі анамаліяў адносіць разломы ці пералівы, у значнай меры схалястычная. Як бы мы ні тлумачылі рытм – гэта не падстава, каб спалохана вяртацца да ямбаў. Горш за ўсё тэарэтычны кампраміс, калі вершы з разломамі адносім да «ямбаў», з інвэрсіямі – сьпісваем на «сылябіку», а гладкую рэшту ласкава дазваляем называць пэонамі.

На жаль, нават рэдкія прыхільнікі пэонаў займаюць досыць непасьлядоўную пазыцыю. Яны вымагаюць ад пэонаў таго, чаго не патрабуецца ад іншых памераў: 1) абавязковых націскаў на ўсіх валох; 2) супаданьня валоў зь лягічнымі націскамі; 3) непажаданасьці ўсплёскаў і іншых акцэнтаў на роўнях. Насамрэч слушнае толькі першае патрабаваньне. Трэцяе не выконваецца ў жадным памеры, а другое наагул адносіцца да праблемаў інтанацыі і сэмантыкі вершу. Якім бы памерам паэт ні пісаў, ён абавязаны карэляваць сэнс як з нормаю, так і з анамаліямі рытму. Яшчэ М. Надзеждзін зазначаў: «Што да гэтак званае гармоніі вершу ... дык уся яе таямніца палягае ў спрыце ставіць пад асноўны націск тое слова, якое адыгрывае галоўную

ролю ў лягічным згадзе мэтрычнага радка… Гэтую падставовую рэч зьлегкаважваюць няўдольныя рабачаі».
Мяркую, што ад кампрамісных абаронцаў пэонаў мы павінны адмяжоўвацца больш рэзка, чым ад іх праціўнікаў. Разважаючы ў рэчышчы першых, трэба было б прызнаць, што наступныя радкі даюць нам розныя памеры: 1-ы – «харэй», 2-і – «пэон трэці»:
Многа поля з добрай доляй, (1)
Нешчасьліва і шчасьліва… (2)
Янка Купала
У падобных разважаньнях пытаньне аб рытмавым інварыянце радка касуецца дарэшты. Фактычна, гэта вяртае нас да тэорыі гіпастазаў або, у лепшым разе, пэоны ператвараюцца ў нейкую факультатыўную мадыфікацыю «ямбу» ды «харэю».
Тым часам зробленыя апісаньні паказваюць настойлівае імкненьне ўсіх разгледжаных памераў да інварыянтнае пэонавае структуры. Амплітуда пэонаў арганічная для мовы. Менавіта гэты момант дае падставу ў кантэксьце вершу называць пэонамі, цэлымі ці абсечанымі, тыя адзінкі, дзе ёсьць толькі адзін ікт і амплітуда ніяк сябе не праяўляе. Усе фрагмэнты радкоў – пэонавыя. Аднак кожны памер мае сваю гісторыю. З чатырох разгледжаных тыпаў вершу шасьціскладовік, або «пэон першы», і васьміскладовік, або «пэон трэці», склаліся «стыхійна», яшчэ ў сылябіцы, абодва пры скандоўлі могуць быць зьведзеныя да «харэю». Сямі- ды дзевяціскладовыя радкі разьвіваліся «дактрынальна», адразу як «ямбы», а ў якасьці інварыянтаў маюць адпаведна будову «пэону другога» і «пэону чацьвёртага».
Адпаведна кожны з памераў выяўляе свой адметны характар, цесна зьнітаваны з гісторыяй. «Сьміскладовік» узьнік у форме, набліжанай да інварыянту, і мала мяняўся. «Васьміскладовік» вельмі хутка эвалюцыянаваў, маючы нахіл да інварыянтнасьці. «Шасьціскладовік», наадварот, эвалюцыянаваў у бок інварыянту запаволена і неахвотна, заўжды захоўваючы схільнасьць да анамаліяў. «Дзевяціскладовік» жа адразу паўстаў з прэтэнзіяй на інварыянтнасьць, але з усіх памераў ён найбольш адхіляўся ад нормы, маючы нейкую нутраную дэструкцыйную патэнцыю і рознаскіраваныя вэктары анамальнасьці. Нягледзячы на ўсю рознасьць формаў, можна заўважыць, што валы памераў вытрымваюць аптымальнае

аддаленьне – тры слабыя склады. Ці, дакладней, два роўні з мажлівым усплёскам – радзей пералівам – пасярэдзіне.
Як варыяцыі і мадыфікацыі працуюць на адзінае рытмавае заданьне, пакажам яшчэ раз на вялікім урыўку зь вершу Старога Ўласа «Вясна»:
Ужо вад**ы** п о ў н ы раз**о**ркі, (1)
І зачарн**е**ліся узг**о**ркі, (2)
Як бы сух**і**я лішайк**і**, (3)
Ды зашум**е**лі ручайк**і**. (4)
А зьнізу л**ё**гкі ветрык в**е**е, (5)
Ды с**о**нейка / т*а*к цёпла грэ**е**, (6)
Бор неяк в**е**села шум**і**ць, (7)
Ў л у з е трав**і**ца зелян**і**ць. (8)
І ўсё ўжо б**у**дзіцца ад сн**а**, (9)
Бо набліж**а**ецца вясн**а**! (10)
А д ж ы л і др**о**бныя мур**а**шкі, (11)
Ч а р в я к і, м *а* т ы л ь к **і**, а пт**а**шкі (12)
Шчабечуць, зв**о**няць і пяюць, (13)
Л ю д з я м ахв**о**ты паддаюць. (14)
*Ж**а**вараначка ў прост**о**ры* (15)
Шчаб**е**ча, *як* у сінім м**о**ры, (16)
Плыве і б**у**сел, і жур**а**ў, (17)
І дрозд зап**е**ў і засьвіст**а**ў. (18)
А як тык**е**ля ён засьв**і**шча, (19)
Ляціць глушэц на такав**і**шча. (20)
Гудзіць лят**у**чы тоўсты жук, (21)
Балбоча **ё**мка цецяр**у**к, (22)
Пішчаць дзесь ч**а**йкі на бал**о**це, (23)
П л і с к а хваст**о**м трасе на пл**о**це, (24)
Гурчыць прац**я**жна жабін х**о**р, (25)
І дзеці пр**у**цца з хат на дв**о**р. (26)

З грунту, гэта банальны «чатырохступовы ямб», які мы вышэй дамовіліся называць дзьвюхступовым пэонам чацьвёртым. Але рытмавым мадуляцыям урыўку можна толькі пазайздросьціць. «Чысты ямб» даюць радкі 5, 21, 25 і 26-ы. Радкі 7-ы і 9-ы «нагружаныя» сысталамі. А 23-і гучыць яшчэ цяжэй, бо сыстала дапаўняецца зьбегам зычных, якія ўтвараюць кансананс. Затое 2-і, 3-і, 4-ы, 10-ы і, у нейкай ступені, 19-ы, наадварот, могуць быць названыя «лёгкімі» за кошт «пірыху». Разлом ёсьць толькі ў 6-м. У 16-м разлому не дапускае дыястала на слове *як*.

Інвэрсіяў куды больш: у 1, 8, 11, 14 і 24-м радкох. У 12-м – «падвоеная» інвэрсія, яна прыпадае і на ўсплёск, і на вал. У кантэксьце ўрыўку дэструкцыйны вынік такой інвэрсіі згладжваецца за кошт рытмавага паралелізму: словаформа *чарвякі* па вэртыкалі дакладна адлюстроўвае словаформу *аджылі*. Асабліва цікавы 15-ы радок, які можна назваць *ірацыянальным*. Тут націск на першым складзе нібыта намяркоўвае інвэрсію, але далей – аж да канстанты – прапушчаныя ўсе акцэнты ды бракуе аднаго складу.
На падставе праведзенага апісаньня можна зрабіць сякія-такія карэктывы да тэрміналёгіі Андрэя Белага. Пропускі рытмавых націскаў ня так паскараюць, як *палягчаюць* радкі. Адпаведна, наяўнасьць «ямбавых» усплёскаў *абцяжарвае* верш. Другую ступень абцяжарваньня даюць сысталы («спандэі»), а трэцюю – кансанансы. Паскораных радкоў наагул не бывае, бо час у квалітацыйным вершаваньні не выконвае рытмаўтваральнае функцыі, ён аднолькавы для ўсіх шэрагаў. Затое можна гаварыць пра «запаволены», ці, лепш, «затрыманы» рытм на месцы *разлому*. Запаволеньне дае «аказіянальная цэзура», якая радок падзяляе на два асымэтрычныя (і даўжынёю, і націскамі) радкі, што ўносіць у рытмавы працэс момант хаатычнасьці, гутарковую інтанацыю.
І ўсё ж рытмавая інэрцыя падпарадкоўвае сабе ўсе радкі бяз вынятку, пульсуючы ў абсягах пэонавае кадэнцыі. Такі вынік мы атрымваем на практыцы. Што да «сыляба-танічнай», «ямба-харэевай» дактрыны, дык яна таксама не зусім бязглуздая, бо, так ці гэтак, рэгулюе пісаньне вершаў, дапамагае вэрыфікаваць пасьлядоўнасьць націскаў, заразом уносячы свае абмежаваньні і свае анамаліі. Спраўдзім цяпер разгледжаныя законы на вершах з даўжэйшымі радкамі.
4. **Дэскрыпцыя люстраной і лінейнай сымэтрыі.**
Шасьціскладовік, як ужо зазначалася, узьнік у выніку распаду цэзураванага дванаццаціскладовіка. Прыкладам апошняга могуць служыць такія радкі:
Н *а* д г **о** р а д а м з**о**рка // **я**сна засьвяц**і**ла, (1)
Н *а* с т **а** ў д з я н ё к в**а**жны, // – *і* Масквa ажы**ла**! (2)
К р *ы* ч **ы** ц ь на ўсё г**о**рла // н *а* р **о** д весял**е**нькі, (3)
Ш т *о* н а в я с ь ц **і** ц ь г**о**рад // ц *а* р **о** ч а к дабрэнькі. (4)
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч
Схема паказвае: усе паўрадкі дванаццаціскладовіка паводле

будовы тоесныя радком шасьціскладовіка. Яны нібы гатовыя схемы, якія могуць і складвацца, і дзяліцца, але ўнутрана захоўваюць імкненьне да пэону першага. Верш В. Дуніна Марцінкевіча, апрача другога паўрадка 1 га радка, увесь інвэрсіяваны. Зрэшты, яго структураў няма сэнсу чапаць, бо падобныя разглядаліся вышэй. Асобную цікавасьць становіць толькі першы паўрадок 4 га радка. Перад намі гранічная ступень інвэрсіі: пульсанта ўсутыч набліжаецца да канстанты, утвараючы зьбег націскаў, нешта накшталт спандэю. А разьвязваецца гэтая цяжкасьць праз выбух: сэмантычная пульсанта, якая падае на слова *навясьціць*, і рытмавая канстанта, якая прыпадае на слова *што*, стаяць, як ужо зазначалася, «у розных вымярэньнях».

Розьніца ж варыянтаў сылябічнага дванаццаціскладовіка і гэтак званага цэзураванага «шасьціступовага харэю» праяўляецца толькі ў прыватнасьцях, што паказвае прыклад:

М*а*скал**і**ска т**у**гы // в**я**жаць нам яз**ы**к, (1)
Ў б*е*лар**у**скай х**а**це // д *у* х н **у** ц ь не да**е**ць. (2)
А хац**е**ў бы **я**, // г *у* д **а** р маладз**і**к, (3)
Для Багд**а**на, П**о**льшчы // с**ё**гня пагудз**е**ць. (4)
Войслаў Савіч-Заблоцкі

Гэты верш заўсёды зьдзіўляў мяне нейкім загадкава энэргічным гучаньнем. Энэргічнасьць страфы, як відаць з папярэдніх разваг, дасягаецца праз рэгулярныя выбухі, якімі пачынаюцца ўсе першыя паўрадкі. Агулам, не зважаючы на пералівы, памер можа быць зьясьняны як «сыляба танічны», тым больш што тут тарнуюцца нехарактэрныя для сылябікі (зарыентаванай на польскую традыцыю) тупыя кляўзулы. А першы паўрадок 3 га радка нават цэзуру мае тупую – у выніку 1 ы радок адзінаццаці , а 3 і – дзесяціскладовы. Але гэта толькі вонкавыя адзнакі. Нутраная ж будова вершу функцыянуе паводле тых самых законаў дванаццаціскладовіка, якія мы назіралі вышэй, бо зьмянілася толькі фармальная даўжыня радка за кошт малаактуальных пасьляканстантавых складоў.

Варта заўважыць: В. Савіч Заблоцкі, сымпатызуючы польскай культуры, мусіў бы, як і В. Дунін Марцінкевіч, пісаць пад уплывам «сылябічнае» традыцыі, але тут мы бачым перавагу «сыляба тонікі». Чаму? Пэўна што выхаваньне пад наглядам расейскага генэрала, навучаньне ў Пецярбурзе не мінуліся для паэта марна і наклалі свой адбітак на яго рытмавыя

стэрэатыпы, якія пазьней ускладніліся пад уплывам беларускага фальклёру і польскае літаратуры. Так ці гэтак, а структуры, «выгадаваныя» ў «сылябіцы», арганічна ўліваюцца ў «сыляба тоніку», яшчэ больш «прыгладжваюцца», выроўніваюцца і натуральна функцыянуюць пад новаю шыльдаю.

Спаквaля для выраўненага дванаццаціскладовіка адзінаю прызнанаю мадуляцыяй становіцца выбух, што гаворыць пра сьведамую арыентацыю яго аўтараў на харэевую канвэнцыю. І толькі старанна вытрыманая мэдыяна ўсё яшчэ нагадвае пра «сылябічнае» паходжаньне памеру. У гэтым пляне паказальны наступны ўрывак:

Н*і* сатр**а**пны бр**а**згат // ц**а**рскіх эскадр**о**наў,
Н*і* крыв**а**вы т**у**пат // п**а**нскага глумл**е**ньня
Н*е* спын**і**лі кр**о**каў // сл**а**ўных пакал**е**ньняў
Д*а* свабоды м**у**жнай, // с**о**нцам азар**о**най.

Піліп Пястрак

Хіба толькі заходнебеларускі паэт мог узяць для санэту такі памер, як цэзураваны шасьціступовы харэй, які сягае канону «сылябічнага» дванаццаціскладовіка. Але зь іншага боку, толькі паэт, выхаваны на традыцыях расейскае «сыляба-тонікі», мог праз чатырнаццаць радкоў ня ўжыць жаднага пераліву. Такая дваістасьць – вельмі характэрная рыса беларускае паэзіі пачатку XX стагодзьдзя, калі і *традыцыйныя* польскія, і *новыя* расейскія культурныя ўплывы ўраўнаважваюцца ды на хвілю застываюць у нейкім няўстойлівым, але надзвычай плённым сынтэзе. Зрэшты, у розных аўтараў яны па-рознаму вар'ююцца. У заходнебеларускай паэзіі 1920–1930-х гадоў яшчэ досыць часта можна было натрапіць на інвэрсіяваны верш узору XIX стагодзьдзя:

К**і**нь жа ты дзіц**я**тка // б *я* з м а т к і у п**о**лі,
Д**а**й яму і ц**а**цак // *і* яды дав**о**лі –
Кр**ы**ху пагул**я**е, // *а* пасьля пачн**е**
Кл**і**каць сваю р**о**дну // з пл**а**чам да сябе.

Тарэса

Калі пры чытаньні Тарэсы не пільнавацца цэзуры, дык яе верш, як даўней верш Дуніна-Марцінкевіча ў вачох Багдановіча, падасца занадта грувасткім. І ўсё ж, арыентацыя на польскую культуру тут узглядная: паэтка яўна ўсьведамляла рытмавыя мажлівасьці беларускае празодыі і таму праводзіла

пасьлядоўную, хоць і няхітрую альтэрнацыю простых ды тупых кляўзулаў.
Славянскія мовы, у якіх няма фіксаванага націску, менавіта за кошт кляўзулаў дазваляюць багата вар'яваць рытмы, так што ў рамах творчасьці аднаго паэта ці паэзіі ў цэлым яны ствараюць уражаньне разнастайнасьці, адначасна, у абсягах вершу, захоўваючы інварыянтнасьць, якая робіць іх напеўнымі. Як бы па-рознаму ні выглядалі гэтыя вершы, перад намі адзін рытмавы тып, той самы інварыянт:
Я иду дол**и**ной, // н*а* затылке к**е**пи,
В л**а**йковой перч**а**тке // см**у**глая рук**а**.
Д*а*леко си**я**ют // р**о**зовые ст**е**пи,
Д*а*леко син**е**ет // б**ы**страя р**е**ка.
Сяргей Ясенін
І, адпаведна:
Есть одна хор**о**шая // п**е**сня у сол**о**вушки –
П**е**сня пан**и**хидная // п*о* моей гол**о**вушке.
Сяргей Ясенін
Ведама, падобным формам, пазбытым пераліваў, можна закінуць у віну іх «манатоннасьць». Але тут ужо нічога не паробіш, паэту трэба выбіраць: або напеўнасьць, або шырыня мадуляцыяў.
Дарэчы, апошні прыклад, як можна заўважыць, гэта той самы адменьнік «шасьціскладовіка» (толькі ўжо пасьлядоўна ўнармаваны і «здвоены»), які мы бачылі раней на прыкладзе з Паўла Васільева. Аналягічны верш, куды больш арганічны, г. зн. у меру вар'яваны выбухамі (першыя паўрадкі 1-га і 2-га радкоў) ды пералівамі (другі паўрадок 4-га радка), можна сустрэць і ў беларускай паэзіі – фактычна гэта адпаведнік *ваганскага* вершу:
П*а*зяхае р**а**ніца // в**е**трыкам нявы**с**паным. (1)
Дрэвы пацяг**а**юцца, // г**о**льлямі шум**я**ць. (2)
Пл**е**чы распр**а**ўляюць // д *у* б ы ганар**ы**стыя, (3)
н*а* зямельцы пр**а**дзедаў // в**а**ртаю ста**я**ць. (4)
Ларыса Геніюш
Лёс «шасьціступовага ямбу», гэтаксама як і «чатырохступовага», істотна розьніцца ад лёсу «шасьціступовага харэю». У беларускую культуру даны памер лучыў праз расейскую традыцыю. Таму варта хоць бы пункцірна прасачыць гісторыю яго станаўленьня. Пачатак памеру сягае французскага

дванаццаціскладовіка (6 + 6), дзе першы паўрадок зьмяшчае шэсьць складоў, а другі – шэсьць з наростам. Тупая цэзура першага паўрадка, якая адпавядае французскаму акцэнту на апошнім складзе і супадае заразом зь ямбаваю дыярэзаю, ды простая кляўзула другога паўрадка даюць нам інварыянт – два дзьвюхступовыя пэоны другія. Менавіта ў такой «сфранцужанай» форме («італьянскімі» можна назваць разгляданыя вышэй дванаццаціскладовікі харэевай кадэнцыі) і прынёс «шасьціступовы ямб» у расейскую паэзію В. Трэдзіякоўскі:

Жел**а**ет челов**е**к // блаж**е**нства непрел**о**жно. (1)
Сем**у** – высокий ч**и**н, // и с**и**ла тем, и ч**е**сть; (2)
Тот сч**а**стия себ**е** // в бог**а**тстве чая л**о**жно, (3)
Преумножая вс**е** // об**и**лие, что **е**сть. (4)
Васілі Трэдзіякоўскі

Пазбыты пераліваў, як і папярэднія расейскія вершы, гучыць ён роўна, нават напеўна, але зноў жа – досыць аднастайна, бо за мадуляцыю мае толькі выбух (гл. першы паўрадок 4-га радка). Праўда, неўзабаве ўсё мяняецца, наўсьлед за Трэдзіякоўскім Ламаносаў уводзіць ў ужытак шасьціступовік «нямецкага» кшталту:

Кузн**е**чик дорог**о**й, // коль мн**о**го ты блаж**е**н, (1)
Коль б**о**льше пред людьм**и** // ты сч**а**стьем одар**е**н! (2)
Препр**о**вождаеш ж**и**знь // меж м**я**гкою трав**о**ю (3)
И наслажд**а**ешся // медв**я**ною рос**о**ю. (4)
Міхаіл Ламаносаў

Адрозьніваецца ламаносаўскі тып тым, што першыя паўрадкі пры аднолькавай колькасьці складоў могуць мець як тупую, так і сьлізкую цэзуры (гл.: 4-ы радок). Гэтая анамалія нагадвае ўжо знаёмы нам разлом, які дае перасмык. Але тут мы маем *перасмык без разлому*, бо ролю апошняга выконвае мэдыяна. У выніку на ўсіх адцінках, дзе ёсьць сьлізкая цэзура, замест другога пэону ўзьнікае пэон чацьвёрты, які, сваім парадкам, схіляецца да дзьвюхступовага дактылю. (Раней мы назіралі адваротнае: замену чацьвёртага пэону другім.) Дэструкцыя падобнага кшталту запраўды пазбывае верш манатоннасьці, пра што ўспаміналася ў прапэдэўтыцы, але заразом набліжае яго да прозы. Добра гэта ці не – залежыць ад густу і намэты

песьняра. Аднак тут ніяк нельга пагадзіцца з М. Гаспаравым, быццам такі згерманізаваны «ямб» стаіць бліжэй да «патрабаваньняў натуральнага рытму вершу». Разважаючы падобным спосабам, можна дадумацца да таго, што сама «натуральным» вершам стане проза.

Тым часам нямецкія прататыпы гучаць зусім ня так, як «згерманізаваныя» расейскія вершы. «Пропускі націскаў, – зазначае В. Жырмунскі, – ня ёсьць у іх звычайнаю асновою для вар'яваньня рытму». Нямецкая мова запраўды натуральна ўкладваецца ў двухскладовыя памеры, практычна не ўтвараючы «пірыхаў». Рэч у тым, што ў сваім гістарычным разьвіцьці праз фанэтычную рэдукцыю звычайныя нямецкія словы скараціліся да аднаго ці двух складоў. А «многія гэтак званыя "складаныя словы"», што, як ведама, вельмі пашыраныя ў нямецкай мове, на думку Л. Шчэрбы, «ёсьць словамі адно паводле формы, а з грунту» могуць уважацца за сынтагмы. Адсюль – кожная лексэма, якая мае тройку і болей складоў, апрача галоўнага націску (Hauptton) заўжды мае пабочны націск, ці г. зв. «паўнаціск» (Nebenton), такі моцны, што, як кажа М. Гаспараў, «ён можа рымавацца з асноўным».

Дарэчы, яшчэ задоўга да Ламаносава немцы на службе ў расейскага цара ўжо спрабавалі на славянскай дзяльніцы досьвед уласнае сыляба-тонікі. І, сярод усяго іншага, у канцы вершавога радка тарнавалі звыклыя для іх «паўнаціскі». Але з гэтага нічога ня выйшла, бо «паўнаціскі» на канстаньце не спрацоўвалі – не ўзьнікала дыястала, як не ўзьнікае яна і на сьлізкай цэзуры. Заўважым, такое прыймо груба парушае ня толькі расейскую, а ўсякую іншую славянскую акцэнтуацыю. Аднак пры пэўных намаганьнях у паэзіі заўжды можна знайсьці кампраміс паміж канвэнцыяй і празодыяй, абы толькі разумна іх спалучыць. Такі кампраміс знайшоў Ламаносаў, дазволіўшы перасмык на цэзуры і забараніўшы на канстаньце, што стварыла ілюзію цэласнасьці памеру. Хоць насамрэч ізноў у прынцып «сыляба-танізму» нішком быў усунуты прынцып «сылябізму», ды яшчэ ў сваёй найвульгарнейшай праяве.

Вось жа, з французскае мовы празь нямецкую, а зь нямецкае праз расейскую французскі александрыйскі верш лучыў і ў беларускую літаратуру:

Ал**е**ксандрыйскі в**е**рш! // Ты ц**і**хі, як Эрэб**у**с,
Хав**а**ючы аг**о**нь // пад сьн**е**гам. Хто in reb**u**s

M*u*sarum зн**а**ецца, // ня м**о**жа не любі**ц**ь
Тв*а*ёй пав**а**жнасьці. // Там**у**-то аднав**і**ць
Хац**е**лася таб**о**й // мне зв**ы**чай пазаб**ы**ты
Эп**і**сталы піс**а**ць. // Ну, *а* цяпер спачн**і** ты.
Максім Багдановіч

Спрэчак аб паходжаньні Багдановічавай александрыны быць ня можа: гэта «шасьціступовы ямб» у характэрнай ламаносаўскай інтэрпрэтацыі. Ніхто не сумняецца ў плённым засвойваньні беларускім паэтам французскае літаратуры, але рытмавыя стэрэатыпы, выхаваныя тэарэтычна, а найперш – яшчэ з маленства – *тэксталягічна*, пераадолець вельмі цяжка. Калі б Багдановіч вучыўся ў польскай традыцыі – хутчэй за ўсё, ён пісаў бы па-беларуску трынаццаціскладовікам. Калі б ён зьвярнуўся да арсэналу нашаніўцаў, дык за адпаведнік александрыны мог бы ўзяць разгляданы вышэй дванаццаціскладовік. Калі б ён ведаў тэорыю вершаваньня павярхоўна, гэтаксама, як савецкія аўтары, наагул ня здолеў бы ўпільнаваць цэзуры. А калі б ён, як Трэдзіякоўскі, паспрабаваў беспасярэдне перастварыць французскі прататып у «ямбе», дык пісаў бы менавіта такім «ямбам», у якім няма перасмыкаў:

Начл**е**жнікі пяюць. // Над в**о**гнішчам тум**а**н.
А сьп**е**ў – вясёлы сум. // А г*а*ласы – рач**у**лкі.
Плыв**у**ць адтуль з куст**о**ў, // з асрэ**б**раных пал**я**н
Част**у**шкі – як званк**і**, // част**у**шкі – як бразг**у**лкі.
Зьмітрок Бядуля

Ведама, Бядуля наўрад ці ставіў сабе за мэту перастварэньне французскага або якога іншага ўзору. Хутчэй за ўсё, ён пісаў «на слых», стараючыся ўкласьці ўражаньні ў напеўны твор. Глянуўшы на гэты тэкст, мы бачым: як раней паўрадкі дванаццаціскладовіка паўтаралі радкі шасьціскладовіка, таксама тут паўрадкі «шасьціступовага ямбу» паўтараюць гатовыя схемы анакрэонтыка.

Вось жа, калі беларускі «шасьціступовы харэй», супраць расейскага, выкшталтаваў на арганічным этапе свайго станаўленьня адумысную мадуляцыю пераліваў, дык у «ямбе» нічога падобнага не назіраецца. Напрацаваная расейскаю літаратураю традыцыя, а ў нейкай ступені і тэорыя (якая ў «харэі», аднак, праявілася «крыху» па-іншаму) надалей схіляюць беларускіх паэтаў культываваць у якасьці клясычнага, прыдатнага для санэтаў ламаносаўскі «шасьціступовы

цэзураваны ямб» зь перасмыкамі (гл. 2-ы і 3-і радкі):
А ў вёсцы блізкай дзед // старэнькі бае, сівы, (1)
Пра страхі розныя, // што там таяцца й дзівы (2)
Начніц, што пацеркі // нанізваюць з расы (3)
І на шляху снуюць // і сеюць сьпеў жудзы; (4)
Ды аб княжне дзіўной, // нябачанай красы, (5)
Ў замковай вежы век // згубіўшай маладзы. (6)
Уладзімер Жылка
Дагэтуль усе разгляданыя цэзураваныя «доўгія» памеры так ці інакш лучыліся зь нецэзураванымі «кароткімі». Істотна адрозную ад іх прыроду мае сымэтрычны (5 + 5) дзесяціскладовік польскага ўзору. Далей мы яго будзем называць *дзесяцьцёвік*, каб адрозьніваць ад сэрбскага асымэтрычнага (4 + 6) памеру, што здаўна ведамы як *дзесяцерац*. Дзесяць складоў – гэта тая граніца даўжыні радка, якая ня можа за раз успрымацца на слых і дзеля таго мусіць падавацца «порцыямі», аддзеленымі адна ад адной цэзураю:
Кажуць старыя, // калі даць веры, (1)
Што былі пушчы, // лясы бязь меры, (2)
Пчол надта многа, // мёду – як глыны, (3)
Птаства бязь ліку, // процьма зьвяры ны, (4)
Дзікоў, мядзьведзяў, // гусяў і лосяў... (5)
Цяпер жа нешта // усё зьвялося... (6)
Стары Ўлас
Даўжыня кожнага паўрадка ў пяць складоў, пры простай кляўзуле, не дазваляе пульсанце аддаліцца больш чым на два роўні, і, як вынік, інварыянтам дзесяцьцёвіка ёсьць *два дзьвюхступовыя дактылі* (3-і радок). Часамі пульсанта рэгрэсійна адхіляецца, ці, інакш, ссоўваецца ў бок канстанты, фармальна ўтвараючы «дзьвюхступовы ямб», а фактычна – пераліў (6-ы радок). Першыя два склады – гэта адзіны абсяг віхтаньня пульсанты. Іншыя акцэнты, што ўсутыч набліжаюцца да канстанты, ператвараюцца ў сысталы, у супарат якім могуць разьвівацца дыясталы (першы паўрадок 2-га радка). Але нават інварыянтныя, чыста «дактылёвыя» адцінкі дзесяцьцёвіка становяць сабою дактыль нестандартны з абсечанаю цэзураю, нечым падобны да «харыямбу». А ўсё разам – і ўемны дактыль, і «ямбавыя» пералівы – стварае тое непаўторнае энэргічна-пералівістае гучаньне дзесяцьцёвіка, зь якім ня можа параўнацца ні дольнік, ні лягаэд.

Беларускі дзесяцьцёвік – ня міт і ня байстар, як лічаць нашыя вэрсолягі, ім напісана нямала прыгожых лірычных вершаў. Гэты памер вельмі падобны да свайго польскага прататыпу, але супраць апошняга мае куды большыя абсягі ў вар'яваньні кляўзулаў. Беларускія паэты добра адчувалі гэтыя мажлівасьці і таму побач з простымі кляўзуламі свабодна карысталіся тупымі:

В**о**сь посьле б**у**рнай // жн**і**ўнай пар**ы**
В**е**расень хм**у**рны, // *я*к дз**е**д стар**ы**,
З т**о**рбаю п**о**ўнай // д*а* н**а**с ідз**е**ць.
М*а*л**ы**я п**е**ўні // ўж*о* ст**а**лі п**е**ць.
З*а*мільгац**е**лі, // *я*к не был**і**,
І адляц**е**лі // ў в**ы**рай бусл**ы**.

Стары Ўлас

Чыста колькасна, за кошт тупых канчароў, кожны радок тут утрымвае толькі дзевяць складоў. Але было б дзіўна, калі б мы пачалі сьцьвярджаць, дзей гэтыя вершы якасна розьняцца ад цытаваных вышэй. А тым часам «сылябічная» догма «сыляба-таністаў» вымагае менавіта такога прачытаньня. Як бачым, абкарачэньне пасьляканстантавых складоў насамрэч не мяняе дактылёвага інварыянту, як раней не мяняла пэонавых.

Сярод доўгіх памераў дзесяцьцёвік – сама кароткі, таму ён мала калі дзеліцца на драбнейшыя, пяціскладовыя адзінкі. Аднак наяўнасьць у ім цэзуры падставу для падзелу дае. Калі ж нутраныя рымы ўзмацняюць цэзуру, як было ў апошнім прыкладзе з Старога Ўласа, дык дзяленьне хаця-нехаця напрошваецца само. Цікавы ўзор дзесяцьцёвіка спатыкаецца ў беларускай калядцы XVIII стагодзьдзя: тут парныя рымы злучаюць то паўрадкі, то радкі, то адначасна тое і другое, намяркоўваючы (///) ці паслабляючы (//) патэнцыйны падзел:

З р**а**дасьці **о**ны /// ч**э**рнцы накл**о**ны
Н**ы**не злаж**ы**ці /// к Б**о**гу бяж**ы**це.
І вы, чарн**і**чкі, /// *у* чарав**і**чкі
*А*буйце н**о**гі /// з р**а**дасьці мн**о**гі.
В**ы**, небаж**а**ты, /// м*а*лы хлапч**а**ты,
Сьпяшайце к Б**о**гу /// ў ст**а**йню уб**о**гу.
Кушняры, з футра /// н*а*дрэце к**у**тра,
Кр*а*ўцы, прост**а**ньце // скр*а*ўкі хав**а**ці:
С**а**м Бог раб**о**ту // р**а**чыць вам д**а**ці.
К*а*валі гв**о**зьдзі // зр*а*беце з к**о**пу,

*А*бы аб**і**ці // тую там ш**о**пу.
Г*а*нтары, г**о**нтаў // *і* лат дад**а**йце,
Ст*а*ляры, дзьв**е**ры // хутка гат**у**йце,
А вы, сьлясары, // **і**х прырыхт**у**йце.
*У*се шныц**а**ры, /// купна з мал**я**ры,
Д*а* тае ш**о**пы // р**о**бце аўт**а**ры.
Шкл**я**ры, бал**о**ны /// д*а* шопы **о**ны
П*а*прыпраўл**я**йце, /// ч**э**сьць Богу д**а**йце.

Спраўджаньне такога падзелу і пераўтварэньне яго паўрадкоў у самастойныя радкі пяціскладовіка можна бачыць на наступным прыкладзе:

Сьн**е**гу ў кал**е**на
І б**е**лы шл**я**х.
Т*а*м дз**я**цька с**е**на
В*я*з**е** ў сан**я**х.
Стары Ўлас
Няўважлівы вершазнаўца пяціскладовік можа лёгка зблытаць зь дзьвюхступовым дактылем, які становіць яго інварыянтнае з'ішчаньне, ці дзьвюхступовым «ямбам», які становіць з'ішчаньне варыянтнае. Пазьней на гэтай падставе ў «сыляба-танізьме» адбылося раздваеньне пяціскладовіка на «дактыль» і «ямб».
Цікава зазначыць, што сучасныя паэты, вызнаючы сыляба-танічную канвэнцыю, якая забараняе перамяшчэньне пульсанты, ахвотна зьвяртаюцца да «варыянту» і ўхіляюцца ад «інварыянту». Прынамсі, дзьвюхступовыя «ямбы» здараюцца ў беларускай паэзіі досыць часта, чаго ня скажаш пра адпаведныя дактылі. Прычына палягае, пэўна што, у большай напружанасьці «варыянтнае» рэалізацыі, якая пры пэўных варунках супраць волі паэта можа ператварацца ў інварыянт і задаваць неагаданую пульсацыю (гл. ніжэй 3-і радок), немажлівую ў манатонным інварыянце:
В*а*ртуе г**о**рад (1)
Н*а*чн**а**я в**а**рта (2)
Т**а**м дзе ня трэба (3)
Х*а*дз**і**ць ня в**а**рта (4)
Міхал Анемпадыстаў

Калі ж вярнуцца да дзесяцьцёвіка, дык трэба зазначыць, што яго рэфлексы ў квазіямбавай рэалізацыі зрэдку тарнуюць і сучасныя аўтары, асабліва пры арыентацыі на фальклёр, відаць, нават мала задумваючыся, з чым яны насамрэч маюць справу:

К**а**ц**і**ўся **я**блык // зь з*я*л**ё**най г**о**ркі,
У х**а**це г**о**сьці // кр**ы**ч**а**лі «г**о**рка».
К**а**ц**і**ўся **я**блык, // *як* с**о**нца, сьп**е**лы,
Д*а* малад**о**й у / с*у*к**е**нцы б**е**лай.
Марыя Шаўчонак

Ёсьць больш заблытаныя, ускладненыя леймамі рэфлексы:

З*аг***а**д пяч**а**ткай // з*а*мацав**а**ны –
Пярсьцёнкам б**і**ску/п*а* // сам**о**га,
К**а**б грахав**о**дні/ц*у* дз**е**ўку **А**нну
*А*дд**а**ць на сп**о**ведзь // *а*гн**ю** сьвят**о**га…
Максім Танк

А некаторыя апасродкаваньні «сыляба-таніст» наагул мог бы сьпісаць на г. зв. «дольнік» ці «тактавік». Але ня ўбачыць у іх рэфлексу дзесяцьцёвіка можа толькі той, хто захоча сьведама ўхіліцца ад пазнаньня:

Гі/ст**о**рыю г**э**ту/ю // к**о**жны саб**а**ка
За / к**о**стку кур**ы**ну/ю // р*а*спавядз**е**:
Т*а*кіх сябр**о**ў, як // сьмя/ц**я**р Кукаб**а**ка
І / С*ы*мон-музыка, // ня / стр**э**неш нідз**е**.
В**о**зіць Кукаб**а**ка // сьм**е**цьце за г**о**рад
Н*а* старым гр*у*завіку // ў з*я*лезнай скр**ы**ні,
А / Сымон-муз**ы**ка // раз/вучвае тв**о**ры
Б**а**ха, Бэтх**о**вэ/на // й П**а**ган**і**ні.
Алег Мінкін

Між іншым, менавіта «сыляба-танічным» рэфлексам дзесяцьцёвіка ёсьць славуты дактыль Г. Дзяржавіна зь леймаванаю цэзураю, на які такую пільную ўвагу зьвярталі Ё. Бродзкі як паэт і М. Гаспараў як гісторык вершу:

Чт**о** ты зав**о**дишь // п**е**сню во**е**нну

Фл**е**йте под**о**бно, // м**и**лый снег**и**рь?
С к**е**м мы пойд**ё**м вой/н**о**й на Г**и**ену?
Кт**о** теперь в**о**ждь наш, // кт**о** богат**ы**рь?
Відаць, празь нейкія польскія ўзоры расейскі клясык засвоіў рытмавы стэрэатып дзесяцьцёвіка, але ня здолеў даць яму добрае «сылябічнае» рэалізацыі. Мы бачым: тое, што ў расейскай паэзіі мажлівае, але да гэтае пары падаецца рарытэтам, беларускія паэты арганічнае пары ўжывалі ледзь не штодзённа. Гэта яшчэ раз паказвае, як уплывае на норму рытму прынятая ў літаратуры канвэнцыя. Дарэчы, дзяржавінская інтэрпрэтацыя дзесяцьцёвіка вельмі нагадвае разгляданую вышэй рэалізацыю дванаццаціскладовіка В. Савічам-Заблоцкім. Апісаньні ўсіх доўгіх радкоў паказваюць нам адмысловую ролю цэзуры: ня маючы загадзя намеркаванага парадку чаргаваньня іктаў, нельга дабіцца рытмавага ладу ў адзінках на дзесяць і болей складоў. Доўгі ізасылябічны радок без цэзуры нічым ня будзе розьніцца ад прозы, што гаворыць пра недастатковасьць ідэі ізасылябізму. Не дае чаканага эфэкту і двухскладовая дактрына. Нездарма А. Квяткоўскі пісаў, што двухскладовая ступа «ня можа служыць колькаснаю мераю рытмавага працэсу дзеля скрайняе абмежаванасьці свайго абсягу». Вышэй мы пераканаліся, што без уліку чатырохскладовае амплітуды яна выклікае разломы нават у васьмі- і дзевяціскладовых радкох. А таму чым даўжэйшымі будуць радкі – тым больш разломаў дадуць нам «ямбы» ды «харэі». Аднак практыка паказвае, што слушнага рытму ў доўгім радку можна дабіцца, не здрабняючы яго цэзурамі, калі пільнавацца трох- або чатырохскладовае амплітуды чаргаваньня іктаў.
Неяк У. Хадасевіч ў успамінах пра В. Брусава заўважыў:
Як ён радаваўся, калі «адкрыў», што ў расейскай літаратуры няма вершу, напісанага чыстым пэонам першым! І як прастадушна зажурыўся, калі я сказаў, што ў мяне ёсьць такі верш і быў надрукаваны, толькі не ўвайшоў у мае зборнікі.
– Чаму не ўвайшоў? – запытаўся ён.
– Кепскі, – адказаў я.
– Але ж гэта быў бы адзіны прыклад у гісторыі расейскае літаратуры!
Гэты цікавы пасаж уводзіць нас у новую адметную праблематыку вершаваньня. Бадай што ня кожны з нашых сучасных паэтаў пры чытаньні гэтага ўрыўку зразумее, пра што

тут, урэшце, ідзецца. Я таксама доўгі час ня меў жаднага ўяўленьня аб пэонах. Але нават нічога ня чуўшы пра іх, ня мог не захапляцца надзвычайнаю гучнасьцю, нейкаю сьвяточнаю напеўнасьцю вось гэтых радкоў:
Вёсны возвращаются! И снова, (1)
На кистях черёмухи горя, (2)
Губ твоих коснётся не суро во (3)
Красный, окаянный свет былого – (4)
Летняя высокая заря. (5)
Павал Васільеў
Традыцыйная тэорыя вершаваньня не давала рады растлумачыць мне, чаму «пяціступовы харэй» расейскага паэта – такі лёгкі, такі грацыёзны, які мала ў каго бывае. Пазьней выявілася: непаўторны рытм П. Васільева – гэта і ёсьць той самы «пэон першы», якога дамагаўся В. Брусаў. Калі раней шасьціскладовік даваў нам гэты памер толькі ў дзьвюхступовай рэалізацыі, дык тут мы маем цэлыя тры ступы пэону – рэч, якая сягае ўжо па-за мажлівасьці «сылябікі». Невыпадкова менавіта для ўсходнеславянскіх моў характэрны падобны верш.
Такі самы пэон мы спаткаем і ў украінскай паэзіі:
На Підгір'ю села невеселі (1)
Простяглися долом-долинами, (2)
Мов край шляху на твердій постелі (3)
Сплять старці, обвішані торбами. (4)
Іван Франко

І ў беларускай:
Скончылася лета... Не сумуй! (1)
Звыклаю хадою час пастуе. (2)
Ад спакою ён цябе ўратуе, (3)
Ад самоты – сам сябе ратуй. (4)
Не сумуй... Яшчэ ў тваіх гадах (5)
Верасень – ня першая прыкмета... (6)
Падаюць антонаўкі ў садах. (7)
Скончылася, скончылася лета! (8)
Уладзімер Някляеў

Або:

Пакланюся я табе, царыца, (1)

Ч**ы**стая, сьцюдз**ё**ная вадз**і**ца. (2)
Т**ы** цячэш бал**о**тамі, імх**а**мі, (3)
Ж**о**ўтымі, сып**у**чымі пяск**а**мі, (4)
Б*е*рагі крут**ы**я падрыв**а**еш, (5)
Дрэвы ды кам**е**ньні падмыв**а**еш... (6)
Максім Багдановіч

Падобных вершаў, чыста вытрыманых, існуе параўнальна няшмат. І з прыточаных прыкладаў пурыстычная тэорыя пэону, якую я вышэй крытыкаваў, мусіла б забракаваць 2-і радок П. Васільева, 1-ы, 2-і і 3-і І. Франка, 3-і, 4-ы, 5-ы У. Някляева ды 1-ы, 5-ы М. Багдановіча. Балазе, з падобнымі адхіленьнямі мы ўжо знаёмыя: гэта тыя самыя дыясталы-выбухі, якія вар'ююць, але не мадыфікуюць рытм.

Не перабольшу, калі заяўлю, што пэон першы, асабліва трохступовы, – гэта найпрыгажэйшы з усіх мажлівых і немажлівых вершавых памераў. Мне заўжды, на гвалт, хацелася дабіцца такога самага напеўнага «пяціступовага харэю». Я старанна вытрымваў усе патрабаваньні тэорыі сыляба-танізму. Але мой «харэй» чамусьці ня «лётаў», а «поўзаў». Толькі пазьней выявілася, што я не вытрымваў правілаў альтэрнацыі (не пісаў пэонамі!) – і «харэй без пэонаў» разбуралі нявідныя для вока разломы, прыкладам:

Будуць сл**у**хаць / л*е*дзяныя сьв**е**чкі (1)
месяц**о**вае / сьвятло арг**а**на, (2)
а малітва стр**о**гая асьв**е**ньціць (3)
н**а**шае яз**ы**цкае ках**а**ньне. (4)
Юрась Пацюпа

Цікава заўважыць, што разломы дае ня толькі брак акцэнтаў на моцных месцах пэонаў, а наагул уся будова радка, у тым ліку «лішнія» націскі канстанты. Калі мы ў гэтых радкох з разломамі адсячэм дзеля экспэрымэнту канцавыя словы, дык атрымаем новы перасмык і няспраўджаны пэон першы абернецца слушным, вельмі лёгкім пэонам трэцім без разломаў:

Будуць сл**у**хаць ледзян**ы**я...
месяц**о**вае сьвятл**о**...

Куды часьцей за пэон першы можна спаткаць трохступовы пэон трэці, тоесны нецэзураванаму шасьціступоваму харэю. Яго

структуры – праўда, не да канца вытрыманыя – досыць часта трапляюцца ў народных песьнях. Адсюль – частае ўжываньне трэцяга пэону ў стылізацыях:

Ах, Лявоніха, Лявоніха мая!
Спамяну цябе ласкавым словам я, –
Чорны пух тваіх загнутых брывянят,
Вочы яркія, вясёлы іх пагляд;
Спамяну тваю рухавую пастаць,
Спамяну, як ты умела цалаваць.
Максім Багдановіч

Або:

Ще щебече у садочку соловій
Пісню любую весноньці молодій,
Ще щебече, як віддавна щебетав,
Своім співом весну красную вітав.
Іван Франко

Аднак гэты памер ня мае жорсткае фальклёрнае прывязанасьці. Падазраю, што паэты з добрым пачуцьцём рытму зьвяртаюцца да пэону міжволі, калі хочуць надаць лёгкасьці свайму «харэю»:

ажываць пэрсанажы анэкдотаў
з падсьвядомасьці выходзяць на пленэр
зноў матросаў закрывае дзіркі дотаў
зноўку бацьку падстаўляе піянер
Андрэй Хадановіч
Прымяркоўваючы даныя прыклады пэонаў да іх карацейшых, «меншступовых» узораў, можна заўважыць, што выбухі мажлівыя толькі на пачатных іктах – і пажадана пры нулёвай анакрузе. Наагул, чым карацейшая анакруза, тым вальнейшае віхтаньне пачатных іктаў. Вершы з задоўжанаю анакрузаю, наадварот, менш гнуткія. Пры нагодзе варта патлумачыць, чаму асобныя адцінкі з трохскладоваю анакрузаю я пазначаю як імаверныя дактылі. Адказ дае апісаньне дзесяцьцёвіка: тры склады доўгае анакрузы тоесныя тром перадканстантавым складом пяціскладовага паўрадка. Значыць, доўгая анакруза мае паддастаткам складоў, каб пераструктуравацца ў асобную

рытмавую адзінку, ствараючы цяжкасьці для вершаваньня. У гэтым і замыкаецца яе нутраная дэструкцыйнасьць, пра якую ня раз успаміналася.

Якраз таму асаблівымі рарытэтамі ў гісторыі вершаваньня ёсьць цьвёрда вытрыманыя шматступовыя пэоны чацьвёртыя. А. Квяткоўскі для першага выданьня свайго слоўніка не знайшоў у ладнай гісторыі расейскае літаратуры належнага кшталту і таму мусіў сам штучна стварыць такі ўзор, досыць няўдалы, за што быў рэзка высьмеяны. Пазьней у якасьці прыкладу ён прытарнаваў дзьвюхступовы ўрывак з чатырохступовага «ямбу» А. Пушкіна, дзе пэонавая структура не зацямняецца ямбавымі ўсплёскамі. І толькі ў 1966 годзе даным памерам уклаў асобны верш А. Кушнер. З гэтае нагоды варта асабліва вітаць беларускую паэтку, якая інтуіцыйна, і ў цэлым амаль што дакладна, здолела ўлавіць наравісты плыў трохступовага пэону чацьвёртага:

Бо на адн**о** дастане с**і**л – даткненьнем г**і**бкім
Сушыць наг**і** маленькай м**о**крыя адб**і**ткі
На шэрым п**о**крыве бэт**о**ннай палас**ы**
І спрабав**а**ць спатоліць в**я**лае тамл**е**ньне,
Яе спадн**і**цай абвів**а**ючы кал**е**ні,
Яму разбэрсаўшы на в**о**чы валас**ы**.

Наталья Кучмель

Пэўна што лішне будзе далей апісваць усе кшталты пэонаў ці іх парушэньні. Але разгледзім пад тое яшчэ адзін прыклад, каб у чытача ня склалася аблуднае ўяўленьне, быццам частку «ямбаў» ды «харэяў» запраўды можна ператлумачыць як пэоны, затое рэшта, якая не ператлумачваецца, – гэта ўжо, маўляў, шчырыя «ямбы» ды «харэі». Менавіта так разважалі нешматлікія абаронцы пэонаў накшталт У. Пяста. Насамрэч «непэонаў» сярод «дзьвюхдольнікаў» не бывае, бываюць толькі неўрэгуляваныя пэоны:

Як п**а**церкy да п**а**церкі, / з*а* годам г**о**д (1)
Н*а* шнур жыцьц**я** ўсё / н**і**жа, / \ н**і**жа; (2)
Адна з тых п**а**церак сьцюдз**ё**ная, як л**ё**д, (3)
Другая ц**ё**плая, як с**о**нца летні ўсх**о**д, (4)
А тр**э**цяя / – як т**о**й чарвяк з-пад кр**ы**жа. (5)
*А*дна дал**е**й, / друг**а**я сэрцу бл**і**жай, (6)
*А*дна, як кв**е**тка, / а друг**а**я, як ас**о**т... (7)

Янка Купала

Запраўдную структуру такога вершу цяжка ўлавіць дакладна, хоць фармальна перад намі «шасьціступовы ямб», з дамешкамі «пяціступовага». Гэта якраз тая мяжа даўжыні, дзе памер не ўспрымаецца на слых. Дапамагчы можа скандоўля ці альтэрнацыя. Аднак рэальна альтэрнацыя вытрымваецца толькі ў 3-м ды 4-м радкох. Рэшту вершу працінаюць разломы, якія даюць нам і пэоны, і дактылі, і нават леймаваны сэгмэнт на канцы 2-га радка. Узьнікае пытаньне: як жа гэтулькі гадоў паэты пісалі, асьлепленыя «ямба-харэізмам»? Практыка паказвае, што пісалі па-рознаму, у залежнасьці ад таго, хто якія мэты перад сабою ставіў. Памеры кароткія і цэзураваныя, як мы бачылі, маюць мэханізмы да самарэгуляцыі. А ў доўгіх многія паэты таксама давалі рады ўлавіць альтэрнацыю. Калі ж не, дык унутры вершу ўтваралася невідомая «лесьвіца Маякоўскага» – я думаю, што менавіта разломы і леймы падрыхтавалі нашае вуха да яе ўзьнікненьня.

Як бачым, пэонавая вэрыфікацыя рытму істотна дапамагае падоўжыць радок без запраграмаванага падзелу мэдыянаю і незапраграмаванага падзелу разломамі. Праўда, звышдоўгіх цэльных пэонавых радкоў ня надта шмат. Кожны зь іх – таксама свайго роду рарытэт. Дзеля нястачы патрэбных беларускіх прыкладаў возьмем урывак з расейскага тэксту:

Заигр**а**й-сыграй, таль**я**ночка, мал**и**новы мех**а**,
Выход**и** встречать к ок**о**лице, крас**о**тка, жених**а**.
Василь**к**ами сердце св**е**тится, гор**и**т в нём бирюз**а**,
Я игр**а**ю на таль**я**ночке про с**и**ние глаз**а**.

Сяргей Ясенін

Гэты верш дасюль недаацэнены вершазнаўцамі. Гучыць ён неяк дзіўна – запраўды, як граньне гармоніка. Рэч у тым, што чым даўжэйшая фраза, тым хутчэйшы яе тэмп, таму радкі, якія захоўваюць цэльнасьць вымаўляюцца адным уздыхам. Аднак доўгі радок, нават добра альтэрнаваны, часьцей за ўсё не вытрымвае адзінства, і калі яго не разьядаюць хаатычныя разломы, дык сымэтрычна дзеліць мэдыяна:

Шары пр**ы**цемак пав**о**лі // зьлізваў б**а**рвы навак**о**льля.
Горад ст**о**йваўся і гл**у**хнуў. // Змрок нас**о**ўваўся густ**ы**.
Ані г**у**ку, ані р**у**ху... // Толькі б**у**лькалі на к**у**хні
Аднаст**а**йна, мерна, гл**у**ха // кроплі ц**я**жкія вад**ы**.

Алег Мінкін

Дык чаму ж радкі слушнага «васьміступовага харэю» С. Ясеніна

і А. Мінкіна паводзяць сябе па-рознаму? У першага яны ўтвараюць вельмі рэдкі суцэльны альтэрнаваны радок, а ў другога, захоўваючы альтэрнацыю, дзеляцца на два паўрадкі. Ці, іншымі словамі, верш Ясеніна зьяўляе адзін чатырохступовы пэон трэці, а верш Мінкіна – два дзьвюхступовыя пэоны трэція. Вышэй мы ўжо казалі: усе загадкі вершаваньня замыкаюцца ў сылябіцы. А гэта значыць, што калі пільна сугадаць факты г. зв. сылябічнае паэзіі, то мы атрымаем адказы і на пытаньні сыляба-тонікі.

З грунту, адказ просты: у Ясеніна сынэрэза стрымвае падзел радка, а ў Мінкіна дыярэза ператвараецца ў цэзуру і спрыяе дыхатаміі. Ясенін унікнуў дыхатамічнага распаду радка, бо месца меркаванае цэзуры ў яго прыпадае на сярэдзіну слоў *тальяночка, околица, светится*. Падзел, каб і ўзьнік за гэтымі словамі, даў бы анакрузу другіх паўрадкоў, адрозную ад анакрузы першых паўрадкоў. Словы на месцы мажлівае цэзуры становяць сабою адумысныя чыньнікі, якія можна абазначыць як *шпоны*. У кароткім радку шпоны не адыгрываюць жаднае ролі, бо рытмавая цэльнасьць захоўваецца бязь іх. Затое ў доўгім цэльнасьці радка можна дабіцца толькі пры дапамозе шпонаў ці сынэрэзы, дзе апошняя становіць сабою зьяву, а першыя – элемэнты, што ўтвараюць тую зьяву.

Як дыхатамія адбываецца – варта прыгледзецца пільней. Для «натуралізацыі» нам патрэбен шаснаццацірадковік, у якім заразом прачытваецца слушны васьміступовы харэй і падзел на ступы супадае з падзелам на словы. Усё разам гэта дае магу сячы радкі да апошняга кванту, якім стане *слова як ступа харэю*. Падобных вершаў у чыстым выглядзе практычна не бывае, але досыць і аднаго добрага радка з «Пэнтатэўгума» Андрэя Белабоцкага, «расейскага беларуса» XVIII ст.:

Ш*а*хом / н**е**бо // хощеш / вз**я**ти, /// м*а*т ти / ск**о**ро // в *а*де / будет.

Перад намі звышдоўгая адзінка – даўжэйшых паэты-сылябісты проста не практыкавалі. Чыста тэарэтычна дыярэзы дазваляюць расьсячы яе на дзьве, чатыры і восем адзінак. Аднак ня ўсе падзелы аднолькава пажаданыя (графічна гэта паказвае колькасьць цэзуравых рысачак). *Шаснаццаціскладовік* «ахвотна» дзеліцца (///) на два *васьміскладовікі*, тыя – ужо «меней ахвотна» – дзеляцца (//) на чатыры *чатырохскладовікі*, і апошнія – «зусім неахвотна» – дзеляцца (/) на восем

двухскладовікаў. Як бачым, чым глыбейшы падзел, тым ён гвалтоўнейшы. Зь іншага боку, звышдоўгі радок – таксама рэч гвалтоўная, нездарма ён так лёгка пасёкся напалам.
Такім парадкам, аптымальная даўжыня дадзенае дыхатаміі – восем складоў, клясычны памер беларускіх паэтаў «арганічнае пары». Ніжэйшы межань (*пэон трэці*) становіць сабою *структуру* паўрадка, заснаваную на моцных іктах. Найніжэйшы межань (*харэй*) зьяўляе *інфраструктуру* структуры, заснаваную на моцных і слабых іктах. А найвышэйшы межань утварае свайго роду *супраструктуру*, апісваную часьцей за ўсё як *цэзураваны шаснаццаціскладовік* ці як *цэзураваны васьміступовы харэй*, радзей – як *цэзураваны чатырохступовы пэон трэці*. Калі ніжэйшы і найніжэйшы межні могуць разглядацца як *дзяленьне* цэльнае рытмавае адзінкі, дык найвышэйшы, наадварот, – выглядае як *складваньне* гэтых адзінак. І, нарэшце, калі паўрадок і адзінка яго структуры, пэон, утрымваюць усе тры віды складоў, дык у харэі заўжды бракуе ці моцнага, ці слабога ікту, што гаворыць пра *несамастойнасьць харэю*.
У несамастойнасьці двухскладовых памераў можна таксама пераканацца на прыкладзе аналягічнага «васьміступовага ямбу», дзе пад націскам стаяць усе моцныя склады – і ямбаў, і пэонаў, – але вольна чытаюцца толькі пэоны. Заразом дыхатамія тут, як і ў Мінкіна, можа разглядацца як вынік складваньня натуральных карацейшых адзінак у ненатуральны звышдоўгі радок:
Ты – мой зак**о**н, мая душ**а**, // мая рэл**і**гія, мой Б**о**г.
І кожну хв**і**лю я таб**е** // малітвы н**о**выя твар**у**.
Табой я шч**а**сьліў, я – твой ж**р**эц, // хвалу таб**е** пяе мой р**о**г.
Я – сеўбіт тв**о**й, я – твой рат**а**й, // я палас**у** тваю ар**у**.
Зьмітрок Бядуля

Дзяленьне і складваньне – падставовы сродак страфаваньня, які практыкаваўся ў антычным вершаваньні і, як мы ня раз пераканаемся, у беларускай сылябіцы. А праз апошнюю натуральна лучыў у блізкія да сылябікі ўзоры сыляба-тонікі. Вось, прыкладам, складаная страфа (нягледзячы на простую рымоўлю), утвораная чыста праз дыхатамію васьмірадковіка:

Гэй, ты м**а**ці, родна м**о**ва,
Гэй, ты зв**о**н вялікі, сл**о**ва,

Звон маг**у**чы,
Звон бліск**у**чы,
З срэбра л**і**ты,
З злота зьб**і**ты,
Загрым**і** ты,
Загрым**і**!
Алесь Гарун

Сказаць, што першыя васьміскладовыя радкі (а даўжыня іх аптымальная) маюць цэзуру, было б перабольшаньнем. Цэзура тут хіба толькі намяркоўваецца. Але патэнцыйна, дзякуючы дыярэзе ў першым радку, верш «гатовы» да цэзуры, нават глыбейшага распаду, што і паказвае рэшта страфы. Варта зацеміць: у аснове цэзуры ляжыць падзел слоў, часьцей за ўсё рэгулярны, аднак далёка ня ўсякі падзел, нават рэгулярны, дае цэзуру. Цэзура ўтвараецца агульным заданьнем вершу, і пры патрэбе, у якасьці кампэнсатарнае анамаліі, гэткае «паэтычнае вольнасьці» можа праходзіць нават праз слова. У вылучэньні цэзуры, так ці інакш, ёсьць момант суб'ектыўнасьці. Разгледзім яшчэ адну дыхатамічную страфу:

Рвіце, дз**е**ткі,
Сабе кв**е**ткі,
Вянкі в**і**йце,
Мядок п**і**йце!..
Пройдзе п**е**ршае мал**е**нства,
Прыйдуць р**о**слыя гад**ы** –
Пройдзе в**о**ля, пройдзе шч**а**сьце,
Прыйдуць кл**о**паты тад**ы**...
Алена
У Алены васьмірадковая частка страфы цальнейшая, чым у Гаруна, бо яе нітуе радковая сынэрэза. Надзвычай цікава ў страфе вылучаюцца і чатырохскладовыя радкі. Яны ўсе (апрача 1-га) маюць інвэрсіяваны харэй. І хоць падзел слоў тут фармальна дае дыярэзу, аднак інвэрсія стрымвае мажлівасьць далейшае дыхатаміі. Рытмічнасьці ж вершу яна яўна ня шкодзіць.
У выніку чарговы раз нельга не пагадзіцца з А. Квяткоўскім, што двухскладовыя ступы наагул немажлівыя як адзінкі рытму. Нават у сыляба-танічнай дактрыне яны не існуюць, а толькі

даўнімаюцца, бо служаць *спосабам* (не зусім дасканалым) *вэрыфікацыі* рытму. Ямб і харэй не ўзьнікаюць пры вольным чытаньні вершу, а толькі пры штучным скандаваньні. Зрэшты, як зазначае той жа А. Кваткоўскі, ёсьць шэраг вершаў, што чыста інтанацыйна, дзеля патрэбаў сэмантыкі, вымагаюць скандоўлі. Але вынятак толькі пацьвярджае правіла: умоўнасьць існаваньня двухскладовых ступ. Часьцей за ўсё гэта дзіцячыя лічылкі ды адпаведныя стылізацыі:
– Ч**ы**жык, / ч**ы**жык, / дз**е** ты / б**ы**ў?
– **Я** на / Б**е**лай / Р**у**сі / ж**ы**ў:
Б**а**чыў / сьлёзы, / ж**а**лю / кр**ы**к,
Як га/р**у**е / т**а**м му/ж**ы**к...
Гальяш Леўчык

Скандоўля можа быць удалым спосабам гукаперайманьня і належнага эфэкту дасягае тады, калі падзел ступ падкрэсьлівае дыярэза:

Зв**о**ны / зв**о**няць, / зв**о**няць, / зв**о**няць
Ў час начн**ы**...
Гр**у**кат, / г**о**ман, / зв**о**няць / ў зв**о**ны
Званар**ы**.
Зінаіда Бандарына

Раз двухскладовая амплітуда націскаў становіць сабою інфраструктуру чатырохскладовых памераў, дык адразу ўзьнікае пытаньне – ці заяўляе яна аб сабе хоць якім спосабам у памерах трохскладовых? З гэтае нагоды раскажу цікавае здарэньне з практыкі. Неяк адна кандыдатка расейскае філялёгіі (сёньня ўжо доктарка), якая выкладала мне ў універсытэце, заўважыла, што ня любіць Я. Яўтушэнкі за верш:

Идут белые снеги,
как по нитке скользя...
Жить и жить бы на свете,
да, наверно, нельзя.

Маўляў, у адным радку ён умудрыўся двойчы парушыць нормы расейскае літаратурнае мовы, ужыўшы формы ***и**дут* і *сне**е**ги* замест *ид**у**т* і *снег**а***. Я доўга пераконваў сваю ўнівэрсытэцкую настаўніцу, дзей слова *ид**у**т* трэба чытаць звычайна, бо верш

напісаны анапэстам і два першыя склады стаяць у слабой пазыцыі. Сёньня я магу дадаць: нават калі б паэт і ўжыў пераакцэнтуацыю, усё роўна меў бы на тое права, бо менавіта такі націск трываў за норму ў расейскай паэзіі XVIII ст., і варыянт ***и**дут* можна ўважаць за паэтызм ці архаізм. Няведаньне паэтыкі і гісторыі мовы – досыць сьмешная падстава для снабізму і пурызму. Але адзінае, у чым я не магу ўпікаць свае суразмоўцы, – гэта тонкі слых, добрая інтуіцыя мовы.

Рэч у тым, што доўгая двухскладовая анакруза анапэсту – гэта ледзь не адзіная прастора ў трохскладовых памерах, дзе рэгулярна дае аб сабе ведамасьць пульсацыя слабых іктаў. Тое, што муляла чуйны слых у вершы Я. Яўтушэнкі, ня што іншае як «эфэкт спандэю» ў трохскладовым памеры. Калі ў тэрмінах часоў Трэдзіякоўскага разьвіваць думку далей, дык на добры лад тут мусіў стаяць «харэй» або «пірых». Вось яшчэ адзін узор падобнае інтуіцыі ў анапэсьце:

Сонцам змытая і аблітая,
Ўся у кветачках – наша сьцежачка!
Аркадзь Моркаўка

Чаму аўтар паставіў *ў* пасьля коскі на пачатку радка? У яго ж была мажлівасьць, практычна нічога не мяняючы, унікнуць неўласьцівага беларускай мове каўтаньня гуку:

Уся ў кветачках – наша сьцежачка!

Хутчэй за ўсё, гэта ня проста неахайнасьць, а жаданьне ўнікнуць таго самага «спандэю», ці, фармальна, «моласу» («трымакру»), які для паэта выглядаў жахлівейшым за каўтаньне *ў* на пачатку радка, і таму ён выбраў «харэй», а фармальна – «амфімакр». Выходзіць, слабыя ікты трываюць ня толькі ў пэонах, ня толькі ў сылябіцы, але зрэдку і ў трохскладовых памерах. Ведама, антычнымі ступамі гэтую зьяву мы пазначаем умоўна, бо ўсякая іншаякасная ступа толькі парушае адзінства рытмавага працэсу. «Молас» тут ёсьць звычайнаю сысталаю, а «амфімакр» – свайго роду «рэха» рытму. Дарэчы, Г. Шэнгелі некалі статыстычна давёў, што паэты ў пачатку анапэстаў досыць ахвотна тарнуюць «амфімакры» і ўхіляюцца ад «моласаў», прыкладам:

Жд**а**ў вясн**ы**, бач, – і сьн**е**г распусьц**і**ўся,
Ш**у**м пайш**о**ў па рак**а**х, па ляс**а**х;
Сьв**е**т вяс**е**ньняга с**о**нца разьл**і**ўся

П*а* ўсіх ч**ы**ста зям**е**льных вугл**а**х.
Іван Піліпаў
Вось жа, на кожным кроку мы ўпэўніваемся, што тэорыя ступ і сыстэм вершаваньня ў тым выглядзе, у якім яна дагэтуль бытуе, уступае ў яўную супярэчнасьць з матэрыяй вершу. Заразом з апісаньняў не зусім зразумела – скуль бярэцца інварыянт, чаму ён дапускае інвэрсіі, колькі сэгмэнтаў вершу можа абымаць інвэрсія? Хоць пад тое мы чамусьці дакладна ведаем, што інварыянтам гэтых радкоў, наскрозь інвэрсіяваных, трэба ўважаць менавіта пэон трэці, які тоесны «чатырохступоваму харэю»:
З а й г р а й, з *а* й г р а й, хлопча м**а**лы,
І ў с к р ы п *а* ч к у і ў цымб**а**лы,
А я з *а* й г р а ю у д**у**ду,
Б о ў К р о ш *ы* н е жыць ня б**у**ду.
Паўлюк Багрым
5. **Сума сынхраніі вершаваньня.** Можна заўважыць, што ўсе пададзеныя вышэй апісаньні вершаў зьяўляюць нам радкі ці паўрадкі як нейкую мінімальную завершаную існасьць, якая, паўтараючыся і вар'юючыся, задае інварыянт рытму і ў пэўнай ступені адпавядае інтанацыйнаму, сынтаксычнаму, сэмантычнаму ды лягічнаму адзінству.
«Найпрасьцейшая адзінка маўленьня як сацыяльнае зьявы, – лічыў Л. Цімафееў, – гэта інтанацыйна закончаны адцінак маўленьня, фраза… і рытм, як зьява маўленьня, ня можа быць пабудаваны іначай, чым само маўленьне». Агульны «накід рытму», базу для канстанты, наяўнасьць якой аб'ядноўвае розныя «сыстэмы» вершаваньня, дае сама мова. «Фразавы націск, – зазначаў А. Рэфармацкі, – гэта галоўны націск з сэрыі націскаў слоў, якія ўтвараюць фразу. Калі вымкнуць гэтак званы лягічны націск і ўзяць фразу апавядальнага нэўтральнага стылю, [дык] гэта націск апошняга слова фразы, незалежна ад таго, якая гэта часьціна мовы і што гэтае слова значыць». Аднак паводле Цімафеева «верш ёсьць сыстэмаю маўленьня», і для яго ўзьнікненьня патрэбен яшчэ шэраг чыньнікаў: 1) «пасьлядоўная паўтаральнасьць аднародных зьяў; 2) «пэўны тып вымаўленьня, ці, інакш, перажываньня гэтага маўленьня». Менавіта ў кантэксьце цэлага ісьніцца інварыянт вершаванае адзінкі, назавем яго *рытмэмаю*.
Першым подступам да адкрыцьця рытмэмы быў празадыйны

пэрыяд А. Х. Вастокава, які паказаў амаль што на ўсе яе *вонкавыя* асаблівасьці: «Лічацца ня ступы, не склады, а *празадыйныя пэрыяды*, г. зн. націскі, паводле якіх і можна мераць вершы. <…> Калі словы займаюць сваё месца ў пэрыядзе ці ў радку, тады нярэдка, з лучнасьці думак, імі выяўляных… трацяць яны або ўзмацняюць свой націск на карысьць сумежных», нібы зьліваючыся ў «адно вялікае складанае слова… праз адабраньне націскаў» у рэшты слоў. «Празадыйны пэрыяд» «мае свае натуральныя абсягі: пры адным складзе, павышаным ці з націскам, можна вымавіць ня болей складоў паніжаных ці бяз націску, колькі дадуць рады грудзі чалавечыя, не зьмяняючы духу». Гэта было вялікае адкрыцьцё. Калі б Вастокаў здолеў разьвіць яго шырэй і знайшоў аднадумцаў, дык паэзія абрала б іншы фарватэр разьвіцьця, не гаворачы ўжо пра вершазнаўства.

Зусім невыпадкова гэты панятак датычыў г. зв. «танічнага» вершаваньня. Але лучнасьць, узьніклая пры адным парадку націскаў, ня можа зьнікаць пры іншым. На жаль, Вастокаў, скупаваўшыся на паэзіі народнага складу, адлучыў сваё адкрыцьцё ад «сыляба-танічнага» і «сылябічнага» вершу, якія з грунту таксама «танічныя». Пры такім падыходзе ён ня мог даць апісаньня рытмэмы з нутра. А тая, мы ведаем, кшталтавалася менавіта ў сылябічным вершы. Зрэшты, пры зародкавым стане мовазнаўства большага выніку чакаць было цяжка. Тым часам *нутраная* будова рытмэмы спасьцігалася супраціўнаю школаю А. Кубарава, які даводзіў: «У даўнейшых ступа, а ў нас такт – паняткі тоесныя». Пазьней розныя аўтары набліжаліся да рытмэмы і з нутра, і з вонку, пішучы пра *колян, такт, кроць, тактамэтравы пэрыяд, фанэтычнае слова, рытмавую структуру, рытмава-мэлядычную матрыцу, мэтрычны ключ, ступовую дамінанту, рытмавую дамінанту* і г. д.

Рытмэмы розьняцца паміж сабою колькасьцю складоў і парадкам націскаў, які ў статычным апісаньні прынята называць ступою. Аднак на гвалт ня трэба блытаць такія прынцыпова розныя рэчы, як ступа і рытмэма. Ступа – чыста ўмоўны адцінак рытму. Гэта нават ня «квант», а толькі «малюнак» паўтарэньня рытмавага працэсу, які па-за рытмэмаю не існуе, як не існуе націск па-за словам. Рытмэма, наадварот, рэальная і завершаная рытмавая фігура, хоць яна, як і ступа,

набывае вершавы сэнс толькі пры паўтарэньні. У аснове рытмэмы ляжыць радок ці паўрадок. Вонкавае адрозьненьне ступы і рытмэмы ў тым, што ступа да ступы прылягае «шчыльна», а рытмэмы адна ад другой аддзяляюцца цэзураю або радковаю паўзаю. Можна сказаць так: калі рытмэма *элемэнт*, дык ступа – *інтэгрант* элемэнту.

У сылябічным вершы рытмэма ўзьнікае арганічна і мае даўжыню ад пяці да дзевяці складоў. Пры большай колькасьці радок распадаецца на паўрадкі карацейшых рытмэмаў. У аснове рытмэмы ляжаць моцныя апорныя іікты, якія імкнуцца да максымальнае гармоніі як інварыянту, які няцяжка пераглумачыць у ступах. Ідэя ступ, сваім парадкам, дазваляе ўсталяваць канстантавы або псэўданканстантавы рытм. Пры канстантавым рытме можна падоўжыць рытмэму да трынаццаці і болей складоў. Аднак рытмэма на шаснаццаць складоў, як мы ўжо бычылі, розломваецца пад уласнай вагою незалежна ад парадку іктаў. У гэтым разе яе можна захаваць пры дапамозе сынэрэзы, якая чыста тэхнічна дазваляе доўжыць рытмэму бясконца. Праўда, апошняе немажліва зь меркаваньняў дэклямацыйных: не «дадуць рады грудзі чалавечыя».

У сылябічным вершаваньні і даўжыня ступы (ці, лепш сказаць, структура рытмэмы) таксама праяўляецца арганічна, вагаючыся ў абсягах трох-чатырох складоў. Гэта добра паказвае такая зьява, як *разьбяганьне моцных іктаў*. Пяціскладовая рытмэма з простаю кляўзулаю мае за інварыянт форму *дактылю* (**о**ооо**о**о), бо два ненацісьненыя склады – гэта максымальна мажлівае ў ёй аддаленьне пульсанты ад канстанты. Шасьціскладовая – мае інварыянтам *пэон першы* (**о**ооо**о**о), бо тры ненацісьненыя склады таксама ёсьць максымальным аддаленьнем моцных іктаў. Але ўжо ў сьміскладовай і васьміскладовай іікты далей чым на тры склады не разьбягаюцца, і таму інварыянтамі адпаведна выступаюць *пэон другі* (о**о**ооо**о**о) і *пэон трэці* (оо**о**ооо**о**о). Значыць, аптымальнаю амплітудаю моцных іктаў ёсьць *тры ненацісьненыя склады*.

Тут вельмі дарэчы было б успомніць заўвагу, што рытмэма як вершавая сынтагма «праз адабраньне націскаў» утварае нешта накшталт «складанага слова». А ведама, у слове на чатыры склады і болей заўжды ўзьнікае дадатковы, паслаблены націск. Заразом гэты паслаблены націск зьяўляецца не адвольна, а на

аптымальным аддаленьні ад асноўнага моцнага. Вось жа, менавіта дадатковы націск і дае той эфэкт, які праяўляецца ў выглядзе ямбу ды харэю, задаючы рытмэме інфраструктуру *ўсплёскаў* як слабых іктаў, падпарадкаваную структуры *валоў* як моцных іктаў. Моцныя ікты могуць сьцягвацца (у «цеснай» рытмэме арганічна або, пры канстантавым рытме, штучна), утвараючы трохскладовыя памеры, дзе для інфраструктуры ўжо амаль не застаецца месца. Як вынятак, ікты таксама могуць аддаляцца, даючы пяці- і нават шасьціскладовыя ступы, колькі дазволіць даўжыня слоў.

Такім спосабам рытмавы працэс адбываецца ў абсягах рытмэмы. Агульны парадак рытму, тая інварыянтная схема, да якой верш у працэсе свае дынамікі найахвотней вяртаецца, залежыць ад даўжыні радка. Але не ўсяе даўжыні, а той, якую можна назваць *актуальнаю*, – г. зн. ад анакрузы і да канстанты ўлучна. Ці, калі гаварыць яшчэ дакладней, наадварот – *ад канстанты і да пачатку радка*. Рытмаваю дынамікаю, яшчэ да чытаньня, праймаецца ўся актуальная частка, становячы сабою *напружаны шэраг радка*. Фактычна, напружаны шэраг – гэта і ёсьць адна вялікая анакруза, якая ўпіраецца ў канстанту. Парадак чаргаваньня складоў у радку задаецца «з хваста», ад рытмавае канстанты як наймацнейшага, фразавага акцэнту. Тут нарэшце здымаецца дылема, які рытм ёсьць першасным – радковы ці ступовы (тактавы), – як у свой час была зьнятая спрэчка аб карпускулярнай і хвалевай прыродзе сьвятла. Напружанаму шэрагу, што вызначае інварыянт рытмэмы, праціўляецца *вольны шэраг* кляўзулы, які нібыта нічога не вызначае, але таксама далёка не нэўтральны. Калі першы надае рытму *колер*, дык другі – *адценьне*. Маюць сэнс і іх прапорцыі. Найяскравей уплыў вольнага шэрагу праяўляецца ў рытмэмах з кароткім напружаным шэрагам. Ці, іншымі словамі, уплыў кляўзулы на гучаньне радкоў проста прапарцыянальны яе даўжыні і адваротна прапарцыянальны даўжыні рытмэмы. Сюды дапасоўваецца тое, што Л. Шчэрба пісаў пра асобнае слова: «Занаціскавыя склады псыхічна слабыя… няздатныя да праясьненьня… Усе пераднаціскавыя склады здольныя да дваякага вымаўленьня – слабога і моцнага, распадзельнага». Доўгаю кляўзулаю «выстаўляецца папярэдні моцны націсьнены склад». А ў выніку – «і ўсё слова», што, само сабою, адбіваецца на рытмэме. Падобнае сьцьвярджае Г. Шэнгелі: «Голасу лягчэй

пераадолець шэраг пераднаціскавых складоў, чым шэраг пасьлянаціскавых».
І ўсё ж, як бы ні мяняўся вольны шэраг, пакуль захоўваецца неадменнасьць напружанага шэрагу – рытмавы інварыянт таксама захоўваецца. Заразом можа ўзьнікнуць пытаньне: раз малюнак рытму вызначае не агульная даўжыня радка, а толькі актуальная, у адліку ад рытмавае канстанты, значыць, усе сылябічныя памеры варта было б паменаваць лічбамі на парадак меншымі? Агульная колькасьць складоў радка мінус склады кляўзулы. Прыкладам, не васьмі-, а *сямісклададовікі*, не шасьці-, а *пяціскладовікі*. Балазе, гэткага «рэвалюцыйнага» глуму нам рабіць не давядзецца, бо ўперад мы абачліва дамовіліся браць за норму простую, а не тупую кляўзулу. Праўда, у такім разе вершы з кляўзуламі, даўжэйшымі ці карацейшымі за простую, усё роўна мы мусім характарызаваць, робячы паправу на яе. А наагул, менаваньне тут не адыгрывае істотнае ролі.
Тое, што рытмэма становіць цэльны арганізм, які разрастаецца ад канстанты да анакрузы, пацьвярджаецца *законам рэгрэсійнае акцэнтнае дысыміляцыі*, апісаным у К. Тараноўскага: апошні ікт заўжды наймацнейшы, яго запабягае найслабейшы перадапошні ікт, далей наперад зьяўляецца зноў моцны, але ўжо слабейшы за апошні, тады – чарговы слабы, які ўсё ж крыху мацнейшы за найслабейшы, – і гэтакім спосабам аж да пачатку радка ідзе чаргаваньне моцных ды слабых іктаў з адпаведным паслабленьнем кантрасту паміж імі. Праводзячы аналёгію псыхікі зь фізычнымі зьявамі, можна сказаць так: рытмэма – гэта *асяродак*, канстанта – *пачатковы імпульс*, рытмавы працэс – *разгортваньне імпульсу*, а ступа – *адзінка яго вымярэньня*, «хваля».
У схілку, існасьць праблемы можна выразіць адною формулай: падставаю мернага вершу ёсьць гамагеннасьць рытму, якую задае *закон адзінства рытмавага працэсу*, або *расьпеў* (назавем так на чэсьць Бажыдара, які першы наблізіўся да яго адкрыцьця ў сваім трактаце «Расьпеўнае адзінства»). Як праяўляецца гэты закон – паказвае **празадыйная піраміда**:

O(x)
o**O**(x)
Oo**O**(x)
oOo**O**(x)

OoOo**O**(x)
o**O**oOo**O**(x)
Oo**O**oOo**O**(x)
oOo**O**oOo**O**(x)
OoOo**O**oOo**O**(x)
o**O**oOo**O**oOo**O**(x)
Oo**O**oOo**O**oOo**O**(x)
oOo**O**oOo**O**oOo**O**(x)
OoOo**O**oOo**O**oOo**O**(x)
o**O**oOo**O**oOo**O**oOo**O**(x)
Oo**O**oOo**O**oOo**O**oOo**O**(x)

Піраміда падае арганічны парадак гармоніі складоў: націсьненых валоў (**O**), слаба націсьненых усплёскаў (O) і ненацісьненых роўняў (o) – у напружаным шэразе, а таксама адменлівую колькасьць складоў (x) у вольным шэразе. Парадак валоў вызначае інварыянты рытмэмаў. Адхіленьне

ад парадку
мяняе
інварыянт і
таму не
дапускаецца.
Рэдкія
адхіленьні
валоў
дапускаюцца
толькі ў
пачатку
рытмэмы
праз
паслабленьне
дзеяньня
закону
рэгрэсійнай
акцэнтнай
дысыміляцыі.
Чым
карацейшая
анакруза
пэону – тым
большыя
адхіленьні
дапускае
першы вал.
Рэшта
складоў
даўнімае
адвольную
якасьць без
абмежаваньня
сысталаў ды
інвэрсіяў,
якія
надаюць
інварыянтам
разнастайнасьці.
Піраміда

дарэшты
адпрэчвае як
недарэчнасьць
супраціўнасьць
рытму і
мэтру. Тыя
адхіленьні
ад ідэальнае
схемы, што
пэўны час
называлі
рытмам,
ёсьць усяго
толькі яго
варыянтамі
ці
мадыфікацыямі.

Найбольшыя адхіленьні ад парадку піраміды дазваляла сабе не сылябічнае, а якраз сыляба-танічнае вершаваньне, што прыводзіла да парушэньня адзінства рытмавага працэсу. Аднак у запраўднасьці аніводная тэорыя вершаваньня ня сьледавала як трэба парадку гармоніі складоў. Часамі паэты з добрым слыхам, якія ня ведалі жаднае тэорыі, пісалі слушней, чым тыя, што паводзіліся недасканалымі правіламі. Сёньня піраміда дазваляе ўнікнуць колішніх парушэньняў сьпеўнасьці вершу. Вершаваньнік, які пільнуецца парадку моцных іктаў, адкрывае для сябе права асабліва вольна адхіляцца ад слабых іктаў, расчышчаючы тым самым дарогу для новых, нязнаных дасюль варыяцыяў рытму. Існыя тэорыі вершаваньня пакуль што ня ўлічвалі гэтае мажлівасьці. Зрэшты, адныя толькі камбінацыі інварыянтаў рознае даўжыні без варыяцыяў дазваляюць сама надзвычайныя мадыфікацыіі.
Спрэчка паміж традыцыйным і нетрадыцыйным вершазнаўствам можа быць зьведзеная да дылемы: што ў вершы важнейшае, пэоны ці ямбы з харэямі, або – такты ці ступы? Пэўна ж, пры такім стаўляньні пытаньня рацыя на баку праціўнікаў двухскладовае мэтрыкі: усё ж каркас радка трымаецца на пэонах-тактах. Але тут важна разам з вадою ня выплюхнуць дзіцяці. Памыляюцца абодва бакі: яны, па-першае,

уяўляюць рытм двухмерным, які тым часам *трохмерны*, і па-другое, канцэнтруюць увагу на канфігурацыі адцінкаў рытмэмы, ступе, але не на радку, не на рытмэме, дзе тыя канфігурацыі ўсяго толькі задаюцца адзінствам рытмавага працэсу.

Калі быць дакладным, дык ані ямбаў, ні харэяў, ані нават пэонаў у вершы не існуе. Ёсьць нутраная дыхатамія траякіх складоў, якую абмыльна можна ператлумачваць як ямбы, харэі ці тыя ж пэоны, чатыроходольнікі, шасьцідольнікі. У неарганічных памерах, дактылях, амфібрахах, анапэстах, пэнтонах (або трохдольніках, пяцідольніках), дзе дыхатамія немажлівая, інфраструктура ўзьнікае толькі на кароткіх адцінках і таму альтэрнансу фактычна няма. Дыхатамію можна вылучыць цотную і няцотную. Калі націскі лічыць ад простае кляўзулы, дык цотнасьць уласьцівая «харэям», а ня «ямбам». З чым жа зьвязаная загадкавая «прыроднасьць» харэю ды «кніжнасьць» ямбу, з чаго вынікае абсалютная перавага харэевай кадэнцыі ў сылябіцы і ў фальклёры? Пэўна што, чым даўжэйшая анакруза, тым большая падстава абцяжараньня яе сысталамі, дыясталамі і паступовае дэструкцыі ўсяго інварыянту.

На падставе чаго ўзьнікае альтэрнанс? Для пачатку ўспомнім дзьве тэорыі імавернасьці: *клясычную* і *статыстычную*. У першай лічба імавернасьці бярэцца апрыёрна ад паловы здарэньняў, а ў другой – апастэрыёрна ў разьліку ад сярэднеарытмэтычнага паказьніка. Адпаведна, першае тлумачэньне альтэрнансу вынікае з патрабаваньня простага ідэальна-гарманічнага разьмеркаваньня моцна-, сярэдне- і ненацісьненых складоў у радку. Другое выходзіць зь сярэдняе даўжыні беларускага слова (3,27), якое задоўгае для трохскладовых памераў і закароткае для чатырохскладовых, – мажліва, у вершы ўзьнікае нешта накшталт эфэкту «інтэрфэрэнцыі». Заўважу, на больш раньняй стадыі разуменьня праблемы ў мяне існавала наагул фантастычная ідэя, дзей моц націску залежыць ад сярэдняе даўжыні слова. Рэшта слоў «насычаюцца» гэтаю моцай, «прасякаюцца» водгульлем, утвараючы характэрную для мовы «прастору выбуху», якая вызначае аптымальную велічыню ступы. Тым больш што націск імкнецца да сярэдзіны слова.

Аднак усе гэтыя гіпотэзы цікавыя толькі як станаўленьне, як

пікантны момант дыялектычнае лёгікі. Калі ж мы ўспомнім той факт, што словы, даўжэйшыя за чатыры склады, маюць дадатковы, паслаблены націск, аптымальна аддалены ад моцнага, тады карціна праясьніцца парадаксальна проста. Тут дзеіць той самы закон, які ў гістарычнай граматыцы праяўляецца пры чаргаваньні моцных і слабых рэдукаваных. У той ці іншай меры ён уласьцівы ўсім славянскім мовам. Фактычна, рытмэма становіць сабою ідэальны адцінак маўленьня, пабудаваны як адно слова. Калі б чалавеку, нібы дудзе ці аргану, для маўленьня не патрабаваліся пэрыядычныя ўдыхі і выдыхі, дык можна было б сказаць, што бясконцая альтэрнаваная фраза і ёсьць слушным гаварэньнем. Проза б тады была самым ненармальным узорам маўленьня. І, хто ведае, можа, дзе ў раі анёлы гавораць якраз на такой ідэальнай мове бясконцых паэтычных радкоў.

У рэальным жа маўленьні ўсякая фраза мусіць завершыцца выдыхам, які ў паэтычным радку дае нам канстанту і абрыў рытмэмы. Далей рытмавы працэс разгортваецца наноў, паўтараючыся раз за разам. Аднак нельга тут забываць і ўвагі М. Трубяцкоя пра *падаўжэньне*, калі няпоўная анакруза кампэнсуецца за кошт паўзы або кляўзулы папярэдняга радка. Гэты эфэкт падказвае нам, што рытмавы працэс ня мае абсалютных абрываў. Заразом ён нібыта супярэчыць іншаму цьвярджэньню Трубяцкоя аб незалежнасьці напружанага шэрагу ад вольнага. Здымаецца гэтая супярэчнасьць тым, што падаўжэньне мае не рэгулярны, а факультатыўны характар. Правіла падаўжэньня найперш вымагае, каб паміж радкамі ўзнаўлялася страчанае пасьля абрыву адзінства рытмавага працэсу.

Тым часам дактылёвая ступа інварыянту «цеснае» пяціскладовае рытмэмы (**о**ооо**о**о) дазваляе ўсталяваць сьцягнутую амплітуду моцных іктаў і праз нарошчваньне новых складоў пры захаваньні адзінства рытмавага працэсу выбудаваць піраміду г. зв. трохскладовых памераў:

Ооо**О**(х)
о**О**оо**О**(х)
оо**О**оо**О**(х)
Ооо**О**оо**О**(х)
о**О**оо**О**оо**О**(х)
оо**О**оо**О**оо**О**(х)

Ооо**О**оо**О**оо**О**(х)
о**О**оо**О**оо**О**оо**О**(х)
оо**О**оо**О**оо**О**оо**О**(х)

Парадак узьнікненьня трохскладовых памераў вымагае асобнага вывучэньня, але пэўна што зародкамі для яго ўсталяваньня служыў памянёны інварыянт, а таксама інвэрсіяваныя варыянты шасьціскладовае (*о***о**ооо**о**о) і васьміскладовае (**о**оо**о**ооо**о**о) рытмэмаў. Вершазнаўцы, якія наўсьлед за М. Чарнышэўскім, адштурхоўваючыся ад сярэдняе даўжыні слова, цьвердзяць пра асаблівую арганічнасьць трохскладовых

памераў, –
памыляюцца.
Невыпадкова
гэтыя
памеры
ўзьніклі
значна
пазьней і не
на падставе
арганічнага
разьбяганьня
іктаў, а ў
выніку
мэтрычнае
дактрыны.
«Сьціснуты»
інварыянт і
некалькі
выпадковых
варыянтаў –
занадта
хісткі грунт
для
натуральнасьці.
Гэтыя
памеры
двухмерныя,
амаль ня
маюць
прасторы
для
інфраструктуры
слабых іктаў
і менавіта з
гэтае
прычыны
жахліва
манатонныя.
Даўнімаю,
сьцягнутасьць

робіць ікты
энэргічнейшымі,
што таксама
спрыяе
манатоннасьці.

Паводле аналёгіі з трохскладовымі сьцягнутымі ступамі можна выбудаваць віртуальную піраміду пяціскладовых «расьцягнутых» ступаў (да якой практычна яшчэ давядзецца вяртацца):

Oooooo**O**(x)
o**O**ooooo**O**(x)
oo**O**ooooo**O**(x)
ooo**O**ooooo**O**(x)
oooo**O**ooooo**O**(x)
Oooooo**O**ooooo**O**(x)
o**O**ooooo**O**ooooo**O**(x)
oo**O**ooooo**O**ooooo**O**(x)
ooo**O**ooooo**O**ooooo**O**(x)
oooo**O**ooooo**O**ooooo**O**(x)
Oooooo**O**ooooo**O**ooooo**O**(x)

Гэтая
структура
таксама не
дазваляе
гарманічна
разьмеркаваць
усплёскі ды
акустычна
разьмежаваць
ікты і
сысталы, але
заразом з
прычыны
абмежаванае
даўжыні
слова
таксама ня
можа
пазбыцца

лішніх
складоў.
Менавіта зь
неўпарадкаванасьці
інфраструктуры
пэнтон мае
адценьне
«дольніка».
Абсечаныя ж
вярхі дзьвюх
апошніх
пірамідаў
гавораць пра
ненатуральнасьць
іх
квазіканстантавага
рытму, калі
толькі
пульсанта,
ператвораная
ў *другую*
канстанту,
дае пачатак
няслушным
структурам.

Аднак усюды мы бачым: інварыянты рытмэмаў і квазірытмэмаў, незалежна ад іх даўжыні, захоўваюць адзінства рытмавага працэсу. Адсюль вынікае, што лягаэдаў, найперш як спалучэньняў ступ рознае прыроды (а ў пэўнай ступені – і радкоў, і строф), быць ня можа. Жыцьцяздольныя толькі такія лягаэды, дзе прасочваецца адзінства рытмавага працэсу. Рэшта лягаэдаў – гэта штучная і нікому не патрэбная празаізацыя вершаў. Парушэньне рытмавага працэсу ў абсягах рытмэмы нельга кампэнсаваць рэгулярным паўтарэньнем гэтага парушэньня. Менавіта ў рэзкіх зьменах рытмавых чаканьняў і замыкаецца цяжкасьць чытаньня радковых лягаэдаў. Будова рытмэмы заўсёды простая, бо падначальваецца закону адзінства. Складаныя ж арабэскі могуць утвараць спалучэньні рытмэмаў, а ня ступ. У тым і замыкаецца майстэрства паэта,

каб выбудаваць арабэсак іктаў, не парушыўшы адзінства рытмавага працэсу.
Умоваю існаваньня ўсіх памераў ёсьць раўнамернасьць чаргаваньня двух ці трох відаў складоў: валоў, усплёскаў і роўняў. Таму надта ненатуральны і ў дыхатамічных памерах, і ў анапэсьце, і ў сылябіцы зьбег націскаў, які называюць *спандэем*. Аднак «спандэй» ня ёсьць і ня можа быць ступою, бо не зьяўляе, а парушае адзінства рытмавага працэсу. Два ікты ўзапар мажлівыя ў мовах з доўгімі складамі, але ніколі – у мовах з моцнымі складамі. Гэта свайго роду рытмавы «вірус». Верш пазбываецца спандэю траякім спосабам: 1) адзін з сумежных націскаў проста зьлегкаважваецца, становячы сабою сысталу; 2) пульсанта, усутыч набліжаная да канстанты, кампэнсуецца выбухам дыясталы ў моцнай пазыцыі; 3) калі ж абодва націскі выступаюць як ікты, дык паміж імі ўзьнікае цэзура або лейма. Менавіта ў гэтым моманце знаходзіць сабе частковае тлумачэньне ідэя леймаванага рытму.
Увесь апісаны тут рытмавы працэс, які *задаецца* з хваста, а *падаецца* з пачатку, выходзіць наскрозь супярэчлівым. Як разьвязаць гэта на практыцы? Выйсьце дае такая псыхічная зьява, як *рытмавы стэрэатып*. Першы націск, які часта абмыльна ўважаюць за падставовы, насамрэч адыгрывае важную, але другасную ролю рытмавае арыентацыі, «падказкі». Калі тая не спрацоўвае і мы не зымаем дынамікі напружанага шэрагу – даводзіцца чытаць пачатак тэксту па-новаму, каб патрапіць на рытмавую інэрцыю. Балазе, найчасьцей такая апэрацыя лішняя. Прычына замыкаецца ў самім парадку ўзьнікненьня вершу. Успомнім, паэты абы час любяць падкрэсьліваць неадлучнасьць думкі ад рытму. І мала хто з аўтараў загадзя ведае, да якога памеру ў той ці іншы момант ён зьвернецца.
Матрыцаю служыць першая фраза, якая мусіць быць рытмава акрэсьленаю, выразнаю. Яе паэт інтуіцыйна прымяркоўвае да знаёмага рытмавага стэрэатыпу, пераносячы на ўвесь верш. Нават загадзя намеркаваны памер патрабуе рытмава выразнае першае фразы. Дарэчы, вершаў зь невыразнымі першымі радкамі параўнальна няшмат. Калі ж фраза замыкае ў сабе вершавую патэнцыю, але паэт ня мае ў памяці адпаведнага рытмавага стэрэатыпу, дык хутчэй за ўсё не пакарыстуе яе. Ці стане адкрываньнікам новага стэрэатыпу. Менавіта тут

тлумачыцца славуты парадокс Л. Цімафеева, дзей «у вершы няма нічога, чаго няма ў мове», і ня менш парадаксальны адказ Б. Тамашэўскага: «Нічога, апрача самога вершу». Маўленьне – гэта патэнцыі, рэальныя, але не актуалізаваныя, не «размножаныя». Верш – стэрэатып актуалізаванае патэнцыі.
У прозе «кішаць» узоры мэтрыкі, аднак паэты здавальняюцца параю-другою рытмавых стэрэатыпаў, зададзеных геніямі-пачынаньнікамі. Для беларусаў у XIX стагодзьдзі такім стэрэатыпам служыў чатырохступовы харэй, а для расейцаў – ямб. Часьцей за ўсё, як паказвае гісторыя літаратуры, для адкрыцьця новага рытмавага стэрэатыпу мала аднае інтуіцыі, нават геніяльнае. Патрэбная вымога канструяваньня і веданьне, хоць бы прыблізнае, законаў празодыі. Усё гэта яшчэ раз пацьвярджае тупіковасьць рамантычнае тэорыі спантаннасьці, натхненьня і генія, калі тую не падмацоўвае рацыя. Усякая спантаннасьць з грунту больш стэрэатыпная, чым пільнае вучнёўства. Праўда, гэтая заўвага датычыць штучных памераў і складаных камбінацыяў рытмэмаў, але не датычыць памераў, якія арганічныя паводле свае прыроды і служаць базаю для астатніх. Наагул жа, перачытваньню першага радка вершу можна прысьвяціць асобнае дасьледаваньне.
Надалей, зважаючы на сказанае, варта адрозьніваць асьвечаны традыцыяй прынцып пісаньня вершаў і выракаваны моваю прынцып іх бытаваньня. Менавіта на стыку штучных правілаў і натуральных законаў празодыі ўзьнікаюць паэтычныя тэксты. Яшчэ М. Трубяцкой падкрэсьліваў: «Найістотнейшаю заганаю ўсіх гэтых тэорыяў ёсьць мала выразны падзел паміж тэорыяй вершаваньня (стихосложения) і тэорыяй дэклямаваньня (стихопроизнесения)». Сёньня можна пайсьці далей і наўпрост сказаць: падобна, што панятак «сыстэма вершаваньня» даўно застарэў, бо ў якасьці сыстэмы для вершу ёсьць толькі мова, яе празадыйны межань. Усе сыстэмы належала б замяніць паняткам *вершавальная школа*. Розьніца ў тым, што школа ўстанаўляецца, як спосаб пісаньня вершаў, чыста тэарэтычна. Тым часам іх існаваньне залежыць не ад тэорыі, а ад беспасярэдняга дзеяньня нацыянальнае празодыі ў абсягах пэўнае школы.
Дзеля пісаньня гістарычна склаліся і, так ці гэтак, існуюць дзьве школы вершаваньня: *цыклічная ды лінейная*. З уплыву на беларускую паэзію іх яшчэ можна адпаведна абазначыць як

«француска-польская» ды «нямецка-расейская». Спосаб вершаваньня, які практыкуе першая школа, цыклічны, ці *кантынуальны*, ён абапіраецца на цэльны паэтычны радок як рытмавы цыкл, а спосаб другой – лінейны, ці *дыскрэтны*, бо грунтуецца на структуры радка, не заўсёды, дарэчы, належна зразуметай. Даўнімаючы хісткасьць і ўмоўнасьць граніцы паміж школамі (ці «сыстэмамі»), Я. Паліванаў, як мы помнім, падзяляў вершы на *сылябічна-танічныя* і *танічна-сылябічныя*. Кожная школа па-свойму дасягае адзінства рытмавага працэсу. У гэтым пляне можна гаварыць аб розных спосабах вэрыфікацыі рытму: *інтуіцыйным*, характэрным для цыклічнае школы, і *рацыянальным*, характэрным для лінейнае. Рацыянальная вэрыфікацыя рытму дасягаецца пры дапамозе ступ, дзе арганічны шэраг дапускае дваякую, пэонавую і ямба-харэевую вэрыфікацыю, што дае пэўную розьніцу ў варыяцыях ды мадыфікацыях рытмэмаў. З рацыянальных вэрыфікацыяў гістарычна склалася толькі ямба-харэевая, хоць беларуская празодыя давала ня меншыя падставы і для пэонавае. Тым часам інтуіцыйная вэрыфікацыя рытму за інварыянт мела вылучна пэонавую амплітуду, што яшчэ раз кажа пра дамінантнасьць пэонаў.

Няцяжка здагадацца, што на пачатковым, інтуіцыйным этапе станаўленьня рытмэмы патрэбен канцавы пункт адліку для ўсталяваньня ізасылябізму і, урэшце, ізатанізму актуальнага шэрагу. Менавіта гэтую функцыю – пункту адліку – і выконвае фіксаваны (і менавіта ад канца) націск пры вэрыфікацыі рытму. У мовах безь фіксаванага націску ці з пачатнаю фіксацыяй інтуіцыйная вэрыфікацыя можа працаваць праз частковае пазычаньне данае асаблівасьці артыкуляцыі ў рамах вершу і ўсталяваньне правіла аднастайнае кляўзулы і цэзуры. Ніякіх іншых істотных замінаў для «складалічыльнага» вершу ў мовах без фіксаванага націску няма. Інварыянты рытмэмаў пры ўсіх спосабах вершаваньня з грунту тоесныя. Аднак узьнікае пытаньне аб тэарэтычных падставах самой рытмэмы як аб'екту вывучэньня.

Аб вылучэньні ў вершаваньні супору маўленьня і мовы гаварыў адзін з айцоў фаналёгіі М. Трубяцкой: «Прапаноўваныя дагэтуль тэорыі… мэтрыкі падлягаюць перагляду з гледзішча сучаснае структуральнае лінгвістыкі». Аднак, пакінуўшы нямала каштоўных дасьледаваньняў мэтрыкі, ён не зрабіў

прынцыповых высноў. Урэшце, сучаснае вершазнаўства ў асобе М. Шапіра прыйшло да парадаксальнага зьмеркаваньня: «Рытм такая самая субстанцыя паэтычнае *мовы*, як і мэтар. Іх дачыненьні і сузалежнасьць вызначаюцца нэўтралізацыяй адрозьненьняў паміж «моваю» ды «маўленьнем», уласьціваю мастацтву ў цэлым». Думаю, рэч ня ў гэтым, проста традыцыйная мэтрыка зь яе ступамі можа прэтэндаваць на ролю мовы толькі прыблізна, ня больш, чым унівэрсальная граматыка Пор-Раяля.

Так, тэорыя ступ вельмі простая для зразуменьня, даступная як паэтам-пачаткоўцам, так і дасьледнікам, якія ніколі не пісалі вершаў. Ці ня з гэтай прычыны за ямбава-харэевую мэтрыку так агрэсіўна трымаецца «мэханістычная школа»? Дзеля справядлівасьці варта прызнаць: «мэханіцысты» давялі тэорыю ступ да вялікае вытанчанасьці, усе яе недасканаласьці згладзіліся, і канкураваць зь імі проста небясьпечна. Аднак граматыка ўсякае мовы мусіць вынікаць з маўленьня, таму адзінкаю рытмалёгіі можа быць толькі рытмэма, як адзінкаю фаналёгіі – фанэма. Усутыч да адкрыцьця рытмэмы наблізіўся ня хто іншы, як А. Квяткоўскі. І сёньня, у якіх бы недакладнасьцях ні вінаваціліі тактамэтрыю, мы павінны аддаць належнае яго інтуіцыі і навуковай адвазе. Лепш дапусьціць колькі абмылаў, чым бясконца таптацца ў тупіку ямбава-харэевай статыстыкі.

«У тэорыі Квяткоўскага былі, ведама, прабелы і слабыя агнівы... – піша І. Раднянская, – але, прынамсі, ён цудоўна паказаў роднасьць розных сыстэм вершаваньня». Першая абмыла А. Квяткоўскага палягала ў тым, што ён не адрозьніваў *цыклічнае* і *лінейнае* школаў. Другая – у тым, што ягоная *кроць* сумяшчала ў сабе якасьці і *рытмэмы*, і *ступы*. А *тактамэтравы пэрыяд*, сваім парадкам, – рытмэмы і *страфэмы*. Слабыя, амаль сьцертыя ў расейскім вершаваньні сьляды рытмэмаў цыклічнае («сылябічнае») школы А. Квяткоўскі геніяльна адгадаў у сваіх «пяцідольніках» і «шасьцідольніках». Але гэтыя рытмэмы як *рэальныя* і завершаныя адменлівыя рытмавыя фігуры, разьдзеленыя цэзурамі і радковымі паўзамі, у яго тэорыі нічым прынцыпова ня розьняцца ад ступ – *умоўных* мінімальных адцінкаў вымярэньня рытму.

Што нам дае падставу пастуляваць рытмэмы як інварыянты рытмавага працэсу? Мяркую, што першасным крытэрам

праўдзівасьці ўсіх вершазнаўчых выракаў і цяпер, і даўней служыў **паэтычны слых**. Гэтак Кірыл і Мятод ня ведалі панятку фанэмы, але калі б не адчувалі інварыянтаў («уяваў») гукаў, дык ніколі не змаглі б адкрыць азбукі. Сімяон Полацкі, стаўляючы рытмавыя націскі ў «паралельным вымярэньні» з слоўнымі, таксама, няйначай, зважаў на інварыянты рытму. Паэтычны слых нечым падобны да музычнага, але ня тоесны яму. На гэты конт ёсьць павучальны ўрывак ў успамінах Р. Іўнева:

Аляксандар Блок, паводле ягоных жа слоў, ня меў найэлемэнтарнейшага музычнага слыху. <…> Наўрад ці мы тады паверылі б гэтаму, зачараваныя перадусім яго найтанчэйшаю суладнасьцю, музыкаю яго паэзіі.

Сьпеўнасьць вершаў Блока прымяркоўвалася да салаўінае. Мы маглі толькі адчуваць гэтую сьпеўнасьць, але не аналізавалі яе. Цяпер я думаю, што, можа, немень музычнага слыху і зрабіла гэткім тонкім і выкшталцоным яго паэтычны слых.

І падобным спосабам разважае Х. Л. Борхес у інтэрвію А. Фэрары:

Х. Л. Б. *У мяне, я думаю, ёсьць слых на тое, што Бэрнар Шоў называў «word music» (музыкай слоў), але зусім няма слыху або ёсьць, але вельмі слабы, што да інструмэнтальнае ці вакальнае музыкі.*

А. Ф. Гэта дзьве розныя здольнасьці.

Х. Л. Б. Але, ведама ж, гэтыя дзьве адмены слыху розьняцца, і мне даводзілася гутарыць з музыкамі, у якіх зусім няма слыху на музыку слова, – яны ня могуць вызначыць, ці добры рытм у празаічным пасажы або ў паэтычнай страфе.

І ў паэтаў, і ў музыкантаў наяўнасьць слыху не залежыць ад іх тэарэтычных ведаў. Таму, тонка адчуваючы рытмэму, не заўсёды можна даць яе тэарэтычнае азначэньне. Тэарэтыкі, сваім парадкам, далёка ня ўсе належна адчуваюць варыянты ды інварыянты рытму. Невыпадкова ж у нешматлікай вершазнаўчай літаратуры так шмат бяздушных, мэханістычных аналізаў. Не сумняюся, якасьць рытмэмы можна вызначыць і дакладным «матэматычным» разьлікам, але без банальнае суб'ектыўнае інтуіцыі само існаваньне вершаў было б немажлівым. Пад канец мушу з скрухаю зазначыць, што мой паэтычны слых далёкі ад дасканаласьці. Іначай і мне практычна ўдалося б суладаць з «чыстымі пэонамі», якія я з

зайздрасьцю чуў у цытаваных вышэй В. Савіча-Заблоцкага, С. Ясеніна, П. Васільева, У. Някляева. Балазе, там дзе бракуе прыроднага дару, – прыходзіць на дапамогу практычны досьвед і, урэшце, тэорыя.

Гэты досьлед – у нейкай ступені помста «ямба-харэізму» за тыя блудныя сьцежкі, па якіх ён вадзіў мяне і водзіць дагэтуль, у той ці іншай меры, усіх нашых паэтаў. Часамі лепш ня ведаць жаднае тэорыі і пісаць на слых, як гэта з посьпехам рабілі нашаніўцы, чым сьлібізаваць фантомныя ступы. Як я зазначаў на пачатку, усе паэтыкі – і айчынныя, і іншыя, – пашыраныя ў абсягах Беларусі, бачылі і бачаць верш вачыма тона-сылябізму. Выкладзеная ж тут тэорыя, хоць і прэтэндуе на ролю *мэтатэорыі*, усё ж за падставовую ідэю бярэ прынцып «сылябізму», ці – запраўднага сыляба-танізму. А наагул, мы пакуль што ня ведаем ні меры свабоды рытму, ні законаў яго спалучальнасьці. Сёньня філялёгія дазваляе распрацаваць законы спалучэньня рытмэмаў, як некалі пост'імпрэсіяністы распрацавалі законы спалучэньня колераў.

[image]

[image]

№ 5 (34) - 2004

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (34) - 2004**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image] **[image]** 2004

"да Змястоў"

ідэміка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура •

рэцэнзіі

[image] [image] [image] **АНАТОЛЬ ТРАФІМЧЫК**

Анатоль Трафімчык Паміж Сцылаю і Харыбдаю

Ладысеў У., Брыгадзін П. *Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939)*. – Менск: БДУ, 2003. – 307 с.

Апошнім часам у Беларусі выходзяць працы па айчыннай

гісторыі як нацыянальна-дэмакратычныя па сваім духу, так і абноўлена-савецкія. Першыя характарызуюцца адыходам ад традыцый савецкай гістарычнай школы (і нярэдка з гэтай прычыны трапляюць у своеасаблівую залежнасць ад яе). Другія ж, наадварот, знаходзяцца ў моцнай залежнасці ад савецкай ідэалагічнай традыцыі[1]. Улічваючы палітычныя працэсы ў Беларусі і вакол яе, было б дзіўна, каб у гістарычнай навуцы, у многім залежнай ад

палітыкі, не
склалася
такой
сітуацыі.

Сумесную працу Ўладзімера Ладысева і Пятра Брыгадзіна (абазнаным зразумела, што больш першага, чым другога) пра станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі ў 1917–1939 гады не аднясеш ні да першых, ні да другіх. Але гэта не значыць, што яна пазбегла ўплываў дня сённяшняга і стала палітычна нейтральнай. Яе амбівалентнасць заключаецца ў імкненні знайсці кансенсус паміж гісторыкамі дзвюх акрэсленых вышэй арыентацый. І гэтае свядомае імкненне прайсці між Сцылаю і Харыбдай прывяло да таго, што праца не можа задаволіць чаканні ні «нацыянальна свядомых», ні саветчыкаў (для першых аўтары не дагаворваюць усёй праўды, а для другіх яны «ерэтыкі» ўжо таму, што замахнуліся на ранейшую праўду). Аўтары, прадбачачы такую сітуацыю, наперад апраўдваюцца: маўляў, «з некаторымі аўтарскімі заключэннямі нехта можа не пагадзіцца. Таму ў кнізе ў якасці дадатку прыведзены дакументы, многія з якіх уводзяцца ў навуковае абарачэнне ўпершыню; на іх аснове можна зрабіць уласную выснову». 40 дакументальных дадаткаў сапраўды ўяўляюць асаблівую каштоўнасць.

У першым раздзеле прасочваецца эвалюцыя беларускага нацыянальнага руху ад лютага да кастрычніка 1917 году ў агульнарасійскім кантэксце з акцэнтам на палітыку партыі бальшавікоў (лагічна: яны ж потым перамаглі). Не абмінаюцца ўвагай палітыка двайных стандартаў з боку бальшавікоў у адносінах да нацыянальна-вызваленчага руху беларусаў, якім адмаўлялася ў прадэкларацыях У. Леніным праве на самавызначэнне (с. 29–31). Паводле Кнорына – аднаго з кіраўнікоў Кампартыі Беларусі, у 1917 годзе «з беларускім пытаннем у першым перыядзе яго існавання наша партыя (бальшавікоў. – **А.Т.**) не справілася» (с. 31).

З беларускім рухам бальшавікі наагул не хацелі лічыцца, ужо ў ліпені 1917 г. Ленін імкнучыся не выпусціць з Расійскай імперыі Польшчу, у лісце ЦК РСДРП яшчэ 29 красавіка 1917 году адкрыта заяўляў: «Конечно, теперь насилие царит над Польшей, но чтобы польские национал-шовинисты рассчитывали на освобождение ее Россией – это изменá

Интернационалу»[3]. Але, як добра паказана аўтарамі (і беларускі нацыянальны рух убіраўся ў сілу, якая выявіцца неўзабаве.

Першаму раздзелу шкодзіць адсутнасць прэамбулы, якая б дазволіла чытачу зразумець, з якімі набыткамі палітычныя рухі Беларусі падышлі да пертурбацый 1917 году.

Падаецца не зусім дакладнай назва другога раздзелу – «Працэс фарміравання дзяржаўнасці Беларусі пасля кастрычніцкіх падзей у Петраградзе» (NB: у адрозненне ад звяржэння царызму захоп улады бальшавікамі рэвалюцыяй не названы!); насамрэч разглядаецца перыяд да сярэдзіны 1919 году. Яго несумненная вартасць бачыцца ў пераканаўчым паказе шырыні і глыбіні разгортвання беларускага нацыянальнага руху, які стаў пад канец 1917 году сапраўды народным і прывёў да скліканння I Усебеларускага з’езду, які выявіў, аднак, што незалежніцкія тэндэнцыі беларусаў не сягаюць радыкальнай аўтаноміі ў складзе Расіі. Дый гэта, палічылі бальшавікі, было заналта – і, напіўшыся, разагналі дэмакратычны сход, стаўшы «ворагамі беларушчыны» (Янка Купала). Аднак рабіць адпаведную выснову аўтары не сталі, і бальшавікоў у адзін шэраг з іншымі акупантамі (польскім войскам) не паставілі.

Далейшае развіццё падзей – станаўленне і дзейнасць БНР – асвятляецца змястоўна, але не без рэверансаў савецкай гістарыяграфіяй: так, маўляў, «адзіным рэальным гарантам сацыяльных заваёў працоўных выступала ў той час Савецкая Расія» (с. 77–78). Дарэчы, Ленін аддзяленне ад Расіі дапускаў, але толькі фармальна: «Мы за автономию для всех частей, мы за право отделения (а не за отделение всех! <…> В общем, мы против отделения. Но мы стоим за право на отделение. <…> Ничего, абсолютно ничего кроме права на отделение здесь нет и быть не должно»[4]. Такая вось імперыялістычная дваістасць.

Незалежніцкія памкненні, праяўленыя беларускай нацыянальнай элітай у 1918 годзе, мелі пад сабою грунт, тым больш што «29 жніўня 1918 г. савецкі ўрад прыняў падпісаны У. Леніным дэкрэт аб адмове ад дагавораў і актаў, укладзеных урадам былой Расійскай імперыі аб падзеле Рэчы Паспалітай»[5]. А гэта значыць, расійская інкарпарацыя беларускіх зямель, якія з’яўляліся ядром ВКЛ, de jure ліквідоўвалася, а за іх

[3] Цыт. па: Петрыкава, І. Выступіў супраць «фальсификаторов советской историографии»: Петриков П. Г. Основные направления историографии Беларуси конца XX – начала XXI веков // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі. Матэрыялы Рэсп. нав.-практ. канферэнцыі 28 лістапада 2003 г. Мінск, 2003. Ч. 2. С. 499–508.

[4] Штопрауда, калі паглядзець на праблему ўважлівей, выяўляецца больш шырокі спектр беларускіх гісторыкаў і

насельніцтвам прызнавалася права на самавызначэнне – калі б гэтае насельніцтва адмовілася ад ранейшага дзяржаўнага status quo ў выглядзе ВКЛ. Аўтары фактычна прызнаюць, што без БНР не адбылося б абвяшчэння Савецкай Беларусі.

ніс – калі б (ў чым, што ён пераконвае і ўзятая для разгляду праца). [2] Думаецца, каб бальшавікам такі ход удаўся, Беларусь, страціўшы статус заходняга фарпосту Расіі, нават фармальна не ўяўляла б цікавасці для іх нацыянальнай палітыкі. Каб краіны суседзяў, у тым ліку і перш за ўсё Польшча, не здолелі замацаваць сваю дзяржаўнасць, наўрад ці бальшавікоў турбавала б і надалей пытанне беларускай дзяржаўнасці.

Аднак, як слушна паказвае трэці раздзел «Беларуская дзяржаўнасць на савецкай аснове», да фактару БНР пры стварэнні беларускай савецкай рэспублікі дадаваліся «ваенна-палітычнага характару», бо насамрэч Масква не хацелася даваць беларусам нават намінальную суверэнітэт. Беларуская тэрыторыя фактычна, як res nullius[6], стала аб'ектам, з дапамогай якой вырашаліся пытанні больш маштабныя. Дзяржаўнае афармленне Беларусі ні ў якім разе не з'яўлялася мэтай для бальшавікоў (дый іх праціўнікаў); больш за тое, ступень улады для беларускага народу і яго нацыянальнай эліты мінімізавалася. Праўда, тут жа аўтары ўжываюць стасоўна чарговага прыходу Чырвонай Арміі такую лексіку, як «вызваленне», хоць «вызваліцелі» ў гэтым раздзеле выглядаюць шчыра несімпатычна.

Кідаецца ў вочы адсутнасць згадкі пра Слуцкі збройны чын 1920 году, без якога працэс, што закончыўся Рыгай у сакавіку 1921 году, выглядае недастаткова асветленым. У той жа час

[3] Ленин В. И. Полное собрание сочинений. Т. 31. Москва: Государственное издательство политической литературы. С. 433. [4] Ленин В. И. Полное собрание сочинений. Т. 48. Москва: Государственное издательство политической литературы. С. 233–236. [5] Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5: Беларусь у 1917 – 2002 гг. / Нав. рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мерцуля. Мінск: Выш. шк., 2003. С. 254. Дарэчы, дзіўна было знайсці такую інфармацыю

упамінаюцца вайсковыя фармаванні Булак-Булаховіча, якія ўтварыліся пад інспіраваныя Пілсудскім.

У раздзеле чацвёртым пры даследаванні працэсаў, якія за Саветамі былі ахрышчаны «ўзбуйненнем» БССР, выкарыстоўваецца больш карэктны тэрмін – «вяртанне ўсходніх этнічных беларускіх зямель». Намінальная суверэннасць рэспублікі дазволіла ад самага пачатку казаць пра яе ўніфікацыйнае для беларускіх тэрыторый значэнне; і ў пацверджанне Масква правяла два так званыя ўзбуйненні. Такі ход рабіў Савецкую Беларусь большай і па тэрыторыі, і па колькасці насельніцтва за заходнебеларускія землі ў складзе Польшчы[7], – не далучаць жа большую частку да меншай[8].

Апошні, пяты раздзел «На завяршаючым этапе кансалідацыі беларускай нацыі» – пра аб'яднанне заходняй часткі Беларусі з усходняй. Сама назва яго падаецца крайне няўдалай, бо ўжо справядліва адзначаюць многія гісторыкі, працэс кансалідацыі беларусаў далёка не завершаны і працягваецца дагэтуль.

Раздзел складаецца з двух параграфаў, першы з якіх рэпрэзентуе стан беларускага пытання ў II Рэчы Паспалітай, а другі падае чарговую інтэрпрэтацыю вераснёўскіх падзей. У цэлым яна з'яўляецца новым словам у «афіцыйнай» беларускай гістарыяграфіі, бо адлюстроўвае гвалтоўнасць аб'яднання. Аднак аўтары ў пошуках спакайнейшага фарватэру (зноў паміж Сцылаю і Харыбдай) дапускаюць нацяжкі. Напрыклад, яны не рашыліся на прызнанне недэмакратычнымі выбараў на далучанай тэрыторыі (ці не цень гэта сённяшняга дня?). Ідэя, што «фарміраванне калгасна-саўгаснай сістэмы» «не знайшло водгуку ў заходнебеларускім сялянстве», таксама памылковая. А водгук быў – адмоўны. У разы два перабольшана плённасць бюджэтных расходаў на асвету ў 1940 годзе для заходніх абласцей БССР, што пазначылі аўтары[9]. Нават у высновы пранікла голая рыторыка: «далучэнне заходнебеларускіх зямель да БССР адпавядала інтарэсам большасці насельніцтва краю». Хоць многія факты, у прыватнасці пасляваеннае

---

[6] Рэч без уладальніка, нічыя (лац.).

[7] Падчас Савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. Польшча ўключыла ў сваю тэрыторыю 52,4 тысячы км2. Прадстаўнікі ЦВК Беларусі і ЦК КП(б)Б патрабавалі вярнуць беларускія тэрыторыі, якія апынуліся пад акупацыяй камуністычнай Расіі, у больш за 200 тысяч км2. У 1939 г. напярэдадні

перасяленне беларусаў у Беларусь, а палякаў у Польшчу, выявілі сапраўднае стаўленне насельніцтва да савецкай улады. Тады пры любой магчымасці сяляне імкнуліся застацца ў заходні бок мяжы, нягледзячы, што там існавалі праблемы нацыянальнай нецярпімасці, бандытызму і г. д. Тысячы мігрантаў на захад, якія ў 1944 годзе ўцякалі ад бальшавіцкай улады – тэма таксама амаль нераспрацаваная ў гістарычнай навуцы.

Аўтары пачалі аналіз падзей 1939 году ў нейтральных тэрмінах і скончылі маркіраваннем вераснёўскіх падзей вызваленнем. Між тым, аб'яднанне Беларусі ў 1939 годзе супала з пачаткам другой сусветнай вайны. Хіба ж можна лічыць цалкам станоўчай для краіны падзею, з якой пачалася адна з самых разбуральных у гісторыі краіны войнаў?

Кароткае заключэнне таксама не пазбегла апрыёрнай канстатацыі, «што менавіта РСФСР дапамагла беларускай нацыі стварыць сваю нацыянальную дзяржаўнасць», хоць аналіз многіх фактаў і дакументаў сведчыць пра адваротную ролю «старэйшага брата».

Як філолаг, не магу не звярнуць увагі на перасыпаную русізмамі мову кнігі. Хоць яе аўтары ведаюць, як называлася сталіца Расіі ў час першай сусветнай вайны (Петраград), а як да 1938 году называлася цяперашняя сталіца Беларусі – нібыта не, па-савецку называючы яе Мінскам.

Падзеі вакол 1917 году ў беларускай гістарыяграфіі за апошні тузін гадоў атрымалі найпільнейшую ўвагу, і іх ацэнкі сталі больш разнастайнымі і менш палітызаванымі. А вось адносна падзей 1939 году да расстаноўкі тут кропак над «і» яшчэ далёка. Усё гэта і адбілася на працы У. Ладысева і П. Брыгадзіна.

вернуўшихся в Беларусь, составила 125,9 тысяч человек. [8] Как было указано в пункте 3-м секретного документа «В комиссию Политбюро ЦК ВКП(б) по вопросу о расширении границ БССР», «основной решающий аргумент за расширение границ БССР – в ближайшее время – определяется политикой Польши»: мелася звесткі, што Пілсудскі збіраўся правесці шэраг рэформаў адносна нацыянальных меншасцяў, у тым ліку беларусаў.

Саветам трэ было ўзмацняць «свой» беларускі («гравітацыйны». – **Томаш Стрыек**) цэнтр, надаць яму кансалідуючае значэнне, якое затым нельга было б паддаць сумневу. Прыкладна такім самым метадам планавалася ўключыць у склад СССР Фінляндыю, далучыўшыяе да Карэла-Фінскай ССР, якую стварылі 31 сакавіка 1940 г., – аб'яднаць нібыта кроўных братоў аднаго народу, адна палова якога «стагнала

пад капіталістычным прыгнётам», другая – будавала светлую будучыню. У 1956 годзе, пасля смерці Сталіна і асуджэння культу асобы, ідэя таго аб’яднання, відаць, канчаткова знікла – і Карэла-Фінская ССР была пераўтворана ў проста Карэльскую АССР. [9] Гл. для параўнання афіцыйны дзяржаўны дакумент тагачасся: Дзяржаўны бюджэт Беларускай ССР на 1940 год. Мінск, 1940. С. 70, 207.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (34) - 2004**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image] **[image]** **[image]** 2004
"да Зьместу"
падземка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура •
рэцэнзіі
[image] [image] [image] **ЯЎГЕН КАЗІНЕЦ**

Яўген
Казінец
Беларусь
шматаблічная

Osteuropa.
Zeitschrift
für
Gegenwartsfragen
des Ostens.
2004. № 2.

Лютаўскі нумар нямецкага часопісу «Osteuropa» выйшаў пад назвай «Контуры і кантрасты. Беларусь шукае сваё аблічча». На вокладцы –рэпрадукцыя твору Казімера Малевіча «Торс у жоўтай кашулі». Постаць, выяўленая на ім, ня мае рысаў твара, удалечыні відаць чырвоны будынак, куды вядзе шлях – невядома. «Краіне яшчэ трэба вызначыць сваё месца ў Эўропе», –пішуць сябры рэдакцыі ў прадмове.

Для шырокіх колаў эўрапейскай супольнасьці Беларусь застаецца белай плямай недзе на ўсходзе, пра якую ведаюць збольшага дзякуючы Чарнобыльскай катастрофе і беларускаму прэзыдэнту. Таму рэдакцыя часопісу «Osteuropa» паставіла сабе за мэту прапанаваць увазе нямецкамоўных чытачоў шматфарбны і больш дэталізаваны вобраз Беларусі. Для яго стварэньня матэрыялы падбіраліся паводле прынцыпаў

міжпрадметнасьці і рэлевантнасьці. Яны належаць да адной з трох частак: контураў, кантрастаў і колаў. Першая частка прысьвечана палітычна-эканамічнай тэматыцы, другая –т. зв. незалежнаму грамадзтву, а трэцяя –усходняй і заходняй сфэрам уплыву, паміж якімі знаходзіцца Беларусь. Каб паглядзець на краіну знутры і звонку, адна палова артыкулаў была напісана беларускімі, другая –заходнімі аўтарамі.

Нарыс Сяргея Панькоўскага «Менск –чацьверты Рым» прысьвечаны беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі. Матывамі яе стварэньня называюцца ўзмацненьне дзяржаўнай улады і апраўданьне ізаляцыі ад міжнароднай супольнасьці. Дзяржаўная ідэалёгія, якая ўводзіцца сёньня, працягвае савецкую традыцыю і мае свае вытокі ў расейскім месіянізьме. Наяўнасьць адзінай ідэалёгіі ёсьць прыкметай таталітарнай дзяржавы, якая пазбаўляе сэнсу шматпартыйную сыстэму, выключае палітычны плюралізм і спаборніцтва палітычных праграмаў у грамадзтве. Аўтар у гістарычным аспэкце разглядае каштоўнасьці заходняй цывілізацыі і супрацьпастаўленыя ім т. зв. усходнеэўрапейскія. Першым каштоўнасьцям кінула выклік беларускае кіраўніцтва, а не беларускі народ, і таму разам зь зьменамі ў грамадзтве –ростам незадаволенасьці, прыходам у публічнае жыцьцё новага пакаленьня –існуе магчымасьць для руху ў супрацьлеглы сёньняшняму палітычнаму курсу бок. Будучыня Беларусі яшчэ ня вызначана, і эўрапейскі шлях для яе канчаткова ня выключаны.

У аналізе Дэвіда Р. Марплза разглядаецца пытаньне папулярнасьці беларускага прэзыдэнта. Фактарамі, якія спрыяюць ёй, ёсьць расейскі ўплыў, слабасьць нацыянальнай сьвядомасьці, а таксама разьяднанасьць апазыцыі. Аўтар зазначае, што інтарэс да Беларусі з боку замежных навукоўцаў пабольшаў у параўнаньні з пачаткам 90-х гадоў. Далей аўтар аналізуе зьмены ў палітыцы Расеі ў дачыненьні да Беларусі пасьля абраньня прэзыдэнтам Пуціна, ролю тэлебачаньня ў палітычным жыцьці краіны.

Асобны разьдзел прысьвечаны праблемам нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў. У ім разглядаецца гістарычны лёс

краіны ў параўнаньні з суседзямі, шукаюцца прычыны і вытокі яе сёньняшняга стану. Яго выснова ў тым, што навукоўцы і дзеячы культуры павінны стварыць новую ідэнтычнасьць беларусаў, якая б уключала ў сябе разуменьне таго, што Беларусь –эўрапейская краіна, здольная выжыць, нягледзячы на неспрыяльныя абставіны.

Сьвятлана Навумава апавядае аб партыях і іх ролі ў палітычным жыцьці краіны, аналізуе прычыны іх слабасьці, пачынаючы ад часу іх заснаваньня і да цяперашняй пары. Стварэньне партыяў ішло ў Беларусі паводле традыцыйнай схемы: спачатку былі грамадзкія аб'яднаньні, якія патроху набывалі палітычны, а потым парлямэнцкі досьвед. У якасьці фактараў, што нэгатыўна ўплываюць на сучасны стан партыйнай сыстэмы, называюцца наяўнасьць мажарытарнай выбарчай сыстэмы, абмежаваньні з боку ўладаў, невысокая якасьць палітычных праграмаў, канкурэнцыя за рэсурсы, благія асабістыя адносіны паміж партыйнымі лідэрамі. Разам з тым, у Беларусі існуе даволі вялікая колькасьць людзей, гатовых галасаваць за партыйных кандыдатаў. Пратэстны патэнцыял грамадзтва яшчэ большы. Ёсьць попыт на новыя ідэі і постаці. Аднак апазыцыя мае, на жаль, імідж вечнага аўтсайдэра, а не гатовага на ахвяры «бацькі і змагара за дабро народу». На думку Навумавай, штуршкі да рэформы існай сыстэмы будуць зыходзіць не ад палітычных партыяў, а хутчэй ад той крытычнай масы людзей, што зьявіцца ў выніку росту грамадзянскай супольнасьці і зьвяжа пэрспэктывы свайго ўласнага жыцьця з дэмакратычнай Беларусьсю. Актыўнасьць дробнага і сярэдняга бізнэсу, а таксама няўрадавых арганізацыяў можа прывесьці да зьменаў у палітычнай сыстэме, і, тым самым, партыі атрымаюць новыя шанцы.

Ірына Бугрова гаворыць пра рэгіёны Беларусі, разьвіцьцё і зьмены ў якіх сталіся за апошнія гады відавочнымі. Яны разглядаюцца з эканамічна-геаграфічнага, палітычна-прававога і сацыялягічнага пунктаў гледжаньня. Падрабязна аналізуецца эканамічная структура і сацыякультурныя асаблівасьці рэгіёнаў, якія падзяляюцца на тры тыпы: актыўныя (Менск і Берасьцейская вобласьць), адаптацыйныя (Гарадзенская, Гомельская і Менская вобласьці) і пасіўныя, ці дэпрэсіўныя

(Віцебская і Магілёўская вобласьці). Вядучыя пазыцыі ў эканамічным разьвіцьці займаюць Менск і Берасьцейская вобласьць, якія амаль па ўсіх паказьніках выпераджаюць астатніх. У іх створаныя свабодныя эканамічныя зоны, што спрыяе пазытыўным пераўтварэньням у эканоміцы. Берасьцейская вобласьць належыць таксама да эўрарэгіёну «Буг», які ўключае ў сябе польскія і ўкраінскія тэрыторыі. Дзяржаве варта спрыяць раскрыцьцю эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў і разьвіваць правільную рэгіянальную палітыку, мяркуе аўтарка.

Д-р Эльке Кнапэ зь Ляйпцыгскага інстытуту геаграфіі аналізуе стан сельскай гаспадаркі Беларусі. Яна падрабязна піша пра аграрны сэктар, які традыцыйна грае важную ролю ў беларускай эканоміцы. Ён знаходзіцца ў цяжкім становішчы з прычыны захаваньня вялікіх малаэфэктыўных прадпрыемстваў і адсутнасьці сур'ёзных рэформаў. Дзяржаўная падтрымка ратуе яго ад канчатковага развалу: палеткі ўрабляюцца, працоўныя месцы захоўваюцца, падтрымліваюцца мінімальныя сацыяльныя гарантыі. Але статыстычныя зьвесткі гавораць пра пагаршэньне сытуацыі ў сельскай гаспадарцы: колькасьць трактараў і камбайнаў у дзяржаўных прадпрыемствах зьменшылася, што прывяло да павелічэньня долі ручной працы; працэнтны паказьнік долі сельскагаспадарчай прадукцыі ў ВУП Беларусі ўпаў з 22,9 % у 1999 годзе да 9,0 % у 2002. Зь сёлаў моладзь і найбольш мабільныя людзі пераяжджаюць у гарады. Цяжкія ўмовы жыцьця, слаба разьвітая інфраструктура, меншыя ў параўнаньні з прамысловасьцю заробкі абумоўліваюць непрывабнасьць жыцьця на сяле. Сельскую гаспадарку Беларусі можа выратаваць толькі прыватызацыя і зьмяншэньне дзяржаўнага кіраваньня, інакш ёй пагражае далейшы заняпад.

Алена Ракава дае адказ на пытаньне, у якіх умовах адбываецца разьвіцьцё дробнага і сярэдняга бізнэсу ў Беларусі. Падтрымка і спрыяньне разьвіцьцю прадпрымальніцтва –важная справа ў краінах з рынкавай эканомікай, дзе дробны і сярэдні бізнэс забясьпечвае вялікую колькасьць працоўных месцаў і гарантуе стабільнае разьвіцьцё грамадзтва. Прыватнае прадпрымальніцтва можа зьменшыць цяжкасьці пераходнага пэрыяду. Нягледзячы на рэпрэсіўны эканамічны клімат,

беларускае прадпрымальніцтва разьвіваецца. Дапамагчы яго пасьпяховаму разьвіцьцю магла б карэкцыя дзяржаўнай эканамічнай палітыкі, а таксама дапамога міжнароднай супольнасьці. Ёсьць патрэба ў новых законах для разьбюракратызацыі эканомікі, павышэньня кваліфікацыі дзяржаўных службоўцаў. Важна працягваць праграмы выдзяленьня невялікіх крэдытаў, дапамагчы Беларусі ў стварэньні інвэстыцыйных банкаў і іншых інструмэнтаў фінансавай дапамогі, спрыяць незалежным СМІ, якія ствараюць пазытыўны вобраз інстытутаў рынкавай эканомікі.

У заключнай частцы нумару Яўген Шырокаў апавядае пра пэрспэктывы разьвіцьця беларускай энэргетыкі, Віктар Чарноў – пра палітычную адукацыю беларускага грамадзтва, Гербэрт Вольхютэр –пра зьмены ў сацыяльнай палітыцы ў дачыненьні да інвалідаў, Пэтра Рэнтроп –пра разьвіцьцё беларускай гістарыяграфіі, Норбэрт Рандаў –пра беларускую літаратуру. Уладзімер Улаховіч аналізуе нэгатыўныя і пазытыўныя наступствы для Беларусі апошняга пашырэньня Эўрапейскага Зьвязу, Хайнц Тымэрман –інтэграцыю Беларусі і Расеі, Алег Манаеў –зьмены ў грамадзкай думцы Беларусі ў пытаньні інтэграцыі з Расеяй і Эўропай. Зьмешчана таксама рэцэнзія нямецкай пісьменьніцы, перакладчыцы і публіцысткі Ільмы Ракузы на кнігу Алеся Разанава «Танец з вужакамі», што выйшла ў Нямеччыне па-нямецку ў 2002 годзе (тутсама друкуюцца два вершы паэта па-беларуску з паралельным нямецкім перакладам). Журналістка Інга Пэц распавядае пра рок-музыку ў незалежнай Беларусі. Райнэр Ліндэр дасьледуе, ці належыць Беларусь да Эўропы. Яго артыкул пачынаецца з цытаты з «Франкфуртэр Альгемайнэ Цайтунг», у якой сьцьвярджаецца, што Беларусь ніколі не была часткаю гістарычнае Эўропы. Аўтар на матэрыяле беларускай гісторыі даводзіць адваротнае.

Беларускі нумар «Osteuropa» сьведчыць пра немалы інтарэс немцаў да Беларусі. Але сёньня, калі Эўрапейскі Зьвяз і Беларусь сталі суседзямі, адной узаемнай цікавасьці мала: патрэбна ўзаемаразуменьне.

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/3/10
[image]